15040588
Э 325 Ч/п
Ю 15

ПАМЯТЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

16040388
63.3(4Б-4Бр)
П15

ПАМЯЦЬ

БРЭСЦКІ РАЁН

МІНСК
БЕЛТА
1998

2000
07

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА), Л.К.ГРЫЦКО, А.Л.ПЕТРАШКЕВІЧ, В.П.РОССІХІН, Б.В.УЛЬЯНКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

Л.К.ГРЫЦКО (старшыня камісіі), М.М.ГОРБА, С.Р.ІВАНЕНКА, У.І.НІКІЦЕНКАЎ, В.П.ЛАСКОВІЧ, В.П.РОССІХІН

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар), М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Укладальнік
В.П.РОССІХІН

Мастак
Э.Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА



ISBN 985-6302-13-7

© БЕЛТА, 1998

Калона, узведзеная ў гонар канстытуцыі Рэчы Паспалітай 1791 г., в. Вістычы.

10—6-е тысячагоддзі да н.э.	Гэтым часам датуюцца самыя старажытныя стаянкі эпохі мезаліту каля вёсак Блювінічы, Заказанка, Калодна, Прылукі, Шумакі.
Пачатак 1-га тысячагоддзя да н.э. — IX ст. н.э.	Да гэтага перыяду адносіцца паселішча жалезнага веку каля в. Дружба (Скорбічы).
VI—VII ст. н.э.	Засяленне Сярэдняга Пабужжа ўсходнімі славянамі.
Канец X— 1-я палова XII ст.	Берасцейшчына ў складзе Тураўскага княства.
1019 г.	Першае летапіснае ўпамінанне пра Бярэсце (Берестье).

Троіцкі касцёл у в. Чарнаўчыцы. Помнік архітэктуры XVI ст.

1087 г.	Пераход Бярэсця ва ўладанне валынскага князя.
1102 г.	Спроба ўтварэння самастойнага Брэсцкага княства.
1240 г.	Бітва з мангола-татарамі пад Бярэсцем.
Канец XIII — 1-я палова XIV ст.	За Берасцейскую зямлю вядуць барацьбу князі Вялікага княства Літоўскага і каралі Польшчы.
1319 г.	Бярэсце ўвайшло ў склад Вялікага княства Літоўскага.
1390 г.	Бярэсце першым з беларускіх гарадоў атрымала магдэбургскае права.

Царква Іаана Багаслова ў в. Чэрні.

15 ліпеня 1410 г.	Удзел берасцейскай харугвы ў Грунвальдскай бітве.
1499 г.	Набег татараў на Берасцейшчыну.
1 ліпеня 1569 г.	Заключана Люблінская унія — аб'яднанне Польшчы і Вялікага княства Літоўскага ў федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую, у склад якой увайшла і Берасцейшчына.
1583 ці 1585 г.	Будаўніцтва мураванага касцёла ў в. Чарнаўчыцы.
6 кастрычніка 1596 г.	Заключана Брэсцкая царкоўная унія.

Капліца на месцы гібелі Афанасія Філіповіча, в. Аркадзія. Пабудавана на мяжы XIX—XX ст.

Каля 1597 г. — 15 верасня 1648 г.	Жыццё і дзейнасць А. Філіповіча, пісьменніка-палеміста, палітычнага і царкоўнага дзеяча.
4 сакавіка 1634 г. — 30 сакавіка 1689 г.	Жыццё і дзейнасць К. Лышчынскага. Нарадзіўся ў маёнтку Лышчыцы Берасцейскага павета.
Красавік 1794 г.	Пад час нацыянальна-вызваленчага паўстання ў Польшчы, на Беларусі і ў Літве пад кіраўніцтвам Т.Касцюшкі ўладу ў Брэсце захапілі паўстанцы.
19 верасня 1794 г.	Расійскія войскі пад камандаваннем А.В.Суворава разбілі пад Брэстам паўстанцкі корпус К. Серакоўскага.
1795 г.	Трэці падзел Рэчы Паспалітай, далучэнне заходняй часткі Беларусі, у т.л. і Берасцейшчыны, да Расійскай імперыі.
1797 г.	Брэст — павятовы цэнтр у Расіі.

Форт № 5 каля в. Аркадзія. Пабудаваны ў 1887—1888 гг.

1812 г.	2 ліпеня Брэст заняты французскімі войскамі. 25 ліпеня вызвалены ў выніку разгрому французаў кавалерыйскай брыгадай А. Шчарбатава. 15 жніўня зноў заняты арміяй Напалеона. Канчаткова вызвалены 25 снежня.
1836—1842 гг.	Будаўніцтва Брэсцкай крэпасці.
16 лістапада 1871 г.	Увод у эксплуатацыю чыгуначнай магістралі Смаленск — Брэст; афіцыйная дата адкрыцця Беларускай чыгункі.
1905 г.	Заснаванне бясплатнай народнай бібліятэкі ў в. Астрамечава, адной з першых у Беларусі.
Жнівень 1915 г.	Пачатак акупацыі войскамі кайзераўскай Германіі тэрыторыі Берасцейшчыны ў час 1-й сусветнай вайны.

Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у в. Чарнаўчыцы.

3 сакавіка 1918 г.	Падпісанне Брэст-Літоўскага мірнага дагавора (Брэсцкі мір) паміж Савецкай Расіяй і дзяржавамі германскага блока.
13 лістапада 1918 г.	ЦВК РСФСР ануляваў Брэсцкі мірны дагавор.
20 лютага 1919 г.	Брэст заняты польскімі войскамі.
1 жніўня 1920 г.	Брэст заняты Чырвонай Арміяй. У горадзе ўстаноўлена савецкая ўлада.
18 сакавіка 1921 г.	Заключэнне Рыжскага мірнага дагавора, паводле якога Заходняя Беларусь адышла да Польшчы.
Сакавік 1921 г. — 1939 г.	Брэсцкі раён у складзе Польшчы.
1926—1937 гг.	Дзейнасць у Брэсце акруговай і павятовай арганізацый Таварыства беларускай школы.

Помнік землякам, што загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, пас. Мухавец.

1 верасня 1939 г.	Нападзенне Германіі на Польшчу — пачатак 2-й сусветнай вайны.
17 верасня 1939 г.	Пераход Чырвонай Арміяй савецка-польскай мяжы з мэтай абароны насельніцтва Заходняй Беларусі.
28 — 30 кастрычніка 1939 г.	Народны (Нацыянальны) сход Заходняй Беларусі ў Беластоку абвясціў савецкую ўладу.
12 лістапада 1939 г.	3-я (нечарговая) сесія Вярхоўнага Савета БССР прымае пастанову «Аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР».
Студзень 1940 г.	Утвораны Брэсцкі і Дамачаўскі раёны. Апошні скасаваны ў 1956 г., частка яго ўвайшла ў склад Брэсцкага раёна.

Адміністрацыйна-культурна-гандлёвы цэнтр у в. Астрамечава.

22 чэрвеня 1941 г.	Вераломны напад фашысцкай Германіі на СССР. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны, пачатак акупацыі раёна фашыстамі.
22 чэрвеня — канец ліпеня 1941 г.	Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці.
Чэрвень 1941 г.	Стварэнне партызанскага атрада пад кіраўніцтвам С.С.Шыканава.
Чэрвень 1941 г. — 28 ліпеня 1944 г.	Дзейнасць Брэсцкага антыфашысцкага падполля.
12 мая 1942 г. — ліпень 1943 г.	Дзейнасць Брэсцкага міжраённага «Камітэта барацьбы з нямецкімі акупантамі».

Сярэдняя школа ў в. Скокі.

Красавік 1943 г.	У Старасельскім партызанскім атрадзе налічвалася 200, а праз месяц — каля 300 чалавек. Пасля гібелі М.М.Чарнака ў маі 1943 г. атрад назвалі ў яго гонар.
Верасень 1943 г.	Фашысты расстралялі 54 выхаванцаў і выхавальніцу Дамачаўскага дзіцячага дома.
1943—1944 гг.	Гітлераўцы правялі тры акцыі па вывазе ў Германію працоўнай сілы, у выніку чаго там апынуліся 1943 жыхары раёна.
Кастрычнік — лістапад 1943 г.	Баі паміж партызанскімі атрадамі імя Варашылава, імя Жукава, партызанскай брыгадай імя І.В.Сталіна і нямецкімі захопнікамі на чыгуначнай станцыі Дамачава і ў г.п. Дамачава.
22 чэрвеня 1944 г.	76-я і 38-я гвардзейскія стралковыя дывізіі 70-й арміі вызвалілі г.п. Дамачава.

Санаторый «Бярэсце».

25 ліпеня 1944 г. Вызваленне войскамі 1-га Беларускага фронту Брэста. Завяршэнне вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

1945 г. У в. Кавердзякі стала працаваць МТС, якая мела 2 трактары і 2 трактарныя сеялкі.

1950 г. У раёне працуюць 2 МТС, ёсць 40 трактароў, 5 камбайнаў, 10 малатарань.

1950 г. Утвораны калгас «Пагранічнік». Калектывізацыя ахапіла 90% сялянскіх гаспадарак раёна.

30 ліпеня 1964 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР шэрагу населеных пунктаў зменены назвы: в. Дурычы на в. Знаменка, в. Каросцічы на в. Холмічы, в. Цярпілавічы на в. Зелянец, в. Скорбічы на в. Дружба.

Народная творчасць. Л.П.Грыгор'ева з в. Астрамечава дэманструе ўзоры саломапляцення.

Ліпень 1968 г.	Адкрылася турбаза «Белае возера».
25 верасня 1971 г.	Адкрыццё мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой».
18 снежня 1973 г.	Ураджэнец в. Камароўка П.І.Клімук здзейсніў касмічны палёт на караблі «Саюз-13».
Май — чэрвень 1975 г.	Лётчык-касманаўт П.І.Клімук ажыццявіў касмічны палёт на караблі «Саюз-18» і арбітальнай станцыі «Салют-4».
Чэрвень — ліпень 1978 г.	Лётчык-касманаўт П.І.Клімук ажыццявіў палёт на караблі «Саюз-30» і арбітальнай станцыі «Салют-6».

Народны хор Дома культуры, в. Тэльмы.

Верасень 1976 г.	Пачаў працаваць міжкалгасны санаторый «Бярэсце».
1989 г.	Утвораны аркестр народных інструментаў выкладчыкаў музычных школ раёна.
1989 г.	У раёне налічвалася 42,8 тысячы жыхароў.
15 студзеня 1990 г.	Брэсцкі раён адзначыў сваё 50-годдзе.
1996 г.	У Днях памяці, прысвечаных 55-годдзю абароны Брэсцкай крэпасці, прынялі ўдзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын.

Да чытача

Паважаныя чытачы!

Перад вамі кніга «Памяць», прысвечаная Брэсцкаму раёну Брэсцкай вобласці. Наш край, што раскінуўся ўздоўж ракі Заходні Буг — мяжы паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча, — своеасаблівая брама ва ўсе краіны Еўропы не толькі для Беларусі, але і для ўсіх суверэнных рэспублік Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Спакон веку жылі людзі на гэтай зямлі. Цяжкай працай яны асвойвалі яе, неаднойчы са зброяй у руках абаранялі ад ворагаў. І, нягледзячы на ўсе нягоды, ператварылі сваё Прыбужжа ў квітнеючы край.

Лепшыя людзі раёна вядомы далёка за яго межамі, імі па праву ганарыцца дзяржава.

Гісторыка-дакументальная хроніка Брэсцкага раёна складзена на падставе дакументаў, музейных экспанатаў, друкаваных матэрыялаў, успамінаў удзельнікаў і сведкаў падзей Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., грамадзянскай вайны, барацьбы працоўных Заходняй Беларусі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, адраджэння і аднаўлення народнай гаспадаркі.

У пошуку і зборы матэрыялаў удзельнічалі прадстаўнікі грамадскасці раёна, навуковыя супрацоўнікі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта, працаўнікі архіваў, бібліятэк, музеяў, райваенкаматаў, пісьменнікі і журналісты. Аўтары карысталіся дакументамі многіх архіваў, у тым ліку Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, дзяржаўных архіваў Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, архіваў калгасаў і прадпрыемстваў Брэсцкага раёна.

Мы добра ўсведамляем, што стагоддзі жыцця Прыбужжа ў адной кнізе не ахапіць. Час адкрые яшчэ многія новыя старонкі, будуць вернуты з забыцця новыя імёны, новыя факты гісторыі...

1504088
БРЭСЦКАЯ ...ЛАСНАЯ
БІБЛІЯТЭКА ...М. ...ОРКАГА


БРЭСЦКІ РАЁН
Цэнтры раёнаў
Цэнтры сельсаветаў
КАМЯНЕЦКІ РАЁН
ПІНСКІ РАЁН
ЦЯРЭСПАЛЬ
УЛАДАВА
МАЛАРЫТА
ЖАБІНКА
БРЭСТ
Вярба
Мал.Зводы
Люта
Астрамечава
Нов. Лышчыцы
Лышчыцы
Кашылава
Шчытнікі
Яцкавічы
Сычы
Мал.Ракавіца
Матыкалы
Вял.Матыкалы
Дзям'янчыцы
Відамля
Турна Вялікая
Холмічы
Покры
Пеліша
Арэпічы
Падлессе
Гарэлкі
Вежкі
Крыўляны
Сцяпанкі
Вял. Сяхновічы
Мацеевічы
Хмелева
Амяліна
Чарнаўчыцы
Бабры
Сакі
Цукровы Завод
Вялюнь
Нагараны
Пятровічы
Навасады
Кашалёва
Братылава
Чзрні
Цюхінічы
Прыбужжа
Кавердзякі
Косцічы
Клейнікі
Скокі
Заход. Буг
Тэльмы 1-я
аэрп. Брэст
Шэбрыны
Вычулкі
Мухавец
Стрыганец
Задзерць
Стар.Сяло
Азяты
Падлессе Радваніцкае
Забалацце
Радванічы Малыя
Радванічы Вялікія
Антанова
Ганчоны
Бярнады
Пасёлак-Мухавец
Каменная
Верасы
Прылукі
Прыпяць
Закруцін
Вялікарыта
Масевічы
Струга
Раматава
Стар.Раматова
Пажэжын
Страдзічы
Страдзеч
Кодзень
Знаменка
воз. Мядзянскае
Медна
Арлянка
Брадзяцін
Замшаны
Гвозніца
Збунін
воз. Радзязянскае
Рагозна
воз. Белае
Дубіца
Дубіца
Страдзенская рэчка
Збураж
Ляпліёўка
Ляплёўка
Кабёлка
Дамачава
Шыкілі
Дамачава-Горад
Падлужжа
Багданы
Чэрск
Галёўка
Радзеш
Дворышча
воз. Алтушскае
Ланская
Хаціслаў
Алтуш
Заазёрная
Ліпінкі
Харсы
Дубок
Малярыта
воз. Арэхоўскае
Пяровае
Арэхава
Прыбарава
Селяхі
біялагічны зак. Селяхі
Ростань
Пішча
Дрочава
Гута
Камароўка
Уладава
Гамашоўка
Пулемец
Астроўе
Мельнікі
УКРАІНА
ВАЛЫНСКАЯ ВОБЛ.
воз. Пульмецкае
Пульма
воз. Сяцкае
Шацк
Крапіўнікі
Стырыкс
Лясная
Кашылевка
23°30'
24°
51°30'
52°

БРЭСЦКІ РАЁН. Размешчаны па ПдЗ Брэсцкай вобл. Пл. 1,6 тыс. км^2 Насельніцтва 41,5 тыс. чал. (1996). Утвораны 15.1.1940 г.(у сучасных межах з 1950 г.). Цэнтр — г. Брэст. На 1.1.1996 г. у раёне 148 сельскіх населеных пунктаў, г.п. Дамачава, 11 сельсаветаў: Гершонскі, Знаменскі, Клейнікаўскі, Лышчыцкі, Матыкальскі, Мухавецкі, Радваніцкі, Тамашоўскі, Тэльмінскі, Чарнаўчыцкі, Чэрнінскі. Паверхня раёна нізінна-раўнінная. Большая частка ў межах Брэсцкага Палесся, невялікая паўночная частка — на Прыбугскай раўніне. Рэкі: Заходні Буг з прытокамі Лясная, Мухавец (уваходзіць у сістэму Дняпроўска-Бугскага воднага шляху), Спанаўка, Серадовая Рэчка, Рыта, Капаёўка; азёры: Селяхінскае, Страдзецкае, Чорнае, Рагазнянскае, Белае, Тайнае, Мяднянскае. Лясы займаюць 36% тэрыторыі раёна, найбольш буйныя масівы — Тэльмінскі, Мухавецкі, Белаазерскі, частка Радваніцкага, Бары, Варахоўскі, Шэбрынскі, Целішанскі. Каля Селяхінскага возера батанічны заказнік Селяхі. Помнікі прыроды: Мяднянскія ельнікі, Лютаўскія букі. Карысныя выкапні: торф, гліна, будаўнічыя пяскі, мел. Сярэдняя тэмпература студзеня -4,4 °С, ліпеня 18,8 °С. Ападкаў 548 мм за год. Вегетацыйны перыяд 208 сутак. Пераважаюць дзярнова-падзолістыя, дзярнова-падзолістыя забалочаныя, поймавыя (алювіяльныя), дзярновыя і дзярнова-карбанатныя забалочаныя глебы. Асноўныя галіны сельскай гаспадаркі — малочна-мясная жывёлагадоўля (буйная рагатая жывёла, свінагадоўля, авечкагадоўля, конегадоўля), буракаводства. Вырошчваюць збожжавыя, кармавыя культуры, бульбу, агародніну. Прадпрыемствы харчовай прамысловасці і будаўнічых матэрыялаў. Праз Брэсцкі раён праходзяць чыгункі Брэст — Баранавічы, Брэст — Лунінец, Брэст — Беласток (Польшча), Брэст — Ковель; аўтадарогамі звязаны з Баранавічамі, Пінскам, Камянцом, Маларытай. Раённая газета «Заря над Бугом».

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна

ГЕРШОНСКІ сельскі Савет: вёскі Аркадзія, Бярнады, Гершоны, Заказанка, Кацельня-Баярская, Міцькі, Прылукі, Страдзеч.

ДАМАЧАЎСКІ пасялковы Савет: г.п. Дамачава; вёскі Багданы, Барысы, Гута, Дубіца, Дубок, Кабёлка, Ліпінкі, Ляплёўка, Навасады, Падлужжа, Рудня, Чэрск, Шыкілі; хутар Дамброўка.

ЗНАМЕНСКІ сельскі Савет: вёскі Дубрава, Збунін, Знаменка, Медна, Рагозна; пасёлкі Лясны, Белае Возера, Бярэсце; хутар Альха.

КЛЕЙНІКАЎСКІ сельскі Савет: вёскі Казловічы, Кацельня-Баярская, Клейнікі, Костычы, Неплі, Пескі, Церабунь, Шумакі.

ЛЫШЧЫЦКІ сельскі Савет: вёскі Агароднікі, Астрамечава, Вялікія Шчытнікі, Кашылава, Кустынь, Лышчыцы, Люта, Малыя Зводы, Малыя Сухарэвічы, Малыя Шчытнікі, Марозавічы, Новыя Лышчыцы, Пагубяцічы, Рудавец, Сегенеўшчына, Цюпрыкі, Яцкавічы.

МАТЫКАЛЬСКІ сельскі Савет: вёскі Баброўцы, Вельямовічы, Вялікая Ракавіца, Вялікія Матыкалы, Галачова, Заполле, Збараміра ва, Кавердзякі, Малая Ракавіца, Малыя Матыкалы, Нехалсты, Скокі, Ставішча, Старое Сяло, Сычы, Цюхінічы, Чыжэвічы, Чылеева; хутар Матыкалы.

МУХАВЕЦКІ сельскі Савет: вёскі Ваўкі, Вулька-Застаўская, Гулі, Забалацце, Закій, Заслучна, Камяніца-

Жыровецкая, Літвіны, Лозы, Падлессе-Камянецкае, Падлессе-Радваніцкае, Сямісосны, Херма; пасёлак Мухавец.

РАДВАНІЦКІ сельскі Савет: вёскі Вялікія Радванічы, Малыя Радванічы, Міхалін, Франопаль.

ТАМАШОЎСКІ сельскі Савет: вёскі Камароўка, Орхава, Прыбарава, Рыцец, Селяхі, Тамашоўка, Харсы.

ТЭЛЬМІНСКІ сельскі Савет: вёскі Булькова, Буякі, Вычулкі, Кошалева, Лідымо, Малыя Косічы, Новыя Задворцы, Очкі, Плоска, Смолін, Старыя Задворцы, Тэльмы 1-я, Тэльмы 2-я, Хабы, Шэбрын, Ямна.

ЧАРНАЎЧЫЦКІ сельскі Савет: вёскі Амяліна, Блювінічы, Вістычы, Вулька, Вялікія Сухарэвічы, Дружба, Зелянец, Івахнавічы, Казловічы, Малая Курніца, Несвіло, Няневічы, Покры, Сколдычы, Смуга, Холмічы, Чарнакі, Чарнаўчыцы; пасёлак Сасноўка.

ЧЭРНІНСКІ сельскі Савет: вёскі Бердычы, Братылава, Вітошкі, Валоскі, Вялікая Курніца, Вялікія Косічы, Вялюнь, Гутовічы, Забярэззе, Залессе, Збірагі, Карабаны, Клімавічы, Машчонка, Селяхі, Харытоны, Чэрні.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ
Каменны і бронзавы вякі

Паўднёва-заходняя частка Палесся, па якой працякае Заходні Буг з прытокамі Мухавец, Лясная, Рыта і ў якую ўваходзіць тэрыторыя сучаснага Брэсцкага раёна, пачала засяляцца чалавекам у далёкай старажытнасці, яшчэ ў канцы палеаліту. Аб гэтым яскрава сведчаць археалагічныя помнікі той пары і знаходкі іх прылад працы, зробленых старажытным чалавекам у тыя далёкія часы. У сувязі з адсутнасцю іншых даных яны з'яўляюцца адзінай крыніцай, пры дапамозе якой можна атрымаць уяўленне аб жыцці чалавека ў старажытныя часы і на працягу наступных тысячагоддзяў.

Гэтыя археалагічныя помнікі былі пакінуты насельніцтвам, якое жыло тут з даўніх часоў. Людзі, што жывуць на той ці іншай тэрыторыі, заўсёды пакідаюць пасля сябе сляды сваёй дзейнасці, якія зямля захоўвае на працягу доўгіх стагоддзяў, а іншы раз і тысячагоддзяў. Вывучаючы археалагічныя помнікі (пасяленні і могільнікі), вучоныя па крупінках збіраюць разнастайныя звесткі, звязаныя з жыццём людзей у старажытнасці, каб аднавіць усё тое, што было тут раней.

На тэрыторыі раёна ў розны час адкрыта даволі значная колькасць археалагічных помнікаў розных эпох. Гэтыя помнікі падзяляюцца на дзве значныя катэгорыі: месцы, на якіх жылі людзі (стаянкі, паселішчы, умацаваныя гарадзішчы, гарады), і месцы, дзе хавалі нябожчыкаў (грунтавыя і курганныя могільнікі).

Цікавасць да археалагічных помнікаў Брэстчыны ўзнікла яшчэ ў канцы XIX ст. У сувязі з тым, што ў старажытнасці людзі сяліліся па берагах вялікіх рэк і іх прытокаў, археолагі дасканала абследавалі месцы, прыгодныя для жыцця ў тыя часы. Так, у 1898 г. М.Ф.Беляшэўскі з мэтай выяўлення археалагічных помнікаў абышоў берагі сярэдняга цячэння Заходняга Буга і выявіў шэраг помнікаў эпохі каменнага веку (мезаліту і неаліту) і эпохі бронзы. У 1926 г. польскі археолаг З.Шміт паўтарыў абследаванне гэтай тэрыторыі, выявіў новыя стаянкі каменнага веку і сабраў вялікую колькасць знаходак, зробленых з крэменю старажытным чалавекам. Праводзілі

Карта археалагічных помнікаў.

абследаванне гэтай тэрыторыі археолагі і ў наш час. Дзякуючы іх намаганням удалося ўстанавіць, што першыя людзі з'явіліся тут яшчэ ў эпоху мезаліту.

Самыя старажытныя стаянкі першабытнага чалавека на тэрыторыі сучаснага Брэсцкага раёна адкрыты археолагамі ў розныя часы каля вёсак Блювінічы, Заказанка, Калодна, Прылукі, Шумакі. На іх знойдзены прылады, зробленыя з крэменю, якія датаваны эпохай мезаліту (свідэрская культура). Так, у час абследаванняў раёна ў 1985 г. Т.М.Каробушкіна знайшла на вуліцы ў в. Шумакі крамянёвы адціскальнік. Апрача таго, жыхар в.Калодна Міхаіл Васільевіч Рачкоўскі расказаў, што на сваім агародзе ён аднойчы знайшоў апрацаваны чалавекам крэмень, а ў 1972 г. — каменную птушку, падобную на вераб'я. Апошнюю знаходку ўбачыць не ўдалося (была згублена), але па апісанні яе можна аднесці да эпохі мезаліту.

Прылады працы і зброю рабілі ў той час з крэменю, таму што ён добра колецца і дае вострый край. Аб гэтым сведчаць разнастайныя знаходкі археолагаў: ножападобныя пласціны, скрабкі, наканечнікі стрэл, розныя вастрыі і інш.

Варта зазначыць, што людзі, якія пасяліліся тут у эпоху мезаліту, працягвалі жыць на адных і тых жа месцах на працягу доўгіх тысячагоддзяў. Несумненна, тлумачыцца гэта спрыяльнымі ўмовамі жыцця ў той час у гэтых мясцінах. Калі ўлічыць, што тэрыторыя Брэстчыны нават у больш познія часы вылучалася сярод іншых тэрыторый вялікай колькасцю лясных масіваў, то можна ўявіць, колькі рознага звера вадзілася ў іх у той час. У рэках было багата рыбы, а на марэнных узгорках заўсёды можна было знайсці неабходную колькасць крэменю для вырабу жыццёва неабходных прылад.

Старажытныя стаянкі каменнага веку і эпохі бронзы, размешчаныя па берагах Заходняга Буга і яго прытокаў, мелі даўжыню да 300 і некалькі болей метраў. Усе яны прывязаны да сучасных вёсак.

У эпоху неаліту (5—3-е тысячагоддзі да н.э.) і бронзавага веку (3—2-е тысячагоддзі да н.э.) людзі працягвалі сяліцца па берагах рэк і азёр. Ужо ў тыя часы Заходні Буг з'яўляўся асноўным водным шляхам, па якім рассяляліся плямёны індаеўрапейцаў з Паўднёвага Буга і Валыні.

У эпоху неаліту ў жыцці тагачаснага насельніцтва адбыліся важныя змены. Па-першае, людзі пачалі разводзіць хатнюю жывёлу, а з 4-га тысячагоддзя да н.э. — займацца першабытным земляробствам. Узнікла неабходнасць рабіць гліняны посуд, які ўпрыгожвалі разнастайным па

форме арнаментам. Звычайна гаршкі выраблялі жанчыны і кожная з іх імкнулася зрабіць гаршчок, які не быў бы падобны на другі. Посуд эпохі неаліту знайшоў М.Ф.Беляшэўскі яшчэ ў 1898 г. Разам з крамянёвымі вырабамі, сярод якіх налічвалася сто прылад працы і зброі, ён выявіў яго каля в.Прылукі. Апрача таго, ім было сабрана шмат кавалкаў глінянага посуду эпохі неаліту і два цэлыя гаршкі эпохі сярэдняй бронзы (тшцінецкая культура), у якіх у свой час былі змешчаны рэшткі пахаванняў, зробленых па абрадзе трупаспалення. Адзін з іх быў упрыгожаны арнаментам у выглядзе прамалінейных баразёнак у верхняй частцы гаршка, наляпнога валіка і двух радоў ямак па тулаве. Гаршкі з перапаленымі касцямі нябожчыкаў знайшоў М.Ф.Беляшэўскі таксама і каля в.Страдзеч. Помнік адносіцца да эпохі позняга неаліту і эпохі сярэдняй бронзы.

На помніках, размешчаных каля вёсак Заказанка і Прылукі, жыццё людзей пачалося яшчэ ў эпоху мезаліту і працягвалася ў перыяд неаліту і бронзы. Але сярод іх ёсць і больш познія, куды людзі прыйшлі толькі ў эпоху позняга неаліту і бронзы. Так, каля в. Збунін адкрыта стаянка, на якой апрача крамянёвых прылад працы і глінянага неалітычнага посуду сабраны бронзавыя рэчы і прасліцы з гліны, якія ў якасці грузікаў надзявалі на верацяно пры прадзенні. Знаходкі сведчаць аб тым, што людзі жылі тут у познім неаліце і ў бронзавым веку.

Паблізу в. Прыбарава М.Ф.Беляшэўскі адкрыў дзве стаянкі эпохі неаліту і бронзы, дзе сабраў вялікую колькасць крамянёвых наканечнікаў стрэл, нажоў і іншых прылад і абломкаў глінянага посуду. У 1980 і 1985 гг. Т.М.Каробушкіна на правым беразе Заходняга Буга на абедзвюх стаянках прама на паверхні знайшла апрацаваныя крамяні (ножападобныя пласціны, адшчэпы), ляпную кераміку з арнаментам у выглядзе елачкі і ямачак. Школьніца Прыбараўскай школы Т.Гараднічук знайшла каменную цяслападобную сякеру з круглай адтулінай у цэнтры за 2,5 км на паўднёвы ўсход ад в.Прыбарава каля хаты шашэйнага майстра, за 0,8 км ад дарогі Брэст — Тамашоўка. Другая каменная сякера таксама эпохі бронзы была знойдзена вучаніцай Дамачаўскай школы на пясчаным узгорку правага берага Заходняга Буга і зафіксавана Т.М.Каробушкінай у 1980 г. Сякера даўжынёй 12,3 см зроблена з валуна, мае ромбападобную форму з адтулінай у цэнтры, зробленай у адзін прыём. Гэта сведчыць аб вялікім майстэрстве жыхароў гэтых мясцін у той час.

Жалезны век

У канцы VII—VI ст. да н.э. на тэрыторыі Беларусі пачаўся жалезны век, які працягваўся да VIII ст. н.э. уключна. Яго ўзнікненне звязана з асваеннем чалавекам чорнай металургіі. З мясцовай балотнай руды ў спецыяльных печах-домніцах атрымлівалі жалеза, якое ішло на выраб прылад працы і зброі. Гэта вельмі значная эпоха ў гісторыі чалавецтва, таму што з адкрыццём жалеза яно адразу паднялося на больш высокую ступень развіцця.

У 1966 г. пры раскопках пасялення жалезнага веку каля в.Дружба (Скорбічы) І.П.Русанавай была знойдзена грубая таўстасценная кераміка. Пры абследаванні гэтых помнікаў Т.М.Каробушкінай у 1980 і 1985 гг. выяўлена ляпная кераміка, арнаментаваная ямкамі, зробленымі палачкай, абмотанай вяроўкай. Апра-



Каменныя сякеры, знойдзеныя каля вёсак Прыбарава (1) і Падлужжа (2), і адціскальнік (3) з в. Шумакі.

ча таго, была выяўлена ляпная глянцаваная танкасценная кераміка (кавалак міскі). Кавалкі таўстасценнай і глянцаванай керамікі належалі посуду, які даследчыкі датуюць IV—II ст. да н.э. і адносяць яе да паморскай культуры, плямёны якой насялялі басейны Заходняга Буга і верхняй Прыпяці. Помнікі гэтай культуры прадстаўлены на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа паселішчамі і грунтавымі могільнікамі. У 1958 г. каля в.Дружба Ю.У.Кухарэнка ўскрыў 220 кв.м плошчы і выявіў сляды грунтавога могільніка падклетавай культуры IV—I ст. да н.э. Могільнік гэтай жа культуры быў выпадкова адкрыты ў 30-я гады мясцовым жыхаром в.Уладычыца, які знайшоў у зямлі гліняны посуд з перапаленымі чалавечымі касцямі, сярод якіх трапляліся пацеркі. Зверху посуд быў накрыты гліняной міскай. У 1955—1957 гг. на гэтым жа помніку вёў раскопкі Ю.У.Кухарэнка, які знайшоў тут пахаванне, зробленае па абрадзе трупаспалення, рэшткі якога былі пахаваны ў гліняным посудзе, і датаваў могільнік VII—IV ст. да н.э.



Крамянёвыя наканечнікі стрэл (1—3) і гаршкі (4—5) эпохі сярэдняй бронзы (в. Прылукі).

У межах тэрыторыі сучаснага Брэста (вул.Маскоўская), раней гэта была в.Трышын, у 1959 г. Ю.У.Кухарэнка адкрыў і на працягу шасці гадоў вывучаў грунтавы могільнік эпохі жалезнага веку. Было ўскрыта 75 пахаванняў, зробленых па абрадзе трупаспалення ў падоўжаных і круглай формы ямах. Трупаспаленне праводзілася за межамі пахавання, пасля чаго рэшткі крэмацыі ссыпалі ў ямку або змяшчалі ў гліняныя гаршкі, збаны, міскі і хавалі ў ямках. Апрача глінянага посуду рознай формы пры пахаваннях выяўлены разнастайныя рэчы, сярод якіх гліняныя прасліцы, жалезныя нажы, замкі, бронзавыя фібулы, сярэбраны бранзалет, дэталі паяснога набору, шкляныя і бурштынавыя пацеркі, металічныя падвескі, касцяныя грабяні, шпількі, кубкі з зялёнага шкла. Помнік датаваны апошняй чвэрцю II — пачаткам III ст. н.э. Могільнік выкарыстоўваўся на працягу цэлага стагоддзя і належаў плямёнам вель-



Знаходкі X—пачатку XI ст. з гарадзішча Франопаль: 1 — наканечнік ножан мяча; 2, 3 — наканечнікі стрэл; 4 — перакрыжаванне мяча; 5 — рыбалоўны кручок; 6 — замок; 7, 8 — гаршкі.

барскай культуры, якая фарміравалася ў Памор'і і нізоўях Віслы. У першыя стагоддзі новай эры плямёны гэтай культуры пачалі рухацца на паўднёвы ўсход і такім чынам дасягнулі Валыні, Сярэдняга Пабужжа, Прычарнамор'я і Падунайя. На падставе вельбарскай культуры на ўказанай тэрыторыі склалася чарняхоўская культура, якую адны даследчыкі лічаць славянскай, а другія звязваюць яе з адным з этапаў у фарміраванні славян. Нягледзячы на тое, што асноўнымі стваральнікамі вельбарскай культуры былі ўсходнегерманскія плямёны готаў і гепідаў, пэўны ўплыў на яе зрабіла і мясцовае насельніцтва, якое жыло на гэтай тэрыторыі яшчэ да прыходу сюды плямён вельбарскай культуры.

Калі ў папярэднія археалагічныя эпохі ў грамадстве панаваў матрыярхат, то ў часы ранняга жалезнага веку ён змяніўся патрыярхатам. Галоўнай ячэйкай у гэты час становіцца вялікая патрыярхальная сям'я. Такія сем'і жылі ў шматкамерных жытлах пад адным дахам. Сем'і аб'ядноўваў

род. Яму належала пэўная тэрыторыя, на якой былі размешчаны пасяленні, сельскагаспадарчыя палі. З мэтай абароны сваёй маёмасці насельніцтву неабходна было побач з неўмацаванымі паселішчамі будаваць умацаваныя гарадзішчы, на якіх можна было выратавацца і захаваць маёмасць на выпадак сутыкненняў з прадстаўнікамі іншага роду.

Эпоха феадалізму

З цягам часу ў нетрах патрыярхальна-абшчыннага ладу пачаў складацца і фарміравацца новы грамадскі лад — феадалізм. Але і пры панаванні феадальных адносін неабходнасць ва ўзвядзенні паселішчаў, якія маюць штучныя абарончыя ўмацаванні з мэтай зберажэння насельніцтва і маёмасці, не толькі не зменшылася, але і павялічылася.

Раскопкі археалагічных комплексаў, якія складаюцца з адкрытых паселішчаў і ўмацаваных гарадзішчаў, даюць падставу ўпэўніцца ў тым, што асаблівая патрэба з'явілася ва ўмацаваных гарадзішчах у X ст. У гэты час у сувязі з развіццём феадалізму ў руках асобных феадалаў былі сканцэнтраваны вялікія багацці ў выглядзе жывёлы і сельскагаспадарчых прадуктаў. З'явіліся ўмовы для пераразмеркавання гэтых багацяў, таму ўзнікла вострая неабходнасць паблізу з селішчамі будаваць умацаваныя гарадзішчы, дзе ў выпадку неабходнасці можна было схавацца не толькі насельніцтву, але і захаваць маёмасць.

Комплекс такіх паселішчаў у 1988 і 1990 гг. вывучаў А.В.Іоў каля в. Франопаль. Раскопкі далі магчымасць устанавіць, што спачатку людзі жылі на паселішчы, але ў другой палове X ст. вымушаны былі пабудаваць умацаванае гарадзішча, якое праіснавала да канца X ст. і было знішчана ў час варожага разбурэння. Разам з гэтым спынілася жыццё і на селішчы і больш на гэтым месцы яно не аднаўлялася. Гарадзішча не ўтрымалася, нягледзячы на тое, што было ўмацавана земляным кальцавым валам вышынёй 2—2,5 м. Унутры вала расчышчаны драўляныя канструкцыі, якія аберагалі яго ад асыпання. Уздоўж вала былі пабудаваны часовыя драўляныя памяшканні, якія ўяўлялі сабой невялікія па памерах клеці. У адной з клецей знойдзены склеп (1х0,8 м), які меў падлогу і ніжнюю частку сценак з дошак, верх сценак быў выкладзены з валуноў, сярод якіх стаяў гаршчок X ст. з зернем проса.

Апрача таго, на селішчы і на гарадзішчы выяўлена шмат кавалкаў ганчарнай керамікі. Зброя прадстаўлена наканечнікамі стрэл і коп'яў, перакрыжаваннем і ажурным бронзавым наканечнікам ножнаў мяча, баявымі сякерамі. З рэчаў хатняга ўжытку — нажы, кубічнай формы замок, шыферныя прасліцы, жорны. З жаночых упрыгожанняў — разнастайныя пацеркі. Характар умацаванняў і знаходкі разнастайнай зброі сведчаць аб тым, што па беразе р.Рыта размяшчаўся своеасаблівы пасёлак, які быў знішчаны ў час варожай навалы.

У верхніх пластах двух невялікіх па плошчы пасяленняў каля в. Дружба (Скорбічы) І.П.Русанавай вызначаны пласты IX—X ст. н.э. Апрача кавалкаў глінянага посуду, сярод якіх ёсць гліняная жароўня, тут расчышчаны рэшткі сямі паглыбленых у зямлю жытлаў, якія размяшчаліся групамі, на адлегласці 5—7 м адна ад адной. Жылыя памяшканні мелі глінабітныя печы і падлогі. Сцены з мэтай уцяплення таксама былі абмазаны глінай. Аб гэтым сведчаць знаходкі глінянай абмазкі. У адной невялікай па памерах пабудове зной-

дзена шмат драўлянага вуголля і шкляного шлаку. Ёсць падстава меркаваць, што яна з'яўлялася майстэрняй па вырабе шкляных рэчаў. Даныя аб планіроўцы і забудове паселішча маюць вялікае значэнне ў сувязі з тым, што да гэтага часу з'яўляюцца адзіным узорам для адкрытых пасяленняў IX—X ст. на тэрыторыі ўсяго Беларускага Пабужжа. І гэта важна таму, што ў насельніцтва гэтага рэгіёну той пары існавала адзіная або падобная планіроўка, забудова, будаўнічая тэхніка, наяўнасць і спосабы пабудовы печаў і іншыя будаўнічыя асаблівасці. Рэчавы матэрыял, атрыманы ў час раскопак, сведчыць аб высокім узроўні развіцця матэрыяльнай культуры насельніцтва паселішча. Керамічны матэрыял верхняга пласта датаваны IX—X ст. н.э., ніжняга — IV—I ст. да н.э. і адносіцца да паморскай культуры. Такім чынам, жыццё на паселішчы працягвалася больш за тысячу гадоў. Апрача керамікі ў верхнім пласце знойдзены рэчы з металу (нажы, шылы, крэсівы, цуглі, серп, рыбалоўны кручок, цвікі, свінцовыя грузілы), шкла (рознакаляровыя пацеркі).

У 1980, 1985 гг. у час абследавання помніка Т.М.Каробушкінай знойдзена кераміка IX—X ст. з хвалістым і лінейным арнаментам, а таксама ляпная таўстасценная кераміка паморскай культуры. Гэтыя матэрыялы з'яўляюцца яшчэ адным пацверджаннем таго, што ў старажытнасці людзі не толькі ўмелі выбраць зручнае для сваёй жыццядзейнасці месца, але і маглі яго цаніць, калі жылі на ім такі працяглы час. Хутчэй за ўсё яны былі вымушаны пакінуць свае абжытыя мясціны ў сувязі з развіццём феадальных адносін, калі жыць на адкрытых паселішчах стала небяспечна. Не выключана магчымасць таго, што селішча было знішчана ў час нейкага варожага нападу на яго. У 1980 г. Т.М.Каробушкінай на паселішчы



Археалагічныя знаходкі з раскопак каля хутара Гуркі: 1 — цвік; 2—4 — нажы; 5 — глінянае прасліца; 6 — пярсцёнак; 7 — шпора.

былі расчышчаны рэшткі невялікіх драўляных спаленых пабудоў. Мяркуючы па іх нязначных памерах, яны хутчэй за ўсё мелі гаспадарчае прызначэнне.

Матэрыялы аб усходніх славянах, атрыманыя з паселішча каля в.Дружба, доўгі час былі адзінымі і самымі старажытнымі рэчавымі доказамі, якія сведчаць аб абжыванні тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа ў канцы I тысячагоддзя н.э. Але ў 1988 г. В.С.Вяргей адкрыла і часткова вывучыла пасяленне славян плошчай не менш як 2 га каля в.Блювінічы. Апрача ляпнога глінянага посуду VI—VII ст. тут былі знойдзены нажы, у аднаго з якіх захаваліся нават драўляная рукаятка, глінянае прасліца, каменны тачыльны брусок. Сляды жытлаў не захаваліся, але ўскрытая на пасяленні печ-каменка дае падставу меркаваць, што яны былі падобны на тыя, якія вывучаны І.П.Русанавай каля в. Дружба. Аб

гэтым сведчыць аналагічны спосаб пабудовы печы. Несумненна, што прыёмы будаўнічай тэхнікі былі сфарміраваны ў славян яшчэ да часу іх прыходу на тэрыторыю Сярэдняга Пабужжа. Яны прынеслі сюды ўжо гатовую матэрыяльную культуру, якая на працягу стагоддзяў магла некалькі абнаўляцца, дапаўняцца, але, што вельмі важна, захоўвала сваю аснову. Неабходна адзначыць, што будаўнічая тэхніка з'яўляецца асноўнай і вельмі кансерватыўнай часткай любой матэрыяльнай культуры. На працягу стагоддзяў змяняюцца або дапаўняюцца толькі асобныя дэталі. Напрыклад, печ, якая ў VI—VII ст. у славян яшчэ не мела пэўнага месца і размяшчалася то каля сцен, то ў кутах, радзей у цэнтры жытла. І толькі ў пачатку XI ст., калі прайшло 500 гадоў, ёй нарэшце было вызначана пэўнае месца — правы або левы вугал ад уваходa ў жыллёвую пабудову.

Вывучэнне паселішча каля в. Блювінічы мае вялікае навуковае значэнне, таму што канкрэтнымі матэрыяламі пацвердзіла па аналогіі з суседнімі тэрыторыямі ранейшае меркаванне вучоных аб засяленні гэтага рэгіёна ўсходнімі славянамі ў VI—VII ст. н.э.

На селішчы, размешчаным на левым беразе р. Лясная каля в. Покры, людзі таксама жылі вельмі працяглы час. Селішча мае выцягнутую форму і прыроднай упадзінай падзелена на дзве часткі. Значныя памеры ўпадзіны (шырыня 6, глыбіня 2,5 м) робяць з аднаго пасялення як бы два астраўкі, якія з паўночна-ўсходняга боку абаронены ракой, а з усходняга — старыцай гэтай ракі. У 1955 і 1959 гг. на абедзвюх частках паселішча невялікія раскопкі былі праведзены А.І.Іофе. Знойдзены крамянёвыя прылады каменнага веку, кераміка XI—XIII ст. і пахаванні па абрадзе трупапалажэння без пахавальнага матэрыялу.

Раскопкамі 1966 г. Ю.У.Кухарэнкі і І.П.Русанавай было ўстаноўлена, што паселішча мела яшчэ штучнае ўмацаванне ў выглядзе рова. Нягледзячы на тое, што паселішча не мае абаронных валоў, мясцовае насельніцтва і зараз называе яго гарадзішчам. Улічваючы, што яно з трох бакоў акружана ракой, а з чацвёртага —штучным ровам, можна лічыць яго гарадзішчам з арыгінальнымі ўмацаваннямі. Апрача таго, гэтымі археолагамі было выяўлена адзінаццаць пахаванняў па абрадзе трупапалажэння. Асаблівую цікавасць выклікаюць пяць пахаванняў на мацерыку, якія былі размешчаны вакол вялікага глінянага гаршка. Помнік з'яўляецца выключэннем як па незвычайных умацаваннях, так і па абрадзе пяці пахаванняў, размешчаных кругам вакол гаршка. Аналогій гэтаму пахавальнаму абраду пакуль няма. Рэчавы матэрыял дае падставу датаваць помнік XI—XIV ст. Але знаходкі крамянёвых прылад гавораць аб тым, што людзі сяліліся тут яшчэ ў каменным веку. Рэчы з крэменю знаходзілі як пры раскопках, так і пры абследаванні помніка ў 1980 г., калі пры зачыстцы ямкі ў паўднёва-ўсходняй частцы помніка з боку ракі разам з керамікай XIV ст. у ніжнім пласце Т.М.Каробушкінай быў знойдзены нож, зроблены з крамянёвай рабрыстай пласцінкі.

Для ўзнаўлення больш поўнай карціны жыцця чалавека ў старажытнасці археолагі з аднолькавым інтарэсам вывучаюць не толькі стаянкі і рознага віду паселішчы, але і пахавальныя помнікі. Насельніцтва сярэдзіны і канца 1-га тысячагоддзя н.э. пакінула могільнікі, зробленыя па абрадзе трупаспалення, якія былі размешчаны паблізу паселішчаў.

Рэшткі трупаспаленняў хавалі ў насыпе кургана або ў яме ці ў гліняным посудзе пад насыпам кургана. Па рэштках металічных рэчаў,

Выгляд аднаго з курганоў каля хутара Гуркі перад пачаткам раскопак.

якія засталіся пасля спальвання нябожчыкаў, па посудзе, а калі-нікалі і па спосабе пахавання вучоныя вызначаюць час пахаванняў. Часцей за ўсё спальвалі нябожчыка ў адным месцы, а курган насыпалі ў іншым. Зрэдку на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа трапляюцца курганы з трупаспаленнем на тым месцы, на якім пасля быў насыпаны курган.

У 1980 г. Т.М.Каробушкінай упершыню быў абследаваны курганны могільнік каля в. Шэбрын, які налічваў трынаццаць насыпаў з пяску вышынёй 4—6 м, дыяметрам 0,4—12 м. У 1983 г. ёю было раскапана два курганы. Пахаванні зроблены па абрадзе трупаспалення. Рэшткі з пахавальнага вогнішча былі прынесены на месца насыпаў курганоў. У адным кургане рэшткі з пахавальнага вогнішча (вугальна-попельны пласт) знаходзіліся ў чатырох ямках на гарызонце. Апрача таго, па лініі ўсход—захад ляжала апаленае дрэва, пад якім таксама знаходзіліся рэшткі вогнішча. Сярод іх былі выяўлены кавалак перапаленай косці і фрагмент таўстасценнага ляпнога гаршка. Не цалкам спаленае дрэва даўжынёй 0,8 м было прынесена з вогнішча разам з рэшткамі пахавальнага вогнішча і пакладзена ў тым напрамку, у якім павінен быў ляжаць нябожчык. Як правіла, славяне ў больш познія часы, калі абрад трупаспалення быў заменены абрадам трупапалажэння (XI—XIII ст.), нябожчыка хавалі па лініі ўсход—захад галавой на захад.

У другім кургане рэшткі пахавальнага вогнішча былі рассыпаны на гарызонце будучага кургана. Сярод іх таксама былі знойдзены кавалак глінянага ляпнога гаршка і кавалак косці. Абодва курганы датаваны IX—X ст. на падставе абраду пахавання і знаходак кавалкаў ляпных гаршкоў. Па двух раскапаных курганах нельга вызначыць дату ўсяго могільніка. Магчыма, на ім ёсць больш раннія або, што больш верагодна, больш познія пахаванні. Пакуль што можна толькі дакладна сцвярджаць, што ў IX—X ст. ён ужо існаваў. Не выключана таксама магчымасць, што ўсе пахаванні на могільніку зроблены менавіта ў гэты час.

Праведзеныя раскопкі курганных пахаванняў на тэрыторыі Беларускага Пабужжа даюць падставу зрабіць вывад, што пахавальны абрад трупаспалення ў XI ст. быў заменены паступова абрадам трупапалажэння. Калі ў канцы X—пачатку XI ст. сустракаецца яшчэ трупаспаленне або часткo-

вае спаленне, характэрныя для пераходнага перыяду, то пазней яны цалкам былі заменены трупапалажэннем, пры якім нябожчыка хавалі ў насыпе кургана, на гарызонце, або ў невялікай падкурганнай яме.

Важнасць вывучэння пахавальнага абраду заключаецца ў тым, што ён адлюстроўвае рэлігійныя ўяўленні насельніцтва таго ці іншага рэгіёна. Гэта азначае, што вывучэнне пахавальнага абраду дае магчымасць атрымаць даныя аб сацыяльна-эканамічным развіцці грамадства.

Звычай насыпаць над пахаваннем курган бярэ пачатак у глыбокай старажытнасці. Ён быў вядомы яшчэ з эпохі бронзы (2-е тысячагоддзе да н.э.) і існаваў у насельніцтва ўсяго свету (за выключэннем Аўстраліі) на працягу 1-га тысячагоддзя н.э., пакуль у першай палове 2-га тысячагоддзя н.э. не быў заменены грунтавымі ямнымі пахаваннямі.

На тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа ёсць звычайныя курганныя насыпы, а ёсць курганы, абкладзеныя ў падножжы камянямі-валунамі. Такім чынам, адны курганы ад другіх адрозніваюцца толькі абкладкай. Усе астатнія дэталі пахавальнага абраду і суправаджаючыя пахаванні рэчы ў іх аднолькавыя. Шматгадовае вывучэнне дэталей пахавальнага абраду дае падставу меркаваць, што як курганы з абкладкай, так і без яе належаць усходнеславянскаму племю дрыгавічоў. Не выключана, што некаторыя з іх пакінуты другім усходнеславянскім племем валынян. Аб гэтым сведчаць як пахавальны інвентар, так і яго дэталі.

Самым вялікім па колькасці насыпаў курганным могільнікам не толькі на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа, але і ва ўсёй Брэсцкай вобласці з'яўляецца могільнік каля х.Гуркі, які налічвае 173 насыпы. Больш таго, на тэрыторыі Беларусі такіх могільнікаў няшмат. Звычайна ў курганнай групе налічваецца ад аднаго да дзесяці курганных насыпаў. Калі ў групе больш за гэтую колькасць, то могільнік лічыцца вялікім. У асноўным на могільніку курганы размешчаны кампактна. Паводле пісьмовых крыніц ён вядомы з XIX ст. Упершыню абследаваў яго К.Салевіч у 1937 г., а ў 1958 г. — І.В.Біруля, у 1980 і 1985 гг. абследавала Т.М.Каробушкіна. У 1960 г. І.В.Біруля раскапаў 14 курганоў, у 1986 і 1990 гг. Т.М.Каробушкіна вывучыла 11 насыпаў. З 25 вывучаных курганоў пахаванні выяўлены толькі ў 12 насыпах. Курганы без пахаванняў насыпаны з улікам усіх бакоў тагачаснага пахавальнага абраду. У некаторых з іх апрача кавалкаў ганчарнага посуду знойдзены вугольле, попел. А ў адным з такіх курганоў была расчышчана куча апаленых жалудоў, якія ляжалі асобна ад кучы вугольля. Можна меркаваць, што яны з'яўляліся своеасаблівым сімвалам пры пахаванні. Пахавальны абрад — трупапалажэнне, пад некаторымі пахаваннямі расчышчана вугольна-попельная падсыпка.

Сярод іншых звяртае на сябе ўвагу адзін курган, у якім быў пахаваны мужчына 25—30 гадоў, у чэрапе якога было дзве круглыя адтуліны. Каля кісці яго рукі быў знойдзены нож, па памерах большы за звычайны, у насыпе кургана — невялікі фрагмент шпоры. Верагодна, што гэта пахаванне воіна, які загінуў, аб чым яскрава сведчаць адтуліны на чэрапе, якія хутчэй за ўсё і з'явіліся прычынай смерці. У абкладцы кургана налічвалася сто невялікіх валуноў. У адрозненне ад звычайнай заходняй арыенціроўкі ён меў усходнюю. Улічваючы дэталі пахавальнага абраду і знаходкі, ёсць падстава меркаваць, што гэта пахаванне воіна, магчыма, немясцовага паходжання. У іншых курганах знойдзены кавалкі рыфленага глінянага посуду, глінянае прас-

ліца, сярэбраны віты пярсцёнак, нажы. Атрыманы матэрыял дае падставу датаваць курганны могільнік XI—XIII ст.

Каля в. Малыя Зводы размешчаны курганны могільнік, які складаецца з 19 насыпаў з каменнай абкладкай вышынёй 0,2—0,5 м, дыяметрам 3—5,5 м. Абследаваны Ю.У.Кухарэнкам у 1976 г., Т.М.Каробушкінай у 1980 і 1985 гг. У 1981—1983 гг. яна даследавала на могільніку дзесяць курганоў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне галавой на захад у падкурганных ямах глыбінёй ад 0,3 да 1,1 м. У курганах сустракаюцца вуголле, попел. Прасочаны рэшткі трун. Звычайна ў кургане пахаваны адзін чалавек, але на гэтым памніку ў двух курганах былі расчышчаны двайныя пахаванні. У адным з іх, у якім было пахавана два мужчыны, знойдзены вялікі ганчарны гаршчок, упрыгожаны прамымі лініямі. У другім пахаванні разам з дарослым была пахавана дзяўчынка 6—7 гадоў, каля якой ляжала бронзавае плоскае скроневае кольца. Па два бронзавыя паўтараабаротныя скроневыя кольцы былі ў жаночым пахаванні. Пры другім дзіцячым пахаванні 7—7,5 гадоў каля ступняў ног знойдзена ніжняя частка гаршка, які быў разбіты яшчэ ў старажытнасці і ад яго засталося толькі днішча і невялікая частка сценак. Такім чынам, атрымалася нешта накшталт гліняной міскі. Знойдзеныя ў кургане рэчы і пахавальны абрад даюць падставу датаваць могільнік XII—XIII ст. Большасць пахаванняў зроблена ў трунах. Беднасць пахавальнага інвентару тлумачыцца нізкім маёмасным узроўнем насельніцтва. Аб гэтым сведчыць той факт, калі нябожчыку ставілі разбіты гаршчок. Былі ў той час выпадкі, калі гліняны посуд разбівалі ў час пахавання і кавалкі ад яго кідалі ў насып будучага кургана. Тут жа зусім іншая справа. Рэшткі гаршка былі пастаўлены родзічамі нябожчыка спецыяльна хутчэй за ўсё з-за адсутнасці для гэтай мэты цэлага посуду, які, можа, і быў у сям'і, але быў патрэбны для штодзённага ўжытку. Гэты факт гаворыць сам за сябе. Апрача таго, з увядзеннем у 988 г. кіеўскім князем Уладзімірам Святаславічам хрысціянства сталі класці нябожчыку з цягам часу ўсё меней рэчаў, бо гэта супярэчыла новай рэлігіі, якая няхай паступова, але ўпэўнена распаўсюджвалася на тэрыторыі Усходняй Еўропы, пакуль не атрымала поўную і канчатковую перамогу. Але шлях да гэтага быў працяглы. Хрысціянская рэлігія была і супраць насыпання курганоў. Па яе канонах нябожчыка трэба было хаваць у яме, але прайшло некалькі стагоддзяў, пакуль людзі адмовіліся ад насыпання курганоў. Аднак уплыў хрысціянства мы заўважаем ужо пры насыпанні курганоў у XII—XIII ст. каля в.Малыя Зводы. Калі ў больш раннія часы нябожчыка хавалі ў насыпе кургана або клалі на гарызонце і толькі потым насыпалі курган, то на гэтым помніку спачатку выкопвалі яму глыбінёй 0,3 м, а потым 1,1 м, а ўжо затым ставілі ў яе труну з нябожчыкам і толькі пасля гэтага насыпалі курган. На тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа — гэта адзін з самых пазнейшых курганных могільнікаў, якія вывучаліся да гэтага часу. Асобныя позніе курганы ёсць на кожным могільніку, але на іх заўсёды ёсць і больш раннія курганы, а тут усе курганы адносна позніе. Вывучэнне курганных помнікаў гэтай тэрыторыі дае падставу сцвярджаць, што некаторыя могільнікі дзейнічалі ад некалькіх соцень гадоў да тысячы і болей. І гэта дае магчымасць прасачыць, якія змены адбываліся ў пахавальным абрадзе насельніцтва дадзенай мясцовасці.

Пахавальны абрад, яго змена або змена яго асобных дэталей маюць важнае значэнне для ўстанаўлення

даты не толькі асобных курганоў, але і ўсяго могільніка і не могуць разглядацца паасобку. Калі ў курганах адсутнічаюць рэчы, якія маюць цвёрдае датаванне, тады даследчык вымушаны датаваць яго выключна па дэталях пахавальнага абраду.

Але, нягледзячы на адносную беднасць, пахавальны інвентар на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа даволі разнастайны. Праўда, жаночыя пахаванні больш багатыя, чым мужчынскія. У мужчынскіх пахаваннях трапляюцца кавалкі гліняных гаршкоў, зрэдку і цэлыя, нажы, крэсівы, цвікі, паясныя спражкі. Часам — упрыгожанні ў выглядзе металічных пярсцёнкаў, кольцаў з дроту, якія насілі замест пярсцёнкаў.

У жаночых пахаваннях сустракаюцца часцей за ўсё кераміка, скроневыя кольцы, пацеркі, пярсцёнкі і калінікалі нават нажы. Сярод жаночых упрыгожанняў ёсць такія, якія былі распаўсюджаны на значнай тэрыторыі. Да іх адносяцца драцяныя паўтараабаротныя скроневыя кольцы, скроневыя кольцы з S-падобным завітком на канцы, але ёсць і такія, якія з'яўляюцца этнавызначальнымі для таго ці іншага племя. Калі названыя скроневыя кольцы былі шырока распаўсюджаны не толькі ва ўсходнеславянскіх плямёнаў, але і заходнеславянскіх, то зерневыя ажурныя пацеркі і трохпацеркавыя скроневыя кольцы з такіх пацерак характэрны толькі для ўсходнеславянскага племя дрыгавічоў. Іх каркас рабілі з бронзавага дроту, на які напайвалі невялікія сярэбраныя круглыя шарыкі. Пацеркі мелі багаты і прывабны выгляд. Несумненна, каштавалі яны дорага, бо іх маглі вырабляць высокакваліфікаваныя ювеліры. У сувязі з гэтым знаходзяць іх у курганах вельмі рэдка. Але на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа яны знойдзены ў некалькіх могільніках. Іншы раз нават разам з трохпацеркавымі ажурнымі скроневымі кольцамі.

Пры этнічным вызначэнні насельніцтва таго ці іншага рэгіёна бярэцца даволі значная тэрыторыя. Пры гэтым улічваюцца не толькі этнавызначальныя жаночыя ўпрыгожанні, але і багаты заўсёды керамічны матэрыял, разнастайныя рысы пахавальнага абраду. Толькі з улікам цэлага шэрагу даных вучоныя вырашаюць гэтае складанае пытанне. Тэрыторыя Сярэдняга Пабужжа, на думку асноўных яе даследчыкаў, была заселена ўсходнеславянскім племем дрыгавічоў. Несумненна, жылі тут і валыняне.

Разгледзеўшы паселішчы і курганныя могільнікі сельскага насельніцтва, якое складала асноўную частку тагачаснага грамадства, можна атрымаць уяўленне аб сацыяльна-эканамічнай гісторыі рэгіёна. Але яно будзе няпоўным без вывучэння гарадоў.

Узнікненне гарадоў на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа

К канцу X ст. на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа склаліся адпаведныя ўмовы для ўзнікнення тут гарадоў. Гэтыя ўмовы былі створаны ў выніку станаўлення і наступнага росту феадальных адносін у сельскай гаспадарцы. Першым горадам на гэтай тэрыторыі быў Брэст, або Бярэсце, як яго называлі тады. Ён з'яўляецца адным са старажытных гарадоў на тэрыторыі ўсёй сучаснай Беларусі. Раней узніклі толькі Полацк (862) і Тураў (980). Першыя летапісныя звесткі аб Бярэсці адносяцца да 1019 г. Горад быў заснаваны ўсходнімі славянамі як парубежная крэпасць паміж імі і заходнімі славянамі, якія жылі па левы бок Заходняга Буга. З самага пачатку свайго існавання Бярэсце стала

палітычным, эканамічным, адміністрацыйным і культурным цэнтрам усяго Сярэдняга Пабужжа. Аб гэтым сведчаць археалагічныя матэрыялы, размешчаныя ў музеі старажытнага горада «Бярэсце».

Пытанне аб вызначэнні этнічнай прыналежнасці тагачаснага сельскага насельніцтва вакол Бярэсця было вырашана пасля археалагічнага вывучэння паселішчаў і курганоў. Высветлена, што сельскае насельніцтва таксама належала да ўсходніх славян, якія з'явіліся на Сярэднім Пабужжы яшчэ ў VI—VII ст. н.э. Гэты факт дае падставу ўпэўніцца ў тым, што першыя гарады ўзнікалі не як апорныя ваенныя крэпасці сярод іншаэтнічных груп насельніцтва, а ў сваім усходнеславянскім асяроддзі. Гэта спрыяла хуткаму будаўніцтву і развіццю горада. На працягу доўгага часу Бярэсце было адзіным усходнеславянскім горадам на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа і, мяркуючы не толькі па пісьмовых, але і па археалагічных крыніцах, паспяхова спраўлялася са значнай і рознабаковай ролю, якая была яму адведзена ў жыцці ўсяго насельніцтва Сярэдняга Пабужжа.

Спачатку Бярэсце ўваходзіла ў склад магутнага Тураўскага княства, якое атрымаў у спадчыну Святаполк ад свайго бацькі кіеўскага князя Уладзіміра. Несумненна, гораду была падпарадкавана ўся бліжэйшая сельская акруга. Святаполк імкнуўся выдзеліць Тураўскае княства са складу Вялікага княства Кіеўскага і, больш таго, заняць пасля бацькі кіеўскі прастол. Пачалася доўгая барацьба з галоўным прэтэндэнтам на кіеўскі трон наўгародскім князем Яраславам, які пад выглядам помсты за забітых братоў Барыса і Глеба вёў са Святаполкам жорсткую і крывапралітную барацьбу, якая праходзіла з пераменным поспехам. Брэст трапіў на старонкі летапісных крыніц у сувязі з гэтай барацьбой за ўладу двух сыноў Уладзіміравых. У 1019 г. Святаполк быў разбіты на р.Альце пад Пераяславам і спадзяваўся знайсці паратунак і дапамогу ў цесця —польскага караля Баляслава I. Але, як паведамляе летапісец, захварэў і не мог рухацца і яго «на косилех... принесоша... к Берестью». Вось так увайшоў горад у гісторыю. На працягу 20—30-х гадоў XI ст. кіеўскія князі неаднойчы здзяйснялі паходы на тэрыторыю Сярэдняга Пабужжа. У сваю чаргу польскія каралі імкнуліся аказаць уплыў на гэту тэрыторыю і таму вялі ўзброеную барацьбу супраць кіеўскіх князёў, якая не спынілася і ў другой палове XI ст. У «Павучанні» Уладзіміра Манамаха, якое пакінуў сваім нашчадкам гэты князь, ёсць звесткі аб тым, што польскія каралі зрабілі спробу сілай уключыць Бярэсце ў склад сваёй дзяржавы, але спроба не ўдалася і землі Сярэдняга Пабужжа працягвалі належаць тураўскаму і кіеўскаму князям. У пачатку XII ст. сын уладзімірскага князя Яраполка Яраслаў, які не атрымаў спадчыны, двойчы спрабаваў захапіць Бярэсце і стварыць тут самастойнае княства. Але абодва разы (1101—1102) спробы не мелі поспеху.

Пасля смерці князя кіеўскага і тураўскага Святаполка Ізяславіча ў 1113 г. Тураўскае княства не было перададзена яго сыну Яраславу, а пакінута ва ўладанні кіеўскага князя Уладзіміра Усеваладавіча. Спроба сілай устанавіць свае правы Яраславам Святаполчычам не мела поспеху. Ён загінуў пад сценамі Уладзіміра, на які хацеў аднавіць правы. З яго смерцю скончылася барацьба нашчадкаў кіеўскага князя за ўладанне Уладзімірскім і Тураўскім княствамі. Пасля смерці Уладзіміра Усеваладавіча ў 1132 г. Бярэсце і яго наваколле дасталіся яго сыну Усеваладу Уладзіміравічу, які некаторы час быў

нават князем кіеўскім, але не ўтрымаўся і страціў свае гарады, якія вымушаны быў вяртаць з дапамогай ваеннай сілы. Пасля гэтага Бярэсце зноў было вернута ў склад Тураўскага княства. Наступныя гады праходзяць у барацьбе паміж прэтэндэнтамі на кіеўскі прастол. Княжацкія міжусобіцы, пастаянная барацьба паміж нашчадкамі вялікіх князёў настолькі аслабілі іх уладу, што яе ўладанні паступова сталі памяншацца. К сярэдзіне XII ст. стала набіраць моц Валынскае княства. Яго роля яшчэ больш узрасла, калі ў канцы XII ст. (1198) князь Раман Мсціславіч далучыў да яго яшчэ і Галіцкае княства. Яму нават удалося захапіць Кіеў і пасадзіць на яго прастол сваіх стаўленікаў. У такіх абставінах Бярэсце з сярэдзіны XII ст. падпадае пад уладу Валынскага княства. Пачалася працяглая барацьба Рамана Мсціславіча і яго нашчадкаў за замацаванне сваёй улады не толькі на Валыні, але асабліва на Галіччыне, дзе ён змагаўся з галіцкімі баярамі. Ён вёў таксама барацьбу з яцвягамі і літоўцамі, і гэта не магло не паўплываць адмоўна на берасцейскія землі ў сувязі з іх пагранічным размяшчэннем. У гэтай сітуацыі Бярэсце і яго наваколле не змаглі вылучыцца ў самастойнае княства, а да пачатку XIV ст. заставаліся ў складзе Валынскага княства, пакуль у 20-я гады XIV ст. не былі ўключаны ў склад моцнага Вялікага княства Літоўскага.

Т.М.Каробушкіна.

Крыніцы:

1. Белящевский Н.Ф. Дюнные стоянки на берегах р.Западного Буга в среднем его течении. //Труды одиннадцатого Археологического съезда в Киеве 1899 г. Т.1. М., 1901.

2. Scmit Z. Badania osadnictwa epoki kamicknej na Podlasik. //Wiadomości Archeologiczne. Warszawa, 1929. T.10.

3. Кухаренко Ю.В. Средневековые памятники Полесья. САИ. Вып. Е-1-57. М., 1961.

4. Лысенко П.Ф. Берестье. Мн., 1984.

5. Полное собрание русских летописей. Т.2. М.; Л., 1961.

6. Коробушкина Т.Н. Курганы Белорусского Побужья X—XIII вв. Мн., 1983.

7. Коробушкина Т.Н., Саливон И.И. Сельское население Среднего Побужья IX—XIII вв. (по материалам курганных могильников). //Советская археология. 1990. № 3.

Берасцейскія землі ў старажытнасці

Вялікае значэнне для ўзнікнення паселішчаў на берасцейскіх землях меў пераход ад падсечнага да ворыўнага земляробства, які адбыўся да X ст. Пры падсечна-агнявым метадзе апрацоўкі зямлі лясы і кустарнікі высякаліся, а пасля прасыхання спальваліся, таксама ж выпальваўся і дзёрн. Попел быў цудоўным угнаеннем для бедных гумусавым слоем падзолістых лясных глеб. Пры гэтым збожжа можна было збіраць 1—2, радзей 3 гады, а затым зямля закідвалася на трыццаць—сорак і болей гадоў. Людзі, якія яе апрацавалі, перасяляліся на новае месца.

Развіццё прылад працы дазволіла перайсці да ворыўнага земляробства. Паравая сістэма, якая выкарыстоўвалася пры гэтым, павялічыла ўрадлівасць зямлі ў 10—15 разоў. Карэнным чынам змяніліся адносіны земляробаў да апрацоўваемага поля. Знікла неабходнасць праз некалькі гадоў шукаць новае месца для жыцця, і характар селішчаў стаў пастаянным. Менавіта ў гэты час узнікаюць «весі», з якіх потым выраслі некаторыя сучасныя вёскі.

Ворыўнае земляробства стала важнай умовай для з'яўлення адасобленай гаспадаркі малой сям'і. Такія

сем'і, аб'яднаныя на аснове агульнасці гаспадарчага жыцця, стваралі сельскую тэрытарыяльную (суседскую) абшчыну — верв, у аснове якой ляжалі ўзаемныя эканамічныя інтарэсы.

Акрамя «весей» існавалі і больш буйныя паселішчы, так званыя пагосты, у якіх быў сканцэнтраваны збор феадальнай даніны. Верв жа магла ахопліваць і некалькі старажытных вёсачак. У гэтым выпадку хутчэй за ўсё пагост і быў цэнтрам верві.

Заняткі жыхароў Берасцейшчыны ў X—XIII ст. ні ў чым прынцыпова не адрозніваліся ад іншых рэгіёнаў Кіеўскай Русі. Асноўнай крыніцай існавання было земляробства. Галоўнымі культурамі былі жыта, пшаніца, ячмень, у значна меншай ступені — авёс, проса, грэчка, бабовыя, віка, лён, каноплі. Займалася насельніцтва і іншымі відамі сельскагаспадарчай працы — агародніцтвам: шырока былі распаўсюджаны капуста, рэпа, агуркі, буракі, рэдзька, морква і цыбуля; садоўніцтвам: пісьмовыя і археалагічныя матэрыялы зафіксавалі развядзенне яблынь, сліў, груш, вішань; жывёлагадоўляй, якая, праўда, ва ўмовах абмежаванай колькасці пашаў не мела вялікага значэння. Распаўсюджанымі былі таксама паляванне, рыбалоўства і бортніцтва.

Пачынаючы з X ст. у жыцці жыхароў Берасцейшчыны адбываецца яшчэ адна найважнейшая змена — пераход ад язычніцтва да хрысціянства. Язычніцкі светапогляд селяніна Усходняй Еўропы склаўся яшчэ ў 2—1-м тысячагоддзях да н.э. і да X ст. існаваў у жыхароў гэтых мясцін. Прыняцце хрысціянства хутчэй ішло ў гарадах, значна павольней у сельскай мясцовасці. Асабліва гэта бачна на змене абраду пахавання. Даследаванне гэтага абраду па матэрыялах Брэсцкага раёна зрабіла Т.М.Каробушкіна. Па яе высновах,

Смерды на раллі. Мініяцюра XV ст. Радзівілаўскі летапіс.

толькі з пачатку XI ст. тут праходзіць расцягнуты па часе пераход ад абраду язычнікаў — крэмацыі памерлага з наступным захаваннем астанкаў у курган — да хрысціянскага абраду. Хутчэй за ўсё ў XII ст. значная большасць селішчаў на тэрыторыі сучаснага Брэсцкага раёна была хрысціянская.

Аб колькасці насельніцтва, якое жыло ў той час на тэрыторыі раёна, гаварыць практычна немагчыма. Але, відавочна, яна была вельмі малая. Для ўсёй Кіеўскай Русі даследчыкі, выкарыстоўваючы розныя методыкі падліку, называюць лічбу ад чатырох з паловай да васьмі мільёнаў чалавек у X—XI ст. Тым больш што гэта лічба значна мянялася ў выніку розных абставін, у тым ліку ад недароду альбо гібелі ўраджаю. Летапісы даволі часта згадваюць такія падзеі — у 1024 г. быў «голод в всей стране», у 1127 г. «осень поби морозъ все об обилье і бысть голод чресъ зиму», у 1228 г. «ядяхуть людие листъ липовыни, кору березову, инше мояиць истолкше, мятуче с пелми и с соломою; инше ушь, мож, конину: и тако друг с другом падаше мертв от глада, трупие по улицам, по торгу, по путем, всюду и пояше наимитов возити мертвых из города». Маразы, якія знішчылі пасевы, адзначаюцца ў 1230 г., у 1094 г. — страшнае нашэсце саранчы, пра якое «не бе сего слышано во днех первых в земле Руис-

Князь Даніла Галіцкі.

кой»; у 1279 г. — катастрафічны неўраджай «и в Руси, и в Ляхох, и в Литве, и в Ятвезех». Пасля гэтакіх катаклізмаў насельніцтва, якое было не ў сілах супрацьстаяць стыхійным бедствам, значна скарачалася.

Але яшчэ больш людзей гінула ў шматлікіх войнах, якія амаль бесперапынна каціліся па тэрыторыі Берасцейшчыны. На працягу ўсёй гісторыі гэты край быў пагранічны, а таму «прывабны» для ўладароў суседніх краін. І палітычная гісторыя Берасцейскай зямлі ў асноўным уяўляе сабой пераход пад уладу ад аднаго да другога манарха, прычым такі пераход быў звязаны з ваеннымі дзеяннямі.

Летапісы паведамляюць, што ў 1227 г. «повоеваша Ятвязи около Берестия». На дапамогу жыхарам кінуліся з дружынай валынскія князі Даніла і Васілька Раманавічы. Непадалёку ад Бярэсця атрады яцвяжскіх князёў Сцегута, Шутра і Небра былі разбітыя: «... и убьен бысть Данилом и Вячеславом Шютр, а Стегут убьен бысть Шелвом. Бежащим же Ятвязем, угони я Данил, Небра язви четырми ранами, древо же вышибе колье из руки его. Василькови же угонившю его, клик бысть велик: брат ти бьется назади... Обратися брату на помощь; ономy же [Небру] сим утекшю; а инии разбегошась...». (Шелв — воевода, Вячеслав — боярин волынские. — *Ю.Р.*)

Пазней каля Бярэсця зноў адбылася бойка з яцвягамі. Даніла і Васілька Раманавічы, выпраўляючыся ў паход у Польшчу, «остависта же у Берестни Володимира Пиньского и Оугровьчаны и Берестьяны сберечи земли от ятвязь... Володимир же... изыиде на не и Берестьяны вси избиша е все...».

Кровапралітная бітва ў гэтых мясцінах адбылася ў 1240 г. Пад час мангола-татарскага нашэсця галіцка-валынскія князі апынуліся ў Польшчы. Пасля адыходу татар Раманавічы вяртаюцца ва Уладзімір-Валынскі і па дарозе заязджаюць у Бярэсце: «Данилови же со братом пришедшу ко Берестью, и не возмогоста ити в поле, смрада ради и множьства избьеных». «Смрад» і «множьство избьеных» былі не ў горадзе, а ў полі, гэта значыць, недзе на тэрыторыі сучаснага Брэсцкага раёна. Лічыцца, што гэтая бітва берасцейцаў адбылася з мангола-татарамі.

Яшчэ адно ўпамінанне аб нападзе ворагаў, якое можна адназначна звязаць з Брэсцкім раёнам, адносіцца да 1282 г. Тады «...Ляхове воеваша у Берестья по Кросне и взяша сел десять и поидоша назад». На дапамогу сялянам кінуўся атрад берасцейцаў на чале з ваяводам Цітам. У сечы перамога была за нашымі землякамі, і яны «полон свои отнимаша, и тако придоша во Берестии с честью, славяче Бога и пречистую яго Матерь во вся век». На гэты раз жыхарам «весей» і пагостаў Берасцейшчыны пашанцавала.

Але так было далёка не заўсёды. Войны, набегі, пастоі войскаў падрывалі эканоміку сельскага жыхара. А паколькі менавіта ён быў у X—XIII ст. асноўным стваральнікам матэрыяльнага дабрабыту феадальнай дзяржавы, то і самі старажытнарускія княствы прыходзілі ў заняпад. Цяжкі гнёт мангола-татар і пастаянныя міжусобіцы, узрастаючая моц

суседніх дзяржаў — усё гэта стварыла ўмовы для пераходу Берасцейскай зямлі пад уладу Вялікага княства Літоўскага.

* * *

Гісторыя не захавала ў поўнай меры да нашага часу паданні ўсходніх славян да прыняцця хрысціянства. Але вызначыць іх можна дзякуючы фальклорнаму матэрыялу і, у першую чаргу, археалагічным знаходкам. Адна з такіх знаходак, звязаных са светапоглядам берасцейцаў дахрысціянскай эпохі, выяўлена на тэрыторыі сучаснага раёна. У 1955 г. жыхар вёскі Астрамечава А.Мацвеюк паблізу праўлення калгаса на глыбіні 60 см знайшоў галаву каменнага ідала.

Але дакладна сказаць, якому язычніцкаму богу адпавядаў Астрамечаўскі ідал, немагчыма. Сістэма багоў у нашых продкаў была наступная. Найвышэйшыя: Дзіў, Род, Сварог, Стрыбог, Святавіт. Далей ідуць: Дажбог, Каляда, Ярыла, Сура, Велес — гэта Сонца пад рознымі назвамі, Пярун — бог грому і маланкі, Купала — бог дастатку і ўраджаю, Вярба — багіня вясны, Тур — бажаство дзікіх звяроў, Лада — багіня кахання, Цёця — багіня асенняга ўраджаю, Парадзіха — жаночы пачатак жыцця, Жыжаль — бог агню, Пераплут — бог весялосці. Акрамя таго, былі яшчэ розныя духі дабра і зла. Галоўным жа бажаством на Беларусі пад час хрышчэння лічыўся Пярун.

Але Астрамечаўскі ідал мог і не быць выявай якога-небудзь бога. Бо ў нашых продкаў ідалаў-куміраў рабілі таксама ў гонар памерлых старэйшын і герояў. Адпраўленне ж культаў рабілася жрацамі, але ёсць меркаванні, што ідальская служба адпраўлялася таксама і князямі, племяннымі і родавымі старэйшынамі.

Ю.С.Рубашэўскі.



Астрамечаўскі ідал.

Крыніцы:

Іоў А.В. Этнічны склад насельніцтва Заходняга Палесся ў X—XIII ст. (па матэрыялах сельскіх паселішчаў). У зб.: Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992.

История крестьянства СССР. М., 1990. Т. 2.

Карамзин Н.М. История государства Российского. М., 1991. Т. 1.

Коробушкина Т.Н. Курганы Белорусского Побужья X—XIII вв. Мн., 1993.

Лысенко П.Ф. Берестье. Мн., 1985.

Рыбаков Б.А. Мир истории. М., 1984.

Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. Мн., 1990.

Дучык А., Кушнір А. Старажытныя выявы // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1987. № 4.

Тарасаў К.І. Памяць пра легенды. Мн., 1990.

БЕРАСЦЕЙШЧЫНА Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

У 1316—1319 гг. уладаром Берасцейшчыны стаў вялікі князь літоўскі Гедзімін. Ён імкнуўся выкарыстаць выгаднае становішча Брэста для захопу Валыні (1320) і паходаў на Украіну. Пасля гэтыя землі перайшлі да князя Кейстута. У 1349 г. частку Берасцейскай зямлі часова займаў польскі кароль Казімір Вялікі (захапіў Брэст і наваколле пасля 9-дзённай аблогі), але ў 1351 г. Альгерд адабраў горад і вярнуў Кейстуту. Трактат 1366 г. на доўгі час устанавіў панаванне літоўскіх князёў. Далучэнне да Літвы выклікала набегі крыжакоў, якія спустошвалі гэты край у імкненні аслабіць Літву. Першы набег пад камандаваннем Тэадора фон Эльнера, комтура з Бальгі, адбыўся ў 1375 г. і ахапіў Камянец-Літоўскі з наваколлем. Забраўшы вялікую колькасць палонных, коней і іншай жывёлы, крыжакі не пайшлі далей на поўдзень. У 1378 і 1379 гг. яны разрабавалі наваколле Брэста, а ў жніўні 1379 г. спалілі горад, але не здолелі захапіць замак. Узяўшы здабычу і палонных, крыжакі спустошылі ўсё ўзбярэжжа рэк Буг і Нараў ад Брэста да Гродна. Дагавор Ягайлы і Кейстута з Тэўтонскім ордэнам у верасні 1379 г. прадугледжваў забеспячэнне Берасцейшчыны на 10 гадоў ад набегаў крыжакоў.

Пад час міжусобнай вайны Ягайлы з Кейстутам у 1382 г. Януш, князь Мазавецкі, захапіў Камянец і іншыя гарады Берасцейшчыны. Але ў наступным годзе Ягайла адабраў гэтыя землі і ў 1384 г. аддаў іх Вітаўту. Калі ж Вітаўт памірыўся з крыжакамі і распачаў набегі на Літву, Ягайла ў 1390 г. пасля 10-дзённай аблогі захапіў Брэсцкі замак з наваколлем і пакінуў тут польскі гарнізон Гінчы з Рогава. У наступныя гады гэтыя землі зноў адыходзяць да Вітаўта. Пасля смерці Вітаўта ў 1430 г. уладаром Берасцейшчыны становіцца князь Жыгімонт Кейстутавіч, правы якога аспрэчваў Свідрыгайла. Вайна паміж Свідрыгайлам у саюзе з княжатамі і Жыгімонтам скончылася перамогай апошняга (яму дапамаглі мазавецкія князі). Яшчэ пры Жыгімонце на сейме 1440 г. у Брэсце было вырашана, што берасцейскія землі павінны адысці да Казіміра Ягелончыка. Пасля смерці Жыгімонта яго сын Міхаіл не прызнаў гэтага рашэння, але мусіў падпарадкавацца і прысягнуў вялікаму князю літоўскаму.

З 1520 г. тэрыторыя сучаснага Брэсцкага раёна была часткай павета Падляшскага ваяводства, а з 1566 г. уваходзіла ў склад Берасцейскага павета Берасцейскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ). (У 1569 г. была заключана Люблінская унія, у выніку якой Вялікае княства Літоўскае і Польшча аб'ядналіся ў федэратыўную дзяржаву — Рэч Паспалітую.) У канцы XVI ст. тут налічвалася каля 40 населеных пунктаў. Прыкладна палова з іх былі шляхецкімі ўладаннямі (Зводы, Церабунь, Лышчыцы, Астрамечава, Выстычы, Чарнаўцы, Чэрні, Ямна, Булкава, Радванічы, Камяніца, Кацельна, Страдзеч, Медна, Збунін, Чэрск і інш.), каля 10 належалі праваслаўнай царкве (Владава, Камароўка, Кодзень, Трышын і інш.), 8 — дзяржаве (Прылукі, Рэчыца, Збірогі, Скокі, Яцковічы, Велямовічы, Сычы, Гершановічы) і адзін — Камяніца — касцёлу[1]. (Тут і далей па тэксце лічбай абазначаны спасылкі на крыніцы, спіс якіх змешчаны ў канцы раздзела.)

Геаграфічнае становішча Брэсцкага раёна вызначыла яго вельмі знач-

ную ролю ў гандлёвых сувязях ВКЛ з Польшчай, Масквой і Украінай. Праз Смаленск, Оршу, Барысаў, Слонім і Брэст ішоў стары гандлёвы шлях з Масквы ў Польшчу. Дарога праз Вільню — Ваўкавыск — Камянец — Брэст — Луцк звязвала Прыбалтыку з Крымам і Турцыяй[2]. З канца XV ст. існавала дарога паміж Брэстам і Пінскам. «Вялікай дарогай», якою «яко гостинцем великим на каждый час многие ездят», называе ў 1541 г. князь Палубінскі тракт праз Брэст і наваколле на Ламазы ў Польшчы. «Гасцінцамі» (г.зн. гандлёвымі шляхамі) названыя ў 1599 г. дарогі Брэст — Кобрын і Брэст — Камянец.

Велізарнае значэнне меў магістральны гандлёвы шлях Орша — Брэст даўжынёй больш за 500 км, які ў дакуменце 1619 г. называецца «большим главным гостинцем, который идёт из ВКЛ до Люблина», па ім «крупные купцы с тяжёлыми товарами часто проезжают». Гэты тракт праходзіў і па берасцейскіх землях. Дарога з Любліна да Вільні ў 1609 г. праходзіла праз Брэст і Чарнаўчыцы. Дарога Нясвіж — Брэст ішла праз Чарнаўчыцы і Брэст на Кодзень і Владаву[3].

У XVI—XVIII ст. Брэст быў буйным цэнтрам рамяства і гандлю і меў цесную сувязь са сваімі прыгарадамі і сельскагаспадарчым раёнам. Сярод гараджан шырокае распаўсюджанне атрымалі сельскагаспадарчыя заняткі. Як сведчаць інвентарныя кнігі XVI—XVII ст., кожны гараджанін меў агароды, сенакосы, выганы, палеткі, сады ў гарадскіх прадмесцях. Напрыклад, у XVII ст. жыхары Брэста мелі зямельную норму ў 10 моргаў, ці 1 рэз[4].

Аднак далёка не ўсе гараджане карысталіся сваімі зямельнымі надзеламі. У брэсцкіх магістрацкіх кнігах за 20—40-я гады XVII ст. часта сустракаюцца такія запісы: «Селянін сяла Плоскае «працовиты Демьян Червякович» купіў 2 рэзы поля; а іншы селянін таго ж сяла, «працовиты Антон Иванович», купіў у брэсцкага гараджаніна яго рэз поля». Такіх запісаў дзесяткі. З другога боку, багатыя гараджане — купцы, рамеснікі — часта былі ўладарамі фальваркаў ці арандавалі маёнткі ў Брэсцкім павеце[5]. Нягледзячы на гэта, па падліках гісторыкаў, Брэст мог пракарміць сябе хлебам толькі на 18,8%[6]. Таму галоўным пастаўшчыком прадуктаў харчавання былі жыхары навакольных вёсак.

У другой палове XVI ст. Берасцейшчына зрабілася цэнтрам рэфармацыйнага руху, а затым — аб'ектам экспансіі каталіцкай царквы. У 1564 г. Мікалай Радзівіл заснаваў на правым беразе р.Буг дзве лютэранскія сельскагаспадарчыя калоніі для «вольных галендраў» (галандцаў-пратэстантаў) — Нейдорф і Нейброў. Першая знаходзілася за 2—3 км на захад, а другая — за 5—6 км на паўночны захад ад вёскі Дамачава. Фрагментарныя і недакладныя звесткі пра іх можна знайсці ў нарысе вядомага беларускага этнографа і гісторыка XIX ст. І.К.Кіркора з кнігі «Живописная Россия». Захаваліся і асобныя архіўныя дакументы. Вось што гаворыцца ў тлумачальнай запісцы гродзенскаму грамадзянскаму губернатару за 1821 г.: «...В двух сёлах, называемых Нейбров и Нейдорф, заселённых вольными иностранцами Голендрами по-над рекою Бугом на землях, принадлежащих князю Радзивилу, заключено 273 душ евангельско-лютеранского исповедания... Прибыли сюда в 1564 г.[7]» А вось якую інфармацыю можна знайсці ў пратаколе праверкі правоў чыншавікоў па калоніі Нейброў Дамачаўскай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні ад 24 лютага 1903 г.: «Из представленных поверенным колонистов колонии уполномочен-

ным приговором Нейбровского общества от 15.11.1895 г. Михаилом Андреевичем Гиндельбрантом и поверенным владельца имения Домачево Бутовича дворянином Евгением Викентьевичем Леситым сведений... оказывается, что земли колонии Нейбров составляют собственность землевладельца Г.И.Бутовича, владеющего ими на основании купчей крепости, но земля находится в вечно-чиншевом пользовании колонистов колонии Нейбров с 1564 г.»[8]

Аднак ужо на пачатку XVII ст. пачынаецца выкараненне «ератычнай заразы» і ўмацаванне пазіцый каталіцкай царквы на Палессі. У 1621 г. езуіцкая місія зрабілася рэзідэнцыяй дзякуючы падтрымцы брэсцкага ваяводы Яўстафія Валовіча, які падараваў ёй фальварак Адамкова. У 1623 г. Леў Сапега падараваў езуітам «на основание коллегии, школ и образование молодёжи» фальварак Дзераўная з вёскамі Мольткі і Мяневеж; у 1650 г. ён купіў для калегіі фальварак Паніквы і вёску з той жа назвай. Актыўную раздачу земляў вакол Брэста езуітам працягваў польскі кароль Міхал Вішнявецкі, які 18 кастрычніка 1669 г. падараваў брэсцкай калегіі в.Плоскі з участкам зямлі ў Прылуках для «распространения Божьей хвалы и римско-католической веры». Кароль вызваліў гэтыя землі ад усіх падаткаў, акрамя агульных для Рэчы Паспалітай[9]. Езуіцкія ўладанні пад Брэстам павялічваліся і за кошт пазыкі грошай пад залог шляхецкіх маёнткаў. Так, у 1638 г. шляхціц Павел Асіпоўскі залажыў свой спадчынны маёнтак Кацельня брэсцкай калегіі за 5000 польскіх злотых.

За кароткі тэрмін езуіты зрабіліся ўладальнікамі 269 сялянскіх гаспадарак у Брэсцкім павеце, пабудавалі цагельню і 9 корчмаў. Яны не толькі прадавалі, а і выраблялі спіртныя напіткі[10].

Вынікам актыўнай дзейнасці Ватыкана, Брэсцкай уніі, пастаянных войнаў XVII ст. стала поўная ліквідацыя праваслаўя ў Брэсцкім павеце ў канцы XVIII ст.[11]

Пачынаючы з XIV ст. Брэст і яго наваколле былі арэнай войнаў і паўстанняў. У 1379 г. гэтыя мясціны разрабавалі і спалілі тэўтонскія рыцары. У 1410 г. гараджане і шляхта Брэсцкага павета паслалі пад Грунвальд харугву, якая змагалася супраць войска Ордэна. У 1500 г. Берасцейшчыну разрабавалі войскі крымскага хана Менглі Гірэя. Аднак найцяжэйшымі для жыхароў гэтага краю былі войны XVII ст.: казацкія паўстанні і антыфеадальная вайна 1648—1651 гг., а затым рускапольская вайна 1654—1667 гг., якая прынесла незлічоныя беды.

У 1648 г. сялянскія паўстанні ахапілі Брэсцкі павет. Казацка-сялянскія атрады ўяўлялі сабой вялікую сілу. Шляхціцы Брэсцкага ваяводства на пачатку паўстання здолелі сабраць апалчэнне. Шляхецкія атрады збіраліся ў лагеры каля Брэста, рыхтуючыся выступіць на Кобрын і даць бой сялянскім атрадам. 15 верасня 1648 г. каля вёскі Аркадзія шляхта расстраляла ігумена Свята-Сямёнаўскага праваслаўнага манастыра ў Брэсце — Афанасія Філіповіча.

А.Філіповіч нарадзіўся ў 1597 г. (?) на Берасцейшчыне. З 1620 г. знаходзіўся пры двары Л.Сапегі ў якасці выхавальніка нібыта сына Ілжэдзмітрыя і Марыны Мнішэк Я.Ф.Лубы. Даведаўшыся, што Я.Ф.Луба — ілжэцарэвіч, А.Філіповіч пастрыгся ў манахі пры Віленскім Свята-Духавым манастыры, пасля жыў у манастырах каля Оршы, Кіева, Пінска, у брэсцкім Свята-Сямёнаўскім. У 1637—1638 гг. ездзіў да рускага цара і расказваў яму пра таямніцу ілжэцарэвіча Я.Ф.Лубы. Двойчы быў асланы. У

1644 г. яго арыштавалі і зняволілі ў варшаўскую турму. Яго выразная прамаскоўская пазіцыя адлюстравалася ў «Дыярыушы» («Дзённіку», 1646 г.) — зборніку яго публіцыстыкі. Спрабаваў дапамагаць сялянскім атрадам зброяй і харчаваннем, за што і быў расстраляны[12]. Акрамя А.Філіповіча ў вайсковым абозе брэсцкай шляхты былі расстраляныя яшчэ адзін святар і 15 мяшчан, абвінавачаныя ў падрыхтоўцы паўстання ў горадзе[13]. Уціхамірыўшы Брэсцкі павет, шляхта накіравалася на Кобрын, дзе панесла вялікія страты ў баях з казакамі. Так, каля Вістыч загінуў вялікі атрад брэсцкай шляхты на чале з брэсцкім кашталянам Казімірам Тышкевічам[14]. У сярэдзіне кастрычніка 1648 г. на Берасцейшчыну рушылі войскі Януша Радзівіла на чале з Мірскім. Яны «агнём і мячом» уціхамірылі непакорных сялян вакол Брэста. Сюды ж прыехаў з атрадамі наёмнікаў і шляхты Януш Радзівіл. У канцы лістапада — пачатку снежня 1648 г. у Брэсцкім ваяводстве ішлі бязлітасныя баі паміж паўстанцамі і войскам Радзівіла.Львоўскі падкаморы Мяскоўскі, які праязджаў у пачатку 1649 г. праз Брэст і яго наваколле, заўважыў, што тут «дворы шляхетские все в пепел превращены»[15].

Разгром гэтых мясцін давяршылі атрады нямецкіх, шведскіх і венгерскіх наёмнікаў, якія збіраліся каля Брэста, каб папоўніць войскі Радзівіла[16]. Прыкрыўшы тэрыторыю Беларусі з паўднёвага ўсходу па Прыпяці, Дняпры і Друці ад войскаў Хмяльніцкага, Я.Радзівіл пачаў расправу з беларускімі паўстанцамі. Маскоўскі дзяк Кунакоў паведамляў у шыфраваным данясенні цару: «...А около... Брести-Литовской на палях многие люди, а иные на колье четвертованные... Мещане и пашенные люди от жолнерей в конечном разореньи...»[17]

На чале аднаго з атрадаў Хмяльніцкага, пасланага на Беларусь супраць войскаў Радзівіла, стаяў кіеўскі палкоўнік, паплечнік гетмана Міхаіл Крычэўскі — па паходжанні шляхціц з-пад Брэста. У атрадзе налічвалася 17 500 казакаў. Менавіта М.Крычэўскі камандаваў казакамі ў бітве каля Лоева і не пусціў войскі Радзівіла на Украіну[18].

Разгром войска Б.Хмяльніцкага каля Берасцечка і заключэнне Белацаркоўскай дамовы выклікалі аслабленне вызваленчай барацьбы на Беларусі. У канцы 1651 г. войскі Радзівіла вярнуліся на Беларусь. Вынікі вайны былі жахлівыя. Ужо ў 1649 г. распачаўся голад. Наступны, 1650-ы, год быў таксама неўрадлівы. Акрамя таго, у 1653 г. распаўсюдзілася эпідэмія сыпнога тыфу, якая працягвалася да 1658 г. У 1653 г. Брэсцкі павет не здолеў заплаціць дзяржаўныя падаткі, бо колькасць насельніцтва рэзка скарацілася ў выніку «морового поветрия»[19]. Аднак перадышка была кароткая.

У 1654—1667 гг. Берасцейшчына зрабілася арэнай новай, рускапольскай вайны. У 1655 г. рускія войскі князёў Якава Чаркаскага, Трубяцкога і Васілія Шарамецьева ўварваліся на тэрыторыю Беларусі. Канчатковай іх мэтай быў Брэст[20]. Сярод беларускай шляхты не было адзінства. Спробы сабраць апалчэнне былі марныя. Шляхта Берасцейшчыны, напрыклад, вырашыла заставацца ў межах свайго ваяводства[21]. Самая значная аперацыя маскоўскага войска на Беларусі ў 1655 г. адбылася позняй восенню на Берасцейшчыне. Рускі корпус на чале з ваяводамі С.А.Урусавым і Ю.Баратынскім рушыў на Брэст. 23 лістапада 1655 г. каля р.Лясная (пад Брэстам) войскі Урусава разбілі перадавыя атрады новага гетмана Вялікага княства Літоўскага Паўла Сапегі[22]. Аднак калі маскоўскія войскі перайшлі раку, то

былі разбітыя непадалёк ад Брэста. Урусаў не здолеў захапіць горад. Рускія палкі адышлі за р. Лясную і пачалі адступаць. Сапега ў гэты час абышоў ворага і перакрыў яму дарогу. У апошнія дні лістапада адбылася бітва, якая, згодна з данясеннямі Урусава і Баратынскага, скончылася перамогай рускіх. Аднак левае крыло маскоўскага войска было разбітае[23], і царскія ваяводы, захапіўшы ў Сапегі 4 пушкі і 28 сцягоў, пачалі адступленне на Вільна[24].

У 1656—1657 гг. тэрыторыю Брэсцкага павета разам з горадам захапілі войскі шведскага караля. Заняўшы Кодзень, шведы абрабавалі царкву і парубілі шаблямі абразы. Не кранулі толькі абраз Божай Маці Кодзенскай (Мадонна Грыгарыянская дэ Гвадэлупа), які ў 1631 г. Мікалай Сапега тайна вывез з Рыма. Гэтая ікона збірала ў Кодзень тысячы паломнікаў.

Зімою 1659 г. Берасцейшчыну страшэнна спустошылі рускія войскі князя Хаванскага. Ідучы па тэрыторыі павета, Хаванскі пусціў перад сабой раз'езды, якія спустошвалі і нішчылі гарады і вёскі, рабавалі і палілі цэрквы і шляхецкія двары, людзей секлі і забівалі. Брэст захапілі і спалілі, тое ж адбылося з Камянцом і іншымі мястэчкамі і вёскамі наваколля. Хаванскі і яго людзі размясціліся ў Брэсце і акрузе і пачалі збіраць з бліжэйшых вёсак харчаванне, фактычна зрабіўшы Берасцейшчыну аперацыйнай базай маскоўскага войска[25]. Вынікі вайны былі катастрафічныя. У 1661 г. каралеўскія чыноўнікі дакладвалі ўраду: «... Воеводство Брестское в большей своей части обращено в пепелище и полностью разорено...»[26].

У 1667 г. у Брэсцкім старостве пуставала 55% пашы. Эканоміка павета была ў страшэнным заняпадзе. Нават праз 20 гадоў пасля вайны, у 1679—1680 гг., у Брэсцкай эканоміі было 19% пустэчы[27]. У 1706 г. у разгар Паўночнай вайны шведы зноў спустошылі Брэсцкі павет. Шведскі генерал Меерфельд з гарнізонам заняў Брэст. У 1710—1711 гг. на Берасцейшчыне лютавала маравая пошасць. Сялянскія гаспадаркі гібелі ў бядноце. У 1724 г. у Воінскім ключы Брэсцкай эканоміі з 205 гаспадарак бязвупражных было 41,5%, а напаўвупражных — 32,5%[28]. Патрабаваліся дзесяцігоддзі для адраджэння эканомікі.

Але ў 1733 г. Берасцейшчыну зноў ахапілі ваенныя дзеянні: распачалася барацьба паміж дзвюма магнацкімі групоўкамі, адна з якіх падтрымлівала караля С.Ляшчынскага, а другая, абвясціўшы канфедэрацыю, выступала за саксонскага курфюрста Аўгуста III. Летам 1733 г. для барацьбы з прыхільнікамі С.Ляшчынскага на Беларусь увайшлі рускія войскі. У Брэсце размясціліся 400 казакаў і сібірскі пяхотны полк палкоўніка Давыдава, у наваколлі — полк палкоўніка Кондырава. Карыстаючыся гэтым, прыхільнік Аўгуста III Мікалай Радзівіл, ваявода навагрудскі, прыехаў у свой маёнтак Чарнаўцы, выклікаў усіх ураднікаў і старастаў і запатрабаваў, каб яны прысягнулі Аўгусту III. Але многія з іх не прыйшлі, ухіляючыся ад прысягі. Даведаўшыся пра гэта, палкоўнік Кондыраў выдаў універсал, у якім заклікаў ураднікаў і шляхту прысягнуць Аўгусту III і пагражаў, што непакорных будзе лічыць ворагамі.

Але большая частка шляхты Брэсцкага павета была на баку С.Ляшчынскага. Брэсцкі стольнік Міхаіл Сузін, вельмі паважаны і ўплывовы чалавек, запрасіў найбольш аўтарытэтных у павеце і ваяводстве людзей у Камянец нібыта на набажэнства. Там усе шляхціцы аднагалосна выступілі за канфедэрацыю супраць Аўгуста III і з гэтай нагоды склалі два лісты — маршалку канфедэрацыі Агінскаму

і стражніку генеральнага рэгімента Пацею. Гэтыя лісты даставіў Людвік Тур[29]. Маючы такую падтрымку мясцовай шляхты, войскі канфедэратаў рушылі на Брэст. Але на шляху Чарнаўчыцы — Брэст яны сутыкнуліся з татарамі, што былі на службе ў князя Вішнявецкага, і мусілі адступіць. Вішнявецкі пагнаўся за імі і зайшоў у глыб Літвы. Неўзабаве і руская дывізія пакінула Брэст. Карыстаючыся гэтым, брэсцкая шляхта на сейміку адкрыта далучылася да канфедэрацыі. Маршалкам канфедэрацыі выбралі брэсцкага чашніка Пелку, пісарамі — Сузіна і брэсцкага падчашніка Паўла Бухавецкага, ротмістрамі — Русецкага, брэсцкага канюшага Францыска Бухавецкага, брэсцкага скарбніка Непакойчыцкага і Дамініка Верашчаку[30]. Канфедэраты вырашылі выставіць 500 пехацінцаў з халопаў каралеўскіх эканомій і шляхецкіх маёнткаў. Але пасля гэтую лічбу паменшылі да 200. Войска падзялілі на два атрады, адзін з якіх стаяў у Кобрыне, а другі — у Камянцы. У хуткім часе канфедэраты былі разбітыя ў балотах над Ясельдай каля Сяльца. Рэшткі войскаў пацягнуліся да Брэста. Туды ж прыбылі ўрэшце рэшт Пацей і Агінскі, стаўшы лагерам каля Цярэспаля. Даведаўшыся пра гэта, князь Вішнявецкі са сваім атрадам і з рускімі войскамі рушыў на Брэст. Пазбягаючы рашучай схваткі, канфедэраты патапілі ў рацэ Мухавец гарматы (драўляныя, акаваныя жалезам) і перайшлі Буг, накіроўваючыся на Славацічы, затым на Ружанку і Владаву і далей на Валынь да Любомля[31]. Пасля гэтага ваенныя падзеі на Берасцейшчыне прыпыніліся да канца XVIII ст.

Асновай эканомікі Брэсцкага рэгіёна ў XVIII ст. застаецца сельская гаспадарка, заснаваная на сістэме феадальнай эксплуатацыі сялян. У канцы стагоддзя пачынаецца дыферэнцыяцыя сялянскіх гаспадарак на маёмасныя групы. Так, сялянскія гаспадаркі Брэсцка-Кобрынскай эканоміі ў 1783 г. падзяліліся на: багатых — 598 (6%), заможных — 1672 (17%), сярэдніх — 3726 (37,8%), бедных — 3858 (39,2%) двароў[32].

У Брэсцкім павеце было шмат дробнашляхецкіх гаспадарак. На 1790 г. іх было 1126 пры агульнай колькасці 37 285 сельскіх дымоў (3%)[33].

Сярод дзяржаўных, царкоўных і шляхецкіх уладанняў на Берасцейшчыне вылучаюцца маёнткі буйных магнатаў. У другой палове XVIII ст. віленскаму ваяводзе князю Каралю Радзівілу належалі два маёнткі ў Брэсцкім павеце і мястэчка Чарнаўчыцы[34]. Цэнтры рамяства і гандлю — мястэчкі — актыўна развіваліся ў магнацкіх уладаннях. Так, Радзівілы прыцягвалі ў Чарнаўчыцы вольных рамеснікаў: давалі ім падатковыя льготы, участкі зямлі пад забудову. Гэта датычыла таксама і купцоў, гандляроў. Каб павялічыць свае прыбыткі, яны пабудавалі 24 карчмы і 13 млыноў, якія прыносілі ў год 23 тысячы злотых[35].

Чарнаўчыцы называюць мястэчкам ужо ў 1521 г. У XV ст. Чарнаўчыцамі і вёскай Турна валодаў пан Невер Ваўчкевіч, аднак у другой палове XV ст. Ваўчкевічы змянялі свае ўладанні на валынскія вёскі Івашкі Ілініча[36].

Пасля 1568 г. Чарнаўчыцы належалі мужу адной з дачок Ілініча — Мікалаю Крыштофу Радзівілу — і зрабіліся рэзідэнцыяй Радзівілаў, цэнтрам Чарнаўчыцкага графства, у якое ўваходзіла каля 400 вёсак. У мястэчку быў пабудаваны замак-палац, а ў 1583 г. — Троіцкі касцёл, унікальны помнік беларускай архітэктуры з элементамі готыкі і рэнесансу і рысамі абароннага дойлідства[37].

У 1761 г. у вёсцы Турна пабудавалі другі палац і разбілі парк[38].

У 1791 г. у Чарнаўчыцкія ўладанні Радзівілаў уваходзіла 9 фальваркаў, якія аб'ядноўвалі 1064 сялянскія двары з 3143 душамі сялян[39]. Асноўная маса сялян была паднявольная і плаціла аброк, але ў магнацкіх вотчынах выкарыстоўвалася і наёмная праца. У Чарнаўчыцах добрыя аўчары зараблялі ад 46 да 80 злотых, вінакур атрымліваў 100 злотых у год, чаляднікі — ад 6 да 8 злотых[40].

У другой палове XVIII ст. распаўсюджваецца адыходніцтва. У Чарнаўчыцкім графстве 14% сялянскіх двароў мусілі вылучыць работнікаў, якія працавалі па найме за межамі сваёй гаспадаркі. Больш за 5% усіх працаздольных асоб абодвух полаў, ці кожны дваццаты, у Чарнаўчыцах жылі за кошт наёмнай працы[41].

У выніку войнаў многія сялянскія гаспадаркі засталіся без рабочай жывёлы, што было вельмі нявыгадна феадалам. Таму магнаты вырошчвалі ці куплялі яе — галоўным чынам валоў — і раздавалі сялянам. У Чарнаўчыцах на 1791 г. было 429 запрэжак жывёлы на 449 сялянскіх двароў[42]. Гэта дазваляла апрацоўваць 91% пашы[43]. У другой палове XVIII ст. зямлю бязвупражных сялян апрацоўвалі паншчыннай працай сяляне, якія мелі запрэжкі. Паводле загаду Радзівілаў аканомы пасылалі дзесяткі запрэжак араць «для больных и безупряжных», «бедных», удоў і г.д. Гэтым вырашаліся адразу дзве задачы: слабыя сялянскія гаспадаркі падтрымліваліся за кошт паншчыны, каб умацавацца і зрабіцца паўнавартасным аб'ектам эксплуатацыі, і гэтая сістэма дазваляла ў якасці кампенсацыі выкарыстоўваць сялян са слабых гаспадарак на любой працы ў фальварку[44].

Развіццю жывёлагадоўлі ў сялянскіх гаспадарках Берасцейшчыны ў другой палове XVIII ст. перашкаджалі захопы сялянскіх сенажацей і пашы панскім дваром. Магнаты клапаціліся толькі пра рабочую, цяглавую жывёлу і прымушалі сялян мяняць кароў на валоў ці коней. Радзівілы нават увялі ў Чарнаўчыцах штраф на выпадак, калі заўважаць карову на пашы, прызначанай для валоў[45]. Эксплуатацыя сялян выклікала супраціўленне. Аднак у канцы XVII—XVIII ст. у вотчынах пераважалі такія формы пратэсту, як скаргі магнату на арандатараў маёнткаў, адміністратараў і слуг, а таксама адмаўленне ад выканання павіннасцей, уцёкі. У 1766—1780 гг., г.зн. за 14 гадоў, з Брэсцка-Кобрынскай каралеўскай эканоміі збегла 327 гаспадароў двароў[46].

Уручыць скаргу магнату было нялёгкай справай. Адміністратары маёнткаў імкнуліся гэтаму перашкаджаць. Так, аканом Дзяменіцкага фальварка ўладання Чарнаўчыцы ў сярэдзіне XVIII ст. на чале атрада з 8 слуг гнаўся за селянінам Карпам Шумскім, які вёз у Варшаву скаргу на яго. Селянін паспеў збегчы ад пагоні і дабраўся да князя Радзівіла, аднак не ўсім так пашанцавала[47].

У сістэму эксплуатацыі сялян, акрамя феадальнага чыншу, уваходзіла аплата дзяржаўных падаткаў. Асноўным з іх быў падымны. Звычайна гэты падатак накладваўся агульнай сумай на ўсю вёску, а пасля размяркоўваўся па дварах. Сяляне вёскі Вулька (Брэсцкая акаміія) у 1767 г. плацілі падымны падатак у памеры 71 злоты і 12 грошаў[48]. Другой грашовай павіннасцю на карысць дзяржавы была гіберна — падатак на ўтрыманне войска ўзімку. Гіберна вёскі Вулька ў 1767 г. складала 31 злоты 20 грошаў[49]. Пастаяннымі павіннасцямі былі валачобнае і каляднае, якія сяляне плацілі на карысць сваіх паноў, осэп — натуральная даніна збожжам — і інш. Осэп вёскі Вулька ў 1767 г. складаў 1 карэц іржы і 1 карэц аўса з валокі[50].

У канцы XVIII ст. Берасцейшчы-

ну ахапілі сялянскія паўстанні. 4 красавіка 1789 г. капітан Цалецкі паведамляў, што сяляне ў наваколлі Брэста і іншых раёнах беларускага Палесся набываюць зброю[51]. Сярод брэсцкай шляхты разышліся чуткі, што руска-польскую мяжу перасекла больш за 2000 вазоў з ружжамі, порахам, кулямі і нажамі, палова з якіх рухалася на Брэст[52]. Для прадухілення мяцяжу на Берасцейшчыну было накіравана больш за 2500 салдат рэгулярных войскаў, якія ўчынілі расправу над сялянамі[53].

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у 1794 г. распачалося ўсеагульнае нацыянальна-вызваленчае паўстанне, якое жорстка задушылі рускія войскі. На Берасцейшчыне зноў развярнуліся ваенныя дзеянні. Тут размяшчаліся войскі А.В.Суворава і іншых рускіх генералаў. У Брэсце стаяў атрад у складзе 2 батарэй егераў, 5 эскадронаў драгунаў, некалькіх дзесяткаў казакаў і 4 гармат на чале з палкоўнікам Чэсменскім. 4 мая 1794 г. атрад выйшаў з горада і пачаў адыходзіць на Пінск. Яго гналі атрады генерала Беляка. 9 мая ў Брэсце адбыўся сход мяшчан Брэсцкага ваяводства, на якім выступіў з прамовай Казімір Нестар Сапега — брэсцкі староста, былы маршалак 4-гадовага сейма. Пасля гэтай прамовы сход вырашыў далучыцца да паўстання, стварыў камісію па навядзенні парадку і крымінальны суд. У склад камісіі было выбрана, акрамя каталікаў і уніятаў, 8 чалавек праваслаўнага веравызнання, з якіх ігумен Грыгароўскі пэўны час нават узначальваў камісію. Гэта адлюстроўвала многаканфесійны склад паўстанцаў. Гэты ж сход вырашыў прызначыць брэсцкага мешчаніна Франкоўскага генерал-маёрам павятовага апалчэння, а Казіміра Рушчыца і Міхаіла Пашкоўскага — палкоўнікамі[54].

Да канца мая 1794 г. у Брэсце сабралася 600 узброеных паўстанцаў, а ў ліпені брэсцкая і кобрынская міліцыя складалася ўжо з 713 чалавек і 199 коней.

Летам і восенню 1794 г. пад Брэстам разварочваліся ваенныя дзеянні паміж паўстанцамі генерала Серакоўскага і рускімі войскамі генералаў Дэрфельдэна і Суворава. 15 ліпеня генерал Серакоўскі, штаб якога знаходзіўся ў Высока-Літоўскім, паслаў уланаў палкоўніка Кёніга і шляхецкую кавалерыю перашкаджаць руху генерала Дэрфельдэна, які спяшаўся ў Брэст пасля Хелмскай бітвы. Атрад выканаў заданне і затрымаў рускія войскі да сярэдзіны жніўня. У корпусе Серакоўскага налічвалася больш за 4800 чалавек: 360 чалавек кароннай гвардыі палкоўніка Панятоўскага, 2 эскадроны велікапольскай брыгады маёра Шышко, 3 эскадроны каралеўскіх уланаў палкоўніка Кёніга, некалькі батальёнаў «адборнай пяхоты», батальён фузільераў кароннай пешай гвардыі, рота стралкоў, атрады рэгулярнай конніцы пад камандаваннем Асалінскага і Машкоўскага, казакі і пікінеры атрада генерала Урбанскага ў складзе 300 чалавек і ўзброеная міліцыя Брэсцкага і Кобрынскага паветаў[55].

19 жніўня Серакоўскі адступіў праз Кобрын да Брэста і размясціў свой лагер пад Цярэспалем. Згодна з рапартам генерала Серакоўскага ад 14 верасня 1794 г., у яго корпусе было гатова да бою 4927 чалавек і 1612 коней. З такімі невялікімі сіламі, атрымаўшы загад затрымаць Суворава, Серакоўскі 15 верасня рушыў яму насустрач. Касцюшка паслаў на дапамогу Серакоўскаму атрад Княжэвіча ў складзе 10-га палка Дзялынскіх, 320 чалавек брэсцкай шляхецкай конніцы і 4 гармат. Але гэтая дапамога спазнілася. 17 верасня за 7 км на захад ад Кобрына каля вёскі Крупчыцы адбылася бітва паміж войскамі Серакоўскага і Суворава. Пасля 6-гадзіннага бою паўстанцы адступілі

ў бок Брэста. 19 верасня Серакоўскі распачаў адступленне з Брэста на Бялу-Падляску. На маршы яго атакавалі перавышаючыя сілы Суворава. Пачалася паніка, прыкладна 1000 палякаў было забіта і столькі ж трапіла ў палон, астатнія разбегліся. У рапарце генерала Серакоўскага ад 8 кастрычніка страты корпуса ў абедзвюх бітвах ацэньваюцца ў 2204 чалавекі. У рапарце ж Суворава называюцца амаль фантастычныя лічбы: 16 000 разбітых пад Брэстам палякаў і толькі 95 забітых і 228 параненых рускіх салдат.

Бітва пад Брэстам была апошняй бітвай паўстанцаў на Берасцейшчыне і ва ўсёй Беларусі[56].

У адрозненне ад шляхты сяляне толькі часткова падтрымлівалі паўстанне, і многія выступалі не толькі супраць рускіх войскаў, але і супраць сваіх паноў. 26 верасня 1794 г. генерал-паручык І.В.Ферзен пісаў у загадзе рускім войскам, якія знаходзіліся на Берасцейшчыне: «Сведения вероятнейшие дошли ко мне, что здешние польские крестьяне имеют всегда в предмет более в приверженность к нам и ныне точно открываются явным поведением противо своих помещиков, отступив вовсе от повиновения к ним, и чтобы не быть насильно принуждёнными напротиво добромыслия своего, оставляют свои дома и пашни, скрываются по лесам». Сяляне бралі зброю, каб абараніць «свою безопасность, поелику без всякой пощады делаются им обиды, притеснения, грабительства и тиранническим и варварским образом, даже убиваются»[57].

Пасля падаўлення паўстання 1794 г. Брэсцкі павет апынуўся ў складзе Расійскай імперыі: у 1795 г. — у Слонімскай губерні, з 1797 г. — у Літоўскай губерні, з 1801 г. — у Гродзенскай губерні[58].

Я.С.Разянблат.

Крыніцы:

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 85, 87, 104, 105.
2. Абецедарский Л.С. Белоруссия и Россия. Мн., 1978. С. 17.
3. Копысский З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии (XVI—XVII вв.). Мн., 1966. С. 153—154.
4. Тамсама. С. 57—58.
5. Тамсама. С. 58—59.
6. Тамсама. С. 59.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г.Гродна. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2334. Л. 1, 2 адв., 11—14, 14 адв.
8. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 3331. Л. 2 адв.
9. Блинова Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. Мн., 1990. С. 44.
10. Тамсама. С. 45.
11. Мараш Я.Н. Очерк истории экспансии католической церкви в Белоруссии XVIII в. Мн., 1974. С. 226.
12. Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. Мн., 1990. С. 131.
13. Абецедарский Л.С. Белоруссия и Россия. Мн. 1978. С. 106.
14. Тамсама.
15. Тамсама. С. 112.
16. Тамсама.
17. Тамсама. С. 116.
18. Тамсама. С. 121—123.
19. Блинова Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. Мн., 1990. С. 68.
20. Сагановіч Г. Невядомая вайна. 1654—1667. Мн., 1995. С. 40.
21. Тамсама. С. 45.
22. Абецедарский Л.С. Белоруссия и Россия. Мн., 1978. С. 170.
23. Сагановіч Г. Невядомая вайна. 1654—1667. Мн., 1995. С. 53—54.
24. Абецедарский Л.С. Белоруссия и Россия. Мн., 1978. С. 170.
25. Сагановіч Г. Невядомая вайна. 1654—1667.
26. Блинова Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. Мн., 1990. С. 69.
27. Игнатенко А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. Мн., 1974. С. 12.
28. Мелешко В.И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII—XVIII в. Мн., 1982. С. 25.
29. Zdański Ksawery. Przyczynki do dziejów powiatu Brzesko-Litewskiego u ziem nim objęych. Warszawa, 1936.
30. Тамсама. С. 19.
31. Тамсама. С. 20.

32. Мелешко В.И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII – XVIII в. Мн., 1982. С. 31.

33. Козловский П.Г. Землевладение и землепользование в Белоруссии в XVIII – первой половине XIX в. Мн., 1982. С. 104.

34. Тамсама. С. 91–97.

35. Лавренюк Н.С. Чернавчицы. Штрихи культуры и истории // Брестчина. От прошлого к будущему. Брест, 1995. С. 35–36.

36. Тамсама. С. 35.

37. Тамсама. С. 36.

38. Тамсама.

39. Козловский П.Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в. Мн., 1969. С. 178–182.

40. Тамсама. С. 153.

41. Тамсама. С. 157.

42. Тамсама. С. 63, 186.

43. Тамсама. С. 184.

44. Тамсама. С. 66.

45. Тамсама. С. 70.

46. Мелешко В.И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII – XVIII в. Мн., 1982. С. 108.

47. Козловский П.Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII – XVIII в. Мн., 1982. С. 164.

48. Мелешко В.И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XVII – XVIII в. Мн., 1982. С. 62.

49. Тамсама.

50. Тамсама. С. 63.

51. Игнатенко А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. Мн., 1974. С. 153.

52. Тамсама.

53. Тамсама. С. 156.

54. Zdaúski Ksavery. Przyczynki do dziejów powiatu Brzesko-Litewskiego u ziem nim objętych. Warszawa, 1936. С. 20.

55. Тамсама. С. 21.

56. Тамсама. С. 22.

57. Игнатенко А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. Мн., 1974. С. 165.

58. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 105.

Дакументы сведчаць

АСОБНЫЯ ШЛЯХЕЦКІЯ, ЦАРКОЎНЫЯ І МАГНАЦКІЯ ЎЛАДАННІ НА ТЭРЫТОРЫІ БРЭСЦКАГА РАЁНА Ў XVI—XVIII ст.

Год	Назва	Уладальнікі
1508	Трышын і Шпановічы	Царква Божай Маці ва Уладзіміра-на-Мухаўцы
	Вёска Косічы, фальваркі Райкоўскі, Ясноўскі і Пашкоўскі	Пан Фёдар Янушкевіч (адпісана царкве Божай Маці)
1568	Маёнтак Рэчыцкі	Малхіер Райскі, Марк Яцыніч, Фёдар Рудзецкі, Міхаіл Сербін, Грыгорый Каранеўскі
1749		Антоній Пацей, стражнік, прадаў пану Флемінгу
Наступныя гады		Ковенскі маршалак пан Забела, князі Чартарыйскія, пан Таўбе
1580	Камароўцы	Міхаіл Іванавіч Багавіцінавіч Казерадскі
1597	Вёска Матыкалы	Пан Іван Мутыкальскі
Да 1754		Земскі суддзя брэсцкі Фларыян Грабоўскі
З 1754		Пан Вацлаў Матушэвіч
1788		Кашталян брэсцкі Юзэф Шчыт
1604	Вёска Клейнікі	Паны Яраслаў і Іеранім Салтаны
1568	Збірогі	Пан Рушчыц
1602		Ян Косць
1609		Агаф'я Пац (Сапежанка)
1740	Вёска Зводы	Пан Сасноўскі
1630	Вёска Залессе	Пан Пётр Вітаноўскі
1774		Антоній Вітаноўскі, Ян Цяльшэўскі, Антоній Тарасоўскі

Год	Назва	Уладальнікі
З 1789	Вёска Залессе	Паны Старавольскія
1753	Вёска Забалоцце	Мінскі чашнік Іржы Матушэвіч
Наступныя гады		Манастыр у Расне
1745	Вёска Вычулкі	Падчашнік брэсцкі Чыж
1767	Вёска Рудавец	Пан Йозэф Дулеба
1740	Вёска Ракавіца	Князі Шуйскія перадаюць вендэнскаму стольніку Пятру Талочку
Да 1823	Вёска Рагознечка	Паны Бельскія
З 1823		Паны Галіцкія і Ясінскія
1698	Вёска Курніца	Паны Тышкевічы
З пачатку VIII ст.		Князі Чартарыйскія
1794	Лышчыцы	Пані Марыяна Лышчынская з сынам Вінсентам
1738	Астрамечава	Пан Сузін
1698	Сяло Плоска	Каралеўскі маёнтак; 36 валок зямлі належала брэсцкім езуітам
XVII ст.	Радванічы Касцёльныя	Паны Гасеўскія
1708		Казімір Сапега; далей пан Якуб Флемінг, затым князі Чартарыйскія
XVI ст.	Вёска Нэпля	Леў Багавіцінавіч, чашнік літоўскі
1686		Паны Скашэўскія
1769		Паны Німцэвічы
Пач. XIX ст.		Паны Ажэшкавы Мерзееўскія
XVIII ст.	Вёска Булькова	Паны Ажароўскія
1808		Паны Чапскія
1740	Чылеева	Пан Ласкоўскі, брэсцкі рэгент
1569	Вёска Чыжэвічы	Пан Багдан Кучук Чыжэўскі
Пач. XVII ст.		Паны Фларыян і Ежы Млажэўскія
1664		Пан Лакніцкі
1680		Пётр Станіслаў Грэк прадае Бенядзікту Сапегу, падскарбію ВКЛ
1724		Сапегі прадалі Антонію Нарковічу
1751		Генерал Зігмунд Нарковіч прадаў Яну Гротхузу
Канец XVIII ст.	Яцковічы	Пан Жылока
Пач. XIX ст.		Пан Мацей Зданьскі і брэсцкі манастыр Св. Брыгіты
1624	Рэчыца	Паны Балабаны прадалі Пятру Пацею
1617	Чэрні	Князь Фёдар Масальскі
Пач. XVIII ст.	Кавярдзякі	Князь Чартарыйскі, канцлер ВКЛ
З 1740		Браты-цыстэрцыянцы з вёскі Вістычы

Год	Назва	Уладальнікі
1682	Вёска Скокі	6 валок належала пану Францішаку Баярскаму
1762	Урочышча Скокі	6 валок зямлі належала пані Барбары Краўзе і пану Станіславу Пашкоўскаму
1682	Старое Сяло	Паны Грабоўскі, Гардзіеўскі, Грынявіцкі, Ждановіч, Махвіч
1756		17,25 валокі зямлі належалі капітану гвардыі ВКЛ Каралю Лепарскаму
Пач. XIX ст.	Вёска Сычы	Паны Высоцкі і Малахоўскі
Пач. XIX ст.	Вёска Сычыкі	Княгіня Яблонская (у першым шлюбе Сапега)
1708	Шчытнікі	Пані Тэрэза Гашчэўская перадала свайму мужу Казіміру Сапегу, гетману ВКЛ
1710		Якуб Флемінг; затым князі Чартарыйскія і Панятоўскія
Пач. XIX ст.		Пан Францішак Паніквіцкі, суддзя брэсцкага павятовага земства; пасля пані Соф'я Тукалава-Шрайберава
Пач. XVII ст.	Вёска Шумакі	Князь Ян Шуйскі, падкаморы брэсцкі
1609	Вёска Церабунь	Князь Ян Шуйскі (радавы маёнтак Шуйскіх
Пач. XVI ст.	Камяніца-Жыровецкая	Івашка Літаўр Храбтовіч
1781		Брэсцкі падкаморы пан Выганоўскі
1471	Вёска Вістычы	Паны Назуты, далей князі Масальскія
XVI ст.		Паны Ілінічы і Тышкевічы
З 1678 да 1832		Цыстэрцыянскі манастыр
1477	Мястэчка Чарнаўчыцы	Пан Немера Ваўчкевіч прадаў Івашку Ілінічу
1564		Ежы Ілініч, граф Мірскі і Чарнаўчыцкі
Канец XVI ст.		Князі Радзівілы
Пач. XIX ст.		Графы Грабоўскія
1682	Вёска Прылукі і Гершановічы	Пан Хайноўскі і пан Даніловіч; пан Кулеша
1754	Гершановічы	3 валокі зямлі належалі пану Прэйсу; затым Ігнацію Леаноўскаму
1759	Прылукі і Гершановічы	Капітан пешай гвардыі ВКЛ Марыян Ціман перадаў 9 валок зямлі панам Яну і Ганне Лінгам
1721	Прылукі	Краўчы брэсцкага ваяводства Карл Басяцкі
1748	Сяло Рудна	Пан Адам Кіркор і пан Бенядзікт Краеўскі
1759	Сяло Чарняны	Пан Пётр Бухавецкі

Крыніцы:

Акты Виленской археографической комиссии. Т. 2; Акты Брестского земского суда. Т. 5. Вильно, 1867; Акты Брестского и Гродненского городских судов. Вильно, 1871 г.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1928. Воп. 1. Спр. 37. Л. 12—15, 27, 27 адв; Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 54. Л. 1081—1085; Спр. 60. Л. 1837, 1837 адв; Спр. 72. Л. 938—944; Ф. 1741. Воп. 1. Спр. 32. Л. 862—863; Спр. 38. Л. 1161—1164.

Zdański Ksawery. Przyczyu Ki do dziejów powiatu Brzesko-Litewskiego u ziem nim objętuch. Warszawa, 1936.

АКТ ФУНДУШУ АСТРАМЕЧАЎСКАЙ ЦАРКВЫ

17 ліпеня 1738 г.

На ўрадзе земскім гродскім Берасцейскім, Актамі старасцінскімі перад мною Францішкам Зегранова-Храноўскім, лоўчым і падстарастам судовым Берасцейскага в-ва зьявіўся асабіста прыпадобны прысьвітар Астрамячоўскае царквы Тамаш Паўловіч. Фундуш на рэч у ім ніжэй выражоны сябе і нашчадкам сваім служачым ад Актаў надаў...

Мы, Міхаіл Станіслаў Сузін, канюшы Берасцейскага в-ва і Ганна з Веракоўскіх Сузінова, канюшына Берасцейская, супругі чынім вядомым людзям сённяшнега будучага часу, каму аб тым ведаць належыць, гэтым нашым вячыстым запісам, што мы ... у памнажэнні Хвалы Божай, выставілі на нашым фундушу Царкву ў маёмасьці нашай дзедзічнай Астрамячове ў Берасцейскім в-ве, у каторай гэтую Царкву на вечныя часы ўзнося Хвалу Богу, вырашылі Мы да гэтай новафундаванай царквы. Устанавіць і фундаваць Каплана ці Прысьвітара за Кансэнсам і Бласлаўленнем Я.М.Ксендза Лявона Кішкі, Арцыбіскупа ўсей Рускай Метраполіі. Гэтаму каплану зараз ад нас уфундаванаму і нашчадкам яго... да жыцця, адзення, да Божага Ухвалення назначылі Мы з Божай Ласкі і Працы рук нашых набытай Фартуны Нашай да гэтай Царквы прылучылі зямлю ад маёнтасці нашай дзедзічнай... 2 валокі літоўскія з прыдаткамі па 20 манкаў Берасьцейскае меры ў сябе маючых пасеву, апроч таго прыдаць Халопа паданага ці Слугі Царкоўнага ці Дзяка з валокамі на вечныя часы надаём, з усемі прыналежнасьцямі, зараслямі, навозамі, лугамі, да гэтых валок належачымі, т.е. першая валока называецца Валашыноўская і Дзенісовічоўская з навозам, лугом і агародам да ніх належачым. Другая валока на пясках, таксама мае нозоў Валашыноўская, да ёй прылучаны грунт Парафінаўскі і грунт Ваўрыноўскі з навозам, лугам, да гэтай валокі належачым, гэты грунт да вечнага ўжывання Каплану пры гэтай Царкве і Нашчадкам яго ад Нас і Нашчадкаў нашых выдана належыць павінен будзе. Пры гэтым на далейшую ахвяру Божую гатовых, грошы па віно з карчмы нашай уласнай, у той жа маёнтак ці Астрамячоўскай штогодна 20 злотых таму жа каплану памянёнай Царквы дахадзіць на вечныя часы павінна... На тым жа грунце да выгоды Каплана рэзідэнцыі і плябаніі з усемі уфундаванямі даём і да разрабленя таго ж грунту пару датычыцца рэчаў царкоўнага абраду, то іх маецца 2 апараты, адзін шаўковы з срэбным келіхам і царкоўны посуд, другі жалобны з келіхам і царкоўным посудам медным. Алтароў з ляпной работы, антэпедзямі (пакрываламі) шытымі... да імшы Сьвятой. 2 званы, 2 малых звона да алтару. Хары мусім потым збудаваць пры магчымасьці і ласкі Божай. Каплану гэтай Царквы кантрыбуцыі, ані падымнага падатку з вышэй фундаваных валок плябанскіх Рэчы Паспалітай да платы не будуюць належаны. Што да патрэбаў уласных дамовых волен будзе без усялякай залежнасці ад арэнды, піва варыць і гарэлку курыць. Таксама з кірмашоў, якія могуць быць пры той Царкве, належыць паводле звычаёў да памянёнага прысьвітара плаціць... паруб дрэў у лясах будзе вольны. У гэтай фундацыі нашай ад нас фундаваны каплан павінен будзе кожную нядзелю набажэнства звычайнае, для Царквы належачае ніколі не прапускаў, а для Парафіі сваёй адпраўляў. Хросты, Шлюбы, Паграбенні чыніў, належна пільна сачыў, каб думы Парафіі без споведзі не зміралі і навучалісь усялякім навукам духоўным. І па намеру жывых фундатараў Міхала і Ганны Сузінаў адна імша сьвятая ў кожную суботу і кожны тыдзень у вечныя часы павінна быць адпраўлена капланам за адпушчэнне грахоў жывым, а па сьмерці імша Сьвятая за душы як нас фундатараў, таксама за ўпрыжываных праз нас калі кольвечы...

Волен тады і моцны будзе той Каплан кіраваць і распалагаць памянёнымі грунтамі без ніякай ад нас і нашчадкаў нашых перашкоды. Абы Хвалу Богу ў той Царкве вазнасіць не ўставалі. Зараз да той жа Царквы Каплана і Нашчадкаў яго прысягнуўшых мець хацелі бы. Усе царкоўныя прыналежнасці выражаны пад асаблівым рэгістрам, нашым уласным коштам учынёны, пры каплане знаходзяцца, на што мы для пэўнейшай фундыцыі нашай рукой уласнай нашай падпісаліс. Подпісі рук І.М.Паноў Печантараў упрашоных.

Пісан у Астрамячове 20 ліпеня 1720 году. У гэтага фундушу подпісі рук як самых Вяльможных Іх Міласцяў Паноў Фундатараў, так і Пана Печантара... Міхал Станіслаў Сузін, Канюшы Берасцейскага в-ва. Ганна Сузінова. Устна і ачавісце прашоны ад Вяльможных Іх Міласцёў Паноў Сузінаў, Канюшых Берасцейскіх, супругаў... Адам з Серпутова Серпутоўскі, Мечнік і Суддзя Гродскі Берасцейскі. А на тым Фундушу пры печатке на чырвоным лаку выціснёнай Апрабацыя Рукі Самаго Яснавяльможнага Я.М. Ксяндза Метрыполф Усей Русі Епіскапа Уладзімірскага і Берасцейскага ў такіх словах пісаны: Фундуш даны Царкве Астрамячоўскай ад Вяльможных І.М. Паноў Фундатараў... Дан у Уладзіміре 19 ліпеня Года Гасподня 1720-га, Лявон Кішка, Метрапаліт Усей Русі, Епіскап Уладзімірскі і Берасцейскі...

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 54. Л. 1081—1805.

АКТ ФУНДУШУ ВЯЛЬМОЖНЫХ ПАНОЎ ХРАНОЎСКІХ КУСТЫНСКАМУ ПЛЯБАНУ

26 кастрычніка 1763 г.

На ўрадзе гродскім Берасцейскім перад Актамі Старасцінскімі і перада мной, Каралём Венчыцкім, падстолім і падстарастам судовым гродскім Берасцейскага ваяводства з'явіўся персанальна ксёндз Ян Савіцкі, прэсвітар кустынскі і фундуш Іх Міласцей паноў Храноўскіх Кустынскай царкве падаў да Актаў, які ўпісаны ў кнігі, наступнага зместу: Апісанне грунтаў, сенажацяў, Кустынскай плябані, Поля... насупраць сядзібы, усяго 2 валокі... балоты, на якіх высяваюць шанкаў берасцейскай меры 12, ад той жа валокі ўздоўж аднім бокам ад грунтаў дворных, а другім уздоўж ад грунтаў вясковых, а паміж грунту кухара Мірона насупраць тых жа валок сенажаці райныя з валокамі па шырыні і ўздоўж аднім бокам ад сенажаці Дворнай, а другім паміж таго ж Мірона, кухара, а скончваюцца на лугах Дворных валок Шэзыленскіх, сенажаці якіх уздоўж 180, 9 сажэняў. За балотам да той жа плябані поле пад назвай Палькова, якое пачынаецца ад палёў Лыпчынскіх аднім бокам уздоўж і заканчваецца каля дарогі Шэзыленскай, а другім бокам уздоўж каля сенажаці кустынскай Дворнай, на полі каторай высяваюць ранняй сяўбой Шанкоў 24, да гэтага поля Сенажаць ад 2-х валок, якія пачынаюцца ўздоўж ад сенажацяў Лыпчынскіх клінам, а заканчваюцца каля сенажаці Кустынскіх сялян, якія ўздоўж паміж Лыпчынскімі маюць сажэняў 150, да сенажацяў кустынскіх сялян уваходзяць клінам, другім бокам уздоўж да каменя вялікага, які аддзяляе іх ад Дворных сенажацяў, у тым баку мае толькі 113 сажэняў, да таго ж поля клін каля кустынскіх могілак, на якім клін, дзе засяваюць 6 шанкаў, да той жа плябані палі, якія пачынаюцца ўздоўж палёў Шчыленскіх, заканчваюцца каля палёў Шчыленскіх, другім бокам уздоўж таго ж грунта Шчыленскага а заканчваецца каля Кустынскага луга, на тым полі высяваюць 14 шанкаў да той жа плябані поле пачынаецца ад грунтаў Лешнянскіх уздоўж бокам адным каля таго ж грунта Лешнянскага... другім бокам уздоўж паміж грунтам кустынскага каваля Кандрата, а заканчваецца каля Яноўскага гасцінца, на якім поле высяваюць шанкаў берасцейскай меры паўчатырнаццаці вышэй памянёнага. Фундуш гэты даецца для айца Кустынскага прэсвітара, згодна з ім робіцца пастанова па ўпрашэнню Яго Міласці ў суботу адправіць імшу за душу Я.М. пана Жыгімонта Храноўскага, падкаморага берасцейскага, як фундатара, а затым душу Я.М. Кацярыны Храноўскай, падкаморкі берасцейскай, як фундатаркі штотыдзень. Штомесяц за душу бацькоў фундатараў Кустынскай плябані. Шточвэрць году імша таксама павінна адпраўляцца, у першую чвэрць года за душу ўсіх памерлых, у другую — за душы продкаў гэтай плябані і ўсіх падданых, якія належаць да гэтай парафіі, у трэцюю чвэрць года за жывых парафіянаў, у чацьвёртую за агульны ратунак... Дан 15 жніўня 1739 г. У гэтага фундушу пры пячатках прыціснутых подпісы рук Кацярына Храноўская, падкаморка берасцейская, Людвік Антоні з Хранова Храноўскі, Станіслаў Храноўскі, старасты Рэвятыцкі, Эмануэль Храноўскі. Гэты фундуш праз вышэй памянёных асобаў да Актаў паданы і да кнігаў гродскіх берасцейскіх прыняты і ўпісаны.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 60. Л. 1837, 1837 адв.

ВЫТРЫМКА ПРЫЗНАННЯ ЎГОДЛІВАГА ЗАПІСУ ПАМІЖ ЯГО МІЛАСЦЮ КНЯЗЕМ ЧАРТАРЫЙСКІМ, КАНЦЛЕРАМ ВКЛ І ЯГО МІЛАСЦЮ ПАНАМ ВІЛЬЧЭЎСКІМ

10 жніўня 1768 г.

Перад урадам і актамі земскімі берасцейскага ваяводства з'явіліся парсанальна Я.М. пан Язэп Вільчэўскі, падкаморы зямлі віскай і Ян Язэп Клакоцкі, падстолі мінскі, староства калачэўскага камісар, якім ад Я.М. князя Міхала Чартарыйскага, канцлера ВКЛ дан запіс угодлівы

аб дыферэнцыі лугоў і сенажацяў паміж вёскамі Бердычы і Курніцы, вячыстых добр князя Чартарыйскага... які слова ў слова змест мае наступны: Паміж Я.М. панам Язэпам Клакоцкім... прадстаўніком Я.М. князя Міхала Чартарыйскага і Я.М. панам Язэпам Вільчэўскім... у дзень св. Марціна 16 снежня 1765 г. ... учынёна ўгода... аб дыферэнцыі лугоў і сенажацяў паміж вёскамі Бердычы і Курніца, вячыстых добр Я.М. князя Чартарыйскага, канцлера ВКЛ...

Дан 20 жніўня 1768 г.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1741. Воп. 1. Спр. 32. Л. 862—863.

Казімір Лышчынскі

Мысліцель-атэіст, педагог і грамадска-палітычны дзеяч.

Казімір Лышчынскі нарадзіўся ў мястэчку Лышчыцы, за 20 вёрст ад Брэста, 4 сакавіка 1634 г. Вучыўся ў мясцовай школе, потым у 17-гадовым узросце паступіў у Брэсцкі езуіцкі калегіум.

Пасля калегіума Казімір Лышчынскі трапіў у войска — спачатку на «казацкую» вайну, потым змагаўся супраць шведаў і рускіх. У сталым узросце ён быў прыпісаны да палка крылатых гусараў — цяжкай конніцы Вялікага княства Літоўскага. У 26-гадовым узросце Казімір Лышчынскі пакінуў ваенную службу і вярнуўся да вучобы. Чатыры гады ён вывучаў рыторыку, логіку, фізіку, метафізіку ў Калішы, пасля чаго выкладаў у Львове, а з 1665 з'яўляўся памочнікам рэктара ў родным Брэсцкім калегіуме езуітаў. Займаць такую пасаду мог толькі член ордэна. Па ўскосных звестках вылічана, што Лышчынскі правёў сярод езуітаў восем гадоў. Але дакументаў, якія хоць крыху асвятлілі б яго духоўны стан на той прамежак часу, не засталося, усе спробы растлумачыць матывы ўступлення ў езуіцкі ордэн застаюцца невядомымі. Пакінуўшы ў 1666 г. ордэн, Лышчынскі ажаніўся з Ядвісяй Жалінхоўскай, атрымаў частку Лышчыцаў і заняўся сваім трактатам. Адначасова ён прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці павета і ваяводства. Ужо ў 1669 г. на Брэсцкім ваяводскім сейміку яго вылучаюць дэпутатам на вольны элекцыйны сейм (абранне на трон новага караля). У 1674 ён зноў прадстаўляў Брэсцкую шляхту на сейме, які абвясціў каралём Яна Сабескага, выдатнага палкаводца, пераможцу туркаў у славутай бітве пад Хоцінам. Відаць, Казімір Лышчынскі таксама ўдзельнічаў у бітве пад Хоцінам ужо як крылаты гусар, бо яго ваенныя заслугі адзначаны ў дакументах. Свой вольны час Лышчынскі аддаваў філасофскім занятках. Шматгадовы роздум і вынікі адкрыццяў ён занатаваў у рукапісе трактата «Аб

Пакаранне смерцю К.Лышчынскага. Карціна мастака А.І.Сільвестрава.

неіснаванні бога». Аднак у тое стагоддзе, калі ўсё жыццё было прасякнута рэлігійнай ідэалогіяй, выдаць твор, які адмаўляў бога, было немагчыма.

Большую значнасць набылі сацыяльныя погляды Лышчынскага, якога абвінавачвалі і ў тым, што ён жадаў «мець свет без улады, народы без валадароў». Ён выконваў абавязкі следчага і адваката. Цяжка ўявіць, як склаўся б далейшы лёс Лышчынскага, калі б не сусед і сябар дзяцінства Ян Казімір Бжоска, які быў вінаваты яму сто тысяч талераў, але грошы гэтыя аддаць не хацеў. Аднойчы ён прыехаў да Лышчынскага пагасцяваць, выкраў 15 сшыткаў яго трактата «Аб неіснаванні бога». Свой данос і ўсе матэрыялы Бжоска даставіў віленскаму біскупу Бжастоўскаму. Хутка аб «бязбожжы» Лышчынскага біскуп напісаў каралю, які выдаў загад зняволіць Лышчынскага. Біскупскі суд (пад старшынствам М.Паплаўскага) вынес прысуд — смерць праз спальванне. Гэты прысуд выклікаў пратэст брэсцкіх мяшчан за парушэнне прывілеяў шляхты, якую па тагачасным праве нельга было судзіць духоўным судом. Літоўскі трыбунал не зацвердзіў рашэнне біскупскага суда і Лышчынскі быў выпушчаны на волю. Бжоска адвёз свой «маніфест» і рукапіс на гродзенскі сейм. Туды быў выкліканы і Лышчынскі, прысутнічаў і кароль Ян Сабескі. І на гэты раз Лышчынскі пазбег смерці, але яна стаяла за плячамі. Пра «брэсцкага манстра» (так празвалі яго царкоўнікі-біскупы) не забыліся. Год перадышкі даваў ім магчымасць добра падрыхтавацца. Бжастоўскі і Паплаўскі перадалі справу ў сеймавы суд у Варшаву, які, згодна статуту, разглядаў самыя цяжкія злачынствы — забойства, атэізм і інш. На трагічны вынік паўплываў папскі нунцый Кантэльмі. Да ўдзелу ў судзе былі запрошаны найбольш аўтарытэтныя прадстаўнікі польскай каталіцкай царквы.

Лышчынскі ў сваім выступленні на судзе прывёў рацыянальныя доказы. Адвакаты імкнуліся, каб суд вынес мяккі прысуд. Біскупы пачалі інтрыгі, подкуп, пагрозы. 28.2.1689 г. быў вынесены прысуд — спаліць на агні. Пасля суда Лышчынскі правёў у турме яшчэ месяц. Яго ўгаворвалі прылюдна раскаяцца, але Лышчынскі адмовіўся. У апошнія дні жыцця ён абдумваў свой лёс, успамінаў Яна Гуса, спаленага ў 1415 г. 30 сакавіка 1689 г. прысуд быў выкананы. Перад тым як паслаць на агонь, Лышчынскаму адсеклі галаву, гэта было каралеўскай міласцю, якая ўлічвала шляхецкае паходжанне пана Казіміра ад старажытнага роду герба «Корчак». Потым цела вывезлі за горад і там спалілі, попел засыпалі ў гармату і выстралілі.

Літаратура:

Прокошина Е.С., Шалькевич В.Ф. Казимир Лыщинский. Мн., 1986.

Друкуецца па кн.: Памяць. Брэст. Мн., 1997. Кн. 1. С. 84—85.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

АДМІНІСТРАЦЫЙНАЕ ДЗЯЛЕННЕ, КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА, ЯГО НАЦЫЯНАЛЬНАЯ І РЭЛІГІЙНАЯ ПРЫНАЛЕЖНАСЦЬ

Пасля 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795 г.) Брэсцкі павет апынуўся ў складзе Слонімскай, з 1797 г. — Літоўскай, а з 1801 г. — Гродзенскай губерняў Расійскай імперыі. Павет знаходзіўся ў заходняй частцы Гродзенскай губерні і межаваў на поўдні з Уладзімірскім і Ковельскім паветамі Валынскай губерні, на ўсходзе — з Кобрынскім, на поўначы — з Пружанскім, а на захадзе — з Бельскім паветамі Гродзенскай губерні і з Седлецкай губерняй. Цэнтрам павета быў горад Брэст-Літоўск. Плошча павета складала 4 299 000 квадратных сажняў (4893,2 км). Паводле новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення, у склад павета ўвайшлі 23 воласці: Велікарыцкая, Войская, Воўчынская, Высока-Літоўская, Вярховіцкая, Дамачаўская, Дварцоўская, Дзмітравіцкая, Жыцінская, Камянец-Жыровіцкая, Камянец-Літоўская, Косіцкая,

Лышчыцкая, Маларыцкая, Матыкальская, Мяднянская, Олтушская, Палавецкая, Прыбараўская, Рагачыцкая, Радваніцкая, Ратайчыцкая, Турноўская.

На 1837 г. у Брэсцкім павеце налічвалася 9 мястэчак, 71 сяло, 307 вёсак (з іх 254 панскія). Вялікіх вёсак у павеце не было. Своеасаблівым тыпам населенага пункта паміж горадам і сялом было мястэчка. Колькасць мястэчак увесь час змянялася. Асобныя паселішчы лічыліся то мястэчкамі, то сёламі. Ва ўсёй Гродзенскай губерні ў 40-я гады XIX ст. налічвалася 71 мястэчка. Жыхары мястэчак займаліся сельскай гаспадаркай, рамяством і гандлем, а таксама працавалі на панскіх прамысловых прадпрыемствах.

У 1837 г. на тэрыторыі Брэсцкага павета пражывала 81 325 чалавек, сярод якіх было 64 855 прыгонных сялян і толькі 488 вольных, 2097 каланістаў, 4031 яўрэй і іншыя катэгорыі насельніцтва. У 1863 г. колькасць жыхароў павета павялічылася да 96 617, а ў 1897 г. склала 218 432 чалавекі. Насельніцтва Брэсцкага павета не было аднастайнае ні па нацыянальнасці, ні па веравызнанні. На 1837 г. тут было 7766 католікаў, 44 лютэраніны, 4042 іудзеі, 33 праваслаўныя і 76 167 уніятаў. У сваёй справаздачы за 1837 г. гродзенскі губернатар адзначаў перавагу уніятаў сярод сялян. Уніяцтва на Берасцейшчыне мела даўнія карані. Яшчэ ў 1797 г. Брэст стаў цэнтрам уніяцкага епіскапства на чале з ксяндзом Арсеніем Глаўнеўскім. Пасля яго смерці епіскапам Брэсцкім у 1798—1828 гг. быў Ігнацій Іасафат Булгак. У 1837 г. у Брэсцкім павеце дзейнічалі 70 драўляных і 7 мураваных уніяцкіх цэркваў, 12 капліц, іх абслугоўвалі 52 святары; існавалі таксама 5 мураваных і 6 драўляных рымска-каталіцкіх касцёлаў і 2 капліцы, 2 лютэранскія царквы, 9 яўрэйскіх малітоўных дамоў. Праваслаўных цэркваў у павеце не было. Але да 1839 г. уніяцтва было вынішчана. Ужо ў 1842—1843 гг. у Брэсцкім павеце было 66 праваслаўных цэркваў, 11 касцёлаў і адна лютэранская царква. Усе уніяцкія цэрквы былі закрытыя. На 1876 г. сярод жыхароў павета было 89 433 праваслаўныя, 5102 католікі, 1343 пратэстанты і 10 332 іудзеі. Абсалютную большасць насельніцтва праваслаўнага веравызнання складалі сяляне-беларусы і ў нязначнай ступені — рускія і ўкраінцы. Католікамі былі беларусы і палякі-землеўладальнікі. У іудзеяў веравызнанне адпавядала нацыянальнасці. Большая частка негарадскіх яўрэяў жыла не ў вёсках, а ў мястэчках. Жыць па-за гарадамі і мястэчкамі «рысы аседласці» ім было забаронена. У другой палове XIX ст. яўрэі складалі большасць насельніцтва мястэчак Брэсцкага павета. Напрыклад, у мястэчку Дамачава на 1900 г. з 1126 жыхароў было толькі 60 хрысціян. Галоўным заняткам местачкоўцаў былі рамяство і гандаль. Яўрэі скупалі ў сялян хлеб і сена, утрымлівалі піцейныя дамы, млыны, былі арандатарамі, кавалямі, шклярамі, фарбавальшчыкамі, шаўцамі. На тэрыторыі павета былі і лютэране, а таксама нязначная колькасць магаметан. У Дамачаўскай воласці існавалі дзве калоніі, Нейброў і Нейдорф, дзе з XVI ст. жылі пратэстанты-лютэране. Гэтыя калоніі «... образовались из 12 семейств, которые прибыли 400 лет тому назад из Голландии по вызову литовского вельможи Радзивилла»[1]. У 1897 г. колькасць каланістаў складала каля 3000 чалавек, дзве трэці з якіх заставаліся пратэстантамі-лютэранамі, а адна трэць прыняла каталіцтва. Лютэране мелі сваю асобную парафію і пастара, а католікі — капліцу ў мястэчку Дамачава.

У канцы XIX ст. у Брэсцкім павеце было 95 праваслаўных цэркваў,

2 каталіцкія касцёлы, 2 пратэстанцкія храмы, 20 сінагог і яўрэйскіх малітоўных дамоў.

САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА

Нараджэнне капіталістычных адносін на пачатку XIX ст. адбілася і на Беларусі. Берасцейскія паны імкнуліся павялічыць прыбытковасць сваіх маёнткаў шляхам ужывання сельскагаспадарчых машын, наймання рабочай сілы, укаранення травасеяння і шматпольнага севазвароту. Усё часцей пераводзілі сялян з паншчыны на чынш. Аднак найманне рабочай сілы і аграрныя новаўвядзенні не былі шырока распаўсюджаныя і не выклікалі вялікіх змен у арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Меры па ўдасканальванні панскай гаспадаркі амаль не закранулі агратэхнічную базу вёскі.

Рост попыту на хлеб у Заходняй Еўропе на пачатку XIX ст. і павелічэнне аб'ёму ўнутранага рынку выклікалі рост таварнасці панскіх гаспадарак. У Гродзенскай губерні панская запашка актыўна павялічвалася за кошт сялянскіх угоддзяў. Каля 70—80% усіх прыбыткаў у 30—40-я гады XIX ст. паступала ад продажу сельскагаспадарчых прадуктаў, галоўным чынам збожжа, гарэлкі і спірту.

У першай палове XIX ст. распачынаецца спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці ў асобных раёнах Беларусі. Так, у Гродзенскай губерні развіваецца жывёлагадоўля. Брэсцкі павет, дзякуючы свайму выгаднаму размяшчэнню, зрабіўся цэнтрам транзітнага гандлю жывёлай. У мястэчку Уладаўка, дзе сыходзіліся некалькі вялікіх дарог (з Валыні ад Любомля і Луцка, з Царства Польскага ад Любліна і Варшавы і дарога ад Брэст-Літоўска), штогод праводзіліся два буйныя кірмашы — з 15 жніўня і з 1 кастрычніка. Першы працягваўся каля 5 дзён, другі — два тыдні. Кірмашы былі заснаваны спецыяльна для гандлю на іх жывёлай, якую прыганялі з паўднёвых правінцый Расіі. У асноўным гэта былі ўкраінскія быкі. У 1836 г. на жнівеньскім кірмашы прадавалася ад чатырох да шасці тысяч, а на кастрычніцкім — ад шасці да дванаццаці тысяч галоў жывёлы. Жывёлу куплялі для Варшавы, Кракава, Вільна і Прусіі.

З рапарта Брэсцкага земскага суда за 1837 г. можна даведацца, што асноўная ўвага ў Брэсцкім павеце надавалася авечкагадоўлі (глядзі раздзел «Дакументы сведчаць»). Рамяство і промыслы былі засяроджаны галоўным чынам у мястэчках. На 1837 г. у Брэсцкім павеце былі: 3 меднікі, 114 кавалёў, 9 бляхароў, 5 сталяроў, 21 цясляр, 77 токараў, 17 карэтнікаў. Працавалі 10 гарбарных заводаў (37 працаўнікоў), 2 суконныя заводы (25 працаўнікоў), адзін свечачны завод (2 працаўнікі). У панскіх маёнтках дзейнічалі 57 вадзяных і 36 ветраных млыноў.

Важнасць Брэсцкага павета для развіцця транзітнага гандлю прымушала мясцовыя ўлады клапаціцца пра дарогі і пераправы. У 1837 г. па тэрыторыі павета праходзілі 4 вялікія дарогі (99 вёрстаў), існавала 29 мастоў. Найважнейшымі шляхамі былі Валынскі і Пецярбургскі тракты.

У павеце было 7 гандляроў (усе яўрэі), якія займаліся традыцыйным гандлёвым абменам з Царствам Польскім. З 1822 г. да 1850 г. паміж Расіяй і Царствам Польскім існавала мытная мяжа. У Брэсцкім павеце знаходзілася 11 казённых кардонных дамоў: у Вялічкавічах, Дамачаве, Прыбараве, Камароўцы і г.д. У Брэсце была мытня 2-га класа, а ў мястэчку Уладаўка — мытня 3-га класа. Уладаўская мытня набірала да 40 тысяч рублёў пошліны.

У першай палове XIX ст. змяніўся сацыяльны і нацыянальны склад землеўладальнікаў на Берасцейшчыне. Далучэнне да Расіі заходніх тэрыторый стварыла магчымасці для новых зямельных падараванняў расійскаму дваранству. Раздаваліся былыя каралеўскія эканоміі і староствы, а таксама землі, адабраныя ў царкоўных устаноў і канфіскаваныя ў памешчыкаў. Сярод новых беларускіх землеўладальнікаў былі генералы і афіцэры царскага войска, чыноўнікі. Укараняючы рускае землеўладанне, царскі ўрад стварaў для сябе падтрымку на гэтых землях. У 1812—1813 гг. былі канфіскаваны маёнткі калабарацыяністаў, што супрацоўнічалі з войскам Напалеона. На гэтыя маёнткі быў накладзены секвестр, але пазней іх аддалі былым уладальнікам, якія вярнуліся на радзіму. Пасля паўстання 1830—1831 гг. у Заходняй Беларусі было канфіскавана 195 маёнткаў. На 1839 г. у Брэсцкім павеце было 2085 дваран. З іх толькі 14 радоў былі зацверджаны геральдыяй.

Велізарнае значэнне для развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі мела рэформа 19 лютага 1861 г. аб скасаванні прыгоннага права. Яна праводзілася ў адпаведнасці з «Общим положением» і «Местным положением», якое датычылася Гродзенскай губерні. У адпаведнасці з «Местным положением» сяляне на працягу 9 гадоў павінны былі ўтрымліваць свае надзелы і выконваць усе асноўныя павіннасці (паншчына, чынш), якія амаль не змяніліся. На паншчыне працавалі ўсе мужчыны ад 18 да 55 і жанчыны ад 17 да 50 гадоў 240—260 дзён у год. Улетку праца на паншчыне працягвалася 12 гадзін, зімой — на 3 гадзіны менш. Сяляне лічыліся часоваабавязанымі і атрымлівалі зямлю не ва ўласнасць, а ў пастаяннае карыстанне. Паны мелі права пакінуць сабе лепшыя землі, нават перанесці дзеля гэтага сялянскія сядзібы. Абнародаванне грабежніцкай рэформы выклікала новы пад'ём сялянскага руху. У красавіку 1861 г. сяляне Брэсцкага павета маёнткаў Ямна пана Кавальскага, Дамбровае графіні Канаўніцынай, Ляневічы пана Ягалкоўскага і іншых адмовіліся выконваць павіннасці на карысць уладальнікаў. Каб навесці ў гэтых маёнтках парадак, туды быў накіраваны батальён Велікалуцкага пяхотнага палка. Асабліва ўпартых сялян пакаралі розгамі, а трох чалавек, западозраных у падбухторванні да непакорнасці, зняволілі ў брэсцкую турму. У другой палове 1861 г. сялянскі рух пачаў супакойвацца. У 1862 г. большасць сялянскіх выступленняў былі скіраваны супраць «устаўных грамат», у якіх устанаўліваліся непасільныя выкупныя плацяжы.

У 1863 г., каб адцягнуць беларускіх сялян ад удзелу ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе, цар выдаў указ, падмацаваны і распараджэннем Віленскага генерал-губернатара М.М.Мураўёва. У сакавіку—кастрычніку 1863 г. часоваабавязанае становішча сялян ліквідавалася, яны пераводзіліся на выкуп і пераходзілі ў разрад сялян-уласнікаў. Землі, адабраныя ў сялян у 1857 г., вярталіся ў поўным аб'ёме. Аднак сяляне атрымалі найгоршыя землі без лясоў, часта без сенажацяў, паш і іншых угоддзяў. У Брэсцкім павеце на 100 дзесяцін сялянскай зямлі пад лясамі ўгоддзямі было 3,7 дзесяціны, а на 100 дзесяцін панскай зямлі — 42,5 дзесяціны.

Адзін з найбуйнейшых магнатаў Берасцейшчыны граф К.Грабоўскі пасля рэформы валодаў 11 маёнткамі. Агульная плошча яго ўладанняў складала 7975 дзесяцін — гэта больш за трэцюю частку ўсіх зямель Турноўскай воласці.

У Брэсцкім павеце пасля рэформы 1861 г. былыя прыгонныя сяляне (30 972 душы мужчынскага полу),

аб'яднаныя ў 269 абшчын, атрымалі 106 097 дзесяцін зямлі. З іх — 74 487 дзесяцін ворнай (на 1 душу мужчынскага полу прыходзілася 5,2 дзес.). 49,7 % зямлі (177 631 дзес.) заставалася ва ўласнасці паноў, 12,1 % (43 144 дзес.) належала дзяржаве, царкве і інш.

З развіццём капіталізму прыватнаўладальніцкая зямля рабілася аб'ектам продажу. Паступова павялічвалася зямельная ўласнасць багатых гандляроў, сялян, мяшчан. У 60—70-я гады XIX ст. сяляне Брэсцкага павета набылі 263 дзесяціны зямлі, з іх 154 дзесяціны ворнай. Аднак гэта толькі ў невялікай ступені магло паменшыць аграрны голад у вёсцы. Большасць сялян мусіла арандаваць землі ў паноў, шукаць заробкі па-за межамі ўласнай гаспадаркі. Кліматычныя ўмовы Брэсцкага павета спрыялі развіццю раслінаводства. У сярэдзіне павета глеба была найбольш плённая, на поўдні пачыналіся тарфянікі і балоты, у астатняй частцы павета глеба была пясчаная і патрабавала вялікай колькасці ўгнаенняў. На тэрыторыі павета было мноства невялікіх і сярэдняга памеру азёр, а таксама рэк, што стварала лішак вільготнасці глебы. Адным з галоўных заняткаў насельніцтва заставалася хлебаробства. У 60—70-я гады XIX ст. галоўнай таварнай культурай было жыта. Хлебны гандаль быў найважнейшай крыніцай прыбыткаў. Збожжа збывалі на ўнутраным і знешнім рынках. У 1876 г. было выдадзена 70 гандлёвых пасведчанняў 3-га разраду сялянам і 58 —прыказчыкам. У мястэчках Высокае, Камянец, Расічы і Уладаўка «торговали хлебом, дровами, скотом, хозяйственными снарядами, домашней посудою, лошадьми и разными съестными припасами». Павялічваліся і пасадкі бульбы, значная частка якой нараўне са збожжам ішла на вінакурства.

Для сялян Брэсцкага павета бульба была найважнейшым прадуктам харчавання і складала адну шостую частку пасеву. У панскіх гаспадарках бульба актыўна выкарыстоўвалася для вінакурства. Выраб спірту з бульбы быў больш прыбытковы, чым са збожжа, а высокі кошт на хлеб у 70-я гады XIX ст. прыносіў значны даход ад продажу хлебных тавараў. У 1877 г. у Брэсцкім павеце ўраджаі збожжавых склалі: пшаніцы — 20 263, жыта — 165 918 чвэрцяў, урадлівасць бульбы была 229 020 чвэрцяў.

У паляводчых гаспадарках Брэсцкага павета пераважала трохполле, папарныя палі ўгнойваліся. Сярэдні ўраджай жыта ў 1871 г. складаў сам 4, ячменю і аўса — сам 3, грэчкі — сам 3, гароху і проса —сам 4.

У сельскай гаспадарцы ўжывалася і наёмная праца. У 1877 г. у Брэсцкім павеце найміт зарабляў 20 рублёў за лета (на харчаванні наймальніка) і 40 рублёў за год на такіх самых умовах. Жанчына атрымлівала адпаведна 15 і 25 рублёў. Сельскагаспадарчая тэхніка заставалася вельмі простая — сохі ды бароны, сярпы ды косы. Механізацыя сельскай гаспадаркі толькі распачыналася ў панскіх гаспадарках. У некаторых маёнтках карысталіся машынамі для зграбання сена і малацьбы.

У сялян былі агароды, дзе вырошчваліся лён і пянька, гарох і боб. Усё гэта выкарыстоўвалася для хатніх патрэб. Агародніцтва развівалася і ў панскіх гаспадарках Брэсцкага павета. Сяляне, якія займаліся возніцтвам, развозілі па ўсёй губерні насенне агуркоў. Шырока распаўсюдзілася садоўніцтва. У гаспадарках каланістаў і ў панскіх садах раслі добрыя сарты сліў, груш, яблынь, агрэсту, маліны, парэчкі, а ў асобных гаспадарках нават вінаград і клубніцы. Уся палепшаная агародніна ішла на продаж. Зімовыя сарты груш і яблык вывозіліся ў Беласток, Гродна, а ад-

туль — у Пецярбург і часам у Варшаву.

Аграрны крызіс 80—90-х гадоў XIX ст. выклікаў раптоўнае паніжэнне цэн на збожжа, у выніку чаго панскія гаспадаркі пачалі спецыялізавацца на малочнай жывёлагадоўлі і вінакурстве. Многія паны стваралі прадпрыемствы для перапрацоўкі малочных прадуктаў. Але большасць здавалі дойны статак у арэнду скупшчыкам малака, якія пастаўлялі гэты прадукт на малочныя заводы і ў гарады. Заможныя сяляне, а таксама галандцы-каланісты Дамачаўскай воласці выраблялі сыр і масла на продаж. У буйных гаспадарках утрымоўваліся ад 50 да 100, у сярэдніх — ад 30 да 50, у дробных — ад 5 да 30 галоў жывёлы. У большасці сялянскіх гаспадарак жывёла была заняпалай пароды і амаль што не давала малака. Яго хапала толькі на хатнія патрэбы.

Важнай галіной жывёлагадоўлі ў Брэсцкім павеце было свінаводства. У панскіх гаспадарках павета гадаваліся свінні іаркшырскай, венгерскай і ютландскай парод. У 1876 г. у Брэсцкім павеце налічвалася 25 394 свіней.

У другой палове XIX ст. прыбытковым заняткам зрабілася авечкагадоўля. Грубашэрсная авечкагадоўля была тыповай для сялянскіх гаспадарак і мела спажывецкі характар, забяспечваючы сялян прадуктамі харчавання і адзеннем. Танкарунных авечак гадавалі ў панскіх гаспадарках. У 1876 г. у Брэсцкім павеце было 44 125 простых і 14 952 танкарунных авечак.

Для апрацоўкі зямлі сяляне трымалі валоў і коней. На 1876 год у павеце іх было 14 403. У 1877 г. у маёнтку Скокі надворны саветнік, камер-юнкер Іван Фадзеевіч Урсын-Німцэвіч стварыў конны завод, дзе гадаваў чыстакроўных англійскіх коней.

У другой палове XIX ст. на тэрыторыі Брэсцкага павета ўзнікае вялікая колькасць мануфактурных і фабрычных прадпрыемстваў — вінакурных, мукамольна-крупяных, лесапільных, цагельных і інш. Асноўная іх маса знаходзілася ў сельскай мясцовасці — бліжэй да сыравіны і таннай працоўнай сілы.

Збяднелыя сяляне (у канцы XIX ст. іх было больш за 25 000) займаліся адыходніцтвам: наймаліся на будаўніцтва шашэйных дарог і чыгунак, на сплаў лесу, ад'язджалі ў Маскву, Пецярбург, Адэсу, Лібаву. Кваліфікаваныя майстры (з каланістаў) за лета на адыходных промыслах зараблялі ад 70 да 100 рублёў і жылі больш заможна ў параўнанні з асноўнай масай сялян.

Амаль самым распаўсюджаным заняткам у Брэсцкім павеце было вінакурства. На 1877 г. у Брэсцкім павеце налічвалася 10 вінакурных і 7 піваварных заводаў, на якіх працаваў 71 чалавек. Яны выраблялі прадукцыю на суму 162 282 рублі. На многіх вінакурнях былі ўсталяваны паравыя машыны: у маёнтку Александрыя — у 1879 г., у маёнтку Вярховічы (уладальнік пан Канстанцін Рыт) — у 1895 г., у маёнтку Грышчыцы (пана Вітольда Войцехавіча Бухавецкага) — у 1879 г., у маёнтку Чамяры (уладальнік — правадзейны стацкі саветнік Пётр Рыгоравіч Пагодзін) — у 1879 г., у маёнтку Ямна — у 1857 г., у маёнтку Свечы — у 1908 г. На вінакурнях працавала звычайна каля 10 чалавек. Вось што пісаў у 1899 г. старшы фабрычны інспектар Гродзенскай губерні: «...Винокуренные заводы представляются неудовлетворительными ни со стороны технической, ни со стороны строительной, ни со стороны санитарно-гигиенической... Здания заводов преимущественно деревянные, выстроены много лет тому назад самым примитивным об-

разом и никаких утверждённых кемлибо планов не имеют... Рабочим элементом на винокуренных заводах, вследствие кратковременности и простоты производства, являются исключительно местные крестьяне, принужденные искать побочных заработков, и притом те из них, которые уже успели привыкнуть к работе и ее неприглядной обстановке... Едва только является возможность заменить работу в винокуренном заводе другим трудом, а особенно сельскохозяйственным, рабочие неизбежно начинают покидать завод...»[3].

Яшчэ ў 1930-я гады ў сувязі з будаўніцтвам Брэсцкай крэпасці ў павеце ўзнікаюць лесапільні і цагельні. Лесапільні з паравым рухавіком былі ў маёнтку Гузні (1884), урочышчы Лукоўшчына і ў вёсцы Дубішча (1884). Дзве лесапільні меліся ў Олтушскай воласці (1896). На лесапільнях звычайна працавала каля 20 чалавек.

Больш за ўсё было ў Брэсцкім павеце заводаў па вытворчасці цэглы, кафлі і чарапіцы. У 1877 г. было 6 цагельняў з 346 працаўнікамі, што выраблялі цэглы на 142 540 рублёў. У 1888 г. існавала цагельня і ў мястэчку Дамачава, якая належала княгіні Марыі Львоўне Гагенлоэ (3 працаўнікі); у 1887 г. — у маёнтку Зводы Лышчыцкай воласці ў пані Алены Гутоўскай. У 1896 г. цагельня Вільгельма Урэдэ (урочышча Лецкаўшчызна Матыкальскай воласці) з адным конным прыводам і 13 працаўнікамі вырабляла цэглы на 1800 рублёў. Завод правадзейнага стацкага саветніка А.П.Штэра ў маёнтку Чэрні (15 працаўнікоў) выпускаў адзін мільён цаглін на 5000 рублёў. А цагельня ў Камянец-Жыровіцкай воласці каля в. Гершановічы вырабляла каля 2 мільёнаў цаглін на 18 тысяч рублёў (36 працаўнікоў). У 1914 г. у Брэсцкім павеце было ўжо 23 цагельных і тры кафельна-чарапічных заводы.

У 1896 г. у Велікарыцкай воласці Брэсцкага павета пры сяле Чарняны працаваў шкляны завод «Рэута-Чарняны», што належаў тайнаму саветніку М.С.Галалобаву. На заводзе працавала больш за 300 чалавек.

Акрамя таго, у павеце былі гарбарныя, крухмальна-шкіпінарныя, маслабойныя і іншыя заводы. На 1902 г. у Брэсцкім павеце было 381 прамысловае прадпрыемства з 824 працаўнікамі, якія выраблялі прадукцыю на 527 тысяч рублёў.

У паслярэформенны перыяд ішло актыўнае развіццё таварна-грашовых адносін, развіваўся гандаль, які традыцыйна знаходзіўся ў руках яўрэйскіх гандляроў.

Насельніцтва павета займалася промысламі, у т.л. вытворчасцю драўлянага посуду і абутку. У 1842—1843 гг. асабістым промыслам займалася да 300 чалавек.

Вялізнае значэнне для развіцця гандлю ў павеце мелі кірмашы. На 1861 г. іх было 9: у мястэчку Расна 24 чэрвеня і 8 лістапада, Якаўлеўскі ў мястэчку Высока-Літоўск 24 чэрвеня, Юр'еўскі ў мястэчку Камянец-Літоўск 23 красавіка, Міхайлаўскі ў мястэчку Уладаўка 1 верасня і там жа Сямёнаўскі 8 лістапада, а таксама 3 кірмашы ў мястэчку Янава (Іванаўскі 24 чэрвеня, Успенскі 15—23 жніўня і Пакроўскі 1—16 кастрычніка).

Акрамя кірмашоў гандаль у павеце ажыццяўляўся праз скупшчыкаў, што ездзілі па сёлах і закуплівалі хлеб, жывёлу. Часам хлеб выменьваўся на соль і мыла.

Павятовы горад Брэст быў недалёка, і таму ў мястэчках актыўнага гандлю не вялося. Вось што пісаў пра мястэчка Дамачава ў 1898 г. «Сельский вестник»: «...Окружные крестьяне и колонисты по своим торговым, судебным и другим делам всегда



Карта Брэсцкага павета ў другой палове XIX ст. паводле В.Л.Насевіча.

переполняют Домачево. Кому нужно в волость, кому к приставу или к мировому, кому в лавку за покупкой, а кому и так — «себя показать и людей поглядеть. Поэтому здесь процветают корчмы.».[4] У мястэчку Дамачава было 3 карчмы, дзе гандлявалі гарэлкай і півам. Усяго ж у Брэсцкім павеце на канец XIX ст. было больш за 350 піцейных дамоў і на кожнага жыхара прыходзілася 7 вёдраў розных спіртных напояў, у тым ліку больш за 5 вёдраў гарэлкі. Масаваму п'янству спадарожнічаў нізкі санітарна-гігіенічны стан гарадоў, мястэчак і сёл Брэсцкага павета. Небрукаваныя вуліцы, залітыя памыямі, адкіды шматлікіх бойняў і іншае садзейнічала ўзнікненню эпідэмій. Так, у 1837 г. у горадзе Брэсце і павеце была эпідэмія халеры. Захварэла 849 чалавек, 80 з іх памерлі. Ужо ў 1843 г. у Брэсцкім павеце было дзве бальніцы, створаныя панамі для сваіх сялян: у мястэчку Высокае — князя Сапегі, а ў маёнтку Пруска — падпалкоўніка Насуржэўскага (яе называлі сялянскім лазарэтам). Пазней узніклі пасады павятовага ўрача, старшых і малодшых лекарскіх вучняў, фельчараў (па адным на кожны ўчастак),

а таксама 3 бабкі-павітухі. У канцы XIX — пачатку XX ст. у павеце ўзнікае і пасада фабрычнага ўрача. Пэўныя медыцынскія паслугі аказвалі таксама цырульнікі (ад 5 да 11 на павет).

З 1887 г. Брэсцкі павет быў падзелены на 2 урачэбныя ўчасткі. У першы ўчастак уваходзілі Жыцінская, Турноўская, Косіцкая, Матыкальская, Ратайчыцкая, Лышчыцкая, Войская, Дзмітравіцкая, Высокалітоўская, Воўчынская, Вярховіцкая, Палавецкая і Камянец-Літоўская воласці. У мястэчку Чарнаўчыцы, сёлах Чэрні, Ратайчыцы, мястэчку Вярховічы і іншых былі фельчары. У Камянцы была сельская лячэбніца на 6 ложкаў, у Вярховічах і Чарнаўчыцах — прыёмныя пакоі на 1 ложак. У 1901 г. на гэтым участку працавала ўжо 5 урачоў, 10 фельчараў і 3 бабкі-павітухі. На ўтрыманне аднаго сельскага ўрачэбнага ўчастка ў 1898 г. было выдаткавана 3937 рублёў 13 капеек.

Урач другога сельскага ўчастка жыў у Дамачава. Ва ўчастак уваходзілі Дамачаўская, Прыбараўская, Мяднянская, Камянец-Жыровіцкая, Маларыцкая, Олтушская, Велікарыцкая і Радваніцкая воласці. Фельчары жылі ў сяле Велікарыта; у сёлах Радзеж, Страдзеч былі прыёмныя пакоі, у Дамачава — сельская лячэбніца на 6 ложкаў і прыёмны пакой. На мяжы стагоддзяў колькасць прыёмных пакояў у павеце павялічылася да 13.

Што ж тычыцца богаўгодных устаноў, то іх у Брэсцкім павеце не было.

Яшчэ адной праблемай была народная адукацыя. Большасць сялян былі непісьменныя. На 1837 г. у Брэсцкім павеце не было ні гімназіі, ні павятовага вучылішча. Існавала толькі адно прыходскае вучылішча з 1 настаўнікам і 35 вучнямі. З 1884 г. у павеце ўзнікаюць царкоўнапрыходскія школы. У названым годзе ў трох школах навучалася 116 чалавек. У 1889 г. было ўжо 8 царкоўнапрыходскіх школ і 29 школ пісьменнасці, дзе вучыліся 1075 праваслаўных дзяцей і 26 католікаў. У 1890 г. колькасць школ пісьменнасці павялічылася да 46 (1449 вучняў). Царкоўнапрыходскія школы былі самымі таннымі навучальнымі ўстановамі — за навучанне плацілі да аднаго рубля на чалавека, а за школу пісьменнасці — па 50 капеек з хлопчыка. У 1900 г. у мястэчках Дамачава, Чарнаўчыцы, Воўчын, Мілейчыцы, Вярховічы, Высокае існавалі народныя вучылішчы. За навучанне ў вучылішчы плацілі «сыпкой до 12 четвертей 6 четвериков картофеля и 45 рублей деньгами, кроме ремонта училища, мебели и классных принадлежностей». Гэта перашкаджала адукацыі сялянскіх дзяцей. Адпаведна перапісу 1897 года, 71,5% насельніцтва павета заставаліся непісьменнымі.

ВОЙНЫ І ПАЎСТАННІ XIX СТАГОДДЗЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА

На пачатку XIX ст. шматпакутнай Беларусі давялося перажыць яшчэ адну жахлівую вайну — нашэсце войскаў Напалеона ў 1812 г. Па тэрыторыі Брэсцкага павета наступаў 7-ы пяхотны корпус генерала Рэнье, корпус складаўся з саксонцаў і аўстрыйцаў. Калі напалеонаўскія войскі перайшлі межы Расіі, царскія ўлады загадалі адправіць у тыл разам з ар'ергардам рускіх войскаў прадстаўнікоў мясцовай шляхты, якія лічыліся ненадзейнымі: прадвадзіцеляў дваранства Станіслава і Івана Німцэвічаў, графа Івана Грабоўскага, старшыню павятовага суда Івана Палхоўскага, чыноўнікаў па выбарах дваранства Міхася Чачкоўскага, Фёдара Паеўскага, Людвіга Лышчынскага, Ігнація Чарнецкага і інш.

У канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1812 г. горад Брэст і павет занялі

аўстрыйскія войскі. Адразу пасля гэтага мясцовыя паны, члены павятовага і гарадскога судоў (адстаўны генерал Войскаў Польскіх Франкоўскі, палкоўнік Сцяпан Грабоўскі і інш.) «составили акт конфедерации, подали оный к припечатанию и всенародному объявлению в «Варшавском вестнике». Следствием чего учредили комиссию под наименованием Временной военно-гражданской комиссии для соблюдения порядка»[6]. Гэтая камісія выконвала ўсе патрабаванні напалеонаўскіх улад. Ядро камісіі склалі паны Іосіф Швыкоўскі, Казімір Каржанецкі, Антоній Турскі і інш.

Пасля стварэння Напалеонам у Вільна камісіі Часовага ўрада Вялікага княства Літоўскага на беларускіх землях пачалі ўзнікаць яго філіялы. У Брэсце і павеце ўтварылася падпрэфектура на чале з панам Аляксандрам Бухавецкім, сакратаром абралі Фаму Падгурскага. Па загадзе «літоўскага ўрада» беларускія губерні павінны былі пастаўляць рэкрутаў французскаму войску. З Брэсцкага павета ўзялі 329 чалавек у пяхоту, 139 у кавалерыю, 107 у жандары, 126 у гвардыю і 20 у стральцы. На патрэбы рэкрутаў было сабрана 72 816 рублёў і 55 кажухоў. Акрамя таго, ад павета патрабавалі 12 000 вазоў дроў.

Цікава, што яўрэйскае насельніцтва Берасцейшчыны не прыняло «новы парадак» Напалеона і актыўна выступіла на баку Расіі. «...Коварные евреи, говорит Верховное Правление в своем предписании, не благодарные стране, их питающей, преимущественно занимаются шпионством в пользу неприятеля. Посему поручить подпрефектам обращать на них особое внимание, так чтобы без паспорта никто из евреев не смел с одного места переноситься на другое, а паспорты позволено выдавать только таким, за которых поручится и обяжется отвечать кагал»[7].

Пасля адступлення ў верасні 1812 г. саксонскае войска аб'ядналася каля Луцка з аўстрыйскім і абодва адышлі праз мястэчка Уладава, сяло Руду, горад Брэст-Літоўск да Высока-Літоўска. У час пераправы праз раку Лясную каля маёнткаў Клейнікі (пана Красоўскага), Церабунь і Вістыч (пана Шаміёта) адбылася бітва з рускімі войскамі. «... При сем погибло 2000 неприятелей и 1000 наших. Деревни же во время сражения сгорели со всем имуществом. Неприятель, избегая преследования, снял мост с реки. Русские войска по понтонным мостам перешли лесную и прогнали неприятеля в Белостокскую область».[8]

Да камандуючага рускім войскам адмірала П.В.Чычагова быў прыкамандзіраваны прапаршчык Артамон Захаравіч Мураўёў (1794—1846) — у далейшым вядомы дзекабрыст, член «Саюза дабрабыту» і Паўднёвага таварыства, асуджаны на 20 гадоў катаргі. З 22 верасня 1812 г. ён браў удзел ва ўсіх баявых аперацыях па праследаванні аўстрыйскіх і саксонскіх войскаў праз мястэчка Люблін да Брэст-Літоўска, а таксама ў сутычцы 29 верасня пры вёсцы Клейнікі на рацэ Лясной. У 37-м егерскім палку служыў будучы член «Саюза дабрабыту» і Паўднёвага таварыства дзекабрыстаў Канстанцін Аляксеевіч Ахотнікаў (? — 1824), які таксама браў удзел у бітве каля Клейнікаў. У баях пад Брэст-Літоўскам удзельнічалі будучыя дзекабрысты: паручык І.І.Сухінаў (1795—1828) — член «Таварыства з'яднаных славян», актыўны ўдзельнік паўстання Чарнігаўскага палка; капітан В.К.Тызенгаўзен (1781—1857) — член Паўднёвага таварыства; маёр І.М.Хацяінцаў (1785—1863) — член «Саюза дабрабыту».

З 28 верасня 1812 г. галоўная кватэра заходняга войска пад камандаваннем адмірала Чычагова была пе-

ранесена ў маёнтак пана Пекарскага — сяло Ямна Брэсцкага павета, а 30 верасня — у Брэст-Літоўск. Адмірал Чычагоў і яго штаб знаходзіліся ў Брэсце 15 дзён. Яны займалі адну з кватэр у доме купца Віналада. 13—25 лістапада адбылася бітва каля мызы Жыравецкай Камяніцы Брэсцкага павета: рускія войскі генерала Сакена сутыкнуліся з аўстрыйцамі Шварцэнберга.

23 снежня Брэсцкі павет быў вызвалены. Ваенныя дзеянні і вялікая колькасць войскаў нанеслі значную шкоду мясцовым жыхарам. Летам 1812 г. у павеце 11 дзён кватаравала аўстрыйскае войска князя Шварцэнберга. «...Означенная армия получала продовольствие от обывателей Брестского уезда по учиненному на то временною комиссиею распоряжению», 25-тысячнае рускае войска адмірала Чычагова таксама харчавалася ў Брэсцкім павеце. Цікава, што «... все те города, села и деревни, где проходил неприятель, разорения, кроме дачи продовольственных припасов, не потерпели»[9]. Дыслакацыя ж рускіх войскаў у павеце «... причинила значительный урон жителям, несмотря на то, что Чичагов делал все возможное вспомоществование и на требования свои постоянно давал квитанции. Жители Брестского уезда, оставляя свои жилища, скрывались в лесах, от этого наши войска встречали затруднения в отыскании продовольствия, тем более, что подвижные запасные магазины нашей армии не могли следовать за нею по быстроте движений».[10]

Страты насельніцтва Брэсцкага павета (разам з горадам Брэстам) ад нашэсця ворагаў склалі 429 479 рублёў 8,5 капеек срэбрам і 49 900 рублёў 40 капейкі асігнацыямі. Да рускага ж войска жыхарамі павета было прад'яўлена прэтэнзій на 402 231 рубель 45 капеек срэбрам і 25 518 рублёў 88 капеек асігнацыямі.

Панскія маёнткі з 30 чэрвеня да 12 верасня 1812 г. панеслі ад аўстрыйскіх, саксонскіх і французскіх войскаў шкоду на 70 300 рублёў 20 капеек срэбрам, а ад рускага войска — 43 783 рублі 9,5 капейкі срэбрам. Царская казна кампенсавала толькі страты на харчаванне, адабранае рускім войскам, што, вядома ж, не магло аплаціць вялікую шкоду, нанесеную вайной.

Паводле рашэнняў Венскага кангрэса (1814—1815), усходняя частка Варшаўскага герцагства, так званае Царства Польскае, была перададзена ў склад Расіі.

У ноч на 29 лістапада 1830 г. у Варшаве выбухнула паўстанне, якое неўзабаве ахапіла ўсё Царства Польскае. Намеснік цара ў Польшчы вялікі князь Канстанцін Паўлавіч мусіў выехаць з Варшавы. Польскае войска перайшло на бок паўстанцаў. 20 снежня 1830 г. польскі Сейм прыняў «Маніфест польскага народу» і абвясціў мэту паўстання — аднаўленне польскай дзяржавы ў межах 1772 г. 20 студзеня 1831 г. ён пазбавіў дынастыю Раманавых і Мікалая I польскай кароны. Рускія войскі пачалі сцягвацца да меж Царства Польскага.

Рускі корпус генерала барона Розена, які стаяў каля Брэста, выконваў загараджальныя функцыі: імкнуўся не даць паўстанню перакінуцца на заходнія беларускія і ўкраінскія землі. Аднак і на тэрыторыі Брэсцкага павета адбываліся ўзброеныя сутыкненні з паўстанцамі. 23 мая 1831 г. польскі атрад Д.Хлапоўскага разбіў войска генерала Мігдэна каля Гайнаўшчызны. Крыху пазней польскі атрад палкоўніка Ружыцкага пераправіўся праз Буг і, жадаючы прайсці ў глыб Літвы, рушыў уздоўж заходняй мяжы Брэсцкага павета — праз Драгічын і Сямяцічы. 24 ліпеня Ружыцкі перарваў сувязь паміж Брэстам і Гродна, захапіўшы ў палон рускага генерала

Панюціна, які ехаў на пасаду начальніка штаба арміі І.Ф.Паскевіча. Руская кавалерыя спрабавала выгнаць палякаў за Буг, аднак Ружыцкі здолеў адысці ў Белавежскую пушчу. 25 чэрвеня каля вёскі Лясная адбылася бітва. Польскія пазіцыі былі на ўзгорках, іх прыкрывала рака Лясная. У атрадзе Ружыцкага было 900 чалавек, у тым ліку: Калішскі эскадрон, афіцэрскі эскадрон з Ловіча, татарскі ўзвод (40 коннікаў) і атрад у 250 пешых стралкоў Кушаля, а таксама 2 гарматы і афіцэрскі атрад палкоўніка Абуховіча. Рускі атрад генерала Боглена быў значна большы, і пасля некалькіх гадзін бою Ружыцкі адышоў на поўнач.

Вясной 1831 г. непадалёк ад Брэста дзейнічалі атрад Юзафа Двярніцкага і Войцеха Гржаноўскага. Аб'яднаўшыся, яны рушылі на Валынь, дзе некалькі разоў перамагалі ў сутыкненнях з рускімі войскамі. Магчыма, менавіта там быў паранены камандзір 3-й брыгады, рускі генерал П.Д.Пхеідзе, пахаваны на тэрыторыі сучаснага Брэсцкага раёна. У эпітафіі на яго магіле гаворыцца: «Здесь погребено тело командира 3 Бригады 2 Пехотной Дивизии Генерала-Майора Князя Павла Давыдовича Пхеидзе, умершего 4 июля от раны, полученной в сражении 14 апреля 1831 года».

Ваенныя падзеі лета 1831 г. і непасрэдная пагроза гораду Брэсту прымусілі камандзіра 6-га пяхотнага корпуса рускага войска генерала Розена загадаць зламаць прыватныя дамы, якія знаходзіліся паблізу ад умацаванняў. Да 22 жніўня было знесена 100 дамоў на Валынскім фарштаце, а 22 жніўня «... при покушении на город мятежников и начатии потому военных действий сожжено... против границы Царства Польского 14 домов. Из мостов же на реке Буг и Тереспольской плотине состоящих сожжены один за границею, при пограничной рогатке вместе с оною и будкой прикараульных, а другой на Тереспольской плотине. Казенный таможенный дом снят до основания»[12].

У канцы жніўня паўстанне на Беларусі было амаль падаўлена. 8 верасня рускія войскі захапілі Варшаву. Гэтая вестка прымусіла рэшткі паўстанцкіх атрадаў, што яшчэ заставаліся ў лясах, разысціся.

Распачаліся рэпрэсіі над удзельнікамі паўстання і іх прыхільнікамі. Шмат хто трапіў у турмы ці эмігрыраваў. Па Гродзенскай губерні ўлады канфіскавалі 70 шляхецкіх маёнткаў. У Брэсцкім павеце былі забраны ў казну маёнткі былога павятовага прадвадзіцеля дваранства Карла Нямцэвіча, які камандаваў атрадам мяцежнікаў у Белавежскай пушчы, канфіскаваны і маёнткі Скокі, Адамкова, Клейнікі, што належалі братам Карлу і Фадзею Німцэвічам. Неўзабаве пасля паўстання за сувязь з яго ўдзельнікамі і знаходжанне пасквільных вершаў быў арыштаваны чарнаўчыцкі ксёндз Замяхоўскі.

Нацыяналістычныя хваляванні берасцейскай шляхты ўзмацніліся ў другой палове 40-х гадоў XIX ст. У 1846—1848 гг. быў усталяваны паліцэйскі нагляд за панамі Брэсцкага павета князем Сапегам і іншымі па падазрэнні ў іх нядобранадзейнасці і ўваходжанні ў тайнае таварыства.

У 1863 г. распачалося новае нацыянальна-вызваленчае паўстанне. Зноў Берасцейшчына пераўтварылася ў арэну баявых дзеянняў. Тэрыторыя павета спрыяла вядзенню партызанскай вайны.

У Брэсцкім павеце сфарміраваўся атрад Стасюкевіча (300 чалавек), які складаўся з дробнай шляхты, казённых сялян і гарадскіх жыхароў.

У адпаведнасці з планамі гродзенскай паўстанцкай арганізацыі, губерня павінна была ўяўляць сабой адно

ваяводства, якое падзяляецца на тры часткі. Цывільным ваяводам Брэсцкага павета і сумежных быў прызначаны Апалон Гофмейстар. Неўзабаве паўстанцы распачалі ваенныя дзеянні. 11 студзеня 1863 г. брэсцкі гараднічы Г.Зайчыкаў паведамляў пра становішча ў Брэсце і наваколлі наступнае: «...Ночью с 10 на 11 число сего месяца толпа народа напала в местечке Кодно... на военных чинов, обезоружила всех, забрала казенный ящик с деньгами, а солдат, защищавшихся, перебила и что толпа эта была вооружена как огнестрельным, так и холодным оружием»[13]. Трывожнае становішча ў Брэсце і яго наваколлі захоўвалася доўгі час. 7 лютага гараднічы Зайчыкаў паведамляў пра з'яўленне паўстанцаў і меры па барацьбе з імі: горад і крэпасць знаходзіліся ў стане баявой гатоўнасці, за жыхарамі горада, асабліва за моладдзю ўсталявалі строгі нагляд, арыштавалі 5 працаўнікоў карэтнай фабрыкі на Кобрынскім фарштаце за спробу далучыцца да паўстанцаў.

Усяго на Берасцейшчыне адбылося каля 30 узброеных сутыкненняў паўстанцаў з рускімі войскамі. Вось некаторыя з іх: 23 студзеня — Кодзень і Ламазы, 15 лютага — Рэчыца, 15 красавіка — Вулька-Плябанская, 28 красавіка — Уладава, 27 мая — Чэрск, 11 ліпеня — Славацічы і Дамачава, 15 кастрычніка — Уладава і 10 снежня —каля Брэст-Літоўска.

Галоўным апорным пунктам рускіх была Брэсцкая крэпасць з моцным гарнізонам і артылерыяй. У мястэчках павета стаялі розныя па колькасці людзей і ўзбраенні рускія атрады генералаў Мамаева, Носціна і А.Ф.Эгера. З боку паўстанцаў ім процістаялі атрады Р.Рагінскага, Развадоўскага, Чапінскага, А.Шаняўскага, А.Радаўніцкага, Наўроцкага, Багуслаўскага, В.Левандоўскага, К.Крысінскага, Чарнецкага, Стасюкевіча, Гржымалы, Р.Траўгута, К.Нарбута, Э.Кярсноўскага, В.Урублеўскага і многіх іншых.

Паўстанне было задушана, распачаліся новыя масавыя рэпрэсіі. Апошнім акордам паўстання была смерць легендарнага партызана-паўстанца ксяндза Станіслава Бжозкі, павешанага рускімі вайсковымі ўладамі 24 мая 1865 г. у Сакалове-Падляскім і перавезенага ўначы ў Брэсцкую крэпасць, дзе яго патаемна пахавалі на адным з валоў.

Царызм люта расправіўся з удзельнікамі паўстання: 128 пакараных смерцю, 12 483 сасланых у Сібір. Маёнткі шляхты, што мела дачыненне да паўстання, былі канфіскаваны; замест касцёлаў адкрываліся праваслаўныя цэрквы. Да канца 1860-х гадоў у краі захоўвалася ваенная дыктатура. Палітыка царызму на Беларусі пераўтварылася ў тыпова каланіяльную. Мэтаю гэтай палітыкі зрабілася татальная русіфікацыя краю.

Я.С.Разянблат.

Крыніцы:

1. Сельский вестник. 1898. № 8. С. 96.
2. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 427. Л. 93.
3. Белоруссия в эпоху капитализма. Мн., 1990. Т. 2. С. 224—225.
4. Сельский вестник. 1898. № 8. С. 97.
5. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 458. Л. 15.
6. Там жа. Ф. 1. Воп. 19. Спр. 1141. Л. 77.
7. Там жа. Ф. 1. Воп. 19. Спр. 1141. Л. 132 (адв).
8. Там жа. Ф. 1. Воп. 19. Спр. 1141. Л. 137, 137 (адв.).
9. Там жа. Ф. 1. Воп. 19. Спр. 1141. Л. 77.
10. Там жа. Ф. 1. Воп. 19. Спр. 1141. Л. 137, 137 (адв.).
11. Рубашевский Ю. Памятник с заросшею тропою // Вечерний Брест. 1996. 14 июня.
12. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 1. Воп. 3. Спр. 1111. Л. 1—4.
13. Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг. М., 1965. С. 337.

Дакументы сведчаць

СПРАВАЗДАЧА ПАВЯТОВАГА ПРАДВАДЗІЦЕЛЯ ДВАРАНСТВА ЗА 1831 ГОД У ВЫГЛЯДЗЕ ПЫТАННЯЎ І АДКАЗАЎ

1. Земли вообще находятся в помещичьих имениях по Брестскому уезду:
под усадьбами — 6,891 1/2 десятин,
под пашнями — 155,333 1/2 десятин,
под сенокосами — 38,305 десятин,
под выгонами — 49,000 десятин,
неудобной — 17,803 десятины,
неопределенного качества и под лесами — 68,321 1/2 десятина,
а всего — 335,654 1/2 десятины.

Недостатка земли по Брестскому уезду крестьяне не имеют и от сего происходит большое затруднение в найме работников для хлебопашества.

В о п р о с: *Сделаны ли какие-нибудь нововведения относительно улучшения сельского хозяйства?*

О т в е т: Нововведений никаких и никем не сделано.

В о п р о с: *Какие имения считаются образцовыми в Брестском уезде по хозяйству?*

О т в е т: Отличительных образцовых имений по хозяйству не имеется в Брестском уезде по малочисленности работников и капиталов.

В о п р о с: *Какие земледельческие орудия употребляются преимущественно и не введено ли употребление машин?*

О т в е т: Сохи и бороны обыкновенного образца употребляются для хлебопашества, как равно серпы и косы... В некоторых имениях заведены особые машины для гребания сена, весьма практичные... в экономии работников. Машины для сева и жатвы оказались еще не практическими, почему и не введены в употребление; машины же для молотьбы существуют (но с большим изъяном). Удобрение земли производится от навоза при разведении скотоводства и пастьбы оного на винокуренных заводах, но при частых падежах скота... самая главная отрасль удобрения земли уменьшилась, а тем самым и сельские хозяйства приведены в довольно скудное положение.

В о п р о с: *Где и в каких количествах разводятся лён, конопля, табак и хмель?*

О т в е т: Разведением хмеля жители Брестского уезда не занимаются. Льну, конопли, табаку разводят только сколько необходимо на домашние надобности, отнюдь же не для торговли. Табак сеется в довольно большом количестве и только крестьянами в лесных местах для курения.

Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 253. Л. 4—5.

СА СПРАВАЗДАЧЫ Ў ГРОДЗЕНСКІ ГУБЕРНСКІ СТАТЫСТЫЧНЫ КАМІТЭТ

22 лістапада 1836 г.

СОСТАВЛЕННОЕ ИЗ РАЗНЫХ ЗАПИСОК И СВЕДЕНИЙ ОБЩЕЕ ОБОЗРЕНИЕ РЕКИ ЗАПАДНЫЙ БУГ И ТОПОГРАФИЧЕСКОЕ ОПИСАНИЕ ОНОЙ ПО ЗАПАДНОЙ ГРАНИЦЕ ГРОДНЕНСКОЙ ГУБЕРНИ

Составитель — действительный статский советник Егор Райский

Описание реки Западный Буг от местечка Влодава до местечка Немирова

По случаю строительства крепости в Брест-Литовске надобность в лесном товаре весьма... увеличилась..., главная часть лесу как строевого, так и дровяного, доставляемая к сему городу, приплавливается по реке Бугу весною из Волынского Полесья с уездов Владимирского, Ковельского и проч.

Окрестности Влодавы и деревни Ореховки. О ярмарке в местечке Влодаве

В местечке Влодаве сосредотачиваются 4 большие проезжие дороги: из Волыни от Любомля и Луцка, из уезда Польского от Люблина и Варшавы, и наконец дорога из Брест-Литовска. Таковое центральное положение местечка Влодава способствует немало к торговым в оном оборотам и для сего учреждены в местечке сем ежегодные ярмарки, одна 15 августа, а другая — 1 октября, из коих первая продолжалась дней 5, а вторая — около двух недель. Ярмарки учреждены были для торговли на оных рогатым скотом, пригоняемым из южных про-

Сялянкі Брэст-Літоўскага павета.

винций России… Состоит большей частью из украинских быков. Скота сего бывает обыкновенно на первой ярмарке в августе — от 4 до 6000, на второй — от 6 до 12 тысяч.

Выкормленные быки доставляются большей частью на продажу в Варшаву, Краков, частью в Вильно и иногда в Пруссию, что однако же случается весьма редко. На ярмарки приводятся также отчасти российские степные лошади и лошади польские заводские, каковые закупаются по большей части жителями и купцами уезда Польского. Прибывают также иногда на сии ярмарки разносчики из российских коренных губерний с красным и мелочным товаром, но не в большом количестве.

Паромы

Между Влодавкой и Славатичами находятся лишь два парома на реке Буг — один при селе Ружанка и один против Славатич, из коих всякий может вместить на себе человек 30 пеших.

Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 639. Л. 59—65.

РАПАРТ БРЭСЦКАГА ЗЕМСКАГА СУДА АБ СТАНОВІШЧЫ Ў БРЭСЦКІМ ПАВЕЦЕ Ў 1837 ГОДЗЕ

1. Движение народонаселения. Крестьяне новыми поселениями наделены не были и переселение оными из одной губернии в другие не случилось.

2. Состояние народного здоровья. Жители сего уезда, кроме обыкновенных, особенными болезнями не страдали, исключая местечко Высоко-Литовское… в котором было появилась эпидемия холеры… Оною заболевших было 259, выздоровело 209, умерло 50.

Больниц гражданского ведомства в Брестском уезде не состоит. Карантинов учреждено не было.

Падеж скота был. В основном пострадало казенное имение Прилуки.

3. Состояние народной нравственности. Народная нравственность жителей Брестского уезда ничего замечательного в худшем отношении к себе не имеет. Помещики, занимаясь хо-

зяйственною промышленностью, а крестьяне — хлебопашеством и простым рукоделием, повинуются законам и правительству, спокойные характером, в навыках, пороках и склонностях ничего особого не обнаруживают. Совращения из православной веры... не случалось...

Число преступлений отдельно по родам и степени важности следующее:

самоубийств — 5;

убийств случайных и неумышленных: в драке — 1, неумышленное — 1;

подкинутых младенцев не находили;

зажигательство — 1; по оному сгорел один господский дом, погибших не было, виновные открыты, всего их двое; грабежей и разбоев не случалось;

воровство происходило в церкви — 1, в доме — 1, виновные открыты и похищенное возвращено;

фальшивой монеты выделываемо не было;

укрывающихся военных дезертиров, других беглых и бродяг найдено 62...

Общественный порядок и тишина нарушаемы не были.

Городов, посадов, местечек, селений, ярмарок и торгов вновь учреждаемо не было.

4. Устройство дорог и переправ. Устройство шоссе предположено по Петербургскому тракту, а досего все большие и просёлочные дороги состоят в прежнем положении и содержатся в должной исправности, по управительному распределению между жителями учинённому дорожною комиссиею, по Волынскому и Санкт-Петербургскому почтовым трактам для улучшения песчаного пути произведена настилка вересом. Судоходные реки Буг и Мухавец — торговля по оным отправляется только весною не далее июня месяца, а за сим по недостаточности наводнения прекращается. Реки сии естественные. Искусственных водяных путей не имеется...

6. Состояние хозяйства и промышленности. Земледелие усовершенствовано и приведено к отличнейшему состоянию и выручаемый из оного озимый и яровой хлеб достаточен для продовольствия народонаселения постоянного и временного и часть обращается на выкурку горячего вина, которое по Брестскому уезду отличается добротою и изобилием. Рогатого скота, отличающегося особенною крупностью либо качеством, не имеется, а также и лошадей отменной породы и никаких заводов не находится. Овцеводство состоит в возвышенной степени доброты и число овец разной породы, в котором имеются мериносовые и гишпанские, простирается до 100 тысяч. Шерсти у оных собирается на сумму до 200 000 рублей ассигнациями и та избывается продажею во внутрь России и в Царство Польское. Пчеловодство здесь не обращает большого внимания в хозяйственной промышленности, шелководства вовсе нету, состояние и степень торговли обозначено в ведомостях... изменения противу прошлых лет не происходило.

Мануфактурных заведений, фабрик и заводов учреждаемо не было... впрочем сельские жители вообще склонности и охоты к занятиям высшим ремеслом не обнаруживают.

В истекшем году рекрутского набора не было...

Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 1. Воп. 19. Спр. 1556. Л. 149—154.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГУБЕРНАТАРА ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ ЗА 1837 ГОД

Мещане делятся на христиан и евреев. Первые составляют в сравнении с евреями едва двадцатую долю населения городов, происходят частью от туземцев, а немногие, преимущественно в городах Гродно и Брест, от поселившихся в здешнем крае иностранцев. Лишь некоторые из них занимаются торговлею, прочие, особенно в уездных городах, суть хлебопашцы, безграмотные, не имеющие ни малейшей образованности и склонные к тунеядству и пьянству. Евреи-мещане завладели торговою и ремесленною промышленностью в городах, главнейшею частью недвижимой собственности и денежных капиталов. О навыках и пороках исконно сего народа не распространяюсь, они слишком известны.

Большая часть крестьян Гродненского и Лидского уездов суть веры католической, говорят свойственным лишь этому краю литовским языком и по всему... происходят от древних местных жителей.

Крестьяне же прочих уездов губернии почти все без изъятия исповедают греко-униатскую веру, говорят испорченным русским языком и суть вероятно потомки выходцев славянского племени...

Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 1. Воп. 19. Спр. 1556. Л. 285—287.

ЛІСТ ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРА ГРОДЗЕНСКАМУ ЦЫВІЛЬНАМУ ГУБЕРНАТАРУ АБ УСТАНАЎЛЕННІ ПАЛІЦЭЙСКАГА НАГЛЯДУ ЗА КНЯЗЕМ САПЕГАМ І ІНШЫМІ ПАМЕШЧЫКАМІ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА Ў СУВЯЗІ З ПАДАЗРЭННЕМ ІХ У НЯДОБРАНАДЗЕЙНАСЦІ І АРГАНІЗАЦЫІ ТАЙНАГА ТАВАРЫСТВА

1 сакавіка 1846 г.

После предложения моего Вашему Превосходительству от 10 декабря 1845 г. за № 1664 об открытии, не существует ли между помещиками Брестского уезда каких тайных неблагонамеренных замыслов, мною получено вновь сведение, что некоторые дворяне и помещики вверенной Вам губернии по поведению своему и образу мыслей навлекают на себя подозрение в неблагонамеренности их к правительству и даже в составлении между собою тайного общества, что лица, на коих может упадать это подозрение, суть следующие: Феликс Пониквицкий, Франц Чарноцкий, Иван Чарноцкий, Роман Пониквицкий, арендатор имения Ковальский, Мартин Якубовский, Егор Гажич, Феликс Веловейский, Александр Веловейский, Иван Швыковский, Иосиф Яголковский, Эдуард Тельшевский, Михаил Телятицкий, Викентий Матусевич, Коронат Поплавский, лекарь Тараевич и князь Ксаверий Сапега; что все эти лица, кроме последнего, отличающиеся своим костюмом, длинными усами и бородами, по близкому их между собою родству, часто собираются друг у друга, особенно у Пониквицкого, Гажича и Ковальского, поют национальные, сочиненные во время мятежа песни и сообщают один другому заграничные политические новости.

Вследствие сего, признав необходимость независимых мер, принятых со стороны Вашего Превосходительства по означенному моему предложению, командировать в Брестский уезд испытанного... в благонадежности и в благоразумной распорядительности советника Виленского губернского правления надворного советника Вендзягольского.

Генерал-губернатор.

Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 1. Воп. 21. Спр. 112. Л. 1—1 адв.

ПРА СТАНОВІШЧА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА ПА ДРУГІМ СТАНЕ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА. АДКАЗЫ НА ПУНКТЫ

14 жніўня 1871 г.

Землевладение

1. Система хозяйства во II стане Брестского уезда вообще существует трехпольная, паровые поля удабриваются и посевов без удобрений не бывает.

2. Две части личных землевладельцев обрабатывают поля сами и нанимают работников, одна часть сдает в аренду. Значительных купеческих хозяйств не существует... Средний урожай ржи сам 4, ячменя и овса — сам 3. Гороху и проса — сам 4...

4. Из корнеплодных картофель, из масличных — лен и пенька; стручковых — горох и бобы. Все эти растения, кроме картофеля, сеются в огородах и исключительно употребляются для домашней надобности, а в особенности картофель, который составляет шестую часть посева...

Жилища топят дровами.

Луговодство и скотоводство

Приблизительно занята покосами одна четверть земель, специальных пастбищ не имеется, скот преимущественно пасется по лесным пастбищам и паровым полям.

Скотоводство преимущественно для домашнего обихода. Количество скота в крупных хозяйствах от 50 до 100 штук, в средних от 30 до 50 и в мелких от 5 до 30 штук.

Постройка крестьянских домов самая простая. Дома одноэтажные, крыши на изгибах крутые, здания как крестьянские, так и владельческие по большей части крыты соломою без глиняной смазки, обыкновенным способом без украшений.

Избы строятся без фундаментов. В избе комната, сени и чулан. При избах лестниц нет.

Окна обращены к улице, при них нет украшений.

Окна в избах на улицу и на двор, строения расположены рядами, без промежутков прямою улицей. Площадей нет. Церкви и дома духовных лиц по большей части расположены посредине селений. Помещичьи усадьбы образуют отдельные посёлки.

Селения расположены вблизи лесов и в малой только части при больших дорогах.

В некоторых местностях разрабатывается строительная глина.

Из кирпичных заводов: казенных отсылается кирпич оптом в Брестскую крепость для постройки, а из частных — на местное употребление.

Освещение

Сельское население исключительно освещает свои жилища лучиною.

Отхожие промыслы

К составу местного населения плотников мало и для работ в другие губернии не выходят.

14 августа 1871 г. Брестский уездный пристав II стана

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г.Гродна. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 256. Л. 5—8.

СПІС НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА, ДВАРОЎ І СЯДЗІБ У ІХ З ПЕРАЛІКАМ ВУЛІЦ І ЎЛАДАЛЬНІКАЎ НА 1876 ГОД

Населенный пункт	Число жилых домов	Число жит-й	
		Муж.	Жен.
Местечко Влодавка	120	591	611
Местечко Домачево (улицы: Брестская, Базарная, Кобелковская, Новая, Черская, Торговая, Купальная, Песочная, Церковная, Леплевская, Кривая, Садовая, Базарная площадь, улица Александровская, на кот. нах-ся сельская лечебница и волостное правление)	246	824	965
Местечко Чернавчицы (улицы: Брестская, Каменец-Литовская, Кобринская; Базарная площадь, Предместье)	177	576	549
Местечко Милейчицы	253	783	783
Всего в местечках Брестского уезда	1856	6470	7219
Домачевская волость			
Дубица, деревня	71	210	200
Кобелка, деревня	113	302	289
Леплевка, деревня	178	499	510
Липинки, деревня	71	216	236
Нейбров, колония	214	651	661
Нейдорф, колония	214	624	636
Новоселки, деревня	123	359	353
Плоска I, сторожка при Брест-Влодавском шоссе	1	3	2
Плоска II, сторожка при Брест-Влодавском шоссе	1	3	3
Рудня, присевок	19	55	49
Харсы, село	87	286	298
Черск, село	130	304	335
Всего в волости	1649	4993	5220
Меднянская волость			
Закрутин, хутор Владимира Домбровского	2	7	6
Закрутин, хутор Тарновских	2	7	5
Збунин, село	122	330	348
Котельня, скипидарный завод	1	4	3
Медна, деревня	132	449	386
Отоки, деревня	32	102	96
Прилуки, село	242	660	702
Рогозна, деревня	129	406	395
Приборовская волость			
Гута, деревня	38	134	150
Дубок, деревня	143	509	499
Александрово, колония инвалидного дома	1	151	118
Комаровка, деревня	140	441	413
Орехово, деревня	157	445	427
Приборово, село	257	706	672
Селяхи, деревня	48	138	118
Томашевка, фольварок	2	11	18

Населенный пункт	Число жилых домов	Число жит-й	
		Муж.	Жен.
Томашевка, поселок	1	12	20
Лыщицы, деревня	29	71	98
Всего в волости	975	3439	3400
Каменец-Жировицкая волость			
Аркадия, деревня	38	122	156
Борнаты,деревня	47	162	150
Вулька-Подгородская, деревня	65	213	247
Вулька-Заставская	35	104	119
Гершоны, деревня	37	98	101
Пугачево, деревня	190	532	569
Каменица-Жировицкая, село	55	160	186
Радваничская волость			
Михалин,деревня	51	165	150
Радваничи Церковные,село	194	492	546
Радваничи Заречные,деревня	117	307	325
Косичская волость			
Вычулки, деревня	35	142	130
Гузин, деревня	26	102	104
Дубровка, деревня	16	57	50
Козловичи, деревня	26	104	109
Косичи, село	37	129	133
Черни, село	42	131	126
Шебрин, село	79	243	273
Лыщицкая волость			
Бояры,деревня	33	101	94
Лыщицы,село	95	224	260
Остромечево,село	51	153	142
Мотыкальская волость			
Вулька,деревня	21	56	68
Клейники,деревня	61	188	177
Ковердяки,деревня	63	166	188
Козловичи,деревня	113	333	332
Малые Мотыкалы,деревня	45	118	137
Большие Мотыкалы,село	59	156	189
Скоки,деревня	61	145	172
Теребунь,село	27	76	87
Олтушская волость			
Орехово,село	215	654	634

Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 14. Воп. 1. Спр. 222. Л. 1—86.

Юльян Урсын Нямцэвіч

Гісторык, паэт, прадстаўнік класіцызму у польскай літаратуры Нямцэвіч Юльян Урсын нарадзіўся 16 лютага 1757 (паводле некаторых крыніц, 1758) г. у вёсцы Скокі Брэсцкага раёна. Вучыўся ў Брэсцкім езуіцкім калегіуме, Кадэцкім корпусе ў Варшаве (1770—1777). У час паўстання 1794 г. быў ад'ютантам і сакратаром А.Т.Касцюшкі. У баі з царскімі войскамі пад Мацэёвіцамі быў паранены і трапіў у палон. Два гады адбываў пакаранне ў Петрапаўлаўскай крэпасці. Тут Нямцэвіч стварыў паэтычную нізку «Элегіі, напісаныя ў рускай турме» (1795). З 1796 г. па 1807 г. знаходзіўся ў ЗША, дзе зблізіўся з Дж.Вашынгтонам. Вярнуўшыся на Радзіму, ажыццявіў некалькі падарожжаў па Беларусі (1809,

Ю.У.Нямцэвіч.

1816, 1819). З 1827 г. узначальваў Варшаўскае таварыства сяброў навук. Прыняў удзел у паўстанні 1830—1831 гг. У 1833 г. эмігрыраваў за граніцу і жыў у Парыжы. У 1838 г. заснаваў Польскую бібліятэку ў Парыжы, завяшчаў ёй рукапісы сваіх твораў. Памёр Нямцэвіч 21 мая 1841 г.

Пяру пісьменніка належыць палітычная камедыя «Вяртанне пасла» (1790), у якой выказана думка пра неабходнасць сацыяльных рэформ у Рэчы Паспалітай, вызвалення сялян ад прыгону. Беларуская тэматыка знайшла адлюстраванне ў зборніку «Літоўскія пісьмы», напісаным у вайну 1812 г. У 1816 г. Нямцэвіч выдаў зборнік «Гістарычныя песні». Пісьменнік з'яўляецца аўтарам раманаў «Два паны Сяцехі» (1815) і «Ян з Тэнчына» (1825). Матэрыялы ад уражанняў Нямцэвіча ў час паездак па Беларусі склалі кнігі «Дзённікі маіх часоў» (выдадзены ў 1848) і «Гістарычныя падарожжы па польскіх землях, якія адбыліся ад 1811 да 1828 гадоў» (выданне 1858), дзе апісана жыццё беларускіх сялян, гарады Гродна, Слонім, Навагрудак, Бяроза, Пінск. У сваіх «Гістарычных падарожжах...» Нямцэвіч шмат увагі ўдзяліў Брэсту. Ён падае звесткі з мінулага горада, у якім была адкрыта адна з першых друкарань на Беларусі. Аўтара нарыса не здавальняў тагачасны стан Брэста. Ён выказваў спадзяванне, што з часам горад стане вялікім гандлёвым портам, што «пладамі Еўропы і Азіі запоўняцца рэчышчы Буга і Мухаўца».

Нямцэвіч выдаў «Збор гістарычных мемуараў пра старажытную Польшчу» (Т. 1—6, 1822—1833), у які ўключыў «Дыярыушы» С. і Б.Маскевічаў.

У цэнтры вёскі Скокі знаходзіцца сядзіба Нямцэвічаў, пабудаваная ў 1770-я гады. Сядзібны дом мае характэрную для архітэктуры барока пластычную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. За ім — парк з цэнтральнай і дзвюма бакавымі паралельнымі алеямі, якія выходзяць да ракі Лясная. Усе аб'екты сядзібна-паркавага ансамбля да нашых дзён не захаваліся.

На мяжы стагоддзяў

Сацыяльна-эканамічнае становішча Брэсцкага раёна ў канцы XIX стагоддзя найбольш поўна характарызуюць матэрыялы першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г.[1]

Паводле даных гэтага перапісу, на тэрыторыі раёна пражывала каля 45 тыс. чалавек, 50,3 % з якіх складалі жанчыны. Населеных пунктаў (мястэчкі, сёлы, вёскі, выселкі) налічвалася 164, а двароў — 6462. На адзін населены пункт прыходзілася, такім чынам, па 274 чалавекі, а на адзін двор у сярэднім — па 7 чалавек.

Сярод пасяленняў па колькасці насельніцтва і гаспадарак найбольш буйнымі былі сяло Прылукі (221 гаспадарка, 1307 чалавек, у т.л. 681 мужчына, 626 жанчын), мястэчка Чарнаўчыцы (144 жылыя дамы, 140 дваровых месцаў, 1101 чалавек, у т.л. 548 мужчын, 553 жанчыны), мястэчка Дамачава (130 дамоў, 1029 чалавек, у т.л. 516 мужчын, 513 жанчын), сяло Страдзеч (142 двары, 986 чалавек, у т.л. 495 мужчын, 491 жанчына), сяло Прыбарава (211 двароў, 969 чалавек, у т.л. 401 мужчына, 568 жанчын), вёска Ляплёўка (149 двароў, 808 чалавек, у т.л. 402 мужчыны, 406 жанчын), сяло Радванічы Царкоўныя (127 двароў, 861 чалавек, у т.л. 433 мужчыны, 428 жанчын), вёска Орха-



Маёнтак у в. Скокі, дзе нарадзіўся Ю.У.Нямцэвіч. З малюнка XIX ст.

ва (121 двор, 727 чалавек, у т.л. 381 мужчына, 346 жанчын), вёска Яцкавічы (110 двароў, 665 чалавек, у т.л. 339 мужчын, 326 жанчын), вёска Радванічы Зарэчныя (86 двароў, 663 чалавекі, у т.л. 349 мужчын, 314 жанчын), вёска Камароўка (116 двароў, 656 жыхароў, у т.л. 334 мужчыны, 322 жанчыны), вёска Дубок (121 двор, 644 жыхары, у т.л. 336 мужчын, 308 жанчын), вёска Рагозна (95 двароў, 637 жыхароў, у т.л. 325 мужчын, 312 жанчын), вёска Медна (105 двароў, 623 жыхары, у т.л. 312 мужчын, 311 жанчын), вёска Казловічы (99 двароў, 604 жыхары, у т.л. 292 мужчыны, 312 жанчын), вёска Навасёлкі (85 двароў, 603 жыхары, у т.л. 307 мужчын, 296 жанчын).

Ад 300 да 600 жыхароў налічвалі наступныя населеныя пункты: Амяліна (517 чал.), Астрамечава (316 чал.), Блювінічы (338 чал.), Ваўкі (321 чал.), Вельямовічы (419 чал.), Вялікая Курніца (497 чал.), Дубіца (358 чал.), Жыровецкая Камяніца (308 чал.), Залессе (456 чал.), Збунін (563 чал.), Івахнавічы (545 чал.), Кабёлка (451 чал.), Кавердзякі (320 чал.), Кашылава (301 чал.), Ліпінкі (348 чал.), Лышчыцы (475 чал.), Марозавічы (409 чал.), Нехалсты (330 чал.), Падлессе (388 чал.), Падлужжа (360 чал.), Пескі (393 чал.), Рыцец (302 чал.), Скокі (313 чал.), Смуга (428 чал.), Сычы (475 чал.), Франопаль (563 чал.), Харсы (516 чал.), Чэрск (538 чал.), Шэбрын (429 чал.).

У далейшым колькасць насельніцтва павялічвалася даволі павольна. Выключэнне складалі, бадай што, толькі мястэчкі. Так, да пачатку першай сусветнай вайны 1914—1918 гг. у Дамачава яно выросла да 1789 чалавек (на 70%), а ў Чарнаўчыцах — да 1625 чалавек (на 48%).

Звесткі аб сацыяльнай структуры насельніцтва, яго падзеле па саслоўях, веравызнанні, роднай мове і г.д. захаваліся з другой паловы XIX ст. Асноўную масу складалі сяляне. У канцы XIX ст. на іх долю прыходзілася больш за 4/5 ад агульнай колькасці жыхароў (1896). На другім месцы ішлі мяшчане — прыкладна 18%. Дваранства складала 0,4%, духавенства ўсіх канфесій — 0,4%, купецтва — 0,1%, іншых — каля 1%.

Сярод вернікаў большасць складалі праваслаўныя: у сярэдзіне XIX ст. — 82,7%, у канцы стагоддзя — 80,4%. Колькасць рымакатолікаў узрасла за гэты час з 5,9 да 7%, іудзеі складалі ў 1900 г. 11,1%.

Сялянская рэформа 1861 г. пры ўсёй сваёй палавінчатасці, захаванні шэрагу прыгонніцкіх перажыткаў несла станоўчыя змены ў жыцці насельніцтва і перш за ўсё сялянства.

Пасля адмены прыгону паскоранымі тэмпамі пайшло развіццё капіталізму. Асабліва важную ролю ў сацыяльна-эканамічных пераўтварэннях у рэгіёне адыграла чыгуначнае будаўніцтва.

Улады, кіруючыся стратэгічнымі і эканамічнымі меркаваннямі, разгарнулі з 1860-х гадоў шырокае будаўніцтва ў заходнім напрамку. Праз тэрыторыю Беларусі былі праведзены найважнейшыя магістралі, якія звязалі цэнтральныя прамысловыя і чарназёмныя губерні з партамі Балтыйскага мора і Польшчай.

З 1867 па 1904 гг. даўжыня чыгунак на Беларусі ў яе сучасных граніцах вырасла з 227 да 2837 вёрст, ці ў 12,5 раза. На пракладцы чыгуначных ліній, на земляных работах было занята да 800 тыс. сялян, галоўным чынам з заходніх губерняў. У другой палове XIX — пач. XX ст. колькасць чыгуначнікаў, якія абслугоўвалі магістралі, узрасла з 10 да 40 тыс., з якіх каля 30 тыс. лічыліся пастаяннымі рабочымі.

Пасля завяршэння будаўніцтва чыгунак Брэст—Варшава (1869), Масква—Брэст (1871), Кіеў—Брэст (1873), Брэст—Гомель (1886) Брэстчына была звязана з цэнтральнымі раёнамі Расіі, Прыбалтыкай, Украінай, Польшчай.

Чыгуначнае будаўніцтва садзейнічала развіццю ўсерасійскага і мясцовых рынкаў, паглыбленню спецыялізацыі эканомікі асобных рэгіёнаў, пашырэнню попыту на рабочую сілу, міграцыі насельніцтва, спрыяла тэхнічнаму прагрэсу, выціскала дакапіталістычныя формы вытворчасці і г.д.

Сацыяльна-эканамічныя падзеі другой паловы XIX ст. спрыялі пэўным зрухам у развіцці і брэсцкай вёсцы.

Каб прыстасавацца да капіталістычных змен, памешчыкі распачалі будаваць у сваіх маёнтках невялічкія прадпрыемствы па вырабе цэглы, пераапрацоўцы драўніны і сельскагаспадарчай сыравіны. Так, буйнейшы землеўладальнік граф Ф.А.Замойскі ў сваіх маёнтках і фальварках Прыбарава, Дубок і Орхава заснаваў майстэрню па вытворчасці гонты, сукнавальню, заводы дзёгцева-шкіпінарны, вапнавы, цагельны, 2 млыны, трымаў 3 карчмы. Прыкладна такія ж прадпрыемствы існавалі ў маёнтках І.І.Урсын-Нямцэвіча, Ю.П.Штэр, М.І.Дурыліна і інш.

Трэба заўважыць, што некаторыя дробныя прадпрыемствы нярэдка дзейнічалі кароткі час, адны закрываліся, іншыя адкрываліся, іх колькасць амаль штогод мянялася. Асабліва гэта тычыцца цагельных заводаў. Больш менш рытмічна працавалі толькі буйнейшыя з іх, як, напрыклад, два цагельныя заводы ў Гершонах, на якіх у 1896 г. было занята 269 рабочых. З іншых прамысловых прадпрыемстваў трэба адзначыць наяўнасць у канцы XIX ст. (1896) 35 ветракоў, 9 вадзяных млыноў і 24 кузняў.

Насельніцтва Дамачава і Чарнаўчыц, галоўным чынам яўрэі, займалася рамяством і дробным пасрэдніцтвам. Але з боку жабрацкай беларускай вёскі попыт быў толькі на самыя простыя танныя вырабы. Таму рамеснік-яўрэй, які абслугоўваў бедняка-беларуса, не мог шырока разгарнуць вытворчасць. Так, у Чарнаўчыцах у пачатку XX ст. дзейнічалі 4 кравецкія, 7 шавецкіх майстэрань і 6 кузняў, на якіх разам было занята 53 чалавекі. У Дамачава быў больш пашыраны дробны гандаль, тут мелася 30 дробных крам і, апрача таго, адбывалася штогод 14 кірмашоў.

Сялянскія саматужныя промыслы

на Брэстчыне ў адрозненне ад інш. рэгіёнаў Беларусі пашырэння не атрымалі. Сяляне ў вольны ад сельскагаспадарчых работ час падраблялі на земляных работах, вывазе і сплаве лесу па рэках. Неабходныя гаспадарчыя прылады і бытавыя рэчы набывалі на кірмашах ці ў вандруючых рамеснікаў. Але самае неабходнае для ўласных патрэб выраблялася непасрэдна ў гаспадарках. Сяляне выраблялі грубашэрснае сукно з авечай воўны на шэрыя світкі, сальну — кудзелю на бялізну і галаўныя ўборы, лапці з лыку, каробкі з бярозавай кары, летнія саламяныя капелюшы, карзіны з лазы і інш. У некаторых вёсках меліся і асобныя сяляне-саматужнікі, якія працавалі на рынак.

Але і пасля рэформы 1861 г., як і раней, галоўным заняткам асноўнай часткі насельніцтва Брэсцкага раёна было земляробства. Яно мела пераважна збожжавы характар і было скіравана на вытворчасць зерневых хлябоў.

Развіццё гэтай галіны народнай гаспадаркі стрымлівалася рэшткамі прыгонніцтва, самым цяжкім з якіх было буйное памешчыцкае землеўладанне.

Буйнейшымі землеўладальнікамі, якім у 1905 г. належала па 500 і болей дзесяцін зямлі, былі:

1. Правадзейны стацкі саветнік М.І.Дурылін, маёнтак Дамачава Дамачаўскай воласці, 7827 дзесяцін;

2. Граф Ф.А.Замойскі, маёнтак Прыбарава з фальваркамі Дубок і Орхава, 6222 дзесяціны;

3. Удава правадзейнага стацкага саветніка Ю.П.Штэр, маёнтак Чэрні Косіцкай воласці, 1370 дзесяцін;

4. Дваранін І.І.Урсын-Нямцэвіч, маёнткі Скокі і Галяндзерня Матыкальскай воласці, 1308,5 дзесяціны;

5. Удава стацкага саветніка М.Дз. фон Гаер, маёнтак Кавердзякі Матыкальскай воласці, 1000 дзесяцін;

6. Дваранка М.Ф.Гажыч, маёнтак Сегенеўшчына Лышчыцкай воласці, 921 дзесяціна;

7. Дваранін Ф.Ф.Панікоўскі, маёнтак Шчытнікі Лышчыцкай воласці, 896 дзесяцін;

8. Дваранін У.Б.Гутоўскі, маёнтак Зводы Лышчыцкай воласці, 708,5 дзесяціны;

9. Дваранін А.В.Пузыня, маёнтак Астрамечава Лышчыцкай воласці, 658 дзесяцін;

10. Дваранін С.П.Яглін, маёнтак Вістычы Матыкальскай воласці, 620 дзесяцін;

11. Дваранін Ф.А.Віслоцкі, маёнтак Лышчыцы, 561 дзесяціна;

12. Жонка правадзейнага стацкага саветніка Ф.П.Пастоўская, маёнтак Матыкалы Матыкальскай воласці, 560,5 дзесяціны;

13. Дваранін С.В.Валянскі, маёнтак Валянава Радваніцкай воласці, 501 дзесяціна.

Такім чынам, 13 зямельных магнатаў валодалі 23 153,5 дзес. На адно такое ўладанне прыпадала 1781 дзес.

Канцэнтрацыя зямель на адным полюсе абарочвалася малазямеллем на другім. Паводле даных П.Лахціна, у 1893 г. у Брэсцкім павеце беззямельныя двары складалі 16,7% ад агульнай колькасці сялянскіх гаспадарак[2]. У сярэднім на 1 чалавека тут прыпадала сядзібнай і ворыўнай зямлі па 0,9 дзес., сенажаці і пашы — па 0,41, лесу, зарасніку і непрыдатнай — па 0,18 дзес. Сярод іншых фактараў, адмоўна паўплываўшых на стан дарэвалюцыйнай сельскагаспадарчай вытворчасці, трэба назваць наяўнасць сервітутных уладанняў (угоддзі, якія на пэўных умовах даваліся памешчыкамі ў карыстанне сялянам, — паша, выганы, сенажаці, бортні, рыбная лоўля), цераспалосіцы, прымітыўнай тэхнікі і культуры земляробства і інш.

Асабліва цяжкім для сялян перажыткам феадальнай эпохі была

цераспалосіца. У большасці вёсак сяляне валодалі надзеламі, якія перамяжоўваліся з памешчыцкімі зямельнымі ўгоддзямі. Такое становішча склалася яшчэ ў часы прыгонніцтва, калі буйныя землеўладальнікі захапілі лепшыя сялянскія землі, а пасля рэформы 1861 г. пакінулі іх за сабой. Яны скрозь выкарыстоўвалі іх, каб захаваць эканамічную залежнасць сялян, здаваць пад адработкі, рабаваць штрафамі за праезд, прагон жывёлы, патравы.

Паводле даных Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта, вядучая роля на Брэстчыне належала збожжавай гаспадарцы. Напярэдадні першай сусветнай вайны больш за 50% пасяўных плошчаў прыпадала на зерневыя і каля 45—47% — на тэхнічныя культуры, галоўным чынам на бульбу. Пры гэтым таннай бульбе ў сялянскай гаспадарцы надавалася вялікая роля, а ў структуры памешчыцкіх пасеваў яна займала ў розныя перыяды ад 1/4 да 1/3 агульнай плошчы.

Гаспадыняй сялянскіх палеткаў, як і даўней, было азімае жыта, на якое прыпадала да 30% агульных пасяўных плошчаў.

Аржаны хлеб быў асноўным прадуктам харчавання беларускага селяніна. Жыта — адзін з найбольш непатрабавальных злакаў, расце на малаўрадлівых землях, добра прыстасуецца да лішку ці недахопу вільгаці, холаду і спякоты, не патрабуе вялікіх працоўных затрат. Адным з найбольш ураджайных быў 1913 г. У гэтым годзе ўраджайнасць на сялянскіх землях з 1 дзес. склала: збожжа — 65 пудоў, аўса — 60 пудоў, бульбы — 600 пудоў.

Трэба заўважыць, што ўрадлівыя гады чаргаваліся з неўрадлівымі. Асабліва цяжкімі былі 1905—1907 гг., калі ў Брэсцкім павеце ва ўмовах халоднага дажджлівага надвор'я зборы жыта рэзка паменшыліся. Менавіта таму свайго хлеба ў большасці вёсак не хапала нават да вясны. Так, напрыклад, на 1.1.1914 г. хлеба на 1 душу заставалася ў сярэднім па 10,3 фунта, а на 1.1.1915 г. — па 9,2 фунта.

У пачатку XX ст. сярод сістэм земляробства «преобладает как у помещиков, так и у крестьян трехполье, а у некоторых крестьян вследствие незначительных наделов практикуется двухполье. Улучшенные способы обработки земли замечаются лишь у некоторых из крупных частных землевладельцев, которые для обработки земли применяют земледельческие орудия новейших конструкций», а галоўнай прыладай для апрацоўкі зямлі ў сялян заставалася ўсё тая ж спрадвечная саха, «уборка хлебов производится женщинами серпами»[3]. Толькі заможныя сяляне паляпшалі культуру земляробства, прымянялі палепшаныя сельскагаспадарчыя прылады працы, гатунковае насенне, штучнае ўгнаенне і г.д.

Як вялася гаспадарка багатых сялян, бачна на прыкладзе хутараніна Мікалая Панасюка з Матыкальскай воласці. Глеба на яго надзеле была супясчаная, усёй зямлі 10 дзес. 1174 кв. сажні. Ралля —7 дзес. 2290 кв. сажняў, сенажаць — 2 дзес. 230 кв. сажняў, непрыдатнай зямлі — 574 кв. сажні і пад ставам — 480 кв. сажняў. Сям'я складалася з 7 чалавек, з якіх 5 былі ў рабочым узросце. Жылы дом і хлеў былі крыты саломай. Жывы і мёртвы інвентар выглядаў наступным чынам: 2 кані, жарабя, 3 каровы, 8 авечак, 2 свінні, 2 плугі, параконны і аднаконны, 2 драўляныя бараны з жалезным зуб'ем, драпач, акучнік і воз на жалезным хаду. Севазварот шасціпольны. Ураджайнасць у гэтага гаспадара была значна вышэйшай за сярэднюю па рэгіёне[4].

Наогул брэсцкая вёска на працягу асвятляемага часу знаходзілася ў вельмі цяжкім стане, далёка не заў-

сёды задавальняючы свае патрэбы ў самым неабходным.

Цяжкія жыццёвыя ўмовы вымушалі сялян час ад часу ўступаць у барацьбу за лепшы лёс. Аднак выступленні гэтыя ў другой палове XIX ст. не вызначаліся масавасцю, згуртаванасцю, упартасцю і наступальнасцю. Хваляванні абмяжоўваліся па большай частцы адной ці зрэдку некалькімі сумежнымі вёскамі. Яны больш паходзілі на ўсплёскі адчаю, якія хутка заціхалі і зноў усё ішло як і раней.

Толькі ў пачатку XX ст. гэты рух стаў больш арганізаваным і масавым. Асабліва бурны характар прынялі народныя хваляванні ў час расійскай рэвалюцыі 1905—1907 гг.

Пры аналізе рэвалюцыйнага руху насельніцтва Брэсцкага раёна трэба мець на ўвазе шэраг абставін. На яго тэрыторыі не было значных рабочых цэнтраў. Таму непасрэдны ўплыў прамысловых рабочых на сялянства быў слабым. Дзейнасць сацыял-дэмакратаў ці іншых палітычных партый не атрымала пашырэння. Тым не менш барацьба брэсцкага сялянства з памешчыкамі і царскімі ўладамі ў гады першай расійскай рэвалюцыі набыла даволі шырокія памеры. Гэта было абумоўлена, па-першае, масавым рэвалюцыйным рухам у краіне. Па-другое, адыгралі сваю ролю асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна. Тут быў больш высокі працэнт згалелых, беззямельных і бясконных сялян, а класавае расслаенне дасягнула большай глыбіні, чым у іншых раёнах. Так, калі ў цэлым па Беларусі беззямельныя ў 1890-я гады складалі 8,8%, то ў Брэсцкім раёне — 16,7%, бясконныя — адпаведна 18% і 33,9%. Уся гэта маса сялянства па сутнасці ўяўляла сабой сельскіх рабочых з надзеламі і без надзелаў, што адбілася і на характары рэвалюцыйнага руху. Пераважалі забастоўкі сялян-падзёншчыкаў і батракоў, якія склалі 53% усіх сялянскіх выступленняў. 25% выступленняў прыпадала на патравы і самавольную пасьбу жывёлы на ўгоддзях памешчыкаў.

Абуджэнню брэсцкай вёскі садзейнічалі шырокі водгук Крывавай нядзелі ў Санкт-Пецярбургу і студзеньска-сакавіцкі ўздым рабочага руху ў краіне. Але сялянскія хваляванні ў гэты перыяд толькі пачыналі разгортвацца і не набылі значных памераў. Колькасць выступленняў была невялікай і абмяжоўвалася галоўным чынам парубкамі прыватнаўласніцкіх лясоў.

Сялянскі рух пачаў узмацняцца з мая, а ў чэрвені — жніўні ахапіў многія вёскі. Фактычна цалкам узняліся Матыкальская, Лышчыцкая, Воўчынская і Турноўская воласці. Сяляне здымалі з работ у маёнтках батракоў, адкрыта пасвілі жывёлу не толькі на памешчыцкіх сенажацях, але і на засеяных палях, высякалі лес, аказвалі ўзброенае супраціўленне адміністрацыі маёнткаў, лясным вартаўнікам, не падпарадкоўваліся паліцэйскім чынам. Так, напрыклад, мясцовы земскі начальнік у рапарце на імя гродзенскага губернатара ад 11 чэрвеня 1905 г. скардзіўся, што «увещевания и разъяснения на крестьян не действуют. Состоялось три судебных заседания, после которых лишь незначительная часть крестьян прекратила пастьбу, а сами приговора ими обжалованы в съезд»[5].

Сяляне ўсё больш рашуча сталі патрабаваць перадачы ім памешчыцкіх зямель. Гэта з трывогай адзначаў гродзенскі губернатар, характарызуючы сялянскі рух у Брэсцкім павеце ўлетку 1905 г.: «...Большинство допускавших самоуправные действия крестьян находилось в полном убеждении своей правоты и заявляло, что настало время, когда вся земля будет возвращена крестьянам»[6].

Актыўны ўдзел у сялянскіх выступленнях прымалі сельскія рабочыя. Яны патрабавалі павышэння заработнай платы, скарачэння рабочага дня, паляпшэння ўмоў працы і інш. Каб задушыць выступленні батракоў, улады накіравалі ў Брэсцкі павет вайсковыя падраздзяленні, з дапамогай якіх 25 «зачинщиков и руководителей» былі арыштаваны[7].

У 1906 г. барацьбу распачалі сяляне вёсак Прыбарава і Камароўка. Яны ў явачным парадку сталі карыстацца лесам, пашай і сенажацямі графа Замойскага, які «установил непосильно высокие цены на топливо и косьбу сервитутов». Толькі за два месяцы граф накіраваў да земскага начальніка 1-га ўчастка больш за 700 заяў на сялян за парубкі і патравы. Сяляне збівалі лясных вартаўнікоў, уступалі з імі ў перастрэлку, палілі іх хаты і маёмасць. Яны «осмелились в официальной бумаге на имя земского начальника высказать угрозы о взятии спорной земли силой»[8].

Па сведчанні паліцыі «особой агрессивностью отличались крестьяне деревни Комаровка». Калі стражнікі за патраву арыштавалі 28 чалавек, то збеглася ўся вёска (больш за 400 чал.) ад мала да вяліка, вызвалілі аднавяскоўцаў і «угрожали как пасли, так и будем пасти»[9].

У 1906 г., як і напярэдадні, найбольшы ўздым сялянскага руху наглядаўся ўлетку. Значныя памеры набылі выступленні падзёншчыкаў і батракоў. Асабліва моцнымі яны былі ў маёнтках Лышчыцы, Кустын, Астрамечава, Вістычы, Прыбарава, Сегенеўшчына, Зводы, Шчытнікі, Матыкалы і інш. У Лышчыцкую воласць, дзе рух быў найбольш моцны, улады накіравалі 3 атрады конных стражнікаў і некалькі вайсковых падраздзяленняў. У многіх вёсках праведзены арышты сялян[10].

Атрымала ў брэсцкай вёсцы развіццё і т.зв. другая сацыяльная вайна — барацьба з кулацтвам. Яна вылівалася звычайна ў тыя ж формы, што і рух супраць памешчыкаў. Так, сяляне вёсак Кустынь, Рудавец і Ратайчыцы ў ліпені 1906 г. захапілі маёнтак Трасцянец, якім валодалі некалькі багацейшых сялян, а гаспадароў выгналі. Гэта быў, па словах супрацоўніка газеты «Северо-Западный голос», ужо трэці такі выпадак.

Нягледзячы на тое, што з другой паловы 1906 г. надышоў разгул чарнасоценнай рэакцыі і рэпрэсій царскіх улад, сяляне Брэстчыны, як і ўсёй Беларусі, працягвалі барацьбу. Як і ў мінулыя гады, парубкі лесу, самавольная пасьба жывёлы, захопы сена і канюшыны суправаджаліся сутыкненнямі са стражай і паліцыяй. Такія выпадкі адзначаны ў маёнтках Прыбарава, Сычы, Зводы, Яцкавічы. У маёнтку Шчытнікі «рубят днём толпой 30—40 человек, вооруженные кольями, топорами, огнестрельным оружием. Рубят сразу вместе несколько деревень, вырубают по 500—800 стволов»[12]. Калі паліцыя паспрабавала спыніць парубкі, сяляне адкрылі агонь з ружжаў.

Ужывалі сяляне і больш вострыя формы барацьбы. Так, зарэгістраваны 4 нападзенні і 16 падпалаў маёнткаў і іншай маёмасці памешчыкаў.

Батрацкі рух у 1907 г. не атрымаў пашырэння, хоць заходы да яго арганізацыі і прымаліся. Вясной 1907 г. была зроблена спроба стварыць стачачны саюз Лышчыцкай, Матыкальскай, Вярховіцкай і Высока-Літоўскай валасцей, каб наладзіць агульную забастоўку і байкот маёнткаў. Але ўлады разам з памешчыкамі зрабілі пэўныя заходы, правялі звальненні і арышты, прыслалі на палявыя работы салдат і свайго дамагліся. У той жа час губернатар выдаў спецыяльную пастанову, у якой загадаў паліцыі падаўляць выступленні сельскагаспадарчых рабочых самымі жорсткімі мерамі аж да прымянення зброі.

З другой паловы 1907 г. рэвалюцыйны рух рэзка пайшоў на спад. Бадай апошнім самым буйным было выступленне сялян вёскі Падлессе Радваніцкай воласці. Яны аказалі рашучае супраціўленне атраду конай варты, які намагаўся апісаць маёмасць за патравы і правесці арышты. Паліцыя адкрыла агонь па натоўпе, некалькі чалавек параніла, але выканаць загад змагла толькі з дапамогай роты салдат, прысланых сюды па іх тэлеграме.

Развіццё капіталізму ва ўсіх галінах эканомікі патрабавала пашырэння пісьменнасці і асветы. Царскія ўлады мусілі прымаць пэўныя заходы ў гэтым накірунку — правесці рэформу школы, каб прыстасаваць яе да патрэб эканамічнага развіцця краіны.

І ў брэсцкай вёсцы раслі культурныя запатрабаванні, разуменне неабходнасці адукацыі і цяга да яе. Але на развіццё школьнай сістэмы дзяржава выдзяляла нязначныя сродкі, а магчымасці насельніцтва былі абмежаваныя. Таму колькасць пісьменных расла вельмі марудна. Паводле перапісу 1897 г., пісьменнасць у Брэсцкім павеце была значна вышэйшай, чым у цэнтры і на ўсходзе Беларусі. Але і тут 3/4 сялянства ва ўзросце ад 10 гадоў і старэй заставаліся непісьменнымі. Пры гэтым пісьменныя сярод жанчын складалі толькі 9,5%, а сярод мужчын — 39,2%.

На тэрыторыі Брэсцкага павета існавалі народныя вучылішчы, царкоўнапрыходскія школы і школы граматы. Сярэдніх навучальных устаноў не было.

Народныя вучылішчы пачалі ствацца ў 1860-я гады пасля таго, як у 1862 г. выйшаў указ аб адкрыцці пачатковых народных вучылішчаў у заходніх губернях. У адпаведнасці з правіламі 18 мая 1884 г. пачатковыя школы ў Паўночна-Заходнім краі аддаваліся пад кантроль праваслаўнага духавенства. Прадметамі выкладання былі: навучанне догматам праваслаўнай веры і царкоўным спевам, вывучэнне царкоўнаславянскай мовы, арыфметыкі і рускай граматы. Для школ краю Віленская вучэбная акруга выдавала падручнікі, у якіх гісторыя Беларусі асвятлялася з клерыкальна-вялікадзяржаўных пазіцый. Тут палітыка была зразумелай: народная адукацыя павінна развівацца як руская і праваслаўная. Меркавалася, што народныя вучылішчы стануць больш высакаякаснай ступенню народнай асветы, больш будуць адпавядаць русіфікатарскай палітыцы, што праводзілася ў краі.

Працэс заснавання народных вучылішчаў ішоў марудна, асабліва з-за недахопу настаўніцкіх кадраў і беднасці мясцовых жыхароў. На тэрыторыі раёна адным з першых было Дамачаўскае народнае вучылішча, заснаванае ў 1863 г. па хадайніцтве прыхаджан Дамачаўскай праваслаўнай царквы. Да пачатку першай сусветнай вайны іх было адкрыта 30.

Вучэбны год у гэтых навучальных установах, згодна з інструкцыяй 1871 г., пачынаўся 1 верасня і завяршаўся 1 мая. На самай жа справе пачатак навучальнага года заўсёды адцягваўся, і нават у кастрычніку яшчэ палова дзяцей не прыступала да вучобы, бо былі заняты з бацькамі ў гаспадарцы. Ды і на працягу ўсяго навучальнага года бацькі час ад часу адрывалі сваіх дзяцей ад вучобы, спасылаючыся на хатнія работы або адсутнасць цёплага адзення ці абутку. Тэрмін навучання складаў: у аднакласных вучылішчах 3 гады, двухкласных — 5 гадоў. Аналіз праграм для народных вучылішчаў, якія былі складзены толькі ў 1871 г. (да гэтага часу дзейнічалі часовыя правілы, зацверджаныя для народных школ у губернях Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай), паказвае, што практычна ніякіх зве-

стак аб гісторыі роднага краю, матчынай мове, беларусах яны не змяшчалі. Дзеці павінны былі вывучаць Закон Божы, царкоўнаславянскую і рускую мовы, арыфметыку, чыстапісанне і спевы. Прадмет «руская мова» разумеўся ў шырокім сэнсе. Ён уключаў у сябе вывучэнне вершаў рускіх паэтаў, расказы і апавяданні рускіх пісьменнікаў, знаёміў з адметнымі гістарычнымі асобамі і падзеямі айчыннай (зразумела, рускай) гісторыі. У гэты раздзел уваходзілі артыкулы «О просветителях славян святых Кирилле и Мефодии», «О первых русских князьях Рюрике, Олеге, Ольге и Святославе», «О Владимире Мономахе», «Об Александре Невском», «О Даниле Галицком», «О Дмитрии Донском», «О покорении Казани и Сибири», інш. у тым жа плане. Аб гісторыі беларускага народа, падзеях, што адбываліся на беларускай зямлі, ніякіх звестак, акрамя таго, што змяшчаліся ў артыкулах «О Брестской церковной унии», «О воссоединении униатов при Николае I», «О благодеяниях народу и государства государя императора Александра II», бадай што і не было[13].

З пачатку 1880-х гадоў пачынаюць адраджацца царкоўныя школы. Штуршком для гэтага паслужылі новыя правілы для царкоўнапрыходскіх школ, якія былі зацверджаны ў 1884 г. Працэс стварэння царкоўных школ у беларускіх губернях ішоў больш інтэнсіўна, чым ва ўсіх другіх губернях Расіі. Усе епархіі, у склад якіх уваходзілі беларускія губерні, знаходзіліся ў ліку пяці першых па колькасці школ у разліку на 100 цэркваў. На тэрыторыі Брэсцкага раёна ў 1913 г. было 18 царкоўнапрыходскіх школ і 14 школ граматы (1897). Гэта не так ужо і шмат, каб народная асвета развівалася на належным узроўні. Тым больш, што трэба ўлічваць і такі факт: амаль усе царкоўныя школы былі малалюдныя, вучэбны працэс у іх вёўся на нізкім узроўні. Беднасцю сялян тлумачылася тое, што некаторыя школы, утвораныя як царкоўнапрыходскія, з цягам часу пераходзілі ў разрад больш нізкі — у школы граматы. Гэтыя школы былі рухомыя, пераходзілі з вёскі ў вёску і не патрабавалі ад сялян значных грашовых і інш. матэрыяльных затрат. Праўда, і веды яны давалі адпаведна нізкія.

Яўрэйскае насельніцтва адкрывала для сваіх дзяцей т. зв. талмуд-торы. Так, у Дамачаве ў 1870 г. працавалі 2 такія навучальныя ўстановы з 39 вучнямі.

Яшчэ горш, чым з асветай, абстаялі справы з медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва. У Брэсцкім павеце, як і ў інш. рэгіёнах Беларусі, лютавалі брушны і сыпны тыф, воспа, халера, малярыя, шкарлятына, сухоты і інш. хваробы. Прычынай такога становішча быў нізкі ўзровень медыцынскага абслугоўвання і бытавыя ўмовы, у якіх жылі сяляне.

Сельская медыцына ўзнікла толькі ў канцы 1860-х гадоў на аснове «Палажэння аб наладжванні сельскай урачэбнай медыцыны ў губернях, дзе не ўведзена палажэнне аб земскіх установах» (ад 24 снежня 1868 г.). На павет прыходзілася ўсяго па 1 урачу, не хапала лячэбніц, медыцынскага персаналу, аптэк. Так, у пачатку XX ст. на тэрыторыі раёна існавалі наступныя медыцынскія ўстановы: Дамачаўская сельская лячэбніца, Чарнаўчыцкі і Страдзецкі прыёмныя пакоі, фельчарскія пункты ў Дамачаве, Чарнаўчыцах, Матыкалах, Медне, Страдзечах, сельскія павівальныя бабкі ў Дамачаве і Медне, фельчарыца-акушэрка ў Дамачаве, сельскія аптэкі ў Дамачаве і Чарнаўчыцах.

У выніку такога становішча працягласць жыцця была зусім невысокая. Калі мы зноў звернемся да перапісу 1897 г., то ўбачым, што насельніцтва, узрост якога перавышаў

60 гадоў, складала ў Брэсцкім павеце прыкладна 8,1%. Асноўная сярод іх маса (больш за 80%) — гэта людзі ва ўзросце да 40 гадоў.

Голад і разарэнне прынесла працоўным першая сусветная вайна. Асабліва згубны ўплыў аказала вайна на гаспадарку тых раёнаў, якія апынуліся ў прыфрантавой зоне і сталі арэнай баявых дзеянняў. Да іх ліку адносілася і Брэстчына.

Ужо ў выніку кампаніі 1914 г. руская армія апынулася ў цяжкім стане, панесла вялікія страты ў людзях і матэрыяльных сродках, пакінула частку заходняй тэрыторыі. Вясной 1915 г. пачалося адступленне ўсяго Паўднёва-Заходняга фронту і тэрыторыя рэгіёна апынулася ў прыфрантавой зоне. А ўлетку яна стала і непасрэдна арэнай баёў.

З самага пачатку вайны беларускія губерні былі аб'яўлены на ваенным становішчы і царскія ўлады ўвялі тут люты рэжым тэрору.

У тэлеграме ад 1 жніўня 1914 г. міністр унутраных спраў загадваў гродзенскаму губернатару: «Там, где, несмотря на принятые вами меры предупредительного характера, возникнут или будут назревать аграрные и погромные движения или вообще серьезные нарушения общественного порядка, вашему превосходительству следует пресекать их в самом начале всеми возможными средствами...

Уголовный закон освобождает от ответственности лицо, принявшее меру, превышающую его власть, если подобное действие было вызвано чрезвычайными обстоятельствами. Ныне такие обстоятельства наступили для всей России, почему превышение власти, вызванное действительной необходимостью охранять жизнь и имущество мирных обывателей или подавить опасное движение, встретит всегда одобрение и поддержку министерства. Напротив того, растерянность в опасные минуты, нерешительность и бездействие власти будут рассматриваться как тягчайшая вина перед долгом службы, невзирая ни на какие формальные объяснения подобного образа действий...»

Найбольш цяжкія страты вайна нанесла сялянскай гаспадарцы, асабліва бяднейшым і серадняцкім дварам.

Сярод фактараў, якія адмоўна паўплывалі на стан сельскай гаспадаркі, трэба перш за ўсё назваць памяншэнне рабочых рук на вёсцы. Па афіцыйных даных па Беларусі было мабілізавана больш за палавіну мужчын у працаздольным узросце. На пабудову абарончых збудаванняў, перавозку вайсковых грузаў, прагон гуртоў жывёлы, ахову чыгунак прыцягвалася практычна ўсё працаздольнае насельніцтва.

Сяляне Брэсцкага павета сталі забірацца на пабудову абарончых умацаванняў у першыя ж месяцы вайны. Вясной 1915 г. гродзенскі губернатар мусіў звярнуцца да ваенных улад з просьбай замяніць на тры тыдні на абарончых работах гродзенскіх сялян сялянамі іншых губерняў, бо «для выполнения наступающих полевых работ ощущается недостаток рабочих рук в деревне и поля останутся незасеянными»[15]. Але ж ніякай рэакцыі з боку камандавання арміі не адбылося. Больш таго, брэсцкі павятовы спраўнік атрымаў у хуткім часе ад начальніка гарнізона Брэсцкай крэпасці генерала ад артылерыі Лаймінга наступны загад: «Все поголовно мужское население крепостного района в возрасте 18—50 лет привлечь на крепостные работы: оборонительные, дорожные, по охране казенного имущества, по уходу за казенным порционным скотом, на железнодорожных сооружениях и по уборке и доставке урожая текущего года и прочих сельскохозяйственных продуктов от населения»[16].

За ўхіленне сялянам пагражалі карай «по законам военного времени».

На сялянскіх гаспадарках таксама цяжка адбіваўся бясконцы шэраг бежанцаў і армейскіх атрадаў з абозамі, якія на сваім шляху забіралі харчаванне, фураж, спусташалі пасевы, сенажаці. На прадметы першай неабходнасці існавала небывалая дарагавізна.

У выніку вясенне-летніх аперацый 1915 г. тэрыторыя Брэсцкага раёна была занята кайзераўскімі войскамі.

Як напамін пра гэтыя падзеі захаваліся ў в. Тамашоўка могілкі салдат першай сусветнай вайны. У 1262 магілах, у т.л. 12 брацкіх, пахаваны 1346 салдат рускай і германскай армій. У 1919 г. на сродкі Міжнароднага Чырвонага Крыжа могілкі былі добраўпарадкаваны.

Э.М.Савіцкі.

Крыніцы:

1. Дзяржаўны гістарычны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 1290. Воп. 11. Спр. 524.
2. Лохтин П. Безземельный пролетариат в России. М., 1905. С. 179.
3. Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне. Ф. 18. Воп. 1. Спр. 2394. Л. 52.
4. Там жа. Ф. 868. Воп. 1. Спр. 58. Л. 46.
5. Там жа. Ф. 18. Воп. 4. Спр. 342. Л. 4 адв.
6. Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905—1907 гг. Мн., 1962. С. 229.
7. Революционное движение в Белоруссии 1905—07 гг.: Документы и материалы. Мн., 1955. С. 355.
8. Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне. Ф. 18. Воп. 1. Спр. 487. Л. 11.
9. Там жа. Ф. 1. Воп. 27. Спр. 2863. Л. 9.
10. Там жа. Ф. 18. Воп. 7. Спр. 273. Л. 2—6.
11. Северо-Западный голос. 1906. № 165.
12. Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне. Ф. 18. Воп. 7. Спр. 273. Л. 13—14.
13. Программы для народных училищ Виленского учебного округа. Вильно, 1871. С. 1—25.
14. Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне. Ф. 2. Воп. 25. Спр. 3132. Л. 5—6.
15. Там жа. Ф. 18. Воп. 1. Спр. 2552. Л. 6.
16. Там жа. Ф. 336. Воп. 1. Спр. 6. Л. 139.

Дакументы сведчаць

Аб прыгнёце сялян вёсак Навалессе, Навасады і іншых Брэсцкага павета памешчыкам Лабачовым

№ 1. СКАРГА 67 СЯЛЯН ВЁСКІ НАВАЛЕССЕ ГРОДЗЕНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ НА ЖОРСТКАЕ АБЫХОДЖАННЕ З ІМІ ПАМЕШЧЫКА ЛАБАЧОВА

26 чэрвеня 1892 г.

Владелец им. Мутвицы 1-го стана Брестского у. Дмитрий Лобачев по своей злобе восстал на нас и безмерно нистожит нас притеснением своим, как между нашими наделами, т. е. пахотными полями, сенокосами и пастбищами, находятся его заросли с лесом, почему и не дает нам свободного доступа к нашим наделам, прохода, проезда и прогона скота, согласно чему забирает своих лесников и прочих рабочих-сослужителей с оружием, т. е. кто с ружьями, кто с топорами, кто с железными граблями и вилами, и сам вооружен двухствольным ружьем, шестизарядным револьвером и кинжалом и все вместе гурьбою ходят на грабеж между нашими наделами и зарослями, нападают на нас, кто бы из нас ни проезжал, проходил и прогонял скот или пас скот на своих наделах или пастбищах неприятельски грабит, снимает одежду всякого рода, какая у кого имеется и наносит разные побои нам и нашим пастухам, сгоняет скот, всякого рода животное, какое только имеется у всех нас, с целой деревни в одну гурьбу и гонит в свое имение и угрожает нам, что будет убивать нас своим оружием и, кроме сего, выдумывает на нас ябеду, что будто бы мы делаем какие-то бунты, предъявляет против нас обвинение, водит нас по судам [в] рабочее время, чем наносит нам значительные убытки, разорение имущества судебными издержками, отлучкою от работы всякого рабочего времени и будто бы за самовольную пастьбу скота в его лесу, уплатою штрафа в казну и в его пользу по причине неправильного показания со стороны его в качестве неправильных свидетелей, состоящих из его сослужителей, ибо кто человек совестный из его сослужителей вместе с ним не причиняет нам обиды и не свидетельствует против нас ложно, тому не платит жалованья и устраняет от

службы, одним словом сказать, заставляет поневоле своих слуг быть нашими врагами по своему примеру. Нашим доказательствам и суд не верит, как матанные его проступки невозможно иметь свидетелей из соседних деревень, свидетелям из нашего общества по производившейся тяжбе делает отводы правильного показания в суде, и потому нигде нашей правды нет, а он разорил наши имущества, сделал нас посмешищем даже у соседей наших, как такого разорения в цельном мире нет, и теперь не хочет нас оставить, хотя будучи уже несчастными, но вознамерился совсем нас погубить, не имея нигде за собой защиты.

А потому честь имеем покорно просить в.в.п. сделать ваше распоряжение, чтобы Лобачев вперед перестал нас нистожить своим притеснением и не погубил бы нас грабежом, дал бы нам свободный доступ к нашим наделам и возвратил нам наши грабежи, сколько он ограбил у нас и наших пастухов в прошедшее время, а также и сделать распоряжение о местном осмотре мест нашего пользования земельными угодьями.

Просители выше сего поименованные, а по неграмотности и личной их просьбе расписался Андрей Пипко.

№ 2. РАПАРТ ПРЫСТАВА 1-га СТАНУ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА ПАВЯТОВАМУ СПРАЎНІКУ АБ ЗДЗЕКАХ ПАМЕШЧЫКА ЛАБАЧОВА НАД СЯЛЯНАМІ

15 верасня 1893 г.

Сакрэтна

Из представленной при сем переписки и нижеприведенных фактов в.в.б. изволите усмотреть и судить о тех отношениях, которые могут существовать между владельцем им. Мутвицы Дмитрием Лобачевым и крестьянами Новолесского сельского общества. Со времени перехода им.Мутвицы, а именно с 1886 г., в распоряжение настоящего владельца крестьяне соседних деревень сразу почувствовали обращение нового помещика, каким явился для них нынешний Лобачев. Обоюдные отношения с течением времени все более обостряются и могут повести к серьезным, печальным последствиям. Владея значительным капиталом, обзавевшись домашним адвокатом, евреем Кантором, имея управляющего прусского подданного, живя в глуши Полесья, Лобачев, при своем строптивом характере, практикует с крестьянами замечательные вещи. Жалоба крестьян д. Новолесья на притеснения и обиды, изложенная в прошении на имя е.в.п., мною негласным образом проверена на месте и приведенных ниже фактов, я полагаю, достаточно, чтобы судить о личности помещика Лобачева. Видя стесненное положение крестьян в пастьбе скота, добывании топлива, Лобачев пользуется этими обстоятельствами и, несмотря на дозволенный свободный прогон скота, проезд и проход к их наделам, как то установлено постановлением губернского присутствия от 28 августа 1891 г. за № 7489 и 23 апреля 1892 г. за № 3678, проделывает следующее: летом текущего года из д. Пища Волынской губ. явилась за подаянием в Новолесье старуха нищая, которая, обойдя деревню, зашла и к Лобачеву, последний, не долго думая, продержал ее в сарае, а затем, разбросав и отдав собакам собранные ею крохи, прогнал со двора в деревню со строгим приказанием не являться более к нему в дом.

Сельский староста Федор Шульжик 19 июня явился к Лобачеву для вручения повестки съезда мировых судей. Приняв таковую, Лобачев, без всякого повода со стороны старосты и по неизвестной причине, удерживал его за рукав верхней одежды около часа, не позволяя удалиться, и водил таким образом за собой через весь двор. Дело находится у мирового судьи 3-го участка. В июле месяце текущего года помещик Лобачев загнал к себе во двор более 90 штук рогатого скота, прогоняемого у его дома на пашу, который и держал весь день. По причине тесноты двора, согнанный в одно место скот исколол один другого, так что на некоторых видны и по настоящее время заживающие раны.

В прошлом году в мае месяце жена крестьянина Андрея Бозорука — Настасия, будучи в интересном положении, возвращалась из казенной дачи с собранными грибами и, имея на право сбора должное разрешение, повстречалась с Лобачевым. Последний начал отнимать, крестьянка защищалась, тогда Лобачев изрезал на ней же веревки, на которых висела корзина, грибы рассыпал и уничтожил.

Из д. Новосад ранней весной, года два тому назад, проходил мимо дома Лобачева крестьянин Трофим Шульжик. Лобачев остановил его, не позволяя идти далее под тем же предлогом, что Шульжик проходит через его, помещика, землю, раздел буквально донога и в таком виде отпустил в д. Новолесье, придя в которую, Шульжик прикрыл свою наготу одолженной одеждой у крестьянина Калины Кушнерика, снятое же Лобачев забрал к себе, но, предвидя плохой исход, уплатил потерпевшему 20 р. за бесчестье.

Дочь крестьянина Якима Бозорука, Стефанида, 17 лет, караулила на паше скот. Явился Лобачев, разогнал скот, а с девушки снял юбку, фартук и платок, все забранное и по настоящее время у него.

17 июня 1892 г. крестьянин Никифор Пипко обрабатывал свою ниву, расположенную между лесом. Дав отдых себе, он отпустил лошадь здесь же на пашу, но явившийся Лобачев с лесными сторожами нашел предлог, будто бы лошадь Пипко кормится на помещичьей земле. Поднялась драка, в которой Пипко был сильно избит лесным сторожем Василием Соловчуком. Потерпевший долго болел, у него открылось кровохаркание.

В прошлом году, во время великого поста, жена крестьянина из д. Гуты Афанасия Кочаловского, Евдокия, возвращалась от исповеди, но у мызы Лобачева ее окружила стая собак помещика, опрокинула на землю, искусала, изорвала, окровавила и в таком виде полумертвая была доставлена домой, которая, проболев некоторое время, умерла. Подобную сцену, несмотря на крик крестьянки, не думали прекращать как сам Лобачев, так равно и его служащие.

Летом, года два тому назад, помещик Лобачев проезжал у д. Новосад в свою усадьбу Мутвицу, возвращаясь с поля. Невдалеке от дороги паслось стадо овец, оберегаемое крестьянскими детьми-подростками, которые при виде Лобачева разбежались, несмотря на то, что стадо находилось на крестьянских наделах. Пользуясь наведенной паникой, Лобачев схватил первого попавшегося барана и повез домой. Баран оказался принадлежащим крестьянину Ивану Пипко, за возвращением которого Пипко обращался к Лобачеву около десяти раз, заявлял на словах бывшему мировому судье г-ну Корицкому, но все его просьбы остались напрасными. Увезенного барана Лобачев не возвратил владельцу. В то же время имел место и подобный случай: владелец Мутвицы, пользуясь тем обстоятельством, что граница его имения, с одной стороны, оканчивается у самых усадеб крестьян д. Новосад, прорыл через проезжую и разрешенную дорогу ров, переход за который строго запрещен всем и каждому со стороны Лобачева. Среди дня небольшой боров, принадлежащий крестьянину Науму Дацику, перешел упомянутый ров и на несчастие попался на глаза Лобачеву, который, поймав борова, почти бегом уходил в имение с ношей. Подобное происходило на глазах многих крестьян д. Новосад, ибо услышав визг животного и предполагая похищение его волком, некоторые из них желали подать помощь, но вместо волка оказался помещик Лобачев. Об этой истории было также заявлено мировому судье Корицкому, который обещал уладить дело во избежание дрязг, а между тем, боров не возвращен Датику и по настоящее время, хотя последний десятки раз обращался к Лобачеву о выдаче собственности.

Крестьянин д.Новосад Данило Шульжик, проезжая с возом навоза к своим угодьям, встретился на дороге с помещиком Лобачевым; дорога эта пролегает и через землю помещика, последний, остановив крестьянина, не дозволял следовать далее. Но когда крестьянин объявил и свои права на существующую дорогу, то Лобачев лег поперек ее, сказав: «Ну, поезжай теперь через мою спину». Озадаченный подобной выходкой, Шульжик оставил воз в поле, а сам возвратился с волами в деревню и только на другой день, пользуясь отсутствием Лобачева, доставил навоз куда следовало.

Крестьянин д.Новолесья Данило Нущик лишился своих ульев, забранных ночью Лобачевым с деревьев, о возврате которых и на удовлетворение убытков имеет исполнительный лист мирового судьи 3-го участка от 24 июня за № 1717. Тот же крестьянин, работая в поле, варил пищу, но явившийся Лобачев разбил горшок, отнял кожаный пояс, сумку, где хранился хлеб, а приготовляемую пищу разлил, не имея к подобным безобразиям ни малейшего повода со стороны крестьянина. Поступок этот был также обжалован мировому судье и потерпевший крестьянин имеет и второй исполнительный лист от того же числа за № 1716.

У крестьянина Ивана Пипко около двух лет [назад] помещик Лобачев забрал 4—5 возов сена, сложенного в стог, мотивируя свой поступок тем, будто бы Пипко скосил ему не принадлежащее. Обе тяжущиеся стороны подали протесты бывшему мировому судье Корицкому, который после местного осмотра все же признал виновным Лобачева. Но от этого крестьянину не сделалось легче: забранного сена помещик Лобачев не возвратил, да к тому же захватил и ружье, хотя Пипко имеет билет на право содержания такового от 31 августа 1871 г. за № 875.

На днях крестьянин Николай Касьяник, купив воз дров в лесу уроч. Хмелище от евреев-лесопромышленников, возвращался домой, но проезжая мимо им. Мутвицы, повстречался с Лобачевым. Последний, долго не думая, забрал дрова к себе и, несмотря на имеющийся у Касьяника билет (квиток), не обратил на его заявление никакого внимания. Предлог к подобному поступку Лобачев видел в том, что дрова не куплены Касьяником, а уворованы в его лесу, хотя

лес помещика Лобачева слишком молодой, насколько мне известно, и тщательно оберегается лесными сторожами.

Подобными обстоятельствами помещик Лобачев пользуется и в отношении крестьянок, отнимая у них корзины с грибами и ягодами, собранными в других соседних лесах, по преимуществу гр. Замойского, казенном и Олтушском. Весьма большое количество фактов, компрометирующих личность вполне русского человека и помещика, каким является г-н Лобачев, мне пришлось бы записать, но я ограничиваюсь вышеприведенными, так как упоминать все забранные им вещи у крестьян д. Новолесья не предоставляется возможности. Достаточно сказать, что из 60 домов, имеющихся в д. Новолесье, 7 есть свободных не более, а из остальных по 2, по 3 из каждого дома остались у помещика Лобачева; небольшая же д. Новосады вся буквально оставила память соседу-помещику. Хотя заборы у крестьян почти незначительны, ибо состоят из разных домашних принадлежностей, как-то: корзин, поясов, латух, платков, ножей, возов, лопат, мешков и т. п., но все же для крестьянина они имеют свою цену, да к тому же не было примера, чтобы забранная вещь возвращалась обратно владельцу, ибо помещик Лобачев в подобных случаях неумолим.

Крестьяне же д. Новосады положительно запуганы Лобачевым, потому что не решаются днем возвращаться с овощами со своих огородов, а всегда ожидают наступления ночи, когда Лобачев и его стража уходят домой. У них сложилась даже поговорка: «Идем воровать сами у себя».

О вышеизложенном, во исполнение предписания от 14 августа с. г. за № 73, имею честь донести в.в.б.

Пристав 1-го стана Брестского у. Рыжков.

№ 3. РАПАРТ БРЭСЦКАГА ПАВЯТОВАГА СПРАЎНІКА ГРОДЗЕНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ АБ ПРЫГНЁЦЕ СЯЛЯН ПАМЕШЧЫКАМ ЛАБАЧОВЫМ

11 снежня 1898 г.

Во исполнение предписания от 14 января с. г. за № 508, представляя обратно дело за № 244, честь имею представить при сем в.п. дознание о притеснениях землевладельцем им. Мутвицы Дмитрием Андреевым Лобачевым крестьян д. Новолесье и других и донести, что между означенным владельцем и крестьянами окружающих его имение селений происходят постоянные недоразумения, преимущественно за пастбища; Лобачев старается всемерно притеснять крестьян и не входит с ними ни в какое соглашение; недоразумения эти особенно отражаются на крестьянах ближайших к имению д. Новолесья. У мирового посредника 1-го участка, как он сообщил мне лично, находится в рассмотрении 36 спорных дел о земле между Лобачевым и крестьянами, каковые споры посредником еще не разобраны; этим обстоятельством пользуется, как говорят крестьяне, Лобачев, спорные пастбищные места обращает в пахотные угодья, пользуется всеми спорными землями единолично, а крестьянам не только препятствует пользоваться спорными участками до разбора спора, но даже не позволяет прогнать скот через спорную землю или пройти пешему крестьянину.

Как сообщил мне мировой судья 3-го участка Брестского округа отзывом от 10 октября с. г. за № 2197, за последние 2,5 года Лобачев возбудил против крестьян д. Хмелевка, Новосады, Отятино и Новолесье следующее количество дел: в 1896 г. за самовольную пастьбу скота 187, за порубку и собирание ягод 50, а всего 237 дел; в 1897 г. 720 дел о тех же крестьянах по обвинению в самовольной пастьбе; в 1898 г. о тех же крестьянах за пастьбу скота 189, за порубку 55. За прогон скота через канавы 9, за разложение огня в лесу и сбивание желудей 6, всего 340 дел, а всего за 2,5 года 1297 дел. Эта внушительная цифра тяжебных дел вполне указывает на ненормальные отношения Лобачева с крестьянами, причем на суде по причинам, объясненными крестьянами, записанными в протоколе, Лобачев всегда является более сильной стороной. Самые главные недоразумения происходят за пастбища, чему причиною немало служат неразрешенные 36 спорных дел, а потому до разрешения их трудно с точностью сказать, кто из спорящих прав; крестьяне действительно очень стеснены пастбищем, но в добровольное соглашение с Лобачевым по сему предмету они войти никоим образом не могут.

Уездный исправник Н. Ельчик.

Секретарь Хобец.

Белоруссия в эпоху капитализма. Мн., 1983. Т. 1. С. 189—195.

ПАВЕДАМЛЕННІ ГАЗЕТ ПРА ЦЯЖКАЕ СТАНОВІШЧА СЯЛЯН

«А загляните в любую деревню нашей волости. Грязь по колено... Избы маленькие, тесные, дымные. Пол — голая земля, а по грязи этой разгуливают мелкие домашние животные. Неудивительно после этого, что разные эпидемии, как-то: тиф, дизентерия, т. д., так часто свирепствуют в нашей волости и уносят в могилу сотни жизней... На 18 тысяч населения имеется только 1 врач и несколько пунктов фельдшеров. Последние, за редким исключением, имеют настолько ничтожные медицинские познания, что считать их способными бороться с эпидемией абсолютно невозможно».

Окраина. 1907. 7 кастр.

ЧТО ЕДЯТ КРЕСТЬЯНЕ:

«У многих хлеб вышел задолго до Рождества. В урожайные годы многие прикупают. А в таком году и подавно цены на хлеб дошли до небывалой у нас высоты. Местность у нас глухая. Заработки ничтожные, а есть надо. И многие голодали самым настоящим образом. Были семьи, которые неделями не видели хлеба на своем столе. Дети ходили в «кусочки», а родители стыдились этого и сидели голодные дома... «Квасовка» (подогретый квас с крупою) без хлеба была для многих роскошью».

Окраина. 1907. 11 кастр.

«В хлебе находится порядочный процент примеси мякины, отрубей и других непитательных веществ. Хлеб черный как земля и отдает тухлым запахом...»

Северо-Западный голос. 1907. 15 снеж.

ПОЛОЖЕНИЕ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ РАБОЧИХ В ЛИТОВСКО-БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЯХ

«...Беспросветность, забитость, такая степень эксплуатации, которой во внутренней России не знают. Рабочий день зимой 12—13 часов, летом и в страдные дни — 17—18 часов. Условия найма: 20—45 руб. в год при хозяйской квартире и пище (так называемая ординария). Батрак получает в год: 20—40 пудов ржи, 9—18 пудов зерна на крупу, 20—40 фунтов сала (не везде). Кое-где дается 1/2 морга (1/3 дес.) под картофель. Иногда как ласка корова. Питание голодное. Жилища батраков и челядников поражают своим убогим и антисанитарным состоянием. Рабочие помещаются по 12—15 человек в старой полуразвалившейся «пекарне» или «на чворанах» — специальная батрацкая хата. Пол земляной, сырой, грязный. Зимой замерзает вода. Освещение свое. Для спанья нары без тюфяков и подушек, на своем кожухе. Здесь же и семейные и девушки».

Западный Буг. 1909. 5 крас.

ВИД БЕЛОРУССКОЙ ДЕРЕВНИ

«Только на 2—3 крышах торчат дымовые трубы — досчатые или сплетенные из хвороста. Остальные же лачуги сохранили еще тот вид, какой имели, вероятно, во времена Гостомысла. Закоптелые, грязные курные избы... Со двора вход в огромные сени, где скот. В избу идешь по навозу, на стенах копоть, сажа».

Полесье. 1911. 7 жн.

З КАРЭСПАНДЭНЦЫІ СЕЛЯНІНА ВЁСКІ БАРЫСЫ ДАМАЧАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ

«Мужик: «Я, как крестьянин и питомец деревни, перенесший все невзгоды моих собратьев, попробую описать жизнь деревни... Жизнь крестьянина темна, грязна и непосильно для него тяжела... Особенно же тяжело положение бедняка-крестьянина: часто его обижают незаслуженно, когда он ищет правды, а сосед-богач деньгами себе право покупает и кичится своей славой.

...Так жизнь в деревне и идет своим чередом: богачи богатеют и полнеют, а бедняки падают и худеют, а умрет бедняк, так богачу же и его долька земли останется. Больше всего на бедняка и ложится тяжесть всяких излишних платежей, работ и послуг — как будто бедноте только и суждено одно — терпеть до конца. Взять хотя бы подводную повинность, а также починку дорог: несет ее бедный мужик, имеющий какую-либо одну лошаденку... Владельцы имений от этого освобождены, а богатые откупаются у старосты за гостинец или угощение водкой. Таким в деревне не житье, а масленица. Знай толстей!... Богачам же устраивать школы нет нужды, они учат детей своих в городах, с другими детьми учить не желают. Так и приходится бедняку все нести на своем хребте со словами: «У нас в деревне не жизнь, а каторга».

Гродненская копейка. 1912. 28 снеж.

Светач культуры

У снежні 1996 года споўнілася 90 гадоў з дня заснавання народнай бібліятэкі ў вёсцы Астрамечава.

Праязджаючы па Астрамечаве, нельга не заўважыць у цэнтры вёскі сучасны мураваны будынак з металічнай шыльдай:

«Міністэрства культуры БССР
Астрамечаўская сельская бібліятэка
імя Ф.Ф.Паўленкава
Брэсцкага раёна».

Не кожны ведае, што з'яўленне на Брэстчыне ў 1905 г. адной з першых на Беларусі бясплатных бібліятэк звязана з імем Фларэнція Фёдаравіча Паўленкава — рускага прагрэсіўнага кнігавыдаўца, дзейнасць якога па распаўсюджванні рэвалюцыйнадэмакратычных і асветніцкіх ідэй праходзіла пад уплывам яго сябра Дзмітрыя Іванавіча Пісарава.

Паўленкаў цярпеў ганенні за свае рэ-

Цена асобнаго нумэру 5 коп.

Год трэці. Вильня 9 (22) декабря 1908 г. № 21.

Цэна з перасылкою и дастаўкою на хаты: на 1 г. — 3 р., на 6 мес. — 1 р. 50 к., на 3 м. — 75 к., на 1 мес. — 25 к. Без дастаўкі и перасылкі: на 1 г. — 2 р. 40 к., на 6 м. — 1 р. 20 к., на 3 мес. — 60 к., на 1 мес. — 20 к. За граніцаю: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р., на 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысункамі

Выходзіць раз у тыдзень рускімі и польскімі літэрамі

Падпіска прымаюцца и продаюцца асобныя нумэры газэты: 1) У Кніг. „Наша Ніва" — Віленская вулица дом № 20. 2) У Кнігарні „Навінаў" — Георгіеўскі проспэкт дом № 4. 3) У Кнігарні Літоўскай М. Пасецкай — Шавлянскае. Домінікінская вулица дом № 19.

Адрэс рэдакціи и администрацыі: Вильня, Виленская вулица, дом № 20.

Аб'явленія прымаюцца на последнёй старонцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы и корэспондэнціи, прысланные у рэдакцыю, мусяць быць чытальна напісаны и праўдзівою фамільею и адрэсам таго, хто ім прысылае. Можна также падпісаць прозвіща рамо и фамільею, што пажадчо, каб была надрукована праўдзівая фамілія. Адрэс и фамілія толькі для ведама рэдакціи.

Хто хоча мець даход, прадаючы „Нашу Ніву" у вёсках, мястэчках и гарадох, нехай напіша аб гэтым на паштовай у Кантору нашай газэты.

Народная библіотэка у с. Остромэчэве.

—o—

„К свабодзе, розуму и знанью
Мы працярэбым сабе след.
И будзе умуку ненавісны
Там, дзе сягоньня плачэ дзед".
Янук Купала.

З розных канцоў Беларуси даходзяць да нас вэсьці, што народ, прачуўшыся ў азвярусе апошніх гадоў ад доўгага сну, пачынае разумець вялікае значэньне навукі и цягнецца к сьвету ясьцы. Дзе-не-дзе нашы сяляне и мястэчковые людзі клапоцяцца ўжо аб школах, библіотэках, чытальнях, — выпісываюць газэты, купляюць кнігі. Але ўсё гэта робіцца нельмі памалу, ды часам, як ня стараюцца людзі, з іх працы нічога не выходзіць: нехват у іх знаньня, не прывыклі спачу да супольнай, грамадзкай работы над праўдзівай свае и братоў сваіх.



Вось чаму нельмі важна и карыстна рэч, калі аб культурную работу вопьмуцца людзі пітаціятывные. Добры прыклад гэтаго дае нам Гродзенская губэрня. Тамака ўжо колькі гадоў сталі мужыкі рупіцца аб школы, библіотэкі, ды знайшлося колькі пітаціятэтоў, каторые дзеля ім сваю помач; и вось справа пайшла добра, ды так, што цяпер у Вельскім и Брэсцкім павэтах ёсць ужо с пятнаццаць народных библіотэк-чытальняў па вёсках и сёлах, а запраўляюць ныя самы мужыкі, самы складаюць гроны на іх.

Да першых библіотэк у тым кутку Беларуси належыць дармовая *народная библіотэка-чытальня імэни Ф. Паўленкова у с. Остромэчэве*, Брэсцкаго павэту. Аткрылася яна ў 1905 году — тры годы таму назад. Апроч кніг, каторых на 50 руб. прыслала ў бібліотэку з „фонда" Паўленкова, дастала яна падмогу грашыма и кнігамі ад аднаго товарыства з Францыі, ад расейскаго пісара Максіма Горкаго, ад сьв. Грыгора Петрова и другіх. — У 1907 году было ўжо 1039 кніг, каторые брали мужыкі з пяцёх вёсак суседніх. Чытала 290 мужыкоў. Цяпер кніг ешчэ прыбыло, ды ўсё болей людзей карыстаюць з іх. У тым году кожны чытаюць, лічачы ягудам, прачытаў па 15 кніжок.

На нашым рысунку бачым хату, у каторай заведзена гэта библіотэка.

Старонка газеты «Наша ніва» з артыкулам, прысвечаным бібліятэцы ў Астрамечава. 1908 г.

валюцыйныя погляды, 10 гадоў знаходзіўся ў ссылках і царскіх турмах. У 1867 г. яго аддалі суду за выпуск твораў Дз.Пісарава. Праз год яго зняволілі ў Петрапаўлаўскай крэпасці, затым выслалі ў Вятку.

У вяцкай ссылцы Ф.Ф.Паўленкаў стварыў вядомую «наглядную азбуку» (наглядна-гукавы метад самаабучэння пісьменнасці), якую выдавалі ў Расіі 22 разы. Усяго Ф.Ф.Паўленкаў выдаў больш за 600 назваў кніг тыражом каля 3 мільёнаў экзэмпляраў. Сярод выданняў былі, напрыклад, «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы» Ф.Энгельса, творы В.Р.Бялінскага. Ф.Ф.Паўленкаў падрыхтаваў першае ў Расіі выданне твораў А.І.Герцэна.

Ф.Ф.Паўленкаў вёў актыўную прапаганду навукова-папулярнай літаратуры, выдаваў творы рускіх і замежных класікаў. Яму належыць ідэя стварэння серый кніг для дзяцей «Пушкінская бібліятэка», «Лермантаўская бібліятэка», «Гогалеўская бібліятэка».

Сродкі, атрыманыя ад выдавецкай дзейнасці, Фларэнцій Фёдаравіч Паўленкаў завяшчаў на арганізацыю дзвюх тысяч народных сельскіх бібліятэк у расійскай глыбінцы. Адной з такіх бібліятэк была Астрамечаўская, адкрытая ў 1905 г.

У першыя гады Астрамечаўскай бібліятэкай кіраваў настаўнік мясцовага народнага вучылішча Антон Паўлавіч Зянкевіч. Яго намаганнямі бібліятэка папаўнялася творамі прагрэсіўных рускіх і замежных пісьменнікаў. Свае кнігі прыслалі ў Астрамечава Максім Горкі і Янка Купала, а таксама іншыя перадавыя літаратары таго часу. У 1908 годзе ў бібліятэцы было ўжо больш за тысячу кніг і яна абслугоўвала 240 чытачоў. У бібліятэцы захоўвалася і распаўсюджвалася нелегальная палітычная літаратура.

У 1915 г. нямецкая акупацыя перапыніла дзейнасць бібліятэкі. Кайзераўскія салдаты разрабавалі і часткова знішчылі яе кніжны фонд, у тым ліку і кнігі, падараваныя Максімам Горкім і Янкам Купалам.

У канцы 1920-х гадоў бібліятэка зноў пачала працаваць. Аднак у 1934 г. улады буржуазнай Польшчы закрылі бібліятэку, лічачы яе асяродкам рэвалюцыйных настрояў сярод сялян Прыбужжа.

У 1946 г. Астрамечаўская бібліятэка зноў адкрылася. І сёння яна працягвае справу свайго знакамітага стваральніка, выхоўваючы сваіх чытачоў, несучы ім святло ведаў. Кніжны фонд бібліятэкі складаецца з 14 тысяч кніг, якімі карыстаецца больш за 1400 чытачоў.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Германскае нашэсце скранула мірных жыхароў з родных мясцін. Сотні сем'яў адыходзілі на ўсход, у глыб Расіі, каб не апынуцца пад прыгнётам нямецкіх акупантаў. Гналі з сабой жывёлу, везлі рэчы. Першыя бежанцы з Гродзенскай губерні знаходзілі прытулак далёка ад родных мясцін, у глыбіні Расіі, асвойваліся там, спадзеючыся ў душы, што гэтая бяда хутка міне.

Але вайна працягвалася, забірала тысячы ахвяр, абвастрала і без таго рэвалюцыйны настрой народных мас.

Люты 1917 г. прынёс буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю, якая знішчыла царскую манархію і аддала ўсю ўладу буржуазіі. Аднак у ваенным пытанні нічога не змянілася. Зноў гінулі на франтах людзі, голад і холад панавалі ў краіне. Часовы ўрад не здолеў авалодаць сітуацыяй і перапыніць нарастанне новай рэвалюцыйнай хвалі.

У ноч на 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. у Петраградзе пачалося ўзброенае паўстанне, у выніку якога Часовы ўрад А.Ф.Керанскага быў звергнуты.

Беларусь адклікнулася на гэта сваімі рэвалюцыйнымі дзеяннямі. Да 20 лістапада (3 снежня) 1917 г. улада на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі перайшла да Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Такая адносна лёгкая перамога тлумачыцца тым, што ўсе чакалі вырашэння набалелых пытанняў таго часу — аб міры і зямлі. Рабочыя, сяляне і салдаты горача падтрымалі дэкрэты II Усерасійскага з'езда Саветаў. Распачалося стварэнне савецкіх органаў улады.

Але толькі водгукі гэтых падзей даляталі да Брэстчыны, якая знаходзілася ў тыле кайзераўскіх войскаў.

З сакавіка 1918 г. Расія падпісала ў Брэсце мірны дагавор з Германіяй, Аўстра-Венгрыяй, Балгарыяй і Турцыяй. Дагавор дазваляў выйсці з вайны і тым самым выратаваць рэвалюцыю і савецкую ўладу. Але па гэтым дагаворы Расія губляла вялізныя тэрыторыі: Украіну, Польшчу, Прыбалтыку, частку Беларусі і Закаўказзя.

Лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. у Германіі азначала канец акупацыі і паспрыяла самавызначэнню народаў. Былі абвешчаны незалежнымі Польшча, Літва. Спробы саветызацыі незалежнай Польшчы і аб'яднання сацыял-дэмакратычных і сацыялістычных сіл для ўзяцця ўлады аказаліся няўдалымі. Уладу захапілі буржуазна-нацыяналістычныя партыі. Па-

колькі яшчэ у жніўні 1918 г. Савецкі ўрад сваім дэкрэтам адмовіўся ад дагавораў і актаў Расійскай імперыі аб падзеле Рэчы Паспалітай (відаць, спадзяваўся на перамогу польскага пралетарыяту), польскае кіраўніцтва пачало заяўляць свае правы на беларускія землі.

У лютым 1919 г. больш за 10 дывізій польскіх войскаў рушылі на Вільна, Ліду, Маладзечна, Баранавічы і Мінск, а таксама на Кобрын і Пінск. Да сярэдзіны сакавіка 1919 г. палякі захапілі Брэст, Ваўкавыск, Слонім, Скідаль, Шчучын, Пінск, Баранавічы. У маі 1919 г., карыстаючыся тым, што Чырвоная Армія вядзе баі на Усходнім фронце, польскія войскі перайшлі да больш актыўных дзеянняў. 8 жніўня захапілі Мінск, а неўзабаве выйшлі на Бярэзіну. Беларускі народ не скарыўся акупантам, пачалося разгортванне партызанскай барацьбы.

У час савецка-польскай вайны 1920 г. 11 ліпеня быў вызвалены Мінск, затым — Бабруйск, Баранавічы, Гродна, Пінск, а 1 жніўня дачакаліся вызвалення ад польскіх акупантаў Брэст і Брэстчына. Свабоду прынеслі 2-я і 10-я стралковыя дывізіі 16-й арміі.

27 ліпеня 3-і конны корпус Г.Дз.Гая ўзяў крэпасць Асавец на рацэ Бобр, уступіўшы на тэрыторыю Польшчы. Пасля баёў на рацэ Заходні Буг войскі Заходняга фронту рушылі ў глыб Польшчы.

Пад Варшавай Чырвоная Армія сустрэла актыўнае супраціўленне, а 16 жніўня палякі распачалі контрнаступленне. У выніку 19 жніўня Брэст і тэрыторыя сучаснага Брэсцкага раёна зноў былі акупіраваны польскімі войскамі.

18 кастрычніка 1921 г. у Рызе быў падпісаны мір паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Гэта быў цяжкі і несправядлівы мір, асабліва для Беларусі: яе заходняя частка адышла да Польшчы, і менавіта ў гэтай частцы знаходзілася тэрыторыя сучаснага Брэсцкага раёна.

В.П.Россіхін.

Дакументы сведчаць

СПРАВАЗДАЧА ПА БРЭСЦКІМ ПАВЕЦЕ ЗА 1919 ГОД

I. ХОЗЯЙСТВЕННО-ЭКОНОМИЧЕСКОЕ ПОЛОЖЕНИЕ БРЕСТСКОГО УЕЗДА ПО ДАННЫМ НА VI МЕСЯЦ 1919 г.

Площадь уезда — 5000 кв. м = ± 409 750 десятин (лугов 90 000, пашни 218 000). Шоссе в уезде — 335 км, ж/д колеи — 250 км.

Население — 84 724, реэмигрантов от 1.IV.19 г. — 1.1.20 г. — ± 34 000. Коней было 5263 шт., сейчас — ± 10 000, крупного рогатого скота было 3798 шт. (коров — 3642, быков — 147, телят — 9), сейчас — ± 6000, овец — 1297 шт., свиней — 3250 шт., коз — 160 шт.

Посевы составляли в 1918/19 году в десятинах:

рожь — 3915 д. и 480 д., засеянных немцами	
пшеница — 161 д.	просо — 130 д.
овес — 377 д.	гречиха — 268 д.
ячмень — 446 д.	горох — 15 д.
лен — 33 д.	картофель — 1246 д.
конопля — 10 д.	овощи — 119 д.

Сбор урожая (в пудах) приблизительно:

рожь — 19 575 п.	горох — 600 п.
пшеница — 4830 п.	картофель — 498 400 п.
овес — 11 310 п.	просо — 5200 п.
ячмень — 9425 п.	лен — 155 п.
гречиха — 10 720 п.	конопля — 200 п.

II. АКЦИЯ СЕВА: ВЕСЕННЯЯ

Надо было овса — 60 000 п., получено — 1113 п.

ячменя — 33 000 п.,	получено	11 241 п.
ржи яровой — 33 000 п.,	-"-	—
пшеницы — 20 000 п.,	-"-	—
гречихи — 12 000 п.,	-"-	—
проса — 6000 п.,	-"-	—
гороха — 12 000 п.,	-"-	—
люпина — 650 п.,	-"-	1221 п.
картофеля — 220 000 п.,	-"-	84 442 п.

Выше приведенные цифры говорят о том, что обеспечение семенами для весеннего сева было недостаточным, кроме того — с запозданием.

Акции сева осеннего:

Потребность составляла: ржи — 260 000 пудов, получено — 29 032 п.; пшеницы — 100 000 п., получено — ноль.

Необеспеченная потребность в этом направлении частично покрыта была самими людьми, которые закупили рожь для сева —значительную часть зерновых.

По обеспечению сельскохозяйственным инвентарем сделано следующее:

продано по ценам значительно ниже рыночных:

кос — 209 штук, пахотных приспособлений — 145 шт., плугов А-1 — 17 шт., плугов А-2 — 53 шт., бабок — 101 шт., предохранительных колец (поршневых) — 100 шт., молотков — 101 шт. С помощью работника сельхозотдела из Управления трофейным имуществом продано:

культиваторов — 26 шт., борон с/х — 13 шт., сох — 2 шт., косилок — 2 шт., веялок — 6 шт., зерноочистительных машин — 2 шт., жнеек — 2, конных грабель — 2, молотилок — 2, локомобиль — 1, лемехов — 6 шт., запасные части к косилкам.

Для того чтобы помочь населению во время сенокоса, в июле законтрактовано 166 850 пудов сена, на что затрачено аванса: наличными — 91 370 марок; натурой: ячменем — 1711 пудов стоимостью 5715 марок, салом — 61 пуд стоимостью 16 096 марок.

Референт по сельскому хозяйству Брестско-Литовского уезда

Пераклад з польскай мовы А.А.Чабанюк.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 2. Л. 1, 1 адв.

З ПРАТАКОЛА БЕЖАНЦАЎ-БЕЛАРУСАЎ ГРОДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ

29 красавіка 1918 г.

1918 г. апреля 29/10. Мы, нижеподписавшиеся, беженцы Гродненской губернии, проживающие в пределах Ядринской волости, уезда, обсуждали постановление беженцев, проживающих в Козьмодемьяновском уезде, вынесших резолюцию по поводу воззвания белорусской громады в гор. Москве, из которой видно, что при обсуждении условий мира представители австро-германской мирной делегации в Брест-Литовском заявили, что народы занятой неприятелем территории будто бы выразили желание отойти от России к Германии; таким образом многие белорусские земли могут быть отторгнуты от России и переданы во владение Германии и мы, белоруссы Гродненской губернии, тогда должны будем перейти в германское подданство и превратиться в рабов немецких господ, помещиков и капиталистов, как и были раньше под игом своих помещиков и капиталистов, и добытая нами и нашими товарищами-беженцами свобода проподет даром. Такого заявления от коренного населения белорусских земель не могло быть. При наступлении неприятеля белоруссы, не желая оставаться под властью немцев, почти все покинули родину, остались только помещики, торговцы и капиталисты, враги рабочего народа и крестьянства, но не белоруссы. Но как помещики, так и торговцы, оставшиеся в наших белорусских землях, ничего общего с нами, коренным белорусским народом, не имеют и мнение их не может быть мнением белоруссов, — ПОСТАНОВИЛИ:

1. Возмущенные таким заявлением, мы, белоруссы Гродненской губернии, проживающие в пределах Ядринской волости, уезда, протестуем против перехода белорусских земель во владение немцев или австрийцев и против перехода белоруссов в германское подданство. Обращаемся ко всем народам России и демократии всего мира и просим встать на защиту нас, белоруссов. Мы желаем остаться в составе Российской Федеративной Республики и не только не желаем быть подданными Германии, но не допускаем даже мысли о переходе в германское подданство.

За время войны мы все потеряли, что имели, перенесли тяжкие страдания и переносим их теперь, и, в случае перехода в подданство Германии, эта неволя в чужом государстве будет

тягчайшим из всех наших страданий. Единый белорусский народ и не может и не должен быть разделен на части, он должен остаться целым, и ему должно быть предоставлено, как и другим народам, право определять свою судьбу. Мы желаем возвратиться в свою родную белорусскую землю свободными русскими гражданами и всеми силами поддерживаем своих товарищей-беженцев, проживающих в Козьмодемьяновском уезде, вынесших постановление и начавших такое важное дело.

Для обсуждения положения белоруссов мы находим необходимым немедленный созыв общебелорусского народного собрания.

2. Просим ходатайствовать перед Советом Народных Комиссаров просить защиты, просить сообщить, какая участь ожидает белоруссов.

Следуют 33 подписи.

Крах немецкой оккупации в Белоруссии в 1918 году: Сборник документов партархива ЦК КП(б)Б. Мн., 1947.

У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ (1921—1939)

Паводле Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г., заходнія землі Беларусі ўвайшлі ў склад Польскай дзяржавы. Такі ж лёс напаткаў і Брэстчыну. Тут было ўведзена адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне, якое было прынята ў Польшчы. У Палескае ваяводства ўвайшло 10 паветаў: Брэсцкі, Драгічынскі, Камень-Кашырскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі, Сарненскі, Столінскі. Тэрыторыя сучаснага Брэсцкага раёна з'яўлялася састаўной часткай Брэсцкага павета, які у сваю чаргу, паводле даных на 1922 г., уключаў у сябе 23 гміны: Велікарыцкая, Войская, Воўчынская, Высока-Літоўская, Вярховіцкая, Дамачаўская, Дварцоўская, Дзмітравіцкая, Жыцінская, Камянец-Жыровіцкая, Камянец-Літоўская, Косіцкая, Лышчыцкая, Маларыцкая, Матыкальская, Мяднянская, Олтушская, Палавецкая, Прыбараўская, Рагачыцкая, Радваніцкая, Ратайчыцкая, Турноўская.

У 1928 г. пры ўзбуйненні гмін скасаваны Войская, Дварцоўская, Жыцінская, Лышчыцкая, Палавецкая, Прыбараўская, Радваніцкая гміны.

Неабходна ўлічваць, што ў межах Брэсцкага павета знаходзіліся тэрыторыі сучасных Камянецкага і Маларыцкага раёнаў, а таксама шэраг вёсак, якія ўваходзяць цяпер у Беластоцкае ваяводства Рэспублікі Польшча. Звесткі, прыведзеныя ніжэй, датычаць у цэлым Брэсцкага павета. З іх цяжка выдзеліць тое, што адносіцца толькі да Брэсцкага раёна.

Плошча Брэсцкага павета на 1930 г. раўнялася 4648 км² і складала 11,8% плошчы Палескага ваяводства. Разам з тым па колькасці (213 440 чал., або 17,7% ад агульнай колькасці жыхароў ваяводства) і шчыльнасці насельніцтва (48 чалавек на 1 км²) Брэсцкі павет займаў першае месца ў ваяводстве.

Паўночная і паўднёвая часткі Брэсцкага павета (умоўнай граніцай паміж імі можна лічыць р. Мухавец) мелі розныя прыродныя і гаспадарчыя характарыстыкі. Паўднёвы край адрозніваўся высокай ступенню забалочанасці, акрамя таго, каля 50% усёй плошчы тут складалі лясы. Амаль 2/3 усяго насельніцтва павета пражывала ў добра асвоенай паўночнай частцы, дзе апрацоўцы зямлі не перашкаджалі балоты і лясы.

У 1929 г. на тэрыторыі Брэсцкага павета размяшчалася 866 населеных пунктаў, у тым ліку 3 гарады: Брэст, Высока-Літоўск, Камянец-Літоўск, а таксама вёскі, фальваркі, асады, хутары.

На агульнае развіццё павета вялікі ўплыў аказвала наяўнасць сродкаў камунікацыі. Праз яго тэрыторыю праляглі чыгуначныя лініі: Брэст—Варшава, Брэст—Баранавічы,

Брэст — Ковель, Брэст — Беласток, Брэст — Холм, Брэст — Пінск, працягласцю 205 км. Тут праходзілі шашэйныя дарогі на Варшаву, Мінск, Уладаву, Кобрын, Ковель, Янаў, Пружаны, Жабінку, Камянец. Іх працягласць 398 км. Вялікую ролю выконвалі грунтавыя дарогі і водныя шляхі.

Паводле даных перапісу 1931 г., у Брэсцкім павеце пражывала 112 248 беларусаў (афіцыйна 95 226 чалавек было запісана тутэйшымі і толькі 17 022 беларусамі), 50 248 палякаў, 32 089 яўрэяў, 17 926 украінцаў, 3075 рускіх, 59 немцаў, 19 чэхаў, 6 літоўцаў, 2511 іншых.

З асаблівасцей нацыянальнага складу вынікалі спецыфічныя рысы канфесіянальнай сітуацыі ў краі. Дакументы за 1936—1937 гг. сведчаць, што ў Брэсцкім павеце яна выглядала крыху інакш, чым у цэлым па Палескім ваяводстве: 82% насельніцтва павета з'яўляліся прыхаджанамі хрысціянскай царквы (праваслаўныя, каталікі, евангелісты і інш.), у той час, як па ваяводстве гэта катэгорыя складала ў сярэднім 90%. Розніца была таму, што ў павеце прыхільнікаў іудаізму 18% (у астатніх паветах Палескага ваяводства гэта лічба не перавышала 10%).

Вышэйшым органам улады ў павеце з'яўлялася павятовае староства. Яно ажыццяўляла агульнае кіраўніцтва адміністрацыйна-гаспадарчым і культурным жыццём. У гмінах былі створаны мясцовыя выканаўчыя органы — управы, а ў вёсках уладу прадстаўляў солтыс. Парадак у краі падтрымліваўся з дапамогай паліцэйскіх участкаў (пастарункаў).

На пачатку 1920-х гадоў Палессе знаходзілася ў бядотным становішчы, гады вайны наклалі свой адбітак на ўсе бакі жыцця. Вось як апісваюцца абставіны ў м. Дамачава на 1921 г.:

«Пасля адступлення чырвоных у жніўні мінулага года, нас наведаў сам бацька Балаховіч. Яго войска згвалтавала больш 70 жанчын, сярод якіх былі дзяўчынкі 12 гадоў і бабулі. Усё насельніцтва абрабавалі, мужчын забілі, жывёлу забралі, а мястэчка спалілі. Засталася 1/4 усіх будынкаў. Але наша мястэчка напаткаў цяжкі лёс. У верасні чырвоны певень знішчыў усе жылыя памяшканні. Цяжка апісаць гэту галечу. На днях паехала у Канаду група сірат з 60 чалавек, ахвяры зверстваў Балаховіча».

Паступова людзі вярталіся да мірнай працы, адбудоўвалі дамы, засявалі палі, аднаўлялі прамысловыя прадпрыемствы. Асноўная частка працаздольнага насельніцтва была занята на сельскай гаспадарцы — 145 142 чалавекі. Сацыяльная структура ў павеце была наступная: у прамысловасці працавала 25 406, у гандлі — 11 957, на транспарце — 11 181, на дзяржаўнай службе — 5784, у сістэме адукацыі і медыцынскіх установах — 3761, у лясной гаспадарцы, рыбалоўстве, агародніцтве — 988, астатнія — 11 708 чалавек.

Да сярэдзіны 1925 г. у Брэсцкім павеце налічвалася 199 прадпрыемстваў, якія займаліся ў асноўным перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі і некаторых відаў мясцовай сыравіны. Асабліва хутка развівалася харчовая і дрэваапрацоўчая прамысловасць.

З аднаго боку, польскія ўлады былі зацікаўлены ў аднаўленні прамысловага і сельскагаспадарчага патэнцыялу, з другога — пазбягалі ўкладваць бюджэтныя сродкі ў развіццё эканомікі беларускіх зямель. Палітыка дзяржавы ў адносінах «усходніх крэсаў» заключалася ў тым, каб як мага больш выкачаць з тэрыторыі Заходняй Беларусі прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі. У выніку падрыву эканамічных рэсурсаў была нанесена вялікая шкода гэтым абласцям. Так, беларускія паветы з'явіліся для Польшчы важнейшымі пастаўшчы-

РАМЕСНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ У БРЭСЦКІМ ПАВЕЦЕ

1938 г.

№№ п/п	Название ремесленной специальности	Количество ремесленников-христиан	Количество ремесленников-евреев
1.	Группа строительных специальностей	12	42
2.	Деревообрабатывающие спец-сти,	48	91
	в том числе столяров	21	61
3.	Текстильное производство,	22	141
	в том числе портные	16	102
4.	Металлообрабатывающие спец-сти,	101	91
	в том числе кузнецов	93	53
	слесарей	7	20
5.	Сфера обслуживания,	66	118
	в том числе производство сахара	7	12
	пекарей	9	36
	мясников	14	69
6.	Группа кожевенных спец-стей,	27	187
	в том числе сапожников	25	125
7.	Сфера особых услуг,	2	27
	в том числе фотографов	–	7
	парикмахеров	2	20
Итого:		278	694

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 3017. Л. 4.

камі драўніны: толькі за 1927 г. на тэрыторыі Брэсцкага павета было вырублена 585 га лесу. У 1937 г. у павеце дзейнічала 11 лесапільных заводаў з 320 рабочымі і фанерная фабрыка з 55 рабочымі.

Побач з дрэваапрацоўчымі прадпрыемствамі дамініруючую ролю ў павеце адыгрывала мукамольная вытворчасць. Млыны былі чатырох тыпаў: паравыя, маторныя, вадзяныя і ветраныя. У в. Чарнаўчыцы ўладальнікам маторнага млына быў Станіслаў Лахоўскі, у в. Матыкалы — Фларыян Пекалькевіч, вадзяны млын у в. Ляплёўка належаў Арону Бінштоку. Дзейнічалі млыны ў вёсках Тамашоўка, Чэрні, Дамачава, Лышчыцы і інш.

Да пачатку 1937 г. у павеце налічвалася 11 цагельных заводаў, 2 з іх знаходзіліся ў в. Гершоны: уладальніка Дабравольскага з 40 работнікамі і Лібермана з 60 работнікамі. Смалакурня Мілера і Гольдрайха ў в. Падлессе Радваніцкай гміны нарыхтоўвала шкіпінар і смалу, там працавала 8 чалавек.

У Брэсцкім павеце быў нізкі ўзровень развіцця прамысловасці. Прадпрыемствам не хапала капіталаў для пашырэння вытворчасці, нізкім было тэхнічнае аснашчэнне.

Каб забяспечыць мясцовае насельніцтва прамысловымі таварамі і рознымі паслугамі, развівалася рамесніцкая вытворчасць, у якой у пераважнай большасці працавалі яўрэі.

За перыяд з 1921 па 1939 гг. край перажыў 2 эканамічныя крызісы — у 1924—1926 гг. і ў 1929—1933 гг. Яны ахапілі ўсе галіны прамысловасці і прывялі да закрыцця многіх прадпрыемстваў. У 1933 г. была спынена работа на шпалапрапітным заводзе ў в. Тамашоўка, які належаў польска-бельгійскаму таварыству. Тады было звольнена 136 рабочых. У снежні гэтага ж года на лесапільным заводзе таварыства «Brokkop» у в. Ляплёўка было звольнена 30 чалавек. Многія прадпрыемствы працавалі няпоўны працоўны тыдзень.

Адным з вынікаў нестабільнасці гаспадарчай дзейнасці, аграрнага пера-

АГРАРНАЯ СТРУКТУРА БРЭСЦКАГА ПАВЕТА

1936 г.

Размер земельного надела в хозяйстве (в га)	Количество хозяйств	Процент от общего кол-ва хозяйств
до 0,5	2 217	5,5
0,5 – 1,0	3293	7,8
1,0 – 2,0	6 384	15,2
2,0 – 3,0	6 091	14,5
3,0 – 4,0	5 696	12,9
4,0 – 5,0	5 332	12,7
5,0 – 10	12 851	30,7
до 10	41 864	86,3
10 – 20	5 676	11,7
20 – 50	844	1,7
50 – 100	41	0,1
100 – и выше	77	0,2

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф.1. Воп. 6. Спр. 55. Л. 7.

насялення вёскі і замаруджаных тэмпаў развіцця прамысловасці стала беспрацоўе. У 1938 г. толькі ў гміне Дамачава налічвалася 148 беспрацоўных. Тыя, хто страціў работу, не атрымлівалі дапамогі, толькі некаторым сем'ям дапамагалі дабрачынныя арганізацыі.

Уладальнікі прадпрыемстваў павялічвалі рабочы дзень, каб кампенсаваць свае страты, якія былі выкліканы эканамічным крызісам, зарплата выдавалася з вялікімі спазненнямі. Гэта выклікала незадаволенасць. 30 мая 1931 г. забаставалі 24 рабочыя, якія рамантавалі шашу Брэст—Матыкалы. Аналагічны выпадак меў месца 6 жніўня 1931 г. у час рамонтных работ Чарнаўчыцкай шашы; у забастоўцы ўдзельнічала 15 чалавек. Рабочыя патрабавалі 8-гадзіннага рабочага дня, павышэння зарплаты і чулых адносін да сябе з боку майстра.

У Брэсцкім павеце сельская гаспадарка з'яўлялася асноўным занятка м насельніцтва. Ворыўныя землі складалі 186 371 га ад агульнай плошчы зямлі (41,7%), лугі займалі 69 513 га (15,5%), пашы — 38 805 га (8,7%).

У Заходняй Беларусі пануючымі былі буйныя памешчыцкія землеўладанні, асноўныя сялянскія масы былі малазямельныя і беззямельныя.

Менавіта буйныя гаспадаркі, якія складалі ўсяго 2% ад агульнай колькасці гаспадарак у павеце, сканцэнтравалі асноўныя зямельныя фонды. 95 сялянскіх гаспадарак в. Шумакі мелі 700 га зямлі, з іх 10 га знаходзілася пад жылымі забудовамі, 480 га — пад ворывам, 108 га — пад лугамі, 36 га — пад пашамі, 20 га — пад лесам. У той жа час Вислоцкаму Францішку належаў маёнтак Лышчыцы агульнай плошчай 1300 га, з іх сельскагаспадарчымі ўгоддзямі было занята 443,5 га. У Дамачаве памешчык Ронікер валодаў маёнткам, які ўключаў 5824 га зямлі.

Сялянскія гаспадаркі не мелі магчымасці нармальна развівацца. Часта сялянская сям'я не магла апрацаваць зямлю. Адсутнасць дарагіх сельскагаспадарчых машын, нізкая вытворчасць працы, невысокая культура вядзення гаспадаркі прыводзілі да неўраджаяў. Бедствам была цераспалосіца, у в. Дубок сялянскі надзел складаўся з 18 палосак зямлі.

Вядучымі галінамі ў сельскай гаспадарцы Брэсцкага павета з'яўляліся зерняводства, бульбаводства, жывёлагадоўля.

РАЗВІЦЦЁ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў БРЭСЦКІМ ПАВЕЦЕ

1937 г.

Отрасль / Часть повета	лошади	крупный рогатый скот	свиньи	овцы	козы
в городах	765	1103	1442	30	188
в хозяйствах с землей более 50 га	813	2173	959	343	4
в хозяйствах с землей менее 50 га	34 932	87 786	71 039	79 302	118
Всего:	36 510	90 992	73440	79 675	310

З мэтай ліквідацыі цераспалосіцы праводзілася палітыка хутарызацыі сялянскіх гаспадарак. Ішла яна вельмі марудна, бо сяляне не жадалі перасяляцца на забалочаныя землі.

Аграрная рэформа, якую праводзіў польскі ўрад, уключала ў сябе і продаж зямлі невялікімі ўчасткамі. Але існавалі абмежаванні для некаторай катэгорыі пакупнікоў. У кастрычніку 1937 г. палескім ваяводам усім павятовым старастам была разаслана тайная інструкцыя: «Да асоб, якія адносяцца або спачуваюць варожым польскай культуры нацыянальнасцям (украінцы, беларусы, рускія, яўрэі), неабходна рашуча і без выключэння прымяняць абмежаванні пры куплі зямлі. Сапраўдная справядлівасць — гэта ацэнка ворагаў з пункту гледжання іх адносін да польскай дзяржавы. Палессе павінна быць польскім, незалежна ад мясцовай гаворкі і веравызнання большасці насельніцтва. Нават справядлівасць павінна адступіць перад вялікімі інтарэсамі польскага духу».

У пошуках падтрымкі польскія ўлады праводзілі на беларускіх землях палітыку насаджэння каланістаў-асаднікаў з ліку былых удзельнікаў польска-савецкай вайны 1919—1920 гг. Зямельныя ўчасткі яны атрымлівалі часта бясплатна або за вельмі нізкую плату, іншы раз да 45 га, г.зн. адбывалася ўмацаванне пазіцый у «крэсах усходніх» польскага землеўладання. Мяркуючы па даных на 1936 г., гэты працэс на тэрыторыі Палескага ваяводства найбольш паспяхова ішоў у Брэсцкім павеце: да канца года налічвалася 29 асад і 193 каланісты. Асаднікі з'яўляліся запасным узброеным атрадам, гатовым у выпадку неабходнасці для выканання паліцэйскіх функцый.

Матэрыяльнае становішча павета і гмін залежала ад падатковых паступленняў ад насельніцтва (яны складалі палавіну бюджэту павета) і ад выканання працоўнай павіннасці па будаўніцтве дарог. Колькасць падаткаў і іх памеры павялічваліся. У гэтых умовах цяжка было сялянству. Цэны на прамысловыя тавары былі вельмі высокія, а на прадукцыю сельскай гаспадаркі нізкія. У 1938 г. селяніну, каб купіць пару ботаў, трэба было прадаць 125 кг жыта або 31 кг свініны.

Сяляне вымушаны былі весці натуральную гаспадарку: займацца вырабам глінянага посуду, прылад працы, адзення і інш. Для таго, каб пракарміць сябе і свае сем'і, малазямельныя сяляне ішлі да памешчыкаў у парабкі. У пошуках заробкаў яны накіроўваліся за мяжу: у Латвію, Францыю, Паўночную і Паўднёвую Амерыку.

Сяляне не маглі выплаціць усе падаткі за зямлю, жылыя пабудовы, на ўтрыманне органаў самакіравання,

Сялянская хата ў в. Антанова. 1933 г.

акцызныя і гербавыя зборы. Улады часта выкарыстоўвалі прымусовыя меры. Шырока практыкаваўся продаж маёмасці сялян з малатка. У 1931 г. у в. Неплі Матыкальскай гміны было апісана 37 гаспадарак. У 1932 г. у той жа вёсцы запазычанасць па падатках склала 800 зл., у в. Казловічы — 1600 зл., а ўсяго па гміне — 37 000 зл. Такая ж сітуацыя складвалася і ў астатніх гмінах Брэсцкага павета.

Бюджэтныя сродкі ў павеце размяркоўваліся наступным чынам (паводле даных на 1936—1937 гг.): з агульнай сумы 530 330 зл. на адміністрацыйныя расходы асігнавалася 71 732 зл., на ўтрыманне дарог — 223 811 зл., на патрэбы бяспекі — 10 760 зл., на сацыяльнае забеспячэнне — 10 455 зл., на адукацыю — 4810 зл., артыкул расходаў на развіццё культуры ў бюджэце не прадугледжваўся.

На ахову здароўя адводзілася 32 778 зл., або 6% бюджэтных сродкаў. Улічваючы стан здароўя насельніцтва, санітарныя абставіны ў краі і адсутнасць пэўнай сеткі медыцынскіх устаноў, гэтых сродкаў было недастаткова.

Кліматычныя ўмовы — частыя туманы і атмасферныя ападкі, асаблівасці ландшафту — забалочанасць мясцовасці, прыводзілі да ўзнікнення і распаўсюджвання сярод насельніцтва захворвання дыхальных шляхоў. Так, у час праверкі прызыўнікоў, 1908—1911 гг. нараджэння, 1932 г. медыцынская камісія пры аглядзе 6393 чалавек выявіла 338 выпадкаў наяўнасці туберкулёзу. Выкарыстанне для піцця недабраякаснай вады прыводзіла да кішэчных захворванняў. Са снежня 1930 г. па студзень 1932 г. у шпіталях г. Брэста лячылася 6 чалавек ад дыфтэрыі, 59 ад брушнога тыфу і 12 чалавек з вострымі атручэннямі.

Становішча ўскладнялася, як адзначалі самі ўрачы, недахопам лазняў, антысанітарыяй у павеце, невысокім узроўнем дабрабыту насельніцтва. Значная плата за лячэнне не давала магчымасці хворым звяртацца да паслуг урачоў і бальніц. У 1931 г. запазычанасць насельніцтва за лячэнне склала 4157 злотых.

У Брэсце дзейнічалі бальніцы: яўрэйская (100 ложкаў), чыгуначная (130 ложкаў), гарадская (110 ложкаў)

і Палеская лячэбніца ўрачоў-спецыялістаў. Плата за лячэнне ў іх складала ад 7 да 11 злотых за суткі. У в. Тамашоўка знаходзіўся туберкулёзны санаторый на 40 ложкаў. У 1930 г. у Брэсцкім павеце налічвалася 67 урачоў, 34 дантысты, 20 фельчараў, 35 акушэрак. Адзін урач абслугоўваў больш за 4000 чалавек. У павеце працавала 10 аптэк. У найбольш цяжкім становішчы былі жыхары сельскай мясцовасці: практычна ўсе ўрачы жылі ў горадзе, там былі сканцэнтраваны амаль усе медыцынскія ўстановы. Дыспрапорцыі паміж горадам і вёскай былі прыкметныя і ў культурным жыцці.

Цяжкае сацыяльнае і эканамічнае становішча спалучалася з нацыянальным прыгнётам беларускага народа. Палітыка ўлад ставіла сваёй мэтай падавіць нацыянальную свядомасць беларусаў. Гэта было б гарантам дзяржаўнай бяспекі — адсутнасць барацьбы за нацыянальнае вызваленне.

Палессе прадстаўляла для палякаў найбольш спрыяльную глебу для культурнай экспансіі, бо гэтыя тэрыторыі знаходзіліся на даволі нізкім узроўні развіцця гаспадаркі і асветы, акрамя таго, яны знаходзіліся недалёка ад граніцы. Узмацненне польскага ўплыву ажыццяўлялася ў выніку паланізацыйна-асімілятыўнай палітыкі ўлад, якая знайшла сваё адлюстраванне ў барацьбе з любой прапагандай нацыянальных культур (беларускай, украінскай, рускай) і сістэматычным пераконванні мясцовага насельніцтва ў тым, што яно з'яўляецца састаўной часткай польскага народа.

Падбіраліся кадры для правядзення ў жыццё гэтых ідэй, на месцы пасылаліся наступныя сакрэтныя інструкцыі: «Настаўнікі для палескай вёскі павінны быць старанна адабраны з радоў свядомых палякаў, яны павінны разумець важнасць ускладзенай на іх місіі. У бліжэйшыя 10 гадоў не можа быць і размовы аб тым, каб настаўнікам мог стаць рускі, беларус, украінец і нават мясцовы палящук. Настаўнік-палящук праваслаўнага веравызнання часцей за ўсе русіфікаваны ці ўкраінізаваны, і замест таго, каб актыўна праводзіць палітыку паланізацыі на карысць дзяржавы, сам трапляе пад уплыў акружэння — пасіўна або нават варожа адносіцца да палітыкі паланізацыі...»

Было забаронена весці справаводства на беларускай і рускай мовах. Школы былі пераведзены на навучанне на польскай мове.

Паводле даных на 1937/38 навучальны год у Брэсцкім павеце налічвалася 236 пачатковых школ, з іх 190 — у вёсках. У сельскай мясцовасці іх наведвала каля 30 тысяч дзяцей, штат настаўнікаў складаў 360 чалавек. Гімназіі і прафесійныя навучальныя ўстановы дзейнічалі толькі ў гарадах. Але польскіх школ было недастаткова, каб атрымалі хоць пачатковую адукацыю ўсе дзеці. У выніку ў Брэсцкім павеце пражывала больш за 5 тысяч зусім непісьменных дзяцей школьнага ўзросту, больш як 2 тысячы ўмелі толькі чытаць.

У 1927 г., баючыся збліжэння насельніцтва з жыхарамі Савецкай Беларусі, польскі ваявода Я.Крахельскі паведаміў усім старастам паветаў аб тым, што ён незадаволены ўжываннем рускай мовы ў размовах з мясцовым насельніцтвам: «Выкарыстанне рускай мовы, чужой аднолькава як польскай дзяржаўнасці, так і ўкраінскаму і беларускаму насельніцтву, лічу недапушчальным і такое буду безумоўна праследаваць». Ён жа прапанаваў свайму апарату заняцца вывучэннем мясцовай мовы, пагражаючы асабістым кантролем: «У далейшай нашай рабоце адсутнасць імкнення ў даным напрамку буду разглядаць як важны момант дэкваліфікацыі як чыноўніка, так і яго кіраўнікоў».

Дзякуючы падтрымцы ўрада былі створаны розныя польскія культурна-асветніцкія і рэлігійныя таварыствы, гурткі ваеннай моладзі. На тэрыторыі Брэсцкага павета дзейнічалі: Дамачаўскі гурток саюза польскіх настаўнікаў (1936—1938), Дамачаўскае аддзяленне саюза рэзервістаў (1930-я гады), Чарнаўчыцкае аддзяленне стралецкага саюза (1933—1935), Дамачаўскае аддзяленне каталіцкага таварыства жаночай моладзі (1934), Дамачаўскае аддзяленне каталіцкага таварыства мужчынскай моладзі (1938).

Усе гэтыя арганізацыі ўтваралі культурныя цэнтры, пры іх ствараліся клубы, у якія ўваходзілі бібліятэкі, чытальні, тэатральныя трупы, спартыўныя гурткі, музычныя калектывы. Яны праводзілі сістэматычныя чытанні, гутаркі, лекцыі, канцэрты, вечары танцаў, спартыўныя спаборніцтвы. Паводле даных на 1930—1931 гг., у Брэсцкім павеце налічвалася 225 бібліятэк (з іх 136 школьных), 2 народныя дамы, 26 тэатральных труп, 27 харавых і 4 аркестравыя калектывы.

Каталіцкая царква ставіла сваёй мэтай выхаванне «актыўных членаў каталіцкага касцёла, падрыхтоўку іх да індывідуальнага і калектыўнага хрысціянскага апостальства, а таксама распаўсюджванне асноў каталіцтва ва ўсе галіны жыцця і культуры».

У гэты час важнае месца ва ўмацаванні пазіцый каталіцкай царквы на тэрыторыі Заходняй Беларусі займала вяртанне культавых збудаванняў, якія раней належалі рымска-каталіцкай царкве, а пазней былі перададзены праваслаўнай. Галоўны ўдар па праваслаўнай царкве быў нанесены ў перыяд да 1924 г., тады былі перададзены пад эгіду Папы Рымскага 6 культавых збудаванняў праваслаўнай царквы. Каталіцкай царкве былі вернуты касцёлы ў вёсках Чарнаўчыцы і Вістычы, яшчэ раней — у 1916 г. — касцёл у в. Шчытнікі і капліца ў в. Скокі.

Перадачу праваслаўных культавых будынкаў католікам зрабіць было лягчэй, бо многія з іх на той час былі закрыты (напрыклад, касцёл у в. Чарнаўчыцы не дзейнічаў з 1915 г.). Польскі епіскапат браў пад сваю апеку нават разбураныя культавыя будынкі: так у 1922 г. каталіцкая царква ўзяла пад сваю апеку падмурак спаленай капліцы ў в. Кустынь.

Трэба адзначыць, што палітыцы акаталічвання супрацьстаяла праваслаўная царква. У 1924 г. каля 63% насельніцтва Брэсцкага павета з'яўлялася праваслаўным (у астатніх паветах ваяводства працэнт праваслаўных быў значна вышэйшым). Праваслаўнай царкве ўдалося і ў далейшым захаваць гэту перавагу. Свяшчэнны Сінод з мэтай схіліць на свой бок мясцовае насельніцтва праз Палескую духоўную кансісторыю, якую ўзначальваў епіскап палескі і пінскі і якая знаходзілася ў Пінску, пастанавіў ісці насустрач пажаданням веруючых і весці богаслужэнні ў храмах на ўкраінскай, беларускай, польскай і чэшскай мовах. Але большасць святароў адказвала палескаму ваяводзе, што весці службу на адной з названых моў немагчыма, бо доўгія гады богаслужэнне вялося тут на царкоўнаславянскай ці на рускай мовах, а таму прыхаджане ўжо даўно прывыклі да гэтага.

Урад у спрэчцы паміж католікамі і праваслаўнымі знешне прытрымліваўся нейтралітэту, афіцыйна было дазволена стварыць камісію па абароне праваслаўнай царквы пры Свяшчэнным Сінодзе.

Праваслаўнае насельніцтва пісала петыцыі, збірала грошы, шукала дакументы, якія пацвердзілі б законнасць прыналежнасці культавых збудаванняў і зямель праваслаўнай царкве. Гэта прымушала польскія ўлады прызнаваць аўтарытэт праваслаўнай

канфесіі, дзейнічаць больш асцярожна.

З боку касцёла былі жорсткія нападкі на менш значныя абшчыны. Прыкладам расправы «з чужароднымі элементамі» стаў выпадак з дзвюма лютэранскімі калоніямі — Нейдорф і Нейброў (першая знаходзілася ў 2—3 км на захад, а другая — у 5—6 км на паўночны захад ад м. Дамачава). 2 лютага 1928 г. пастар лютэранскага прыхода ў кірхе, што знаходзілася ў Нейдорфе, аб'явіў забастоўку дзяцей-лютэран школьнага ўзросту. Забастоўка ахапіла і школы ў м. Дамачава (усяго баставала каля 500 дзяцей з 5 школ). Сутнасць канфлікту заключалася ў тым, што ў школах Нейдорфа і Нейброва, а таксама часткова ў Дамачаве вучылася ад 85 да 90% дзяцей-лютэран. Аднак школы былі ўкамплектаваны выключна настаўнікамі-католікамі. Гэта выклікала занепакоенасць бацькоў і абурэнне лютэранскага пастара Эвальда Людвіха, прызначанага адміністратарам прыхода Нейдорф — Нейброў духоўнай кансісторыяй лютэранскай царквы ў Варшаве ў 1925 г. Бацькоў турбавала перспектыва акаталічвання дзяцей. Неаднаразовыя скаргі па гэтым пытанні ў школьны апякунскі савет ні да чаго не прыводзілі. І тады пастар Эвальд Людвіх адважыўся на больш рашучы крок — на забастоўку дзяцей, якая была прызначана на перыяд з 6 па 19 лютага 1928 г.

Паліцыя прыклала нямала намаганняў, каб падавіць забастоўку. Прэзідэнт Евангельскага сходу ў Варшаве пісаў: «Паліцыя тэрарызіруе, здзекуецца над людзьмі ў грубай і злоснай форме». Былі разасланы дысцыплінарныя штрафы на агульную суму 500 злотых. У выніку, 13 лютага, на сёмы дзень, забастоўку вымушаны былі спыніць.

На гэтым польскія ўлады не супакоіліся. Паводле загаду Міністэрства ўнутраных спраў у 1930 г. калоніі Нейброў і Нейдорф былі перайменаваны адпаведна ў Машчыцэ-Гурне і Машчыцэ-Дольне. Тлумачылася гэта неабходнасцю надаць усім населеным пунктам Польшчы польскія назвы.

Да веруючых нехрысціянскага веравызнання каталіцкая царква праяўляла цярплівасць. На тэрыторыі Брэсцкага павета існавала 13 яўрэйскіх гмін (найбольш значныя: Дамачаўская — 2129 чалавек, Матыкальская — 1300 чалавек), дзейнічалі сінагогі ў Чарнаўчыцах, Дамачаве, малітоўны дом у в. Тамашоўка, дабрачынныя яўрэйскія таварыствы і таварыствы апекі над яўрэйскімі дзецьмі-сіротамі ў Чарнаўчыцах і Дамачаве.

Дакументы сведчаць

СПІС ВЁСАК, СЯДЗІБ І ХУТАРОЎ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА

Лістапад 1921 г.

Гмина и резиденция гмины	Деревни	Усадьбы и хутора
Лыщицы. Резиденция в Кустыне	Бояры Яцковичи Кустын Кошилово Люта Лыщицы Морозовичи Огородники Остромечево	Червинец (имение) Юльяново (имение) Кустын (колония) Кустын I (имение) Кустын II (имение) Лыщицы Лешняны Михалин Остромечево

Гмина и резиденция гмины	Деревни	Усадьбы и хутора
Турнянская. Резиденция в Чернавчицах	Плянта Похубятычи Щитники Большие Щитники Малые Сычи Сычики Зводы Большие Зводы Малые Бильдейки Хмелево Чернавчицы Деменичи Доманьчицы Ивахновичи Коростичи Лясоты Лешанка Лешня Олешковичи Омелинно Подлесье Пекры Сколдыцке Терпиловичи Турна Видомля Задворье Завешаны	Сегеневщина Щитники (имение) Сычи (имение) Сычики Шумин Воробьево Забужье (кол.) Зводы (имение)
Мотыкальская. Резиденция дер. Мотыкалы	Бобровцы Боярска Челеево Котельня Ковердяки Катенбург Костычи Колодно Клейники Козловичи Нехолсты Непли Мотыкалы Большие Мотыкалы Малые Раковицы Большие Раковицы Малые Пески Ставище Старосело Смуга Суха Скоки Шумаки Тюхиничи Перобунь Вулька	Мотыкалы (колония) Мельники (колония) Контенбург (колония) Столпы Клейники (фольварк) Контенбург (фольварк) Плясковщизна (фольварк) Старое Село (фольварк) Скоки (имение) Чилеево (имение) Раковичи (имение) Нехолсты (имение) Ковердяки (имение) Вистичи (имение) Забурье (имение)

Гмина и резиденция гмины	Деревни	Усадьбы и хутора
	Запле	
	Зборомирово	
Косичи.	Бердичи	Ямно (имение)
Резиденция в Черни	Березувка	Бжезувка (имение)
	Братылово	Колосув (имение)
	Хабы	Курница-Малая (имение)
	Черняки	Щебрин (имение)
	Черни (поселок)	Речица (имение)
	Черни (деревня)	Лисовичи (имение)
	Дубровска	
	Гузьни	
	Ямно	
	Климовичи	
	Косичи	
	Козловичи	
	Курница Большая	
	Курница Малая	
	Мощенка	
	Несвило	
	Плоска	
	Речица	
	Селяхи	
	Скорбичи	
	Шебрин	
	Шпановичи	
	Тельмы-Государ.	
	Тельмы-Собственные	
	Тришин	
	Тришин-Задворцы	
	Вычулки	
	Задворцы Ст.	
	Задворцы Новые	
Каменица-Жировецкая.	Аркадия	Имения
Резиденция Пугачево	Бернады	
	Гершановичи	Ковалево
	Каменица-Жиров.	Кросьник
	Камень-Бискупья	Красный Двор
	Котельня-Боярская	Гершоновичи
	Котельня-Подхороцкая	Митьки
	Кумахи	Пугачево
	Лежи	Пьяновичи
	Митьки	Пельчицы
	Пугачево	Лидимо-Остромо
	Вулька-Подгородская	Скверки
	Вулька-Заставская	Заболотье
	Заболотье	
	Закий	Имения
Радваничская.	Антонов	
Резиденция в Радваничах	Гули	Антоново
	Ферма	Воляново
	Франополь	Зався
	Литвины	
	Михалин	
	Подлесье	

Гмина и резиденция гмины	Деревни	Усадьбы и хутора
	Радваничи цер.	
	Радваничи пос.	
	Радваничи-Зарецка	
	Урские-Хутора	
	Волки	
Меднянская.	Бородзятын	
Резиденция в Страдичах	Дуричи	Имения
	Фастыново	
	Гвозьница	Домброва
	Язвин	Колпин
	Медно	Гвозьдзица
	Орлянка	
	Отоки	
	Прилуки	
	Рогожна	
	Страдечь	
	Заказанка	
	Збунин	
Домачевская.	Харсы	
Резиденция Домачево	Черск	Имения
	Домачево г.	
	Дубица	Домачево
	Кобелка	Зелизна
	Леплевка	Александрово
	Липинки	
	Найбрув кол.	
	Найдорф кол.	
	Подлужье	
Приборово.	Александров колония	
Резиденция в Приборово	Дубок	
	Гута	
	Комаровка	
	Орхув	
	Приборово	
	Рыпець	
	Селяхи	
	Станиславов	
	Голендры	
	Влодавка (городок)	

Пераклад з польскай мовы В.Г.Ліневіч.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 2031. Воп. 3. Спр. 3. Л. 87–90.

СПІС ІСНУЮЧЫХ НА ТЭРЫТОРЫІ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА РОЗНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

1925 г.

Местность, деревня и гмина	Вид фабрики или предприятия	Владелец предприятия	Число рабочих	Принадлежность к союзу рабочих в процентах		Национальность рабочих в процентах				Руководитель профсоюзного движения
				являющихся чл. союза	не являющихся чл. союза	поляков	россиян	евреев	др.	
дер. Морозовичи гмина Лыщицы	ветряная мельница	Ян и Герасим Петручик	2	–	–	–	2	–	–	–
дер. Яцковичи гмина Лыщицы	ветряная мельница	Карпосюк Юстын	1	–	–	–	1	–	–	–
дер. Большие Зводы гмина Лыщицы	ручное производство кирпича	Отто Адольф								
дер. Большие Щитники гмина Лыщицы	ветряная мельница	Микитюк Петр	1	–	–	–	1	–	–	–
дер. Большие Зводы гмина Лыщицы	ветряная мельница	Никита и Андрей Миколаюк	2	–	–	–	2	–	–	–
дер. Б. Зводы гмина Лыщицы	ручное производство кирпича	Миколаюк Микита								
дер. Люта гмина Лыщицы	ветряная мельница	Кондратюк Михал	1	–	–	–	1	–	–	–
дер. Кошилово гмина Лыщицы	ветряная мельница	Вагнер Винценты и Яшечек Станислав	2	–	–	2	–	–	–	–
имение Червеньце гмина Лыщицы	механическая мельница	Толлочко Кароль	2	–	–	1	1	–	–	–
дер. Кустын гмина Лыщицы	ручная кузница	Тышко Антони	1	–	–	–	1	–	–	–
дер. Бояры гмина Лыщицы	ручная кузница	Кобелко Харитон	1	–	–	–	1	–	–	–
дер. Кошилово гмина Лыщицы	ручная кузница	Финдер Никанор	3	–	–	–	3	–	–	–
колония Яново гмина Лыщицы	ручная кузница	Мировски Ян	1	–	–	1	–	–	–	–
дер. Люта гмина Лыщицы	ручная кузница	Миколаюк Николай	1	–	–	–	1	–	–	–
дер. Яцковичи гмина Лыщицы	ручная кузница	Змудзки Анджей	1	–	–	1	–	–	–	–
дер. Яцковичи гмина Лыщицы	ручная кузница	Поплавски Францишек	1	–	–	1	–	–	–	–
дер. Малые Щитники гмина Лыщицы	ручная кузница	Маер Францишек	1	–	–	1	–	–	–	–
колония Лыщицы той же гмины	ручная кузница	Я...ки Станислав	1	–	–	1	–	–	–	–
колония Сегеневщина гмина Лыщицы	ручная кузница	Щепаньски Томаш	1	–	–	1	–	–	–	–
дер. Морозовичи гмина Лыщицы	ручная кузница	Ляшук Андрей	1	–	–	–	1	–	–	–
колония Кошилово гмина Лыщицы	ручная кузница	Червиньски Францишек	1	–	–	1	–	–	–	–
дер. Большие Щитники гмина Лыщицы	ветряная мельница	Тохусевски Вацлав	1	–	–	1	–	–	–	–

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 93. Воп. 1. Спр. 542. Л. 100—101.

СПІС ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ У БРЭСЦКІМ ПАВЕЦЕ

ліпень 1925 г.

Гмина	Имя и фамилия владельца	Адрес предприятия	Кол-во рабочих	Вид предпр. и что производит	Явл. ли пред. дейст.	Замечания
Домачево	Адам Ромкур	дер. Леплевка	1	водяная мельница	действ.	
—"—	фирма «Броккоп»	—"—	12	лесопилка	—"—	
—"—	Евангелический приход	колония Нейбров	1	ветряная мельница	—"—	
—"—	Мэйлах Либерман	—"—	1	—"—	—"—	
—"—	Ицко Лин	Домачево	2	производство масел	—"—	
—"—	Мойзеш Хаим Лин	—"—	2	—"—	—"—	
Лыщицы	Ян и Герасим Петручик	дер. Морозовичи	2	ветряная мельница	действ.	
—"—	Юстын Карповяк	дер. Яцковичи	1	—"—	—"—	
—"—	Адольф Отто	дер. Большие Зводы	2	производство кирпича	—"—	
—"—	Микита и Анджей Миколаюк	—"—	2	ветряная мельница	—"—	
—"—	Микита Миколаюк	—"—	2	производство кирпича	—"-	
—"—	Михал Кондрацюк	дер. Люта	1	ветряная мельница	—"—	
—"—	Петр Никицюк	дер. Б. Щитники	1	—"—	—"—	
—"—	Вин. Вапнур и Станислав Янчук	дер. Кошилово	2	—"—	—"—	
—"—	Владимир Пажик	имение Остромечево	1	—"—	—"—	
—"—	Кароль Толочно	имение Червеньце	1	—"—	—"—	
—"—	Антони Пышко	дер. Кустын	1	кузница	—"—	
—"—	Харитон Кобялко	дер. Бояры	1	—"—	—"—	
—"—	Никанор Фимлер	дер. Кошилово	1	—"—	—"—	
—"—	Мрозовский Ян	колония Яново	1	—"—	—"—	
—"—	Микита Миколаюк	дер. Люта	1	—"—	—"—	
—"—	Анджей Жмудцки	дер. Яцковичи	1	—"—	—"—	
—"—	Францишек Поплавски	дер. Яцковичи	1	—"—	—"—	
—"—	Францишек Майер	дер. М. Щитники	1	—"—	—"—	
—"—	Станислав Яроньски	колония Лыщицы	1	—"—	—"—	
—"—	Томаш Щепаньски	Сегеневщина	1	—"—	—"—	
—"—	Анджей Лящук	дер. Морозовичи	1	—"—	—"—	
—"—	Францишек Червиньски	колония Кошилово	1	—"—	не действ.	

Гмина	Имя и фамилия владельца	Адрес предприятия	Кол-во рабочих	Вид предпр. и что производит	Явл. ли пред. действ.	Замечания
Мотыкалы	Владыслав Конто...	Тюхиничи	1	водяная мельница	действ.	
—"—	Ёсель Айзенман	Вистичи	1	—"—	—"—	
—"—	Манкер	имение Пясковщизна	1	производство кирпича	—"—	
—"—	Гордон Олевка	Малые Мотыкалы	1	ветряная мельница	—"—	
Косичи	Б-тья Васылюк	Кошелево	1	—"—	—"—	
—"—	А... Шевчук	Шебрынь	1	—"—	—"—	
—"—	Цирыль Савчук	—"—	1	—"—	—"—	
—"—	Юзеф Шаньковски	Тришин	1	—"—	—"—	
—"—	Эмильян Васылек	Кошилово	1	—"—	—"—	
—"—	Михал Сычук	Ямно	1	—"—	—"—	
—"—	Эмиль Ян	Гуринь	8	производство кирпича	—"—	
Кам... Жир...	П... Предприятия Эдвард...	Гершоны	было 40	—"—	не действ.	
—"—	Арья Либерман и компания	—"—	60	—"—	действ.	
—"—	Юзеф Бергер и Тирма Бэрата	Пухсичен	14	—"—	—"—	
Приборово	Гецель Эппель	ст. Влодава	6	смоловарка	—"—	
—"—	—"—	поселок Стуло	3	—"—	—"—	
—"—	Янкель Гринбаур	ст. Влодава	–	лесопилка	не действ.	
—"—	Мошко Лихтэнберг	—"—	—	—"—	—"—	
—"—	Найман Куня	г. Влодава	4	производство кирпича	действ.	
—"—	Шлёма Ледерер	—"—	4	—"—	—"—	
—"—	Шия Лихтеберг	ст. Влодава	–	смоловарка	не действ.	
—"—	Фирма "Сута"	станция Приборово	10	лесопилка	—"—	
—"—	Фруня Крезонафт	ст. Влодава	200	насыщение шпал	—"—	
—"—	Янкель Гринбаум	ст. Влодава	–	паровая мельница	—"—	
Медна	Вацлав Енороф и Г.Эпуль	Отани	2	скипидарня	действ.	
—"—	Ян Гречук	Страдечь	1	ветряная мельница	—"—	
—"—	Павел Ткачук	Збунин	1	—"—	—"—	
—"—	Петр Кархелюк	Прилуки	–	—"—	не действ.	
Радваничи	Виноград	Подлесье	1	смоловарка	действ.	
—"—	Петр Ласунович	Франополь	–	ветряная мельница	не действ.	
—"—	Онуфри Новиш	Волки	1	—"—	действ.	

Пераклад з польскай мовы В.Г.Ліневіч.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 93. Воп. 1. Спр. 542. Л. 127—131, 131 адв.

СПІС МЛЫНОЎ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗІЛІСЯ НА ТЭРЫТОРЫІ БРЭСЦКАГА ПАВЕТА

Рег. позиц.	Название и фирма	Адрес	Вид привода	Замечания
2.	Станислав Ляховски	пос.Чернавчицы гмина Турна	моторная	
10/21				
11.	Флерьян Пекалкевич	дер. Мотыкалы гм. Мотыкалы	моторная	
24.	Арон Биншток	дер. Леплевка гм. Домачево	водяная	
9.	Тэодор Вульфэрт	дер. Лумно гм. Мотыкалы	паровая	вместе с лесопилкой
59.	Францишек Шиманьски	гм. Лыщицы гм. Мотыкалы	моторная	
120.	Аля Арон Киршенбаум	пос. Томашовка гм. Домачево	паровая	вместе с лесопилкой
33-а	Францишек Шиманьски	дер. Кошилово гм. Косичи	моторная	
36-а	Юстына Мисиюк	дер. Пугачево гм. Кам.-Жир.	– " –	
39-а	Кароль Толлочко	дер. Червиньце гм. Мотыкалы	паровая	
IV-41	Компания «Клос» Ян Зеленл и Герман Эйснер	пос. Домачево	– " –	
48-а	Алексы Котович	дер. Новые Задворцы гм. Косичи	– " –	
52-а	Станислав Гутовски	имение Жыцин		не работающий вместе с произв. масел
61-а	Антони Хоронжи	пос. Томашовка гм. Домачево	– " –	
64-а	Гжегож Кирилюк	пос. Чернавчицы гм. Турна	– " –	
136.	Густав Рылль	пос. Домачево	моторная	
244.	Хэршко Вишэнград	пос. Чернавчицы гм. Турна	моторная	
337.	Шнацбэр Нахман	дер. Аркадия гм. Кам.-Жир.	электрическая	
7-а	Владыслав Контовт	дер. Тюхиничи гм. Мотыкалы	водяная	вместе с лесопилкой

Пераклад з польскай мовы В.Г.Ліневіч.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 3017. Л. 8, 8 адв.

АГЛЯД ГЕАГРАФІЧНАГА, ДЭМАГРАФІЧНАГА, САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА СТАНОВІШЧА БРЭСЦКАГА ПАВЕТА

Брестский повет занимает территорию около 460 тыс. га; в отношении сельскохозяйственных угодий: пашни около 45%, лугов 15%, пастбищ 10%, лесов 20%, в том числе государственного леса в госуд. управлении лесничеств и Д.О.К. № IX около 12%, остальные являются дорогами, реками, городами и местностями под полигонами и военными фортами (около 10%).

На территории повета имеются 3 города: 1) Брест н.Б., как областной город с населением около 55 тыс., и 2 малых городка, 2) Высокое-Литовское около 4 тыс. населения, в том числе евреи

составляют 80% и 3) Каменец-Литовский около 3 тыс. населения с количеством евреев около 80%.

Кроме того, на территории повета имеется несколько поселков, как: 1) Малорита, 2) Домачево, 3) Чернавчицы, где количество евреев составляет значительный процент.

В отношении судебных органов и инстанций имеются городские суды: 1) Брест н.Б., 2) Высокое Лит., 3) Каменец-Литов., 4) Малорита и 5) Домачево.

Больницы: Кроме больниц в Бресте н.Б. есть больница в Каменце-Лит. на несколько десятков коек с одним врачом. В поселке Малорита имеется санаторий для туберкулезников Общ. Самоуправленцев.

Места отдыха: 1) Домачево, Томашовка, Комаровка, Отоки, Дубица, Дуричи и Непли н.Б. как место купания.

Сельскохозяйственные школы: В Дубице и Колпино начальные сельскохозяйственные школы. Самоуправление повета организовано в 15 гминах, которые объединяют 417 староств.

Характеристика отдельных гмин:

2) Гмина Домачево:

Гмина имеет 26 сел, расположенных на юге повета с правой стороны реки Буг с землей очень бедной, песчаной с восточной стороны, переходящей в лесисто-пастбищный район, по этой причине и в связи с расположением близко реки Буг на территории гмины имеется несколько мест отдыха уже перечисленных. Поселок Домачево — резиденция Управления Гмины, является местом отдыха (большей частью приезжают евреи, 90%). Имеется рим.-кат. костел. На территории гмины средоточия польские: кол. Александрово-Масьлянки, кол. Пежехвало и кол. Черск. При станции Влодава имеется цех для насыщения, поэтому Томашовка, Станиславовка и окрестность железнодорожной станции Дубица — рабочие поселки. Характерной особенностью является большое скопление далеких потомков поселений голландцев; 1/3 часть католики, а 2/3 евангелисты, которые сохранили до сей поры своеобразный характер и считают себя преимущественно поляками. Они богатые, потому что работают сдельно на всевозможных земельных работах, из-за этого мало солидные, испорчены деньгами, нужно было бы при дальнейшей парцелляции учесть это, так как наряду с поляками они являются наиболее сильными покупателями, имеющими деньги. Земля бедная, поэтому в кол. Александрово-Масьлянки в некоторой части земля безжизненная, кроме того, надо привить полякам, чтобы на летний сезон приезжали на «голландку», т.е. на работу. За сезон 1 человек с лошадью и телегой заработает 1000—1500 зл. нетто, поэтому имеет возможность поддержать хозяйство. Деревня русская пассивная, бедная, проявляется много коммунистических тенденций. Среди больших собственностей имеются леса Ордын Замойского и земли Виленского Земельного Банка. При соответствующей земельной политике можно увеличить польский элемент, если к бедной земле прибавить какое-либо место работы для дополнительного заработка, лесопилки, голландскую насыщальню, что следует привить полякам. Организационно поляки имеют Стрелковый Союз в Александровке-Масьлянке, элемент пришлый с разных сторон, политически не сильно активный. Система образования довольно сносная, только с кол. Александровка-Масьлянка должны ходить аж в поселок Домачево.

3) Гмина Каменица Жировецкая расположена на юг от г. Бреста н.Б. под границей река Мухавец. Худшая земля уже в 40% экспроприирована или является в ходе экспроприации для целей О.К. № IX.

В остальной части произошло много укрупнений, поэтому коммунизм имеет меньше влияния и имеет высший хозяйственный уровень. Из-за близости Бреста крестьянин более спросвещенный, несмотря на это проявляется русская (не украинская) тенденция у крестьян. Польские средоточия — это военный поселок Скверки, кол. Заосьци, где имеется костел рим.-кат., а также частично в Каменице Бискупей и хуторах Комановских. Имение Красный Двор, владельцем является владелец отеля Римского в Бресте, может в будущем увеличить владения Польши, а также больше экспроприировать в окрестности полигона, а затем образовать защитный пояс с польским населением, как это делали москали. Гмина имеет 24 села. Кооперация спит, создать польскую торговлю в деревне.

5) Гмина Косичи на севере г. Бреста, соседствует с городом Брестом. Деревня преобладает русская, более сознательная, сильные коммунистические тенденции, а у старших вздохи по России, система образования сносная, только уровень обучения низкий из-за отрыва детей на другие работы. Польские средоточия: военный поселок Ямно, Шебрынь, Буяки, кол. Речица, частично деревня Збироги (приход и костел рим.-кат.) (В Збирогах церковь имеет много земли по униатах — 170 га), Максымы, Карабаны и частично Ивахновичи, эти 3 последние деревни — ху-

торская шляхта, особенно в Ивахновичах, где имеется десятка полтора семей и нужно менять веру и душу, с молодыми соответственно здесь школа много может сделать. Дер. Ивахновичи относится к гмине Турна, но здесь упоминаю, потому что соседство.

В Курнице Малой живет б. ком. большевистский, это сияет. С помощью частичной экспроприации под полигон и земель по униатах и церковных увеличить польские владения, а также соответственно бывших униатов восстановить в правах, хотя это половинчатая мера, которую не разделяю. Русские люди во всем повете не набожные и попы не играют большой роли. Настроения в деревне сносные, однако есть гнезда коммунизма, а также церковь среди старших проводит русские тенденции.

7) Гмина Медна упирается в Буг и гм. Великорита, лежит на юге повета, обведенная массивами государственных лесов с юга, севера и востока. Частично экспроприирована под военные полигоны, имеет 10 деревень. Части над Б. подходящие для отдыха, поэтому легко могут перейти в польские руки. Преобладает русский элемент, достаточно бедный и пассивный, много работает в государственных лесах. Система образования слабая, отсутствуют коммуникации к восточным деревням. Польские средоточия: кол. Гвозьница, Отоки, Збунин, немного в Дуричах, Пжилатах и Страдичах.

С помощью соответствующей политики следует заселить всю территорию над Бугом, где имеется железная дорога и шоссе, элементом чисто польским, характер зоны отдыха в этом поможет, также имение Страдичи б. польского консула, говорят еврея, а также имение Гвозьница, в котором следует из-за неуплаты налогов (в состоянии экспроприации) продолжить парцелляцию — чтобы укрепить элементом чисто польским, можно образовать меньшие колонии, так как много лесов, то учесть их при парцеллах и переработке дерева. Общее замечание: ошибочной политикой является, что на фабрики и лесопилки вообще принимают только тех, кто не имеет вообще земли, нужно здесь учесть, что хотя иногда имеет около десяти с половиной га земли, но это участок нежизненный и только при другом побочном занятии может существовать и создавать бастион польского характера. На территории повета Брестского создается организация СТЖ кол. Черемха, насыщальня и коксовый завод, следует дать там работу преимущественно полякам с кол. Борки и Янцевич, а также с кол. Озарово, Погулянки, Белой Стражи и Едловки. Польский элемент, настроения народные и проправительственные, среди поляков коммунистов мало, а у русской нации, то есть принесенная с России неприязнь ко всему польскому. Система образования на территории гмины, как уже отмечалось, слабая, далекая от достижения цели, а также уровень у крестьянина низкий недоверчивый, пропитан русским духом, украинского движения не заметил. Только владелец имения Гвозьница — украинец-боевик в своем роде. Кооперативное движение слабое, так как нет хороших надежных людей в деревне и недоверие крестьян друг к другу.

8) Гмина Мотыкалы с резиденцией в Лыщицах имеет 52 деревни, расположена на север от Бреста, вытянута вдоль железной дороги Брест — Белосток, имеет наиболее организованную сельскохозяйственную кооперацию, однако еще не все ладится, в некоторых местах имеются молочные заводы и доверие к своим кооперациям. В национальном отношении — это русский элемент, имеет численное превосходство, однако польский элемент более инициативный, однако польский элемент разобщенный, поэтому кроме явных озоновцев имеются средоточия, которые пассивны (так кол. Нехолсты, Щитники, Сегеневщина), где у старших преимущественно по убеждению людовцев, а также в военных поселках элемент с познаньского почитает народников. Русский элемент имеет большое влияние через Ганька — помощника войта, секретарь гмины, говорят русский, а также в Козловичах Голувко Теодор (подозревается коммунист) — всюду втискиваются и не всегда хороших русских партнеров вводят в самоуправленческую жизнь. Система образования стоит достаточно высоко. Ликвидировать антагонизм между бывшими приятелями пос. Аугустыняком и войтом Суркоттой, как и один, так и другой, по-моему, это люди, которые поспособствовали развитию польского характера, но не без личной корысти, что колет глаза другим и вызывает неприязнь к ним у других поляков, между прочим люди очень посредственные. Ввести в органы самоуправления поселенца пор. Рачиньского с Лыщиц, благородный, а также предоставить возможность пересмотра собственности и ликвидацию (установить состояние собственности). В кол. Сегеневщина, где начал, но не закончил измерений землемер присяжный Винценты Гура, такое же замечание относится к пос. Сьвитичи с гмины Высокое Лит. (тоже чисто польской, только 2 россиян), где В. Гура не закончил работу и теперь хаос во владениях и кость взаимных недоразумений. Иначе используют на земле, а иначе в контрактах (ипотеке).

Общее замечание: Нужно заранее подумать о новых запасах земли поблизости образованных военных поселков, кол. Потому, что поляки имеют много детей, а здесь давит право неделимости, а также хозяйство это также нежелательное. Уплыть в другие профессии в настоящей структуре и задолженности польских колоний трудно подумать. Нужно дать возможность прикупать новые участки. Запас земли малый в имении Лыщицы, Кустынь, Раковица, Челеево, Яховичи, Щитники и другие.

Польский элемент здесь достаточно сильный, но нужно его поднять в районе над Бугом и около кол. Вистычи, Ковердяки и кол. Стоки.

Общее замечание: Ни в коем случае не допускать и клеймить продажу при необходимости вне ипотеки кусков земли русской нации, что имеет место во всех колониях. Учитывая близость Бреста, подумать о торговом и ремесленном обучении польских детей с окрестностей Лыщиц (станция), чтобы затем повлиять на всю территорию. При правильной политике польский элемент в гмине Мотыкалы можно поднять до 60% общего числа. В деревне Яцковичи рендыфиковать смешанные семьи. Среди русского населения много тенденций коммунистических вызывает близость города и общение с посланниками.

Развивать объединяющее движение и провести ревизию всех костельных земель. Соответственно К.К.О. в Бресте должно провести парцелляцию имения Зводы.

Общее замечание. В Конгрессовке и Крэсах при объединениях землемеры и комиссары, придерживаясь точно закона, обижают меньших при разделе общих земель (как надельных, так и батрацких и огородников), а также ликвидация сервитутов проводится шаблонно.

Пераклад з польскай мовы В.Г.Ліневіч.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 8. Спр. 1654. Л. 13—21.

ТЛУМАЧЭННЕ ВАЯВОДЫ ПАЛЕСКАГА АБ ПРОДАЖЫ ЗЯМЛІ МЯСЦОВАМУ НАСЕЛЬНІЦТВУ

№ 1186/секр. **13 кастрычніка 1937 г.**

ПАНУ СТАРОСТЕ ПОВЯТОВОМУ

В связи с распространяющимися неточными комментариями, касающимися вопроса купли земли с парцелляции или свободной продажи местным населением, разъясняю:

При разрешении на куплю земли не могут иметь места никакие ограничения прав купли земли или лицам местного происхождения (полешуки, местные, поляки, православные и т.д.). Категорически запрещаю применение предпосылок вероисповеданий при решениях такого рода.

Только в отношении лиц, принадлежащих или декларирующих свое недружелюбное отношение к польской культуре (по национальности украинцы, белорусы, русские, евреи) — нужно применять упомянутые ограничения со всей последовательностью без исключений, а это с целью ослабления влияний, недружелюбных польскому характеру. Конечно, применять это надо в первую очередь к подрывным элементам (коммунистам), несмотря на вероисповедание.

Повторяю еще раз, что к бесцветному пока еще в отношении культуры местному населению, полесскому, в огромном большинстве православному, нужно относиться наравне с населением по национальности определенно польским. Это имеет целью сближение этой бесцветной массы к Польскому Государству и польской культуре и борьбу со всякими большевистскими, украинскими, белорусскими и русскими аргументами, якобы к местному населению на Полесьи враждебное отношение как якобы к чуждому. Следует считать это спокойное местное население польским, не сознающим еще своей принадлежности к какой-либо культуре, а втянутым силой течения жизни под влияние нашей культуры.

Вышеуказанное распоряжение доведет Пан Староста до сведения и применения своему персоналу ведомств Министерства Сельского Хозяйства и Сельскохозяйственных реформ. Желающих купить землю надо обработать политически. В случае каких-либо сомнений в этом отношении следует обращаться в Общественно-Политический Отдел с просьбой о сообщении моего решения.

Независимо от применения этого распоряжения в делах аграрных — нужно применять вышеизложенные указания при разрешении всяких текущих дел, однако при этом, что даже видимая справедливость должна уступать перед великим интересом польского характера. Настоящая справедливость — это такое отношение к врагам и друзьям, на какое они заслуживают своим поведением в отношении к Польскому Государству, определенно Польскому. Одинаковое отношение к определенно неприятелям польского характера и людям пассивным или дружелюбным вызывает в массах понятие бессилия Польского Правительства и распространяет

чувство несправедливости, а также дезориентации. Полесье должно быть польским, несмотря на местный говор и вероисповедание огромного большинства жителей.

Так как распространились глубоко несоответствующие комментарии в деле очень чувствительном и жизненном — купля земли — приказываю Пану Старосте переслать в каждую гмину это распоряжение для прочтения его на ближайших совещаниях старост.

Воевода Полесский Вацлав Костэк-Бернацки

Пераклад з польскай мовы В.Г.Ліневіч.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 6. Спр. 2608. Л. 30, 30 адв.

МЕРКАВАННІ ВАЯВОДЫ ПАЛЕСКАГА АБ СТАНЕ АДУКАЦЫІ І ПОЛЬСКАЙ ПРАПАГАНДЗЕ

Лістапад 1937 г.

Сакрэтна!

Пану Міністру Унутраных Спраў у Варшаве.

В связи с докладной запиской Пана Воеводы Новогридского от дня 31.XII.1936 г. № PN. 92/тйн/36, присланной мне к сведению в деле расширения строительства образования и польской пропаганды на Восточных Кресах, а также акцией местных военных властей, имею честь представить Пану Министру следующие выводы и замечания:

1. Образование.

Отсутствие достаточного количества общеобразовательных школ является вместе с отсутствием дорог наиболее существенной болячкой Полессия, где процент безграмотных и безграмотных возвратных является самым высоким в Государстве (за исключением Гуцульщины).

Так как Министерство Религиозных вероисповеданий и Общественного Просвещения предусматривает в будущем школьном году увеличение штатных учительских единиц на 4000 — считаю, что необходимо по меньшей мере 400 новых учительских сил предоставить Полесскому воеводству. Это является тем более обоснованным, что Полесье, будучи самой бедной областью Государства, дало относительно самую большую сумму на Общество Содействия Строительству Общественных Школ. Дальнейшее использование с этой целью фондов только из пожертвований местной общественности, а также от самоуправления гмин не даст необходимого эффекта и выполнение...

Пераклад з польскай мовы В.Г.Ліневіч.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 8. Спр. 1656. Л. 14.

ЗВЕСТКІ АБ ВЫНІКАХ ПРЫЗЫВУ Ў ПОЛЬСКУЮ АРМІЮ ПА БРЭСЦКІМ ПАВЕЦЕ Ў 1932 г.

Призывная комиссия на повет	Число призывников по плану				Результаты числа призыва по кат. сан. 5/30					Гигиена		Подвыпившие или пьяные	Болезни					
													туберкулез			трахома		
													кат. В		др. категории	кат. В		др. категории
	1911 г.р.	1909 – 1910 г.р.	другие г.р.	вместе	А.	В.	С. и Д.	Е.	вместе	грязные	вшивые		1911 г.р.	1910 г.р.		1911 г.р.	1910 г.р.	
Брестский	2455	597	4	3056	1529	587	472	69	2657	6	3	–	90	37	63	5	4	31

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 28 с./р-1. Воп. 4. Спр. 1198. Л. 96.

Нацыянальна-вызваленчы рух

Паводле аднаго з пунктаў Рыжскага дагавора, беларусам і іншым нацыянальным меншасцям у Польшчы павінны былі быць забяспечаны роўныя з палякамі правы ў развіцці сваёй культуры, мовы, адукацыі і выкананні рэлігійных абрадаў. Але на практыцы праводзіўся жорсткі курс на апалячванне насельніцтва заходніх зямель. У 1919 г. на

тэрыторыі, якая адышла да Польшчы, было каля 500 беларускіх школ, 2 настаўніцкія семінарыі і 5 гімназій. Да 1924 г. засталося толькі 37 беларускіх школ і 4 гімназіі з абмежаванымі правамі.

Нацыянальны прыгнёт у спалучэнні з цяжкім эканамічным і сацыяльным становішчам садзейнічалі разгортванню масавага нацыянальна-вызваленчага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі. У першыя гады камуністычныя арганізацыі не былі адзіным цэлым, яны дзейнічалі пад кіраўніцтвам розных цэнтраў: ЦК Кампартыі Літвы, ЦК Камуністычнай рабочай партыі Польшчы (КРПП), ЦК Кампартыі Заходняй Украіны (КПЗУ) і ЦК Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), апошняя да 1923 г. уваходзіла ў склад КРПП на правах тэрытарыяльна-адміністрацыйнай арганізацыі. Барацьба за нацыянальнае вызваленне ў той час насіла стыхійны характар. Найбольш актыўныя сяляне, як правіла, гэта бежанцы, якія вярнуліся ў родныя мясціны, удзельнікі рэвалюцыі 1917 г. і грамадзянскай вайны, аб'ядноўваліся ў невялікія групы, ішлі ў лясы, нападалі на паліцэйскія ўчасткі і памешчыцкія маёнткі.

Першымі на тэрыторыі Брэсцкага павета з'явіліся падпольныя ячэйкі ў вёсках Вялікія і Малыя Радванічы, Франопаль, Міхалін, Ваўкі, Гулі, Літвіны, Чарнаўчыцы. Але спачатку Брэсцкі акружны камітэт партыі галоўную ўвагу ўдзяляў прапагандзе сярод рабочых горада. Толькі пасля выбараў восенню 1922 г. у сейм і сенат, калі дэпутатамі, нягледзячы на актыўную агітацыйную кампанію, былі выбраны ўсяго 2 члены кампартыі, акружны камітэт заўважыў памылковасць недаацэнкі ролі вёскі ў палітычным жыцці краю і больш патрабавальна пачаў адносіцца да распаўсюджвання свайго ўплыву на яе жыхароў.

У студзені 1923 г. у склад КПЗБ увайшла папулярная сярод беларускага сялянства Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА), якая значна ўзмацніла партыю. У 1924 г. аб'ядналіся нелегальныя камуністычныя арганізацыі моладзі пад кіраўніцтвам КПЗБ, быў створаны Камуністычны Саюз Моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Праз год была аформлена Міжнародная арганізацыя дапамогі рэвалюцыянерам (МОПР), яна стала масавай нелегальнай арганізацыяй дапамогі палітычным зняволеным і іх сем'ям. З гэтага часу вызваленчы рух уступіў у новую паласу свайго развіцця, стаў больш радыкальным і арганізаваным.

На тэрыторыі сучаснага Брэсцкага раёна існавала некалькі падпольных партыйных раёнаў: Дамачаўскі, Маларыцкі, Матыкальскі, Чарнаўчыцкі, Лышчыцкі, найбольш буйным і значным сярод іх быў Падгорскі, у яго ўваходзілі вёскі Аркадзія, Буякі, Бярнады, Барысы, Ваўкі, Вулька-Застаўская, Вычулкі, Гулі, Гершоны, Закій, Забалацце, Заслучна, Завосце, Знаменка, Літвіны, Міхалін, Очкі, Прылукі, Падлессе-Радваніцкае, Плоска, Пугачова, Вялікія і Малыя Радванічы, Рагозна, Сямісосны, Страдзеч, Тэльмы, Хабы, Херма, Шэбрын, Ямна. Межы гэтых раёнаў не былі нязменнымі, здаралася, што тая ці іншая вёска выпадала з агульнага ланцуга ў выніку арыштаў лідэраў-камуністаў.

Каля вытокаў вызваленчага руху стаялі: у в. Чарнаўчыцы — Несцер Амельянюк, Міхаіл Антанюк, Максім Абрамук, Даніла Козел, у в. Лышчыцы — Даніла Мацвяюк, у в. Страдзеч — Іван Герасімук, у в. Прыбарава — Аляксандр Пятручык, Агрыпіна Казярук, Фёдар Дарашук, у в. Камароўка — Сямён Гараднічук, Якаў Тарасюк, Ігнат Клімук.

У пачатку 1924 г. у в. Вялікія Радванічы прыбыў прадстаўнік ЦК,

адзін з першых арганізатараў усяго рэвалюцыйнага падполля — Сямён Андрэевіч Дубовік. У яго прысутнасці ў доме Рыгора Кавальчука прайшоў арганізацыйны сход Падгорскага райкома КПЗБ, была абрана часовая кіруючая тройка падпольнага райкома, якая павінна была аказваць дапамогу ў стварэнні падпольных ячэек КПЗБ у другіх вёсках. Праз год яны былі створаны ў большасці вёсак Брэсцкага раёна. У некаторых — Франопаль, Вялікія і Малыя Радванічы, Міхалін — давялося ствараць па 2 ячэйкі (па ўмовах канспірацыі рэкамендавалася, каб у складзе ячэйкі знаходзілася не больш 9 чалавек, не ўключаныя ў рады партыі, але якія спачувалі камуністычным ідэям і называліся «сімпатыкамі»; пасля хвалі арыштаў яны займалі месца выбыўшых членаў КПЗБ). Былі выпадкі, калі ў адной вёсцы паралельна працавалі ячэйкі КПЗБ і КПЗУ.

На Брэстчыне, асабліва ў яе паўднёвай частцы, поспехам сярод сялянства карысталіся легальнае ўкраінскае сялянска-рабочае аб'яднанне «Сельроб» і культурна-асветніцкая арганізацыя «Прасвіта». У 1927 г. у справаздачы палескага ваяводы адзначалася, што гурткі «Сельроба» існавалі ў вёсках Пугачова (15 чалавек), Радванічы (60 чалавек), Залессе (30 чалавек), Чарнаўчыцы (20 чалавек), а таксама ў вёсках Франопаль, Рэчыца, Страдзеч, Матыкалы, Лышчыцы, Прыбарава, Дамачава. Тут распаўсюджваліся газета «Сіла», якая выдавалася ў Львове, і «Сель-Роб», часопіс «Вікно», у якіх побач з агратэхнічнай інфармацыяй змяшчаліся матэрыялы аб Савецкім Саюзе і вызваленчай барацьбе. Часта яны выходзілі з чыстымі палосамі. У 1932 г. дзейнасць «Сельроба» была спынена.

Значную ролю ў падтрыманні нацыянальнага духу адыгрывала «Прасвіта». На пачатку 1927 г. у Брэсцкім павеце налічвалася: у гміне Дамачава — 113 членаў «Прасвіты», у гміне Лышчыцы — 136, у гміне Медна — 80, у гміне Матыкалы — 302, у гміне Прыбарава — 107, у гміне Радванічы — 74, у гміне Турна — 119 чалавек.

Яны ставілі п'есы ўкраінскіх і беларускіх драматургаў. Асаблівай любоўю ў гледачоў карысталіся п'есы І. Катлярэўскага «Наталка-Палтаўка» і Янкі Купалы «Паўлінка».

Пры «Прасвіце» адкрываліся так званыя «рідны хаты» — бібліятэкі, дзе збіраліся для чытання і абмеркавання газет, праводзіліся гутаркі на розныя, у тым ліку і палітычныя, тэмы.

Камуністы выкарыстоўвалі ўсе магчымыя сродкі для таго, каб прыцягнуць увагу грамадскасці да неабходнасці правядзення ўрадам заходаў, каб палепшыць жыццё працоўных і змяніць дзяржаўны лад. З гэтай мэтай праводзіліся масавыя дэманстрацыі, распаўсюджвалася адпаведная літаратура, лістоўкі, звароты, вялася растлумачальная работа. У в. Забалацце без афіцыйнага дазволу пачала выходзіць газета «Заря Подлясья», тыражом 50 экзэмпляраў. Выйшла некалькі нумароў, перш чым выдаўцы Іван Карыяеўскі і Міхаіл Вальчук былі арыштаваны і асуджаны на 2 гады пазбаўлення волі кожны. Для падрыву аўтарытэту ўлад не грэбавалі ніякімі сродкамі. Паводле ўспамінаў Р.А.Зінчука, у той жа вёсцы ў час спектакля аб прыгнёце казакаў у гады турэцкай няволі акцёр, чытаючы згодна ролі тэкст: «Маці Украіна, вось твае ворагі, вось твае каты», паказаў не на турак, як было неабходна па ходу п'есы, а на месцы ў глядзельнай зале, занятыя паліцэйскімі. Публіка адгукнулася рогатам і апладысментамі. Спектакль быў спынены, акцёр арыштаваны.

КПЗБ падтрымлівала сувязь з Беларускай сялянска-рабочай грамадой, іх аб'ядноўвалі агульныя мэты —

барацьба супраць паланізацыі і каланізацыі Заходняй Беларусі, закрыцця беларускіх школ і культурна-асветніцкіх арганізацый, за народную школу з роднай мовай навучання, за ліквідацыю асадніцтва і канфіскацыю памешчыцкіх зямель, каб падзяліць іх паміж сялянамі, за стварэнне сялянска-рабочага ўрада. У 1927 г. урад Пілсуцкага забараніў дзейнасць Грамады, было арыштавана каля 500 членаў арганізацыі.

Хоць на тэрыторыі Брэсцкага раёна не было камітэтаў Грамады, Брэсцкі АК КПЗБ і КСМЗБ адказаў на гэта рэзалюцыямі пратэсту:

«Таварышы рабочыя і сяляне!

...Далоў крывавы суд над Грамадой...

Патрабуем вызвалення грамадаўцаў і ўсіх палітычных зняволеных.

Патрабуем спыніць працэс над Грамадой».

Жорсткія праследаванні і рэпрэсіі з боку ўлад да ўдзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху сталі нормай таго часу. Арыштоўвалі нават дзяцей: у в. Забалацце ў 1925 г. было затрымана сямёра 12—14-гадовых хлопчыкаў за тое, што яны ў форме своеасаблівых рэвалюцыйных «калядак» збіралі ахвяраванні ў дапамогу палітычным зняволеным і іх сем'ям. Справа дайшла да суда. Пракурор у абвінаваўчай прамове назваў іх віднымі і небяспечнымі дзяржаўнымі злачынцамі, але суддзі былі абураны арыштам дзяцей і вызвалілі іх з-пад варты.

У 1920-я гады члены КПЗБ арыентаваліся на супрацоўніцтва з членамі іншых палітычных сацыял-дэмакратычных партый. Але паступова адбывалася яе самаізаляцыя, а потым і поўны разрыў з астатнімі арганізацыямі. Гэты працэс знайшоў сваё адлюстраванне і ў гісторыі Брэстчыны.

Іван і Марыя Лесакі, чыя партыйная работа пачалася яшчэ ў гады грамадзянскай вайны ў Крыме, дзе яны пазнаёміліся з С.Дубовікам, вярнуўшыся на радзіму, зблізіліся з паслом польскага сейма, жыхаром м. Дамачава — Альфрэдам Бонам. Гэта быў таленавіты палітык, усебакова адукаваны чалавек, цудоўны аратар, які разумеў праблемы мясцовага насельніцтва і шукаў шляхі іх вырашэння. А.Бон быў прыкметнай фігурай, вядомай не толькі ў Брэсцкім раёне, але і на ўсім Палессі. Карыстаючыся дэпутацкай недатыкальнасцю, ён ездзіў па навакольных вёсках і мястэчках, збіраў мітынгі, востра крытыкаваў урад і яго парадкі. У польскім сейме ён з'яўляўся сакратаром пасольскага клуба ўсяпольскай легальнай Незалежнай сялянскай партыі (НПХ), асабліва блізка да сэрца прымаў інтарэсы сялянства ў абарону іх правоў. А.Бон стаў ініцыятарам стварэння на Брэстчыне партыйных арганізацый НПХ. Першы арганізацыйны сход праходзіў на кватэры І.Лесака ў маі 1926 г. у Брэсце; тады быў выбраны АК НПХ, у яго ўвайшлі: Галаўко Фёдар (в. Матыкалы), І.І.Лесак (ураджэнец в. Страдзеч), А.Бон, Чыквін Мікалай (в. Хлевішча), Грот (г. Пінск).

У кароткі тэрмін была створана сетка арганізацый НПХ. У склад мясцовых камітэтаў часта ўваходзілі камуністы. НПХ праводзіла шырокую кампанію за вызваленне палітзняволеных, перадачу зямлі малазямельным сялянам, дэмакратычныя свабоды.

У 1927 г. яе дзейнасць была забаронена. А.Бон арганізаваў сваю Левасялянскую партыю, якая карысталася асаблівай папулярнасцю на Брэстчыне і Кобрыншчыне. Яе рупарам стала газета «Заря», якая аб'ядноўвала людзей розных нацыянальнасцей, саслоўяў і палітычных поглядаў. Яе падтрымлівалі не толькі ідэйна, але і матэрыяльна. Разам з Бонам працаваў у якасці сакратара І.Лесак. Марыя Лесак стала карэктарам.

У той час, калі адкрыліся

магчымасці для аб'яднання, кампартыя пачала ўзводзіць паклёп на А.Бона і яго аднадумцаў. Іх абвінавацілі ў сувязях з дэфензівай. Дало аб сабе знаць імкненне КП адмежавацца ад патэнцыяльных канкурэнтаў, не ўступаць ні ў якія палітычныя блокі і дабіваца манаполіі на палітычнай арэне. А абылганы пасол сейма вымушаны быў хавацца, пачаліся ганенні і на яго з боку ўлад, аб чым сведчыць і наступны дакумент.

Зусім сакрэтна
Брэст н/Б 13/1-27 года.
Сакрэтна

Усім Аддзелам Паліцыі Брэсцкага павета. У выпадку з'яўлення на в/тэрыторыі пасла Бона Адольфа або іншых дэпутатаў-камуністаў, БВРХ, Сельроба і т.п. партый прапаную тэрмінова паведаміць аб гэтым мясцовы Аддзел паліцыі. Адначасова інфарміруйце аб дзейнасці названых дэпутатаў. Начальнік павятовай П.П. (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 242. Воп. 1. Спр. 146а. Л. 1.)

У палітычным жыцці краю асобна стаялі яўрэйскія арганізацыі: Паалей Цыён і Бунд. На тэрыторыі Заходняй Беларусі яны дзейнічалі легальна. Па даных на 1926 г., Паалей Цыён (правіца) мела каля 500 прыхільнікаў па Брэсцкаму павету. Разам з Паалей Цыён (лявіцай) яна займалася падрыхтоўкай сваіх членаў для адраджэння і развіцця Палесціны. Існавала Дамачаўскае аддзяленне сіянісцка-рэвізіянісцкай арганізацыі і Чарнаўчыцкае аддзяленне таварыства яўрэйскай моладзі ім. Трумпельцора. Паалей Цыён заклікала лаяльна адносіцца да польскіх улад, што выклікала крытыку з боку Бунда. Бунд выступаў супраць сіяністаў, сцвярджаючы, што іх праграма дабрабыту яўрэяў у Палесціне — утопія і здрада, заклікалі змагацца за эканамічныя, палітычныя і нацыянальныя правы ў польскай дзяржаве. Бунд займаўся культурна-асветніцкай работай. Аддзяленне «Культур-Ліга» ў Дамачаве на 18.1.1928 г. налічвала 40 членаў; прэзідэнтам быў Бранштэйн Езель. Там жа існавала яўрэйская народная бібліятэка. У в. Чарнаўчыцы дзейнічала аддзяленне «Таварыства яўрэйскіх школ», прэзідэнтам якога быў член Бунда Крашынскі.

Вялікую ролю ў актывізацыі палітычнага жыцця краю адыгралі людзі, якіх прыслалі на падпольную работу з Савецкага Саюза. Яны неслі ідэі далучэння да Савецкай Беларусі, імкнуліся ярчэй праявіць сябе, арганізоўвалі мітынгі і дэманстрацыі, у імя справы былі гатовы ахвяраваць сабой. Яны не прайшлі дастатковай падрыхтоўкі, не былі падрыхтаваны да мясцовых умоў, вельмі прыкметныя, часта «гарэлі», запаўняючы турэмныя камеры.

Гэтаму садзейнічала распрацаваная дэфензівай сістэма ўкаранення правакатараў у рады падпольшчыкаў.

У ліпені 1932 г. на Брэстчыну быў прысланы Сяргей Яфімавіч Багданчук (партыйная клічка Жэнька). Ён стаў першым сакратаром АК КПЗБ. Пачатак яго дзейнасці быў звязаны з кур'ёзам: у в. Чармяны маладыя мясцовыя падпольшчыкі прынялі яго за «шпіка» і ледзь не расправіліся з ім — з'явіўся чалавек, які добра ведаў Багданчука. Як высветлілася пазней, Багданчук курыў «панскія» папяросы і паліў адну запалку за другой: у вёсцы, дзе курылі тытунь-самасей і дзялілі адну запалку на 2—4 часткі ў мэтах эканоміі, такую раскошу мог дазволіць сабе толькі той, хто быў блізкі да польскіх улад. У снежні 1932 — лютым 1933 гг. з дапамогай Багданчука была праведзена забастоўка лесарубаў на Пружаншчыне, якая закончылася перамогай бастуючых. У красавіку 1933 г. правакатар выдаў Багданчука, яго схапіла паліцыя і замучыла недалёка ад в. Радванічы. Яго іменем названы вуліцы ў Брэсце і ў пас. Му-

хавец, дзе яму пастаўлены помнік.

Да пачатку 1930-х гадоў Кампартыя мела на Брэстчыне разгалінаваную сетку сваіх арганізацый. З асаблівым жаданнем уключалася ў барацьбу моладзь. У Дамачаўскім раёне дзейнічала 6 ячэек КСМЗБ, у Чарнаўчыцкім — 6, у Лышчыцкім — 27. У іх уваходзілі сяляне-беднякі, рабочыя розных нацыянальнасцей: беларусы, украінцы, яўрэі. Адбывалася актывізацыя палітычнага жыцця краю. Аб гэтым сведчыць выступленне жыхароў в. Прыбарава. У лістападзе 1932 г. быў арыштаваны вядомы ў гэтай мясцовасці падпольшчык Васіль Крыніца. Навіна аб яго затрыманні выклікала абурэнне сярод жанчын гэтай вёскі. Яны паднялiся на яго абарону. Той дзень увайшоў у гісторыю в. Прыбарава як «бабін бунт». Больш чым 150 жанчын усіх узростаў патрабавалі ад трох паліцэйскіх вызваліць В.Крыніцу. Папераджальныя выстралы ўверх уплыву на жанчын не аказалі, а прымусілі іх дзейнічаць. Яны закідалі паліцэйскіх граззю, засыпалі іх пяском. Паліцэйскія ўцяклі, а Крыніца схаваўся. Чатырох жанчын арыштавалі, яны былі асуджаны на тры месяцы турэмнага зняволення. Астатнія атрымалі штраф 10 злотых, але ні адна з іх не магла заплаціць яго, бо маёмасці было ў іх так мала, што апісваць не было чаго.

У гады эканамічнага крызісу 1929—1933 гг. узрасла незадаволенасць сялян, часта яны выходзілі з-пад кантролю. КПЗБ выступала супраць індывідуальнага тэрору, але не заўсёды магла спыніць дзейнасць тэрарыстычных груп. Як адзначалася ў справаздачы з месцаў:

«Такая ўстаноўка нашай партыі па пытанню барацьбы з белым тэрорам і дыверсантах не спадабалася некаторым таварышам з Дамачаўскага раёна. І вясною бягучага года 4 тав. выйшлі з партыі, заявіўшы, што такая ўстаноўка толькі шкодзіць справе. Дастаткова агітацыі і прапаганды. Гэтым мы нічога не зробім. Трэба брацца за зброю і змагацца. З канфідэнтамі трэба разлічвацца коратка. У лоб — і справа скончана. Палажыць некалькі чалавек, другія не палезуць і г.д. Выйшаўшы з партыі, яны стварылі тэрарыстычную ўзброеную групу, уцягнуўшы ў яе яшчэ 16 чалавек беспартыйнай вясковай моладзі. Цяпер група налічвае 20 чалавек. Створаная група ўзброілася рэвальверамі і абрэзамі (якім шляхам яна здабыла зброю, нам невядома) і прыступіла ў першую чаргу да «знішчэння» канфідэнтаў (за дакладнасць звестак ручацца нельга — прычыну гэтага глядзець ніжэй). Праведзеныя пасля забойстваў арышты не выявілі забойцаў і ўсе арыштаваныя былі вызвалены. Усе члены гэтай групы ходзяць заўсёды са зброяй у кішэнях.

Гэта тэрарыстычная група мае сувязь з партарганізацыяй Дамачаўскага раёна праз былых членаў партыі і карыстаецца ўказаннямі партыі, хто з'яўляецца канфідэнтам, але арганізацыйна партыі яны не падпарадкоўваюцца.

Брэсцкі АК, атрымаўшы звесткі аб гэтай групе, даў дырэктыву Дамачаўскаму РК распусціць або разбіць гэту групу, бо яе існаванне можа прывесці да карнай экспедыцыі, да ліквідацыі рэвалюцыйнага руху ў раёне і акрузе. Ажыццявіць гэту дырэктыву АК РК не ўдалося.

Неабходна адзначыць, што партарганізацыя Дамачаўскага раёна, як і частка таварышаў з самога РК, сімпатызуе гэтай групе, значыць і яны па некаторых пытаннях не згодны з устаноўкай партыі. Аб гэтым сведчаць словы аднаго таварыша з РК: «Дамачаўскі раён ужо гатовы да рэвалюцыі. Мы ўжо можам выступаць».

Насельніцтва Брэстчыны добра ўспрымала антыпадатковую і антышарварачную агітацыю. Заклік

байкаціраваць падаткі знаходзіў водгук сярод збяднелых сялян. Яны не плацілі ў тэрмін грошы: у в. Нэплі жыхары выгналі судовага выканаўцу і паліцэйскіх, якія прыбылі забраць апісаныя рэчы. У вёсках Казловічы і Кавердзякі былі выбраны антыпадатковыя камітэты, створаны дружыны самаабароны.

23 ліпеня 1933 г. адбылося антыпадатковае выступленне ў в. Ляплёўка. У ім удзельнічала 80 чалавек. Праз дзень з вёскі выгналі секвестратара і трох паліцэйскіх (аднаму з іх у час сутычкі зламалі руку). Справа дайшла да стральбы: Лявону Багонскаму, мясцоваму актывісту, раздрабілі абедзве нагі. Быў арганізаваны мітынг пратэсту, спяваючы «Інтэрнацыянал», даставілі раненага да ўрача. На наступны дзень ён памёр ад страты крыві. Ноччу ў вёску прыбыў атрад паліцыі. Пошукі вінаватых суправаджаліся грабяжамі, людзей жорстка збівалі, 9 чалавек было арыштавана.

У адказ на гэта сакратар Брэсцкага АК КПЗБ Рэгіна Каплан арганізавала масавы паход у маёнтак памешчыкаў Малачэўскіх, якія не плацілі батракам. Ноччу 3 жніўня каля в. Дарапеевічы Кобрынскага павета сабралася каля 100 чалавек, у большасці моладзь з вёсак Вялікія і Малыя Радванічы, Міхалін, Ваўкі, Муры, Франопаль, Сямісосны. Па дарозе яны напалі на паліцэйскі ўчастак у м. Навасёлкі. Усю ноч ішла перастрэлка, а раніцай сяляне разышліся.

У Кобрынскі, Брэсцкі, Пружанскі паветы былі накіраваны карныя атрады паліцыі. Больш за 30 удзельнікаў узброенага выступлення былі аддадзены пад суд. (Р.Каплан была арыштавана напярэдадні). Васьмі з іх пагражала смяротнае пакаранне. У сувязі з гэтым па закліку партыі пачаўся рух супраць расправы. Улады вымушаны былі замяніць пакаранне смерцю рознымі тэрмінамі зняволення. Р.Каплан была асуджана на 15 гадоў пазбаўлення волі.

Акцыі пратэсту іншы раз мелі поспех. У в. Франопаль камсамольцы арганізавалі 3-тыднёвую забастоўку рабочых лясніцтва. Яны дабіліся павышэння аплаты працы.

Сяляне Дамачава ў выніку антышарварачнай прапаганды адмовіліся вазіць каменне ў Брэст. У староства была паслана рэзалюцыя, яе падпісалі і жыхары в. Забалацце.

У в. Рэчыца восенню 1934 г. 22 школьнікі адмовіліся працаваць на школьным агародзе, спаслаўшыся на тое, што працуюць на ўласных участках, плацяць падаткі і не даядаюць. У в. Забалацце дзеці адмовіліся здаваць грошы на партрэт Пілсудскага.

Рэвалюцыйны настрой адчуваўся і ў час выбараў у сейм. Улады запалохвалі насельніцтва. Тым, хто не ўдзельнічаў у выбарах, пагражалі непрыемнасці. Сяляне, якія выказвалі варожыя адносіны да ўлады, абкладаліся штрафам за смецце на падворку, за тое, што сабака не на ланцугу і інш. На выбарчых участках людзям раздавалі тытунь, дазвалялі галасаваць за ўсіх членаў сям'і. Тым не менш часта ўладам даводзілася падтасоўваць вынікі галасавання.

І.Э.Яленская.

Змагаліся за лепшую долю

Васіль Пятровіч Ласковіч нарадзіўся 18 лютага 1914 г. у в. Франопаль Брэсцкага павета. Адзін з арганізатараў і ўдзельнікаў узброенага выступлення сялян в. Навасёлкі Брэсцкага павета ў 1933 г. У 1953 г. уступіў у КПЗБ. У лістападзе 1934 г. арыштаваны, асуджаны на 10 гадоў зняволення. У верасні 1939 г. вызвалены Чырвонай Арміяй. Абраны дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі ў Бе-

В.П.Ласковіч.

Ф.В.Чараўко.

Р.Я.Кавальчук.

Л.Я.Кавальчук.

К.Я.Міхно.

ластоку ў 1939 г. З чэрвеня 1941 г. на фронце, кулямётчык, удзельнік абароны Смаленска. У верасні 1941 г. рэпрэсіраваны, сасланы ў г. Омск, у красавіку 1942 г. вызвалены. У верасні 1942 — ліпені 1944 гг. намеснік начальніка асобага аддзела атрада імя Калініна партызанскай брыгады «Народныя мсціўцы», начальнік спецгрупы. У 1949 г. скончыў Усесаюзны юрыдычны завочны інстытут. У 1945—1970 гг. на савецкай і партыйнай рабоце і ў органах юстыцыі ў Брэсце. У 1970—1989 гг. навуковы супрацоўнік мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Даследуе гісторыю рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі ў 1920—1930-я гг. і гісторыю партызанскай барацьбы ў Вялікую Айчынную вайну. Адзін з аўтараў зборнікаў «У суровыя гады падполля» (1958), «У працы і баі» (1970), «Гады выпрабаванняў і мужнасці» (1973). Ганаровы грамадзянін г. Брэста (1978).

Феадосій Вакулавіч Чараўко нарадзіўся ў 1897 г. у сям'і беднага селяніна. Сям'я выехала ў Самарскую губерню, дзе ён быў мабілізаваны ў царскую армію. Дабравольна перайшоў у Чырвоную Армію, камандаваў кулямётным узводам на Калчакаўскім фронце. У 1920 г. вярнуўся на радзіму.

У 1922 г. уступіў у КРПП, а ў 1924 г. быў першым арганізатарам КПЗБ у Брэсцкім раёне. У 1933 г. арыштаваны польскімі ўладамі, якія не знайшлі матэрыялы для суда і мусілі яго вызваліць. У 1934 і 1935 гадах ён зноў трапляў у турму. Але арышты толькі ўмацоўвалі яго веру ў ідэалы справядлівасці і дабра.

З 1939 г. Ф.В.Чараўко актыўна ўдзельнічаў у аднаўленні і ўмацаванні савецкай улады. Працаваў сакратаром сельскага савета. Калі распачалася вайна, ён разам з усёй сям'ёй пайшоў у падполле, а затым з дачкою Ганнай партызаніў у атрадзе імя Чарнака Брэсцкага партызанскага аб'яднання.

Браты Кавальчукі. Іх было чацвёра. У 1915 г. яны разам з бацькамі пакінулі родную вёску Радванічы і выехалі ў Расію, дзе злучылі свой лёс з рэвалюцыяй. Рыгор, Антон і Іван служылі ў Чырвонай Арміі. Апошні ў 1919 г. загінуў на Доне ў Першай коннай. Антон застаўся вайскоўцам.

Рыгор і Лукаш у 1921 г. вярнуліся на радзіму. Разам з Феадосіем Чараўко яны стварылі першыя 8 ячэек КРПП, а пазней КПЗБ.

Лукаш у 1926 г. нелегальна выехаў у СССР, стаў інжынерам. У 1941 г. ён геройскі загінуў у баях за Маскву.

Рыгор у час белапольскай акупацыі быў актывістам КПЗБ, неаднойчы ўваходзіў у склад райкома партыі, абіраўся і ў акруговы камітэт. У гады Вялікай Ай-

чыннай вайны дапамагаў партызанам. Пасля перамогі працаваў у калгасе.

Кліменцій Яфімавіч Міхно змагаўся за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. У 1920 г. з сябрамі дапамагаў параненым чырвонаармейцам. Выратаваў многіх з іх ад легіянераў Пілсудскага. У 1924 г. уступіў у КПЗБ. На першым арганізацыйным сходзе Брэсцкага (Падгародскага) райкома КПЗБ, на якім прысутнічалі: з в. Франопаль — Васіль Лобік, Сямён Фёдаравіч і Лаўрэнцій Данілавіч Панасюкі, Сцяпан Барысавіч Ласковіч, Барыс Кандрацюк, Ануфрый Дзямідавіч Міхно, Пётр Фёдаравіч Лобік; з Вялікіх і Малых Радваніч — Якаў Вакулавіч Міхно, Кузьма Пятровіч Галадко, Павел Ігнатавіч Міхно, Акім Іванавіч Кузьміцкі, Іван Пятровіч Галадко, Кірыл Пятровіч Сабко і іншыя, Кліменція Міхно абралі сакратаром.

Васіль Захаравіч Лобік нарадзіўся ў 1897 г. У ліку бежанцаў апынуўся ў Самарскай губерні, у 1919 г. пайшоў у Чырвоную Армію і ваяваў на франтах грамадзянскай вайны. У 1921 г. разам з бацькамі вярнуўся на радзіму ў в. Франопаль.

У 1925 г. уступіў у КПЗБ. Яго хата была явачнай кватэрай падпольшчыкаў.

У гады нямецкай акупацыі В.З.Лобік разам з сынамі пайшоў абараняць Айчыну. Мясцовы здраднік — войт Камянец-Жыровіцкай гміны Стах — выдаў немцам сям'ю Лобікаў. Жонку Васіля Захаравіча Кацярыну Пятроўну і іх малодшага сына Паўліка закатавалі ў брэсцкай турме. Васіля Захаравіча здраднік забіў з засады. Старэйшы сын камсамолец Мікалай загінуў пры вызваленні Брэста ў ліпені 1944 г.

Браты Пучыкі Лукаш і Сцяпан нарадзіліся і жылі ў в. Міхалін. Лукаш уступіў у КПЗБ у 1930 г., Сцяпан — годам пазней. У 1931 г. Брэсцкі райком КПЗБ даручыў Лукашу арганізаваць партыйныя ячэйкі ў вёсках Пажэжын, Масевічы, Велікарыта. Неўзабаве яго абіраюць членам, а ў 1935 г. — сакратаром Падгародскага райкома партыі, членам Брэсцкага акруговага камітэта КПЗБ. Яго неаднойчы арыштоўвалі, але вытрымка і самавалоданне на допытах кожны раз пазбаўлялі Лукаша ад турмы. Прымалі ўдзел у Навасёлкаўскім узброеным паўстанні сялян.

Васіль Захаравіч і Кацярына Пятроўна Лобікі.

Л.Я.Пучык.

У красавіку 1935 г. Лукаша Пучыка арыштавалі і ў кастрычніку прысудзілі да 6 гадоў турмы. Ён быў вызвалены ў верасні 1939 г.

Пасля арышту брата Сцяпан узяў на сябе вялікую долю партыйнай работы. Ён прывозіў з Брэста падпольную літаратуру, сустракаў і хаваў прадстаўнікоў ЦК, дапамагаў ім, збіраў партыйныя ўзносы, трымаў сувязь з палітвязнямі брэсцкай турмы. Летам 1936 г. разам з інструктарам ЦК КПЗБ Марыяй Русецкай быў арыштаваны. На пачатку 1937 г. у Брэсце адбыўся суд, на якім Сцяпана прыгаварылі да 10 гадоў турмы, а Марыю Русецкую — да чатырох. Абодва былі вызвалены ў 1939 г.

Іван Ігнатавіч і Марыя Васільеўна Лесакі.

Іван нарадзіўся ў 1896 г. у в. Страдзеч. У 1915 г. сям'я ў ліку бежанцаў апынулася ў Троіцку Арэнбургскай вобласці. На пачатку 1916 г. Івана прызвалі ў царскае войска. У складзе арміі генерала Брусілава ён быў паранены ў Карпатах. Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі сустрэў у

І.І.Лясак.

М.В.Лясак.

І.В.Салейка.

Феадосіі, дзе знаходзіўся на лячэнні. Паправіўшыся, скончыў палкавую школу ў арміі Дзянікіна, ваяваў у званні прапаршчыка, ізноў быў паранены і апынуўся ў тым жа шпіталі ў Феадосіі. Там працавала медсястрой вельмі прыгожая і міласэрная дзяўчына — Марыя Мікалаенка.

У той час у Феадосіі працаваў дасведчаны бальшавік-падпольшчык Сямён Андрэевіч Дубовік (мянушка Андрэй Марскі). Ён і далучыў Івана і Марыю да сумеснай працы ў партыі. У 1921 г. Іван Лясак прывёз 22-гадовую жонку ў сваю родную вёску. Марыя прываблівала не толькі надзвычайнай прыгожасцю, але і душэўнай сардэчнасцю, розумам, інтэлігентнасцю. У гэтым жа годзе ў хату да Лесакоў завітаў іх стары знаёмы — кіраўнік падполля ў Феадосіі Андрэй Марскі. Радасць была вялікая. Яны ўпершыню пачулі яго сапраўднае імя. Так узнавілася даўняе сяброўства. Марыя Васільеўна пад псеўданімам Семянюк была сувязной Сямёна Дубовіка, Іван пад псеўданімам Барысаў працаваў побач з ім. Не парываючы з роднай вёскай, яны ўладкаваліся на працу ў Брэсце. Марыя, вывучыўшы польскую мову, па заданні Дубовіка працавала ў вайсковым гарнізоне Брэсцкай крэпасці. Ёй давялося шмат разоў пераходзіць польска-савецкую мяжу, выконваць даручэнні Дубовіка і ЦК КПЗБ, зрэдку тайна наведваць сваю родную Феадосію. У канцы 1924 г. па Страдзецкім сельсавеце пракацілася хваля арыштаў. Арыштавалі больш за 30 чалавек, 18 з іх асудзілі. Сярод іх былі Уладзімір Качук, Ігнат Мацкевіч, Аграфена Казярук, Іван Смаль, Рабініцкі, Мардко, Дзямід Ляшук, Ганна Дзенясюк і інш. Івана Лесака арыштавалі 18 лістапада 1924 г. На допытах ён ні ў чым не прызнаўся і таму ў канцы сакавіка 1925 г. быў вызвалены. І зноў праца ў падполлі...

Марыю Васільеўну арыштавалі на мяжы, калі яна чарговы раз вярталася з СССР. Яе кінулі ў баранавіцкую, а затым у брэсцкую турму, доўга і жорстка катавалі. Пра яе смерць засталіся жудасныя чуткі.

Ёй было толькі 29 гадоў. Яе забаранілі хаваць на могілках. Цела аддалі зямлі на Лысай гары пад Брэстам. Сцежка да магілы гераіні не зарасла травой.

Раман і Бенядзікт Зінчукі — браты, нарадзіліся ў в. Яблачна (знаходзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Польшча), Раман у 1903 г., а Бенядзікт у 1910 г. Абодва ў 1926 г. уступілі ў КПЗБ і захавалі вернасць партыі і працоўнаму народу да апошніх сваіх дзён.

Рамана ў 1927 г. абралі сакратаром ячэйкі КПЗБ роднай вёскі. На пачатку 1930 г. яго арыштавалі і 27 ліпеня прысудзілі да 2 гадоў турмы. Вызваліўшыся ў 1932 г., за стойкасць і адданасць справе ён быў абраны сакратаром Дамачаўскага райкома КПЗБ. Але, на жаль, яму нядоўга давялося працаваць. У чэрвені 1933 г. Раман быў зноў арыштаваны і 29 лістапада асуджаны на 8 гадоў турмы. Ён вызваліўся ў 1939 г.

Бенядзікта польскія фашысты без усякага суда ў 1937 г. кінулі ў канцлагер у Бярозе-Картузскай, дзе ён страціў здароўе. У гады нямецкай акупацыі Бенядзікт загінуў. Раман памёр у 1971 г.

Павел Антонавіч Руцкі нарадзіўся ў 1912 г. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1931 г. арыштаваны. Вызваліўшыся ў

Р.А.Зінчук. Турэмнае фота.

П.А.Руцкі. Турэмнае фота.

1932 г. з турмы, стаў на чале райкома. У 1938 г. — зноў арышт і прысуд на 10 гадоў турмы, у 1939 г. — вызваленне. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам у атрадзе Чарнака.

Іван Васільевіч Салейка нарадзіўся 14 сакавіка 1907 г. у в. Ямна Косіцкай гміны. З 1930 г. актыўна ўдзельнічаў у рэвалюцыйнай барацьбе. У 1931—1932 гг. быў тэхнікам Прыгародскага райкома КСМЗБ, распаўсюджваў камуністычную літаратуру, удзельнічаў у партыйных сходах. 4 красавіка 1932 г. быў арыштаваны і 7 снежня ў Брэсце асуджаны на 8 месяцаў турмы. У верасні 1934 г. за распаўсюджванне камуністычнай літаратуры быў зноў арыштаваны і 28 лютага 1935 г. асуджаны на 4 гады. 17 снежня 1936 г. быў вызвалены па амністыі. У 1937 г. Іван Салейка быў абраны сакратаром Падгародскага райкома КПЗБ. 12 красавіка 1938 г. яго арыштавалі і за прыналежнасць да Камуністычнай партыі асудзілі на 7 гадоў турмы. Верасень 1939 г. прынёс яму вызваленне.

З першага дня Вялікай Айчыннай вайны І.В.Салейка падпольшчык, антыфашыст. Ён быў адным з актыўных арганізатараў партызанскага атрада імя Чарнака Брэсцкага злучэння, камандзірам роты, затым старшынёй міжраённага антыфашысцкага камітэта, а з красавіка 1944 г. да вызвалення Брэста — камісарам партызанскага атрада імя І.Каліева.

А.П.Саванеўскі. Турэмнае фота.

Іван Васільевіч Салейка памёр у 1951 г. Тэльмінскі сельскі Савет увекавечыў памяць героя: яго іменем назвалі адну з вуліц в. Тэльмы, а ў 1988 г. там устанавілі мемарыяльную дошку.

Аляксандр Паўлавіч Саванеўскі нарадзіўся ў 1902 г. у в. Івахнавічы. У 1920 г. Алесь Саванеўскі ўступіў у Чырвоную Армію. У 1921 г. вярнуўся ў роднае сяло і стаў заснавальнікам Чарнаўчыцкага райкома КРПП, а затым КПЗБ.

Разам з ім ішлі адданыя сыны і дочкі народа і браты Рыгор і Радзівон Антанюкі, Рыгор Мікалаевіч Кузаўко, Зміцер Міхайлавіч Тромза, Сцяпан Рахлей, Пётр Кучур, Цімафей Гацкевіч і іншыя. Па пачыне А.Саванеўскага неўзабаве ўтварыліся падпольныя ячэйкі ў вёсках Блювінічы, Покры, Вялікая і Малая Курніцы, Скорбічы, Косічы, Рэчыца і многіх іншых.

Па ініцыятыве Чарнаўчыцкага райкома КПЗБ 20 лютага 1927 г. у в. Булькова была арганізавана першая масоўка, якая перайшла ў дэманстрацыю. Алесь Саванеўскі быў на ёй галоўным аратарам. У жніўні 1927 г. за прыналежнасць да КПЗБ яго асудзілі на 4 гады турмы. Аднак у сярэдзіне 1927 г. пад націскам народа ўрад мусіў абвясціць амністыю. Сярод вызваленых быў і А.Саванеўскі.

У студзені 1932 г. зноў арышт. У вялікім палітычным працэсе над 32 камуністамі і камсамольцамі Заходняй Беларусі А.Саванеўскі атрымаў 6 гадоў турмы. На пачатку 1938 г. ён выйшаў з турмы зусім хворы, з адкрытай формай сухотаў, і памёр у 1941 г.

Васіль Сцяпанавіч Яцэвіч разам з бацькамі быў у ліку бежанцаў у Расіі, вярнуўся на радзіму ў 1922 г. і апынуўся сярод сацыяльных несправядлівасцей польскага акупацыйнага рэжыму. Васіль быў упэўнены, што працоўны народ можа дабіцца вольнага жыцця толькі ў барацьбе на прыкладзе рускай рэвалюцыі. З дапамогай верных сяброў — Аляксандра Саванеўскага, Зміцера Тромзы, Мікалая Плячко — Васіль Яцэвіч уступае ў КПЗБ. Развіццё рэвалюцыйнага руху насцярожвала ўлады. На пачатку мая 1926 г. дэфензіва нанесла першы ўдар па партыйнай арганізацыі. Арышты ахапілі многія вёскі, былі арыштаваны стваральнікі падполля: у в. Чарнаўчыцы — Станіслаў Ерузелімскі, Павел Іларыёнавіч Барысаў, Бембель Мееравіч Лагоціч, Іван Паўлавіч Трафімук, Сямён Рыгоравіч Людыцкі, Іосіф Паўлавіч Рачкоўскі;

у в. Амяліна — Васіль Іосіфавіч Кузаўко, Рыгор Сяргеевіч Дзяцел, Андрэй Зіноўевіч Кузаўко; у вёсцы Падлессе — Міхаіл Емяльянавіч Бабрук, Сямён Трафімавіч Шалонік; у вёсцы Селяхі — Іван Лук'янавіч Козел, Васіль Якаўлевіч Гуцік; у вёсцы Івахнавічы — Кірыл Філімонавіч Гацкевіч.

Следства працягвалася больш за 10 месяцаў. Усе былі абвінавачаныя ў распаўсюджанні камуністычных лістовак, арганізацыі мітынгаў і масовак з заклікамі не плаціць урадавыя падаткі.

27 чалавек аддалі суду, які праходзіў у Брэсце з 15 па 21 лютага 1927 г. Нягледзячы на ўсе старанні шпікаў, доказы былі недастатковыя. Але суд, каб не страціць годнасці, усё ж такі прыгаварыў 14 чалавек да 2—4 гадоў турмы. Астатнія 13 за недахопам доказаў былі вызваленыя прама ў зале суда.

Пасля прыходу Чырвонай Арміі распачалося новае жыццё. У 1939 г. Васіль Сцяпанавіч быў абраны старшынёй Турнянскага сельскага Савета. На гэтай пасадзе яго застала вайна. Ізноў давялося ісці ў падполле. Не здолеўшы схапіць В.С.Яцэвіча, фашысты ўзялі заложніцай яго жонку. Давялося пакінуць на чужых людзей траіх дзетак, старэйшай дачцэ было толькі 10 год. На пачатку зімы 1942 г. мясцовыя паліцаі схапілі Яцэвіча. Жонку адпусцілі. У канцы мая 1942 г. Васіля Яцэвіча расстралялі ў брэсцкай турме.

Васіль Давыдавіч Бысюк нарадзіўся ў вёсцы Неплі (зараз у складзе Клейнікаўскага сельскага Савета). У 1923 г. дваццацігадовы Васіль даведаўся, што ў вёсцы існуе ячэйка КПЗБ, і адразу уступіў у партыю. На падпольнай рэвалюцыйнай працы ён сустрэў выдатных людзей — Сямёна Андрэевіча Дубовіка і Веру Харужую, якая ў 1924 г. прысутнічала на партыйным сходзе ў вёсцы Неплі і прапанавала абраць Васіля Бысюка сакратаром ячэйкі КПЗБ. На пачатку 1928 г., каб пазбавіць Васіля ад арышту, ЦК КПЗБ накіраваў яго ў Мінск, у спецшколу КПЗБ. У Мінску ён атрымаў вестку, што Брэсцкая партыйная арганізацыя абрала яго дэлегатам на Першы з'езд КПЗБ, які адбыўся ў ліпені 1928 г. у санаторыі непадалёк ад Оршы. Пад мянушкаю Барон Васіль Бысюк актыўна ўдзельнічаў у з'ездзе: выступаў у спрэчках, увайшоў у камісію па сялянскім пытанні, вакол якога адбылася найбольш гарачая дыскусія. Пад час лютаўскіх масавых арыштаў 1931 г. В.Бысюка схапілі і ў складзе групы з 25 чалавек аддалі суду, які адбыўся ў Навагрудку. Васіля асудзілі на 6 гадоў турмы. Віленскі апеляцыйны суд 26 чэрвеня 1932 г. скараціў гэты тэрмін да двух гадоў, і Васіль хутка выйшаў на волю. Пасля ўз'яднання Беларусі В.Бысюка абралі старшынёй сельскага Савета. Але неўзабаве выбухнула вайна. Ужо на досвітку 22 чэрвеня фашысты былі ў Клейніках. Васіль Давыдавіч адразу пайшоў у падполле. Усе яго сваякі ў гады існавання КПЗБ дапамагалі камуністам, радаваліся прыходу савецкай улады. Гэта ведалі мясцовыя здраднікі, якія імкнуліся выслужыцца перад новымі гаспадарамі. Над сям'ёй Бысюка навісла пагроза смерці. З вёскі Неплі яны пераехалі ў Рэчыцу ў прыгарадзе Брэста. Васіль Давыдавіч часта наведваўся да сям'і, і яго высачыў мясцовы солтыс. В.Д.Бысюка схапілі ўначы. Яго доўга і жорстка катавалі, а пасля кінулі азвярэлым аўчаркам. Так загінуў верны сын Беларусі. Арыштавалі і яго жонку Ганну, таксама члена КПЗБ. Яе замучылі ў гарадской бальніцы. Магілы іх невядомыя. Іх прах прыняла зямля беларуская, якую яны любілі, за якую змагаліся і з якою злучыліся назаўсёды.

* * *

У 1924 г. у Брэсцкім раёне быў створаны падпольны камітэт КСМЗБ. Пад сцягам камсамола маладое пакаленне змагалася за адзінства Беларусі. У вёсках узнікалі камсамольскія ячэйкі. Польская дэфензіва і паліцыя не сядзелі склаўшы рукі. Першага лютага 1927 г. распачаліся павальныя вобыскі, якія пераходзілі ў пагромы. Не ўсе камсамольцы былі дасведчанымі ў падпольнай барацьбе, многія недаацэньвалі канспірацыю. У рукі паліцыі трапілі лістоўкі, брашуры, кнігі сацыялістычнага накірунку, чырвоная тканіна, якая таксама лічылася рэчавым доказам злачынства. Было арыштавана больш за 50 чалавек, 15 з якіх аддадзена суду:

АНДРАЮК Пётр Яўгенавіч, 23 гады, з в. Шчытнікі,

БАХМАТ Мікалай Канстанцінавіч, 22 гады, з в. Смуга,

БЫСЮК Васіль Давыдавіч, 24 гады, з в. Нэплі,

ДУБЕНЮК Аляксандр Гаўрылавіч, 23 гады, з в. Нехалсты,

КЛІМУК Міхаіл Пятровіч, 26 гадоў, з в. Шумакі,

КЛІМУК Сямён Васільевіч, 23 гады, з в. Нехалсты,

КЛІМУК Фёдар Якаўлевіч, 25 гадоў, з в. Нехалсты.

КОБАК Іван Антонавіч, 23 гады, з в. Церабунь,

Іван Андрэевіч Чарнегель, першы сакратар камсамольскай арганізацыі в. Прыбарава.

Макар Яфімавіч Хамічук, першы старшыня сельсавета ў в. Прыбарава.



Камсамольцы-падпольшчыкі: Іван Раманавіч Лоша, намеснік першага сакратара камсамольскай арганізацыі в. Прыбарава; Міхаіл Мацвеевіч Кучук, член першай камсамольскай арганізацыі, забіты паліцаямі ў в. Тамашоўка.

КОЗЕЛ Фёдар Карнілавіч, 22 гады, з в. Кусцічы,

ЛАШ Мікалай Андрэевіч, 23 гады, з в. Казловічы — пазней зрабіўся правакатарам,

МІСАК Ігнат Канстанцінавіч, 23 гады, з в. Смуга,

САРОКА Аляксандр Іларыёнавіч, 29 гадоў, з в. Клейнікі,

ШАРКО Яфім Канстанцінавіч, 22 гады, з в. Неплі,

ШАЎЧУК Андрэй Андрэевіч, 23 гады, з в. Кавердзякі.

Судовы разгляд справы праходзіў у Брэсце з 19 па 21 снежня. Гэта быў першы буйны працэс над камсамолам Брэсцкага раёна. На судзе хлопцы трымаліся па-баявому, выкрыквалі лозунгі за адзінства Беларусі, за сусветную пралетарскую рэвалюцыю, супраць вайны і фашызму. 12 чалавек былі асуджаныя на розныя тэрміны пазбаўлення свабоды.

* * *

Яўгенія Цярэнцьеўна Бабёр нарадзілася ў 1913 г. у вёсцы Шумакі Брэсцкага раёна. У 1930 г. уступіла ў камсамол, а ўжо ў наступным годзе — у КПЗБ. У канцы 1931 г. у Варшаве была захоплена частка архіва КПЗБ, у выніку чаго распачаліся арышты. 20 красавіка 1932 г. арыштавалі і Яўгенію Бабёр. Але яна не страціла самавалодання. Аднойчы на допыце Яўгенія заявіла следчаму: «Турма не для мяне, сядзець я не маю намеру, я ўцяку». Следчы і пракурор лічылі гэта пустымі словамі і памыліліся. 9 лістапада 1932 г. Я. Бабёр збегла з турмы. Хлапчукі-газетчыкі крычалі на вуліцах, што камуністка раззброіла варту і збегла з турмы.

Увесь апарат вышуку быў кінуты на пошук мужнай жанчыны. Многіх хвалявaў яе лёс. Ёй прапаноўвалі пераехаць у іншую акругу на падпольную працу ці выехаць за мяжу. Яўгенія адмовілася: «Сталіца мая — родныя Шумакі, а месца жыхарства — блакітнае Прыбужжа...».

Але знайшоўся здраднік, і 9 красавіка 1933 г. яе схапілі. Працэс, па якім яна мусіла праходзіць, ужо скончыўся, яе судзілі адну.

Суд адбыўся 20 чэрвеня 1933 г. Віна яе была зусім не даказана, і суд даў ёй 2 гады турмы хутчэй за дзёрзкасць, чым за злачынства. Неўзабаве Я.Бабёр выйшла на волю і вярнулася да працы.

За гады барацьбы на тэрыторыі Брэстчыны выросла цэлае пакаленне людзей, якія ставілі нацыянальныя інтарэсы вышэй за ўласныя. Многіх з іх арыштоўвалі, катавалі, збівалі польскія ўлады. Некаторыя перажылі несправядлівыя абвінавачанні савецкай улады. У гады Вялікай Айчыннай вайны яны зноў даказалі сваю адданасць Беларусі.

В.П.Ласковіч.

Дакументы сведчаць

ДАНЯСЕННЕ БРЭСЦКАГА ПАВЯТОВАГА КАМЕНДАНТА ПАЛІЦЫІ Ў ПАВЯТОВАЕ СТАРОСТВА АБ СВЯТКАВАННІ НАСЕЛЬНІЦТВАМ 1 МАЯ

11 ліпеня 1925 г.

Сакрэтна

В соответствии с устным поручением пана старосты сообщаю, что, как установлено тайным сыском, население здешнего повета в связи с рабочим праздником 1 Мая не работало в этот день в следующих местах:

Лыщицкая гмина. В деревне Люта — 4 семьи, Бояры — 25 семей, Лыщицы — 30 семей, Малые Щитники — 12 семей, Большие Щитники — 5, Сычи — 2, Яховичи — 5, Погубятичи — 6 семей.

Значительная часть населения из Мотыкальской гмины и очень много лиц из Косицкой гмины принимали участие в демонстрации в Бресте. Что касается остальной территории, то во всех гминах здешнего повета царило спокойствие и население за исключением нескольких человек работало в день 1 Мая.

Поветовый комендант

Пераклад з польскай мовы.
Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 720. Л. 17.

СПРАВАЗДАЧА ЧЭРНЕНСКАГА ПАЛІЦЭЙСКАГА ПАСТАРУНКА БРЭСЦКАГА ПАВЕТА АБ РАЗГЛЯДЗЕ АБСТАВІН АНТЫФАШЫСЦКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ МОЛАДЗІ Ў ВЁСЦЫ СКОРБІЧЫ КОСІЦКАЙ ГМІНЫ

16 ліпеня 1930 г.

16 июля 1930 г. я, комендант полицейского участка в Чернях Косицкой гмины, проводя следствие вместе с пшодовником следственной службы Рутковским Адамом из следственного отдела государственной полиции в Бресте над Бугом по делу о коммунистической демонстрации, состоявшейся 13 июля с.г. в д. Скорбичи Косицкой гмины Брестского повета, установил следующее:

13 июля с.г. в 14 часу в д. Скорбичи Косицкой гмины приехала молодежь из разных окрестных деревень, как Блювиничи и Покры Турнянской гмины, Ковердяки, Козловичи и Ставичи Мотыкальской гмины, Бердичи и хутор Черни Косицкой гмины, в количестве 40 человек обоего пола, по-видимому, с целью устройства танцевального вечера.

После часового танцевального вечера, организованного во дворе Елизаветы Игнатюк, молодежь, присутствовавшая на вечере, по призыву Стефана Козла из дер. Блювиничи, двинулась с пением «Интернационал» через д. Скорбичи по направлению к дер. Чернаки, подняв вверх подготовленный коммунистический транспарант с антиправительственными лозунгами, которые несли Козел Стефан и Паднюк Михаил из д. Покры.

В ходе следствия установлено, что инициатором этой демонстрации был Гацкевич Томаш, житель д. Блювиничи Турнянской гмины, а помощниками были: Козел Стефан, Гришко Ян из д. Блювиничи, Паднюк Михаил, Мизерья Михаил из д. Покры Турнянской гмины и Малыха Григорий из д. Бердичи Косицкой гмины — все известные и зарегистрированные коммунистические деятели из Чернавчицкого РК КСМЗБ, которых задержали (и передали) судебным органам. Остальные лица, принимавшие участие в указанном шествии, были: Богдан Василий, Трычик Николай из хутора Черни, Малыха Дмитрий из хутора Бердичи Косицкой гмины, Дмитрук Николай из д. Блювиничи Турнянской гмины, Антонюк Мария, Вишневецкая Надежда, Добролинская Ольга, Климук Ксения, Вишневецкая Екатерина, Козловский Михаил, Кондратюк Александр, Кушнерук Владимир, Гурец Михаил из д. Ковердяки Мотыкальской гмины, Головко Андрей, Завадский Адам, Лащ Алексей из дер. Козловичи Мотыкальской гмины, Пивоварчик Алексей, Добролинский Адам и Добролинский Владимир из д. Ставичи Мотыкальской гмины, Грогорович Василий из дер. Покры Турнянской гмины, также заподозренные в принадлежности к коммунистической организации, но как менее важные деятели были освобождены.

Инициатор и организатор шествия Гацкевич Томаш 13 июля с.г. встретил в дер. Блювиничи Гришко Яна, дал ему транспарант с коммунистическими лозунгами и велел ему после полудня явиться в деревню Вистичи Мотыкальской гмины, где, как он сообщил, должна быть проведена коммунистическая демонстрация. Так как в это время в Вистичах находился поли-

цейский патруль, собравшаяся там молодежь по указанию Гацкевича Томаша и Малыхи Григория направилась в дер. Скорбичи, где должна была состояться танцевальная вечеринка.

В Скорбичах также по инициативе Гацкевича Томаша была умышленно организована танцевальная вечеринка на дворе Игнатюк Елизаветы посреди деревни, а когда собралось уже много лиц, то Козел Стефан (помощник Гацкевича) позвал молодежь, чтобы она пошла на другой конец деревни, объясняя, что здесь нехорошо танцевать, тогда вся молодежь по этому призыву направилась демонстрацией через деревню, неся коммунистический транспарант с антиправительственными лозунгами и распевая революционные песни, как «Интернационал», «Смело, товарищи, в ногу», «Вставай против нас, Европа». В конце деревни молодежь разошлась.

После того, как демонстрация разошлась, Козел Стефан снял транспарант с палки и забрал его с собой, а затем, возвращаясь домой в обществе Гришко Яна и Паднюка Михаила, спрятал его в кустах над р. Лесной недалеко от дер. Скорбичи, думая позже его забрать. Во время допроса Козел признался, указав место, где спрятан транспарант. Затем транспарант был взят пшодовником Гонским Яном и приложен к делу как вещественное доказательство. На этом транспаранте были написаны следующие лозунги: «Да здравствует антифашистский день молодежи — 13 июля!», «Долой империалистическую войну против СССР!», «Да здравствует Коммунистический Союз Молодежи Западной Белоруссии!»

Гацкевичу, как инициатору, предъявили обвинения, но он сам в этом не признался. Во время обыска у него нашли блокнот с разными записями, которых прочитать невозможно, так как все написано сокращенно — шифром, а он объяснить отказался. Нашли также письма из Советской России и его собственные, из которых видно, что он принадлежит к Компартии и занимает в ней видное место, в чем он также не признался.

Отмечаю, что дер. Скорбичи, в которой состоялась коммунистическая демонстрация, слывет спокойной деревней и членов Компартии или сочувствующих ей в деревне не имеется...

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобл. Ф. 93. Воп. 1. Спр. 1112. Л. 15.

ДАНЯСЕННЕ БРЭСЦКАГА ПАВЯТОВАГА СТАРАСТЫ ПАЛЕСКАМУ ВАЯВОДСКАМУ ЎПРАЎЛЕННЮ АБ РАСПАЎСЮДЖВАННІ КАМУНІСТЫЧНЫХ ЗАКЛІКАЎ І ТРАНСПАРАНТАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ПАВЕТА

30 снежня 1933 г.

В связи с распоряжением № БП 9-а от 9 декабря с.г. сообщаю, что в ночь с 19 на 20 декабря с.г. в дер. Франополь Каменица-Жировецкой гмины вывешено 3 коммунистических транспаранта, а именно: первый — с лозунгами, написанными от руки. На красном полотне: «Не давайте брата в руки палача-полицейского, гоните секвестраторов, забирайте хлеб и дрова у помещиков!», второй — с надписями, начерченными белой краской на желтой бумаге: «Долой палача Пилсудского!», «Долой полевые суды и виселицы! Да здравствует Советская Россия!» и третий — с белой надписью на черной бумаге: «Вечная память несчастному борцу тов. Женьке. (Речь идет о С.Богданчуке (Женьке), убитом полицией. Долой мучителей наших товарищей!»

В ночь с 19 на 20 декабря 1933 г. в дер. Заболотье Каменица-Жировецкой гмины неизвестными лицами вывешен коммунистический транспарант с лозунгами: «Все на борьбу против усмирений 20 декабря! Ни гроша налога, ни шагу, ни шарварки! Долой полевые суды! Да здравствует революция!».

В это же время на дороге, ведущей из Кошилова в дер. Большие Косичи, на вербе вывешен транспарант с лозунгами: «Да здравствует день протеста! Долой фашистское правительство! Долой террор над политзаключенными! Долой карательные отряды! Товарищи, не платите налогов фашизму! Да здравствует рабоче-крестьянское првительство! КПЗБ».

В это же время на Влодавском шоссе на придорожном дереве вывешен транспарант с лозунгами: «Честь и память погибшему революционеру Женьке, которого убили фашистские палачи. Долой террор политзаключенных! Да здравствует рабоче-крестьянское правительство! КПЗБ».

19 декабря с.г. на площади по ул. Ягелонской, № 66 вывешен плакат, написанный от руки, с лозунгами на еврейском языке: «Долой положение об арбитраже!» 20-го все на забастовку, выступим под знаменем Коммунистического Союза Молодежи!».

В это же время на дороге между Вулькой Заславской и Каменец-Жировицами вывешен транспарант с лозунгами на русском языке: «Все на борьбу против усмирений 20 декабря, ни гроша и ни зерна налога, ни шагу на шарварки! Долой виселицы и полевые суды польских палачей! Рубите все дрова в лесах и забирайте зерно в панских амбарах!» Другой транспарант вывешен на доме Жминко Константина в дер. Вулька Заславская с такими же лозунгами.

Кроме этого, 18 и 19 декабря разбросано несколько воззваний в селении Влодавка, призывающих к неуплате государственных займов, а также в Бресте, направленных против положения об арбитраже.

Расследование по выявлению виновных продолжается.

За поветового старосту Махницкий.

Пераклад з польскай мовы.
Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 9. Спр. 2553. Л. 35.

ДАНЯСЕННЕ БРЭСЦКАГА ПАВЯТОВАГА СТАРАСТЫ ПАЛЕСКАМУ ВАЯВОДСКАМУ ЎПРАЎЛЕННЮ АБ РАСПАЎСЮДЖВАННІ Ў ДАМАЧАЎСКАЙ ГМІНЕ КАМУНІСТЫЧНЫХ ЗАКЛІКАЎ У СУВЯЗІ З МІЖНАРОДНЫМ ДНЁМ МОЛАДЗІ

4 верасня 1935 г.

Сакрэтна

Исполняя указание от 22 августа 1935 г.№ БА 16-д, сообщаю, что кампания Компартии по распространению литературы в связи с днем 1 сентября, ежегодным празднованием Международного Юношеского дня, на территории Брестского повета проявилась в 5 местностях в форме разбрасывания и расклеивания коммунистических листовок, а именно:

1. Ночью 1 сентября между дер. Харсы и Литвинки Домачевской гмины на дороге разбросано 14 воззваний;

2. В ночь на 1 сентября в дер. Орхово Домачевской гмины вывешено 2 воззвания;

3. В ночь на 1 сентября в дер. Приборово Домачевской гмины вывешено 5 воззваний;

4. В ночь на 1 сентября на хуторе Томашовка Домачевской гмины вывешено 2 воззвания;

5. В ночь на 3 сентября на железнодорожных путях около д. Комаровка Домачевской гмины найдено 1 воззвание.

Кроме этого, других выступлений не наблюдалось и было спокойно.

За поветового старосту вице-староста Фр.Усаевич.

Пераклад з польскай мовы.
Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 10. Спр. 732. Л. 156.

БРЭСТЧЫНА Ў 1939—1941 гадах

Пачатак 2-й сусветнай вайны

1 верасня 1939 г. гітлераўская Германія напала на Польшчу. Нямецкія танкавыя і мотамеханізаваныя дывізіі перайшлі граніцу і ў некалькіх напрамках пачалі хутка рухацца ў глыб польскай дзяржавы. Гераічныя старонкі ў гісторыю барацьбы польскага народа з нямецка-фашысцкімі войскамі ўнеслі абаронцы Вестэрплятэ, Хеля, Гдыні, Модліна, Варшавы. Былі сярод іх і выхадцы з Брэсцкага раёна, якіх яшчэ перад вайной прызвалі ў Войска Польскае. Па-рознаму склаўся іх лёс. Нехта трапіў у нямецкі палон, многія загінулі, некаторыя змаглі вярнуцца дадому. Доўгі час пра гэтыя ваенныя падзеі не ўспаміналі. Вайна была быццам невядомай. Толькі ў апошні час пачала аднаўляцца сацыяльная справядлівасць у адносінах да яе ўдзельнікаў. Сярод тых, хто змагаўся на гэтай «невядомай вайне», жыхары Брэсцкага раёна, якія атрымалі ад польскага ўрада медалі «Удзельнік абарончай вайны Польшчы ў 1939 г.». Вось іх прозвішчы:

АБЛАМСКІ Рыгор Карнілавіч, н. у 1916 у в. Астрамечава.

АНУФРЫЮК Міхаіл Рыгоравіч, н у 1911 у в. Дубіца.

ВАСІЛЮК Мікіта Сцяпанавіч, н. у 1909 у в. Медна.

ГАПАНЮК Ігнат Пятровіч, н. у 1912 у в. Збунін.

ГУК Іван Сямёнавіч, н. у 1914 у в. Лышчыцы.

ДАБЫШУК Кірыла Цітавіч, н. у 1913 у в. Яцкавічы.

ДАНІЛЮК Пётр Пятровіч, н. у 1916 у в. Астрамечава.

ДЗЕМЯДЗЮК Павел Сямёнавіч, н. у 1912 у в. Дубіца.

ДЗЕНІСЮК Сяргей Тарасавіч, н. у 1916 у в. Ляплёўка.

ЛІЦЮК-ЛЯШУК Андрэй Максімавіч, н. у 1911 у в. Вялюнь.

МАРТЫНЮК Марк Герасімавіч, н. у 1915 у в. Скокі.

МАЦКЕВІЧ Даніла Фёдаравіч, н. у 1911 у в. Лышчыцы.

МІХАЛЮК Аляксей Мацвеевіч, н. у 1914 у в. Вялікія Шчытнікі.

МІШУК Іван Піліпавіч, н. у 1913 у в. Ліпінкі.

МЯШКО Рыгор Фёдаравіч, н. у 1915 у в. Чарнаўчыцы.

ПЯТРОВІЧ Мікалай Якаўлевіч, н. у 1915 у в. Рагозна.

САЙКО Іван Георгіевіч, н. у 1912 у в. Страдзеч.

САЛАДУХА Іван Рыгоравіч, н. у 1917 у в. Церабунь.

СІДАРУК Георгій Сямёнавіч, н. у 1915 у в. Казловічы.

УЮН Мікалай Антонавіч, н. у 1913 у в. Страдзеч.

ЦЯРЭШКА Іван Сцяпанавіч, н. у 1912 у в. Харсы.

ШАЙКО Іван Майсеевіч, н. у 1913 у в. Страдзеч.

ШАШКО Іван Іванавіч, н. у 1916 у в. Страдзеч.

ШУМСКІ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1907 у в. Чарнаўчыцы.

ШЭЙДА Міхаіл Данілавіч, н. у 1916 у в. Буякі.

ЯКАВІК Іван Іосіфавіч, н. у 1912 у в. Люта.

ЯКАВУК Мікалай Лявонцьевіч, н. у 1909 у в. Шчытнікі.

Пахмурным днём 1 верасня 1939 г. жыхары прылягаючых да Брэста вёсак маглі бачыць самалёты, якія ляцелі з захаду, бамбёжку і пажары ў горадзе. Пачалася другая сусветная вайна. Асаблівай трывогі наконт вайны Германіі з Польшчай мясцовае насельніцтва не выказвала. Праз некалькі дзён у Сычах, Цюхінічах, Шчэбрыне і ў другіх вёсках з'явіліся наступаўшыя на Брэст з Усходняй Прусіі нямецкія атрады. Яны пачалі асаду Брэсцкай крэпасці. Жыхары Палесся, якія былі мабілізаваны і служылі ў гэты час у Войску Польскім, удзельнічалі ў баях з нямецкімі захопнікамі. Сярод іх, напрыклад, быў Ф.У.Грычук з в. Рагозна, другія жыхары Брэсцкага раёна. 14 верасня 1939 г. германскія салдаты ўвайшлі ў Брэст, а 17 верасня захапілі асноўныя фарты крэпасці.

У верасні 1939 г. нямецкія ўлады вялі сябе ў адносінах да насельніцтва Брэстчыны спакойна, актывістаў не праследавалі, рыхтаваліся да перадачы ўлады Саветам, стваралі сетку разведагентуры. За тыдзень да нападу Германіі на Польшчу 23 жніўня 1939 г. у Маскве быў падпісаны Дагавор аб ненападзенні паміж Германіяй і Савецкім Саюзам. У сакрэтным дадатковым пратаколе да гэтага дагавора ўказвалася, што пытанне аб захаванні незалежнасці Польскай дзяржавы «можа быць канчаткова высветлена толькі на працягу далейшага палітычнага развіцця», а «граніца сфер інтарэсаў Германіі і СССР будзе прыблізна праходзіць па лініі рэк Піса, Нараў, Вісла і Сан». Такім чынам, лёс Польшчы быў вырашаны.

Уз'яднанне

У адпаведнасці з дагаворам 17 верасня 1939 г. часці Чырвонай Арміі перайшлі савецка-польскую граніцу. Да гэтага часу польская адміністрацыя на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў выніку паражэння польскіх войскаў і наплыву бежанцаў была поўнасцю дэзарганізавана.

З весткай аб уступленні Чырвонай Арміі на землі Заходняй Беларусі многія паны ўцяклі, частка польскага насельніцтва, узброіўшыся, пайшла ў лясы. У сваю чаргу з мэтай садзейнічання ўстанаўленню савецкай улады, пераадольвання супраціўлення палякаў з ліку мясцовых жы-

хароў, з ліку падпольшчыкаў пачалі ствараццa ўзброеныя групы. Так, актывісты з Трышына, Пугачова і другіх блізкіх да Брэста вёсак захапілі і раззброілі абоз 14-га камісарыята брэсцкай паліцыі і іх памочнікаў, якія імкнуліся павярнуць на Ковельскую шашу і выехаць у Румынію.

22 верасня 1939 г. Чырвоная Армія ўступіла ў Брэст-Літоўск, дзе прайшла змена пастоў нямецкіх і савецкіх войскаў. У той жа дзень было падпісана германа-савецкае камюніке, якое ўстанавіла дэмаркацыйную лінію паміж германскай і савецкай арміямі па рэках Піса, Нараў, Буг, Вісла, Сан. Такім чынам, тэрыторыя цяперашняга Брэсцкага раёна стала прыгранічнай.

СУСТРЭЧА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Асобныя воінскія падраздзяленні ўжо 22 верасня прайшлі па навакольных вёсках. Сустрэча Чырвонай Арміі ў Брэсцкім раёне, як і ў другіх месцах Беларусі, была трыумфальнай. У Булькове, Ліпінках, па дарозе на Быцень і ў многіх другіх вёсках былі зроблены аркі з зялёных галінак і кветак з чырвонымі сцягамі і транспарантамі. Паднеслі хлеб-соль воінам жыхары вёсак Ямна, Трышын, Вычулкі, Ваўкі. Кветкамі асыпалі чырвонаармейцаў у Сычах, Ліпінках, Радванічах, Дамачава. Людзі імкнуліся дакрануцца да вызваліцеляў. Хлопчыкі крычалі «ўра!», а старыя са слязамі на вачах апускаліся на калені і цалавалі зямлю, па якой прайшлі салдаты. Жанчыны частавалі фруктамі, паілі малаком. Асаблівую актыўнасць пры сустрэчы праявілі члены КПЗБ. Так, у Радванічах арганізатарамі сустрэчы Чырвонай Арміі былі Ф.У. Чараўко і браты Краўчукі, у Франопалі — В.Лобік і С.Панасюк. У Чарнаўчыцах пад кіраўніцтвам А.Саванеўскага адбылося шэсце жыхароў многіх вёсак, якія выйшлі на сустрэчу з воінскімі часцямі. Энтузіазм асноўнай масы жыхароў Брэсцкага раёна тлумачыўся гадамі сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, нізкім узроўнем жыцця ў перыяд рэжыму «санацыі», існуючай пагрозай устанаўлення германскага новага парадку.

ФАРМІРАВАННЕ НОВЫХ ОРГАНАЎ УЛАДЫ. ТЭРЫТАРЫЯЛЬНА-АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ РЭФОРМА

У вясковыя хаты заходзілі агітатары. Стыхійна ўзнікалі мітынгі, на якіх пад кіраўніцтвам ваенных з мясцовых жыхароў фарміраваліся часовыя сялянскія камітэты для садзейнічання і зацвярджэння савецкай улады. У склад часовага камітэта в. Медна, напрыклад, былі выбраны А.М.Бандарук, С.М.Радчук, В.Р.Пальчук, С.В.Васілюк, М.А.Васілюк. Сялянскія камітэты прыступілі да раздзелу памешчыцкіх і прыходскіх земляў, жывёлы, інвентару сярод батракоў, беднякоў, дзяцей-сірот.

Да прыходу Чырвонай Арміі на тэрыторыі Брэсцкага раёна налічвалася 25 памешчыцкіх маёнткаў з 5320 га зямлі. Сялянскія камітэты падпарадкоўваліся часовым упраўленням, створаным у гарадах Заходняй Беларусі на аснове загаду камандуючага войскамі Беларускага фронту камандарма М.Кавалёва ад 19 верасня 1939 г. Першыя афіцыйныя выбары ў мясцовыя валасныя і пасялковыя органы ўлады прайшлі ў кастрычніку 1939 г. Выбіралі мясцовых жыхароў з ліку былых падпольшчыкаў, членаў КПЗБ. Старшынёю Камянец-Жыровіцкага часовага валаснога ўпраўлення быў выбраны, напрыклад, В.П.Ласковіч, а Матыкальскага — В.Ю.Мацвеюк. 16 кастрычніка былі аб'яўлены, а 22 кастрычніка 1939 г. з вялікім пад'ёмам на Брэстчыне прайшлі выбары ў Народны Сход Заходняй Беларусі. Ад горада Брэста і Брэст-Літоўскага

павета было вылучана 46 кандыдатаў, з якіх 33 былі сялянамі. У іх ліку былі В.Ю.Мацвеюк з в. Лышчыцы, В.П.Ласковіч з в. Франопаль, С.П.Гараднячук з в. Камароўка, В.Д.Бісюк з в. Клейнікі, Е.Суржынская з в. Быцень, Ф.Трацюк з в. Аркадзія. Многія з дэлегатаў былі былымі палітзняволенымі польскіх турмаў. 927 пасланцоў, якія сабраліся 28—30 кастрычніка ў г. Беластоку, прагаласавалі за ўстанаўленне савецкай улады і ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Яны выказаліся таксама за нацыяналізацыю зямлі, прамысловасці і банкаў. Народны Сход прыняў рашэнне 17 верасня лічыць Днём вызвалення народаў Заходняй Беларусі. С.П.Гараднячук стаў і членам дэлегацыі на 5-й нечарговай сесіі Вярхоўнага Савета СССР, якая 2 кастрычніка 1939 г. прыняла Закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў састаў Беларускай ССР.

Для тых, хто не падтрымліваў гэтага рашэння, існавала магчымасць выезду ў акупіраваныя немцамі вобласці Польшчы. У адпаведнасці з савецка-нямецкім пагадненнем быў дазволены пераход жадаючых з савецкай на германскую тэрыторыю і, наадварот, для ўз'яднання з родзічамі (сваякамі) і па другіх прычынах. Пакідалі Брэстчыну ў асноўным асобы польскай і яўрэйскай нацыянальнасцей. Сярод іх былі памешчыкі, якія паспелі выехаць, напрыклад, пан Суцкі з вёскі Сычы. Да тых, хто застаўся, прымяняліся рэпрэсіўныя меры. Так, быў расстраляны буйны землеўладальнік Кучынскі з в. Чарнаўчыцы, а яго сын выехаў у Польшчу. Выязджалі пераважна прыезджыя палякі: настаўнікі, спецыялісты. Многія мясцовыя польскія сем'і засталіся. З лютага 1940 г. пачалася рэгістрацыя жыхароў далучаных да СССР новых раёнаў і выдача савецкіх пашпартоў. Некаторым асобам было забаронена пражываць на 100-кіламетровай пагранічнай паласе. Былі рэпрэсіраваны прадстаўнікі былой польскай сельскай адміністрацыі. Быў арыштаваны і высланы ў Сібір солтыс з в. Чарнаўчыцы В.Налівайка. Аднак у многіх вёсках, такіх як Клейнікі, Мухавец і другіх, солтысы засталіся жыць. Неабходна адзначыць, што пры вырашэнні лёсу кандыдатаў да высялення вялікае значэнне мелі петыцыі мясцовых грамадзян у абарону іх.

Паступова змяняўся тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Заходняй Беларусі. 4 снежня 1939 г. былі ўтвораны вобласці, у тым ліку і Брэсцкая. Часовыя ўпраўленні былі заменены аблвыканкомамі. У студзені 1940 г. былі створаны раёны. У ліку 18 раёнаў Брэсцкай вобласці былі Брэсцкі і Дамачаўскі. Асноўная маса населеных пунктаў цяперашняга Брэсцкага раёна ўвайшла ў іх склад. Тэрыторыя Брэсцкага раёна ў 1940 г. складала 1044,5, а Дамачаўскага — 491,3 квадратных кіламетраў. Насельніцтва двух новаўтвораных раёнаў налічвала 77 659 чалавек.

У лютым—сакавіку 1940 г. былі сфарміраваны сельскія саветы, а часовыя сялянскія камітэты спынілі сваю дзейнасць. Састаў сельсаветаў у асноўным быў прадстаўлены мясцовымі жыхарамі. У Падлужскі сельсавет увайшлі С.М.Галяка, М.Ф. і Ю.Ф.Лобачы, М.А.Боніяк, М.К.Юхімук. Старшынёй Цюхініцкага сельсавета стаў Я.А.Хоміч, Лышчыцкага — П.Андрэюк, Чэрнінскага — У.Р.Антанюк, Казловіцкага — І.Д.Яркоў і г.д. Пад сельсаветы былі адведзены дамы ў цэнтры сёл. У 1940 г. ва ўсіх сельсаветах Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў, на здзіўленне сялян, былі праведзены тэлефоны, па якіх штодзённа перадаваліся зводкі і прымаліся дырэктывы з Брэста. Работа сельсаветаў кантралявалася і рэгламентавалася. На плечы сельскага кіраўніцтва лёг увесь цяжар

складаных і цяжка выконваемых задач.

Наступныя выбары ў мясцовыя органы ўлады праходзілі 15 снежня 1940 г. Сяляне арганізавана з'явіліся на ўпрыгожаныя жаночымі рукамі ўчасткі і прагаласавалі за сваіх кандыдатаў. Ад Брэсцкага раёна былі выбраны 4 дэпутаты ў абласны савет, сярод якіх быў Ф.І.Дывянчук з в. Закі, усе дэпутаты ў райсавет, 377 дэпутатаў у сельскія саветы. У ліку выбраных у Брэсцкі райсавет дэпутатаў працоўных было многа мясцовых жанчын: П.М.Якубчык з в. Раковіца, В.Д.Мацвеюк з в. Лышчыцы, М.А. Лазіцкая з в. Скокі, А.І. Цішук з в. Казловічы, І.М. Вольская з в. Закі і др.

Кіраўніцтва сельскіх органаў улады было прадстаўлена ў асноўным мясцовымі жыхарамі, на больш высокія пасады назначаліся кадры, якіх прысылалі з усходніх раёнаў. У іх ліку былі першы і другі сакратары Брэсцкага РК КП(б)Б А.М.Дзядзеў і Р.С.Прахін, старшыні Брэсцкага райвыканкома У.К.Скараходаў і Бандаровіч, сакратар Дамачаўскага РК КП(б)Б Б.Шахметаў, загадчык Дамачаўскага райфа П.Абрамаў, загадчык Дамачаўскім райпарткабінетам М.У.Бачурына і многія іншыя. Выключна з прыезджых фарміравалася кіраўніцтва органаў юстыцыі і правапарадку. Пракурор Брэсцкага раёна Д.М.Галаванаў быў накіраваны з Крымскай АССР. З Расіі і ўсходніх раёнаў Беларусі прыехалі начальнік Брэсцкага райаддзела НКВД У.А.Яршоў, начальнік Дамачаўскага РА НКВД А.Ф.Артамонаў, пракурор Дамачаўскага раёна Зуеў, начальнік РАМ Брэсцкага НКВД П.Р.Кавалёў, народны суддзя Брэсцкага раёна М.І.Гулевіч і інш. У Брэсцкім раёне было створана 2 участкі народнага суда.

Арганізацыйную работу ў 1939—1941 гг. ажыццяўлялі камуністы. Яны займалі кіруючыя пасады, фарміравалі партыйныя, савецкія, адміністрацыйныя органы, прымалі рашэнні. У красавіку 1940 г. на ўліку ў Брэсцкай партыйнай арганізацыі было 125 членаў і 134 кандыдаты ў члены КП(б)Б. У Дамачаўскай — адпаведна 59 і 53 чалавекі.

Выключную большасць камуністаў складалі прыезджыя. Былым членам КПЗБ было адмоўлена ў пераводзе ў рады КП(б)Б, а ў 1940 г. было прынята нідзе не надрукаванае рашэнне ЦК КП(б)Б аб прыёме іх у партыю ў індывідуальным парадку. Гэтага гонару ў 1940—1941 гг. дачакаліся нямногія. Папаўненне партыйных радоў ішло марудна. Так, у Дамачаўскай раённай партарганізацыі да жніўня 1940 г. у рады УКП(б) было прынята толькі 2 чалавекі. У найбольш складаных умовах знаходзіліся члены нізавых партыйных арганізацый. Іх кіраўніцтва трапіла пад крытыку вышэйшых органаў і сістэматычна знімалася. У жніўні 1940 г. быў зняты з пасады сакратара партячэйкі ст. Уладава камуніст Кавалёў, а ў перыяд вясенняй справаздачна-выбарчай кампаніі 1941 г. выбраныя сакратары пярвічных партарганізацый склалі 55,5% ад агульнага ліку.

Брэсцкі райком партыі размяшчаўся спачатку ў доме № 25 па вуліцы Леніна (раней вул. Ягелонская), будынак захаваўся да нашых дзён, потым у доме № 18 па вул. Савецкай. Будынак райвыканкома знаходзіўся па вуліцы Савецкіх пагранічнікаў, 29. Сістэма назначэння кіраўнікоў з ліку камуністаў усходніх рэгіёнаў прыводзіла да таго, што ў структурах улады раённага маштабу адчуваўся недахоп кадраў. На абласной партыйнай канферэнцыі вясной 1940 г. А.М.Дзядзеў скардзіўся на тое, што нават у райкоме партыі не хапае работнікаў. Адукацыйны ўзровень партыйных і савецкіх

кіруючых кадраў быў вельмі нізкім. Людзей, якія мелі вышэйшую адукацыю, было вельмі мала. Многія работнікі раённага апарата ўлады, не гаворачы ўжо аб ніжэйшых структурах, не мелі сярэдняй адукацыі. Большасць з іх былі вылучаны на кіруючыя пасады ўпершыню і не мелі неабходных ведаў і практычнага вопыту работы з людзьмі. Некампетэнтнасць часта хавалася за шаблоннымі бюракратычнымі, камандным метадамі кіраўніцтва. Тым не менш аўтарытэт савецкай улады ў 1939—1941 гг. сярод насельніцтва Брэстчыны быў дастаткова высокі.

ІДЭАЛАГІЧНАЯ КАМПАНІЯ

Савецкая ўлада паставіла буйнамаштабныя задачы і шырокія перспектывы. Рэалізацыя іх была немагчыма без магутнай кампаніі ідэалагічнай прапаганды. Галоўная праблема заключалася ў тым, што ў свядомасці жыхароў заходніх раёнаў Беларусі ў кароткі тэрмін павінна было зацвердзіцца тое, што на тэрыторыі СССР фарміравалася на працягу двух дзесяцігоддзяў. У побыце і адпачынку жыхароў Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў з'явілася многа новага, цікавага. Асноўнай формай агітацыйнай работы былі сходы і лекцыі, якія актыўна наведвала мужчынская частка насельніцтва. Напрыклад, 16 лістапада 1940 г. на лекцыі «Другая імперыялістычная вайна і становішча рабочых капіталістычных краін» у Вялікіх Матыкалах прысутнічала 250 чалавек.

Ужо ў снежні 1939 г. былі арганізаваны курсы падрыхтоўкі агітатараў для Брэсцкай вобласці. Ад Брэсцкага павета было паслана туды 100 чалавек. Агітатары раз'язджаліся па вёсках, каб прапагандаваць сталінскую канстытуцыю, перавагу савецкага складу жыцця, кіраваць вывучэннем біяграфіі Іосіфа Вісарыёнавіча і гісторыі камуністычнай партыі. Восенню 1939 г. вёскі разбіваліся на дзесяцідворкі, жыхары якіх збіраліся ў адным з дамоў слухаць агітатара. М.Раінчык з в.Быцень (быў тады пяцікласнікам і выконваў ролю памочніка агітатара) помніць, што на адным з участкаў ён «чытаў артыкул Канстытуцыі, а дэпутат сельсавета, ён жа агітатар, іх каменціраваў. Мог бы агітатар сам чытаць брашуру, але ён быў малапісьменным». У жніўні 1940 г. у Брэсцкім раёне пры сельсаветах існавала 18 агіткалектываў, аб'яднаўшых 412 «агітатараў і чытачоў», а ў канцы 1940 г. ужо 28 агіткалектываў.

Асабліва актыўнай была агітацыйная работа ў перыяд перадвыбарных кампаній. Так, у кастрычніку 1939 г. у Брэсцкім раёне працавала каля 400, а ў снежні 1940 — 600 агітатараў. За кастрычнік—лістапад 1940 г. было прачытана 114 лекцый, праведзена 368 мітынгаў і сходаў. Дзейнасць агітатараў-актывістаў працякала ў складаных умовах. На курсах яны часта дрэнна разумелі рускую мову, а ў раёнах не маглі працаваць, бо адсутнічалі лямпы, а старшыні сельсаветаў імкнуліся выкарыстаць іх на іншай рабоце. Многія агіткалектывы, напрыклад, у Матыкалах, Гершонах, Трышыне існавалі фармальна. Носьбітамі новай ідэалогіі былі прыйшоўшыя на Брэстчыну ў верасні 1939 г. ваенныя. У працэсе непасрэдных кантактаў з імі жыхары Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў даведваліся многа новага аб жыцці СССР. У Чэрску, напрыклад, дыслацыравалася 138-я стралковая дывізія. У часці быў свой духавы аркестр, і вечарамі вясковая моладзь хадзіла да іх у госці. Актыўна запрашалі пагранічнікаў у Матыкалы з праграмамі мастацкай самадзейнасці.

Уся ідэалагічная і культурна-адукацыйная палітыка савецкай улады была накіравана на фарміраванне ў грамадстве зусім новага светапогля-

ду. У працэсе далучэння мас да сацыялістычнага культурнага жыцця, пошуку якіх-небудзь новых, мясцовых рашэнняў не адбывалася. Як і ўсюды, у Брэсцкім і Дамачаўскім раёнах арганізоўваліся хаты-чытальні, чырвоныя куткі, дамы культуры. Страдзецкі сельсавет адвёў, напрыклад, пад хату-чытальню дом выселенага асадніка ў цэнтры вёскі, а ў в. Рэчыца хата-чытальня знаходзілася ў доме селяніна Кандрацюка. У маі 1941 г. у Брэсцкім раёне існавала 18 хат-чытальняў і 2 бібліятэкі. Толькі ў ліпені 1940 г. было адкрыта 8 падобных устаноў у Дамачаўскім раёне. З цягам часу ў многіх хатах-чытальнях, акрамя газет, шашак, шахмат, з'явіліся радыёпрыёмнікі, якія ў той час былі рэдкасцю і стаялі на строгім уліку.

У Лышчыцах адкрыўся дом сацыялістычнай культуры на 300 месцаў, дзе ў верасні 1940 г. была абсталявана стацыянарная кінаўстаноўка. Савецкае кіно стала масавым і папулярным сярод насельніцтва, неад'емным элементам новага сацыялістычнага быту на Брэстчыне. З дапамогай кінаперасовак кіно прыйшло ў самыя далёкія вёскі. Савецкія гукавыя мастацкія і дакументальныя фільмы аказвалі вялікі ўплыў на свядомасць сельскіх жыхароў, якія часта хадзілі па некалькі кіламетраў у зімовую сцюжу, каб паглядзець новую карціну. Пасля прагляду фільма надоўга затрымліваліся, каб абмеркаваць яго і пагаварыць аб жыцці. Большасць вяскоўцаў бачылі кіно ўпершыню, а старыя нават баяліся глядзець. Акрамя кіно, масавы водгук у асяроддзі мясцовага насельніцтва атрымаў такі напрамак ідэалагічнай работы, як развіццё мастацкай самадзейнасці. У свядомасць і побыт жыхароў Палесся ўводзіліся новыя рэвалюцыйныя святы. Старыя, у большасці рэлігійныя, не прызнаваліся і крытыкаваліся. Неабходна адзначыць, што цэрквы і касцёлы не закрываліся, аднак антыклерыкальная прапаганда была актыўная і бесцырымонная. Толькі за красавік 1941 г. у Дамачаўскім раёне было прачытана 20 антырэлігійных лекцый. Найбольш папулярнымі тэмамі ў Брэсцкім і Дамачаўскім раёнах былі: «Рэакцыйная роля царквы», «Царква і шпіянаж». Гэтыя лекцыі, ілюстраваныя перасовачнымі выстаўкамі, фатаграфіямі і дакументамі, наведвала моладзь і не заставалася абыякавай. Напрыклад, у красавіку 1941 г. у в. Пугачова такія лекцыі наведала 200 чалавек, а ў в. Чэрвень Дамачаўскага раёна маладыя перасталі вянчацца ў царкве. Аднак выключэнне рэлігіі са свядомасці людзей было з'явай складанай і хутка вырашыцца не магло. 50% вучняў у рэлігійныя святы не наведвала школу.

Партыйныя і дзяржаўныя органы не шкадавалі сіл і сродкаў на тое, каб увесці ў быт і свядомасць людзей такія даты, як 8 Сакавіка, Дзень МОПРа, Дзень Чырвонай Арміі, Ваенна-Марскога Флоту, Дзень сталінскай канстытуцыі і г. д. Напярэдадні свят у Брэсцкім і Дамачаўскім раёнах праводзіліся гутаркі і даклады з тлумачэннямі. Так, напрыклад, у ліпені 1940 г. напярэдадні Дня Ваенна-Марскога Флоту прачытаны даклады аб чырвоным сцягу, а напярэдадні 5 мая 1941 г. — праведзены гутаркі аб гісторыі і значэнні бальшавіцкага друку і яго ролі ў справе камуністычнага выхавання мас. Новыя галоўныя рэвалюцыйныя святы — 7 лістапада 1939 г. і 1 мая 1940 г. — адзначаліся жыхарамі Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў без прымусу і з вялікім пад'ёмам. Гэты факт сведчыць аб тым, што людзі з павагай адносіліся да савецкай улады. Напрыклад, у в. Прыбарава ўсе жыхары 7 лістапада 1939 г. вывесілі сцягі, на якія пайшлі чырвоныя спадніцы, каптаны і іншыя прадметы дамашня-

га ўжытку. 1 мая 1941 г. сустракалі з песнямі, партрэтамі, сцягамі. З асаблівай дакладнасцю і ўрачыстасцю рыхтаваліся ўлады і жыхары Брэсцкага раёна да гадавіны вызвалення Заходняй Беларусі. Але паступова народны энтузіязм у адносінах да савецкай улады пачаў зніжацца.

НОВАЯ ШКОЛА

У якасці важнейшага ідэалагічнага інстытута разглядалася школа. Невыпадкова ў шырокай сацыяльнай праграме савецкай улады школе адводзілася цэнтральнае месца. Відавочна, што ваенныя дзеянні, змена ўлады, неабходнасць адсялення некаторых вёсак і школ ад дзяржаўнай граніцы з'явіліся прычынай дэзарганізацыі навучальнага працэсу восенню 1939 г. Кіраўніцтва Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў прыклала максімум намаганняў для таго, каб наладзіць сістэму адукацыі па савецкім ўзоры ў кароткі тэрмін. Аддзелам народнай адукацыі вобласці і паветаў было загадана аднавіць заняткі ў школах да лістапада 1939 г. Замест «паўшэхных школ» у раёнах былі арганізаваны пачатковыя і няпоўныя сярэднія школы. Адной з задач новай адукацыйнай палітыкі з'явілася забеспячэнне ўсеагульнага навучання дзяцей. Да пачатку 1940/41 навучальнага года ў Брэсцкім раёне налічвалася больш за 8 тысяч дзяцей школьнага ўзросту. Да ўстанаўлення савецкай улады на тэрыторыі раёна ў школах навучалася 3000 чалавек.

Пад школы адводзіліся лепшыя будынкі. Была адведзена пад школу былая сядзіба Нямцэвічаў у Скоках. У цэнтры вёскі насупраць сельсавета размясціўся школьны будынак у Чэрнях. Пачалося будаўніцтва новых школьных будынкаў, у якіх на грамадскіх асновах актыўна ўдзельнічалі мясцовыя жыхары. Размах школьнага будаўніцтва быў вялікі і цяжкі для выканання, нягледзячы на выдзеленыя на гэтыя мэты значныя сродкі з бюджэтаў раёнаў. У 1941 г. на будаўніцтва школы ў в. Страдзеч, напрыклад, было асігнавана 175 тысяч рублёў і яшчэ 100 тысяч выдзелена на ўнутраны рамонт і абсталяванне.

Спробы будаўніцтва і рамонту школ гаспадарчым спосабам катэгарычна забараняліся. Бытавыя цяжкасці, неабходнасць вырашэння іншых надзённых праблем часта адцягвалі ўвагу кіраўніцтва сельсаветаў ад праблем адукацыі. У дакладной запісцы загадчыка Брэсцкага рана Жукоўскага паведамлялася, што ў Бярозаўцы дом былога лесніка, дзе размяшчалася школа, быў аддадзены пад міжраённую базу загатоўчай канторы жывёлы. У Кавердзяках школьны будынак займала МТС, у Прылуках будаўніцтва школы было спынена з-за адсутнасці лесаматэрыялаў. З-за таго, што не хапала дошак, цвікоў, цэглы, дроту, толю, бляхі, чарапіцы, былі спынены ўнутраныя работы ў многіх школах раёна напярэдадні 1940/41 навучальнага года. У выніку больш чым у двух дзесятках школ рамонт да пачатку навучальнага года не скончыўся.

Планы і графікі будаўніцтва і рамонту школ у Брэсцкім і Дамачаўскім раёнах, як і ва ўсёй вобласці, не выконваліся. Матэрыяльнае забеспячэнне сістэмы адукацыі было нізкім. Паліграфічная база рэспублікі не забяспечвала школы падручнікамі. Катастрафічна не хапала пісьмовых прылад. Чарніл летам 1940 г. не было ні ў продажы, ні на базах. Не хапала сшыткаў, наглядных дапаможнікаў. Школы Брэсцкага раёна восенню 1940 г. не атрымалі 470 партаў. Прычынай такога становішча былі, з аднаго боку, бурны рост школьнай сеткі, з другога — уласцівая савецкай сістэме неарганізаванасць. Часта забывалі заказваць матэрыялы і дапаможнікі, везлі тавары не па

прызначэнні. Аднак у цэлым колькасныя паказчыкі развіцця раённай сістэмы адукацыі былі ўражлівыя. У лютым 1941 г. у Брэсцкім раёне налічвалася 63 школы, у якіх працавала 127 настаўнікаў (да 17 верасня 1939 г. на тэрыторыі раёна было 30 школ з 38 настаўнікамі). Сямігодкі былі адкрыты ў Гершонах, Збірагах (дырэктар Кавальская), Жыровіцкай Камяніцы, Лышчыцах, Астрамечава (дырэктар Гатоўкін), Страдзечах, Церабуні (дырэктар Сяменчанкаў), Пугачове, Сычах, Тэльмах, Рэчыцы (дырэктар Шышкін), Трышыне, Скоках (дырэктар У.М.Кандрацюк), Чарнаўчыцах, Чэрнях (дырэктар І.В.Трацюк). Усяго на канец 1940 г. у Брэсцкім раёне налічвалася 15 няпоўных сярэдніх школ. Неабходна адзначыць, што асноўная частка раённага бюджэту ішла на развіццё сістэмы адукацыі. У 1941 г. з агульнай сумы 3 531 500 рублёў на народную асвету меркавалася выдзеліць 2 216 000 рублёў, што складала 62% ад усяго бюджэту Брэсцкага раёна.

Відавочна, што змест навучання значна змяніўся пасля 17 верасня 1939 г. З 17 студзеня 1940 г. навучанне пераводзілася на адзіныя планы і праграмы, зацверджаныя Наркамасветай БССР. Савецкія праграмы былі больш складаныя за польскія, таму некаторыя класы пакінулі на другі год на той жа ступені. Урокі праводзіліся на рускай мове, якую вучні польскіх школ ведалі дрэнна. Адбылася поўная арганізацыйная і ідэалагічная перабудова жыцця школ. Па ўспамінах вучняў тых гадоў, вучыцца было цікава. Настаўнікі расказвалі пра Кастрычніцкую рэвалюцыю, пра камсамол, калгасы, канстытуцыю, пра папанінцаў і стаханаўцаў.

Буйное развіццё раённай сістэмы адукацыі патрабавала адпаведных кадраў. У Брэсцкі і Дамачаўскі раёны прыехалі выпускнікі савецкіх вышэйшых навучальных устаноў. Старыя настаўніцкія кадры прайшлі перападрыхтоўку. У студзені 1940 г. праводзіліся двухтыднёвыя курсы для настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ Брэста і павета, на якіх вывучалі асновы савецкай педагогікі, Канстытуцыі СССР, рускую і беларускую мовы. Чыталі лекцыі аб міжнародным становішчы і ролі інтэлігенцыі ў жыцці грамадства. У Дамачаўскім раёне ў настаўніцкія рады ўліліся прадстаўнікі польскай інтэлігенцыі, эвакуіраваныя з цэнтральных раёнаў Польшчы, але кадравая праблема ў сістэме адукацыі заставалася вострай. Да пачатку 1940/41 навучальнага года для нармальнай работы школ Брэсцкага раёна не хапала 38 настаўнікаў для няпоўных сярэдніх і 72 — для пачатковых школ. Пачалі рыхтаваць настаўнікаў з ліку выпускнікоў мясцовых няпоўных сярэдніх і сярэдніх школ на кароткатэрміновых курсах (3 і 6-месячных). Узровень падрыхтоўкі гэтай групы настаўніцкіх кадраў быў нізкім. У выніку такой палітыкі палова настаўнікаў Брэсцкай вобласці ў 1940/41 навучальным годзе не мела сярэдняй адукацыі. Значны працэнт складала моладзь, якая працавала ў школе першы год.

Да ведаў пацягнулася і дарослае насельніцтва. На пачатку 1940 г. у Брэсцкім павеце налічвалася больш за 40 тысяч непісьменных і малапісьменных. Для тых, хто на самай справе хацеў вучыцца, савецкая ўлада стварала ўсе умовы. З 1 лютага 1940 г. у Брэсце пачалі працаваць курсы культпрасветармейцаў, у праграму якіх уваходзілі беларуская мова, арыфметыка, канстытуцыя СССР і методыка навучання грамаце. У сярэдзіне сакавіка 67 выпускнікоў гэтых курсаў раз'ехаліся ў раёны на барацьбу з непісьменнасцю. Вячэрнія школы часта ствараліся па жаданні сельскіх жыхароў. К вясне

1941 г. у школах для дарослых Брэсцкага раёна навучалася 4 тысячы чалавек. Актыўна дзейнічалі гурткі па ліквідацыі непісьменнасці ў вёсках Плоска, Новыя Задворцы. У вячэрняй школе пры Чарнянскім сельсавеце ў 1940 г. займалася 40 чалавек. Разам з тым клопаты пераважна аб колькасных паказчыках прывялі да таго, што многія школы існавалі толькі на паперы, другія, напрыклад, у в. Вістычы Матыкальскага сельсавета, — распадаліся. Часта ў якасці педагогаў у вячэрніх школах выкарыстоўваліся людзі малапісьменныя.

Аднак у цэлым развіццё сістэмы адукацыі ў 1939—1941 гг. на Брэстчыне з'явілася адной з заслуг савецкай улады.

РЭАРГАНІЗАЦЫЯ СІСТЭМЫ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ І САЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

Неад'емнай рысай новай палітыкі, закліканай паказаць перавагу савецкай улады, стала функцыянаванне сістэмы аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння. Восенню 1939 г. была ўведзена бясплатная медыцынская дапамога ўсім малазабяспечаным і бяднейшаму сялянству, распрацавана сістэма санітарна-эпідэмічных мерапрыемстваў. Медыцынскую дапамогу атрымалі тыя, хто ніколі раней яе не меў. У Брэсцкім раёне рэзка скараціласа захворванне такімі хваробамі, як сыпны тыф і менінгіт (хоць асобныя выпадкі яшчэ мелі месца). Да верасня 1940 г. у Брэсцкім раёне прафілактычныя прышчэпкі зрабілі 11 315 чалавек, г. зн. чвэрць усіх жыхароў раёна.

У 1941 г. многія сельсаветы Брэсцкага раёна пачалі будаўніцтва лазняў. Разам з тым магчымасць атрымання медыцынскага абслугоўвання выключна па месцы жыхарства стварала пэўныя цяжкасці. Так, рабочыя з Валынкі не маглі атрымаць урачэбную дапамогу ў горадзе. Расла сетка ўстаноў аховы здароўя. Насуперак таму, што рэальныя тэрміны ўводу ў дзеянне фельчарскіх, акушэрскіх, медыцынскіх пунктаў, бальніц (асабліва ў Дамачаўскім раёне) сур'ёзна разыходзіліся з вызначанымі графікамі, поспехі ў гэтай галіне былі значныя. Па паведамленні загадчыка раённага аддзела аховы здароўя Сахарава, у Брэсцкім раёне ў верасні 1940 г. дзейнічалі: бальніца на 15 месцаў, 4 урачэбна-медыцынскія і 3 фельчарскія пункты, пункт аховы здароўя. У гэтых установах працавалі 2 урачы, 28 фельчараў і медыцынскіх сясцёр. У Дамачава к гэтаму часу працавала інфекцыйнае аддзяленне на 15 ложкаў, будавалася бальніца і радзільны дом. Усяго ў Дамачаўскім раёне налічвалася 5 урачоў, 20 медсясцёр, 9 фельчараў і акушэрак.

Палітыка сацыяльнага забеспячэння савецкай улады была накіравана ў першую чаргу на дапамогу непрацаздольным слаям насельніцтва. Мнагадзетныя маці, якія мелі больш 7 дзяцей, з 1 студзеня 1940 г. пачалі атрымліваць штомесячную дзяржаўную дапамогу. Напрыклад, у лістападзе 1940 г. 4000 рублёў атрымала жыхарка з в. Падлужжа Ф.А.Петрачук. Брэсцкі раённы аддзел аховы здароўя за першы год савецкай улады распаўсюдзіў 21 пуцёўку ў санаторыі і дамы адпачынку.

Ужо з лістапада 1939 г. былі прызначаны пенсіі тым грамадзянам, што не мелі іншых сродкаў для існавання. Далей пенсіённае забеспячэнне рэгулявалася нормамі, якія дзейнічалі ў СССР. Усе пенсіі, прызначаныя перад устанаўленнем савецкай улады, былі перагледжаныя. З працоўнага стажу выключалася служба ў жандармерыі, паліцыі і г.д. Былі скасаваны пенсіі па інваліднасці, атрыманай у барацьбе супраць савецкай улады.

ГАНДАЛЬ. БЫТАВЫЯ ПРАБЛЕМЫ

У верасні 1939 г. было аб'яўлена,

што рубель прыраўніваецца да аднаго злотага, а на ўсе прадукты і тавары застаюцца старыя цвёрда ўстаноўленыя цэны.

Гандляры Брэстчыны дружна сабатавалі гэтыя рашэнні, закрылі магазіны і пачалі гандляваць тайна, завышаючы кошт тавараў. Новая ўлада вызначыла гэтыя дзеянні як спекуляцыю і павяла са спекулянтамі вайну. Задача гэта была цяжкая, таму што наладзіць сістэматычную пастаўку тавараў на тэрыторыю Брэсцкай вобласці не ўдавалася. З пачаткам ваенных дзеянняў узніклі праблемы з прадметамі першай неабходнасці, такімі, як хлеб, соль, газ, запалкі, мыла і г.д. На працягу 1940 г. становішча з многімі з гэтых тавараў і прадуктаў так і не нармалізавалася. З 21 снежня 1939 г. адзінай грашовай адзінкай стаў рубель. Грашовая рэформа прывяла да пагаршэння матэрыяльнага становішча нешматлікага заможнага насельніцтва вёскі, бо для абмену вызначалася сума да 300 злотых. На рубяжы 1939—1940 гг. магазіны былі нацыяналізаваны, прыватны гандаль практычна закрыты. У вёсках была арганізавана спажывецкая кааперацыя, праз якую сяляне маглі купіць сельскагаспадарчыя прылады, адзенне і прадаць сваю прадукцыю. Лішчыцкая сельская спажывецкая кааперацыя налічвала, напрыклад, у 1940 г. 14 магазінаў. Праўленне Камянец-Жыровіцкага сельпо складалася з 5 чалавек. Узначаліў яго былы батрак У.Т.Пушкарэвіч. Старшынёй райспажыўсаюза Брэсцкага раёна быў прызначаны прыбыўшы з Магілёўскай вобласці Л.І.Каплун, а Дамачаўскага — С.Ф.Стралкоўскі, які прыехаў са Жлобінскага раёна. Але дзяржаўны гандаль развіваўся марудна і не мог задаволіць патрэбы вясковых жыхароў. Брэсцкі райспажыўсаюз не выканаў планаў па будаўніцтве сельмагаў. Напрыклад, на 1 студзеня 1941 г. з прызначаных да здачы 8 магазінаў не быў закончаны ні адзін.

У 1940—1941 гг. у Брэсцкім і Дамачаўскім раёнах адчуваўся недахоп пшанічнай мукі, цукру, крупы, рыбы, кандытарскіх вырабаў, чаю, перцу. У вёсцы Забалацце, напрыклад, у маі 1940 г. 4 дні не было солі. Назіраўся востры дэфіцыт лыжак, іголак, мыла, абутку, асабліва дзіцячага, і другіх тавараў. Не было газы і другіх гаруча-змазачных матэрыялаў. З палівам існавалі сур'ёзныя праблемы. Напрыклад, за зіму 1940—1941 гг. жыхарамі Тамашоўкі былі разабраны на дровы ўсе платы і агароджы адміністрацыйных будынкаў мясцовых улад. Разам з тым хлеб і тытунёвыя вырабы да разраду дэфіцытных не адносіліся. Цэны за 1 кг хлеба ў залежнасці ад якасці вагаліся ад 85 кап. да 4 руб. 20 кап. Лішак і таннасць хлеба часта вялі да выкарыстання яго сялянамі для адкорму жывёлы.

Савецкія ўлады не маглі справіцца з дэзарганізацыяй гаспадарчага быту. Сакратар Дамачаўскага РК КП(б)Б Шахметаў паведамляў, што замест таго, каб «засылаць тавары і будаўнічыя матэрыялы, якія з'яўляюцца першай неабходнасцю і забяспечваюць попыт насельніцтва раёна, аблспажыўсаюз засылае ў раён тавары, якія не карыстаюцца попытам, такія, як беларускую літаратуру, розныя жалеза-скабяныя вырабы і г.д.». Была ўведзена размеркавальная сістэма. Напрыклад, цукар, абутак, мануфактуру Камянец-Жыровіцкае сельпо дзяліла па лаўках, а спецыяльныя лавачныя камісіі размяркоўвалі іх сярод насельніцтва.

Дэфіцыт вёў да злоўжыванняў. Так, у жніўні 1940 г. у Дамачаўскі раён было адгружана 3 тоны пшанічнай мукі са шклом. У Дамачава, напрыклад, загадчыца галантарэйным магазінам Любашыцкая распрадавала тавары з-пад прылаўка сваім знаёмым, а сталовая № 1 ператварыла-

Падзел панскай зямлі.

ся ў закрыты размеркавальнік, які адпускаў тавары па запісках старшыні райспажыўсаюза. Фактычна многія тавары можна было купіць толькі па спекуляцыйных цэнах. Так, рэальны кошт пары чаравікаў складаў 100 рублёў пры дзяржаўным кошце 55 рублёў, а рэальны кошт мог перавышаць дзяржаўны ў дзесяць разоў. Цэны былі дастаткова высокія, калі ўлічваць, што заработная плата рабочага і настаўніка складала ў тыя гады ў сярэднім 150 рублёў. Пры вострым недахопе прадуктаў харчавання ў гарадах сялянам забаранялася вывозіць і прадаваць на рынку ўласную прадукцыю. Аднак нелегальны гандаль тым не менш вёўся актыўна і садзейнічаў вырашэнню матэрыяльных праблем жыхароў Брэстчыны. У цэлым, параўноўваючы ўзровень жыцця і побыту да і пасля прыходу савецкай улады, сяляне рабілі вывады не на карысць апошняй. З боку бежанцаў, якія прыехалі з акупіраванай Польшчы, распаўсюджваліся чуткі аб мностве і таннасці тавараў на заходніх польскіх землях.

КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Многае ў эканамічнай палітыцы савецкай улады, якая праводзілася ў 1939—1941 гг., вымушала сельскіх жыхароў Палесся займаць насцярожаную пазіцыю. Намечаныя эканамічныя перабудовы вызначаліся маштабнасцю і размахам. У 1940 г. пачалася калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Гвалтоўнага прымусу не прадугледжвалася, але актыўна разгарнулася прапагандысцкая кампанія аб перавагах калгаснага жыцця, аб магчымасці выкарыстання сельскагаспадарчых машын. Разам з афіцыйнымі матэрыяламі бытавалі чуткі аб бядотным становішчы калгасных гаспадарак у некаторых рэгіёнах СССР. Аб гэтым патаемна гаварылі чырвонаармейцы, а таксама землякі, якія вярнуліся з работы ў шахтах СССР. Існавала думка аб недаўгавечнасці савецкай улады ў сувязі з надыходзячай вайной, аб тым, што калгасы — гэта вяртанне паншчыны. Насцярожвала сістэма аплаты ў першых сельскагаспадарчых арцелях на Брэстчыне, яна была аднолькавая для ўсіх, калі працадні налічваліся не па выпрацоўцы, а за выхад на работу. У шэрагу вёсак, дзе большасць складалі бядняцкія гаспадаркі, былі створаны калгасы. Вясной 1940 г. у Брэсцкім раёне іх налічвалася 7: імя Калініна ў в. Кавердзякі, імя Сталіна ў в. Казловічы, імя 17 Верасня ў в. Скорбічы, імя Варашылава ў в. Закі, імя Молатава ў в. Кустын, «Чырвоны пагранічнік» у в. Раковіца, імя Дзяржынскага ў в. Чылеева. У чэрвені 1940 г.

у гэтых калгасах налічвалася 280 гаспадарак. У ліку калгаснікаў было 25 былых батракоў.

Перадавой у калгасным будаўніцтве апынулася маленькая вёсачка Закі, дзе ў калгас увайшлі ўсе 66 гаспадарак. У другіх вёсках значная частка жыхароў пажадала весці ўласную гаспадарку. У в. Кавердзякі толькі 25 з 65 гаспадарак уступілі ў калгас. Ва ўласнасць 7 калгасаў Брэсцкага раёна адышло 1398 га ворнай зямлі. Райземаддзел перадаў ім 73 коней, 266 адзінак буйной рагатай жывёлы, 170 авечак і 130 свіней. Такім чынам, калгасныя гаспадаркі атрымалі магчымасць стварыць свае жывёлагадоўчыя фермы. Так, малочная і свінаводчая фермы былі арганізаваны ў калгасе імя Калініна. У ліку перадавых лічылася ферма калгаса «Чырвоны пагранічнік», загадчыцай якой была С.Зажэчная. Найбольш буйнымі ў 1940—1941 гг. былі калгасы ў вёсках Закі і Кустын Брэсцкага раёна і калгас «Вольная праца» Дамачаўскага раёна, які атрымаў у вечнае карыстанне 500 га зямлі.

З другой паловы 1940 г. націск на сялян у правядзенні калектывізацыі ўзмацніўся. Праявілі сябе камандна-бюракратычныя метады кіраўніцтва, уласцівыя савецкай сістэме ўлады. З'явілася небяспека, што тыя, хто не ўступіў у калгас, могуць быць высланы. У гэтым пераконвалі выпадкі раскулачвання і высялення сем'яў без усякіх на тое відавочных падстаў. Вясной 1941 г. у Брэсцкім раёне існавала ўжо 13 калгасаў, якія аб'ядналі 435 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Было таксама арганізавана 2 саўгасы і 17 падсобных гаспадарак прадпрыемстваў і арганізацый г. Брэста. Адна з такіх гаспадарак размяшчалася ў былым маёнтку Бярозаўка. Сярод новых былі калгасы імя Леніна Матыкальскага сельсавета, «1 Мая» Чарнаўчыцкага сельсавета. У Дамачаўскім раёне вясной 1941 г. таксама былі створаны дзве калектыўныя гаспадаркі: «Вызваленне» ў в. Чэрск і «Сталінец» у в. Кабёлка. У ліку старшынь першых калгасаў былі Ф.І.Дывянчук (калгас імя Калініна), А.А.Кулай (калгас імя Варашылава), А.Клімук (калгас імя Леніна), У.Міланюк (калгас «Вызваленне»), І.В.Піварчук (калгас імя Сталіна) і іншыя.

Калгасы з пачатку іх арганізацыі разгарнулі будаўніцтва і абсталяванне гаспадарчых памяшканняў, канюшняў, кароўнікаў, свінарнікаў, хлебных свірнаў і г.д. Ужо ў 1940 г., напрыклад, у калгасе «Вольная праца» Дамачаўскага раёна былі пабудаваны канюшня, хлебны свіран, пуня для захоўвання сена і саломы. Будаўніцтва вялося сіламі і сродкамі саміх калгасаў, таму часцей выкарыстоўваліся абагульненыя падсобныя пабудовы калгаснікаў.

У дапамогу калгасам былі створаны Брэсцкая і Дамачаўская машынна-трактарныя станцыі. Брэсцкая МТС заняла 13,97 га і размясцілася ў былым маёнтку Кавердзякі. Дырэктарам яе быў назначаны т. Коганер. Аднак на працягу ўсяго 1940 г. Брэсцкая МТС была адстаючая. Будаўніцтва аб'ектаў на тэрыторыі МТС зацягвалася з-за недахопу рабочай сілы. Усе 7 прысланых з усходніх раёнаў на Брэсцкую МТС трактароў аказаліся няспраўнымі. Не хапала прычапнога інвентару і трактарыстаў. Пачалася падрыхтоўка мясцовых кадраў механізатараў. Авалодаць трактарам імкнуліся не толькі юнакі, але і дзяўчаты. Так, у абласную сельскагаспадарчую школу ў Кобрынскім раёне была накіравана камсамолка М.Л.Козел з в. Закі. На калгасных палях пачалі выкарыстоўвацца новыя сельскагаспадарчыя машыны.

Калі ў калгас «Вольная праца» прывезлі і ўстанавілі малацілку МК-

11000, калгасніца Вірчык сказала: «Мы такую машыну бачым упершыню. Пры ўладзе польскіх паноў мы аб такой машыне не маглі і марыць, не толькі працаваць. Усю малацьбу праводзілі цапамі, а цяпер праводзім машынай, якая робіць лягчэйшай нашу працу». Сяўба збожжавых вясной 1941 г. у калгасе «Чырвоны пагранічнік» праводзілася сеялкай па ўсіх агратэхнічных правілах. У ліку кадраў МТС былі аграномы, якія аказвалі дапамогу ў навуковым вядзенні сельскагаспадарчай вытворчасці. Вясной 1941 г. многія калгасы актыўна ўносілі хімічныя ўгнаенні пад збожжавыя. Калгаснікі в. Казловічы восенню 1940 г. выкарысталі прывезеныя з Брэста 7 тон мінеральных угнаенняў, рыхтуючы глебу да пасеву пад азіміну. Аграномы дапамагалі асвоіць новыя, незнаёмыя для Брэстчыны, але цяпер неабходныя для вырошчвання тэхнічныя культуры: цукровыя буракі, кок-сагыз, каноплі. У калгасе імя Сталіна вясной 1941 г. 0,15 га зямлі было засеяна кок-сагызам.

У калгасах разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва, якое стала неад'емнай рысай таго часу. Многія калгаснікі Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў мелі высокія паказчыкі вытворчасці працы. Лепшыя з іх у маі — чэрвені 1941 г. пабывалі на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Сярод удзельнікаў выстаўкі былі старшыня калгаса імя Леніна А.Клімук, пераможца абласнога спаборніцтва трактарыстаў У.Дэкан з Дамачаўскага МТС, калгасніцы-стаханаўкі з калгасаў імя Калініна і імя Варашылава К.Р.Хвісіўчык і В.М.Дзівінчук. Пабывалі на выстаўцы таксама брыгадзір калгаса імя Варашылава У.М.Грыцук і брыгадзір калгаса імя Молатава С.І.Валчук, які сабраў у сярэднім па 15,8 цэнтнера збожжавых і 158 цэнтнераў бульбы з кожнага гектара зямлі.

ПАДАТКОВАЯ ПАЛІТЫКА

Нягледзячы на поспехі многіх сельскіх гаспадарак, у большасці вёсак у 1939—1941 гг. калгасы не былі створаны. Пры гэтым сялянам часта прыходзілася супраціўляцца даўленню з боку раённага кіраўніцтва, напрыклад, у Прыбарава. Вясной 1941 г. у Брэсцкім раёне менавіта аднаасобнікі засеялі каля 80% усіх земляў, прызначаных пад ярыну. Пасля правядзення падворнага абходу, перапісу і ўліку ўсёй зямлі і жыўнасці былі ўстаноўлены высокія сельскагаспадарчыя падаткі, якія часта былі значна вышэйшыя, чым у папярэдні час. Велічыня падаткаў з самастойных гаспадарак перавышала нормы, якія былі ў калгасах, калгасных дварах, а таксама дыферэнцыравалася ў залежнасці ад колькасці зямлі і жывёлы. Пры гэтым у адрозненне ад раней прынятых нормаў зусім не бралася пад увагу якасць зямлі, якая знаходзілася ва ўласнасці. Так, калгасы Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў штогадова абавязваліся пастаўляць дзяржаве зерне ў колькасці 30 кг з гектара зямлі, якая апрацоўвалася. Абавязковыя пастаўкі для аднаасобнікаў, якія мелі да 2 га зямлі, складалі 35 кг, вышэй 2 га — 40 кг, вышэй 5 га — 50 кг, вышэй 10 га — 65 кг зерня з гектара.

Нормы здачы мяса дзяржаве вар'іраваліся ў залежнасці ад колькасці зямлі, якая была ў наяўнасці, ад 20 да 300 кг штогадова. Плата за зямлю мясам была новаўвядзеннем савецкай улады і не карысталася папулярнасцю ў сялянскім асяроддзі. Абавязковыя пастаўкі шэрсці налічваліся зыходзячы з разліку 300 грамаў з 1 авечкі для калгаснікаў і 500 грамаў — для аднаасобнікаў.

Дзяржаўныя органы закупалі прадукты па цвёрдых цэнах, што былі значна ніжэй за рыначныя. Напрыклад, малако даводзілася здаваць дзяржаве па 40 кап. за літр, а прадаць яго можна было за 2 рублі 50 кап. Сель-

скагаспадарчы падатак налічваўся ў адпаведнасці з нормамі прадуктыўнасці і прыбытковасці. Так, па Брэсцкім раёне ў 1940 г. абавязковыя пастаўкі збожжа склалі 1275 т., бульбы — 2370 т., мяса — 335 т., воўны — 5,4 т. Вельмі цяжка ішла закупка збожжа ў насельніцтва Брэсцкага раёна вясной 1940 г. У Дамачаўскім раёне пасля правядзення «масавапалітычнай работы» план здолелі выканаць на 75,8%.

Існавалі нормы здачы скур, кантрактацыі льну і г.д. Рэгламентаваліся пасевы. Напрыклад, гаспадар, які меў 7 га зямлі, абавязаны быў адзін з іх засадзіць цукровымі буракамі. У такіх умовах сяляне імкнуліся скрыць жывёлу і пасевы ад уліку. У чэрвені 1940 г. высветлілася, што ў Брэсцкім раёне ворнай зямлі налічвалася 37 943 га, а абкладзена — 33 960 га. Аднак існавалі спецыяльныя адміністрацыйныя органы, якія сачылі за строгім выкананнем правіл. На чале іх стаялі кадры, якія мелі выпыт работы ва ўсходніх абласцях. Райупаўнаркамзагам Брэсцкага раёна быў назначаны Валодчанка М.Ю., які раней быў райупаўнаркамзагам Мікалаеўскага раёна Растоўскай вобласці, а дырэктарам канторы нарыхтоўкі зерня стаў Трайтлін Г.М., кіраўнік базы нарыхтоўкі зерня ў г. Дрыса (БССР). У кожнай вёсцы быў служачы, які займаўся ўлікам і кантролем паставак. Летам 1940 г. пасля жніва здача зерня пайшла актыўней. Перадавым у Брэсцкай вобласці па выкананні абавязковых хлебапаставак быў Дамачаўскі раён. Сяляне Брэсцкага раёна 8 жніўня 1940 г. на 544 фурманках прывезлі і здалі на дзяржаўны пункт 40 тон збожжа. Цэлымі днямі з чырвонымі сцягамі і транспарантамі даводзілася хадзіць мясцовым жыхарам на дзяржаўны склад сена. Аднак часта хлебаздатчыкам, прастаяўшы на пункце «Заготзбожжа» да позняй ночы ў чарзе, даводзілася вяртацца дадому, так і не здаўшы хлеб. Ужо ў жніўні 1940 г. ўсе 60 гаспадарак в. Пескі разлічыліся з дзяржавай па гадавых нормах паставак зерня, мяса, шэрсці.

Адбываўся масавы ўбой жывёлы, які тлумачыўся нестабільнасцю жыцця, баязлівасцю прымусовай калектывізацыі, высокімі цэнамі на мяса. Толькі за чэрвень месяц у адносінах да плана на першае паўгоддзе 1940 г. паступіла 169,5% мяса з Дамачаўскага раёна і 124,9% — з Брэсцкага.

Існавалі і іншыя паборы, такія, як культзбор, рыбалоўны збор і г.д. Давялося адгукнуцца жыхарам Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў на пазыку трэцяй пяцігодкі. Пасля больш чым тысячнага мітынгу ў ліпені 1940 г. у раённым цэнтры Дамачава 642 чалавекі падпісаліся на суму 152,467 руб. У Брэсцкім раёне ў 1940 г. 16 500 чалавек пазычылі дзяржаве 1 млн. 24 тыс. руб. Упаўнаважаныя па падпісцы не абмінулі ніводнай сялянскай хаты. Летняя кампанія 1941 г. была яшчэ больш плённая. У ліку перадавых па падпісцы былі калгаснікі сельгасарцелі імя Сталіна, «Чырвоны пагранічнік» і г.д. Сума пазыкі па Брэсце і раёне склала 4 чэрвеня 1941 г. 5 131 000 руб.

У канцы 1940 — пачатку 1941 гг., перакінуўшыся з гарадоў у вёскі, узмацнілася палітыка рэпрэсій. Улады выконвалі задачы па выяўленні неіснуючых кулацкіх гаспадарак. Ішла дэпартацыя насельніцтва ва ўсходнія і паўночныя часткі СССР. У в. Чарнаўчыцы, напрыклад, быў раскулачаны серадняк С.Грыговіч і вывезены з сям'ёй у Сібір. Прычынай для дэпартацыі адной з сем'яў з в. Калейнікі стаў пераход двух сыноў на акупаваную немцамі польскую тэрыторыю.

ПРАЦОЎНЫЯ БУДНІ

На плечы сялян легла шмат павіннасцей. Сярод найбольш цяжкіх

былі лесанарыхтоўкі, вываз драўніны, адсяленне вёсак ад граніцы і будаўніцтва 62-га Брэсцкага ўмацаванага раёна. Многія вёскі, якія ў 1939 г. сталі прыгранічнымі, такія, як Нэплі, Ліпінкі і інш., былі пераселены.

Штодзённа па разнарадцы на тыднёвы тэрмін з Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў адпраўляліся сотні людзей на нарыхтоўку і вываз лесу, на дастаўку на граніцу для будаўніцтва дотаў каменняў, шчэбню, пяску, цэменту, жалеза і іншых будаўнічых матэрыялаў. Усе перавозкі ажыццяўляліся асабістым гужавым транспартам сялян. На спецбудаўніцтве, як тады называлі абаронныя аб'екты, патрабаваліся кваліфікаваныя рабочыя. Разнарадка на гэтыя работы ў ліпені 1940 г. для Брэсцкага раёна склала 100 чалавек, 20 з якіх павінны былі быць кваліфікаванымі цесляpамі.

У 1939—1941 гг. на тэрыторыі Брэсцкага раёна актыўна разгарнулася дарожнае будаўніцтва. Прыводзіліся ў парадак дарогі, рамантаваліся старыя і будаваліся новыя масты. Намаганнямі жыхароў Брэсцкага раёна ішло будаўніцтва мастоў праз Мухавец у напрамку Брэст—Ковель, а таксама ў в. Булькова. У ліпені 1940 г. на будаўніцтва моста праз Мухавец было накіравана 60 цесляроў, 280 землякопаў, 250 конных фурманак. Будаваліся масты каля вёсак Вістычы і Цюхінічы і інш.

Згодна з пастановай СНК БССР № 1294 г., у верасні 1940 г. насельніцтва Брэсцкага раёна павінна было выканаць дарожныя работы на суму 41 890 руб.

У выкананні работ актыўна ўдзельнічаў камсамол. Камсамольскай арганізацыяй Брэсцкага раёна кіраваў тады малады, энергічны Ф.Ю.Рома, а Дамачаўскай — Х.Ш.Гінсбург. У адрозненне ад партыйных радоў у камсамол актыўна прымалася мясцовая моладзь, як правіла, не звязаная з рэвалюцыйным падполлем Заходняй Беларусі. Да 1 сакавіка 1940 г. Брэсцкі РК ЛКСМБ прыняў у свае рады 13 чалавек. Пярвічныя камсамольскія арганізацыі часта ствараліся раней за партыйных. Сярод першых камсамольцаў 1940 г. былі перадавікі В.І.Ручэўская з в. Кавердзякі, П.Т.Вольскі з в. Закі, У.М.Дзямчук з в. Ваўкі, П.Клешчанок з в. Чарнаўчыцы і інш. Вялікім аўтарытэтам у Казловічах карыстаўся сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса імя Варашылава Дарафей Яркоў. Камсамольцы актыўна выкарыстоўваліся на агітацыйнай рабоце, у арганізацыі калгасаў, на будаўніцтве мастоў, рамонце дарог і іншых важных тады работах.

Эканамічная сітуацыя ў СССР у гэты час была складаная. Заданні трэцяй пяцігодкі не выконваліся. Ужо ў кастрычніку 1939 г. пачалася актыўная вярбоўка моладзі на работу ў прамысловыя цэнтры Савецкага Саюза. Выязджалі ў шахты Данбаса, Чэлябінскую вобласць і іншыя месцы. Спачатку ехалі ахвотна, добраахвотнікаў было шмат. Прайшоў час, атрымлівалі паведамленні аб цяжкай рабоце і складаных бытавых умовах — пачалі ўхіляцца ад набораў. Многія з тых, што паехалі, стварылі там сем'і і назаўсёды засталіся ў іншых рэспубліках СССР.

Працоўным подзвігам жыхароў Брэстчыны стаў удзел у рэканструкцыі і будаўніцтве Дняпроўска-Бугскага канала. Грандыёзныя работы былі выкананы ў вельмі кароткі тэрмін: са снежня 1939 г. па жнівень 1940 г. Гэта была першая вялікая будоўля ў Заходняй Беларусі. Адзін з пяці ўчасткаў будаўніцтва ў Брэсцкай вобласці —Трышынскі — знаходзіўся на тэрыторыі Брэсцкага раёна. Жыхары Брэсцкага і Дамачаўскага раёнаў у асноўным забяс-

печвалі работу на 9-м і 10-м гідравузлах. У студзені 1940 г. на шлюзах пачаліся земляныя работы. З вёсак прыходзілі і прыязджалі на фурманках сяляне. Згодна з разнарадкай, ад Брэсцкага раёна на двух гідравузлах сістэматычна павінны былі працаваць 30—60 цесляроў, 450—500 рознарабочых, 200—300 фурманак. Для Дамачаўскага раёна нормы адпаведна былі меншымі.

Відавочна, што пры такім напружаным графіку бывалі і перабоі, калі, напрыклад, не было магчымасці адпраўляць фурманкі і г.д.

З мэтай прадухілення цякучасці кадраў з сялянамі заключаліся дагаворы, устанаўліваліся нормы выпрацоўкі. Яны капалі катлаваны, забівалі палі і выконвалі іншыя работы.

Нягледзячы на тое што на будаўніцтва канала была завезена тэхніка, большая частка работ выконвалася ўручную. Толькі 20% усіх земляных работ выконвалася экскаватарамі.

На будаўніцтва прыехалі інжынеры-будаўнікі з Масквы, вялікая партыя рабочых-камуністаў з усходніх раёнаў. Аднак асноўная маса будаўнікоў з'яўлялася мясцовымі жыхарамі. Зіма 1940—1941 гг. выдалася халодная. Маразы дасягалі — 30—40°С але работа не спынялася. Цяжкім перыядам будаўніцтва стаў час вясенняй паводкі, калі пад пагрозай разбурэння апынуліся многія збудаванні і катлаваны шлюзаў. На дапамогу прыйшлі людзі з навакольных вёсак, якія самаахвярнай працай, не зыходзячы з пастоў па некалькі змен, перамаглі стыхію. На канале працавалі спецыяльна арганізаваныя брыгады камсамольцаў, мужчыны, жанчыны і нават дзеці. Так, на 9-м гідравузле працаваў А.А.Барысюк з Пажэжына. Выходзілі на работу цэлымі сем'ямі, як, напрыклад, дзед, сын і ўнук Галашы з в. Шэбрын. К канцу ліпеня работы на 9-м і 10-м гідравузлах былі закончаны. 1 жніўня 1940 г. на 10-м гідравузле адбыўся мнагалюдны мітынг, прысвечаны заканчэнню работ, а 9 жніўня ўжо сустракалі першы караван суднаў з партрэтамі Сталіна. Сотні людзей, пакінуўшы работу, выйшлі на бераг Мухаўца, які стаў мнагаводным. Гэта было свята, заслужанае цяжкай працай. З Кіева, Адэсы, Пінска па новай трасе ў пагранічны Брэст пайшлі караблі з хлебам і прамысловымі таварамі.

МЯСЦОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

У 1939—1941 гг. развівалася і мясцовая прамысловасць. Яе асновай сталі нацыяналізаваныя ў снежні 1939 г. у Брэсцкім павеце прамысловыя аб'екты. У іх ліку былі лесапільны завод у Тамашоўцы, цагляныя заводы ў в. Гузні, Гершонах, млыны ў Страдзечах, Матыкалах, Цюхінічах, Тамашоўцы, Дамачаве, Вістычах, Чарнаўчыцах, Замосці. У Брэсцкім раёне быў створаны млынавы камбінат, які аб'яднаў 8 млыноў і атрымаў дзяржаўныя датацыі. Так, у лютым 1940 г. з мэтай нармалізацыі работы млынавых прадпрыемстваў было выдзелена 8 тысяч руб.

Была створана рыбная гаспадарка, якая займала плошчу 735 га. Аднаразовая прадуктыўнасць двух цагляных заводаў складала 7 млн. штук цаглін. Для забеспячэння патрэб жыхароў Брэсцкага раёна палівам і выканання плана торфаздабычы былі створаны 4 торфазаводы: «Залессе», «Багач», «Тэльмы», «Чарнаўчыцы». Тут разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва. З'явіліся рэзчыкі-стаханаўцы, такія, як В.Дзямешка, А.Паско, М.Галуцкі на торфазаводзе «Чарнаўчыцы», І.С.Пясецкі, А.К.Касцюкевіч на торфазаводзе «Тэльмы». Дапамогу ў правядзенні падрыхтоўчых асушальных работ аказвалі мясцовыя жыхары. У ліпені 1940 г. на торфазавод «Тэльмы» было накіравана 440 мужчын і 4 300 жан-

чын. У Брэсцкім і Дамачаўскім раёнах былі арганізаваны прамысловыя арцелі, такія, як кавальская пры Матыкальскім сельсавеце, цяслярская ў Чарнаўчыцах, кравецкая і швейная ў Дамачаве. У 1940 г. у Дамачаўскім раёне была выраблена вялікая колькасць розных прадметаў мэблі і бочак для салення. Аднак у цэлым ці можна гаварыць аб значным развіцці мясцовай прамысловасці ў 1939—1941 гг. У 1940 г. кошт прамысловай прадукцыі Брэсцкага раёна склаў толькі 6 тысяч рублёў.

АБАРОНЧАЯ РАБОТА

У трывожных перадваенных абставінах у калгасах і вёсках вялася масавая абарончая работа. Школьнікі і моладзь здавалі нормы на значкі «ГПА» і «Юны варашылаўскі стралок», спаборнічалі ў бегу і стральбе. У вёсках ствараліся арганізацыі Асаавіяхіма (Таварыства садзейнічання абароне, авіяцыйнаму і хімічнаму будаўніцтву СССР) і Чырвонага Крыжа. У жніўні 1940 г. Дамачаўскі раённы савет Асаавіяхіма арганізаваў 15-кіламетровы ваенізаваны паход моладзі, прысвечаны Дню авіяцыі. У ім прыняло ўдзел 75 чалавек, якія вывучылі правілы хадзьбы ў калоне, вядзення разведкі, паводзін байца ва ўмовах вайны. Восенню 1940 г. у Дамачаўскім раёне існавала 17 пярвічных арганізацый Чырвонага Крыжа. Іх членамі сталі 28 чалавек. Медыцынскія работнікі Дамачаўскага раёна падрыхтавалі 50 чалавек, якія атрымалі значкі «Гатоў да санітарнай абароны». У маі 1941 г. каля 300 маладых людзей Брэсцкага раёна пасля настойлівых трэніровак прынялі ўдзел у спаборніцтвах па бегу.

Вайну прадчувалі. А вясковыя хлопцы, якія ўладкаваліся на работу ў брэсцкім рачным порце, перагружалі збожжа з прыбыўшых баржаў у нямецкія вагоны, якія ішлі ў Германію.

А.В.Пятроўская.

Дакументы сведчаць

З ЗАГАДУ КАМАНДУЮЧАГА ВОЙСКАМІ БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ

19 верасня 1939 г.
г. Мінск

1. Во всех городах на территории, занятой частями Рабоче-Крестьянской Красной Армии, впредь до образования органов власти создать Временные управления из представителей Рабоче-Крестьянской Армии и местного населения, на которые возложить руководство административной, хозяйственной и культурно-просветительной деятельностью в этих городах.

2. Приказываю Временным управлениям немедленно привести в действие все предприятия и заведения, призванные обслуживать население. Обязать владельцев немедленно открыть для нормальной работы: магазины, хлебопекарни, булочные, рестораны, парикмахерские, бани, кинотеатры и т.д.

Восстановить нормальную работу внутренней телефонной сети, почты, электроосвещения и водоснабжения...

З ПАСТАНОВЫ КАМІТЭТА ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВЫБАРАЎ У НАРОДНЫ СХОД ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АБ СКЛАДЗЕ КАМІТЭТА І ДНІ ВЫБАРАЎ

6 кастрычніка 1939 г.

Комитет по организации выборов в Белорусское Народное собрание постановляет:

1. Назначить день выборов в Белорусское Народное собрание — воскресенье 22 октября 1939 г.

2. Объявить днем начала выборной кампании по выборам депутатов Белорусского Народного собрания — 7 октября 1939 г.

3. Утвердить «Порядок организации выборов в Белорусское Народное собрание...».

З ДЭКЛАРАЦЫІ НАРОДНАГА СХОДУ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ АБ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЛАДЗЕ

29 кастрычніка 1939 г.

... Белорусское народное собрание, выражая непреклонную волю и желание народов Западной Белоруссии, провозглашает на всей территории Западной Белоруссии установление Советской власти. Отныне вся власть на территории Западной Белоруссии принадлежит трудящимся города и деревни в лице Советов депутатов трудящихся...

З ДЭКЛАРАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ АБ УВАХОДЖАННІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў СКЛАД БССР

29 кастрычніка 1939 г.

... Считая волю белорусского народа высшим законом, Белорусское Народное собрание постановляет:

Просить Верховный Совет Союза Советских Социалистических Республик и Верховный Совет Белорусской Советской Социалистической Республики принять Западную Белоруссию в состав Советского Союза и Белорусской Советской Социалистической Республики, воссоединить белорусский народ в единое государство и положить тем самым конец разобщению белорусского народа...

З ДЭКЛАРАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА СХОДУ АБ КАНФІСКАЦЫІ ПАМЕШЧЫЦКІХ ЗЯМЕЛЬ

30 кастрычніка 1939 г.

... Белорусское народное собрание, руководствуясь кровными интересами трудового крестьянства и выражая волю всех трудящихся масс, провозглашает на территории Западной Белоруссии конфискацию, без всякого выкупа, помещичьих земель, земель крупных государственных чиновников со всем их живым и мертвым инвентарем и усадебными постройками.

Отныне вся земля Западной Белоруссии с ее недрами объявляется общенародным достоянием, то есть государственной собственностью....

Падборку дакументаў паводле матэрыялаў тагачаснага друку падрыхтавала супрацоўніца Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці Л.В.Дацкевіч.

ПАСТАНОВА БЮРО БРЭСЦКАГА АБКОМА КП(б)Б АБ УТВАРЭННІ БРЭСЦКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

снежань 1939 г.

Сакрэтна

Образовать Брестский район с центром в гор. Бресте в составе следующих населенных пунктов Брестского уезда: Прилуки, Страдеч, Горы, Колпин, Гершоны, Аркадья, Митки, Котельня Бояр, Бернады, Каменица-Биск., Подлоса-Камн. Лазы, Каменица-Жир., Заболотье, Семисосны, Вулька-Заст., Кунахи, Хутора — Романовск, Подлесье, Радванич, Волки, Литвины, Сакие, Пугачёво, Котельня-Подг., Вулька-Подгор., Радваничи-Зар., Радваничи Церковн., Михалин, Муры, Франополь, Заостье, Тришин, Вичулки, Ямно, Гузьня, Черны, Черны, Братылово, Косичи Большие, Косичи Малые, Климовичи, Мальки, Курница Большая, Курница Малая, Носвило, Чернаки, Скорбичи, Селяхи, Бордичи, Харитоны, Волоски, Поплавки, Ветошки, Волюнь, Збироги, Залесье, Карабаны, Максимы, Сычи, Гутовичи, Тельмы, Сопсты, Тельмы каз., Очки, Лидимо, Смоляны, Буяки, Кошелево, Кошелево, Речица, Адамково, Клейники, Непли, Катенборг, Козловичи, Дубровка, Котельня-Боя ск. Березовка, Плоская, Мощенка, Задворцы Старые, Задворцы Новые, Мотыкалы Большие, Мотыкалы Малые, Вулька, Нехолоти, Нехолоти, Смуга, Чилиево, Заполье, Раковица Большая, Раковица Малая, им. и хут. Раковица, Столпы, Сабурье, Шумаки, Костычи, Теребунь, Колодне, Тюхеничи, Старое село, Скоки, Скоки, Бобровцы, Ковердяки, Ковердяки, Пески, Станище, Сычи, Сычики, Сычи, им. Сычи, хут. Сычики, Велямовичи, Чижевичи, Добронеж, Галачево, Лыщицы, Лыщицы, Щитники Большие, Щитники Малые, Щитники, Кустынь, Остромечево, Бояры и Тюприки, Рудавец, Яново, Чернавчицы, Блюменичи, Смолина, Терпиловичи, Ивахновичи, Колды, Неневичи, Козловичи, Кошилово, Сухаревичи Большие, Сухаревичи Малые, Зборомирово, Витмичи и Мельники.

Общее число населения района 47 512 чел., территория района составляет 1044,5 кв. км. Земельная площадь 104 450 га, в том числе:

Пахотной земли	49 061 га
Сенокосных угодий	13 717

Пастбищных угодий	17 090
Лесных угодий	1277
Неудобных земель	686
Прочих земель	557
Прудов и озер	62

Просить ЦК КП(б)Б утвердить данное решение.

Секретарь Брестского обкома КП(б)Б (Киселев)

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 1б. Спр. 1.

ПАСТАНОВА БЮРО БРЭСЦКАГА АБКОМА КП(б)Б АБ УТВАРЭННІ ДАМАЧАЎСКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Сакрэтна
ад 14 снежня 1939 г.

Образовать Домачевский район с центром в Домачево в составе следующих населенных пунктов Брестского уезда: Дуричи, Белогоры, Медна, Рогозна, Медная Руда, Отоки, Ст. Дубица, Дер. Дубица, Збунин, Осада-Зубин, Кол. Мельники, Котельная, Леплевка, Рудня, Кобелка, Грабувка, Жуково, Черск, Кир. зав. Рудня, Будка 40-43 клм., Попова-Дубровна, Долоброд, Черск, Черск, Гута, Дубок, Новосады, Дубок, Лесн. Стойло, Домбрувка, им. Железна, Домачево; Борок-Острова, Горьпца-Кацы, Грабовка, Подлужье, Борысы-Шикале, Болданы, Лошнево, Липники, Новые Дворы, Приборово, Харсы, Комаровка, Станиславовка, Селяхи, Томашевка, ж.д. ст. Влодова, Орхово, м-ко Влодовка, Тадеушовка.

Общее число населения района 30 147, территория района составляет 491,3 кв. клм. Земельная площадь 49 130 гектаров, в том числе:

Пахотной земли	18 150 га.
Сенокосных угодий	15 292 га.
Лесных угодий	10 014 га.
Остальные угодия	5674 га.

Просить ЦК КП(б) утвердить данное решение.

Секретарь Брестского обкома КП(б)Б (Киселев)

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 1б. Спр. 1.

МАТЭРЫЯЛЫ ПА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ І КУЛЬТПРАСВЕТРАБОЦЕ Ў БРЭСЦКІМ РАЁНЕ Ў ПЕРЫЯД З 17 ВЕРАСНЯ 1939 г. ПА 17 ВЕРАСНЯ 1940 г.

	Было до 17.IX.39 г.	Стало к 17.IX.40 г.
Всего школ по району, в т.ч.	29	60
1) начальных	29	45
2) неполно-средних	—	15
3) средних	—	—
4) для взрослых	—	36
Охват населения обучением	3750	8262
1)начальным	3750	6934
2) неполно-средним	—	1328
3) средним	—	7
4) взрослое	—	—
Количество неграмотных, в т.ч.	16 025	10 261
1) дети школьн. возр.	4512	567
2) взрослые	4409	3296
Количество малограмотных	7104	5398
Культпросветучреждения	—	15
Библиотеки	—	2
Кружки художественной самодеятельности	—	10
Бюджет народного образования и культпросветучреждений	—	1 776 500

Зав. РайОНО А.Жуков

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 1а. Спр.1.

Прысуд адменены

Паход Чырвонай Арміі на захад у верасні 1939 г. прывёў да ўстанаўлення на тэрыторыі Заходняй Беларусі савецкай улады. З першых жа дзён тут пачалася работа па адміністрацыйна-гаспадарчым уладкаванні, пераводзе эканомікі заходняй часткі Беларусі на рэйкі сацыялістычнага будаўніцтва, стварэнні партыйных і камсамольскіх арганізацый. У кола абавязкаў упаўнаважаных па арганізацыі адміністрацыі на заходнебеларускай тэрыторыі ўваходзіла таксама каардынацыя работы па выяўленні і рэпрэсіраванні рэальных і нават патэнцыяльных праціўнікаў савецкай улады на далучаных землях.

У ліку першых падвергліся рэпрэсіям асаднікі — адстаўныя афіцэры і унтэрафіцэры польскага войска, якія вызначыліся ў савецка-польскай вайне 1918—1920 гг. і якія атрымалі зямлю на заходнебеларускіх тэрыторыях, а таксама работнікі лясной аховы. 10 лютага 1940 г. адбылося масавае высяленне гэтай катэгорыі грамадзян у Сібір, Казахстан і іншыя аддаленыя раёны краіны. З Брэсцкай вобласці было выселена 662 гаспадаркі колькасцю 3802 чалавекі.

13 красавіка 1940 г. была праведзена другая аперацыя па высяленні. Па яе выніках за межы рэспублікі было выселена звыш 26 тысяч чалавек, у тым ліку каля 5 тысяч з Брэсцкай вобласці. Гэта былі члены сем'яў тых, хто знаходзіўся ў лагеры для ваеннапалонных, у турмах, збег за мяжу і інш.

29 чэрвеня 1940 г. органамі НКУС была праведзена трэцяя па ліку дэпартацыя людзей у аддаленыя раёны СССР. Яна датычылася вялікай колькасці бежанцаў, якія шукалі прытулку ад гітлераўскага тэрору ў Польшчы.

Чацвёртая па ліку масавая дэпартацыя людзей з заходніх абласцей рэспублікі адбылася 19—20 чэрвеня 1941 г., за два дні да пачатку вайны.

Акрамя масавых высяленняў у адміністрацыйным парадку, вялікая колькасць жыхароў Брэста падвяргалася рэпрэсіям з боку судовых і несудовых органаў як у даваенны, так і ў пасляваенны час, аж да 1953 г.

Вернутыя імёны

Спіс ахвяр палітычных рэпрэсій падрыхтаваны на падставе звестак па стане на 1.3.1997 г.

Сюды ўвайшлі асобы, неабгрунтавана прыцягнутыя да адказнасці судовымі і несудовымі органамі ў 1930—1950-я гг., а таксама рэпрэсіраваныя ў адміністрацыйным парадку і рэабілітаваныя ў 1950—1990-я гг.

Спісы падрыхтаваны Дзяржаўным камітэтам па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь. Адказныя за складанне У.І.Адамушка, Ю.А.Кладухін, О.У.Бірукова.

АБАРБАНЕЛ Ізраіль Майсеевіч, н. у 1905 у Віцебску, член КПСС (выключаны ў сувязі з арыштам), да арышту працаваў дырэктарам Дома сацыялістычнай культуры ў м. Дамачава, асуджаны 23.11.1948 на 25 гадоў ППЛ, вызвалены 5.8.1955. Рэабілітаваны 16.12.1961.

АДАМОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1880 у г. Каменка Цярнопальскай вобласці, былы камендант польскай паліцыі, пражываў у в. Медна Дамачаўскага раёна. Асуджаны 26.8.1940 асобай нарадай пры НКУС СССР да 8 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 31.3.1989.

АКУЛАЎ Васіль Антонавіч, н. у 1897 у Курскай вобласці, селянін-аднаасобнік, пражываў у в. Чэрні. Асуджаны 4.9.1940 асобай нарадай пры НКУС СССР да 8 гадоў ППЛ. Памёр у заключэнні 21.10.1943. Рэабілітаваны 22.3.1989.

АМЯЛЬЧУК Аксіння Фядотаўна, н. у 1892 у в. Дубок, сялянка-аднаасобніца. Асуджана 1.12.1945 асобай нарадай пры НКУС СССР да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітавана 20.9.1989.

АНДРАЮК Кузьма Дзмітрыевіч, н. у 1906 у в. Лышчыцы, рабочы на станцыі Лышчыцы Брэст-Літоўскай чыгункі. Асуджаны 25.2.1946 асобай нарадай пры НКУС СССР да 4 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 25.10.1993.

АНТАНЮК Павел Несцеравіч, н. у 1902 у в. Заполле, калгаснік калгаса імя Чапаева. Асуджаны 24.12.1951 Брэсцкім абласным судом да 25 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 12.12.1984.

АНТАНЮК Пётр Паўлавіч, н. у 1928 у в. Заполле, часова не працаваў, пражываў у Брэсце. Асуджаны 21.3.1947 Судовай калегіяй па крымінальных справах Брэсцкага абласнога суда да 10 гадоў ППЛ. Судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда

БССР ад 27.3.1947 тэрмін пакарання зніжаны да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 16.12.1991.

АРСЕНЮК Антон Паўлавіч, н. у 1906 у в. Чэрні, без вызначаных заняткаў. Асуджаны 7.7.1945 асобай нарадай пры НКУС СССР да 5 гадоў ППЛ. Рэабілітаваны 9.6.1992.

ЛЯСОТА Юльян Францавіч, н. у 1875, жыхар в. Сколдычы, працаваў на сельскай гаспадарцы. У 1952 разам з жонкай **ЛЯСОТА Аленай Казіміраўнай,** н. у 1886, і дзецьмі **ЛЯСОТА Адэліяй Юльянаўнай,** н. у 1921, і **ЛЯСОТА Соф'яй Юльянаўнай,** н. у 1926, выселены ў Казахстан. Рэабілітаваны 4.1.1995.

МАНЬКО Агаф'я Лук'янаўна, н. у 1882, жыхарка в. Калоднае, працавала на сельскай гаспадарцы. У 1952 разам з **МАНЬКО Вольгай Міхайлаўнай,** н. у 1930, выселена ў Казахстан. Рэабілітавана 5.3.1992.

МАРТЫНЮК Соф'я Еўдакімаўна, н. у 1926 (1930), жыхарка в. Скокі, працавала на сельскай гаспадарцы. У 1941 разам з **МАРТЫНЮК Ганнай Еўдакімаўнай,** н. у 1929 (1932), **МАРТЫНЮК Марыяй Еўдакімаўнай,** н. у 1932 (1924), выселена ў Алтайскі край. Рэабілітавана 10.3.1994.

МІХАЛІК Праскоўя Давыдаўна, н. у 1873, жыхарка в. Каростычы, працавала на сельскай гаспадарцы. У 1952 разам з **МІХАЛІК Ксеніяй Сямёнаўнай,** н. у 1900, **МІХАЛІК Ганнай Гаўрылаўнай,** н. у 1926, **МІХАЛІКАМ Васілём Гаўрылавічам,** н. у 1932, **МІХАЛІКАМ Сяргеем Гаўрылавічам,** н. у 1939, выселена ў Казахстан. Рэабілітавана 31.3.1992.

ПЛЯЧКО Аляксандра Фёдараўна, н. у 1871, жыхарка в. Ямна, працавала на сельскай гаспадарцы. У 1939 разам з **ПЛЯЧКО Ганнай Іванаўнай,** н. у 1914, **ПЛЯЧКО Яўгеніяй Міхайлаўнай,** н. у 1938, **ПЛЯЧКО Фёдарам Міхайлавічам,** н. у 1940, выселена ў Казахстан. Рэабілітавана 28.12.1994.

ФАРЫЦКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1889, жыхар в. Малыя Зводы, працаваў на сельскай гаспадарцы. У 1940 разам з **ФАРЫЦКАЙ Людвікай Іосіфаўнай,** н. у 1880, выселены ў Архангельскую вобласць. Рэабілітаваны 18.12.1991.

ХІБОЎСКАЯ Леакадзія Іосіфаўна, н. у 1904, жыхарка в. Малыя Зводы, працавала на сельскай гаспадарцы. У 1940 разам з **ХІБОЎСКАЙ Янінай Зігмундаўнай,** н. у 1937, выселена ў Архангельскую вобласць. Рэабілітавана 18.12.1991.

ШОСТАК Сіла Фёдаравіч (дата нараджэння не ўказана), жыхар в. Нехалсты, працаваў на сельскай гаспадарцы. У 1940 разам з жонкай **ШОСТАК Еўдакіяй Ігнацьеўнай** (дата нараджэння не ўказана), дзецьмі **ШОСТАКАМ Аляксеем Сілавічам** (дата нараджэння не ўказана), **ШОСТАК Марыяй Сілаўнай,** н. у 1926, выселены ў Акцюбінскую вобласць. Рэабілітаваны 27.10.1994.

ШОСТАК Фёдар (імя па бацьку не ўказана), н. у 1866, жыхар в. Нехалсты, працаваў на сельскай гаспадарцы. У 1940 разам з **ШОСТАК Ірынай,** н. у 1874, **ШОСТАКАМ Рыгорам,** н. у 1908, **ШОСТАК Валянцінай Рыгораўнай,** н. у 1936, **ШОСТАК Надзеяй,** н. у 1910, выселены ў Акцюбінскую вобласць. Рэабілітаваны 19.10.1994.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Першыя дні

На тэрыторыі Брэсцкага раёна, у цяперашніх яго тэрытарыяльна-адміністрацыйных межах, летам 1941 г. дыслацыраваліся войскі 4-й арміі Заходняй асобай ваеннай акругі, якія прыкрывалі граніцу ў 150 кіламетраў шырынёй на Брэсцка-Мінскім напрамку (камандуючы арміяй генерал-маёр А.А.Карабкоў*, член ваеннага савета арміі дывізіённы камісар Ф.І.Шлыкаў, начальнік штаба палкоўнік Л.М.Сандалаў).

У склад арміі ўваходзілі 6, 42, 49 і 75-стралковыя, 2 танкавыя, 1 матарызаваная дывізіі, 1 змешаная авіядывізія, 1 умацаваны раён, шэраг артпалкоў. Штаб арміі дыслацыраваўся ў Кобрыне, адкуль пасля налёту варожай авіяцыі эвакуіраваўся ў в. Бухавічы, а затым у в. Запруды.

Часці 28-га стралковага корпуса (генерал-маёр В.С.Папоў) былі размешчаны ў Брэсцкай крэпасці і побач з ёй.

6-я Чырванасцяжная стралковая дывізія (палкоўнік М.А.Папсуй-Шапко) размяшчалася ў крэпасці ў няпоўным складзе — знаходзіліся 84, 125, 333-і стралковыя палкі, 37-ы асобны батальён сувязі, 98-ы асобны супрацьтанкавы артылерыйскі дывізіён, 75-ы асобны разведвальны батальён, 31-ы асобны аўтатранспартны батальён, 44-ы асобны палявы аўтахлебазавод, артылерыйскія і рэчавыя склады дывізіі.

З 42-й стралковай дывізіі (генерал-маёр І.С.Лазарэнка) у крэпасці базіраваліся 44-ы і 455-ы стралковыя палкі, 393-і асобны зенітны артылерыйскі дывізіён, склады гэтых палкоў.

Акрамя вышэйназваных у крэпасці знаходзіліся 33-і інжынерны полк акруговага падпарадкавання, карпусны і армейскі ваенныя шпіталі, падраздзяленні 17-га Чырванасцяжнага пагранічнага атрада і 132-га асобнага батальёна канвойных войскаў НКУС.

Штаб і штабныя падраздзяленні

---

* Трагічна склаўся яго лёс. Згодна з пастановай Дзяржаўнага камітэта абароны ад 18 ліпеня 1941 г., падпісанай І.В.Сталіным, ён быў арыштаваны і расстраляны. У пасляваенны час — рэабілітаваны.

131-га артылерыйскага палка 6-й стралковай дывізіі, палкавая школа, 1-ы і 3-і дывізіёны, канюшні, склад АРЗ былі размешчаны каля крэпасці на беразе р. Заходні Буг (зараз гэта спортпляцоўка Брэсцкага пагранічнага атрада). Артпарк размяшчаўся бліжэй да гарнізонных могілак. У раёне цяперашняга мясакамбіната ў крапасным форце Граф Берг (форт Сікорскага) знаходзіўся 2-і дывізіён 131-га артылерыйскага палка.

У форце № 5, у 4 км на паўднёвы захад ад Брэста, знаходзіўся 3-і стралковы батальён 44-га стралковага палка 42-й стралковай дывізіі, у форце № 8, у 2 км на поўнач ад Брэсцкай крэпасці, — 1-ы стралковы батальён 455-га стралковага палка 42-й стралковай дывізіі.

Уздоўж берага р. Заходні Буг ад Брэсцкай крэпасці былі размешчаны доты 62-га Брэсцкага ўмацаванага раёна. Апорныя яго пункты павінны былі прыкрываць граніцу ад Беластока да Брэста і на поўдзень. Будаўніцтва дотаў яшчэ не было завершана. Многія кіламетры (па лініі ўмацаванага раёна) не мелі ніводнага абарончага збудавання. У 30-кіламетровай паласе на поўдзень і поўнач ад Брэста ў збудаваных і часткова абсталяваных дотах размяшчаліся роты 18-га асобнага кулямётнага батальёна. Першая рота знаходзілася ў дотах каля в. Рэчыца, другая — каля вёсак Гершоны, Аркадзія, Бярнады, трэцяя — на мяжы былога Высокаўскага і Брэсцкага раёнаў (вёскі Ставы, Орля).

У паласе 62-га Брэсцкага ўмацаванага раёна на будаўніцтве знаходзіліся 9 стралковых батальёнаў з 27, 3 артылерыйскія дывізіёны і ўсе сапёрныя часці корпуса, асноўныя сілы 33-га інжынернага палка акруговага падпарадкавання, а таксама 5 будаўнічых участкаў 74-га ўпраўлення начальніка будаўніцтва.

Непасрэдна ў Брэсце размяшчаліся штабныя і спецыяльныя падраздзяленні карпуснога, армейскага і акруговага падпарадкаванняў.

У Паўночным гарадку размяшчаўся 111-ы сапёрны батальён і 246-ы асобны зенітны артылерыйскі дывізіён, 84-ы асобны разведвальны батальён, 18-ы асобны батальён сувязі і 17-ы гаўбічны артылерыйскі полк 42-й стралковай дывізіі, 447-ы карпусны артылерыйскі полк 28-га стралковага корпуса.

У Паўднёвым гарадку Брэста дыслацыраваліся ўваходзячыя ў склад 14-га механізаванага корпуса (генерал-маёр С.І.Аборын) 22-я танкавая дывізія (генерал-маёр В.П.Пуганаў) у складзе 43-га і 44-га танкавых палкоў і 22-і мотастралковы полк. Побач знаходзіўся 40-ы аўтамабільны полк карпуснога падпарадкавання, у раёне в. Кавалёва — 204-ы гаўбічны артылерыйскі полк 6-й стралковай дывізіі.

На танкадроме Паўднёвага гарадка знаходзіліся палкавая школа і два дывізіёны 17-га гаўбічнага артылерыйскага палка 42-й стралковай дывізіі. У палатках каля Паўднёвага гарадка размясціўся 455-ы карпусны артылерыйскі полк, які быў выведзены з Пінска ў летнія лагеры.

22.6.1941 г. на артылерыйскі палігон былі выведзены частка асабовага складу 393-га асобнага зенітнага артылерыйскага дывізіёна 42-й стралковай дывізіі з дзвюма 76-мм гарматамі, дзве батарэі 2-га і адна 1-га дывізіёнаў 131-га артылерыйскага палка 6-й стралковай дывізіі і шэраг асобных падраздзяленняў з Брэсцкай крэпасці разам з тэхнікай.

У лагерах каля в. Плоска знаходзілася асноўная частка выведзеных з Кобрына 944-га асобнага батальёна сувязі армейскага падпарадкавання, з Брэсцкай крэпасці 37-га асобнага батальёна сувязі 6-й стралковай дывізіі, з Паўночнага гарадка 18-га

асобнага батальёна сувязі 42-й стралковай дывізіі, з Брэста 298-га асобнага батальёна сувязі 42-й стралковай дывізіі. У в. Плоска знаходзіліся таксама склады 447-га карпуснога артылерыйскага палка.

На поўдзень ад Брэста ў в. Медна і каля возера Рагазнянскае дыслацыраваліся 34-ы стралковы і 68-ы лёгкі артылерыйскі палкі 75-й стралковай дывізіі (генерал-маёр С.І.Нядзвігін) армейскага падпарадкавання.

28-ы стралковы і 235-ы гаўбічны (1-ы дывізіён) артылерыйскія палкі дывізіі займалі ўчастак на стыку Кіеўскай асобай ваеннай акругі на левым флангу і 4-й арміі ў раёне Чэрск — Дамачава — Мелавая гара.

Такім чынам, злучэнні арміі знаходзіліся паблізу граніцы, але на значнай аддаленасці (ад 30 да 75 км) ад рубяжоў, прызначаных да заняцця абароны.

Для збору асобных падраздзяленняў па трывозе спатрэбіліся б не менш 1—1,5 дня, таму яны ўступілі ў бой непадрыхтаванымі. Баявая трывога была аб'яўлена самастойна камандзірамі часцей ужо пасля пачатку артылерыйскай падрыхтоўкі і авіяцыйнага налёту праціўніка.

Дзеянні авіяцыйных палкоў 10-й змешанай авіяцыйнай дывізіі (палкоўнік М.Г.Бялоў), перад якой ставілася задача прыкрыцця арміі, з першых хвілін вайны былі паралізаваны. Аэрадромы 123-га (в. Імянін каля Кобрына), 33-га знішчальных (м. Пружаны), 39-га бамбардзіровачнага (г. Пінск), 74-га штурмавога (в. Зводы) палкоў былі разбіты фашысцкай авіяцыяй.

Немцы нанеслі ўдар на ўчастку Янаў-Падляскі — Славотычы, практычна ахапіўшы ўвесь Брэсцкі раён.

Праціўнік фарсіраваў р. Заходні Буг на ўчастку Зачопкі — Макраны з далейшым наступленнем у напрамку вёсак Лышчыцы, Матыкалы, Кодзень, Дамачава, дзе адкрылі агонь па падраздзяленнях, якія выйшлі да граніцы на абарончыя работы, а потым па раёнах дыслакацыі часцей 75-й стралковай дывізіі ў вёсках Медна і Чэрску.

12-ы нямецкі армейскі корпус, цэнтр ударнай групоўкі праціўніка, наступаў на Брэст, 34-я пяхотная дывізія рухалася на поўдзень, 31-я — на поўнач ад горада і 45-я — у раён Брэсцкай крэпасці.

34-я нямецкая дывізія нанесла вялікія страты размешчаным у Паўднёвым гарадку 22-й танкавай дывізіі, 204-му гаўбічнаму і 455-му карпусному артылерыйскім палкам.

З пачаткам артылерыйскага абстрэлу камандзір 22-й танкавай дывізіі генерал-маёр В.П.Пуганаў аб'явіў баявую трывогу і загадаў часцям падрыхтавацца да выхаду ў раён г. Жабінка. У раёне вёсак Вулька і Валынка батальёны 44-га танкавага палка (капітан М.І.Кудраўцаў і ст. лейтэнант І.Р.Разанаў) контратакавалі праціўніка. Пры падрымцы пешых танкістаў 22-га мотастралковага палка забяспечваўся выхад дывізіі ў зададзены раён. Спробы вывесці тэхніку з-пад абстрэлу каштавалі жыцця многім чырвонаармейцам.

Пры выкананні баявой задачы па кіраўніцтве дзеяннямі 22-га разведвальнага батальёна загінуў начальнік разведкі дывізіі маёр Парфёнаў. У першыя гадзіны вайны загінуў начальнік палітаддзела дывізіі палкавы камісар А.А.Іларыёнаў, намеснік камандзіра дывізіі па тэхнічнай часці ваенінжынер 2-га рангу Е.Р.Чартоў.

Выхадам дывізіі ў раён збору рэгуляваў начальнік штаба дывізіі палкоўнік А.С.Кісліцын.

Танкавую калону, якая накіроўвалася да Жабінкі, узначальваў камандзір дывізіі генерал-маёр В.П.Пуганаў.

Тыя падраздзяленні, якія не мелі танкаў і аказаліся без аўтамашын, пад

камандаваннем намесніка камандзіра дывізіі І.В.Конанава накіроўваліся да Жабінкі праз вёскі Пугачова і Радванічы.

Становішча ўскладнялася яшчэ і тым, што запасы гаручага дывізіі захоўваліся ў в. Пугачова на складзе гаруча-змазачных матэрыялаў (пры дывізіі была толькі адна запраўка), а баявыя камплекты танкістаў знаходзіліся на дывізіённым складзе на Валынскім умацаванні Брэсцкай крэпасці.

Да поўдня 22-я танкавая дывізія з вялікімі стратамі выйшла ў раён вёсак Хмелева, Селішча, Падрэчча, страціўшы большую частку танкаў, звыш 50% аўтамашын, усе запасы гаручага і боепрыпасаў, 20% асабовага складу. Матчасць мела адзін бензабак і адну запраўку гаручага.

22-і мотастралковы полк дывізіі сканцэнтраваўся ў лесе на ўсход ад в. Радванічы.

Пры знішчэнні штабных дакументаў загінуў лейтэнант І.Л.Смагін. Сцяг палка быў выратаваны І.А.Лук'янчыкавым і лейтэнантам І.М.Жэндзінскім.

Згубіўшы надзею на пераправу, уцалелыя батарэі па загадзе І.А.Лук'янчыкава пачалі адступленне да в. Радванічы.

У 9 гадзін раніцы ў раёне в. Камяніца-Жыровецкая, абсталяваўшы агнявыя пазіцыі і назіральныя пункты, батарэі адкрылі агонь па пантонным мосце праціўніка. Становішча пагоршылася пасля таго, як з боку м. Дамачава рушылі танкі і мотапяхота праціўніка.

Сумесна з 22-й танкавай дывізіяй з поўдня Брэст прыкрывалі 204-ы гаўбічны (капітан І.А.Лук'янчыкаў), 455-ы карпусны (маёр К.І.Каралёў) артылерыйскія палкі і асобныя часці 28-га стралковага корпуса. Дзякуючы хуткім і рашучым дзеянням капітана І.А.Лук'янчыкава асноўная частка гармат 204-га гаўбічнага артылерыйскага палка была выведзена з артылерыйскага парка. Аднак перайсці р. Мухавец, каб сумесна з 84-м стралковым палком 6-й стралковай дывізіі заняць абарону, удалося нямногім.

У другой палове дня 22 чэрвеня чатыры батарэі палка занялі пазіцыі каля в. Малыя Радванічы, каб прыкрыць адыход палка на новыя рубяжы. Апынуўшыся ў акружэнні, артылерысты пад камандаваннем ст. лейтэнанта Ю.А.Каморнага вялі бой да апошняга снарада. Потым сапсавалі гаўбіцы, спалілі цягачы і рушылі да сваіх. У гэтым баі вызначыліся палітрук Р.Ф.Кузьменка, радавы Талкачоў і іншыя.

На поўнач і паўночны-ўсход ад Брэста збіраліся рэшткі войскаў, якія адступалі з крэпасці і Паўночнага гарадка. Байцы прыходзілі групамі і па адным, іншы раз напаўраздзетымі, без зброі.

Асабліва ў цяжкім становішчы апынуўся 1-ы дывізіён 131-га артылерыйскага палка 6-й стралковай дывізіі. Дзяжурным па палку ў ноч на 22 чэрвеня 1941 г. быў мал. лейтэнант І.Д.Журбенка. Менавіта ён кіраваў абаронай, арганізаваў дастаўку патронаў з палаючага склада.

Тыя, хто застаўся ў жывых і вёў ружэйны агонь, адступалі да гарнізонных могілак і форта Граф Берг. У форце пад камандаваннем сяржанта І.А.Агапава трымаліся да 18 гадзін, а потым адступілі ў напрамку в. Цюхінічы. Трэба адзначыць, што некалькі чалавек абараняліся ў гэтым форце да 25 чэрвеня 1941 г.

Да Жабінкі адыходзілі ўцалелыя групы воінаў 131-га артылерыйскага палка пад камандаваннем начальніка штаба палка капітана У.В.Русанава. Батарэі гэтага дывізіёна, якія знаходзіліся ў лагеры, адкрыць агонь па праціўніку не змаглі з-за адсутнасці баявых снарадаў.

У другой палове дня 22.6.1941 г.

рэшткі 131-га артпалка выйшлі да Жабінкі.

Часці 28-га стралковага корпуса, якія размяшчаліся ў Паўночным гарадку, панеслі меншыя страты ў асабовым складзе і тэхніцы.

17-ы гаўбічны артылерыйскі полк (маёр А.В.Навіцкі) быў выведзены з гарадка ў складзе двух дывізіёнаў. Штабная дакументацыя, якую не адправілі ў тыл, была знішчана. Радавому А.Ф.Лук'яненку і тэхніку-інтэнданту 2-га рангу Я.В.Чарвякову ўдалося вынесці і выратаваць сцяг палка. Батарэі занялі абарону ў 8—9 кіламетрах на паўночны ўсход ад Брэста каля в. Тэльмы. Адпраўленая на артылерыйскі склад машына вярнулася ні з чым. Зноў прыйшлося адступаць. Да іх далучыліся 455-ы і 447-ы карпусныя артылерыйскія палкі і 18-ы асобны батальён сувязі 42-й стралковай дывізіі.

447-ы карпусны артылерыйскі полк выйшаў з Паўночнага гарадка з 19 гарматамі (36 па штату) і асабовым складам у трыста чалавек. Гэта ўдалося зрабіць дзякуючы рашучым дзеянням камандзіра палка палкоўніка А.А.Маўрына. Паводле яго загаду былі вывезены штабныя дакументы і сцяг палка. У размяшчэнні палка ў Паўночным гарадку загінуў камандзір 3-га дывізіёна капітан С.В.Логінаў, прапалі без вестак лейтэнант А.І.Барушка і ст. лейтэнант В.Ф.Карсакоў.

Адной з першых у раён збору па трывозе (в. Плоска) прыбыла першая батарэя лейтэнанта Э.А.Інашвілі. Нямецкі аэрастат выявіў гарматы. Батарэя адышла да в. Тэльмы і адкрыла агонь па ворагу. Калі засталося па 2—3 снарады на гармату, адышлі да Кобрына.

Першымі ўдарамі праціўніка па Паўночным гарадку быў знішчаны будынак ваенгандлю і казармы 18-га асобнага батальёна сувязі, загінулі радавыя Шапіра, Каваленка. На мосце каля чыгуначнага вакзала была знішчана штабная машына з дакументамі і сцягам, загінуў старшына Маісеенка (Маісееў).

Ноччу 22 чэрвеня ў размяшчэнні батальёна засталіся па адным узводзе з кожнай роты і штабныя падраздзяленні. Астатнія знаходзіліся ў летніх лагерах каля в. Плоска.

Разам з воінамі 18-га і 37-га асобных батальёнаў сувязі вялі агонь і сувязісты 944-га асобнага батальёна, які ўзначальваў ст. лейтэнант Ратнер.

Пад націскам праціўніка сувязісты адышлі да Жабінкі.

Адыходзячыя часці не змаглі сабрацца ў раёнах збору па трывозе.

Каля сямі гадзін раніцы часці 45-й і 34-й нямецкіх пяхотных дывізій занялі Брэст. Адступаючы пад націскам праціўніка, 42-я стралковая дывізія заняла пазіцыі на рубяжы Чарнаўчыцы—Курніца—Велька, 6-я стралковая дывізія — у гаі на поўдзень ад в. Чэрні.

У паласе 62-га ўмацаванага раёна на шляху ворага стаялі гарнізоны дотаў. Але іх становішча было вельмі цяжкае: нярэдка без вады, святла, тэлефоннай сувязі, з недаўкамплектаваным асабовым складам, без боепрыпасаў.

Бліжэй за іншых да горада размяшчаліся доты 1-й роты 18-га асобнага кулямётнага батальёна, які ўзначальваў лейтэнант М.Ф.Бубноў.

Пры штабе батальёна (раён цяперашняга мясакамбіната) акрамя 1-й роты знаходзілася вучэбная рота, якая ў асноўным складалася з толькі што прызваных мясцовых жыхароў, маладых афіцэраў, што закончылі ваенныя вучылішчы. На ўчастку іх казармы абарону арганізаваў лейтэнант І.М.Швейкін. Адзіная машына, якая падвозіла боепрыпасы да дотаў, была ўзарвана ў першыя ж часы вайны. У поўдзень 22 чэрвеня групы воінаў-ураўцаў, гаспадарчыя падраздзяленні, служачыя 21-га будаўнічага ўчастка

62-га УР, пасля вулічных баёў у горадзе выйшлі на паўночную ўскраіну Брэста. Выйсці змаглі не ўсе. Байцы, якіх узначальвалі мал. лейтэнанты П.П.Селязнёў, М.Г.Зімін і старшына І.Ф.Рэхін, стрымлівалі пераправу праціўніка цераз р. Заходні Буг на працягу ўсяго дня 22 чэрвеня 1941 г. Усе яны загінулі. У размяшчэнні 1-й роты загінуў мал. палітрук П.Д.Данілаў. Загінуўшых пахавалі на могілках в. Рэчыца.

У раёне вёсак Гершоны, Аркадзія, Бярнады на працягу 22 і 23 чэрвеня стрымлівалі націск праціўніка гарнізоны дотаў пад камандаваннем камандзіра 2-й роты мал. лейтэнанта І.М.Барысава. Загінуўшыя ў дотах былі пахаваны мясцовымі жыхарамі в. Бярнады.

Увечары 22 чэрвеня 1941 г. нашы часці адышлі ад граніцы на 25—30 кіламетраў. 22-я танкавая дывізія сканцэнтравалася ў Жабінцы і працягвала бой на рубяжы Ракітніца-Радванічы.

42-я стралковая дывізія стрымлівала праціўніка ў Жабінцы, частка 6-й стралковай дывізіі сумесна з 459-м стралковым палком 42-й стралковай дывізіі вяла баі ў раёне в. Федзькавічы, 75-я стралковая дывізія — на ўсход ад в. Медна і за Чэрскам (Пажэжын, Маларыта, Хаціслаў).

Каб прыкрыць і падтрымаць дзеянні адыходзячых груп і часцей, з мэтай разведкі з аэрадрома Імянін на працягу 22 чэрвеня вылятаў моцна аслаблены 123-і знішчальны авіяцыйны полк. У гэтых баях праявіў самаадданасць і гераізм камандзір палка маёр Б.М.Сурын. Ён прымаў удзел у чатырох паветраных баях, збіў тры самалёты праціўніка. У апошнім баі лётчык загінуў. Лётчыкі 33-га знішчальнага авіяпалка (маёр М.І.Акулін) адбівалі налёты нямецкіх самалётаў на Брэст, Кобрын, Пружаны. У 10 гадзін раніцы лейтэнант П.С.Рабцаў ажыццявіў над Брэстам паветраны таран.

Але арганізаваць паветраную разведку, прыкрыццё нашых войскаў знішчальнай авіяцыяй, нанесці адчувальныя бомбавыя ўдары па ворагу дывізія не мела магчымасці.

Адпаведна з дырэктывай НКА СССР № 2 ад 22 чэрвеня 1941 г. на наступны дзень штабам 4-й арміі войскам быў дадзены асобны баявы загад перайсці ў наступленне сіламі 14-га механізаванага корпуса, 28-га стралковага корпуса і хуткай бамбардзіровачнай авіяцыі 10-й змешанай авіяцыйнай дывізіі, каб у канцы 23 чэрвеня выбіць ворага з Брэста.

23 чэрвеня 1941 г. войскі 4-й арміі перайшлі ў контрнаступленне ў раёне Жабінкі. Праціўнік не чакаў з нашага боку ўдару і на некаторых участках, у тым ліку ў раёне в. Пелішча і ўздоўж чыгункі ад Жабінкі да Брэста, быў адкінуты на некалькі кіламетраў. Але праз паўгадзіны з'явіліся фашысцкія бамбардзіроўшчыкі і адкрылі агонь па танках 14-га мехкорпуса генерал-маёра С.І.Аборына. Потым перайшла ў наступленне танкавая група Г.Гудэрыяна. На рубяжы Камянец—Жабінка—Вялікія Радванічы разгарнуўся жорсткі танкавы бой. Узначальваў контратаку генерал-маёр В.П.Пуганаў. У гэтым баі асабліва вызначыўся танкавы экіпаж ст. сяржанта М.В.Спічанкова, якому ўдалося падбіць 5 танкаў праціўніка і вывезці з поля бою, узяўшы на буксір, некалькі нашых падбітых танкаў. М.В.Спічанкоў загінуў у баі. Загінулі і камандзір дывізіі генерал-маёр В.П.Пуганаў, камандзір 44-га танкавага палка маёр І.Д.Квас.

Пад націскам перавышаючых сіл праціўніка нашы часці адышлі на ўсход, а асобныя групы воінаў, якія засталіся ў акружэнні, прарываліся праз баявыя парадкі праціўніка да лініі фронту.

Л.Р.Бібік.

Гарачыя дні абароны

З успамінаў былога камандзіра 235-га артпалка 75-й стралковай дывізіі маёра З.Т.Бабаскіна

У першы дзень баёў на нашым участку абароны гітлераўцы страцілі 21 машыну і каля 600 чалавек забітымі. Немалыя страты панеслі і мы. Некаторыя гарматныя разлікі, зрасходаваўшы ўсе снарады, па-геройску загінулі пад гусеніцамі танкаў. У гэтых баях загінулі смерцю храбрых камандзір дывізіёна капітан Макаранка, камандзір штабной батарэі ст. лейтэнант Цымбал і шмат іншых баявых таварышаў.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977.

З успамінаў былога хімінструктара роты 34-га стралковага палка К.П.Шведкава

75-я стралковая дывізія прымала ўдзел у баях з фінамі, у маі 1941 г. дыслацыравалася ў Палескай вобласці і ўваходзіла ў склад Заходняй ВВА, адкуль была пераведзена ў штат 4-й арміі. Часці дывізіі размясціліся ў лагерах Маларыцкага і Дамачаўскага (цяпер Брэсцкага) раёнаў, а штаб — у Маларыце.

34-ы стралковы полк (камандзір маёр Я.І.Бярдзееў), 68-ы лёгкі артылерыйскі полк (камандзір палкоўнік М.Д.Бажко), 110-ы медсанбат, 219-ы асобны артдывізіён знаходзіліся ў раёне в. Медна і каля возера Рагазнянскае.

28-ы стралковы полк (маёр Д.С.Бандарэнка), 235-ы гаўбічны артполк займалі ўчастак у раёне Дамачава — Чэрск — Мелавая гара, а 115-ы стралковы полк (камандзір маёр А.Н.Лабанаў) знаходзіўся ў лесе ў 2 кіламетрах ад Маларыты.

... Першы бой з фашыстамі дывізія пачала 22 чэрвеня ў 4.00 раніцы. Па нашых палатках немцы адкрылі агонь з артылерыі, а самалёты пачалі расстрэльваць з брыючага палёту ўсіх, хто быў у полі іх зроку. Шмат нашых хлопцаў засталіся ляжаць забітымі ў палатках каля пірамід са зброяй. Жывыя, атрымаўшы патроны, занялі абарону. Трэці батальён змагаўся каля станцыі Дубіца. Адыходзіў з боем, але ж усе мы трымаліся да 21 гадзіны і па загадзе адышлі ў бок лагера, але мы ўжо фактычна былі ў акружэнні. Адышлі ў лес каля возера Рагазнянскае, занялі новую абарону і ўсю ноч з 22 на 23 чэрвеня вялі бой з немцамі.

Раніцай 23 чэрвеня камандзір палка загадаў начальніку палкавой школы капітану Масіашвілі сабраць з былых выпускнікоў групу добраахвотнікаў і прарваць абарону немцаў. Сабралася каля 40 чалавек. Пайшлі ў атаку ва ўвесь рост (гэта было на ўзлессі). Немцы прамой наводкай білі па нас, аднак група перастраляла разлікі гармат і мінамётаў і прарвала нямецкую абарону, а праз прарыў пачалі выходзіць усе, хто меў магчымасць.

Фонды музея народнай славы ў в. Медна. Кіраўнік П.Д.Карабейка.

З успамінаў Героя Савецкага Саюза Ф.А.Асташонка

У першыя дні чэрвеня загадам па 4-й арміі я быў прызначаны кіраўніком групы па рэкагнасцыроўцы другога рубяжа брэсцкіх апорных пунктаў...

21 чэрвеня наша група знаходзілася ў в. Турна. Калі ў пачатку пятай гадзіны раніцы 22 чэрвеня вартавы разбудзіў мяне і паведаміў, што на граніцы чутны кананада і моцныя выбухі, я не сумняваўся, што пачалася вайна.

Аб'явіўшы трывогу для асабовага складу, загадаў падрыхтавацца да выезду ў Брэст. Каля 7 гадзін раніцы мы дайшлі да скрыжавання шашэйных дарог у некалькіх кіламетрах на поўдзень ад мястэчка Чарнаўчыцы. Тут я сустрэў групу байцоў, некалькі камандзіраў і грузавік, на якім знаходзіліся параненыя...

Я загадаў кулямётнаму ўзводу, стралковаму аддзяленню і сапёрам заняць абарону каля шашы. Машыну з параненымі накіраваў у армейскі шпіталь, у Кобрын.

У гэтую ж гадзіну з густога жыта выйшла каля 30 курсантаў палкавой школы 125-га стралковага палка з вінтоўкамі і двума кулямётамі. Камандзір узвода паведаміў, што непадалёку ў жытнім полі знаходзіцца камандзір палка маёр А.Э.Дулькейт з 9-й ротай колькасцю 50 чалавек.

Дулькейт паведаміў аб становішчы ў Брэсце. Горад быў у акружэнні. З крэпасці прарываюцца толькі малыя групы і адзіночкі, многія з іх уплаў цераз абводны канал, таму што вароты вораг трымае пад агнём. Дзе штаб дывізіі, не ведае, пасланыя ім сувязныя назад не прыйшлі. Колькасць падыходзячых байцоў і камандзіраў 6-й і 42-й дывізій узрастала...

Удзень а другой гадзіне ў наша распалажэнне па шашы ад граніцы прарваліся 10—12 нямецкіх матацыклістаў. Згубіўшы траіх забітымі, гітлераўцы павярнулі назад. Праз гадзіну з таго ж боку паказалася да дзесяці лёгкіх танкаў...

Пад вечар праціўнік выбіў нашу роту з Чарнаўчыц і заняў гэты населены пункт. З раёна Жабінкі даносілася стралянінa. Мы разумелі, што праціўнік прарваўся ў наш тыл і пагражае акружэнцам.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977.

З успамінаў ваентэхніка 2-га рангу, камандзіра транспартнай роты 44-га танкавага палка 22-й танкавай дывізіі І.І.Варанца

... У палку ўбачыў страшэнную карціну: сотні людзей ляжалі ў розных позах забітыя і параненыя, многія з іх, сыходзячы крывёю, прасілі аб дапамозе. Пазбіраўшы ўсіх у месцы, дзе можна было схавацца ад агню, пачалі эвакуацыю параненых і ўзяліся выратоўваць ваенную тэхніку. Усё рабілася пад бесперапынным абстрэлам. Транспартныя машыны маёй роты вывезці не ўдалося. Яны ўжо дагаралі, стоячы на падпорах. Па загадзе камандзіра палка я ўзначаліў камандаванне зборнай танкавай ротай, таму што папярэдні штатны састаў аднавіць было немагчыма...

Падзеі разгортваліся з незвычайнай хуткасцю. Успыхнулі пажары ў Валынцы, Вульцы, Пугачове і Брэсце.

Адышоўшы ад разгубленасці, часці дывізіі ў перадбаявых парадках выходзілі на зборныя пункты. Да ўсходняй ускраіны Пугачова сцякаліся пешыя...

Каля моста цераз Мухавец у раёне Брэст-Палескі стаялі насмерць салдаты з роты лейтэнанта М.І.Панамарова. Відавочцы потым апавядалі, што там засталіся спаленыя танкі разам з экіпажам, а вакол іх трупы варожых матацыклістаў, перавернутыя гарматы з забітым разлікам.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977.

З успамінаў былога камандзіра 3-га батальёна 125-га стралковага палка 6-й Арлоўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М.Е.Калеснікава

...Цёплы і сухі май 1941 г. падыходзіў да канца, калі 3-і батальён атрымаў загад выйсці з крэпасці ў раён Чыжэвічы — Вельямовічы — Чылеева, кіламетраў 12—15 на поўнач ад Брэста, для будаўніцтва палявых умацаванняў уздоўж Буга.

На новым месцы жыццё батальёна ўвайшло ў рамкі звычайнага воінскага распарадку і забурліла ў хуткім і напружаным тэмпе. Але ненадоўга.

Крывавы ўсход 22 чэрвеня. Батальён па маім загадзе хутка заняў абарону на раней падрыхтаваных пазіцыях. З правага боку —нікога, з левага — адна Чылееўская застава. Прыкрываючыся артылерыйскім і мінамётным агнём, фашысты пачалі пераправу цераз Буг. Закіпеў бой.

У трох месцах праціўнік спрабаваў пераправіцца цераз раку ўброд, на гумавых лодках і па штурмавых мосціках, але быў адбіты нашым агнём. Паплылі па рацэ трупы варожых салдат і афіцэраў.

Упартую барацьбу з гітлераўцамі вяла 7-я стралковая рота лейтэнанта Гаршкова. Лейтэнант Гаршкоў атрымаў некалькі раненняў, але працягваў камандаваць ротай, павёў яе ў контратаку і першым уварваўся ў рады наступаючага ворага, знішчаючы яго ў рукапашнай схватцы. Адважна біўся і малодшы палітрук Чыкалін.

У гэты дзень быў забіты камандзір 8-й стралковай роты. Прыняў яе старшы ад'ютант батальёна лейтэнант В.А.Аляксееў, які прарваўся да батальёна з горада і атрымаў пры гэтым раненне. Ён натхняў байцоў асабістым прыкладам.

Пазней з групай байцоў ён прабіўся на поўнач, спадзеючыся знайсці свае часці і прасіць у іх дапамогі. Сваіх знайшоў, але дапамагчы ў абставінах, якія склаліся, яны не змаглі...

24 чэрвеня. Каля станковага кулямёта застаўся толькі двойчы паранены сяржант Мячыкаў. Падпусціўшы фашыстаў на

блізкую адлегласць, ён касіў іх прыцэльным агнём. Раззлаваныя гітлераўцы абрушылі на гэты агнявы пункт мора агню, усё знікла ў дыме і пыле. Калі вораг падымаўся ў атаку, зноў ажываў кулямёт сяржанта.

Па-геройску загінуў і лейтэнант Гаршкоў. 25 чэрвеня аддаў сваё жыццё за Айчыну малодшы палітрук Чыкалін... Аддаў загад 9-й стралковай роце прарваць акружэнне і выйсці да вёскі Вельямовічы. Рота тройчы кідалася ў атаку, згубіла свайго камандзіра, але прарвацца не змагла. Няўдалай была і атака ўзвода мінамётчыкаў. Іх камандзір старшына Мягкіх таксама быў забіты...

Ноччу 26 чэрвеня застаўшаяся ад батальёна група закідала праціўніка гранатамі і вырвалася з кальца.

Раніцай 4 ліпеня ў пяці кіламетрах на поўнач ад Кобрына нечакана наткнуліся на моцную групу гітлераўцаў. Ухіліцца ад бою не ўдалося, і ў кароткай бязлітаснай схватцы тыя 20 чалавек, што засталіся ў батальёне, былі забіты або паранены.

Асабовы склад 3-га батальёна 125-га стралковага палка сумленна і да канца выканаў свой абавязак перад партыяй і Радзімай.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977.

Дакументы сведчаць

З АПЕРАТЫЎНАГА ДАНЯСЕННЯ Ў ШТАБ НЯМЕЦКАЙ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР»

22 чэрвеня 1941 г.

Группа армий «Центр» оперативный отдел исх. 1/41
Штаб 22.06.41. 8.00
Утреннее донесение на 8.00 22.06.41. 4 армия.

Наступление продолжается успешно. В общем отмечается слабое сопротивление противника. По-видимому, противник на всех участках застигнут врасплох.

Мосты через р. Зап. Буг: мост у Кодень, ж.д. мост у Бреста и мост в районе Франолув взяты нашими войсками. Наши авангарды к 6.00 достигли общей линии 4—5 км (восточнее границы).

Сопротивление в Бресте оказывается главным образом в городской части — в крепости.

Постройка мостов ведется строительными частями корпусов. Внезапность достигается непрерывными сильными ударами по арьергардам противника. До сих пор отмечается незначительная активность авиации противника. Сбит один наш самолет-разведчик.

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 500. Воп. 12 451. Спр. 134. Л. 143.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ 28-га СТРАЛКОВАГА КОРПУСА

22 чэрвеня 1941 г.

В 12.00 22.06.41 г. связь со штабом 6-й стрелковой дивизии (роща южнее Черни) прекратилась и в дальнейшем местонахождение командира дивизии полковника т. Папсуй-Шапко и его штаба установить не удалось. Связь со штабом 75-й стрелковой дивизии (Малорита) за весь период боевых действий установить не удалось ни в штакоре, ни в штаарме [штаб корпуса, штаб армии].

Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 318. Воп. 4631. Спр. 8. Л. 55.

ЗВОДКА САЎІНФАРМБЮРО ПАВЕДАМЛЯЛА

29 чэрвеня 1941 г.

Воспользовавшись тем, что Советские войска не были подведены к границам, немцы, не объявляя войны, воровским образом напали на наши пограничные части, и первый день войны хваленые немецкие войска воевали против наших пограничников, не имевших ни танков, ни артиллерии. К концу первого дня войны и весь другой день войны только передовые части наших регулярных войск имели возможность принимать участие в боях, и только на третий, а кое-где на четвертый день войны наши регулярные войска успели войти в соприкосновение с противником. Именно ввиду этого удалось немцам занять Белосток, Гродно, Брест, Вильнюс, Каунас.

Зводкі Савецкага інфармбюро. Т. 1. М., 1944.

Падрыхтаваў В.П.Россіхін.

Вёска ратавала савецкіх воінаў

Вайна ўвайшла ў жыццё вёскі Медна ўранку 22 чэрвеня 1941 г. З-за Буга гітлераўцы абстралялі вёску. Гэта, мабыць, здарылася таму, што ў навакольных лясах каля Рагазнянскага возера дыслацыраваліся часці 75-й стралковай дывізіі. У вёсцы згарэла некалькі хат. Былі забіты Герасім Пятровіч Васілюк, Фядос Іванавіч Міхальчук, Рыгор Антонавіч Міхалюк, Ганна Рыгораўна Міхалюк, Наталля Рыгораўна Пякун, Вольга Цялепка і іншыя.

Спачатку акупанты не турбавалі сялян. Але ўсе разумелі, што за дапамогу чырвонаармейцам можна развітацца са сваім жыццём. І ўсё ж многія ў вёсцы далі прытулак сем'ям ваеннаслужачых і параненым. Іх сабралася 36 чалавек. У Медна і сёння памятаюць кантужанага ў баі Васіля Алфёрава, які жыў у Рыгора Пальчука. Спачатку ён хаваўся ў лесе, дзе яго знайшлі вясковыя пастушкі. Яны прыносілі яму ваду і ежу.

Аднойчы ў вёску прыйшлі паліцэйскія. Васіль з двума таварышамі пабег да лесу. Двое паліцэйскіх кінуліся наўздагон. Адзін з паліцэйскіх быў з суседняй вёскі. Ён не стараўся злавіць чырвонаармейцаў. Наўмысна выпусціў з рук сумку з патронамі і доўга збіраў іх у снезе, чым даваў чырвонаармейцам шанц дабегчы да лесу. А другі паліцай вельмі стараўся. Ён параніў Васіля ў руку. Байцы ўцяклі ад пагоні. Па іх слядах пайшлі дзеці, доўга шукалі, але знайшлі, дапамаглі параненаму Васілю.

У сям'і Аксенція Майсеевіча Ярашука жыў старшы лейтэнант Чырвонай Арміі Дзмітрый Фёдаравіч Жданаў. Ён збег з фашысцкага лагера з Маларыты. А.М.Ярашук дапамагаў яму ў пошуку палкавога сцяга, які, каб не трапіў ворагу, быў закапаны ў лесе пад вялікай сасной. Але пасля пажару ў лесе нельга было знайсці тое месца...

Аднойчы немцы наляцелі на вёску знянацку. Адразу ж накіраваліся да Ярашука. Мабыць, нехта падказаў ім. Жданаў убачыў іх, праз акно скочыў у двор і кінуўся да брамы. Але там стаяў нямецкі салдат. Ён адкрыў агонь і цяжка параніў уцекача ў спіну. Карнікі сагналі ўсю вёску, каб апазналі Жданава. Усе маўчалі. Тады немцы забралі ўсю сям'ю Ярашукоў (іх было шасцёра), павезлі ў Дамачава, дзе і расстралялі.

За гады акупацыі загінула амаль 200 жыхароў вёскі.

С.Р.Іваненка.

Немецкія мінамётчыкі на пазіцыі пад Брэстам.

Лазарэт Сарачынскага

У ваколіцах вёскі Чарнаўчыцы ўжо ў першы дзень вайны ішлі баі з гітлераўцамі. Адразу ж да чырвонаармейцаў прыбег мясцовы фельчар Іосіф Ігнатавіч Сарачынскі, пачаў перавязваць параненых. Яму дапамагалі медсястра Яўдакія Васільеўна Макарава і браты Аляксей і Мікалай Бышкі. Яны шукалі параненых на густым іржышчы, пераносілі іх у вёску. Давялося І.І.Сарачынскаму прааперыраваць салдата прама на полі: спыніў крывацёк, адрэзаў брытвай, якую прачысціў ёдам, перабітую кісць левай рукі. Да трынаццаці байцоў, падабраных вяскоўцамі ў першы дзень вайны, пазней далучыліся Барыс Сошнікаў і Пётр Багамаз. Лячыць 15 параненых было цяжка. Не хапала медыкаментаў, перавязачных матэрыялаў. На бінты рэзалі прасціны. Не было чым і карміць іх. На дапамогу прыйшлі аднавяскоўцы Крысціна Налівайка, Настасся Катовіч, Марыя Рыбчэўская і іншыя. Еўдакія Макарава і Антаніна Барсук гатавалі ежу. Схадзіў Іосіф Ігнатавіч і ў царкву прасіць дапамогі. Потым кожную раніцу на ганку знаходзіў ён то кавалак сала, то хлеба.

Фашысты даведаліся пра «шпіталь». Аднойчы яны ўварваліся ў двор Сарачынскіх. У хляве знайшлі параненых. Адзін з іх сарваў павязку з Пятра Арлова. З раны хлынула кроў. Пераканаўшыся, што ў хляве знаходзяцца цяжкапараненыя, пайшлі, нікога не забраўшы. Праз некаторы час ачунялыя праз лінію фронту дабраліся да сваіх. Але трагічны лёс напаткаў брата І.Сарачынскага Фёдара. Нечакана з'явіліся гітлераўцы і ў хляве знайшлі аднаго брата, якога тут жа застрэлілі.

Пасля вайны да І.І.Сарачынскага прыязджалі выратаваныя ім Пётр Георгіевіч Арлоў з Маскоўскай вобласці, Сяргей Сцяпанавіч Шаўчэнка з Днепрапятроўшчыны.

Патрыятычны ўчынак Іосіфа Ігнатавіча адзначаны медалём «За адвагу».

В.П.Россіхін.

Першымі ўступілі ў бой пагранічнікі

17-ы Брэсцкі Чырванасцяжны пагранічны атрад ахоўваў граніцу на працягу 182 кіламетраў уздоўж ракі Буг. 22 чэрвеня 1941 г. у 4.00 сувязь з падраздзяленнямі атрада і начальнікам гарнізона Брэста была перарвана... З 5.00 пагранатрад невялікімі сіламі на працягу некалькіх гадзін стрымліваў наступаючага праціў-



Мемарыяльная дошка на сцяне санаторыя «Бярэсце».

Помнік на магіле невядомага савецкага лётчыка, загінуўшага 22.6.1941 г., в.Літвіны.

ніка. У бой уступілі 20 пагранзастаў, 10 з іх, атрымаўшы дапамогу ад падраздзяленняў падтрымкі Чырвонай Арміі, стрымлівалі націск гітлераўцаў ад 10 да 15 гадзін.

1-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. СУТНО)

У чатыры гадзіны раніцы 22.6.1941 г. на заставу абрушыўся агонь ворага. Абстрэл працягваўся больш за 30 хвілін. За гэты час гітлераўцы падрыхтаваліся да навядзення пантоннага моста. Група пагранічнікаў пад камандаваннем малодшага лейтэнанта А.В.Урусава і палітрука І.А.Шаброва адкрыла агонь па пераправе. Але праціўнік змог пераправіць тэхніку і акружыў заставу. Да 12 гадзін дня было адбіта некалькі атак ворага. Пад вечар тыя, што засталіся жывымі, далучыліся да адыходзячых часцей нашай арміі.

2-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. НАВАСЁЛКІ)

Фарсіраваўшы раку, немцы павялі наступленне на заставу. У 7 гадзін раніцы адна нямецкая рота ў паходным парадку падыходзіла да в. Навасёлкі. Падпусціўшы яе метраў на 70, пагранічнікі з усіх агнявых сродкаў адкрылі агонь. Рота фашыстаў была знішчана.

На левым флангу вораг таксама фарсіраваў раку і павёў атаку на паўднёвую ўскраіну вёскі, прыкрываючыся мінамётным і кулямётным агнём. У 8 гадзін раніцы немцы высадзілі дэсант каля 30 чалавек за 2 кіламетры на паўднёвы ўсход ад Навасёлак, але група палітрука Гарбачова прыкавала іх сваім агнём да зямлі.

Праціўнік вырашыў акружыць заставу. Пад націскам ворага пагранічнікі, пад кіраўніцтвам капітана Кандрацьева адышлі да заставы і да ўсходняй ускраіны вёскі. Але гітлераўцам удалося акружыць заставу. У 18 гадзін начальнік заставы малодшы лейтэнант Гарбуноў аддаў загад на прарыў варожага кальца ў напрамку в. Воўчын. Бой з праціўнікам у раёне в. Навасёлкі ішоў на працягу 14 гадзін.

Вораг згубіў больш за 300 чалавек забітымі і параненымі.

3-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ВЕЛІЧКОВІЧЫ)

На правым флангу заставы дзейнічала група абаронцаў на чале з палітруком І.Д.Кадацкім, на левым — старшага лейтэнанта В.М.Міхайлава, у цэнтры — абарону трымала група малодшага палітрука В.Д.Плахотніка.

Немцы вялі артабстрэл заставы, снарады рваліся ў акопах абаронцаў, абвальваліся будынкі. Паявіліся забітыя і параненыя.

Каля 7 гадзін раніцы паказалася нямецкая пяхота. Салдаты ішлі ў поўны рост. Пагранічнікі сустрэлі іх арганізаваным ружэйна-кулямётным агнём. Немцы кінуліся назад. Новая атака — вораг заняў лес каля заставы, пачалося яе акружэнне. Пад вечар начальнік заставы аддаў загад: усім жывым прабівацца да в. Дубовай.

4-я ПАГРАНЗАСТАВА (ВЁСКІ ЛАЗОВІЦА, РУДАВЕЦ)

На заставу абрушыўся шквал артылерыйска-кулямётнага агню праціўніка. Пад яго прыкрыццём немцы пачалі пераправу цераз р. Буг. Але адразу фарсіраваць яны не змаглі. Агонь пагранічнікаў сарваў пераправу. У адказ зноў масіраваны артабстрэл, падключыліся варожыя мінамёты. Бой за пераправу працягваўся каля чатырох гадзін. Пагранічнікі заставы на чале з начальнікам старшым лейтэнантам І.Г.Ціханавым мужна вялі няроўны бой з фашыстамі. Гітлераўцы двойчы прапанавалі пагранічнікам спыніць агонь і здацца, але пакуль былі боепрыпасы воіны супраціўляліся. Шмат з іх загінула...

5-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ЧЫЛЕЕВА)

... Пагранічнікі, разбіўшыся на групы, занялі абарону ў 4 акопах вакол заставы. Было адбіта некалькі атак ворага.

Успамінае жыхарка в. Чылеева Аляксандра Скавародка: «Пагранічнікі шмат іх паклалі. Асабліва, калі немцы праз роўны луг пабеглі да заставы са штыкамі наперавес. Пагранічнікі з кулямёта па іх. Немцы заляглі, а потым схапілі ў вёсцы старых, жанчын, дзяцей і павыганялі на луг паміж пагранічнікамі і іх салдатамі. Пагранічнікі перасталі страляць. Немцы адышлі, пасля чаго пусцілі некалькі танкаў і пайшлі на заставу з усіх бакоў...»

І супраць танкаў пагранічнікі не спасавалі. Захараў звязкай гранат падарваў гусеніцу першага танка, астатнія спыніліся і пачалі абстрэльваць пагранічнікаў з двух бакоў. Застава вяла бой 5 гадзін, а тыя што засталіся жывымі, адышлі да в. Ракавіца.

6-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ШУМАКІ)

Супраць заставы праціўнік кінуў узмоцнены батальён пяхоты з танкамі, арты-

лерыяй, мінамётамі. Пагранічнікі занялі блакгаузы і акопы, падпусцілі ворага на 50 метраў і адкрылі агонь.

«Прыкладна ў 9.00 з шостай заставы, — успамінае М.А. Нікіфараў, начальнік штаба камендатуры, — прабіўся паранены чырвонаармеец (прозвішча яго не памятаю), які паведаміў, што кіраўніцтва заставы загінула, а камандуе застаўшыміся ў жывых камандзір кулямётнага аддзялення сяржант Шатохін. Пагранічнікі заселі ў блакгаузах, а нямецкія танкі іх расстрэльвалі амаль што ва ўпор».

7-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. НЕПЛІ)

22 чэрвеня ў 4.10 па заставе быў адкрыты варожы агонь з гармат, мінамётаў, кулямётаў. Начальнік заставы, выскачыўшы са сваёй кватэры, кінуўся да казармаў і быў забіты. Камандаванне прыняў старшы палітрук В.Г.Умноў.

Немцы навялі два пантонныя масты цераз Буг і пераправіліся па іх, акружаючы заставу. Снарад трапіў у будынак заставы, пачалі рвацца патроны і гранаты на складзе. Параненага Умнова на кані адправілі ў в. Клейнікі.

Разбіўшыся на маленькія групы, пагранічнікі пачалі з боем адыходзіць. Повар І.Грыгор'еў, будучы двойчы параненым, прыкрываў гранатамі і агнём з вінтоўкі адыход таварышаў і загінуў у няроўным баі. 8 гадзін невялікая частка пагранічнікаў вяла бой з фашыстамі.

8-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ДУБРОЎКА)

Немцы дакладна прыстралялі свае гарматы і па заставе білі без промаху. Снарады клаліся густа. Паявіліся першыя параненыя, першыя страты. Пагранічныя нарады вялі агонь па праціўніку, які фарсіраваў Буг. Пасля сямігадзіннага бою пагранічнікі па загадзе начальніка заставы пачалі адыходзіць на ўсход.

9-я ПАГРАНЗАСТАВА (КРЭПАСЦЬ)

Хутка раніца. Дзесь далёка ледзь чутны гукі выбухаў. Праз некалькі хвілін ад жудаснага ўзрыву затрашчала шкло. У казарму ўрываецца дым. Валіцца частка будынка. Вакол стогны параненых. Усе, хто можа трымаць зброю, — да акон, амбразур, праломаў у сценах.

Пасля артналёту — атака, затым другая, трэцяя... Над галовамі пагранічнікаў, якія прыхінуліся да кулямётаў і вінтовак, неба ў дыме, верхнія паверхі разбіла ўзрывамі. Кіжаватаў з двума байцамі ўзбіраецца на пляцоўку другога паверха, яшчэ не разбуранага з вугла будынка, устанаўліваюць там кулямёт. Яго агнём і гранатамі адбіта яшчэ адна атака варожых аўтаматчыкаў. Кіжаватаў вядзе пагранічнікаў насустрач новаму ланцугу гітлераўцаў. Справа ўздымаюцца з вінтоўкамі байцы суседняга стралковага палка.

С.В.Барадоўскі.

10-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ВАЛЫНКА)

На заставе ўступіла ў бой з немцамі група пагранічнікаў колькасцю да 30 чалавек. Камандаваў ёй начальнік заставы малодшы лейтэнант М.К.Ішкоў.

Пазіцыя заставы была нязручнай для абароны. Пагранічнікі ўмацаваліся ў драўляным хляве, куды вымушаны былі адысці пад націскам праціўніка. Быў моцны бой. Пагранічнікі аказвалі супраціўленне, пакуль не загінулі ў ахопленым полымем хляве.

У 1977 г. у час земляных работ непадалёку ад в. Валынка былі знойдзены астанкі 16 пагранічнікаў заставы. З ваеннымі ўшанаваннямі яны былі пахаваны ў брацкай магіле.

11-я ПАГРАНЗАСТАВА (х. МІЦЬКІ)

З успамінаў начальніка заставы У.У.Еўдакімава

22 чэрвеня ў 4 гадзіны раніцы ў наш тыл прыляцеў нямецкі самалёт. Адначасова пачаўся артылерыйскі і мінамётны абстрэл заставы, населеных пунктаў, Паўднёвага гарадка і Брэста.

Асабовы склад заставы быў падняты пад ружжо. Занялі бліндажы. Праціўнік вёў моцны агонь. У 6.00 на заставу прыйшоў тав. Пяроў, нач. штаба камендатуры з кавалерыстам і без коней. Ён прыбыў правяраць пагранічныя пасты на заставе. Я паведаміў аб становішчы.

Тэрыторыя заставы была агароджана жалезным частаколам з вострымі шпілямі на жалезабетонным фундаменце. Пераадолець такі частакол немцам было цяжка. Падыходы да заставы добра праглядваліся з амбразур блакгаузаў. Навакол заставы было пасеяна жыта і немцы бесперапынна вялі агонь па заставе. Аднак на яе тэрыторыю пранікнуць не змаглі. Пагранічнікі

вялі бой, пакуль не скончыліся боепрыпасы. Боепрыпасы былі на зыходзе бліжэй да 12 гадзін.

Параіўшыся з Пяровым, вырашылі знішчыць сакрэтную дакументацыю заставы і з боем выходзіць з акружэння, каб прабрацца ў Паўднёвы гарадок для злучэння з яго гарнізонам.

Фонды мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Воп.17. КПА. Спр. 75.

12-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ПРЫЛУКІ)

22 чэрвеня каля 7 гадзін раніцы да пагранічнікаў далучыўся 2-і батальён 84-га стралковага палка пад камандаваннем старшага лейтэнанта Кормшчыкава, які быў на будаўніцтве ўмацаванага раёна.

М.С.Гузікаў успамінае: «Праціўнік зрабіў некалькі спроб фарсіраваць раку Буг, але сустракаў кожны раз супраціўленне з боку пагранічнікаў 5-й і 6-й стралковых рот, нёс вялікія страты, адыходзіў на зыходныя пазіцыі. Потым атакі немцаў узмацніліся. Каля 13—15 гадзін шляхі адыходу былі адрэзаны праціўнікам».

Тыя, што засталіся жывымі, з цяжкімі баямі выходзілі з акружэння.

13-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. СТРАДЗЕЧ)

З успамінаў жыхара в. Страдзеч Мікалая Ільіча Свірыда

На поўдзень ад заставы быў мост цераз Буг. Каля 4 гадзін ноччу немцы падышлі да моста і прапанавалі двум вартавым пагранічнікам прапусціць іх па мосце. Пагранічнікі патрабавалі, каб немцы адышлі. Тады іх абодвух забілі і рушылі па мосце. Ішлі пяхота, кавалерыя, танкі, гарматы, абозы. У гэты час з кустоў процілеглага берага на адлегласці 300 метраў па заставе ўдарыла артылерыя. Прамым пападаннем будынак заставы быў разбіты, з'явіліся забітыя і параненыя. Вялікія сілы немцаў ужо ў тыле заставы. Ранены ў ногі начальнік заставы лейтэнант Шчагалёў. Нягледзячы на гэта, ён спрабаваў арганізаваць абарону, але быў забіты. Праз кусты і зараснік палітрук вывеў застаўшыхся ў жывых з акружэння. Бой на заставе працягваўся 4 гадзіны.

Фонды мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Сшытак № 50. С.С.Смірноў.

14-я ПАГРАНЗАСТАВА (ВЁСКІ ДУРЫЧЫ, АЛЬХА)

Прыкрываючыся масіраваным агнём, гітлераўцы хутка арганізавалі пераправу цераз Буг і рушылі на заставу.

Пагранічнікі занялі абарону ў трох акопах. Каля 6 гадзін раніцы была адбіта першая варожая атака. Другая пачалася з боку заходняга ўчастка, дзе кіраваў абаронай лейтэнант Тамілаў. Пад прыкрыццём артагню і бронемашын вораг рабіў адну спробу за другой знішчыць заставу. І толькі каля 18 гадзін, не дабіўшыся поспеху, гітлераўцы спынілі атакі.

Ноччу пагранічнікі пачалі адыходзіць у бок рагазнянскіх лясоў.

15-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ДУБІЦА)

У 4.00 22 чэрвеня 1941 г. застава была абстраляна артылерыйскім, мінамётным і кулямётным агнём. Байцы занялі абарону. Фашысцкая пяхота неаднаразова імкнулася атакаваць пагранічнікаў, але пад моцным агнём кулямётаў адкатвалася назад, несучы пры гэтым значныя страты. Па-геройску дзейнічаў у баі станковы кулямётчык яфрэйтар Ткачэнка (пазней забіты). У абароне застава знаходзілася з 8.00 да 16.00. Па загадзе асабовы склад заставы пачаў адыходзіць і далучыўся да часцей 75-й стралковай дывізіі. Пры адыходзе быў цяжка паранены палітрук заставы Паўлюк.

16-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. БАРЫСЫ, п. ДАМАЧАВА)

Пасля артпадрыхтоўкі, ва ўзаемадзеянні з авіяцыяй, немцы пачалі наступленне. Падпусціўшы ворага на невялікую адлегласць, кулямётчыкі і стралкі адкрылі моцны агонь, у выніку немцы былі прымушаны ўцякаць. Разлаваныя беспаспяховасцю першай атакі, яны пачалі другую, але і на гэты раз пацярпелі няўдачу. Было знішчана больш за 100 фашыстаў. Больш за 5 гадзін пагранічнікі стрымлівалі пераўзыходзячага ворага. Не маючы падтрымкі ад часцей Чырвонай Арміі, па загадзе начальніка штаба камендатуры старшага лейтэнанта Палякова застава адышла да сяла Чэрск, дзе далучылася да 75-й стралковай дывізіі. У баях на заставе загінулі смерцю храбрых начальнік заставы лейтэнант Баскакаў і яго намеснік па палітчасці палітрук Пшанічны.

17-я ПАГРАНЗАСТАВА (ВЁСКІ БАГДАНЫ, ЛІПІНКІ)

З успамінаў былога начальніка 17-й пагранзаставы старшага лейтэнанта Бабашнева

... У 4.00, калі пачало крыху світаць, на заставу абрушыўся моцны агонь артылерыі і мінамётаў. Нямецкія захопнікі разлічвалі знянацку знішчыць яе абаронцаў. Пагранічнікі занялі абарону і адкрылі агонь.

У 11.00 загарэўся будынак камандзнага склада, быў разбураны агнявы пункт № 6. Нягледзячы на вялікія страты ворага, мы не змаглі спыніць яго. Пераправіўшыся на наш бераг, рота немцаў развярнулася ў баявы парадак і пачала наступленне. Пагранічнікі адбілі атаку. Каля 12.00, абставіўшы групу прыкрыцця з чатырох чалавек, застава пачала выхад з акружэння.

Фонды мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Воп. 17. КПА. Спр. 73.

18-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ПРЫБАРАВА)

Байцы пад камандаваннем лейтэнанта Багданава аказалі ўпартае супраціўленне фашыстам. Дзесяткі фашыстаў былі знішчаны нашымі байцамі. Аднак, не маючы падтрымкі ад часцей Чырвонай Арміі, пад націскам пераўзыходзячага праціўніка застава адышла ў напрамку с. Вілька-Хрыпская.

19-я ПАГРАНЗАСТАВА (в. ТАМАШОЎКА)

...Пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка было вырашана адысці да дарогі, якая вяла ў мястэчка Шацк, і там заняць абарону каля в. Пішча. Застава, злучыўшыся з часцямі Чырвонай Арміі, пачала бой з праціўнікам.

23 чэрвеня немцы з гэтай вёскі былі выбіты.

У гэтых баях па-геройску біліся станковыя кулямётчыкі Чудноўскі і Запарожац. Смеласць і адвагу паказалі старшына заставы сяржант Іваноў і чырвонаармеец Грабеншчыкоў.

З в. Пішча застава пачала адыходзіць у напрамку г. Любомль, дзе злучылася з 96-м пагранатрадам, з якім у гэты час дзейнічалі 20-я застава і ўпраўленне 5-й камендатуры пагранічнага ўчастка.

20-я ПАГРАНЗАСТАВА (п. АЛЯКСАНДРАЎСКАЯ КАЛОНІЯ, РАЁН в. ТАМАШОЎКА)

...Пасля 10-гадзіннага бою застава адыходзіла на ўсход. Было знішчана да 120 нямецкіх салдат. 22 чэрвеня 1941 г. у 19.30 застава выйшла з варожага акружэння і далучылася да 1-й пагранічнай камендатуры 98-га пагранічнага атрада, а 23 чэрвеня 1941 г. абараняла г. Любомль.

26 чэрвеня застава прыкрывала адыход 45-й стралковай дывізіі, прыняла бой каля чыгункі (вёскі Скібы, Падгародная).

27 чэрвеня 1941 г. застава выйшла з бою і сканцэнтравалася ў Гомелі, куды прыбыла 9 ліпеня 1941 г.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Пограничные войска в годы Великой Отечественной войны. М., 1976.

Падрыхтаваў В.І.Фядосік.

Заўсёды ў баі

З успамінаў былога начальніка 17-га Чырванасцяжнага пагранатрада Беларускай пагранакругі войскаў НКУС маёра А.П.Кузняцова

...17-ы Чырванасцяжны пагранічны атрад займаў адно з вядучых месцаў сярод часцей Беларускай пагранічнай акругі.

Невялікія па колькасці, але моцна згуртаваныя і дружныя гарнізоны застаў, камендатур высока неслі гонар сваіх падраздзяленняў.

21 чэрвеня я вярнуўся з граніцы, дзе правяраў баявую гатоўнасць. Падраздзяленні атрада атрымалі станоўчую адзнаку.

У другой палове дня, заслухаўшы даклады начальніка штаба, яго намеснікаў, у 16.00 пайшоў дадому. Вельмі хацелася пабачыць адзінаццацімесячную дачушку, ды і адпачыць трэба было пасля доўгай камандзіроўкі. Але ні прылегчы, ні паабедаць не ўдалося. Прыкладна ў 17.00 паведамілі аб пажары ў раёне 11-й заставы ў в. Кацельня-Баярская. А праз гадзіну ўзнік пажар на сумежным баку. Прыйшлося выехаць на месца здарэння і прыняць неадкладныя захады, каб ліквідаваць пажар і ўзмацніць ахову граніцы на гэтым участку.

Усе дваццаць лінейных застаў і штабы 3, 4, 5-й камендатур, іх рэзервовыя заставы

і прыштабныя падраздзяленні былі адначасова атакаваны пры падтрымцы артылерыі і авіяцыі пераўзыходзячых сіл праціўніка. Штаб 1-й і 2-й камендатур і іх рэзервовыя заставы, якія знаходзіліся на нейкай адлегласці ад граніцы, былі атакаваны некалькі пазней.

У напрамках галоўных удараў фашысцкай арміі пагранічныя заставы абараняліся па 3—4 гадзіны. А некаторыя змаглі пратрымацца даўжэй. Выканаўшы свой абавязак перад Радзімай, большасць пагранічнікаў гэтых застаў загінула ў няроўным баі. Так здарылася з 4, 10, 13-й заставамі. Пагранічнікі 9-й лінейнай, 3-й рэзервовай застаў, аўтатранспартная рота і іншыя падраздзяленні праявілі вялікі гераізм і мужнасць пры абароне Брэсцкай крэпасці.

Там, дзе вораг наносіў дадатковыя ўдары, на заставы наступалі меньшыя сілы, без танкаў. Тут воіны-чэкісты паспяхова вялі баявыя дзеянні на працягу 10—16 гадзін, а некаторыя больш доўгі час.

На паўднёвы захад ад Брэста ў раёне станцыі Дубіца размяшчаліся 4-я камендатура і 15-я застава.

На досвітку 22 чэрвеня гітлераўцы на гэтым участку пачалі пераправу. Яны ставілі перад сабой задачу — асядлаць чыгунку і шашу каля станцыі Дубіца і выйсці да Медна, у раён дыслакацыі 75-й стралковай дывізіі.

Як толькі пачаўся варожы абстрэл, байцы занялі свае ўчасткі і падрыхтаваліся да абароны.

З кухні выбег повар Ставіцкі і кінуўся да кулямётнага акопа, які быў выкапаны насупраць. Два байцы вярталіся з нарада з правага фланга, яны залеглі каля дуба, на самым беразе ракі. Больш зручнае месца цяжка было знайсці. Адсюль адкрываўся добры агляд, а сам дуб быў надзейным укрыццем. У яго ствале было вялікае дупло, у якім свабодна маглі змясціцца два чалавекі. У ім і схаваліся кулямётчык са сваім напарнікам.

Толькі пад канец дня пачаў заціхаць бой на заставе і фашысты змаглі падавіць кулямёт. Тады яны смела пагрузіліся ў лодкі і рушылі ў наш бок. Але дзе там! Ад дуба, зверху, затрашчаў кулямёт. Гітлераўцы ніяк не маглі зразумець, адкуль вядзецца агонь.

А герой-кулямётчык вельмі ўмела выкарыстоўваў дуб як агнявы пункт. Як толькі фашысты спынялі абстрэл і дэсант выходзіў на сярэдзіну Буга, воін адкрываў агонь з кулямёта. Захопнікі выбіраліся на заходні бераг і пачыналі шалёны абстрэл. Але кулямётчыка надзейна ўкрываў ад варожых куль стары дуб.

Усё слабее бой на станцыі. Ужо да Маларыты прарваліся гітлераўцы, а на гэтым участку яны яшчэ не маглі прайсці наперад.

Доўгі час заставалася невядомым імя гэтага героя. Выявіць яго дапамаглі жыхары Брэста О.Н.Бікалюк і А.С.Гасюк, былыя партызаны, а таксама жыхары Польшчы А.К.Мамчур і Е.П.Гарбавец. У кастрычніку 1964 года мы пабывалі і на брацкай магіле ў Бяла-Падлясцы, дзе пахаваны герой. Музей абароны Брэсцкай крэпасці выявіў і поўнае імя воіна. Яго звалі Аляксей Аляксандравіч Новікаў.

Тром выхаванцам атрада — Андрэю Мітрафанавічу Кіжаватаву (пасмяротна), Міхаілу Іванавічу Мяснікову і Паўлу Іванавічу Галоўкіну прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Тром пагранічным заставам, якія нясуць службу на заходняй граніцы, прысвоены імёны А.М.Кіжаватава, І.П.Бяляева, А.А.Новікава.

Друкуецца са скарачэннямі ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977.

У першыя гадзіны і дні вайны

З успамінаў былога старшыны 5-й пагранзаставы Ільі Пятровіча Максімава

... У 4.00 раніцы 22 чэрвеня 1941 г. гітлераўцы адкрылі па нас артылерыйскі агонь. Артпадрыхтоўка працягвалася 2 гадзіны, у 6.00 у паветра паднялісяся нямецкія самалёты, пачалі бамбіць. Па-за абстрэлам не знаходзілася ніводнага метра прыгранічнай зямлі.

Адначасова на ўчастку заставы немцы пачалі наводзіць дзве пераправы цераз р. Заходні Буг. 1-я на шашы і 2-я — брод каля былой вёскі Дабранечы (яна знесена ў 1939 г). Мы знаходзіліся пад такім абстрэлам, што прыходзілася ў акопах ва ўвесь рост капаць у бок шашы, каб не траплялі

асколкі мін на дно акопа. Частка пагранічнікаў была на граніцы, астатнія занялі кругавую абарону заставы ў акопах, якіх выкапалі чатыры за два дні да пачатку вайны.

Амаль у 7.00 раніцы з'явіўся на шашы першы ланцуг немцаў, наступаючых на нас, нага да нагі, з люлькамі ў роце. Мы іх падпусцілі на кідок гранаты і адкрылі агонь. Наша зброя была: вінтоўкі, гранаты, адзін кулямёт «максім» і адзін «Дзегцярова» — вось і ўсё. Акрамя нас, пагранічнікаў, на нашым участку ніякіх войскаў не было.

Чатыры пагранічнікі ў першым баі на адбудаваным немцамі пантонным мосце на шашы падбілі матацыкліста і адзін бронетранспарцёр і загінулі ў няроўнай схватцы.

Па першаму ланцугу мы адкрылі агонь. Фашысты падалі адзін на аднаго... Атакі паўтараліся, бамбёжкі таксама.

У другой палове дня немцы займаюць вёску ...запальваюць свінарнік (на заставе — *В.Р.*), будынак заставы, гадавальнік сабак, конны двор. Мы з-за моцнай спякоты не змаглі падняцца з акопаў. Гэты варыянт (захапіць заставу — *В.Р.*) таксама не ўдаўся, тады яны збіраюць у вёсцы ўсіх старых з дзецьмі на руках і гоняць іх перад сабой на нас. Мы з акопаў крычым насельніцтву: «Ідзіце, не бойцеся, мы па вас страляць не будзем».

Было вырашана ў тыл насельніцтва, г.зн. цывільных, кінуць гранаты, але гэтага не адбылося — немцы падалі каманду і насельніцтва адбегла ўбок.

Пад вечар на наш акоп немцы пускаюць тры танкі. Ішлі яны адзін за другім, вялі па нас агонь. Першы танк мы падпусцілі метраў на 20, звязалі рамянямі ад штаноў вязкі гранат і калі кінулі пад гусеніцы, то вязка яфрэйтара Захарава дасягнула мэты. З разарванай гусеніцай танк зрабіў круг. Мы былі па-за яго абстрэлам, а гармата была амаль над нашымі галовамі. У назіральную шчыліну танка мы бачылі, як азіраўся вадзіцель. Астатнія два танкі вялі агонь, але на нас не пайшлі. Нас разоў па тры завальвала зямлёй ад разрываў снарадаў. Выцягвалі мы з Захаравым адзін аднаго за ногі. Тут я быў кантужаны і паранены асколкамі ў абедзве нагі.

Яфрэйтар Захараў настаяў, каб мы адышлі ў чацвёрты акоп. Ім камандаваў начальнік заставы малодшы лейтэнант Багамаз. Калі мы папаўзлі па ходу сувязі, над нашым акопам (ямы старога сховішча для агародніны, у іх нарабілі ячэйкі для стральбы стоячы) з'явіліся тры фашысты з аўтаматамі, я ў аднаго стрэліў з пісталета, ён зваліўся ў яму, астатнія двое скокнулі самі, дзве гранаты зрабілі сваю справу — яшчэ тры (варожыя) трупы засталіся ў нашым акопе.

Начальніка заставы мы знайшлі амаль засыпанага пяском, цяжка параненага. Ён сказаў: «Не кідайце мяне, давайце адыходзіць у тыл...»

Да нас яшчэ падышоў адзін артылерыст. Іх у нас было трое, яны ўдзень з вышак назіралі за сумежным бокам, такі ў іх быў загад. Падышоў важаты сабак Яхненка і гаворыць, што, як толькі мы выйдзем з саду — адразу трапім пад кулямётны агонь, немцы за садам устанавілі кулямёт. Папрасіў у нас дзве гранаты і гаворыць: «Я іх знішчу...» — і папоўз па маліннік да кулямёта. Кінуў дзве гранаты, кулямёт знішчыў, але ва ўпор быў забіты фашыстамі, якія знаходзіліся каля яго збоку. І заўважылі Яхненку, калі ён поўз да кулямёта. Гэта ўсё адбылося ў нас на вачах.

Мы пачалі адыходзіць, 4 чалавекі: я, начальнік заставы Багамаз, якога мы цягнулі на сабе, яфрэйтар Захараў, артылерыст. Акрамя Захарава, усе былі параненыя.

Толькі выпаўзлі на балота, па нас адкрылі фашысты агонь, паўзлі па вадзе; з вады відаць былі адны галовы. Куляй у патыліцу быў забіты яфрэйтар Захараў, адважны чалавек, не на жыццё, а насмерць змагаўся з фашыстамі. Утрох мы паўзлі жытам, лесам, у начны час пераходзілі шашэйныя дарогі...

На 5-ы дзень нас трох параненых падабралі ў вёсцы Чарнаўчыцы, змясцілі ў амбулаторыю, дзе лячыў нас фельчар Сарачынскі, а насельніцтва вёскі карміла нас.

Цяжка апісаць бой на заставе. Карціна была жудасная: хто лаецца, хто крычыць: «Дабіце мяне...» Радавы Чэрнікаў са слязамі на вачах просіць: «Старшына, калі ласка, дабі, бачыш, як я пакутую...»

У памяшканні заставы на ложку ляжалі цяжкапараненыя, застава гарэла, таму што яна была драўляная. Згарэлі на заставе старшы сяржант Кузун, намеснік палітрука Павалоцкі Майсей, радавы Ісхакаў — усяго прыкладна 78 чалавек.

...Паведамляю Вам імёны гераічна загінуўшых пагранічнікаў 5-й заставы: палітрук Сарокін; радавы, важаты сабак Яхненка (Н.І.); кулямётчык Гнаценка (А.П.); яфрэйтар Захараў; старшы сяржант Кузун, намеснік палітрука Павалоцкі (С.М.); радавы Ісхакаў; радавы (яфрэйтар?) Кокін (Мікалай Мікалаевіч); сяржант Рабаў (Рыгор Паўлавіч); радавы Цуркоў (Яўген Барысавіч); радавы Шмыгароў (Міхась Афанасьевіч), — усе імёны і імёны па бацьку ўстаноўлены ў Музеі баявой славы атрада.

Гэта тыя загінуўшыя, якіх я бачыў і ведаю па нашай заставе. Яшчэ загінуў на нашай заставе ў баі з немцамі старшы лейтэнант (магчыма, ён быў капітанам, нач. 1-га аддзялення штаба атрада С.М.Грыненка), прозвішча не ведаю, ён камандаваў нашым акопам, а прыбыў ноччу са штаба атрада і пасля яго гібелі камандаваў абаронай акопа я.

З успамінаў Марыі Іванаўны Сарокінай, жонкі намесніка начальніка па палітчасці 5-й пагранзаставы І.П.Сарокіна

...Я з дзяўчатамі-камсамолкамі Надзеяй Філіманюк, Таццянай і Лідай параненых аднеслі ў вёску Чылеева ў пуню і дапамаглі ім: рабілі перавязку і насілі ім есці. У пуні яны знаходзіліся некалькі дзён у цяжкім стане. Па загадзе немцаў савецкіх пагранічнікаў адправілі на кані за Буг у шпіталь Бяла-Падляскі.

Забітых байцоў немцы закідалі зямлёй хто дзе ляжаў. Іх пачалі выкопваць сабакі, вымываць дажджы. Мірнае насельніцтва папрасіла дазволу, каб закапаць іх у брацкую магілу.

Хавалі ўсёй вёскай Чылеева. Каля брамы заставы пахавалі 17 пагранічнікаў.

Фонды Музея баявой славы 17-га КПА.

Падрыхтаваў В.П.Россіхін.

Вытрымалі

З успамінаў начальніка 20-й пагранзаставы лейтэнанта Е.Ф.Манекіна

У сакавіку 1940 года мяне прызначылі начальнікам 20-й пагранзаставы, якая размяшчалася ў пасёлку Аляксандраўская Калонія, за 65 км на поўдзень ад Брэста...

Вайна! Яе не забыць.

Каля трох гадзін пазваніў маёр Кузняцоў:

— Быць напагатове: ёсць інфармацыя перабежчыкаў...

Размова прыпынілася, сувязь з атрадам і суседзямі парушылася.

Выклікаў намесніка па палітычнай часці малодшага палітрука Рыгора Міхайлавіча Шаварына. У хуткім часе абрушыўся шквал артылерыйскага і мінамётнага агню, кулямёты праціўніка трасіруючымі кулямі пачалі прастрэльваць наша ўзбярэжжа, ствараючы агнявую заслону. З-за Буга ляцелі фашысцкія самалёты. Снарады раскідалі назіральныя пагранічныя вышкі. Пяхотны батальён гітлераўцаў пачаў пераправу цераз Буг злева ад чыгуначнага моста каля Уладавы. Пагранатрады ўступілі ў няроўны бой.

У нашым гарнізоне гарэлі некаторыя збудаванні. Мы панеслі першыя страты. Загінуў начальнік рэзервовай заставы лейтэнант Віталь Кірухін. Яго жонка — А.Т.Мальцава — перавязвала параненых, падносіла патроны, сама вяла агонь. Зачапіў і мяне асколак.

Усе падраздзяленні гарнізона занялі пункты згодна з агульным планам абароны. Два аддзяленні з ручным і станковым кулямётамі пад камандаваннем Шаварына — акопы ў паўночна-ўсходняй частцы апорнага пункта, два іншыя аддзяленні пад маім камандаваннем з двума кулямётамі — абарончыя збудаванні каля дарог, на захадзе.

Частка падраздзяленняў камендатуры разам з рэзервовай заставай, якімі камандаваў намеснік каменданта па палітчасці старшы палітрук А.Н.Белакапытаў, размясціліся на поўдзень.

Адзін за адным тры ланцугі фашыстаў рушылі да нашых пазіцый. Падпусціўшы гітлераўцаў на 200—250 метраў, мы адкрылі агонь. Фашысты заляглі, а потым адышлі і схаваліся, выкарыстоўваючы мясцовасць. Убачыўшы, што атака не ўдалася, гітлераўцы ўзнавілі абстрэл з артылерыі і мінамётаў. Пагранічнікі ўкрыліся, аставіўшы на пазіцыях толькі назіральнікаў. Больш усяго мы неслі страты ад мін праціўніка. Але, як толькі сціхаў

абстрэл, зноў займалі свае баявыя месцы. Пасля пятай атакі асобным варожым групам удалося бліжэй падпаўзці да нашых акопаў. Тады пайшлі ў ход гранаты. Каля сарака гітлераўцаў усё ж уклініліся ў нашу абарону. Іх закідалі гранатамі старшына Жытлухін і яфрэйтар Сяргушаў. Яны хутка мянялі свае пазіцыі і з кароткіх дыстанцый адкрывалі згубны агонь па праціўніку. Фашысты палявалі на кулямётчыкаў, але ніяк не маглі знайсці іх пазіцыі. Адна з варожых груп зайшла ў тыл кулямётнага разліку малодшага сяржанта Філатава, але ў гэты час адкрылі агонь кулямётчыкі Іваземцаў і Бурохін, якія прыйшлі на дапамогу таварышам. Гітлераўцы зноў адышлі назад і, узлаваныя няўдачай, пачалі абстрэльваць пазіцыі запальнымі снарадамі. Загарэўся лес. Густы дым ахутаў акопы. Цяжка стала дыхаць і назіраць за дзеяннямі праціўніка. Немцы выкарысталі гэта і пачалі акружаць нас.

Як ні цяжка было весці назіранне, але пагранічнікі, якія прывыклі несці службу ва ўмовах абмежаванай бачнасці, усё ж заўважылі манеўр ворага. Для адбіцця ўдару з тылу і флангаў мы па загадзе Белакапытава зрабілі перагрупіроўку сіл.

І вось наступная атака ворага.

Малодшы сяржант Аляксандр Філатаў, сакратар камсамольскай арганізацыі заставы, выкаціў свой кулямёт на бруствер акопа. Гэта быў волат і душой і целам. Ён бачыў, што ворагі насядаюць, хацеў іх спыніць, і ні разрывы гранат, ні свіст куль, ні пажары яго не хвалявалі. Аб сабе ён не думаў. Галоўнае — спыніць фашыстаў. А калі забіты Аляксандр упаў, яго месца заняў радавы Фёдар Ермакоў. У воіна абгарэў твар, вушы, але ён працягваў касіць насядаўшых фашыстаў...

Пад градам куль байцы падымаліся з акопаў і ва ўпор знішчалі гітлераўцаў. Да чаго ж адважны ў баі савецкі чалавек!

Кулямётчыкі, якіх узначальваў сяржант Ляпустын і яфрэйтар Забалуеў, мяняючы агнявыя пазіцыі, абрушвалі на ворага агонь з тых напрамкаў, адкуль ён яго не чакаў. У праціўніка склалася ўражанне, быццам уся мясцовасць прастрэльваецца перакрыжаваным агнём станковых і ручных кулямётаў. Не адставалі ад кулямётчыкаў і стралкі. Старшына заставы Васіль Жытлухін, малодшы сяржант Аляксандр Шангін, яфрэйтары Сяргушаў, Рыгор Юзіфовіч, радавыя Рамайкін і Мімула Хайрудзінаў — кожны знішчыў не па аднаму гітлераўцу. Больш за паўтара дзесятка фашыстаў забілі снайперы Уладзімір і Іван Афанасьевы. Вызначыліся Павел Ляпустын, Пятро Налётаў, Рамайкін.

Малодшы палітрук Р.М.Шаварын асабістым прыкладам натхняў байцоў і сам забіў некалькі фашысцкіх салдат і афіцэраў. Аднак сілы праціўніка пераўзыходзілі нас і агнявое кальцо сціскалася ўсё тужэй. Сувязі з атрадам і суседзямі не было. Супраць нашых воінаў дзейнічаў і другі страшны вораг — лясны пажар. Многія пагранічнікі атрымалі моцныя апёкі. Людзі задыхаліся ў дыме.

«Трэба выходзіць з акружэння», — вырашылі мы з Белакапытавым і Шаварыным. Адзіны шлях скрозь кальцо праходзіў цераз скрытыя траншэі. Прыкрываць наш адыход засталася група малодшага палітрука Шаварына. З ім — разлікі станковага кулямёта на чале з Фёдарам Ермаковым і ручных кулямётаў Міхася Бурохіна і Міхася Іваземцава. Кулямётчыкі занялі агнявыя пазіцыі ў 50—80 метрах. Пакуль немцы рыхтаваліся да наступнай атакі, мы па патайным ходзе выйшлі ў лес.

Па тым, як аслабеў агонь абаронцаў, гітлераўцы здагадаліся, што пагранічнікі пачалі адыход. Выявіўшы ход сувязі, вораг паспрабаваў атакаваць нашы падраздзяленні каля лесу, але напароліся на агонь кулямётаў групы Шаварына. Па-геройску трымаліся разам з Рыгорам Міхайлавічам сакратар партыйнай арганізацыі камендатуры старшы ваенфельчар Павел Максімаў, старшына Жытлухін, кулямётчык Іваземцаў. Ісці за намі па палаючым лесе гітлераўцы не адважыліся.

Гэты наш першы бой цягнуўся больш за адзінаццаць гадзін. Прабіраючыся па лясах і багнах, мы пад канец дня выйшлі да возера Пулямецкае, а да 23 чэрвеня — да горада Любомль, дзе злучыліся з адыходзячымі заставамі 5-й камендатуры і ў складзе 98-га пагранатрада працягвалі весці цяжкія абарончыя баі.

Поспех баявых дзеянняў нашых воінаў быў забяспечаны своечасовым абсталяваннем раёнаў абароны, выдатным веданнем і выкарыстаннем мясцовасці, добра арганізаванай сістэмай агню, фізічным загартаваннем і трываласцю, а галоўнае —

непахіснай верай у нашу перамогу над ворагам, бязмежнай адданасцю Радзіме.

За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў першыя дні вайны, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 жніўня 1941 года былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга — старшы палітрук А.М.Белакапытаў, малодшы палітрук Р.М.Шаварын, старшына У.У.Жытлухін, радавы Ф.М.Ермакоў, яфрэйтар Сяргушаў і аўтар гэтых радкоў; ордэнам Чырвонай Зоркі — яфрэйтар М.Ф.Забалуеў і М.А.Іназемцаў.

Друкуецца ў перакладзе на беларускую мову паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977.

Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Брэсцкага раёна

Адміністрацыйная структура і эканоміка. На працягу трох гадоў (з чэрвеня 1941 па жнівень 1944) нямецка-фашысцкія акупанты ажыццяўлялі на захопленай тэрыторыі Беларусі жорсткі акупацыйны рэжым, накіраваны на знішчэнне і зняволенне беларускага народа, рабаванне яго матэрыяльных і духоўных багаццяў. Яны знішчылі дзяржаўнасць БССР, увялі на яе тэрыторыі новы ваенна-адміністрацыйны падзел. З 1 верасня 1941 г. Брэст і Брэсцкая вобласць увайшлі ў склад рэйхскамісарыята «Украіна» на чале з генеральным камісарам гаўляйтэрам Эрыхам Кохам. Утвораная Брэст-Літоўская акруга падзялялася на 5 раёнаў: Брэсцкі сельскі, Дамачаўскі, Маларыцкі, Матыкальскі і Жабінкаўскі[1] (два апошнія ўвайшлі ў яе склад на працягу 1941 г.)[2]. Раёны ў сваю чаргу складаліся з валасцей. Воласці былі невялікія: колькасць жыхароў у кожнай была каля 4000 чалавек.

Кіраўніцтва захопленымі тэрыторыямі ажыццяўлялі ўлады: ваенныя (палявыя і мясцовыя, гарнізонныя камендатуры), грамадзянскія нямецкія акупацыйныя (акружны камісарыят, гарадскія, раённыя ўправы). У раёнах уся ўлада належала зондэрфюрэру, альбо нямецкаму шэфу раёна[3], раённай управе на чале з бургамістрам.

У сваёй дзейнасці акупацыйныя ўлады абапіраліся на вермахт, СС, паліцыю, палявую жандармерыю і іншыя карныя фарміраванні, мясцовыя ўлады — на створаную паводле загаду гітлераўцаў паліцыю парадку. Два бургамістры карысталіся паслугамі аднаго паліцэйскага ўчастка (1 начальніка паліцыі і ў сярэднім да 10 паліцэйскіх).

Усе адміністрацыйныя нямецкія ўлады акругі знаходзіліся ў Брэсце.

У жніўні — снежні 1941 г. «новая ўлада» правяла перапіс насельніцтва Брэсцкага раёна. На пачатку 1942 г. адбыўся паўторны перапіс. Згодна дакладу акружнога камісара Брэст-Літоўскай акругі, яе плошча складала 3592,61 км², колькасць насельніцтва — 130 130 чалавек.

Тэрыторыя сучаснага Брэсцкага раёна ўваходзіла ў склад трох раёнаў, вызначаных акупантамі: Брэсцкага сельскага, Дамачаўскага, Матыкальскага.

Брэсцкі сельскі раён займаў тэрыторыю 550,31 км² з насельніцтвам 24 919 чалавек. У складзе насельніцтва былі: 4 «фольксдойчэ», 21 115 украінцаў, 2016 палякаў, 760 беларусаў, 1200 рускіх, 4 яўрэі[4]. Раён падзяляўся на 7 валасцей з 75 вёскамі. Асноўным заняткам насельніцтва была сельская гаспадарка. У Чэрнінскую воласць на 12 верасня 1942 г. уваходзілі наступныя вёскі: Бердычы (308 жыхароў), Братылава (329), Чэрні 1-я (249), Чэрні 2-я (375), Клімавічы (210), Курніца (560), Плоска (522), Селішчы (190), Трышын (610), Вычулкі (370), Новыя Задворцы (216) і інш. з агульнай колькасцю жыхароў — 2472 чалавекі[6]. У Адамкаўскую воласць уваходзілі наступныя населеныя пункты: Адамкава (815), Бярозаўка (481), Бярозаўка 1-я (138), Бярозаўка 2-я (159), Дуброўка (220), Казловічы (280), Лысая Гара

(155), Рэчыца (650), Рэчыца 2-я (340)[7]; агульная колькасць жыхароў — 3238. Воласць Радванічы складалася з вёсак: Вялікія Радванічы (959 чалавек), Малыя Радванічы (735), Франопаль (743), Радванічы 3-я (471), Міхалін (399), Муры (214) і інш., усяго 3726 жыхароў[8]. Камянец-Жыровіцкая воласць: Камяніца-Жыровецкая (844 жыхары), Раманаўскія Хутары (237), Лозы (106), Забалацце (505) і інш.[9], усяго 3440 жыхароў. У Пугачоўскую воласць уваходзілі: Пугачова (1470 чалавек), Кацельня (446), Аркадзія (480), Бярнады (248), Гершоны (503), Кацельня 2-я (260), Міцькі (224), Вулька (602)[10], усяго 4233 жыхары. У воласць Тэльмы ўваходзіла 9 вёсак: Ямна (456 жыхароў), Тэльмы, Косічы (280), Шэбрын і інш.[11], усяго 2820 жыхароў. Акрамя названых у склад раёна ўваходзіла Збіражская воласць. Для кіравання Брэсцкім раёнам раённы шэф меў апарат з 29 чалавек[12]. У валасцях былі бургамістры, сакратары валасцей, аграномы і іншыя службовыя асобы агульнай колькасцю 35 чалавек (на верасень 1942 г.)[13]. Сярод іх было 30 палякаў, 15 украінцаў, 10 рускіх, 7 беларусаў, 1 грузін і 1 славак[14].

У раёне былі 3 цагельні, 6 гравійных кар'ераў, 6 пясчаных кар'ераў і 2 буйныя торфараспрацоўкі. Сельская гаспадарка складалася з сялянскіх гаспадарак і створаных немцамі маёнткаў. Самы вялікі прыбытак акупацыйная ўлада мела з Брэсцкага раёна: на сакавік 1942 г. ён склаў 95 000 нямецкіх марак[15].

Дамачаўскі раён займаў плошчу 719,9 км^2 з насельніцтвам 19 038 чалавек у складзе: 284 «фольксдойчэ», 7330 украінцаў, 2217 палякаў, 204 беларусы, 301 рускі, 3316 яўрэяў і інш. Раён падзяляўся на 6 валасцей з 35 вёскамі[16]. Акупанты разглядалі Дамачаўскі раён як крыніцу забеспячэння лесам, рыбай (у маёнтку Страдзеч разводзілі карпаў) і хлебам. Яны ўтварылі тут 4 сельскагаспадарчыя маёнткі, пабудавалі мылаварню. У маёнтку Колпін адкрылі акружную сельскагаспадарчую школу. Нямецкая ўлада актыўна выкарыстоўвала цагельню, млыны, лесапільню і смалакурню. У сувязі з вынішчэннем яўрэйскага насельніцтва, якое традыцыйна займалася рамяством, у Дамачаве адкрыліся майстэрні для падрыхтоўкі шаўцоў, краўцоў, сталяроў, цесляроў, кушняроў, кавалёў, стальмахоў[17]. Падаткі з Дамачаўскага раёна складалі 50 000 нямецкіх марак[18].

Матыкальскі раён займаў плошчу 531,2 км^2 з насельніцтвам 28 101 чалавек, сярод якіх былі: 8 «фольксдойчэ», 10 402 украінцы, 4724 палякі, 11 834 беларусы, 784 яўрэі і інш. Раён падзяляўся на 7(8) валасцей з 95 вёскамі[19]. Нямецкая ўлада высока ацэньвала сельскагаспадарчы патэнцыял гэтага раёна. Тут было ўтворана 12 дзяржаўных маёнткаў, але, калі раён быў перададзены ў студзені 1942 г. Брэсцкай акрузе (раней ён быў у складзе Усходняй Прусіі), усе маёнткі былі ўжо разрабаваны[20]. У раёне былі вялізныя сады, аднак на 1942 г. большая частка дрэў вымерзла. Нямецкая ўлада абсталявала ў Матыкальскім раёне самы вялікі ў акрузе механізаваны малочны завод, дзе ўсё абсталяванне было нямецкае. Гэты завод кожны дзень перапрацоўваў да 5000 літраў малака. Падаткі ад Матыкальскага раёна складалі 51 000 нямецкіх марак[21].

Акупанты ацэньвалі заваяваныя тэрыторыі ў першую чаргу з практычнага пункту гледжання — як максімальна выгадней выкарыстаць іх для Вялікай Германіі. Начальнік штаба Ведамства эканомікі і ўзбраення Германіі пісаў у справаздачы аб службовай камандзіроўцы на Усходні фронт (1—4 жніўня 1941 г.): «...Ясна відаць розніцу паміж польскай, новай рускай і старой рускай тэрыторыямі па сельскагаспадарчых пасевах і ўборачнай кампаніі... Запамінаюцца і выклікаюць развагі пажары ў вёсках вакол Белавежскай пушчы (праз 3 тыдні пасля за-

канчэння баявых дзеянняў)... Кідаюцца ў вочы на новай рускай тэрыторыі вялікія статкі кароў на пашы, пра якія сельскагаспадарчы кіраўнік нічога не ведаў... У асобных месцах назіраюцца вялізныя нагрувашчванні падбітых рускіх танкаў. Усюды ляжыць многа не падабранага вайсковага рыштунку... Камендант Брэст-Літоўска генерал-лейтэнант фон Унру... выказаў пажаданне... атрымаць некалькі кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, каб сабраць ураджай у адным раёне... Каменданту была абяцана падтрымка сельскагаспадарчым персаналам»[22].

У лістападзе — снежні 1941 г. немцы стварылі аддзел «Харчавання і сельскай гаспадаркі» з капітанам Фасбендэрам на чале. У склад аддзела акрамя цывільных асоб уваходзілі 11 салдат вермахта, якія займалі кіруючыя пасады і адказвалі за сельскагаспадарчыя пастаўкі[23].

З першых дзён акупацыі пачалося метадычнае рабаванне сялянскіх гаспадарак Брэсцкага раёна. Ужо ў верасні 1941 г. немцы вывезлі 4 453 667 т зерня, 2818 галоў буйной рагатай жывёлы, 3603 авечкі, 1 244 553 л малака. Да канца 1941 г. было створана 46 дзяржаўных маёнткаў[24]. У 1942 г. было нарыхтавана і вывезена 9 844 500 т зерня, 3 720 500 т сена, 19 846 галоў буйной рагатай жывёлы, 4170 свіней, 8450 авечак, 208 205 т рыбы[25] і многае іншае.

Аднак ужо на пачатку 1943 г. арганізаванаму рабаванню Брэсцкай акругі сталі перашкаджаць партызаны, якія знішчылі ўсе дзяржаўныя маёнткі ў Маларыцкім і Дамачаўскім раёнах. З 46 маёнткаў на 1943 г. у акрузе дзейнічала 29[26].

Нягледзячы на гэта, вываз сельскагаспадарчай прадукцыі працягваўся і ў наступным годзе. Да 20 сакавіка 1944 г. было вывезена 11 620 570 т зерня, 1 795 493 т сена, 14 864 галавы буйной рагатай жывёлы, 3107 свіней, 4652 авечкі і інш.

Нямецкая ўлада сама ўсведамляла беспрэцэдэнтны размах рабавання сялянства. У справаздачы за 1943 г. акружны камісар Брэст-Літоўска паведамляў: «У сельскай мясцовасці вельмі адмоўна падзейнічала тое, што ў селяніна з хлява выводзяць апошнюю карову. Кожны дзень на бойню прыводзяць цельных кароў. Такім чынам... харчовае становішча яшчэ пагоршылася»[27].

Насельніцтва Брэсцкага раёна галадала. Ужо вясной 1942 г. сяляне не мелі хлеба[28]. У гэты ж час вайскова-харчовая база ў Брэсце карміла коней пшаніцай і жытам[29].

Сельскае насельніцтва неахвотна плаціла падаткі, у большасці сялян іх прыходзілася браць сілай, асабліва жывёлу [30]. Падаткі былі непамерныя. Падатак за продаж хлеба на 26 лютага 1942 г. складаў 525 рублёў 90 кап. За дазвол забіць жывёлу (кабана) трэба было заплаціць 100 рублёў, за памол зерня — 3 рублі[31]. Спецыяльныя падаткі ўводзіліся на лоўлю рыбы, высечку лесу і г.д.[32]. Каб прадаць прадукты ў горадзе, патрабаваўся спецыяльны дазвол, а цэны былі значна ніжэй сабекошту, бо і гараджане жылі бедна, часта галадалі. У канцы 1942 г. бульба каштавала 30 капеек за кілаграм, проса — 1,50 руб., грэчка — 3,50 руб., мука пшанічная — 2 руб., ячная — 4 руб., алей — 16 руб., каўбасы — 16 і 12 руб.[33]. Гараджане атрымоўвалі мяса і хлеб па картках, але нерэгулярна і нізкай якасці[34].

Вайсковыя ўстановы паўсюдна рэквізавалі ў сялян вазы і сані. Сяляне прыцягваліся для аховы чыгунак, што прыводзіла да поўнай адсутнасці мужчынскай рабочай сілы ў асобных вёсках[35].

У лістападзе 1942 г. для барацьбы з партызанамі былі ліквідаваны хутары: насельніцтва перасялілі ў суседнія вёскі, а пабудовы спалілі[36]. 25 лютага 1943 г. гаўляйтэр Украіны Эрых Кох у тэлеграме рэйхсфюрэру СС Генры-

ху Гімлеру выказаўся «за поўную эвакуацыю (г.зн. вынішчэнне) вёсак на тэрыторыі шырынёй ад 50 да 100 км з абодвух бакоў чыгункі Брэст-Літоўск — Гомель»[37]. Гэта патрабаванне было выканана.

У 1943 г. становішча сельскага насельніцтва яшчэ больш пагоршылася. Як паведамлялі прадстаўнікі нямецкай улады, «запасы ў... сялян скончыліся. У бедных валасцях многія людзі харчуюцца толькі адной бульбай»[38].

У 1943—1944 гг. у прадчуванні блізкага канца «новага парадку» акупацыйныя ўлады абвясцілі «ваенны збор па сялянскіх абшчынных гаспадарках». Належала здаваць мяса любой жывёлы, птушак, рыбу, яйкі, воўну, малако, мёд, зерне, грэчку, проса, бабовыя, семя алейных раслін, лён, каноплі, сена, салому, бульбу, агародніну. За выкананне ваеннага збору адказвала ўся вёска. За невыкананне пагражаў расстрэл[39]. Што будуць есці сяляне, аддаўшы ўсё, — гэта не цікавіла нямецкія ўлады. Гэту палітыку ажыццяўлялі немцы Вутке, Кноблах, абласны аграном Зайдэль[40].

У студзені — лютым 1944 г. улады абвясцілі эвакуацыю Брэсцкай акругі. Да 15 лютага 1944 г. «на выпадак раптоўнага пакідання тэрыторыі ўсе каштоўныя машыны, у тым ліку і трактары, зерневыя запасы, акрамя двухмесячных, насенны матэрыял, а таксама маладыя кабыліцы адпраўлены ў рэйх». Усяго з Брэсцкай акругі было адпраўлена 138 вагонаў, з раёнаў на ўсход ад Брэста — 173 вагоны [41].

Вываз насельніцтва ў Германію. Ужо ў снежні 1941 г. кіраўнікі аддзела працы Брэст-Літоўскай акругі доктар Айтнер і інспектар Кайзер пачалі ўлік працаздольнага насельніцтва. Для гэтага ў Дамачаве і іншых валасных цэнтрах былі ўтвораны біржы працы[42]. Вясной 1942 г. паступіла заяўка з рэйха на 20 000 працаўнікоў. Найперш адправілі ў Германію людзей, якія прыбылі на тэрыторыю акругі пасля 22 чэрвеня 1941 г. Гэта былі так званыя «ўсходнікі» — галоўным чынам члены сямей савецкіх ваеннаслужачых [43].

Масавы вываз насельніцтва ў Германію пачаўся ў 1943—1944 гг. Адбыліся 3 акцыі па мабілізацыі працоўнай сілы. Акупанты захапілі і адправілі ў Германію 1043 чалавекі [44]. Акружны камісар Брэст-Літоўска пісаў у справаздачы: «...Большая частка мясцовага насельніцтва так настроена супраць паездкі на працу ў Германію, што, калі вярбоўшчыкі прыязджаюць у вёску, насельніцтва пакідае свае хаты і хаваецца, так што ўсюды застаеш пустыя вёскі. Таму ў асобных выпадках не грэбавалі прымусам і захопам сталых людзей узамен моладзі»[45]. Большая частка мабілізаваных збягала, беглі і працаўнікі нямецкіх дзяржаўных маёнткаў[46].

Аб сутнасці акупацыйнай палітыкі адзін з кіраўнікоў Брэсцкага сельскагаспадарчага раёна ў 1943 г. заявіў: «Усё зробленае намі дагэтуль загіне, калі ў бліжэйшы час не будзе забяспечана моцная ўлада, якая навядзе парадак і будзе дзейнічаць жорсткімі расправамі. У гэтым — поспех усёй нашай працы»[47].

Медыцына і адукацыя. Паводле прызнання нямецкіх улад адсутнасць мыла і жахлівыя ўмовы жыцця насельніцтва Брэст-Літоўскай акругі прывялі да эпідэміі сыпнога тыфу. Лекаў не хапала. Немцы мусілі наладзіць элементарнае медыцынскае забеспячэнне раёнаў.

З сакавіка 1942 г. пачалі дзейнічаць 165 школ, у тым ліку і школа «фолькс-дойчэ» ў калоніі Нейдорф пад асабістым кантролем акупацыйнага камісара. У школах не было падручнікаў, дапаможнікаў. Выкладала па 2—4 чалавекі (разам з дырэктарам школы), часта яны не мелі ніякага вопыту выкладання. Многія школы існавалі толькі ў рапартах акружнога камісара.

У Тэльмаўскай і Камянец-

Жыровіцкай валасцях Брэсцкай акругі на 16 сакавіка 1942 г. працавалі школы ў наступных вёсках: Ямна — 1 настаўнік; Тэльмы — 2 (дзяўчыны 24 і 26 гадоў); Камяніца-Жыровецкая — 4 (ад 20 да 41 года, са стажам па 2 гады); Забалацце — 1 (дзяўчына 21 года); Камяніца-Біскупская — 2; Косічы — 2 (19 і 20 гадоў); Шэбрын — 2 настаўнікі. Былі школы ў Гершонах і Пугачове; у Збірагах (3 настаўнікі), Чэрнях (4), Трышыне (3), Вычулках (1), Рэчыцы (3), Адамкава (4).

Карныя акцыі акупантаў і генацыд на тэрыторыі Брэсцкага раёна. Адным са сродкаў усталявання «новага парадку», барацьбы супраць партызан, вынішчэння мірнага насельніцтва гітлераўцы абралі карныя аперацыі, якія праводзіліся на Беларусі з першых дзён акупацыі. 15 жніўня 1942 г. 3-і батальён 15-га паліцэйскага палка ў складзе 9, 10 і 11-й рот прыбыў у Брэст для барацьбы з партызанамі ў акрузе[48]. 5 верасня 1942 г. батальён распачаў аперацыю супраць партызан пад кодавай назвай «Трохвугольнік» на тэрыторыі Брэсцкага, Кобрынскага, Маларыцкага і Жабінкаўскага раёнаў. Роты батальёна занялі вёскі Радванічы, Падлессе-Камянецкае Брэсцкага раёна. 11 верасня 1942 г. у вёсцы Радванічы за дапамогу партызанам спалілі 2 сялянскія сядзібы і расстралялі адну жанчыну[49]. 19 верасня прачасалі вёску Міхалін, расстралялі 9 саўдзельнікаў партызан[50]. 20 верасня 1942 г. партызаны ажыццявілі дыверсію на чыгунцы паблізу ад станцыі Падлессе-Радваніцкае. Пасля гэтага ў розных вёсках было арыштавана мноства людзей, 55 чалавек расстраляна[51]. 21 верасня расстраляна 30 чалавек[52]. 2 кастрычніка 1942 г. у вёсцы Радванічы спалілі 3 хаты саўдзельнікаў партызан[53]. 6 кастрычніка 11-я рота арыштавала ў вёсцы Камяніца-Жыровецкая 89 чалавек, 86 з іх было расстраляна. За 1 км на поўнач ад гэтай вёскі расстраляна 17 чалавек[54]. 22 кастрычніка каля вёскі Франопаль у час разведкі 10-я рота расстраляла 43 яўрэяў[55]. У вёсцы Ляплёўка Брэсцкага раёна гітлераўцы расстралялі 54 дзяцей і выхавальніцу Дамачаўскага дзіцячага дома.

У жніўні 1942 г. на станцыю Лышчыцы прыбыла карная экспедыцыя гестапаўцаў з Брэста. Каля возера Курылава былі падрыхтаваны 3 вялізныя ямы, пасля чаго гестапаўцы з дапамогай паліцыі распачалі масавыя арышты мірных грамадзян у бліжэйшых вёсках, арыштоўвалі цэлымі сем'ямі, прыганялі па 10—15 чалавек да ям і расстрэльвалі.

Жыхарка чыгуначнай станцыі Лышчыцы Г.І.Рыдко апавядала: «Ад месца зверскай расправы гітлераўцаў я жыву за 300 метраў, а таму бачыла жахлівую карціну зверстваў гітлераўцаў над мірнымі грамадзянамі. Міма нашай хаты паліцаі і гестапаўцы гналі на расстрэл па 10—15 чалавек насельніцтва розных узростаў ад немаўлят да старых, мужчын і жанчын. Перад расстрэлам паліцыя здымала з людзей вопратку, а саміх спіхвала ў яму і страляла. Вопратку і іншыя рэчы паліцыя і гітлераўцы дзялілі паміж сабой. Знішчэнне людзей працягвалася 18—20 сутак». За гэтыя дні было расстраляна і закатавана 756 чалавек: 220 жанчын, 101 мужчына, 435 дзяцей. Дзяцей кідалі ў ямы жывымі і закопвалі. Удзельнікі і кіраўнікі расстрэлаў: гестапаўцы Румі і Пауль, шэф Матыкальскага раёна Фёдар Мамота, старшыня Лышчыцкай воласці Ота Адальф, камендант Лышчыцкай паліцыі Маляк, яго намеснік Касірак, паліцэйскія Ялоп і Арас[56].

10 лістапада 1942 г. у вёску Страдзеч прыехала група гестапаўцаў і разам з мясцовай паліцыяй пачалі звозіць на машыне і зганяць насельніцтва ў адну хату на краі вёскі. Сабраўшы такім чынам 14 сем'яў, гітлераўцы хацелі запаліць хату, але пабаяліся, што згарыць суседні дом, у якім размяшчалася камендатура. Тады

яны пачалі выводзіць па адной сям'і, здымалі з людзей вопратку, ставілі на калені і стралялі ў патыліцу. Дзяцей расстрэльвалі на вачах у бацькоў, затым забівалі дарослых. Так за адзін дзень былі знішчаны 72 чалавекі, з іх 48 дзяцей[57].

Для барацьбы з партызанамі і ўтрымання парадку ў валасных цэнтрах былі размешчаны жандарскія пасты і паліцэйскія ўчасткі. Жандармерыя і паліцыя выкарыстоўваліся для аховы чыноўнікаў грамадзянскага кіраўніцтва акругі, транспарту і г.д. На тэрыторыі Брэсцкага раёна існавалі жандарскі пост у мястэчку Дамачава (4 чалавекі) і 54 паліцэйскія. У Матыкальскім раёне — 62, у Дамачаўскім раёне — 41 паліцэйскі пост. Для абучэння паліцэйскіх былі ўтвораны курсы ў вёсцы Валынка пад Брэстам. Абутак і коўдры для паліцэйскіх былі атрыманы з ліквідаванага яўрэйскага гета ў мястэчку Дамачава[58]. У 1942 г. на тэрыторыі Брэсцкай акругі размяшчаўся таксама нямецкі кавалерыйскі эскадрон, яго штаб стаяў у в. Тамашоўка, а адна з груп — у п. Дамачава[59]. Аднак гэтыя меры не маглі ўтрымаць партызан, якія актыўна дзейнічалі ў паўднёвай частцы Брэсцкага раёна.

У 1942 г. на тэрыторыі Брэсцкага раёна быў утвораны лагер для «прымусовых перасяленцаў». Галоўным чынам у ім трымалі людзей, прызначаных для адпраўкі ў Германію. Максімальная колькасць вязняў — 3425 чалавек[60]. Быў яшчэ «перасыльны лагер» (316 чалавек) і лагер для цыган (800 чалавек)[61]. Іх лёс невядомы. Хутчэй за ўсё вязняў расстралялі.

На тэрыторыі Брэсцкага раёна існавалі таксама гета для яўрэйскага насельніцтва. Найбуйнейшымі былі Дамачаўскае і Тамашоўскае. Асобныя яўрэйскія сем'і, што хаваліся па вёсках і лясах, паліцыя ўвесь час вылоўлівала і знішчала. Да 1942 г. (да пачатку масавых расстрэлаў і ліквідацыі гета) немцы выкарыстоўвалі яўрэйскае насельніцтва на розных работах, напрыклад на будаўніцтве шашэйных дарог. Яны «не мелі ніякай ежы» і паміралі дзесяткамі[62].

19 і 20 верасня 1942 г. у Дамачаве і Тамашоўцы зондэркаманда СД разам з размешчаным у Дамачаве кавалерыйскім эскадронам жандармерыі і паліцыяй правяла «яўрэйскую акцыю», пад час якой было расстраляна прыкладна 2900 яўрэяў[63]. Вось што расказваюць дакументы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па даследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Брэсцкай вобласці:

Дамачаўскае гета. «У мястэчку Дамачава перад вайной жыло галоўным чынам яўрэйскае насельніцтва, колькасць яго складала больш за 3000 чалавек... У канцы 1941 г. немцы ўстроілі лагер для яўрэяў. Ён займаў плошчу ў 1 км^2, быў абнесены двума радамі калючага дроту, вакол стаялі вартаўнікі. У гэты лагер гітлераўцы сагналі больш за 2 тысячы яўрэяў — дарослых і дзяцей. Людзі цэлы год знаходзіліся ў гэтым лагеры. Фашысты білі іх прыкладамі, нагайкамі і палкамі. Ад знясілення і голаду пачалася масавая смяротнасць. Ад катаванняў у гестапа памерлі 20 чалавек. 18 верасня 1942 г. немцы прымусілі яўрэяў капаць ямы на пясчаным узгорку ў паўкіламетры на поўдзень ад Дамачава. Людзі пачалі разбягацца, але іх лавілі ў лесе і расстрэльвалі. Вылоўлівалі і збеглых ваеннапалонных, якія хаваліся там. Іх катавалі і расстрэльвалі. Так загінулі 42 чалавекі. Калі ямы былі падрыхтаваны, немцы пачалі масавыя расстрэлы, кідалі гранаты, закопвалі людзей жывымі. Так за адзін дзень было зверскі забіта больш за 2700 чалавек мірных грамадзян»[64].

Тамашоўскае гета. «...У рабочым пасёлку Тамашоўка ў ліпені 1942 г. фашысты ўтварылі гета пад назвай «Фірма Райнке», куды сагналі з навакольных мястэчак і вёсак яўрэйскае

насельніцтва колькасцю да 2 тысяч чалавек. Гета займала плошчу ў 1,5 км². Зняволеныя ў ім яўрэі сядзелі галодныя, распранутыя, іх увесь час збівалі. У канцы ліпеня 1942 г. за чатыры дні гета было вынішчана. Расстрэлы адбываліся на Камароўскім полі каля процітанкавага рова, у 1,5 км ад шашы Уладава — Брэст... Больш за 500 чалавек было атручана газам у спецыяльным закрытым аўтамабілі»[65].

Масавае вынішчэнне яўрэйскага насельніцтва працягвалася. 15 і 16 лістапада 1942 г. было знішчана Брэсцкае гета.

Тых, хто здолеў пакінуць горад, лавілі ў бліжэйшых вёсках. Больш за 500 яўрэяў, якія збеглі з гета, былі расстраляны на матыкальскіх могілках у кастрычніку — лістападзе 1942 г. Былы камендант паліцыі Матыкальскага раёна Семянюк сведчыў: «...У лістападзе 1942 г., калі яўрэі пачалі разбягацца з Брэсцкага гета, я атрымаў загад іх лавіць, і аднойчы мы адразу расстралялі 47 чалавек яўрэяў»[66].

Пра гэтыя падзеі сведка Г.К.Шпендзік апавядаў: «Я быў накіраваны на сталярные работы ў Матыкалы і кожны дзень бачыў злачынствы... Людзей вадзілі на расстрэлы групамі ад двух да дваццаці чалавек. Я аднойчы сам назіраў, як паліцэйскія пад кіраўніцтвам гестапаўцаў пачалі выводзіць на двор з усіх памяшканняў затрыманых яўрэяў. Сярод іх былі жанчыны, немаўляты, нават зусім старыя людзі — усяго 100—120 чалавек. Іх пастроілі ў калону, абкружылі паліцэйскімі і павялі да ямы, дзе загадалі сесці на зямлю, распрануцца, а пасля спіхвалі ў яму і забівалі... Адна жанчына, зусім распранутая, з голым дзіцянём гадоў 2—3, падышла да ямы, але, скочыўшы туды, дзіця ўсё ж такі пакінула, спадзявалася, мабыць, што гэтыя звяры захаваюць яму жыццё... Дзіця адбегла метраў на пяць, але гестапавец схапіў яго за руку, перакруціў у паветры і кінуў у яму. Пасля гэтага яшчэ мінут з пяць чуўся дзіцячы крык»[67].

«Яўрэйскія акцыі» выклікалі шок у насельніцтва Брэсцкага раёна. Сялянства «так запалохана, што, калі бачыць, як у вёску ўязджае грузавая ці легкавая аўтамашына, усе кідаюцца бегчы з вёскі, думаючы, што пачынаецца новая акцыя»[68]. І далей: «Сярод насельніцтва разыходзяцца чуткі, што пасля расправы над яўрэямі адбудуцца расправы над рускімі, а затым расстраляюць палякаў і ўкраінцаў»[69]. Чуткі аказаліся праўдзівымі. За гады акупацыі на тэрыторыі Брэсцкага раёна (даныя па 18 сельсаветах, без Дамачава і Тамашоўкі) было расстраляна 6610 чалавек, у тым ліку 1257 жанчын і 1239 дзяцей; забіта 7202 ваеннапалонныя, вывезена ў Германію 1060 чалавек, загінуў ад бамбёжак 81 чалавек. Усяго — 14 453 жыхары раёна.

Крыніцы:

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 100.
2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). Ф. 195. Воп. 1. Спр. 3. Л. 1.
3. Там жа. Л. 434.
4. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 85—86.
5. Там жа. Л. 100.
6. ДАБВ. Ф. 195. Воп. 1. Спр. 117. Л. 16.
7. ДАБВ. Ф. 195. Воп. 1. Спр. 117. Л. 18.
8. Там жа. Л. 20.
9. Там жа. Л. 23.
10. Там жа. Л. 24—25.
11. Там жа. Л. 27—28.
12. Там жа. Л. 31.
13. Там жа.
14. Там жа. Л. 31.
15. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 100—101.
16. Там жа.
17. Там жа.
18. Там жа.
19. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 102.
20. Там жа. Л. 103.
21. Там жа.
22. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 937. Л. 21—24.
23. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 86.
24. Там жа. Л. 35.
25. Там жа. Л. 36.
26. Там жа. Л. 38.
27. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 971. Л. 97.
28. Там жа. Л. 53.
29. Там жа.
30. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 148.

31. ДАБВ. Ф. 195. Воп. 1. Спр. 132. Л. 9, 12 адв., 37.
32. НАРБ. Ф. 750. Воп. 1. Спр. 224. Л. 5.
33. ДАБВ. Ф. 201. Воп. 1. Спр. 2442. Л. 5.
34. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 143.
35. Там жа. Л. 167.
36. Там жа. Л. 141.
37. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 956. Л. 416.
38. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 170.
39. ДАБВ. Ф. 201. Воп. 1. Спр. 2442. Л. 5.
40. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 143.
41. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 32.
42. Там жа. Л. 88.
43. Там жа. Л. 98.
44. Там жа. Спр. 971. Л. 108.
45. Там жа.
46. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 971. Л. 110–111.
47. Там жа. Л. 112.
48. Там жа. Спр. 941. Л. 76.
49. Там жа. Л. 77.
50. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 941. Л. 77.
51. Там жа.
52. Там жа.
53. Там жа. Л. 78.
54. Там жа.
55. Там жа. Л. 80.
56. ДАБВ. Ф. 514. Воп. 1. Спр. 41. Л. 27–29.
57. Там жа. Спр. 298. Л. 2–5.
58. ДАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 134–136.
59. Там жа. Спр. 971. Л. 51.
60. Там жа. Спр. 1043. Л. 145.
61. Там жа. Л. 144–145.
62. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 971. Л. 55.
63. Там жа. Спр. 1043. Л. 133.
64. ДАБВ. Ф. р-514. Воп. 1. Спр. 195. Л. 8.
65. Там жа. Л. 5, 15.
66. Там жа. Спр. 41. Л. 10.
67. ДАБВ. Ф. р-514. Воп. 1. Спр. 41. Л. 15.
68. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1943. Л. 140.
69. НАРБ. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1943. Л. 148.

Я. С. Разянблат.

Трагедыя вёскі Медна

З успамінаў відавочцаў

АНДРАШУК Васіль Кузьміч. Быццам магнітам цягнула мяне на нядзелю 1 сакавіка 1943 года з Брэста дадому. Прыехаў. Застаўся нанач. Калі прачнуліся раніцай, убачылі немцаў. З хаты ў хату перадаваўся загад нікому не выходзіць з дамоў, будзе праверка. Але гэта была аблава. Пачаліся расстрэлы. Забівалі тых, хто аказваўся ў чужым доме. Жыхарку Яращчук засталі ў суседзяў і разам з імі расстралялі. Я бачыў усё гэта. Калі падвялі іх да ямы, я пазнаў Стасюка Карпа і Панасюка Сямёна.

...На двары былой гміны было многа людзей. Калі яны ўбачылі, што людзей расстрэльваюць каля ямы, кінуліся ва ўсе бакі. Павалілі плот, пабеглі на агароды. Немцы пачалі страляць па іх з кулямётаў. Ні адзін чалавек не выратаваўся. Людзей зноў сабралі да ямы. Сабралі дзяцей да 10 гадоў і загадалі некалькім жанчынам адвесці іх у Брэст.

П.Д.КАРАБЕЙКА. Мы абышлі ўсе двары, каб высветліць імёны дзяцей, якіх гітлераўцы ў жудасны дзень 1 сакавіка 1943 г. адправілі з вёскі ў Брэст. Вось іх імёны:

ВАСІЛЮК Еўдакія Герасімаўна.
ДАРАШУК Вольга Емяльянаўна.
ДЫМІНСКАЯ Настасся Пракоп'еўна.
ДЫМІНСКАЯ Вольга Пракоп'еўна.
ДЫМІНСКАЯ Ніна Пракоп'еўна.
ДЫМІНСКАЯ Марыя Пракоп'еўна.
ДЫМІНСКІ Дзмітрый Пракоп'евіч.
ЛЕВАЙ Аляксандр Ігнатавіч.
ЛЕВАЙ Дзмітрый Ігнатавіч.
ЛЕВАЙ Дзмітрый Пракопавіч.
ЛЕВАЙ Ніна Ігнатаўна.
ЛЯЎЧУК Таццяна Андрэеўна.
ПАЛЯШЧУК Павел Мікалаевіч.
ПАНАСЮК Надзея Сцяпанаўна.
ПАРХІМУК Вольга Іванаўна.
ПАРХІМУК Вольга Еўдакімаўна.
ПАРХІМУК Фёдар Еўдакімавіч.
ПАРХІМУК Еўдакія Еўдакімаўна.
ПАЦЯЮК Вольга Сямёнаўна.
СТАНЧУК Ксенія Паўлаўна.
ФЕДЧУК Надзея Сцяпанаўна.
ФЕДЧУК Ніна Сцяпанаўна.
ЯРАШУК Дзмітрый Гаўрылавіч.
ЯРАШУК Марыя Іванаўна.

Цяжка зараз, праз 50 гадоў пасля падзей вайны, дасканала ўлічыць усе ахвяры. У расстралянага Івана Кандрацюка немцы забралі дзве маленькія дзяўчынкі. Як іх звалі, мы, на жаль, не ведаем. Прозвішчы, імёны, звесткі аб нараджэнні некаторых дзяцей у дзіцячых дамах былі скажоны.

НАВУМЧЫК Пётр Гаўрылавіч. 23 лютага 1943 г. Нядзеля. У Медна гулялі

адразу чатыры вяселлі. Ухалюк Іван Кірылавіч жаніўся з Пекун Ганнай Рыгораўнай, Ярашук Сцяпан Фёдаравіч з Нічыпарук Кацярынай Емяльянаўнай, Васілюк Ганна Сямёнаўна выходзіла замуж у в. Збунін, а Харза Малання Купрыянаўна — за хлопца з Рагозна. Вяселле ёсць вяселле. Нішто і не нагадвала, які лёс быў ім угатаваны...

...Прачнуліся раніцай ад шуму, крыкаў на вёсцы. Падумалі, што вяселлі працягваюцца. Але раптам убачылі, што да старой гміны немцы вядуць людзей цэлымі сем'ямі. Маці параіла мне схавацца за саломай. Я так і зрабіў. Праз шчыліну даху бачыў, як збівалі людзей. Вывелі з натоўпу Максімука Івана Мартынавіча. Нешта пыталі ў яго. Але ён адмаўляў. Яго білі, спачатку прыкладамі аўтаматаў, потым нагамі... Білі, пакуль ён не памёр. Раптам натоўп рушыў на немцаў, зламаў агароджу і кінуўся ва ўсе бакі. Немцы адкрылі агонь з аўтаматаў. Ніхто не выратаваўся... Падвялі да ямы Сачука Карпа Іванавіча. Яго застрэлілі і кінулі ў яму. Затым падвялі Сямёна Панасюка. Я бачыў, як ён узнімаў уверх рукі. Відаць, маліўся. Людзі маладзейшыя вырываліся. Немцы іх білі, кідалі каля ямы, прыстрэльвалі і нагамі спіхвалі ў яе. Да сённяшняга дня перад маімі вачыма стаіць гэта жудасная карціна...

АНДРАШЧУК Вольга Рыгораўна. ...У тую жудасную нядзелю была я на вяселлі ў Нічыпарукоў. Маладая доўга прыбіралася... Каця была прыгажуня. Мы ўсе віншавалі маладых, жадалі ім шчасця на доўгія гады. Танцавалі. У гэты дзень на вёсцы гулялі чатыры вяселлі. Не абышлося і без бойкі. З чаго яна пачалася — невядома. Але біліся да крыві. Божа ж мой, ведалі б тады людзі, што робяць, што іх чакае... Думаецца мне, што гэта быў божы знак, а людзі не прыслухаліся...

Страшны лёс чакаў усіх нас. Я зайшла ў адну хату, нічога ж не ведала... А там усе дзверы расчынены. У хаце ніводнай жывой душы. Я спалохалася... Немцы не падпускалі да гміны жыхароў, адганялі. Стракаталі кулямёты. Мы здагадаліся, што там робіцца...

Падрыхтаваў С.Р.Іваненка.

Як забівалі жыхароў вёскі Рагозна

16 жніўня 1942 г. стаў чорным днём у жыцці сялян вёскі. Па загадзя састаўленых спісах гітлераўцы і паліцаі сабралі тых, хто падазраваўся ў сувязях з партызанамі. На скрыжаванне трох вуліц прывялі 42 чалавекі. Як расказваюць аднавяскоўцы, першай схапілі сям'ю Захожых: Івана Мікалаевіча, удзельніка рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, яго жонку Аляксандру, сыноў-камсамольцаў Васіля і Дзям'яна, дочак Марылю і Марфу. Івана Мікалаевіча, яго сына Дзям'яна і Васіля Кірчуна трымалі асобна. Яны ў гэты дзень не былі расстраляны. Іх адвезлі ў Дамачава на допыт, дзе Іван Мікалаевіч і Васіль Кірчун, пасля жудасных катаванняў, былі закапаны яшчэ жывымі, а Дзям'яна вырашылі выкарыстаць як правакатара.

У той дзень быў схоплены былы чырвонаармеец, удзельнік грамадзянскай вайны Мікалай Макаравіч Асавец з жонкай і траімі дзецьмі. Іх старэйшы сын Сцяпан быў у партызанах і не ведаў, якая бяда адбылася з яго сястрой Ксеняй, братам Валодзем, сябрамі Васілём Захожым і яго сястрой Марыляй, Дзям'янам Хівуком, Мікалаем Дземчуком, Васілём Кірчуном, Мікалаем Кавальчуком, Сцяпанам Вальчуком, Емяльянам Кундам і іншымі. Усе яны ўваходзілі ў Дубіцкую камсамольскую арганізацыю, якую ён узначальваў да вайны.

У натоўпе была і сям'я Емяльяна Раманавіча Станчука, яго жонка і пяцёра малых дзетак. Іх схапілі за тое, што ў пачатку вайны яны хавалі трох параненых чырвонаармейцаў, якіх потым пераправілі да партызан. Была арыштавана і сям'я Тараса Фёдаравіча Ухалюка, старога бальшавіка, удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе, які бачыў У.І.Леніна...

У 10 гадзін раніцы карнікі адкрылі па людзях прыцэльны агонь. Кулі даганялі і тых, хто кінуўся ўцякаць. Васіля Захожага адна з іх напаткала на плоце, які ён меркаваў пераскочыць. Хутка ўсё скончылася. Захапіўшы нарабаванае і заложнікаў, карнікі паехалі ў Дамачава...

Праз дзесяць дзён у вёску зноў прыехалі немцы. Яны прывезлі з сабой

Дзям'яна Захожага. Прывялі да дома Якава Пракопавіча Пятровіча, які хаваў некаторы час Васіля Мікалаевіча Грабнёва (будучага камандзіра партызанскага атрада). Карнікі пайшлі на правакацыю: «Няхай усе ў вёсцы ведаюць, што Пятровіча выдаў Захожы Дзям'ян». Але з гэтага нічога не выйшла. Дзям'ян упарта адмаўляў усе абвінавачванні. Карнікі павесілі на дварэ Якава Пятровіча, а яго жонку Дар'ю, дзяцей Марфу, Ніну, Еўдакію і Васіля па-зверску забілі на прыступках дома.

Дзям'ян Захожы змог уцячы да партызан. Ён загінуў пазней у родным доме ў час бою з паліцэйскімі.

Падрыхтаваў В.П.Россіхін.

Невядомыя...

Сярод першых ахвяр фашыстаў былі савецкія ваеннапалонныя. Большасць з іх засталіся ў гісторыі Невядомымі. Героі вайны без Імя, без Прозвішча. На тэрыторыі нашага раёна іх было больш за 15 000 чалавек — радавых і камандзіраў Чырвонай Арміі. Амаль усе яны прайшлі праз фашысцкі лагер смерці, так званы лазарэт Паўночнага гарадка Брэста.

З успамінаў былога камандзіра 354-й стралковай дывізіі генерал-лейтэнанта Героя Савецкага Саюза В.Н.Джанджгавы

Возле деревни Тонкеля (это район Семятичей, что перед войной входил в состав Брестской области: авторское пояснение) обнаружен огромный ров, где фашисты закапывали расстрелянных военнопленных. Жители деревни называют это место «лагерем смерти».

... С чем-то подобным дивизия уже встречалась в районе Слонима. Там нацисты, пытаясь перед отступлением замести следы своих кровавых преступлений, все рвы, доверху заполненные трупами расстрелянных военнопленных, сравняли бульдозерами.

Машины останавливались у деревни Тонкеля. За околицей, огороженной тремя рядами колючей проволоки, небольшой участок. В центре его несколько полусгоревших деревянных строений. Вдоль проволочной ограды насыпь. Из-под земли торчат полуистлевшие трупы людей. Сколько их? Тысяча? Две? Три?...

Друкуецца паводле кн.: Джанджгава В.Н. Немеренные версты. 1983.

Буйнейшае злачынства

Крупнейшим преступлением немцев после истребления евреев в Европе — их погибло 6 млн. от рук немцев (потребовалось гораздо больше, чем просто горстка «плохих» немцев, чтобы провести эту «работу»), несомненно, является уничтожение голодом и другими способами, пожалуй, до трех миллионов советских военнопленных.

Мы стояли в Ровно... Неподалеку находится огромная масса русских военнопленных, которых держат под открытым небом. Их, должно быть, 80 тысяч. Они стонут, потому что умирают от голода... Я пошел посмотреть. За колючей проволокой находились десятки тысяч русских военнопленных. Многие были при последнем издыхании. Мало кто из них мог держаться на ногах. Лица их высохли, глаза глубоко запали. Каждый день умирали сотни, и тех, у кого еще оставались силы, сваливали в огромную яму.

Только примерно в середине 1942 г. к уцелевшим советским военнопленным начали относиться, как к рабам.

Все, что делали с советскими военнопленными, настолько ужасно, что просто трудно всему этому верить. Если учесть, что общие людские потери СССР определяются цифрой свыше 20 миллионов человек, гибель 3—4 миллионов в немецком плену не кажется невероятной.

Друкуецца паводле кн.: Верт А. Россия в войне 1941—1945. М., 1967.

Падрыхтаваў В.П.Россіхін.

Дакументы сведчаць

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА ПЕРЫЯД З 26 ЛІСТАПАДА ПА 2 СНЕЖНЯ 1941 г.

Брэст-Літоўск, 24.12.1941 г.

... В последнее время на здешней территории имеет место очень много случаев заболевания тифом, особенно катастрофически обстоит дело в Домачевском районе. Больницы настолько забиты больными, что по двое лежат в одной кровати. Отдано распоряжение выделить в Домачево еще один дом под изолятор для больных. До сих пор зарегистрировано 50 случаев заболеваний. Некоторые уже выздоровели и выписаны из больницы. Одна 18-летняя девушка умерла...

Окружной комиссар Брест-Литовска.

Пераклад з нямецкай мовы.
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 971. Л. 22.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АКРУЖНОГА КАМІСАРА БРЭСТ-ЛІТОЎСКА

22 жніўня 1942 г.

... Урожай сравнительно хороший. При обмолоте с гектара получаем примерно 6 двойных центнеров. Из этих 6 центнеров 3 центнера сдаются властям, на семена оставляется 2 центнера, так что для снабжения населения остается 1 центнер, которого далеко недостаточно. По этой причине я хотел бы просить, чтобы поставки зерна брались с учетом урожайности земли, в противном случае получится опять так, что крестьяне уже зимой или весной не будут иметь куска хлеба. Брестская область ранее завозила хлеб или получала дотации, и мы теперь даже при всех наших усилиях не добьемся такого положения, чтобы были излишки хлеба, так как на болоте и песке хлеб не растет в таком количестве. И нельзя у крестьянина, который производит хлеб, забирать его весь. А получается так, что кроме установленной нормы сдачи зерна добавляются еще особые обложения, так что вообще ничего не остается. С другой стороны, как я установил здесь и докладывал об этом генеральному комиссару, военно-продовольственная база в Бресте скармливает лошадям пшеницу и рожь. Когда я услышал об этом, то подумал, что либо я, либо они сошли с ума. В Германии так трудно с хлебом, здесь вообще для местного населения нет хлеба, а вермахт использует пшеницу и рожь для скармливания лошадям. Лошади крестьян, которые систематически заняты на труднейших полевых работах, не получают не только ржи, но и овса, ибо это строжайше запрещено. Если здесь на военно-продовольственной базе нет достаточного количества овса для лошадей, то это не значит, что надо кормить лошадей хлебом, ибо армейские лошади, которые имеются здесь, настолько упитаны и настолько мало работают, что их вполне можно кормить свежей травой или сеном. Запрещено выдавать сельскому населению рожь. Я не знаю, почему это так, но я должен заявить, что это свинство.

Окружной комиссар в Брест-Литовске.

Пераклад з нямецкай мовы.
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 117.

СПРАВАЗДАЧА КАМАНДЗІРА 11-й РОТЫ АБ КАРНАЙ АПЕРАЦЫІ З 5 ПА 11 КАСТРЫЧНІКА 1942 г.

5 октября 1942 г. 1-й взвод выслал патруль в Зводы и Старую Весь. Обыск мест Зводы и леса западнее Старой Веси результатов не дал. В 19.00 одним отрядом 1-го взвода были расстреляны 2-е мужчин и 6 женщин, которые, по показаниям бургомистра, были пришлыми русскими. Казнь была произведена в Чернянах.

В 03.00 в Каменицу-Жировецкую, Волки, Кунахи, Закия, Заболотье, Лозы были посланы 25 чел. из 2-го взвода и 18 из 3-го. Там были арестованы 11 мужчин, 41 женщина и 64 ребенка, все пришедшие с востока («восточники»). Из них 1 мужчина, 11 женщин и 15 детей были расстреляны в тот же день в лесу в 1 км севернее Каменицы. Остальные остались под арестом в Каменице.

6 октября 1942 г. в 05.30 в лесу в 10 км южнее Подлесья была совершена казнь остальных лиц «восточников», арестованных накануне в селении Каменица. Были расстреляны 10 мужчин, 30 женщин и 49 детей.

Пелльс, капитан и командир роты 3-го батальона 15-го полицейского полка.

Поступило 12 октября 1942 г.

Оперативный отдел.

Друкуецца паводле кн.: Документы обвиняют. М., 1945. С. 32—33.

З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 3-га БАТАЛЬЁНА 15-га НЯМЕЦКАГА ПАЛКА З 11 ВЕРАСНЯ ПА 24 ЛІСТАПАДА 1942 г.

11 верасня 1942 г., Кобрын

... В Радваничах сожжены 2 двора, откуда бандиты регулярно получали продовольствие. Расстреляна 1 женщина, шпионившая для бандитов...

12 верасня 1942 г., Кобрын

Арест подозрительных лиц, обыск населенных пунктов и местности продолжаются. Обнаружен и сожжен лагерь бандитов.

При обыске лесничества южнее Заболотья 2 бандита убиты при попытке к бегству, 1 ранен и 1 задержан. В Михалинах задержаны и расстреляны 17 человек, принадлежавших к бандам. Близ Подлесья бандитами взорвана железнодорожная линия...

19 верасня 1942 г., Кобрын

Проверяется население Великориты и Михалин. Расстреляны 9 сообщников бандитов.

20 верасня 1942 г., Кобрын

Бандитами взорвано полотно железной дороги у Подлесья. В различных населенных пунктах арестованы русские подданные: 55 чел. расстреляно...

21 верасня 1942 г., Кобрын

... Расстреляны 3 сообщника бандитов и 27 советских подданных.

30 верасня 1942 г., Кобрын

В Радваничах обнаружена 1 женщина, состоявшая будто бы агентом ГПУ... В 21.30 близ Радваничей у одного взвода 10-й роты произошло столкновение с бандитами. Дело дошло до огневого боя. Взводный вахмистр Визер ранен в лицо. Банда прекращает бой и отступает в непроходимые леса. Преследование не дало результатов...

3 кастрычніка 1942 г., Кобрын

... В Михалинах одним тайным агентом донесено еще о других лицах, подозреваемых в бандитизме. Там арестован один бандит.

6 кастрычніка 1942 г., Кобрын

... 11-я рота арестовывает в Каменице-Жировецкой 89 советских подданных и 86 из них расстреливает... В 1 км севернее Каменицы-Жировецкой расстреляно 17 человек.

12 кастрычніка 1942 г., Кобрын

В Заболотье и Каменице Бискупской, близ Подлесья, расстреляно 2 советских подданных...

31 кастрычніка 1942 г., Кобрын

... Оставшаяся на опорном пункте стража захватила в Михалинах еврейку и расстреляла ее...

6 лістапада 1942 г., Кобрын

... 11-я рота высылает дневные и ночные патрули в Медную (24 км южнее Бреста) и ее окрестности. В 1 км восточнее Медной взорваны 2 землянки, расстреляно 2 бандита. В Подлесье и Медной казнено по 7 сообщников бандитов. У южного выхода в Подлесье найден польский карабин...

Пераклад з нямецкай мовы.
Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Воп. 148. Спр. 4. Л. 187–188.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АКРУЖНОГА КАМІСАРА БРЭСТ-ЛІТОЎСКА АБ СТАНОВІШЧЫ З РАБОЧАЙ СІЛАЙ

1943 г.

Общая обстановка, как уже указывалось в предыдушем отчете, вследствие проведенной мобилизации на работу в рейх, еще более обострилась. Побеги с работы приняли такие размеры, что никакими средствами нельзя покончить с ними. В отместку за принудительную отправку людей на работы в Германию бандиты сожгли два кирпичных завода. Не может быть выполнен и установленный план добычи торфа, так как большая часть присланных рабочих сбежала к бандитам. Огромные потребности в рабочей силе не могут быть удовлетворены, так как рабочая сила не может быть мобилизована ни в зараженных бандитами районах, ни в сельской местности, свободной от бандитов. Большая часть наличной рабочей

силы систематически уходит в бандитские районы. Сегодня уже невозможно добраться до наших учреждений в Малорите и Домачево, так как все мосты на дорогах сожжены, да и вся местность находится в руках бандитов.

Срочные заявки на рабочую силу в целом составляют 2317 человек. В связи с уборкой урожая рабочую силу из сельских усмиренных районов брать нельзя.

Рабочие торфоразработок полным составом, забрав лошадей и приводные ремни, ушли к бандитам.

Пераклад з нямецкай мовы.
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л.3.

ТЭЛЕГРАМА РЭЙХСФЮРЭРА УКРАІНЫ Э.КОХА РЭЙХСФЮРЭРУ СС Г.ГІМЛЕРУ АБ ЗНІШЧЭННІ ВЁСАК У МЭТАХ БАРАЦЬБЫ З ПАРТЫЗАНАМІ

25 лютага 1943 г.

Группенфюрер Томас спрашивает меня от твоего имени, почему я в беседе с министром по Востоку высказался против сжигания деревень в целях борьбы с партизанами. Я очень удивлен таким вопросом, потому что я никогда не упрекал полицию в том, что она слишком много эвакуирует деревень в областях, где действуют партизаны. Я выступаю за полную эвакуацию деревень на территории шириной от 50 до 100 км по обе стороны железной дороги Брест-Литовск — Гомель, потому что эта территория, кроме лесного хозяйства, не имеет для меня никакого значения. Как сообщает Томас, эта полная эвакуация не была возможна до сих пор по техническим причинам. Я все же не отказываюсь от намерения сделать это и надеюсь, что эвакуация будет возможна. О своих мнениях я буду сообщать тебе в дальнейшем устно.

С наилучшими пожеланиями и хайль Гитлер твой Эрих Кох.

Пераклад з нямецкай мовы.
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 956. Л. 416.

СПРАВАЗДАЧА АКРУЖНОГА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА КІРАЎНІКА ЗА ЧЭРВЕНЬ 1943 г.

... В связи с постоянными принудительными мобилизациями рабочей силы в рейх, которые, конечно, необходимы, во всей округе сложилось крайне тревожное положение, которое находит свое выражение в том, что немецкая полиция потеряла всякий авторитет в глазах у населения, которое вообще больше не выполняет предписаний и распоряжений немецких властей. Эти мобилизации рабочей силы проводились так неумно и с такой ненастойчивостью полиции, что большинство мобилизованных рабочих бежало. Полиция не в силах собрать бежавших, которые сейчас проводят огромную антинемецкую пропаганду. Арестовать и наказать их невозможно, и так постепенно создается положение, делающее невозможным немецкое управление и подрывающее его авторитет...

... Такое тревожное положение и недисциплинированность охватили и крестьян в части сдачи установленных норм сельскохозяйственной продукции. Крестьяне видят, что мы не можем настоять на выполнении своих распоряжений, и становятся все более непослушными и нахальными.

Вывоз леса из государственного леса также все больше затрудняется. В лесах хозяйничают банды, которые к тому же терроризируют работающих в лесу крестьян, отнимают у них одежду и отправляют домой. Полицейская защита, которая здесь была бы так необходима, невозможна, и распоряжения немецких властей остаются пустым звуком...

Окружной сельскохозяйственный руководитель.

Пераклад з нямецкай мовы.
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 971. Л. 110—111.

СА СВЕДЧАННЯ К.А.ТРАФІМУКА АБ РАССТРЭЛАХ ЯЎРЭЯЎ У КАСТРЫЧНІКУ 1943 г.

... Приблизительно в октябре 1943 г. 12 жителей Чернавчиц, в том числе и я, были отправлены копать яму на пастбище «Дичка», 2,5 км за с. Чернавчицы... Ровно через полтора часа прибыл трактор с большой платформой, на которой находились исключительно еврейские женщины и среди них один ребенок — мальчик лет 7—8. Следом за трактором прибыла и автомашина с тремя гестаповцами, которые предложили всем женщинам раздевать-

ся донага, даже из волос что-то они вытаскивали и бросали в кучу белья и одежды. В углу ямы был сделан сход, и женщины молча шли и автоматически выполняли приказания переводчика ложиться плотнее — ногами к стенкам, головой в середину, ровными рядами, а два гестаповца спокойно расстреливали сверху из автоматов, меняя обоймы...

Мы, 12 человек, лежали в ямке метрах в 15 — немцы ходили около ямы, курили, смеялись. Один из нас не смог смотреть на эту кошмарную картину, ушел метров на 200 в сторону и лег лицом вниз и плакал...

Среди расстрелянных позднее были чернавчицкие евреи — Гольдберг, Иерусалимский Юдель, Пытлин, Коржиневич Борис Михайлович (1915 г.р., предс. сельпо), Зельцер Шмуль Давидович (1902 г.р.), Зельцер Кисель Лейбович (1880 г.р.), Зельцер Абрам Киселевич (1902 г.р.), Зельцер Хуна Киселевич (1906 г.р.), Тарнопольский Ушер Иосифович (1920 г.р.), Езолитский Берко Шмулевич (1921 г.р.), Виниковский Мотель Мошкович (1922 г.р.), Виниковский Абрам Мошкович (1920 г.р.), Вишенгряд Михаил Мошкович (1900 г.р.)...

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. р-514. Воп. 1. Спр. 41. Л. 19—20.

АКТ № 2 АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ВЁСЦЫ РЭЧЫЦА БРЭСЦКАГА РАЁНА

15 лютага 1945 г.

1945 г. февраля 15 дня, мы, нижеподписавшиеся, прокурор Брестского района Муханов Б.А., председатель Речицкого сельсовета Бабрук А.К. и гр. с Речицы Назарук И.К. в соответствии с материалами расследования злодеяний немецких фашистов по с. Речица составили настоящий акт о нижеследующем:

1. На расстоянии одного километра от ст. Речица находились «Красные казармы», где в июле месяце 1941 г. немцами был организован лагерь для военнопленных, огороженный двумя рядами колючей проволоки, между которыми были клубки колючей проволоки. В данный лагерь было привезено до 8000 человек пленных красноармейцев, военнопленных. Выдавалась пища: щи из листьев капусты и 150 грамм хлеба один раз в день. Медпомощь совершенно отсутствовала. Происходили расстрелы лиц, пытающихся бежать. Голодные люди доходили до того, что использовали в пищу трупы умерших военнопленных, за что «виновные» немцами расстреливались. Больные пленные не лечились и лежали с больными, которые были не в силах идти за хлебом (150 гр.), даже не касались хлеба и пищи, а таковые обрекались на верную смерть. Были частыми случаи, когда сбрасывали в яму живых, истязали и побои резиновыми палками проводились ежедневно и за мелкие провинности.

Не отмечено ни одного случая, чтобы из этого лагеря были вывезены куда-либо живыми военнопленные. В декабре 1941 г. этот лагерь был закрыт и в нем осталось не более 800 человек, остальные все остались в трех больших ямах общим размером 120х90х1,5 метра, находившимися рядом с лагерем.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 514. Спр. 41. Л. 1—2.

Падрыхтаваў В.П.Россіхін.

Дзеці і выхавацелі Дамачаўскага дзіцячага дома. Здымак даваеннага часу.

З ДАКЛАДА БРЭСЦКАЙ АБЛАСНОЙ КАМІСІІ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ ГІТЛЕРАЎЦАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ВОБЛАСЦІ

1 сакавіка 1945 г.

...Больных, измученных каторжным трудом и условиями жизни в Германии, немцы вывозили из Германии и помещали в лагерь. Один из таких лагерей был организован немцами на территории Брестского района вблизи дер. Речица, где в начале 1943 г. было помещено большое количество больных. Режим в лагерях ничем не отличался от немецких лагерей для военнопленных. За попытку выбраться из лагеря многие были расстреляны.

Гр-ка Мушницкая Мария рассказывала, что она была очевидцем, как в лагерях больных одну из женщин немцы жестоко били, а потом тут же среди собравшихся повесили на дереве. Тех женщин, что начали плакать, немцы избивали резиновыми палками. Многие советские граждане, измученные непосильным трудом, попавшие в лагерь больных, погибли в лагере...

Выздоравливающих было мало, но их снова отправляли в Германию на каторжные работы...

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Воп. 148. Л. 187—228.

Падрыхтаваў В.П.Россіхін.



Помнік дзецям Дамачаўскага дзіцячага дома перад уездам у г.п. Дамачава.

З ВЫСТУПЛЕННЯ ПАМОЧНІКА ГАЛОЎНАГА АБВІНАВАЎЦЫ АД СССР Л.Н.СМІРНОВА НА НЮРНБЕРГСКІМ ПРАЦЭСЕ

1946 г.

Я ссылаюсь, далее, на предъявленный суду документ под номером СССР-634. Это акт об издевательствах и расстреле детей Домачевского детского дома в Брестской области БССР:

По приказу немецких оккупационных властей округа шеф района Прокопчук приказал бывшей заведующей детским домом Павлюк А.П. отравить больного ребенка Ренклах Лену, 12 лет. После того как Павлюк отказалась отравить ребенка, Ренклах Лена была расстреляна полицейскими вблизи детского дома, якобы при попытке к бегству.

В целях спасения детей от голода и смерти в 1942 г. 11 детей было роздано на воспитание местным жителям и 16 детей взяты родственниками.

Вот дальнейшая судьба этих детей.

23 сентября 1942 г. к 7 часам вечера во двор детского дома прибыла пятитонная автомашина с шестью вооруженными немцами в военной форме. Старший из группы немцев, Макс, объяснил, что детей повезут в Брест, и приказал сажать детей в кузов автомашины. В машину было посажено 55 детей и воспитательница Грохольская. Шахматова Тося, 9 лет, слезла с машины и убежала, а все остальные 54 ребенка и воспитательница Грохольская были вывезены в направлении ст. Дубица, в 1,5 км от деревни Леплевка. На пограничной дерево-земляной огневой точке, расположенной на расстоянии 800 м от реки Западный Буг, автомашина с детьми остановилась. Дети были раздеты, о чем свидетельствует наличие детского белья на возвратившейся в Домачево автомашине, и расстреляны.

Друкуецца паводле кн.: Нюрнбергский процесс. Сборник материалов в 8 т. М., 1991. Т. 5. С. 148—149.

АКТ АБ МЕСЦЫ МАСАВАГА ПАХАВАННЯ САВЕЦКІХ ВАЕННАПАЛОННЫХ НА ТЭРЫТОРЫІ ПАЎНОЧНАГА ГАРАДКА Ў БРЭСЦЕ

2 ліпеня 1961 г.

Акт, 2 июля 1961 г., г. Брест.

Мы, нижеподписавшиеся, участники боев в районе Бреста в июне 1941 г. Петров Ю.В. — доктор медицинских наук, участник обороны Брестской крепости-героя, майор в отставке Гаврилов П.М. — Герой Советского Союза, Бондарь И.Г., Терехов С.П., Хлебников Е.Г., составили настоящий акт в том, что нами в присутствии ст. научного сотрудника музея «Брестская крепость-герой» подполковника запаса Маслюкова С.В. и представителя в/ч 43 115 майора Аксенова И.А. определено и уточнено место массовых захоронений советских воинов, погибших в лагере военнопленных в Южном городке в июле 1941 г. до расформирования лагеря в мае 1942 г. (Схема с указанием места захоронения прилагается).

За время существования лагеря, где фашистами были созданы нечеловеческие условия, из месяца в месяц росла смертность военнопленных. Особенно высокая смертность была в декабре 1941 г., в январе — марте 1942 г. В этот период погибало от 80 до 100 советских воинов в день. Таким образом, за весь период существования лагеря погибло до 15 тысяч советских военнопленных, находящихся в лагере Южного городка.

На месте массового захоронения кроме советских воинов никого не хоронили.

Настоящий акт составлен в трех экземплярах (подписи вышеназванных лиц).

СТРАТЫ БРЭСЦКАГА РАЁНА ЗА ГАДЫ ВАЙНЫ

1	2	3	4	5	6	7	8	9
Вычулковский с/с	385	1305	143	45	8	6	67	9
Гершонский с/с	1135	4823	389	203	40	28	90	9
Домачевский п/с (без г.п.)	1185	2066	70	134	59	32	76	5
Жировецкий с/с	846	3530	432	104	12	12	62	15
Клейниковский с/с	567	2211	30	15	21	16	100	4
Лыщицкий с/с	1013	5121	119	48	86	68	175	11
Меднянский с/с	690	2979	380	373	28	23	99	15
Мотыкальский с/с	762	3399	31	83	35	22	68	—
Радваничский с/с	604	2644	149	112	1	1	103	18
Тельмовский с/с	1029	5337	144	17	21	8	101	8
Томашовский с/с	1230	6417	341	2279	243	228	194	14
Чернинский с/с	421	1801	153	106	28	21	65	8
Чернавчицкий с/с	1063	4135	129	438	22	9	134	14
Всего по району без горпоселка	10 930	46 048	2510	3957	604	474	1334	130
Домачево, горпоселок	530	3950	500	3800	—	—	3	—
Всего по району	11 460	44 998	3010	7757	604	477	1337	130

Тлумачэнні да табліцы:

1 — сельскі Савет, 2 — колькасць двароў да пачатку вайны, 3 — колькасць жыхароў да пачатку вайны, 4 — знішчаныя двары, 5 — забітыя жыхары, 6 — вывезеныя ў Германію, 7 — з іх вярнуліся на радзіму, 8 — загінуўшыя на франтах вайны, 9 — загінуўшыя ў партызанах.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 847. Л. 4.

Падрыхтаваў В.П.Россіхін.

Антыфашысцкае падполле ў раёне

НА ЧАЛЕ НАРОДНАГА СУПРАЦІЎЛЕННЯ

Барацьба з фашызмам у Брэсцкім раёне звязана з імёнамі многіх выдатных патрыётаў. Адным з кіраўнікоў антыфашысцкага руху ў Прыбужжы стаў былы член КПЗБ Іван Васільевіч Салейка (1907—1951).

Незадоўга да Вялікай Айчыннай вайны І.В.Салейка быў абраны старшынёй Тэльмінскага сельскага Савета. У яго абавязкі ўваходзіла размеркаванне і дастаўка людзей на работы па ўмацаванні абарончых аб'ектаў на дзяржаўнай граніцы, рэканструкцыі дзевятага шлюза Дняпроўска-Бугскага канала, рамонце шашэйных дарог. Старшыня сельсавета часта бываў у пагранічнікаў, шмат чаго бачыў і таму лічыў, што чуткі аб хуткім пачатку вайны не без падстаў. І ўсё ж такі першыя выбухі нямецкіх снарадаў аказаліся і для яго неспадзяванымі.

Адразу ж Іван Васільевіч кінуўся збіраць таварышаў па падполлі ў гады буржуазнай Польшчы і актывістаў савецкай улады. Ніхто не мог даць адказу, што здарылася, — сувязі з Брэстам не было. Там, на захадзе, грымелі выбухі. Усё стала зразумела гадзіны праз дзве, калі на Маскоўскай шашы з'явіліся нямецкія танкі, вялізныя грузавікі з пяхотай.

— Так, гэта вайна, — сказаў таварышам Салейка. — Што нам рабіць, я пакуль не ведаю. Разыходзьцеся, хлопцы, па хатах, будзьце асцярожнымі. Можа, у лес прыйдзецца ісці, можа, нашым войскам спатрэбіцца дапамога. Карацей, будзьце гатовымі сабрацца ў любую хвіліну. Я дам знаць.

Але фашыстаў спыніць не ўдалося. Многім актывістам савецкай улады і былым членам КПЗБ прыйшлося хавацца па суседніх вёсках, бо пасля абеду ў Тэльмы ўвайшлі нямецкія рэгулярныя часці. Адразу з'явіліся мужчыны ў цывільнай вопратцы, якія са спісамі ў руках хадзілі па хатах і выпытвалі ў сялян, дзе знайсці старшыню сельсавета Салейку, куды падзеліся мясцовыя дэпутаты, камуністы і камсамольцы.

У гэты нялёгкі час Іван Васільевіч быў ужо ў аддаленай вёсачцы Забалацце. Там, на сваёй сядзібе, у яме пад стогам сена яго схаваў Іван Стараселец. У першую ж ноч вайны Салейка прабраўся да в. Чэрні, ціхенька пастукаў у акно Аляксандру Паўлавічу Саванеўскаму. Немцы былі ў Чэрнях, аднак салдаты яшчэ не кватаравалі па сялянскіх хатах — захопнікі, відаць, баяліся нахапацца ў «рускіх свіней» вошай ці клапоў. Ды і не да сну было фашыстам. Яны адзначалі, відаць, першы ўдалы ваенны дзень, бо занадта ж моцна гарланілі песні. Недзе стралялі, гулі маторы, з прытушанымі фарамі лёталі па вёсцы матацыклісты.

— Трэба людзей збіраць, — цяжка дыхаючы, параіў Івану Аляксандр Паўлавіч. — Збіраць сваіх людзей трэба, Іван, каб змагацца з ворагам. Прыйдуць нашы і спытаюцца: «А што вы тут, камуністы, рабілі?» Я больш не здолею ўжо, а ты збірай хлопцаў.

Туберкулёз лёгкіх Саванеўскі падхапіў яшчэ ў польскай турме, дзе сядзеў як член КПЗБ. Хутка І.В.Салейка сустрэўся з братамі Мікалаем і Лявонам Носікамі, Аляксеем Дзмітруком, братамі Ігнатам і Радзівонам Антанюкамі, Барысам Лазаруком. Акрамя Салейкі ў Тэльмінскім сельсавеце пражывала яшчэ дзевяць былых членаў КПЗБ, сярод якіх былі Мікалай Раманавіч Чырук, 1911 г. н., член КПЗБ з 1931 г., Пётр Аляксеевіч Шутко, 1908 г. н., член КПЗБ з 1931 г., Фёдар Іванавіч Лысюк, 1908 г. н., член КПЗБ з 1931 г., Міхаіл Паўлавіч Куц, 1908 г. н., член КПЗБ з 1928 г., Аксенцій Барысавіч Плечка, 1911 г. н., член КПЗБ з 1931 г. Сустрэўся Іван Васільевіч і з былымі камсамольцамі, уступіўшымі ў КСМЗБ

у 1930—1935 гг. Паўлам Карнеевічам Сычуком, Міхаілам Аляксеевічам Шутко, Пятром Нікіфаравічам Тымасюком, Іванам Ануфрыевічам Каплевічам. Гэтыя людзі сталі ў вытокаў падпольнага і партызанскага руху ў Брэсцкім раёне.

У першыя дні фашысцкай акупацыі І.В.Салейка асабіста сустрэўся з многімі людзьмі і ў рэшце рэшт стварыў партызанскую групу з 20 чалавек. Знаходзілася яна ў Семісоснаўскім лесе.

Сабралі на месцах былых баёў 5 кулямётаў і 20 вінтовак, так што ўзброены былі добра. Хутка сустрэліся ў лесе з іншымі партызанскімі групамі, якія ў асноўным складаліся з партыйна-савецкіх актывістаў.

Падпольную і партызанскую барацьбу з ворагам у пачатку вайны ў роднай вёсцы Старое Сяло Жабінкаўскага раёна ўзначаліў Міхаіл Мікітавіч Чарнак. Да вайны М.М.Чарнак працаваў старшынёй сельскага Савета. Гэта быў смелы і рашучы чалавек, якому ў 1941 г. ішоў трыццаць першы год.

Сваю першую дзёрзкую аперацыю Чарнак правёў 16 верасня 1941 г. У пачатку восені немцы мабілізавалі мясцовых жыхароў на перавозку боепрыпасаў з палігона на ваенны склад у Брэсце. Сяляне выконвалі гэтую работу пад узмоцненай аховай. Калі аб гэтай акцыі стала вядома Чарнаку, ён разам з аднавяскоўцамі на сваёй фурманцы таксама паехаў на палігон, пагрузіў на воз 6 станковых кулямётаў, 5 скрынак гранат і 5 скрынак патронаў. Згаварыўшыся з возчыкамі, каб яны адцягнулі ўвагу вартавых, Міхаіл Мікітавіч здолеў непрыкметна павярнуць коней на другую дарогу і, накідаўшы на фурманку сена, без прыгод завёз усё гэтае дабро ў Старасельскі лес.

Міхаіл Мікітавіч устанавіў цесныя сувязі з партызанскай групай чырвонаармейцаў, якія засталіся дзейнічаць у тыле ворага. Для байцоў і

М.М.Чарнак.

камандзіраў Чырвонай Арміі здабываў каштоўныя звесткі, прыносіў ім у лес хлеб і бульбу.

У ліку кіраўнікоў антыфашысцкага руху быў і Фёдар Іванавіч Лысюк, жыхар вёскі Ямна. Ён супрацоўнічаў з І.В.Салейкам. З дапамогай аднавяскоўцаў-патрыётаў група Лысюка наладзіла сувязі з многімі населенымі пунктамі Прыбужжа, дзе ўжо дзейнічалі падпольныя арганізацыі.

Антыфашысцкая група ў в. Пугачова, напрыклад, арганізавалася яшчэ ў ліпені—жніўні 1941 г. У яе склад увайшлі муж і жонка Рыгор Міхайлавіч і Вера Захараўна Слядзінскія, Мікалай і Зінаіда Сугак, Андрэй Хвядчук, Павел Ахрымук, Ганна Кавальчук, Лука Змянько, Міхаіл Шыбуня, Кастусь Жмянько, Валодзя Жмянько, браты Пятро і Сцяпан Руцько. Іх сувязной была Еўдакія Жмянько з х. Вулька-Застаўская.

Летам і восенню 1941 г. былыя члены КПЗБ браты Пятро Мікалаевіч і Сцяпан Мікалаевіч Руцько па заданні падпольнай групы ўладкаваліся на працу ў лагер савецкіх ваеннапалонных у Паўднёвым гарадку г. Брэста. Браты выконвалі абавязкі слесараў-сантэхнікаў, працавалі пазменна, добра ведалі каналізацыйную сістэму гарадка. Праз каналізацыйныя люкі і трубы, што ў той час ужо не дзейнічалі, яны вызвалялі з лагера ваеннапалонных, якіх потым сувязныя перапраўлялі да партызан.

Пятру і Сцяпану ўдалося вывесці

з лагера некалькі дзесяткаў чалавек. У іх ліку быў і паранены камісар І.Г.Чапыжэнка. Ім дапамагалі і мясцовыя жыхары, якія выкуплялі ці прызнавалі сваімі «родзічамі» палонных.

На пачатку вайны немцы дазвалялі некаторым раззброеным чырвонаармейцам разысціся па хатах. Гэтую акалічнасць падпольшчыкі выкарыстоўвалі, каб вызваліць з палону як мага больш вязняў.

Практыкавалі браць з лагера «батракоў» для работы на сельскай гаспадарцы.

На жаль, восенню сорак першага братоў Руцько нехта выдаў немцам. Іх па-зверску закатавалі ў брэсцкім гестапа.

Чатырох выратаваных з палону камандзіраў на чале з камісарам І.Г.Чапыжэнкам падпольшчыкі пераправілі на хутар Малыя Радванічы, дзе жылі Трафім Макаравіч і Варвара Іванаўна Чарэўка. Гэта сям'я ў пачатку вайны дала прытулак многім людзям, якія вымушаны былі хавацца ад немцаў і паліцаяў.

Па некалькі тыдняў жылі на хутары сем'і савецкіх камандзіраў. Жонка лейтэнанта-пагранічніка Надзея Лазарава з пяцігадовай дачкой Рытай пад выглядам сваячкі гаспадароў пражыла тут амаль год. На хутар да Трафіма Макаравіча часцяком прыходзілі людзі з лесу, у тым ліку і лейтэнант Чырвонай Арміі Сяргей Сяргеевіч Шыканаў, камандзір партызанскага атрада, які дзейнічаў у Старасельскім лесе з першых дзён вайны. Пры кожнай сустрэчы з камісарам Іванам Георгіевічам Чапыжэнкам Сяргей Сяргеевіч доўга раіўся, як ім, чырвонаармейцам, быць: прабівацца на ўсход да лініі фронту ці заставацца ў прыбужскіх лясах і дзейнічаць тут як партызанскі атрад. Камісар параіў лейтэнанту застацца. А сам, як толькі трохі ачуняў, пачаў збірацца да сваіх. Дарога наперадзе была доўгая і небяспечная, і І.Г.Чапыжэнка рыхтаваўся грунтоўна: займеў зброю, раздабыў цывільную вопратку, харчы. У канцы лістапада 1941 г. камісар і тры яго таварышы па палоне пайшлі на ўсход.

Толькі пасля вайны муж і жонка Чарэўкі даведаліся, хто быў іх пастаялец, якога паміж сабой ваеннапалонныя называлі «бацяй». Герой грамадзянскай вайны палкавы камісар І.Г.Чапыжэнка з 1921 г. служыў у Беларусі. У 1940 г. яго прызначылі начальнікам палітаддзела 62-га Брэсцкага ўмацаванага раёна (камендант генерал-маёр М.Я.Пузыроў). У першы дзень вайны Іван Георгіевіч быў цяжка паранены ў баі, страціў прытомнасць. Апрытомнеў ужо ў лагеры ваеннапалонных у Паўднёвым парадку, што пад Брэстам. З групай у 14 чалавек удалося вызваліцца з палону. Вязні рассеяліся па лесе, на хутар Малыя Радванічы прыйшлі з камісарам толькі тры камандзіры. Даведаліся Чарэўкі, што камісар Чапыжэнка так і не дайшоў да лініі фронту. Ён трапіў недзе пад Гомелем у засаду і загінуў. У маі 1942 г. на хутары хаваўся паранены партызанскі сувязны Аляксей Мікалаевіч Ахрымук з жонкай, якому ўдалося ўцячы з нямецкай камендатуры. Калі Аляксей ачуняў, яго пераправілі з хутара ў Булькоўскі лес.

Вакол Брэста ў першыя месяцы вайны стыхійна ствараліся маленькія ўзброеныя групы з ліку ваенных, трапіўшых у акружэнне. Гэтыя групы паступова зліваліся з мясцовымі групамі. Неўзабаве партызаны ўжо далі аб сабе знаць ворагу: то тут, то там нападалі на нямецкія машыны, рвалі тэлефонныя правады, падпілоўвалі слупы, разганялі мясцовыя пастарункі. Дзейнічалі партызаны настолькі дзёрзка, што фашысты вымушаны былі ў верасні 1941 г. правесці аблаву. Але аб гэтай акцыі патрыётаў папярэдзілі свае людзі. Ніхто з партызан не трапіў у рукі ворага.

У пачатку кастрычніка 1941 г. у Старасельскім лесе было ўжо каля 60 узброеных байцоў. Аднак з надыходам зімы баявую дзейнасць партызаны вымушаны былі прыпыніць. Захаваўшы адзінае кіраўніцтва атрадамі, партызаны ў складзе 10—12 чалавек дыслацыраваліся ў Шэбрынскім, Сычоўскім, Казацкім і Халстуноўскім лясах. Частка партызан, надзейна схаваўшы зброю да вясны, падалася ў Брэст і Кобрын. Вораг вырашыў, што партызанскі рух распаўся.

Але гэта было не так. Цэнтр кіравання сіламі патрыётаў знаходзіўся на хутары каля в. Сычова. Сюды, у хату падпольшчыка Андрэя Хоміча, 2—3 разы ў месяц прыходзілі камандзіры груп. На нарадах абмяркоўваліся вынікі разведкі ў тыле ворага, разглядалася пытанне росту груп з мясцовага насельніцтва і іх узбраенне.

У ліку арганізатараў падпольнага антыфашысцкага руху ў Брэсцкім раёне быў Іван Фёдаравіч Селівонік (партыйны псеўданім Хоміч). Нарадзіўся ён у в. Франопаль у сялянскай сям'і ў 1909 г. Членам КПЗБ стаў у лістападзе 1932 г. І.Ф.Селівонік разам з братам Аляксандрам, фінагентам Радваніцкага сельсавета, і актывістам мясцовага Савета Васілём Захаравічам Лобікам з першых дзён вайны вялі патрыятычную работу сярод насельніцтва. Праз братоў Мікалая і Леаніда Носікаў з в. Ваўкі яны выйшлі на сувязь з падпольшчыкамі в. Пажэжын Кузьмой і Мікалаем Лойкамі, в. Закій — Фамой Вольскім, в. Вялікія Радванічы — Змітром Чарэўкам і Фёдарам Панасюком (усе яны былі членамі КПЗБ). Па трывалай падпольнай сувязі патрыёты атрымалі загад ад І.В.Салейкі правесці сярод насельніцтва тлумачальную работу аб з'яўленні ў мясцовых лясах ілжэпартызанскіх груп, якія называлі сябе змагарамі супраць немцаў, а на самай справе займаліся крадзяжом, выяўлялі партызанскіх сувязных. Асабліва вызначаліся зладзюгі з Дахлоўскага лесу, якіх у вёсках празвалі «махноўцамі».

Восенню 1941 г. і зімой 1942 г. паводзіны «махноўцаў» было цяжка ўзяць пад кантроль. Маёр Дародных, у групе якога было 20 чалавек, спрабаваў навесці парадак. З гэтай мэтай ён перайшоў са Старасельскага лесу ў раён в. Літвінкі, што пад Кобрынам. Але «махноўцы» заўважылі групу і ўвесь час сачылі за ёй. І калі аднойчы маёр Дародных адзін пайшоў на канспіратыўную сустрэчу ў в. Плянты, яны падпільнавалі камандзіра групы і забілі яго.

Гэты жудасны выпадак падштурхнуў Салейку, Лысюка, Антанюка, Чарнака, Селівоніка, Шыканава і іншых кіраўнікоў антыфашысцкага руху да стварэння адзінага арганізаванага кіраўніцтва. У лясах паблізу Брэста і Кобрына дзейнічала досыць многа разрозненых узброеных груп. Паасобку яны, канешне, не маглі прынесці ворагу многа шкоды, а вось разам — маглі.

Зімой 1941—1942 гг. вярнуліся з акружэння Якаў Дзянісавіч Плечка з Хабаў, яго аднавясковец Рыгор Антонавіч Плечка, Захар Філімонавіч Паплаўскі з в. Буякі, Васіль Андрэевіч Носік, Мікалай Лаўрэнцьевіч Янчук, Кірыла Ануфрыевіч Сыч, Фядос Плечка з в. Шэбрын, Васіль Гойнаш з Ракітніцы. Хутка яны ўступілі ў падпольныя антыфашысцкія групы.

Цяжкая дарога з палону прыйшлася на долю Мікалая Андрэевіча Мартысюка з в. Шэбрын. З першых дзён вайны ён з таварышамі пайшоў разам з адступаючымі часцямі Чырвонай Арміі аж да Вязьмы. У Вязьме М.А.Мартысюк быў накіраваны ў 101-ы полк 19-й арміі. У адным з баёў быў цяжка паранены, прама ў санітарным абозе яму зрабілі хірургічную аперацыю. Разам з іншымі параненымі быў адпраўлены ў Маскву. Але ў канцы верасня санітарная калона не змагла ўжо прабіцца ў сталіцу — вакол

ішлі жорсткія баі. Праз некалькі сутак немцы ўзялі калону ў палон і адправілі ў захопленую Вязьму, а потым у Смаленск. Абыходзіліся з параненымі жорстка: хто не мог ісці сам, тых канваіры забівалі. На адным з этапаў Мартысюк уцёк. Два месяцы прабіраўся дадому. Хаваўся спачатку ў Фёдара Астапчука ў в. Булькова, а потым на сядзібах Сцяпана Бойкі і Івана Фалько ў маленькай Задзерці. У лютым 1942 г. сустрэўся з Мікалаем Андрэевічам Мірочнікам, які жыў у в. Падбулькова. Ад яго і даведаўся пра антыфашысцкі камітэт. Хутка адбылася сустрэча з І.В.Салейкам, ад якога М.А.Мартысюк атрымаў заданне.

У родныя мясціны з акружэння вярнуўся і Аляксей Сямёнавіч Купрыянюк. Пры польскім часе ён двойчы сядзеў у турме за рэвалюцыйную дзейнасць. Другі раз член КПЗБ А.С.Купрыянюк быў асуджаны ў жніўні 1938 г. тэрмінам на 8 гадоў. Калі пачалася другая сусветная вайна, ён быў вязнем брэсцкай турмы. 14 верасня 1939 г. прыняў удзел у паўстанні палітзняволеных, у выніку чаго змог вызваліцца з-за кратаў. У красавіку 1941 г. А.С.Купрыянюк быў прызваны на службу ў Чырвоную Армію. Служыць давялося на граніцы. Папаў у акружэнне. Адступаў да Магілёва. У красавіку 1942 г. дабраўся ў родную вёску. Прыйшоў, як аказалася, у самы раз: у прыбужскіх лясах зноў пачыналі баявую дзейнасць распушчаныя восенню сорак першага партызанскія групы, аб'яднаныя цяпер ужо ў атрады.

Першымі ў атрад аб'ядналіся групы Шыканава — Чарнака і Зяленіна — Кіцьяна. У красавіку 1942 г. у атрадзе налічвалася ўжо каля 50 партызан. Камандзірам атрада стаў С.С.Шыканаў, камісарам — Л.П.Зяленін, М.М.Чарнак — начальнікам разведкі.

Арганізаваўся і атрад з «палітрукоў» на чале з І.В.Салейкам. У атрадзе акрамя мясцовых камуністаў былі ваеннаслужачыя Павел Астаф'еў, Аляксандр Сяргеевіч Кузачкін, Анатоль Захаравіч Казлоў, Віктар Піваваў, Сяргей Данілавіч Чубараў, якім удалося ўцячы з палону. Прыйшлі ў атрад былыя ваеннапалонныя, якія хаваліся ў вёсках Лазы і Забалацце. Брэсцкі падпольшчык Кандрат Сушкоў прывёў з горада да Салейкі двух нашых лётчыкаў і паляка Рамана Станіслававіча Рамкоўскага.

У чэрвені 1942 г. атрады І.Салейкі, Хоміча (Селівоніка) і М.Чарнова ўліліся ў атрад С.Шыканава. З гэтага часу партызанскі атрад у Старасельскім лесе становіцца даволі грознай узброенай сілай.

Да сакавіка 1942 г. быў створаны моцны антыфашысцкі рух у раёне. Падпольныя групы ўзначальвалі Фама Вольскі (в. Закій), Уладзімір Іванавіч Стальмашук і Іван Стараселец (в. Забалацце), Карп і Уладзімір Васілюкі (в. Камяніца-Жыровецкая), Міхаіл Андрасюк (в. Падлессе), Аксенцій Барысавіч Плечка і Міхаіл Захаравіч Бурчык (в. Шэбрын), Аляксандр Селівонік (в. Херма), Мікалай Андрэевіч Мірочнік і Канстанцін Хвалько (в. Падбулькова), Рыгор Андрэевіч Трацюк, муж і жонка Антон і Ганна Селівонікі (в. Тэльмы), Андрэй Андрэевіч Пугач (в. Тэльмы-1), Мікола Сяргеевіч Ярошык (в. Плоска), Барыс Мікітавіч Сокал (в. Задворцы), Карп Малыха (в. Бердычы), Ігнацій Антанюк (х. Чэрні), Вольга Рыгораўна Антанюк (в. Чэрні), Сцяпан Мацвеевіч Смаль (в. Бярнады), Фёдар Астапчук (в. Булькова), Міхаіл Качурка і Мікалай Раманюк (в. Вычулкі), Іван Раманавіч Стальмашук (в. Лозы), Макар Смаль і Мікалай Саўчук (в. Гершоны), Князюк, падпалкоўнік НКУС (в. Кошалева), Аляксандр Мартысюк (в. Хабы), Дзям'ян Грыцук і Іван Казел (в. Селяхі), Іван Стараселец (в. Забалацце), Павел Антонавіч Руцкі (в. Курніца), Савелій Раманюк (в. Крушына), Андрэй Пугач (в. Косічы), Барыс Аляксеевіч Слядзінскі (в. Шпановічы),

Мікалай Кароль (в. Пугачова), Карп Іванавіч Гаршчарык і Сцяпан Якаўлевіч Пучык (в. Міхалін), Павел Гуль (в. Задзерцы), Іван Фёдаравіч Селівонік і Аляксандр Селівонік (в. Франопаль), Міхаіл Дзям'янавіч Саўчук (х. Бярозаўка), Іван Ануфрыевіч Каплевіч (вёскі Буякі, Очкі).

Падпольныя групы былі створаны таксама ў вёсках Радванічы, Камяніца, Старое Сяло. Група з 25 чалавек пад кіраўніцтвам Фёдара Іванавіча Лысюка дзейнічала ў в. Ямна. У яе ўваходзілі браты Усцін Паўлавіч і Міхаіл Паўлавіч Куцы, браты Аляксандр Карнеевіч і Павел Карнеевіч Сычукі, Уладзімір Аляксандравіч і Віктар Піліпавіч Сычукі, Мікалай Раманавіч, Аляксей Фёдаравіч і Адам Фёдаравіч Чырукі, Мікалай Антонавіч і Васіль Антонавіч Плечкі, Мікалай Сцяпанавіч і Аляксей Сцяпанавіч Дзівенцы, Іван Аляксеевіч і Ігнацій Аляксеевіч Шутко, Аляксей Васільевіч і Аляксандр Міхайлавіч Салейкі, Ігнацій Васільевіч Качаноўскі, Мікалай Пятровіч Тымасюк, Уладзімір Пятровіч Кубай, Васіль Цімафеевіч Лысюк, Уладзімір Пятровіч Новік, Мікалай Пятровіч Нічыпарук (па прозвішчы Хлопчык), Аляксандр Пятровіч Кахманюк.

У в. Крушыны дзейнічала падпольная група Савелія Фаміча Раманюка з х. Крушыны. У групу ўваходзілі Мікалай Фаміч і Мікалай Іванавіч Раманюкі, Аляксандр Васільевіч Катовіч і іншыя патрыёты.

Сувязнымі падпольшчыкаў і партызан былі Мікола Савіч з в. Сычова Жабінкаўскага раёна (расстраляны фашыстамі ў 1943 г.), яго сыны Іван, Васіль і Міхась, жыхар в. Ваўкі Аляксандр Іванавіч Гаўрылюк (забіты немцамі ў 1943 г.), Андрэй Хоміч з в. Сычова, Іван і Вольга Ляўчук з в. Азяты, Наталля Чарнак, Ілья Іванавіч Ласковіч з в. Франопаль (загінуў у баі ў верасні 1943 г.). Гэтыя людзі многа зрабілі для партызан — прыносілі ў лес каштоўныя звесткі аб ворагу, прадукты, зброю, медыкаменты.

Па заданні партызан у в. Забалацце падпольную ячэйку з 7 чалавек арганізаваў Уладзімір Іванавіч Стальмашук. За год актыўнай работы патрыётам удалося здабыць і перадаць партызанам 3 кулямёты, 10 вінтовак, некалькі скрынак патронаў. У аперацыі па знішчэнні лесапілкі прынялі непасрэдны ўдзел і хлопцы з Забалацця.

Уладзімір Стальмашук з самага пачатку сваёй антыфашысцкай дзейнасці імкнуўся да партызан, але камандаванне атрада лічыла, што ён прынясе больш карысці застаўшыся ў роднай вёсцы. Напрадвесні 1943 г. над падпольшчыкам навісла пагроза правалу. Партызаны інсцэніравалі «расправу над нямецкім служкам Стальмашуком». У атрадзе Уладзімір быў пад псеўданімам Максім Саха, добра ваяваў, уступіў у камсамол. Удзельнічаў у падрыве 8 эшалонаў, 9 аўтамашын, зрэзаў 40 кіламетраў тэлеграфна-тэлефоннай сувязі. У баі здабыў станковы кулямёт, 500 патронаў да яго і дзве вінтоўкі.

Дзейнасць падпольных груп распаўсюджвалася і на нямецкіх памагатых — старастаў вёсак, якія праяўлялі стараннасць перад нямецкімі ўладамі. Яны папярэджвалі іх ад імя партызан. Гэта станоўча дзейнічала не толькі на старастаў, але і на ўсіх тых, хто яшчэ не вырашыў для сябе, на чый бок стаць у гэтай жудаснай вайне.

АБ'ЯДНАННЕ НАМАГАННЯЎ ПАТРЫЁТАЎ ГОРАДА І РАЁНА

Яшчэ ў першую ваенную восень І.В.Салейка і Ф.І.Лысюк пачалі наладжваць сувязі з антыфашысцкім падполлем Брэста. У сваю чаргу імкнуліся звязацца з партызанамі камуністы і камсамольцы, якія не змаглі выбрацца з горада ў першыя дні вайны, былыя ваеннапалонныя і акружэнцы.

Сувязь падпольшчыкаў горада і

раёна вялася па многіх каналах. Актыўна дзейнічалі сувязныя Ігнат Рыгоравіч Антанюк, Кандрат Георгіевіч Сушкоў, Сцяпан Трафімавіч Ільін. Розныя гэта былі людзі і па гадах, і па адукацыі, і па прафесіі. Але іх аб'яднала прага да барацьбы з ворагам.

Аляксандр Іванавіч Гаўрылюк быў настаўнікам пачатковай школы ў в. Літвіны. Калі прыйшлі немцы, уладкаваўся працаваць лесніком Шэбрынскага лясніцтва. Да яго хаты цягнуліся многія ніткі падпольна-партызанскіх сувязей. З горада да яго на кардон пераправілі хірурга Сцяпана Трафімавіча Ільіна, якому ў Брэсце пагражала небяспека. Тут, у лесе, Ільін з Гаўрылюком і яго жонкай Соф'яй Аляксандраўнай стварылі нешта падобнае на шпіталь: аказвалі дапамогу параненым і хворым, якіх удалося вызваліць з нямецкага палону. На зіму іх размеркавалі ў навакольных вёсках Франопаль, Вялікія і Малыя Радванічы, Муры, Падлессе.

Набліжалася зіма. Людзей з лесу адпраўлялі ў горад і вёскі. Заставацца да вясны на чужых харчах доктару С.Т.Ільіну не дазваляла сумленне. Ён таксама падаўся ў Брэст. Вясной 1942 г. партызаны даведаліся, што жандары арыштавалі яго, кінулі ў гарадскую турму. Разам з падпольшчыкамі партызаны рабілі ўсё, каб вызваліць з няволі Сцяпана Трафімавіча. Не адзін раз Аляксандр Іванавіч Гаўрылюк, рызыкуючы жыццём, ездзіў да турэмнага начальства з прэзентамі — мёдам са сваёй пасекі, свежым салам ды іншымі прысмакамі. Яму ўдалося-такі падкупіць начальства: у чэрвені 1942 г. доктара Ільіна выпусцілі з турмы. Яго спачатку ўладкавалі на працу ў Малярыцкую бальніцу, а яшчэ праз год адазвалі ў Брэсцкае партызанскае злучэнне Паўднёвай зоны.

Іншы лёс спасціг А.І.Гаўрылюка. У жніўні 1943 г. дом лесніка нечакана быў акружаны карнікамі. Уцячы ў лес нікому з сям'і Гаўрылюкоў не ўдалося. Фашысты жорстка катавалі Аляксандра Іванавіча і яго жонку Соф'ю Аляксандраўну, каб дазнацца, дзе знаходзіцца галоўная база партызан. Нічога не сказалі Гаўрылюкі. І тады карнікі на двары сядзібы расстралялі мужа, жонку і іх шасцігадовага сына Паўліка.

Загінуў у баі з карнікамі ў 1943 г. і сувязны камсамолец Барыс Лазарыкаў. Жыў ён у горадзе. Сакрэтныя звесткі, медыкаменты, сілкаванне для радыёпрыёмніка перадаваў праз надзейных людзей у в. Ямна. Гэта была небяспечная, напружаная работа, тым больш, што працаваць прыходзілася сярод немцаў. Аднак Барыс рабіў усё, каб як найлепш выканаць заданні партызан. Пазней ён стаў партызанам.

Каштоўныя звесткі аб перамяшчэнні нямецкіх войскаў у раёне станцыі Брэст партызаны атрымлівалі ад Васіля Якаўлевіча Мельнікава (падпольная мянушка Андрэй). Працаваў В.Я.Мельнікаў на чыгунцы, меў свабодны доступ да эшалонаў, быў знаёмы з усімі паравознымі брыгадамі. Каштоўныя матэрыялы прыходзілі да партызан за подпісам Раскатаў. Гэта былі звесткі ад Якава Аляксеевіча Каханоўскага, інжынера адной з нямецкіх устаноў. Ён зрабіў і перадаў планы дыслакацыі воінскіх часцей і агнявых кропак гітлераўцаў у горадзе і яго наваколлі. З дапамогай падпольшчыкаў Брэста ў горадзе ўладкоўваліся партызаны і сельскія патрыёты.

Актыўную сувязь паміж падполлем горада і раёна трымаў на працягу амаль трох гадоў (з восені 1941 г. па ліпень 1944 г.) Сямён Міхайлавіч Мельнічук. Жыў ён на х. Дуброва, што ў Радваніцкім сельскім Савеце. Да партызанскай дзейнасці яго прыцягнуў Салейка. Сямён Міхайлавіч восенню сорак першага арганізаваў групу, у якую ўвайшлі Любоў Кірылаўна Мурашка, Акім Міхайлавіч, Рыгор Емяльянавіч і Аляксей Цімафеевіч Мельнічукі. Яны збіралі медыкаменты

спачатку для шасцярых савецкіх параненых ваеннапалонных, якіх немцы прыгналі працаваць у маёнтак Валянява, а потым — для партызанскага атрада І.В.Салейкі.

Да вайны Л.К.Мурашка была медсястрой у абласной бальніцы. З дапамогай блізкіх людзей яна выйшла на сувязь з Галінай Аляксандраўнай Аржанавай, якая працавала ў гарадской аптэцы на рагу вуліц Савецкай і Пушкінскай. Дарэчы, менавіта ў яе Мурашка атрымлівала медыкаменты. Аржанава і Мурашка перадалі ў лес акрамя бінтоў, шпрыцаў шмат іншых медінструментаў. У кастрычніку 1943 г. Г.А.Аржанава была арыштавана і павешана ў брэсцкай турме.

Падпольшчыкі разам з партызанамі вялі сярод насельніцтва агітацыйную работу, распаўсюджвалі савецкія газеты і лістоўкі, атрыманыя з Вялікай зямлі. У в. Забалацце ў свірне Савы Цыбульскага схавалі ў склепе радыёпрыёмнік, пішучую машынку, рататар. Паляк Раман Станіслававіч Рамкоўскі, якога падполле пераправіла з горада яшчэ ў першую ваенную зіму, добра ведаў нямецкую і рускую мовы. Ён пісаў агляды міжнародных падзей, лістоўкі з выкрыццём фашысцкіх планаў сусветнага панавання, запісваў зводкі з фронту. Разам з Рамкоўскім некаторы час працаваў Мікалай Арцёмавіч Засім, які нарадзіўся ў в. Шыны, што на Пружаншчыне. Раман і Мікалай перапраўлялі надрукаваныя імі лістоўскі ў Азяцкі, Стрыганецкі, Чарнянскі, Радваніцкі, Велікарыцкі, Камянец-Жыровіцкі, Тэльмінскі і Гершонскі сельсаветы.

Мікола Засім яшчэ пры Польшчы быў вядомы як паэт-змагар за лепшую долю беларускага народа. І ў Вялікую Айчынную ён таксама змагаўся супраць фашыстаў і зброяй, і словам. Даведаўшыся, што М.А.Засім знаходзіцца сярод партызан, немцы расстралялі родных паэта — маці, бацьку і сястру. Пасля вайны былыя партызаны адкапалі ў Закійскім лесе жалезную скрынку, у якой знайшлі некалькі сшыткаў-нататкаў паэта Міколы Засіма.

СТВАРЭННЕ І ДЗЕЙНАСЦЬ РАЁННАГА АНТЫФАШЫСЦКАГА КАМІТЭТА

2 красавіка 1942 г. у лесе паблізу в. Камяніца-Жыровецкая адбылася нарада былых членаў КПЗБ і партыйна-савецкага актыву Камянец-Жыровіцкага, Тэльмінскага, Чэрнінскага, Радваніцкага (Брэсцкі раён), Стрыганецкага і Старасельскага (Жабінкаўскі раён), Пажэжынскага (Маларыцкі раён) сельсаветаў. У нарадзе, якую вёў вопытны падпольшчык, у мінулым разведчык СССР у Польшчы Р.С.Рамкоўскі, прынялі ўдзел 15 чалавек. Пасля грунтоўнага аналізу дзейнасці патрыятычнага руху на тэрыторыі суседніх раёнаў нарада вырашыла стварыць адзіны антыфашысцкі камітэт. Сакратаром камітэта быў абраны Іван Васільевіч Салейка, яго намеснікам — Андрэй Ануфрыевіч Пугач, членамі — Іван Іванавіч Гапанюк, Фама Ігнацьевіч Вольскі, Фёдар Іванавіч Лысюк, Уладзімір Іванавіч Стальмашук, Мікалай Андрэевіч Мартысюк, Іван Фёдаравіч Селівонік.

На нарадзе была распрацавана праграма дзейнасці антыфашысцкага камітэта. Акрамя шырокай падтрымкі ўсенароднага партызанскага руху ў Прыбужжы ставілася задача аказваць матэрыяльную і грашовую дапамогу людзям, якія засталіся без жылля і сродкаў да існавання, зрываць мабілізацыю савецкіх людзей у Германію, ратаваць патрыётаў і мірных жыхароў, збіраць зброю, боепрыпасы і медыкаменты для партызанскіх атрадаў. Не заўсёды ўдала заканчваліся аперацыі па здабычы зброі і боепрыпасаў. Так, у чэрвені 1942 г. ад Брэсцкага падпольнага гаркома партыі праз К.Г.Сушкова паступілі ў атрад звесткі аб тым, што ў некаторых грамадзян в. Скорбічы (цяпер Дружба) ёсць зброя.

Вядомы былі нават прозвішчы сялян, якія хавалі вінтоўкі, карабіны, патроны. Партызаны вырашылі забраць гэтую зброю.

Але ў вёску папярэдне нікога не паслалі, каб разведаць настрой сялян да партызан. І калі група ў складзе братоў Ігната і Радзівона Антанюкоў, М.А.Мартысюка, Чубарава, Казачкіна, К.Малыхі пад кіраўніцтвам А.С.Купрыянюка прыйшла ў Скорбічы, заходзіла ў хаты па названых адрасах і патрабавала здаць зброю, людзі не прызнаваліся ні ў чым. Яны дзяліліся хлебам, бульбай, вопраткай, але пра зброю маўчалі.

Партызаны зайшлі і да солтыса Кандрацюка. Той пачаў бажыцца, што не супраць савецкай улады, што служыць немцам толькі з-за страху. Госці развялі дыскусію аб пераважнасці калгасаў над дробнымі ўласнымі гаспадаркамі. Солтыс паддакваў, згаджаўся з незнаёмымі ўзброенымі людзьмі. У гэты час з другога пакоя сын солтыса вылез праз акно, каля якога партызаны не паставілі вартаўніка, і пабег за дапамогай у суседнюю вёску.

Заўважыўшы сваю памылку, партызаны хутка пакінулі вёску, аднак ішоў дождж, дарога была слізкая. І каб заблытаць сляды, партызаны ішлі задам наперад крок у крок. Такая хадзьба была вельмі марудная, і яны паспелі за некалькі гадзін адысці толькі да в. Бердычы. Тут, каля ўрочышча Сцебрына, іх дагналі немцы і паліцаі. Пачаўся бой. Разрыўной куляй быў забіты камандзір групы Аляксей Сямёнавіч Купрыянюк, паранены М.А.Мартысюк, адзін партызан здаўся ў палон. Траім з групы ўдалося праз балота адарвацца ад пагоні, ў алешніку паблізу х. Машчонка схаваліся браты Антанюкі. Яны вынеслі з бою цела забітага камандзіра групы, дапамаглі параненаму Мартысюку.

Фёдар Тарасавіч Токун запрог каня і павёз параненага ў в. Ямна. Дарога была небяспечная, усюды стаялі патрулі. Але ў возе, у якім быў схаваны партызан, немцы не корпаліся. Паблізу Мухаўца групу ўжо чакаў член антыфашысцкага камітэта Фёдар Іванавіч Лысюк. Ён першы і даведаўся, што аперацыя прайшла няўдала.

З гэтай вылазкі быў зроблены вывад — партызанам, падпольшчыкам і сувязным трэба дзейнічаць толькі ў цесным кантакце. Інакш без цяжкіх ахвяр не абысціся.

З вясны 1942 г. партызанскі рух у раёне пачаў набіраць сілу. У брэсцкую камендатуру прыходзілі рапарты аб засадах, пажарах, дыверсіях. Былі разгромлены будынкі валасной управы ў Камяніцы-Жыровецкай, торфазавод у Тэльмах, памешчыцкая сядзіба ў Ямна, цагельны завод у Гершонах.

Але трэба адзначыць, што хапала ў той час і шпіёнаў, і правакатараў, знаходзіліся людзі, якія добраахвотна паведамлялі немцам аб савецкіх актывістах, аб месцазнаходжанні сем'яў ваеннаслужачых, наводзілі паліцэйскіх на сувязных партызанскіх атрадаў. У выніку гэтага ў турмах было замучана 120 жыхароў в. Старое Сяло, каля 300 чалавек з вёсак Азяты, Сычова, Радванічы. Больш за 100 чалавек насільна былі адпраўлены на работу ў Германію з в. Пугачова.

За ўдзел у антыфашысцкім руху ў в. Шэбрын ад рук карнікаў загінулі Дзмітрый Паўлавіч, Аксенцій Барысавіч і Ганна Іванаўна Плечкі, Андрэй Антонавіч і Міхаіл Лукіч Мартысюкі, Мікалай Аляксеевіч, Аксіння Елісееўна, Сямён Елісеевіч і Аляксей Сямёнавіч Купрыянюкі, Пётр Васільевіч, Пётр Іосіфавіч і Марфа Іосіфаўна Носікі, Аляксей Рыгоравіч, Настасся Рыгораўна і Васіль Сцяпанавіч Гулі, Мікалай Аксенцьевіч, Уладзімір Фёдаравіч, Дар'я Максімаўна і Васіль Мікалаевіч Леўчукі, Максім Макаравіч, Іван Макаравіч і Аляксандр Ігнацьевіч Грычанікі. Сцяпана Міхайлавіча Саў-

чука немцы расстралялі толькі за тое, што ў яго хаце знайшлі чырвонаармейскую форму.

У першай палове 1942 г. у раёне было арыштавана больш за 50 партыйна-савецкіх актывістаў. Многія з іх былі расстраляны.

Але ніякія рэпрэсіі не змаглі ўжо спыніць масавага партызанскага руху. Бургамістр в. Радванічы 18 лістапада дакладваў свайму начальству ў Брэст, што сабранае ў насельніцтва збожжа (50 цэнтнераў) для вывазу ў Германію партызаны спалілі разам са школай, у якой быў склад, а ў Франопалі адабралі 40 цэнтнераў зерня і затапілі ў рэчцы. На ўсіх дарогах, паведамляў бургамістр, фурманкі з зернем затрымліваюцца бандытамі. Неўзабаве паліцэйскі ўчастак з в. Радванічы немцы перавялі ў Брэст. Бязлітасна расправіліся акупанты з жыхарамі в. Зялёныя Буды. Яны сагналі ўсіх мужчын, жанчын і дзяцей у драўляную павець і запалілі. Хто спрабаваў уцячы — расстрэльвалі з кулямёта. Уся вёска — а там было каля 20 двароў — была спалена.

Такое ж злачынства супраць мірнага насельніцтва фашысты зрабілі і ў в. Барысаўка, у якой налічвалася каля 60 хат. Загінула больш за 150 чалавек.

У в. Вялікія Радванічы карнікі расстралялі пяць сем'яў, спалілі іх сядзібы.

У в. Старое Сяло да Ульяны Карнілаўны Козіч зайшоў аднойчы яе аднавясковец, партызан Мікалай Ануфрыеў. З ім былі яшчэ два таварышы. Нехта данёс паліцыі, дом акружылі, пачаўся бой. Сілы былі няроўныя, хутка ўсе хлопцы палеглі ў баі. Калі быў апазнаны Мікалай Ануфрыеў, паліцэйскія прывялі на допыт яго маці. Каб адвесці бяду ад аднавяскоўцаў за сувязь з партызанамі, мужная жанчына сказала ворагам: «Не, гэта не мой сын. Коля пайшоў на ўсход з Чырвонай Арміяй».

Як ні было цяжка, але падполле дзейнічала. Патрыёты групаваліся ў так званыя «тройкі». Такая арганізацыя была больш застрахавана ад выпадковых правалаў і дзейнічала больш эфектыўна. Мікіта Сяргеевіч Ярошык з в. Плоска перадаў у лес 5 вінтовак, скрынку аўтаматных патронаў і некалькі гранат. З в. Бярнады Карп Іванавіч Малыха, Мікалай Сцяпанавіч Трычак перадалі партызанам 3 вінтоўкі і 4 гранаты.

Перадавалі зброю партызанам Іван Арсенцьевіч і Фядора Рыгораўна Старасельцы, Мікалай Грышук і Раман Скавародка, Цімафей Піліпавіч Жмінько, Анатоль Пятровіч і Ганна Рыгораўна Саско, Лявонцій Стальмашук (усе з в. Забалацце), Фама Ігнатавіч і Андрэй Ануфрыевіч Вольскія, Зінаіда Маркаўна Дывільчук, Арына Вольская (в. Закій), Сямён Кірылавіч Шпільчук, Мікалай Рыгоравіч Печка, Фёдар Тарасавіч Такун (в. Машчонка), Марыя Давыдаўна Гусік (в. Селяхі), Іван Рыгоравіч Воўчык і многія іншыя жыхары раёна.

У кастрычніку 1942 г. партызанская група на чале з І.В.Салейкам на перагоне Задворцы — в. Косічы ўзарвала нямецкі эшалон з жывой сілай і тэхнікай праціўніка. У гэтай аперацыі прымалі ўдзел І.Селівонік, М.Засім, Р.Рамкоўскі, Н.Мартысюк. Група М.Чарнова знішчыла паліцэйскі ўчастак у в. Чэрні.

Каб нейтралізаваць партызанскі рух, немцы арганізавалі карныя экспедыцыі. У вёскі Забалацце, Шэбрын, Ямна, Булькова, Старое Сяло, Ракітніца, Азяты, Чарняны, Антонава, Велікарыта, Радванічы, Лозы былі ўведзены войскі. Вясной 1943 г. партызаны зноў пачалі праводзіць маштабныя дыверсіі.

На чыгункі Брэст—Ковель, Брэст—Тэўлі і Брэст—Кобрын былі ўзарваны масты, спушчана пад адхон некалькі цягнікоў. Раз-пораз

узрываліся на мінах аўтамашыны на дарогах Брэст — Кобрын і Брэст — Ковель. У партызан было ўжо дастаткова сіл, каб праводзіць баявыя аперацыі на значнай тэрыторыі раёна.

У красавіку 1943 г. у Старасельскім партызанскім атрадзе, якім камандаваў С.С.Шыканаў, налічвалася ўжо больш за 300 байцоў. Агульнымі намаганнямі партызан і падпольшчыкаў былі разгромлены гарнізоны ў кар'еры паблізу в. Вялікія Косічы, у вёсках Ацечына і Алянава.

2 мая 1943 г. фашысты пачалі шырокае наступленне на Старасельскі лес. Немцы ішлі на партызан з трох бакоў, пакінуўшы свабодным выхад толькі на Брэст, але партызаны не палезлі ў пастку, а вырашылі даць бой. Большасць людзей у той дзень выконвала баявыя заданні, і на базе заставалася толькі адна рота. Заняўшы кругавую абарону, партызаны падпусцілі карнікаў на 15—20 метраў і адкрылі агонь. Фашысты не вытрымалі раптоўны агнявы шквал партызан і адступілі. Рота прарвалася праз фашысцкі ланцуг і ўглыбілася ў лес на 15 кіламетраў.

На наступны дзень карнікі, атрымаўшы дапамогу, працягвалі прачэсваць лес. Але хутка зразумелі, што гэта нічога не дасць, і знялі блакаду. У гэтым баі загінуў Міхаіл Мікітавіч Чарнак, разведчык Старасельскага атрада, адзін з яго арганізатараў. Партызаны і мясцовае насельніцтва з пашанай пахавалі героя. Яго імя прысвоілі партызанскаму атраду.

АБ'ЯДНАННЕ АНТЫФАШЫСТАЎ РАЁНА З БРЭСЦКІМ ПАРТЫЗАНСКІМ ЗЛУЧЭННЕМ

Да вясны 1943 г. у партызан С.С.Шыканава яшчэ не было цеснай сувязі з Вялікай зямлёй. У маі ў атрад з групай байцоў-аўтаматчыкаў прыбыў упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па арганізацыі партызанскіх атрадаў і антыфашысцкага руху Паўднёвай зоны Захар Філімонавіч Паплаўскі. Ад яго партызаны даведаліся, што ў красавіку ў Дзівінскі раён прыбыла з-за лініі фронту арганізацыйная партыйная група на чале з сакратаром Брэсцкага абкома КП(б)Б і ўпаўнаважаным ЦК КП(б)Б і Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) па Брэсцкай вобласці Сяргеем Іванавічам Сікорскім. Неўзабаве група разгарнулася ў падпольны абком КП(б)Б.

З гэтага моманту падпольны абком партыі пачаў ствараць міжраённыя, гарадскія і раённыя падпольныя камітэты партыі і камсамола. На працягу лета 1943 г. — вясны 1944 г. было арганізавана ў вобласці 2 міжрайкомы, гарком і 18 райкомаў ЛКСМБ. Брэсцкі міжраённы «Камітэт барацьбы з нямецкімі акупантамі» па рашэнні ЦК КП(б)Б у ліпені 1943 г. быў ператвораны ў Брэсцкі абласны антыфашысцкі камітэт, які ў сваю чаргу аб'яднаў дзеючыя і стварыў новыя раённыя антыфашысцкія камітэты. Іван Васільевіч Салейка ўзначаліў раённы антыфашысцкі камітэт, адначасова выконваючы ў атрадзе імя М.М.Чарнака абавязкі камандзіра ўзвода. Намеснікам Салейкі быў прызначаны Фёдар Іванавіч Лысюк (клічка Ваня), членамі камітэта — Павел Антонавіч Рудскі (Сярожа) і Юстын Паўлавіч Куц. Работу Брэсцкага, Маларыцкага, Жабінкаўскага, Дзівінскага і Дамачаўскага раённых антыфашысцкіх камітэтаў накіроўваў З.Ф.Паплаўскі.

Для аператыўнага кіраўніцтва партызанскім рухам у канцы красавіка 1943 г. быў створаны штаб партызанскіх атрадаў. Пачалася практычная работа па арганізацыі партызанскага злучэння вобласці.

У красавіку — чэрвені абком і штаб устанавілі сувязь з асобна дзеючымі партызанскімі атрадамі, у ліку якіх быў атрад імя М.М.Чарнака, узмацнілі слабыя баявыя групы, вызначылі арганізацыйную структуру атрадаў, іх задачы і раёны баявых дзеянняў.

З перабудовай арганізацыйнай ра-

боты значна ўзрасла эфектыўнасць дзейнасці партызанскага і падпольнага руху ў раёне. Летам 1943 г. у антыфашысцкіх «тройках» і групах налічвалася 176 чалавек. У ліпені ў партызанскія атрады прыйшло 37 чалавек, 22 з іх са зброяй. Як паведамляў І.В.Салейка ў справаздачы штабу партызанскага злучэння, толькі ў жніўні сорак трэцяга было спалена шэсць драўляных мастоў, спілаваны слупы лініі сувязі на адлегласці 16 кіламетраў.

Дыверсіі праводзіліся і ў самім горадзе. Падпольшчыкі псавалі электрычныя і тэлефонныя кабелі, палілі эшалоны з сенам і саломай, што накіроўваліся на фронт.

Пад кіраўніцтвам Васіля Якаўлевіча Мельнікава ў горадзе працавала група агентаў асобага аддзела. У час вайны тут дзейнічала і агентурная разведка Лонданскага польскага эмігрыйнага ўрада. Адзін з іх, Уладзімір Рыгоравіч Прыгон, быў адначасова і рэзідэнтам партызанскай брыгады імя І.В.Сталіна. Да антыфашысцкага руху з вясны 1943 г. далучыўся і начальнік раённай адміністрацыі паляк Рудкоўскі. Акупантам было вядома, што ў 1939 г. ён быў рэпрэсіраваны савецкай уладай, таму і даверылі яму высокую пасаду. Рудкоўскі ненавідзеў фашыстаў і летам 1943 г. здолеў выйсці на сувязь з савецкімі патрыётамі і перадаць у партызанскі атрад радыёпрыёмнік, пішучую машынку, паперу, вельмі каштоўныя звесткі аб ваенных умацаваннях у Брэсце, планы аэрадромаў. Асобы аддзел партызанскага злучэння рабіў захады на больш цесныя кантакты з Рудкоўскім, але сустрэча з ім у в. Раманаўскія Хутары не адбылася, бо восенню 1943 г. Уладзіміра Прыгона, Станіслава Лэнскага, Рудкоўскага і іншых членаў арганізацыі польскага супраціўлення гітлераўцы арыштавалі.

Вясной 1943 г. вораг высачыў партызанскіх сувязных Трафіма Макаравіча і Варвару Іванаўну Чарэвак. На х. Малыя Радванічы ў сям'і лесніка пад выглядам сваякоў знайшлі прытулак муж і жонка Ануфрый і Вольга Ласковіч с Франопаля, якіх западозрыла паліцыя.

Праз пэўны час Ануфрый Іванавіч з братам Пятром вырашыў наведаць сваю хату, узяць некаторыя рэчы. Пайшлі днём. Сабралі пажыткі. Пятро пайшоў на поле, дзе людзі ўжо аралі пад сяўбу, папрасіць у знаёмага фурманку, каб завезці сабранае на хутар. У гэты час на вёску наляцелі паліцаі і акружылі хату Ласковічаў. Адстрэльваючыся, праз агароды Ануфрый пабег да лесу. На ўзлеску быў паранены, але здолеў схавацца ў гушчары. Паліцаі не сталі даганяць братоў, а адразу ж паехалі на хутар да Чарэўкі, забралі ў пастарунак Вольгу Ласковіч, пакуль не з'явіцца яе муж.

Ануфрый прыйшоў на хутар толькі на другую раніцу. Не паспелі мужчыны яшчэ ўсё як след абмеркаваць, як сядзібу раптоўна акружылі паліцэйскія — відаць, яны сядзелі ў засадзе. Ідучы на хутар, Ануфрый схаваў свой наган у дупле дрэва каля дарогі. Так звычайна рабілі ўсе сувязныя, бо ў выпадку аблавы пры наяўнасці зброі на літасць нікому нельга было разлічваць.

Ануфрыя схапілі, пачалі дапытваць. Потым аднаго з паліцаяў паслалі за фурманкай, каб завезці арыштаванага ў пастарунак. Неўзабаве на хутар прыехаў памочнік каменданта. Паліцаі кінулі Ласковіча ў фурманку, двое з вінтоўкамі селі на драбіны з двух бакоў і рушылі па лясной дарозе якраз у накірунку дуба.

Паліцаі не звярталі ўвагі на Ануфрыя — куды той дзенецца. А той, нібыта шукаючы лепшую апору на возе, — бо вельмі ж трэсла — вобмацкам знайшоў пад саломай сякеру і, як толькі фурманка параўнялася з дубам, аглушыў вартаўніка. Пакуль другі паліцай зразумеў, у чым справа, Ануфрый ма-

ланкай сігануў да дуба, выхапіў наган і знік у лесе. Паліцай страляў услед, але дарэмна.

У партызанскі атрад Ануфрый прыбег, не адчуваючы болю ў параненай назе. Далажыў С.С.Шыканаву аб падзеях на хутары ў Чарэўкі. Камандзір прыняў рашэнне вызваліць з палону Трафіма Макаравіча. Ён сам узначаліў групу захопу. Партызаны прыбеглі на хутар у той момант, калі закаванага ў наручнікі Т.М.Чарэўку паліцаі ўжо выводзілі з хаты. Першая ж кулямётная чарга паверх даху хаты заставіла паліцэйскіх разбегчыся. Пасля гэтага здарэння сям'я Трафіма Макаравіча пайшла ў атрад. Потым, калі зона партызанскага кантролю атрада імя М.М.Чарнака пашырылася, Чарэўкі вярнуліся на свой хутар і працягвалі дапамагаць народным мсціўцам.

Летам 1943 г. вакол Брэста немцы стваралі гарнізоны з нацыянальных фарміраванняў, у якіх служылі завербаваныя ваеннапалонныя Чырвонай Арміі. Сярод іх былі розныя людзі. Многія пайшлі на службу да гітлераўцаў, каб пры зручным выпадку перайсці да партызан. Казакі і легіянеры звычайна ахоўвалі чыгунку, масты. Партызаны раскідвалі па гарнізонах адозвы з заклікамі пераходзіць да партызан. Многія ўласаўцы са зброяй і амуніцыяй прыходзілі ў лес. З самога Брэста перайшлі да партызан 36 асецінаў. Усе яны прынялі ўдзел у разгроме пастарунка ў Азятах. Фашысты прынялі асецін за сваіх, бо на іх была немецкая форма. А калі спахапіліся, было ўжо позна.

* * *

Цяжкія выпрабаванні леглі на плечы Фёдара Іванавіча Лысюка, аднаго с арганізатараў антыфашысцкага руху ў Прыбужжы. З лета 1942 г. ён быў першым памочнікам І.В.Салейкі, амаль два гады кіраваў дзейнасцю падпольных ячэек. Фёдар Іванавіч і сам удзельнічаў у дыверсіях.

На тэрыторыі былой падсобнай гаспадаркі ў в. Ямна немцы арганізавалі склад, звозілі туды нарабаваныя ў сялян зерне, бульбу, сена, хатнія рэчы. Пад кіраўніцтвам Лысюка падпольшчыкі Павел Сычук, Мікалай Нічыпарук, Іван Шутко, Уладзімір Піліпавіч і Уладзімір Аляксандравіч Сычукі падпалілі некалькі свірнаў. Згарэла многа дабра, падрыхтаванага да адпраўкі ў Германію.

Узрыўныя ўстройствы падпольшчыкі атрымоўвалі ад партызан. Іх часта прыносіла жонка Ф.І.Лысюка Любоў Паўлаўна. Гэта былі смелыя і рашучыя людзі.

Не давялося дажыць да перамогі Фёдару Іванавічу Лысюку. 10 сакавіка 1944 г. раніцай карнікі раптоўна акружылі в. Ямна. Фёдар Іванавіч кінуўся да Мухаўца, каб пераплыць на чоўне на другі бераг, але не паспеў. Ён быў двойчы паранены, упаў на зямлю і, каб не трапіць у рукі ворага, застрэліўся з пісталета.

Фашысты спалілі хату Лысюка, сагналі ўсіх жыхароў вёскі на плошчу, арыштавалі Паўла Сычука, яго брата Аляксандра, Адама Чырука і брата Ф.І.Лысюка Цімафея Іванавіча. Усе яны былі расстраляны. Шукалі немцы і Любоў Паўлаўну, але яе ў сваім хляве пад старымі коўдрамі схавала сялянка Параска Шкоб.

Калі карнікі паехалі з вёскі, сяляне пахавалі забітага Фёдара Іванавіча пад дубам. І ўжо пасля вайны перанеслі яго прах на могілкі в.Трышын.

За некалькі дзён да гібелі Фёдар Іванавіч схаваў у шкляную бутэльку некалькі дакументаў і закапаў іх у агародзе. Любоў Паўлаўна з партызанамі некалькі разоў спрабавала адшукаць бутэльку, але марна. Яе знайшоў толькі ў красавіку 1965 г. сусед Лысюкоў П.М.Казлоўскі. Гэтыя дакументы разам з бутэлькай былі перададзены ў абласны краязнаўчы музей. Фёдар Іванавіч склаў спіс падпольшчыкаў, пералік сабраных сродкаў сярод

насельніцтва раёна ў 1943 г. у фонд абароны краіны: аблігацый на 40 тысяч 245 рублёў, валюты на 19 тысяч 902 рублі, сярэбраных рэчаў на 240 рублёў, 15 сярэбраных манет і 1 амерыканскі долар — усяго каштоўных папер, грошай і вырабаў на 60 тысяч 600 рублёў. У бутэльцы ляжала таксама справаздача аб рабоце антыфашысцкіх груп раёна.

У канцы 1943 г. фашысты правялі некалькі карных экспедыцый у партызанскую зону. Былі спалены вёскі Міцькі, Кацельня-Баярская, Бярнады, Гулі, Ваўкі. Многа знішчылі людзей і дамоў у вёсках Медна, Прыбарава, Рагозна, Падлессе, Страдзеч, Малыя Радванічы. Многа мірных жыхароў у вёсках Буякі, Бярозаўка, Селяхі, Казловічы, Шэбрын, Херма, Чэрні, Бердычы, Пугачова, Міцькі, Раманаўскія Хутары, Закій, Вялікія Радванічы, Вулька-Застаўская, Кунахі, Скверыкі, Камяніца-Жыровецкая, Чарнаўчыцы, Залессе, Збірагі, Вялюнь, Франопаль, Івахнавічы, Машчонка, Хабы, Плоска. У в. Лозы карнікі забілі 15 дзяцей і 11 жанчын.

Набліжэнне лініі фронту выклікала сярод мясцовага насельніцтва новы патрыятычны ўздым. У гэты перыяд пры Брэсцкім падпольным абкоме КП(б)Б была створана аператыўная група па забеспячэнні зброяй партызан. У сувязі з гэтым раённы антыфашысцкі камітэт правёў шэраг сустрэч з насельніцтвам партызанскай зоны. Толькі за адзін месяц — з 14 лютага па 16 сакавіка — актывісты камітэта і камандаванне атрада імя М.М.Чарнака правялі 22 сустрэчы, на якіх расказвалася жыхарам аб Сталінградскай і Курскай бітвах, аб савецка-польскіх адносінах, аб міжнародным становішчы. У такіх сустрэчах прыняло ўдзел каля 800 чалавек.

За перыяд абарончых баёў супраць карнікаў брыгада імя І.В.Сталіна, якая была створана ў чэрвені 1943 г. на базе атрадаў імя М.М.Чарнака і К.Я.Варашылава і ў якую потым увайшлі партызанскія атрады імя М.В.Фрунзе і Г.К.Жукава, змагла вывесці і перадаць нашым наступаючым часцям больш за 200 коней і 300 кароў, эвакуіраваць з зоны баявых дзеянняў больш за 5 тысяч чалавек мясцовага насельніцтва, у тым ліку пераправіла за лінію фронту 846 старых, жанчын і дзяцей. У дзеючую армію з брыгады добраахвотна ўступіла каля 200 маладых партызан. Частка партызанскага атрада імя М.М.Чарнака была накіравана ў тыл ворага і дзейнічала ў зоне сваёй былой дыслакацыі.

НА ЗАВЯРШАЛЬНЫМ ЭТАПЕ

Калі асноўныя партызанскія сілы пайшлі на злучэнне з наступаючымі часцямі Чырвонай Арміі, у зоне іх дзейнасці засталіся невялікія дыверсійныя і разведвальныя групы атрадаў імя М.А.Шчорса (20 чал.), імя Р.І.Катоўскага (53 чал.), імя М.М.Чарнака (86 чал.). Гэта ў асноўным былі людзі, якія на пачатку баёў былі на чыгунцы або выконвалі іншыя заданні і, зразумела, не змаглі прабіцца да сваіх праз шчыльнае кальцо блакады.

Сярод іх аказаўся і Іван Васільевіч Салейка. Менавіта ён узяўся за арганізацыю новага партызанскага атрада ў Старасельскім лесе.

У пачатку красавіка 1944 г. ён склікаў на нараду ўсіх кіраўнікоў груп, якія засталіся на тэрыторыі Брэсцкага і Жабінкаўскага раёнаў. Было прынята рашэнне аб стварэнні партызанскага атрада, каб дзейнічаць у тыле ворага.

Камандзірам атрада стаў Мазарбек Іосіфавіч Каліеў. Партызаны яго добра ведалі. У пачатку вайны лейтэнант М.І.Каліеў трапіў у палон. Каб вырвацца з палону, уступіў у паўночнаасецінскі нямецкі легіён. Праслужыў камсамолец Мазарбек Каліеў усяго 17 дзён. 25 мая 1943 г. разам з таварышамі на чале з камандзірам Рамазанам

Дзабіевічам Козыравым перайшоў да партызан. За гэты час Мазарбек паказаў сябе смелым байцом, умелым і патрабавальным камандзірам.

Камісарам новага атрада стаў І.В.Салейка, начальнікам штаба — Мікалай Андрэевіч Шапавалаў.

У атрадзе Каліева налічвалася каля 100 партызан. За два месяцы атрад правёў 53 дыверсіі, знішчыў 397 варожых салдат і афіцэраў, 27 аўтамашын, адну танкетку, пусціў пад адхон 5 лакаматываў і 53 вагоны, узарваў два масты. Актыўны ўдзел у дыверсійных аперацыях прымалі Пётр Камбулаў, Міхаіл Рабкоў, Максім Міхальчук, Іван Галатка, Іван Чаркас, Іван Арлоў, Мікалай Татараў, Уладзімір Смаль, Уладзімір Макавецкі, Карп Гаршчарык, Іван Гапанюк, Іван Бугакаў, Дзям'ян Мінчанка, Рыгор Цілітка. Атрад Каліева спачатку не меў сувязі са штабам Брэсцкага партызанскага злучэння і дзейнічаў самастойна. У пачатку красавіка на сувязь са штабам была паслана падпольшчыца В.С.Козел (Селівонік), якая з-за карных аперацый дабралася туды толькі ў пачатку мая. Перадала планы агнявых кропак праціўніка ў Брэсце. Яны аказаліся патрэбнымі камандаванню наступаючай Чырвонай Арміі.

Знаходзячыся ў савецкім тыле, партызанскі атрад імя М.М.Чарнака быў перафарміраваны і 15 мая 1944 г. зноў накіраваны на акупіраваную тэрыторыю. Лінію фронту партызаны перайшлі ў ноч з 17 на 18 мая, а праз некалькі дзён былі ў знаёмых мясцінах.

31 мая 1944 г. атрад М.І.Каліева ўліўся ў атрад імя М.М.Чарнака. І.В.Салейка зноў узначаліў антыфашысцкі камітэт, на гэты раз — міжраённы. У зоне дзеяння атрада ў вёсках Жабінкаўскага раёна налічвалася ў падпольных групах 30 чалавек, а ў Брэсцкім — больш за 100. Патрыёты дзейнічалі актыўна. Толькі за чэрвень — ліпень 1944 г. спалілі масты на дарогах паміж вёскамі Красны Двор, Ваўкі і Вулька — Забалацце, узарвалі тры варожыя машыны. У нямецкай сталовай у Паўночным ваенным гарадку Мікалай Андрэевіч Шапавалаў паставіў міну, якая ўзарвалася ў час вячэры нямецкіх салдат. Напярэдадні вызвалення было праведзена многа іншых дыверсій у горадзе і на чыгункі.

МОЛАДЗЬ У БАРАЦЬБЕ З АКУПАНТАМІ

З самага пачатку вайны ў барацьбу з ворагам уступілі камсамольцы і моладзь раёна. Савелій Раманюк вучыўся ў Брэсцкім чыгуначным тэхнікуме, а яго старэйшы брат Мікалай працаваў шафёрам у МТС. Калі прыйшлі немцы, хлопцы ўкрыліся на х. Крушыны. Хтось падказаў Раманюкам, што хутка маладых людзей пачнуць забіраць у Германію. Каб пазбегнуць «вярбоўкі», браты ўладкаваліся на працу ў аўтарамонтныя майстэрні. Да Раманюкоў прыгледзеліся падпольшчыкі і прапанавалі ім стварыць у в. Вычулкі маладзёжную падпольную групу.

Хутка такая група была створана. У яе ўвайшлі Мікалай Іванавіч Собаль, Мікалай Іванавіч Васілюк, Міхаіл Іванавіч Качурка, Максім Палюшык, Міхаіл Канстанцінавіч Сцепанюк.

У другой палове 1942 г. былі арганізаваны падпольныя маладзёжныя групы ў вёсках Трышын, Бярозаўка, Рэчыца, Казловічы. У іх дзейнічала больш за 30 патрыётаў.

Камсамольцы на месцах былых баёў збіралі зброю, распаўсюджвалі лістоўкі. Многія працавалі ў аўтарамонтных майстэрнях і шкодзілі немцам. Пры зборцы адрамантаваных рысор упоперак лістоў клалі швейныя іголкі пэўнай таўшчыні. Пры яздзе па калдобінах пад цяжарам рысоры лопаліся, іх зноў трэба было замяняць.

Вясной 1943 г. у вёсцы Крушына раённы антыфашысцкі камітэт правёў першы семінар-нараду з групай моладзі, дзе вучыліся, як праводзіць

палітінфармацыю для насельніцтва, падрыхтаваць і правесці дыверсію.

Камсамольска-маладзёжная група Савелія Раманюка ў ліпені 1943 г. спаліла 20-метровы мост каля в. Трышын. Савелій Раманюк, М.І.Раманюк, А.В.Катовіч і М.І.Собаль ноччу аблілі бензінам драўляны насціл і бэлькі моста, раскідалі патроны, паклалі гранату і артылерыйскі снарад з тым разлікам, што немцы не захочуць тушыць агонь, калі пачнуцца выбухі. Усё так і атрымалася.

Немцы прымушалі сялян здаваць малако на гарадскі маслазавод. Па вёсках былі ўстаноўлены чэргі яго дастаўкі. І калі падышла чарга везці малако Раманюкам, на прыёмным пункце ў Вычулках браты Мікалай і Савелій паставілі на воз вялікую бочку, напоўнілі яе сабраным малаком і павезлі ў горад. Там упрасілі немцаў даць ім бочку адгону для парсючкоў. З завода хлопцы паехалі на Рэчыцу да сувязнога Уладзіміра Міронавіча Мацкевіча. Той іх ужо чакаў. Перадаў для партызан два пісталеты «ТТ», наган, аўтамат, некалькі гранат і сумку патронаў. Усё гэта браты паклалі на дно бочкі з адгонам.

Дамоў Раманюкі вярталіся праз увесь горад. На выездзе з Брэста іх спыніў патруль. Немцы сагналі хлопцаў з воза, абмацалі іх з ног да галавы, пакорпаліся ў возе, заглянулі нават у бочку. Але нічога падазронага не заўважылі. Дома браты дасталі з бочкі зброю і перадалі па прызначэнні. Гэтым спосабам Раманюкі карысталіся неаднойчы. З рызыкай для жыцця дзейнічаў Тарас Еўдакімавіч Шпільчук з х. Бярозаўка, што быў непадалёку ад дэпо і чыгуначнай станцыі Брэст-Усходні. На хутары было ўсяго чатыры хаты, месца было ціхае. Калі-нікалі сюды прыходзілі сувязныя, ваеннапалонныя, якіх удавалася вызваліць з Рэчыцкага канцлагера, тут хавалі зброю, што здабывалі падпольшчыкі.

Камсамольскую падпольную групу з пяці чалавек у в. Новыя Задворцы ўзначальваў Барыс Мікітавіч Сокал. Яго бацька быў расстраляны немцамі ў Брэсце ў пачатку вайны за тое, што прынёс збан малака яўрэйскай сям'і. У пачатку 1942 г. памерла маці, і Барыс стаў за бацьку і за маці сваім малодшым братам і сёстрам.

У групе актыўна працавала Вольга Рыгораўна Паміская (жонка лейтэнанта Чырвонай Арміі). Яна жыла ў сям'і Сокалаў. У вёсцы ніхто на яе не данёс фашыстам.

Восенню 1943 г. немцы падпільнавалі Барыса і Вольгу, аднак жанчына здолела праз падворкі выйсці на ўскраіну вёскі, а Барыс на кані ўцёк у Чэрні. Немцы спалілі хату. Трое малодшых дзетак Сокалаў у гэты момант знаходзіліся ў дзядзькі Еўдакіма Сокала і таму цудам засталіся ў жывых. Барыс Сокал і Вольга Паміская пайшлі да партызан.

Адным з найбольш актыўных членаў Брэсцкай раённай падпольнай арганізацыі ЛКСМБ быў Мяфодзій Гуцік з в. Селяхі. Перад вайной ён вучыўся ў дарожна-механічным вучылішчы. Да антыфашысцкай дзейнасці Мяфодзія прыцягнулі яго бацька, Васіль Якаўлевіч, былы член КПЗБ, дэпутат Чэрнінскага сельсавета, і дваюрадныя браты бацькі Ігнат і Радзівон Антанюкі. У гэтую групу ўваходзілі Аляксандр Васільевіч і Мікалай Паўлавіч Гуцікі. Хлопцы сабралі многа зброі ў былых фартах. Перад наступленнем Чырвонай Арміі на Брэст камсамольцы склалі і перадалі партызанам падрабязную схему абароны горада.

Актыўна працавалі браты Аляксей і Рыгор Мельнічукі. На тэрыторыі Радваніцкага сельсавета яны сабралі шмат вінтовак і ўзрыўчаткі. Усю зброю перадалі партызанам праз жыхара в. Міхалін Карпа Іванавіча Гаршчарыка.

Па шашы Брэст—Масква заўсёды назіраўся інтэнсіўны рух варожага транспарту. Аднак з 1943 г. немцы ноччу ўжо баяліся ездзіць, каб не нарвац-

ца на засаду партызан. Партызаны пачалі мініраваць дарогу. Самі рабілі ўзрыўныя ўстройствы пад кіраўніцтвам В.А.Несцярэнкі і Н.Я.Шчарбакова. Выкалупвалі са снарадаў тол, плавілі яго, разлівалі ў драўляныя формы і атрымлівалі самаробныя міны, якія звычайна важылі па 6—10 кілаграмаў. Імі можна было ўзарваць і мост, і тэхніку. Такімі самаробнымі прыстасаваннямі падпольшчыкі з в. Вычулкі і х. Крушыны за лета 1943 г. знішчылі 2 бронетранспарцёры і 8 грузавікоў.

Многа маладых патрыётаў загінула ў барацьбе з ворагам. У верасні 1943 г. камсамолец з в. Вычулкі Аляксандр Васільевіч Катовіч удала правёў ад в. Ямна двух патрыётаў, якім у Брэсце пагражала небяспека. Але калі вяртаўся ў вёску, каб вывесці яшчэ двух падпольшчыкаў, быў затрыманы паліцаямі. Хлопца доўга білі, але ён не прызнаўся, куды і з кім хадзіў. А.В.Катовіча завезлі ў брэсцкую турму, дзе пасля катаванняў праз два тыдні расстралялі.

У канцы 1943 г. навісла пагроза над братамі Савеліем і Мікалаем Раманюкамі. Яны паспелі ўцячы да партызан атрада імя М.М.Чарнака, дзе былі кулямётчыкамі.

Значны ўклад у антыфашысцкі рух зрабіла камсамольская ячэйка в. Бярнады. Сцяпан, Макар, Рыгор, Мікалай Смалі і Мікалай Саўчук перадалі ў атрад некалькі кулямётаў, вінтовак, многа патронаў. Актыўным падпольшчыкам быў камсамолец Уладзімір Скавародка. Да вайны ён быў камсоргам у роднай в. Чылеева.

Разам з акупантамі ў вёску вярнуліся памешчыкі, і сялянам прыйшлося зноў працаваць на іх. Але думка аб барацьбе з ворагам не пакідала юнака. На спаленай пагранічнай заставе ён падабраў два пісталеты і вінтоўку. Восенню 1941 г. у лясным гушчары адбыўся падпольны сход камсамольцаў вёсак Чылеева і Шчытнікі. Рашэнне было кароткае — весці барацьбу з акупантамі.

Камсамольцы в. Шчытнікі вырашылі забіць каменданта паліцыі. Гэтую прапанову ўнёс Пашкоўскі.

Здавалася, што ўсё было падрыхтавана да аперацыі. Але ў апошні момант паліцыі нешта стала вядома, і яна ў адзін дзень арыштавала шасцярых камсамольцаў. У Пашкоўскага пры вобыску знайшлі пісталет. Гэтага было дастаткова, каб расстраляць усіх затрыманых.

Аб правале групы ў в. Шчытнікі Уладзімір Скавародка не ведаў і пайшоў туды на сустрэчу. У в. Ракавіца сяляне папярэдзілі юнака аб небяспецы. Уладзімір схаваўся ў знаёмых.

Паліцаі знайшлі яго. Разам са Скавародкам быў арыштаваны Аляксандр Баніфатавіч Якаўчук.

На двух фурманках іх павезлі ў гестапа. Валодзю ахоўвалі паляк Чубатараў. Па дарозе арыштаваны і вартаўнік мірна размаўлялі. Праехалі Скокі і Кацінбор, да Брэста зусім блізка. Каля в. Дуброўка Уладзімір саскочыў з воза і ўцёк у хмызняк. Па ім стралялі, але не папалі. Уладзімір прабраўся на Граеўку, потым — у в. Падлессе, дзе яму дапамаглі сустрэцца з партызанамі.

У жніўні 1943 г. быў створаны падпольны райком ЛКСМБ. Яго работу ўзначаліла намеснік камісара партызанскага атрада імя М.М.Чарнака Фаіна Георгіеўна Тронкіна. Пярвічныя камсамольскія арганізацыі ў той час дзейнічалі ў вёсках Камяніца-Жыровецкая, Кунахі, Закій, Семісосны, Ваўкі, Залессе, Збірагі, Матыкалы, Гутавічы, Вялюнь, Івахнавічы, Ямна, Забалацце.

На рахунку маладых патрыётаў было многа карысных спраў. Як сведчаць дакументы, са жніўня 1943 г. па красавік 1944 г. у 15 вёсках раёна ў падполлі дзейнічалі 65 камсамольцаў. Толькі 12 чалавек з іх уступілі ў камсамол да вайны, астатнія ў партызанах. Аўтарытэт і папулярнасць камсамола сярод моладзі былі вялікія.

У барацьбе з ворагам загінула многа маладых патрыётаў. У пачатку 1944

г. у брэсцкай турме быў расстраляны Пётр Іосіфавіч Бабіч з в. Вялюнь, сувязны партызанскага атрада. З 292 падпольшчыкаў загінулі 70 чалавек. Яны былі расстраляны, закатаваны, павешаны гітлераўцамі. 16 патрыётаў загінулі, змагаючыся ў радах партызан, 8 — на франтах вайны.

А.А.Грабёнкіна.

Крыніцы:

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 481, 483; Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 302, 305, 320; Воп. 5. Спр. 406; Воп. 7. Спр. 422; Воп. 21. Спр. 108; Ф. 3660. Воп. 1. Спр. 1, 22; Ф. 3662. Воп. 1. Спр. 7, 10; Ф. 3705. Воп. 1. Спр. 19, 4, 29; Ф. 4290. Воп. 2. Спр. 21, 70.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 69. Воп. 1. Спр. 851.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 1. Воп. 7. Спр. 125; Воп. 1. Спр. 19; Воп. 28. Спр. 91; Ф. 500. Воп. 1. Спр. 29, 40, 99, 101; Воп. 3. Спр. 1, 39; Воп. 28. Спр. 91; Ф. 514. Воп. 1. Спр. 337.

Фонды Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея. Спр. 83, 84, 88, 6661.

Архіў А.А.Грабёнкінай.

Архіў В.П.Ласковіча.

Удзельнікі антыфашысцкага падполля Брэсцкага раёна

РАШЭННЕ БРЭСЦКАГА РАЙВЫКАНКОМА АБ ЗАЦВЯРДЖЭННІ СПІСА ЧЛЕНАЎ АНТЫФАШЫСЦКАГА ПАДПОЛЛЯ БРЭСЦКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ (1941—1944 гг.)

14 кастрычніка 1996 г.

Заслушав информацию по данному вопросу председателя комиссии по подготовке и написанию книги «Память» Грицко Л.К., исполком отмечает, что решением Брестского райисполкома от 30.06.1944 г. № 291 установлен факт действия антифашистского подполья на территории района в годы Великой Отечественной войны с июня 1941 года по июль 1944 г. Список членов антифашистского подполья не утверждался, так как проходил дополнительную проверку по архивам. С 3 июля 1996 г. районная газета «Заря над Бугом» начала публикацию перепроверенного списка и завершила его 17 июля 1996 г. Данный список прошел еще раз публичную проверку и таким образом стал основным документальным дополнением к установленному факту действия антифашистского подполья на территории Брестского района в годы Великой Отечественной войны.

Учитывая, что за прошедшее после опубликования списков время официальных опровержений не поступало, районный исполнительный комитет РЕШИЛ:

Утвердить список членов антифашистского подполья, действовавшего на территории района в 1941 — 1944 гг.

Председатель райисполкома К.Н.Бобко.
Управделами райисполкома П.А.Брюзгин.

АБРАМУК, удзельнік падполля ў в. Вялюнь.

АНДРАСЮК Міхаіл Усцінавіч, кіраўнік падполля ў в. Падлессе, расстраляны ў 1942.

АНТАНЮК Вольга Рыгораўна, в. Чэрні, член падпольнай групы ў в. Падлессе.

АНТАНЮК Ганна Тарасаўна, удзельніца падполля ў Чэрні, з мая 1942 партызанка.

АНТАНЮК Ігнат Рыгоравіч, в. Чэрні, адзін з арганізатараў падполля і партызанскага руху ў раёне, з мая 1942 партызан.

АНТАНЮК Лідзія, гаспадыня явачнай кватэры на х. Чэрні, з мая 1942 партызанка.

АНТАНЮК Міхаіл, в. Чэрні, сувязны.

АНТАНЮК Радзівон Рыгоравіч, в. Чэрні, адзін з арганізатараў падполля і партызанскага руху ў раёне, з мая 1942 партызан.

АСТАПУК Фёдар Сямёнавіч, в. Булькава.

АХРЫМУК Аляксей Мікалаевіч, в. Ракітніца.

АХРЫМУК Павел Фёдаравіч, х. Чэрні.

АХРЫМУК Павел Лаўрэнцьевіч, в. Пугачова.

АХРЫМУК Паліна, в. Пугачова.

БАБІЧ Пётр Іосіфавіч, в. Вілюнь, сувязны, расстраляны ў пачатку 1944.

БАРШЧЭЎСКІ Мікалай Раманавіч, удзельнік падполля ў в. Трышын.

БАХМАТ Іван Захаравіч, б. член КПЗБ, сувязны, расстраляны ў снежні 1943 у брэсцкай турме.

БАХМАТ Марыя, сувязная, расстраляна ў снежні 1943 у брэсцкай турме.

БОБІЧ Сяргей Іванавіч, сувязны.

БОГДАН Міхаіл, удзельнік падполля ў в. Бердычы.

БУДЗЬКО Сяргей Кліменцьевіч, кіраўнік камсамольскага падполля ў в. Трышын.

БУРЧЫК Міхаіл Захаравіч, кіраўнік падполля ў в. Шэбрын.

ВАСІЛЮК, в. Франопаль, сувязны, расстраляны разам з сям'ёй.

ВАСІЛЮК Гаўрыла Мікалаевіч, удзельнік падполля ў в. Камяніца-Жыровецкая, партызан.

ВАСІЛЮК Іван Якаўлевіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Камяніца-Жыровецкая, партызан.

ВАСІЛЮК Карп Уласавіч, удзельнік падполля ў в. Камяніца-Жыровецкая, партызан.

ВАСІЛЮК Кузьма Іосіфавіч, в. Камяніца-Жыровецкая, партызан.

ВАСІЛЮК Мікалай Іванавіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Вычулкі.

ВАСІЛЮК Пётр Раманавіч, в. Камяніца-Жыровецкая, загінуў 5.11.1943.

ВАСІЛЮК Уладзімір Васільевіч, удзельнік падполля ў в. Камяніца-Жыровецкая, партызан атрада імя М.В.Фрунзе.

ВАСІЛЮК Уладзімір Восіпавіч, кіраўнік падполля ў в. Камяніца-Жыровецкая.

ВОЛЧЫК Іван Рыгоравіч, удзельнік падполля ў в. Знаменка, партызан.

ВОЛЬСКАЯ Арына, удзельніца падполля ў в. Закій.

ВОЛЬСКІ Андрэй Ануфрыевіч, удзельнік падполля ў в. Закій.

ВОЛЬСКІ Фама Ігнатавіч, кіраўнік падполля ў в. Закій, член раённага камітэта.

ГАЛАЎЧЫНЕР Аляксандр Рыгоравіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Трышын.

ГАЛОДКА, ляснічы, расстраляны разам з сям'ёй у 1943.

ГАМОКА Феня Сідараўна, удзельніца камсамольскага падполля ў в. Камяніца-Жыровецкая.

ГРЫЦУК Дзям'ян, кіраўнік камсамольскага падполля ў в. Селяхі, загінуў на фронце.

ГРЫЦУК Мікалай, удзельнік падполля ў в. Забалацце.

ГУЛЬ Андрэй Рыгоравіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны ў 1942.

ГУЛЬ Настасся Рыгораўна, удзельніца падполля ў в. Шэбрын, расстраляна ў 1942.

ГУЛЬ Павел, кіраўнік падполля ў в. Задзерць.

ГУЛЬ Сцяпан Андрэевіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны ў 1942.

ГУЦІК Аляксандр Васільевіч, удзельнік падполля ў в. Селяхі і раёне.

ГУЦІК Васіль, удзельнік падполля ў в. Селяхі, партызан.

ГУЦІК Васіль Якаўлевіч, былы член КПЗБ, адзін з арганізатараў падполля.

ГУЦІК Марыя Давыдаўна, удзельніца падполля ў в. Селяхі.

ГУЦІК Мікалай Паўлавіч, удзельнік падполля ў в. Чэрні.

ГУЦІК Міхаіл Васільевіч, удзельнік падполля ў в. Селяхі і раёне.

ГУЦІК Мяфодзій Васільевіч, удзельнік падполля ў в. Селяхі, партызан.

ДЗЕНІСЮК Мікалай Цярэнцьевіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Трышын.

ДЗЕНІСЮК Павел Цярэнцьевіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Трышын, партызан.

ДЗЯМЧУК Іван Андрэевіч, удзельнік падполля ў в. Ваўкі, з сакавіка 1944 партызан.

ДУКШЭЙ, удзельнік падполля ў в. Франопаль (маці М.І.Дукшэя).

ДУКШЭЙ Мікалай Іванавіч, удзельнік падполля ў в. Франопаль.

ДУКШЭЙ Сцяпан Іванавіч, удзельнік падполля ў в. Вялікія Радванічы, сувязны, партызан.

ЖАЛЯЗОЎСКІ Уладзімір Іосіфавіч, удзельнік падполля ў раёне, партызан.

ЖМЕНЬКА Еўдакія, удзельніца падполля ў в. Вулька Застаўская, сувязная.

ЖМЕНЬКА Канстанцін, удзельнік падполля ў в. Пугачова, сувязны, расстраляны фашыстамі ў лютым 1942.

ЖМЕНЬКА (жонка Жменькі Канстанціна), удзельніца падполля ў в. Пугачова, сувязная, расстраляна фашыстамі ў лютым 1942.

ЖМЕНЬКА Мікіта, удзельнік падполля ў в. Пугачова, сувязны, расстраляны фашыстамі.

ЖМЕНЬКА Уладзімір, удзельнік падполля ў в. Пугачова, сувязны.

ЖМІНЬКО Цімафей Піліпавіч, кіраўнік падполля ў в. Забалацце.

ЖУКОЎСКІ Юльян Іосіфавіч, удзельнік падполля ў в. Кацельня Падгародская, сувязны.

ЖЫГАР Апанас, кіраўнік па сувязі падполля з Брэстам.

ЗАСІМ Мікалай Арцёмавіч, адзін з кіраўнікоў падполля і партызанскага руху на Брэстчыне.

ЗАХАРЧУК Афанасій Хатаевіч, гаспадар явачнай кватэры ў в. Вулька Падгародская.

ЗАХАРЧУК Марыя Іванаўна, сувязная.

ІВАШКА Аляксей Фёдаравіч, в. Рудка (Жабінка), сувязны Брэсцкага падполля.

КАВАЛЬЧУК Ганна, удзельніца падполля ў в. Пугачова, сувязная, павешана фашыстамі вясной 1943 каля свайго дома.

КАВАЛЬЧУК Кузьма Ільіч, удзельнік падполля ў в. Франопаль.

КАВАЛЬЧУК Ціхан Фёдаравіч, сувязны, з красавіка 1943 партызан.

КАЗЛОВА Вера, удзельніца падполля ў в. Астрамечава.

КАНДРАЦЮК Марыя, удзельніца падполля ў в. Астрамечава.

КАПЛЕВІЧ Іван Андрэевіч, удзельнік падполля ў в. Очкі.

КАРОЛЬ Мікалай Міронавіч, кіраўнік падполля ў в. Франопаль.

КАТОВІЧ Аляксандр Васільевіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Вычулкі, расстраляны фашыстамі ў верасні 1943.

КАТОВІЧ Яўген Мікалаевіч, в. Крушына, удзельнік камсамольскага падполля.

КАХМАНЮК Аляксандр Пятровіч, удзельнік падполля ў в. Ямна.

КАЧАНОЎСКІ Ігнат Васільевіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, загінуў на фронце.

КАЧУРКА Міхаіл Іванавіч, кіраўнік камсамольскага падполля ў в. Вычулкі.

КІКЛЕВІЧ Іван Іванавіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Трышын.

КІРЭЙЦАЎ Іван Рыгоравіч, удзельнік падполля ў в. Селяхі, партызан, загінуў у час блакады.

КІЯНЕЦ Іван, удзельнік падполля ў в. Селяхі, расстраляны фашыстамі ў кастрычніку 1942.

КНЯЗЮК Уладзімір Іванавіч, кіраўнік падполля ў в. Кошалева.

КОЗЕЛ Іван Іванавіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Селяхі.

КОЗЕЛ Павел Сідаравіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Трышын.

КУБАЙ Уладзімір Пятровіч, удзельнік падпольнай групы ў в. Ямна.

КУПАЕЎ Іван, удзельнік падполля.

КУПРЫЯНЮК Аксіння Елісееўна, удзельніца падполля ў в. Шэбрын, расстраляна фашыстамі ў 1942.

КУПРЫЯНЮК Аляксей Сямёнавіч, былы член КПЗБ, адзін з кіраўнікоў падполля і партызанскай барацьбы ў раёне, загінуў 26 чэрвеня 1942.

КУПРЫЯНЮК Мікалай Елісеевіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны фашыстамі ў 1942.

КУПРЫЯНЮК Сямён Елісеевіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны фашыстамі ў 1942.

КУЦ Міхаіл Паўлавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, сувязны.

КУЦ Юстын Паўлавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, з чэрвеня 1943 член раённага антыфашысцкага камітэта.

ЛАГУЦІК Іван, удзельнік падполля ў в. Міхалін, партызан.

ЛАСКОВІЧ Ануфрый Іванавіч, былы член КПЗБ, удзельнік падполля ў в. Франопаль, партызан.

ЛАСКОВІЧ Веліяс Іванавіч, былы член КПЗБ, удзельнік падполля ў в. Франопаль.

ЛАСКОВІЧ Ілья Іванавіч, в. Франопаль, сувязны, партызан, загінуў ў 1943.

ЛЕНСКІ Станіслаў Іванавіч, удзельнік польскага супраціўлення (Арміі Краёвай), сувязны з партызанскімі атрадамі раёна, расстраляны ў брэсцкай турме ў 1943.

ЛОБІК Васіль Захаравіч, былы член КПЗБ, удзельнік падполля ў в. Франопаль, расстраляны фашыстамі восенню 1942.

ЛОБІК Мікалай Васільевіч, удзельнік падполля ў в. Франопаль, партызан, загінуў 21 студзеня 1944 у в. Антонава.

ЛОЙКА Кузьма, былы член КПЗБ, кіраўнік падполля ў в. Пажэжын.

ЛЫСЮК Васіль Цімафеевіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, загінуў на фронце.

ЛЫСЮК (Скавародка) Любоў Паўлаўна, удзельніца падполля ў в. Ямна, партызанка.

ЛЫСЮК Марыя (маці Ф.І.Лысюка), удзельніца падполля ў в. Ямна.

ЛЫСЮК Фёдар Іванавіч, былы член КПЗБ, намеснік сакратара раённага антыфашысцкага камітэта, расстраляны фашыстамі 10 сакавіка 1944.

ЛЫСЮК Цімафей Іванавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, расстраляны фашыстамі ў сакавіку 1944.

ЛЯЎЧУК Вольга, удзельніца падполля ў в. Шэбрын, сувязная.

ЛЯЎЧУК Дар'я Максімаўна, удзельніца падполля ў в. Шэбрын, расстраляна фашыстамі ў 1942.

ЛЯЎЧУК Іван, в. Франопаль, сувязны.

ЛЯЎЧУК Мікалай Аксенцьевіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны фашыстамі ў 1942.

МАЛЫХА Карп Іванавіч, кіраўнік падполля ў в. Бердычы, партызан, загінуў на фронце ў 1944.

МАРТЫНЕНКА Мікалай Васільевіч, уцёк з фашысцкага палону, удзельнік падполля ў раёне, партызан атрада імя М.М.Чарнака.

МАРТЫСЮК Аляксандр Міхайлавіч, кіраўнік падполля ў в. Хабы.

МАРТЫСЮК Андрэй Антонавіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны фашыстамі ў 1942.

МАРТЫСЮК Мікалай Андрэевіч, былы член КПЗБ, партызан атрада імя М.Ф.Фрунзе.

МАРТЫСЮК Міхаіл Лукіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны фашыстамі ў 1942.

МАЦКЕВІЧ Ілья Міронавіч, удзельнік падполля ў в. Рэчыца, расстраляны фашыстамі ў 1944.

МАЦКЕВІЧ Любоў Міронаўна, удзельніца падполля ў в. Рэчыца, расстраляна фашыстамі ў 1944.

МАЦКЕВІЧ Мікалай Міронавіч, удзельнік падполля ў в. Рэчыца, расстраляны ў 1944.

МАЦКЕВІЧ Мірон, кіраўнік падполля ў в. Рэчыца, расстраляны фашыстамі ў 1944.

МАЦКЕВІЧ Уладзімір Міронавіч, удзельнік падполля ў в. Рэчыца.

МЕЛЬНІЧУК Акім Міхайлавіч, в. Міхалін, удзельнік раённай падпольнай групы разведкі пад кіраўніцтвам С.М.Мельнічука з 1942.

МЕЛЬНІЧУК Аляксей Цімафеевіч, удзельнік раённай падпольнай групы разведкі пад кіраўніцтвам С.М.Мельнічука.

МЕЛЬНІЧУК Рыгор Мікітавіч, былы член КПЗБ, удзельнік раённай падпольнай групы разведкі пад кіраўніцтвам С.М.Мельнічука.

МЕЛЬНІЧУК Сямён Міхайлавіч, кіраўнік раённай падпольнай групы разведкі.

МЕЛЯНЧУК Аляксандр Іванавіч, удзельнік падполля ў в. Міхалін, партызан.

МЕЛЯНЧУК Аляксей Емяльянавіч, удзельнік падполля ў в. Міхалін, з мая 1943 партызан атрада імя М.В.Фрунзе.

МІЛЕЎСКІ Іван Сцяпанавіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Трышын.

МІЛЯНЧУК Максім, в. Красны Двор, сувязны.

МІЛЯНЧУК Фёдар, в. Красны Двор, сувязны.

МІРОЧНІК Мікалай Андрэевіч, кіраўнік падполля ў в. Падбулькава.

МУРАШКА Любоў Кірылаўна, удзельніца раённай падпольнай групы разведкі пад кіраўніцтвам С.М.Мельнічука.

МУШНІЦКІ Канстанцін Іванавіч, в. Рэчыца, сувязны.

НАЗАРУК Георгій Іванавіч, удзельнік падполля ў в. Рэчыца.

НАЗАРУК Іван Кірылавіч, удзельнік падполля ў в. Рэчыца.

НАРЫШКІНА (Сокал) Вольга Рыгораўна, удзельніца падполля ў в. Задворцы, з лютага 1943 партызанка.

НОВІК Уладзімір Антонавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, расстраляны фашыстамі.

НОСІК Лявонцій, кіраўнік падполля ў в. Ваўкі, расстраляны фашыстамі ў сакавіку 1943.

НОСІК Марфа Іосіфаўна, удзельніца падполля ў в. Шэбрын, расстраляна фашыстамі ў 1942.

НОСІК Мікалай Антонавіч, удзельнік падполля ў в. Ваўкі, расстраляны фашыстамі восенню 1941.

НОСІК Пётр Васільевіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны фашыстамі ў 1942.

НІЧЫПУРУК Мікалай Пятровіч, удзельнік падполля ў в. Ямна.

ПАЛЮШЫК Максім, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Вычулкі.

ПАНАСЮК, в. Малая Бярозаўка, сувязны.

ПАНАСЮК Мікалай Якімавіч, удзельнік падполля ў в. Франопаль.

ПАНАСЮК Фёдар, адзін з кіраўнікоў падполля ў в. Вялікія Радванічы, загінуў у партызанах.

ПАРФЯНЮК Андрэй Максімавіч, удзельнік падполля ў в. Новыя Задворцы, у партызанскім атрадзе разам з сям'ёй.

ПАРФЯНЮК Наталля Аляксееўна, удзельніца падполля ў в. Новыя Задворцы.

ПАРХАЦ Міхаіл Пятровіч, удзельнік падполля ў в. Лозы.

ПАСТУШЫК Міхаіл Пятровіч, удзельнік падполля ў в. Падлессе.

ПАШКОЎСКІ («усходнік»), кіраўнік камсамольскага падполля ў в. Шчытнікі, расстраляны з шасцю падпольшчыкамі восенню 1941.

ПІЛІПЮК Аляксей Васільевіч, сувязны атрада імя М.М.Чарнака.

ПЛЕЧКА Аксенцій Барысавіч, былы член КПЗБ, кіраўнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны фашыстамі ў 1942.

ПЛЕЧКА Васіль Антонавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна.

ПЛЕЧКА Дзмітрый Паўлавіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын, расстраляны фашыстамі ў 1942.

ПЛЕЧКА Мікалай Антонавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, загінуў.

ПОЛХ Вольга Іванаўна, удзельніца падполля ў в. Астрамечава.

ПОЛХ Сцяпан Цярэнцьевіч, удзельнік падполля ў в. Астрамечава.

ПРАНІШНІКАЎ Аляксандр Фёдаравіч, удзельнік падполля ў в. Селяхі, партызан.

ПУГАЧ Андрэй Ануфрыевіч, кіраўнік падполля ў в. Тэльмы 1-я, член раённага антыфашысцкага камітэта, з 1942 партызан.

ПУЧЫК Сцяпан Якаўлевіч, удзельнік падполля ў в. Міхалін, партызан атрада імя М.М.Чарнака.

ПЯЧКО Мікалай Рыгоравіч, удзельнік падполля ў в. Лышчыцы.

РАМАНЮК Мікалай Іванавіч (х. Крушына), член дыверсійнай групы камсамольскага падполля.

РАМАНЮК Мікалай Фаміч (х. Крушына), член дыверсійнай групы камсамольскага падполля.

РАМАНЮК Савелій Фаміч (х. Крушына), кіраўнік дыверсійнай групы камсамольскага падполля.

РУДКОЎСКІ, удзельнік польскага супраціўлення (Арміі Краёвай), дапамагаў партызанам, загінуў у турме ў 1943.

РУДСКІ Павел Антонавіч (Сяргей), былы член КПЗБ, член раённага антыфашысцкага камітэта.

РУЦЬКО Пётр Мікалаевіч, былы член КПЗБ, удзельнік падполля ў Паўднёвым гарадку Брэста і в. Пугачова, закатаваны ў гестапа (вывезены ў Германію).

РУЦЬКО Сцяпан Мікалаевіч, былы член КПЗБ, удзельнік падполля ў Паўднёвым гарадку Брэста і в. Пугачова, закатаваны ў гестапа (вывезены ў Германію).

РЫЛЬ, удзельнік падполля ў в. Ямна, сувязны.

САВАНЕЎСКІ, удзельнік падполля ў в. Машчанка.

САВАНЮК Аляксандр Сідаравіч, удзельнік раённага камсамольскага падполля.

САВІЧ Васіль Мікалаевіч, в. Сычава (Жабінка), сувязны.

САВІЧ Іван Мікалаевіч, в. Сычава (Жабінка), сувязны.

САВІЧ Мікалай, в. Сычава (Жабінка), сувязны, расстраляны фашыстамі ў 1943.

САВІЧ Міхаіл Мікалаевіч, в. Сычава (Жабінка), сувязны партызан.

САЛАЎЧУК (ГУЦІК) Надзея Паўлаўна, удзельнік падполля ў в. Селяхі.

САЛЕЙКА Аляксандр Міхайлавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна.

САЛЕЙКА Аляксей Васільевіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, расстраляны фашыстамі.

САЛЕЙКА Іван Васільевіч, былы член КПЗБ, кіраўнік раённага антыфашысцкага камітэта, камандзір узвода атрада імя М.М.Чарнака.

САРОКА Аляксандр, удзельнік падполля ў в. Клейнікі, расстраляны фашыстамі ў 1943.

САСКО Антон Паўлавіч, удзельнік падполля ў в. Забалацце.

САСКО Ганна Рыгораўна, удзельніца падполля ў в. Забалацце.

САЎЧУК Мікалай, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Бярнады.

САЎЧУК Мікалай Дзям'янавіч, кіраўнік падполля ў в. Гершоны, сувязны атрада імя М.В.Фрунзе.

САЎЧУК Мікалай Сцяпанавіч, удзельнік падполля ў в. Новыя Задворцы, сувязны, расстраляны фашыстамі летам 1944.

САЎЧУК Міхаіл Аляксеевіч, удзельнік падполля ў в. Шэбрын.

САЎЧУК Міхаіл Дзям'янавіч, кіраўнік камсамольскага падполля ў в. Беразоўка, сувязны партызанскага атрада імя В.П.Чкалава.

САЎЧУК Уладзімір, удзельнік падполля ў в. Новыя Задворцы, сувязны.

САХАРЧУК Іван Паўлавіч, удзельнік падполля ў в. Падлессе.

САЧУК Фёдар, удзельнік падполля ў в. Сцебрава (Жабінка).

СВЯДЗІНСКІ Мікалай, удзельнік падполля ў в. Пажэжын.

СЕГЯНЮК Іван Рыгоравіч, член раённага антыфашысцкага камітэта, з сакавіка 1944 партызан.

СЕЛІВОНІК Аляксандр Пятровіч, кіраўнік падполля ў в. Хермы, расстраляны фашыстамі ў 1942.

СЕЛІВОНІК Аляксандр Фёдаравіч, былы член КПЗБ, кіраўнік падполля ў в. Франопаль, расстраляны фашыстамі ў 1943.

СЕЛІВОНІК Антон, удзельнік падполля ў в. Тэльмы, расстраляны фашыстамі ў 1943.

СЕЛІВОНІК Ганна, удзельніца падполля ў в. Тэльмы.

СЕЛІВОНІК Іван Фёдаравіч, былы член КПЗБ, адзін з кіраўнікоў падполля і партызанскага руху ў раёне, партызан атрада імя М.М.Чарнака.

СІГНЮК Рыгор, удзельнік раённай падпольнай арганізацыі.

СІДАРУК Іван Паўлавіч, в. Казловічы, сувязны.

СКАВАРОДКА Раман Ерамеевіч, удзельнік грамадзянскай вайны, падполля ў в. Забалацце, разведчык атрада імя М.М.Чарнака.

СКАВАРОДКА Уладзімір Аляксандравіч, удзельнік падполля ў в. Чылеева, партызан.

СЛАДЗІНСКІ Барыс Аляксеевіч, падпольшчык.

СЛАДЗІНСКІ Алег Аляксеевіч, удзельнік падполля, загінуў у час дыверсіі.

СЛАДЗІНСКІ Аляксей Іванавіч, кіраўнік падполля ў в. Шпановічы, з лістапада 1943 партызан.

СЛАДЗІНСКІ Анатоль Аляксеевіч, удзельнік падполля, загінуў у час дыверсіі.

СЛАДЗІНСКІ Усевалад Аляксеевіч, удзельнік падполля, загінуў у час дыверсіі.

СЛЯДЗІНСКАЯ Вера Захараўна, удзельніца падполля ў в. Пугачова, з красавіка 1944 партызанка.

СЛЯДЗІНСКІ Рыгор Міхайлавіч, былы член КПЗБ, удзельнік падполля, з кастрычніка 1941 партызан.

СМАЛЬ Макар, кіраўнік падполля ў в. Гершоны.

СМАЛЬ Мікалай, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Бярнады.

СМАЛЬ Рыгор, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Бярнады.

СМАЛЬ Сцяпан Мацвеевіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Бярнады.

СОБАЛЬ Мікалай Іванавіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Вычулкі, партызан атрада імя М.В.Фрунзе.

СОБАЛЬ Фёдар Лук'янавіч, сувязны, партызан атрада імя М.В.Фрунзе, загінуў 25 сакавіка 1944.

СОКАЛ Барыс Мікітавіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Задворцы, партызан.

СТАЛЬМАШУК Уладзімір Іванавіч (Соха Максім Іванавіч), кіраўнік камсамольскага падполля в. Забалацце, з красавіка 1943 партызан.

СТАРАСЕЛЕЦ Іван Арсенцьевіч, кіраўнік падполля ў в. Забалацце.

СТАРАСЕЛЕЦ Фядора Рыгораўна, удзельніца падполля ў в. Забалацце.

СУГАКА Зінаіда, удзельніца падполля ў в. Пугачова, расстраляна фашыстамі.

СУГАКА Мікалай, удзельнік падполля ў в. Пугачова, сувязны, расстраляны фашыстамі.

СЦЕПАНЮК Міхаіл Канстанцінавіч, удзельнік камсамольскага падполля ў вёсках Вычулкі і Крушына.

СЫЧУК Аляксандр Карнеевіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, расстраляны фашыстамі ў сакавіку 1944.

СЫЧУК Віктар Піліпавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна.

СЫЧУК Павел Карнілавіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, сувязны, расстраляны фашыстамі ў сакавіку 1944.

СЫЧУК Уладзімір Аляксандравіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, расстраляны фашыстамі ў сакавіку 1944.

ТАКУН Фёдар Тарасавіч, удзельнік падполля ў в. Машчанка.

ТРАФІМУК Іосіф Фёдаравіч, член раённага камітэта, з вясны 1942 сувязны атрадаў імя М.М.Чарнака і М.В.Фрунзе.

ТРАЦЮК Рыгор Андрэевіч, удзельнік падполля ў в. Тэльмы.

ТРЫЧЫК Мікалай Сцяпанавіч, удзельнік падполля ў в. Бердычы.

ФЕДАРУК Пётр Фядосавіч, удзельнік падполля з 1941, з мая 1943 партызан.

ФЕДАРУК Якаў Фядосавіч, удзельнік падполля, з мая 1943 партызан.

ФІЛІМАНЮК Мікалай, удзельнік падполля ў в. Чылеева, усе гады вайны хаваў жонку палітрука з Чылееўскай заставы Марыю Сарокіну.

ФІЛІМАНЮК Таццяна, удзельніца падполля ў в. Чылеева.

ФЯДЗІНІЧ Ганна, в. Задзерць, сувязная.

ФЯДЗІНІЧ Уладзімір, в. Задзерць, сувязны.

ХВАЛЬКО Канстанцін, удзельнік падполля ў в. Задзерць.

ХВЯДЧУК Андрэй, удзельнік падполля ў в. Пугачова, сувязны.

ХОМІЧ Андрэй, сувязны, гаспадар явачнай кватэры на х. Сычава.

ЦІМАСЮК Мікалай Пятровіч, солтыс вёскі, удзельнік падполля ў в. Ямна.

ЦІМАСЮК Пётр Нікіфаравіч, сувязны, загінуў на фронце.

ЦЫБУЛЬСКІ Савелій, удзельнік падполля ў в. Забалацце, гаспадар явачнай кватэры.

ЧАПЫЖЭНКА Іван Рыгоравіч, палкавы камісар 62-га УРа, удзельнік падполля ў в. Радванічы ў верасні — кастрычніку 1941, загінуў у баі пры выхадзе за лінію фронту.

ЧАРНАК Міхаіл Мікітавіч, кіраўнік падпольнага і партызанскага руху ў Брэсцкім і Жабінкаўскім раёнах, загінуў у маі 1943.

ЧЫРНАК Наталля Емяльянаўна, сувязная.

ЧАРНОЎ Міхаіл Панцялеевіч, адзін з арганізатараў падпольнага і партызанскага руху ў раёне.

ЧАРЭЎКА Варвара Іванаўна, удзельніца падполля ў в. Малыя Радванічы.

ЧАРЭЎКА Дзмітрый Макаравіч, былы член КПЗБ, адзін з арганізатараў падполля і партызанскага руху.

ЧАРЭЎКА Трафім Макаравіч, былы член КПЗБ, удзельнік падполля ў в. Малыя Радванічы, сувязны, партызан.

ЧЫРУК Адам Фёдаравіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, расстраляны фашыстамі ў сакавіку 1944.

ЧЫРУК Аляксей Фёдаравіч, удзельнік падполля ў в. Ямна.

ЧЫРУК Мікалай Раманавіч, былы член КПЗБ, удзельнік падполля ў в. Ямна, загінуў на фронце.

ШАБІЛА Юстын, удзельнік падполля ў в. Вялюнь.

ШАПАВАЛАЎ Мікалай Андрэевіч, член Брэсцкага падпольнага РК ЛКСМБ, партызан атрада імя М.М.Чарнака.

ШКОБ Праскоўя, удзельніца падполля ў в. Ямна.

ШПІЛЬЧУК Сямён Кірылавіч, удзельнік падполля ў в. Машчонка.

ШПІЛЬЧУК Тарас Еўдакімавіч, удзельнік камсамольскага падполля ў в. Беразоўка.

ШУТКО Ігнат Аляксеевіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, загінуў у партызанах.

ШУТКО Іван Аляксеевіч, удзельнік падполля ў в. Ямна, загінуў у партызанах.

ШУТКО Міхаіл Аляксеевіч (в. Тэльмы), былы член КПЗБ, сувязны.

ШУТКО Пётр Аляксеевіч, в. Тэльмы, былы член КПЗБ, сувязны.

ШЫБУНЯ Міхаіл, удзельнік падполля ў в. Пугачова, сувязны, расстраляны фашыстамі ў лютым 1942.

ШЫБУНЯ Уладзімір Міхайлавіч, удзельнік падполля ў в. Пугачова, сувязны, партызан, загінуў.

ШЫБУНЯ Уладзімір Панцялеевіч, адзін з кіраўнікоў камсамольскага падполля ў раёне, сувязны, з верасня 1943 партызан.

ЯРАШЭНКА Іван, збег з фашысцкага палону, хаваўся ў Н.С.Гацько ў в. Камяніца-Жыровецкая, удзельнік падполля, сувязны, партызан імя М.М.Чарнака.

ЯРОШЫК Ганна Іванаўна, удзельніца падполля ў в. Плоска, сувязная.

ЯРОШЫК Мікалай Сяргеевіч, удзельнік падполля ў в. Плоска.

ЯРОШЫК Мікіта Сяргеевіч, удзельнік падполля ў в. Плоска, сувязны.

Падрыхтавала А.А.Грабёнкіна.

Партызанскі рух на тэрыторыі Брэсцкага раёна

З першых дзён акупацыі пачалася барацьба супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Брэстчыны, актыўны ўдзел у якой прынялі і жыхары Брэсцкага раёна. Гэтую барацьбу ўзначалілі былыя члены КПЗБ, якія карысталіся старымі сувязямі, ведалі людзей і рыхтавалі іх да барацьбы (Салейка Іван, Лысюк Фёдар, Антанюк Іван, Антанюк Рыгор, Чарнак Міхаіл, Селівонік Іван, Дзмітрук Аляксей і інш.), ваеннаслужачыя, якія па розных прычынах засталіся ў тыле ворага, добра ведалі ваенную справу, маглі аб'яднаць асобныя групы, на падставе якіх былі створаны партызанскія атрады (С.С.Шыканаў, Садыкаў Нурум, Л.П.Зяленін і іншыя), падпольшчыкі Брэста.

Вакол Брэста ўжо ў першыя месяцы вайны ўзніклі малыя ўзброеныя групы воінаў, якія трапілі ў акружэнне. Паступова да іх далучаліся мясцовыя жыхары. Удзельнікі гэтых груп нападалі на нямецкія аўтамашыны, рвалі тэлефонную сувязь, спілоўвалі слупы. Дзейнасць груп была настолькі эфектыўнай, што немцы ўжо ў верасні 1941 г. вымушаны былі правесці аблаву. Мясцовыя жыхары папярэдзілі партызан і аблава не прынесла жаданых вынікаў.

Адначасова ўзнікалі партызанскія групы, створаныя мясцовымі жыхарамі. Адной з першых была група пад кіраўніцтвам старшыні Чэрнінскага сельскага Савета У.Р.Антанюка. Толькі Антанюкоў — братоў і сясцёр разам з дочкамі і сынамі — у гэтай групе было 18 чалавек[1].

Прыкладна ў гэты час у Сямісоснаўскім лесе была створана партызанская група з 20 чалавек. На ўзбраенні гэтай групы было 5 кулямётаў і 20 вінтовак, у асноўным падабраных на месцах былых баёў. Узначаліў яе І.В.Салейка, які незадоўга да вайны быў абраны старшынёй Тэльмінскага сельскага Савета[2].

Разам з узброенымі групамі ўзнікалі і партызанскія атрады. Першы атрад узнік у Старасельскім лесе Жабінкаўскага раёна. Сюды на трэці дзень вайны прыйшоў камандзір кулямётнай роты Сяргей Шыканаў. Па дарозе да яго далучыліся байцы, пагранічнікі. Усяго пад камандаваннем С.Шыканава сабралася каля 250 чалавек. У Старым Сяле ён наладзіў сувязь са старшынёй Савета Міхаілам Чарнаком. Разам з Шыканавым М.Чарнак па сутнасці стаў арганізатарам партызанскага атрада, у які ўступілі і мясцовыя жыхары. Першую дыверсію М.Чарнак правёў 16 верасня 1941 г. У гэты дзень ён разам з мясцовымі жыхарамі па загадзе немцаў павінен быў перавозіць боепрыпасы з палігона на ваенны склад у Брэсце. Аднак 6 станковых кулямётаў, 5 скрынак гранат і 5 скрынак патронаў, дзякуючы кемлівасці і адвазе М.Чарнака, апынуліся не на складзе, а ў Старасельскім лесе. Неўзабаве атраду стала вядома, што ў вёсцы Радванічы ў палоне знаходзіцца савецкі афіцэр, якога выдалі немцам. М.Чарнак разам са сваімі сябрамі М.Алексіевічам і Козічам вырашылі вызваліць яго з палону. З засады напалі на канвой, вызвалілі афіцэра і без страт адышлі ў лес[3].

Аднак трэба адзначыць, што першыя партызанскія атрады і групы не мелі дастатковага вопыту партызанскай барацьбы і моцнай сувязі паміж сабой, вялі баявыя дзеянні паасобку. Не хапала зброі, медыкаментаў, харчавання, адзення. Толькі пачыналі наладжвацца сувязі з мясцовым насельніцтвам, прычым іх прыходзілася ўстанаўліваць у цяжкія гадзіны фашысцкага тэрору. Да таго ж у партызанскія групы і атрады прыходзілі розныя людзі. Адны лічылі, што партызанскія дзеянні не маюць будучыні і што трэба прабівацца на

ўсход, каб злучыцца з Чырвонай Арміяй. Другія, сустрэўшыся з цяжкасцямі лясного жыцця, пакідалі атрады. Трэція, паверыўшы нямецкім лістоўкам, самі з'яўляліся ў паліцыю. Адначасова ў лясах з'яўляліся фальшывыя бандыцкія партызанскія групы, якія рабавалі мясцовае насельніцтва. У некаторых месцах жыхары называлі ўдзельнікаў такіх груп «махноўцамі». Цяжкасці павялічыліся з наступленнем першай ваеннай зімы, да якой атрады і групы былі недастаткова ці зусім не падрыхтаваны. У гэтых складаных умовах атрад С.Шыканава раздзяліўся на групы па 10—12 чалавек у кожнай, якія абсталяваліся ў Шэбрынскім, Сычкаўскім, Казацкім, Халстунаўскім лясах. Частка партызан, надзейна схаваўшы зброю, да вясны падалася ў Брэст, Кобрын і іншыя населеныя пункты.

Магутным штуршком для разгортвання партызанскага руху паслужыла перамога савецкіх войскаў пад Масквой. У прыбужскіх лясах актывізавалі сваю дзейнасць распушчаныя ў канцы 1941 г. партызанскія групы. Вясной 1942 г. яны пачалі аб'ядноўвацца ў атрады. Да атрада С.Шыканава далучылася група Л.Зяленіна — С.Кіцьяна. У сакавіку 1942 г. у атрадзе налічвалася каля 50 партызан. Камандзірам атрада стаў С.С.Шыканаў, камісарам — Л.П.Зяленін. М.М.Чарнак быў прызначаны начальнікам разведкі[4].

Адначасова іншыя партызанскія групы аб'ядналіся ў так званы атрад «палітрукоў», які ўзначаліў І.В.Салейка. Разам з мясцовымі камуністамі касцяк атрада склалі ўцёклыя з нямецкага палону ваеннаслужачыя Павел Астаф'еў, Аляксандр Кузачкін, Анатоль Казлоў, Віктар Піваваравў, Сяргей Чубарсаў, якія ў першую ваенную зіму разышліся па вёсках Лозы і Забалацце. У атрадзе апынуліся два савецкія лётчыкі і паляк Раман Рамкоўскі, якіх прывёў брэсцкі падпольшчык Кандрат Сушкоў[5].

Са зброяй (2 кулямёты, 6 вінтовак) прыйшлі ў атрад і жыхары в. Камяніца-Жыровецкая Уладзімір, Карп і Гаўрыла Васілюкі.

Мікіта і Мікалай Ярошыкі з в. Плоска перадалі ў лес 5 вінтовак, 6 гранат і скрынку аўтаматных патронаў[6].

Перадавалі зброю партызанам Іван Арсенцьевіч і Фядора Рыгораўна Старасельцы, Мікалай Грышчук, Раман Скавародка, Анатоль Пятровіч і Ганна Рыгораўна Саско, Лявонцій Стальмашук (в. Забалацце), Фама Ігнатавіч і Андрэй Андрэевіч Вольскія, Арына Вольская (в. Закій), Сямён Кірылавіч Шпільчук, Мікалай Рыгоравіч Печка, Фёдар Тарасавіч Такун (в. Машчонка) і іншыя жыхары раёна[7].

Забеспячэнне партызан зброяй садзейнічала актывізацыі партызанскага руху на тэрыторыі раёна. Партызанамі былі разгромлены будынкі нямецкай адміністрацыі ў Камяніцы-Жыровецкай, торфазавод у Тэльмах, цагельня ў Гершонах. У кастрычніку 1942 г. партызанская група на чале з І.В.Салейкам на перагоне Задворны — Косічы ўзарвала эшалон з жывой сілай і тэхнікай ворага. У той жа час група М.Чарнова знішчыла паліцэйскі ўчастак у в. Чэрні. 18 лістапада партызаны спалілі ў в. Радванічы склад, у якім знаходзілася 50 цэнтнераў збожжа, сабранага ў мясцовага насельніцтва для вывазу ў Германію. Усе падводы з зернем, якія накіроўваліся з Радваніч у Брэст, затрымліваліся партызанамі. Немцы вымушаны былі перавесці паліцэйскі ўчастак з Радваніч у Брэст[9]. Фашысты зрабілі спробу нейтралізаваць партызанскі рух. З гэтай мэтай у многія вёскі, у тым ліку Шэбрын, Ямна, Булькова, Чарняны, Ракітніца, Велікарыта, Азяты, былі ўведзены войскі. Адначасова былі арганізаваны карныя экспедыцыі. У в. Вялікія Радванічы было расстраляна пяць сем'яў, а іх хаты спалены.

Каб аслабіць партызанскі рух, акупанты арыштавалі больш за 50 чалавек партыйна-савецкага актыву. Многія з іх былі расстраляны. Многа жыхароў раёна было закатавана ў турмах, звыш 100 чалавек прымусова адпраўлены на работу ў Германію[10].

Рэпрэсіўнымі мерамі на кароткі тэрмін немцам удалося спыніць баявыя дзеянні партызан.

У канцы 1942 г. наступіў карэнны пералом у ходзе вайны. Пачатак яму паклала контрнаступленне Чырвонай Арміі пад Сталінградам, якое завяршылася бліскучай перамогай нашых войскаў. Поспехі Чырвонай Арміі, удалыя баявыя дзеянні партызан спрыялі таму, што партызанскі рух перарос ва ўсенародную барацьбу. Гэтаму ў значнай ступені садзейнічала агітацыйна-прапагандысцкая работа, якую вялі падпольшчыкі і партызаны сярод насельніцтва. Вусная прапаганда праводзілася галоўным чынам сіламі прапагандыстаў і агітатараў з ліку найбольш падрыхтаваных партызан. У канцы 1942 г. асноўная маса агітатараў і прапагандыстаў пачала аб'ядноўвацца ў агіткалектывы. Колькасць праведзеных агітатарамі гутарак, дакладаў, лекцый не паддаецца дакладнаму ўліку, але, зыходзячы з канкрэтных фактаў, яна была вялікая. Так, толькі за адзін месяц, з 14 лютага па 16 сакавіка, актывісты антыфашысцкага камітэта і агітатары атрада імя М.М.Чарнака правялі з жыхарамі раёна 22 сустрэчы, на якіх расказалі аб Сталінградскай і Курскай бітвах, аб савецка-польскіх адносінах, аб міжнародным становішчы. У сустрэчах прыняло ўдзел каля 800 чалавек. Агітатары распаўсюджвалі сярод насельніцтва падпольную газету «Заря», лістоўкі.

Такія мерапрыемствы садзейнічалі прытоку ў атрады новых сіл. Толькі за ліпень 1943 г. рады народных мсціўцаў раёна павялічыліся на 37 чалавек, 22 з якіх мелі зброю[11].

Адначасова вялася прапаганда ў варожых гарнізонах вакол Брэста, у якіх служылі завербаваныя ваеннапалонныя Чырвонай Арміі розных нацыянальнасцей. Частка з іх пайшла на службу да немцаў, каб пры зручным выпадку перайсці да партызан. Па гарнізонах былі раскіданы лістоўкі з заклікам пераходзіць да партызан. У многіх выпадках такая агітацыя давала станоўчыя вынікі. Так, з Брэста перайшлі да партызан разам са зброяй і амуніцыяй 36 асецінаў[12].

Рады партызан папаўняліся таксама за кошт польскіх партызанскіх груп. У канцы кастрычніка 1943 г. у партызанскі атрад імя М.М.Чарнака прыбыла група польскіх партызан у колькасці 20 чалавек на чале з падпаручнікам Юрыем Карніцкім. На іх базе была створана 3-я рота, у якой налічвалася больш за 60 узброеных партызан. А ўсяго атрад імя М.М.Чарнака налічваў у гэты перыяд 307 чалавек, у тым ліку беларусаў — 122, рускіх — 107, украінцаў — 26, яўрэяў — 13, палякаў, асецінаў і інш. — 39[13].

Для каардынацыі баявых дзеянняў партызан у вобласць прыбыла ў красавіку 1943 г. арганізатарская партыйная група на чале з сакратаром Брэсцкага абкома КП(б)Б і ўпаўнаважаным ЦК КП(б)Б і БШПР па Брэсцкай вобласці С.І.Сікорскім. На базе яе быў створаны падпольны абком партыі, які ён і ўзначаліў[14].

Для ваеннага кіраўніцтва партызанскім рухам абком у канцы красавіка 1943 г. стварыў штаб і распачаў фарміраванне партызанскага злучэння вобласці. Яно ўзнікла вясной 1943 г. Абком і штаб устанавілі сувязь з атрадамі, у тым ліку і з атрадам М.М.Чарнака. На сумесным пасяджэнні былі вызначаны структуры атрадаў, іх задачы і раёны баявых дзеянняў. З буйных партызанскіх атрадаў штаб злучэння выдзеліў падраздзяленні, якія былі разгорнуты ў самастойныя атрады. З атрада Чар-

нака была выдзелена ініцыятыўная група, на базе якой у пачатку чэрвеня 1943 г. быў створаны партызанскі атрад імя М.В.Фрунзе. Камандзірам спачатку быў прызначаны І.С.Супрунюк, потым — В.У.Каткоў[15].

Ва ўмовах пашырэння партызанскага руху падпольны абком і штаб увялі новую арганізацыйную форму партызанскіх сіл — брыгаду. Брыгаду склалі як старыя, добра зладжаныя ў баявых адносінах атрады, так і новыя. Гэты прынцып арганізацыі даваў магчымасць, не зніжаючы баяздольнасці партызанскіх атрадаў, аб'яднаць іх і накіраваць у рэчышча арганізаванай узброенай барацьбы. У 1943 г. у вобласці была створана брыгада імя І.В.Сталіна, у якую ўвайшлі атрады імя М.М.Чарнака і імя К.Я.Варашылава, а таксама новастварэныя атрады імя М.В.Фрунзе і імя Г.К.Жукава, якія дзейнічалі на тэрыторыі Брэсцкага раёна. Камандзірам брыгады быў прызначаны Л.П.Зяленін, а пасля яго смерці ў верасні 1943 г. — С.Х.Арзуманян[16].

Па заданні ЦК КП(б)Б і БШПР на тэрыторыю вобласці і раёна з усходніх раёнаў перадыслацыраваліся партызанскія атрады і брыгады. У канцы 1943 г. на тэрыторыю раёна прыбыла з Капаткевіцкага раёна Палескай вобласці 150-я брыгада імя Ф.М.Языковіча, названая ў гонар загінуўшага ў баі сакратара Палескага падпольнага абкома КП(б)Б[17].

Арганізацыйныя мерапрыемствы, выхаваўчая работа ў атрадах і брыгадах, паляпшэнне якасці навучання партызан ваеннай справе у значнай ступені садзейнічалі развіццю баявых дзеянняў партызанскіх фарміраванняў, узмацненню ўдараў па камунікацыях, гарнізонах і воінскіх часцях праціўніка.

Вопыт партызанскай барацьбы ў тыле ворага паказаў, што ў нанясенні страт праціўніку ў жывой сіле, тэхніцы, сродках сувязі найбольш эфектыўнымі з'яўляліся дыверсіі. Асаблівая ўвага надавалася аперацыям на шашэйных дарогах і чыгункі. Вясной 1943 г. партызанамі раёна на чыгуначных лініях Брэст — Ковель, Брэст — Тэўлі і Брэст — Кобрын былі ўзарваны масты і пушчаны пад адхон некалькі цягнікоў з жывой сілай і тэхнікай. У жніўні 1943 г. атрадам М.Чарнака было спалена 6 драўляных мастоў, пашкоджана 16 кіламетраў сувязі[18].

Вядучае месца ў барацьбе на камунікацыях ворага займалі маладзёжныя дыверсійна-падрыўныя групы.

Яны нанеслі значныя страты вора-

Камсамольская дыверсійная група партызанскага атрада імя М.М.Чарнака перад выхадам на заданне.

гу ў жывой сіле і тэхніцы, праяўляючы пры гэтым мужнасць і гераізм. У атрадзе імя М.М.Чарнака адна з такіх груп складалася з 6 чалавек. У яе, у прыватнасці, уваходзілі Аляксей Антанюк, Пётр Камбулаў, Міхаіл Рудзько, Аляксандр Бяляеў. На рахунку гэтай групы 18 падарваных эшалонаў. Спачатку падрыўнікі карысталіся мінамі націскнога дзеяння, а калі немцы пачалі перад цягніком пускаць платформы з пяском, партызаны сталі ўжываць міны нацяжнога дзеяння. Як правіла, паравоз падаў пад адхон і цягнуў за сабой вагоны. Аднойчы, як успамінае былы падрыўнік Аляксей Антанюк, у час падрыву эшалона на ўчастку каля Задворцаў паравоз пайшоў адразу пад адхон, а вагоны закаціліся аж да Кошалева[19].

У 1943 г. партызаны раёна прынялі актыўны ўдзел у буйной аперацыі пад назвай «Рэйкавая вайна». У ходзе аперацыі атрадам імя М.М.Чарнака былі падарваны эшалоны на чыгункі Брэст — Маларыта, Брэст — Жабінка, Жабінка — Кобрын, Жабінка — Тэўлі. У ходзе «рэйкавай вайны» вылучыліся падрыўнікі: М.Квячэўскі, М.Ткачэнка, А.Мілехін, А.Бяляеў, А.Антанюк, М.Міленчук, У.Козел і інш. За тры гады баявой дзейнасці падрыўнікі атрада пусцілі пад адхон каля 150 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, знішчылі больш за 100 аўтамашын[20]. Аперацыі па падрыву эшалонаў працягваліся і восенню 1943 г. 14 кастрычніка камандзір Брэсцкага злучэння С.І.Сікорскі аддаў загад № 0041, згодна з якім усе партызанскія фарміраванні вобласці павінны былі нанесці масіраваныя ўдары па чыгункі. Выконваючы гэты загад, партызаны брыгады імя І.В.Сталіна ў ноч з 22 на 23 кастрычніка на ўчастках Брэст — Ковель, Брэст — Холм знішчылі больш за 900 рэек, падарвалі 2 варожыя эшалоны, у тым ліку партызаны атрада імя М.М.Чарнака — 2 эшалоны і 208 рэек, партызаны атрада імя К.Я.Варашылава — 300 рэек, імя Г.К.Жукава — 150[21].

Аб шырокім размаху партызанскага руху на тэрыторыі раёна ў 1943 г. сведчаць дакументы праціўніка. Начальнік аддзела прапаганды ў Брэст-Літоўску ў адным са сваіх данясенняў генеральнаму камісару Валыні і Падолля паведамляў, што ў Брэсцкім раёне маюцца буйныя добра арганізаваныя партызанскія сілы, у першую чаргу ў паўднёвай частцы раёна. Ён адзначаў, што, нягледзячы на праведзеную ў кастрычніку 1943 г. буйнамаштабную аперацыю нямецкай групы «Гюнтэр» і паліцэйскай роты «Нюрнберг», партызаны працягвалі актыўную дзейнасць, ва ўсходняй частцы стварылі добра ўмацаваныя лагеры, куды падысці можна толькі пры падтрымцы буйных сіл рэгулярнай арміі[22]. Начальнік жандармерыі і акружны камісар Брэст-Літоўска ў сваіх справаздачах дакладвалі аб узрастанні партызанскай дзейнасці ў 1943 г. Толькі за снежань спалены апорныя пункты венгерскіх войскаў, спіртзавод у Булькова, знішчаны 2 дзяржаўныя маёнткі, адно прамысловае прадпрыемства, праведзены 3 дыверсіі на чыгункі, пашкоджана некалькі кіламетраў сувязі. 20 і 25 снежня партызаны зрабілі напады на гарнізон у Дамачава, у выніку якіх было спалена некалькі дамоў, у тым ліку будынак раённай управы, біржа працы і млын[23].

Партызаны і насельніцтва зрывалі забеспячэнне нямецкай арміі прадуктамі харчавання і адзеннем. Як паведамляў акружны камісар, дзейнасць партызан набыла такія памеры, што ва ўсёй акрузе працаваць сельскагаспадарчым кіраўніком стала немагчыма, вялікія тэрыторыі перайшлі пад кантроль партызан[24].

У канцы 1943 г. фашысты правялі некалькі карных экспедыцый у партызанскай зоне, у выніку якіх былі спалены вёскі Міцькі, Кацельня-Баярская, Бярнады, Гулі, Ваўкі. Многа людзей і

дамоў было знішчана ў вёсках Медна, Прыбарава, Рагозна, Падлессе, Страдзеч, Малыя Радванічы. Многа мірных жыхароў у Буяках, Бярозаўцы, Селяхах, Казловічах, Шэбрыне, Хермах, Чэрнях, Бердычах, Пугачове, Раманаўскіх Хутарах, Закіях, Вялікіх Радванічах, Вульцы, Кунахах, Скверыках, Камяніцы-Жыровецкай, Чарнаўчыцах, Залессі, Збірагах, Вялюні, Франопалі, Івахнавічах, Машчонцы, Хабах, Плосцы сталі ахвярамі ў час гэтых акцый.

Барацьба працягвалася. Сілы партызан раслі.

У красавіку 1944 г., згодна з загадам штаба партызанскага злучэння вобласці, з атрадаў імя К.Я.Варашылава і імя Г.К.Жукава, выдзеленых з брыгады імя І.В.Сталіна, была створана новая брыгада імя У.І.Леніна. 7 чэрвеня 1944 г. з выдзеленых атрадамі імя К.Я.Варашылава і імя Г.К.Жукава ініцыятыўных груп быў створаны новы атрад, якому было прысвоена імя загінуўшага камандзіра брыгады імя І.В.Сталіна Л.П.Зяленіна. Атрад імя Л.П.Зяленіна ўвайшоў у склад брыгады імя У.І.Леніна[25]. Актыўныя дзеянні партызан спрыялі наступаючай Чырвонай Арміі.

У.В.Здановіч.

Крыніцы:

1. Навечна ў памяці народнай. Брэст, 1995. С. 27.
2. Заря над Бугом. 1992. 15 лют.
3. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобл. (ДАБВ). Ф. 500. Воп. 1. Спр. 99. Л. 80.
4. Заря над Бугом. 1922. 29 лют.
5. Тамсама.
6. Тамсама.
7. Тамсама.
8. Тамсама, 11 сак.
9. Навечна ў памяці народнай. Брэст, 1995. С. 28.
10. Заря над Бугом. 1968. 22 кастр.; 1992. 11 сак.
11. Навечна ў памяці народнай. Брэст, 1995. С. 29.
12. Заря над Бугом. 1972. 2 крас.
13. ДАБВ. Ф. 500. Воп. 1. Спр. 99. Л. 99.
14. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков. Мн., 1984. Т. 2. С. 61.
15. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944). Мн., 1983. С. 127, 148.
16. Тамсама. С. 126.
17. Тамсама. С. 141.
18. Заря над Бугом. 1992. 18 сак.
19. Тамсама. 1994. 1 чэрв.
20. ДАБВ. Ф. 500. Воп. 1. Спр. 99. Л. 82.
21. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944): Документы и материалы. Мн., 1978. Т. 2, кн. 2. С. 348.
22. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 1043. Л. 11, 13.
23. Тамсама. Л. 21, 22, 24.
24. Тамсама. Л. 147.
25. Партизанские формирования Белоруссии... Мн., 1983. С. 147, 149.

Партызанскія фарміраванні на тэрыторыі Брэсцкага раёна

ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА ІМЯ І.В.СТАЛІНА

Дзейнічала на тэрыторыі Брэсцкага, Дзівінскага, Жабінкаўскага, Кобрынскага і Маларыцкага раёнаў. Створана ў ліпені 1943 г. згодна з загадам па партызанскім злучэнні Брэсцкай вобласці з партызанскіх атрадаў імя М.М.Чарнака і К.Я.Варашылава. У ліпені былі створаны партызанскія атрады імя Г.К.Жукава і М.В.Фрунзе.

Камандаванне брыгады: Л.П.Зяленін (ліпень—верасень 1943, загінуў), С.Х.Арзуманян (кастрычнік 1943 — сакавік 1944).

Камісар К.А.Шкаварада; начальнік штаба С.М.Кіцьян.

Партызаны ў жніўні 1942 г. знішчылі 25 маёнткаў. У 1943 г. удзельнічалі ў разгроме варожых апорных пунктаў у Шацку (Валынская вобл., Украіна), райцэнтры Дамачава, разагналі паліцэйскія ўчасткі ў вёсках Чарняны, Азяты, правялі баі каля в. Радзеж Маларыцкага, в. Арэхаўскія Хутары Дзівінскага раёнаў і іншых, наносілі ўдары па чыгуначных участках Брэст — Ковель, Брэст — Уладава. У кастрычніку — лістападзе разбілі ст. Дамачава. У студзені 1944 г. зрабілі больш за 80 дыверсій на чыгунках і шашэйных дарогах, падарвалі шмат эшалонаў, мастоў, аўтамашын. Пасля злучэння з Чырвонай Арміяй брыгада ў складзе 160-й

стралковай дывізіі трымала абарону ў Любяшоўскім (Валынская вобл., Украіна) і Дзівінскім раёнах, прыкрывала пераправу цераз Прыпяць і правы фланг дывізіі каля в. Радастава.

АТРАД ІМЯ М.М.ЧАРНАКА
(да чэрвеня 1943 г. Старасельскі атрад)

Створаны ў чэрвені 1941 г. у Старасельскім лесе Жабінкаўскага раёна з ваеннаслужачых 84-га і 125-га стралковых палкоў, пагранічнікаў і жыхароў Старасельскага сельсавета. Да ліпеня 1943 г. дзейнічаў самастойна. У маі 1943 г. прысвоена імя нам. камандзіра атрада па разведцы М.М.Чарнака, які загінуў у баі 2 мая 1943 г.

22 сакавіка 1944 г. атрад злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі, быў рэарганізаваны і 15 мая зноў накіраваны ў тыл ворага, у Жабінкаўскі раён. У другі раз злучыўся з савецкімі войскамі 21 ліпеня 1944 г. у складзе 607 партызан.

Камандзіры: Шыканаў Сяргей Сяргеевіч (чэрвень 1941 — чэрвень 1943), Бізяеў Леанід Трафімавіч (чэрвень 1943 — жнівень 1943), Козыраў Рамазан Дзабіевіч (жнівень 1943 — сакавік 1944), Хоміч Іван Фёдаравіч (красавік 1944 — ліпень 1944); камісары: Зяленін Леанід Пятровіч (люты 1942 — ліпень 1943), Козыраў Рамазан Дзабіевіч (ліпень 1943 — жнівень 1943), Аршынаў Аркадзь Іванавіч (верасень 1943 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Кіцьян Сяргей Мікітавіч (снежань 1942 — чэрвень 1943), Хоміч Іван Фёдаравіч (чэрвень 1943 — красавік 1944), Вядмедка Анатоль Сяргеевіч (красавік 1944 — ліпень 1944).

Як мы стваралі партызанскі атрад

З успамінаў С.С.Шыканава, камандзіра Старасельскага партызанскага атрада

У чэрвені 1941 г. С.С.Шыканаў быў лейтэнантам, камандзірам роты 125-га стралковага палка 6-й стралковай дывізіі. Удзельнік баёў на граніцы. Апынуўшыся ў акружэнні, вырваўся з яго, перайшоў да партызанскіх дзеянняў у тыле ворага.

...Числа 20 мая получил приказ ехать с ротой на полигон в Южный городок для проведения боевых стрельб из станковых пулеметов. Начальником сборов пулеметчиков был назначен майор Семен Капитонович Дородных (Майор Дородных С.К. погиб весной 1943 г. в лесах Брестчины. —*Р.В.*), командир 84-го стрелкового полка.

На этот раз на полигоне были все три пулеметные роты 125-го стрелкового полка. Мы занимались обычной боевой подготовкой, но в каждой роте держали по три боекомплекта на пулемет...

На заре 22 июня под грохот канонады, освещенные заревом пожарищ в крепости, мы ехали в Брест.

На восточной окраине Бреста, у Кобринского моста, я остановил полуторку и приказал ехать на полигон. Едем. А в голове мысли одна тревожнее другой. В районе крепости зарево, оттуда доносится непрерывный зловещий гул. Там некоторые из моих командиров. Сумеют ли они пройти на полигон, к своей роте? Рота! А у нее всего две тысячи патронов. Что это для пулеметчиков? Капля в море.

Не заметил, как машина выскочила на Суворовский мост. Навстречу танки. Видимо, 22-я танковая вытягивается. Но что это на танках? Так это же патронные ящики! Выскакиваю из машины и прямо к головному танку. В открытой башне стоит командир и направляет движение колонны. Сразу не разобрал, кто по званию, показалось — подполковник.

— Товарищ подполковник... (Как теперь установлено, это был командир танковой роты лейтенант Пономарёв Николай Иванович. — *Р.В.*) — представляюсь. — У вас, я вижу, на машинах патронные ящики.

— Короче!

— На полигоне пулеметная рота без патронов.

— Товарищи, поможем пулеметчикам. Сбросьте на машину десять ящиков. 30 тысяч патронов! Порядок.

— Ну, жми, друг, на всю железку! — говорю водителю.

Благополучно проскочили Южный городок, по которому немцы вели массированный артогонь.

В роте потерь не было, если не считать раненого ездового. Приказал немедленно набивать ленты. Почти одновре-



С.С.Шыканаў.

менно прибыли командиры 1-го взвода лейтенант Алексей Иванович Колымцев и 2-го — младший лейтенант Григорий Данилович Клинотин. Но опасения мои оправдались: из крепости не прибыли замполит младший политрук Иван Аксенович Троян и командир 3-го взвода лейтенант Петр Иванович Давыдов. (Лейтенант П.И.Давыдов героически погиб при обороне Брестской крепости. — *Р.В.*). В первую и вторую роты вообще никто из комсостава не прибыл. Оказавшись старшим, вызвал к себе помкомвзводов и старшин рот...

Мы вошли в район Красного Двора. Здесь оказались удобные позиции, оставшиеся еще со времен первой мировой войны. Приспособили их. А скоро и вступили в бой с передовыми подразделениями противника. Почти целый день удерживали мы свой рубеж, прикрывая отход частей.

Перед вечером майор Дородных приказал:

— По московскому шоссе беспрерывно идут войска. Будем отходить через Шебринский лес.

Снялись с позиций. В это время к нам подошла группа пограничников. Они рассказали, что немцы уже в Бресте. А из крепости все время доносится гул канонады.

Подходим к деревне Франополь...

Летняя ночь коротка, отдыхать особенно некогда. Хотел ночью перейти московское шоссе — не удалось. Мы укрылись в Бульковском лесу. Утром вновь встретился с Дородных. Посоветовавшись, решили провести разведку в направлении Стриганец — Радваничи и выйти в Старосельский лес, оттуда через болота на Пинск. Возможно, удастся соединиться со своими.

В ночь на 24 июня благополучно перешли в Старосельский лес. К этому времени у нас собралось 286 человек. Тут были и танкисты, и связисты, и артиллеристы, и пограничники — словом, воины самых разных родов войск.

Над лесом сгущались сумерки, повеяло прохладой. Настороженно шумела листва, и надоедливо пищали комары. Каждый из нас, видимо, думал о своем. Я думал о том, что из троих командиров-пулеметчиков осталось нас двое: Клинотин погиб в первый же день в бою у Бульковского моста, а ведь скоро немцев должны погнать на запад, и он уже не увидит нашей победы.

— Семен Капитонович, не может быть, чтобы наши далеко отступили, а? Как вы думаете?

— Не должны.

— Вы знаете, у меня есть мысль. Всей нашей группе перейти к партизанским методам борьбы, а когда наши войска начнут наступать, будем наносить удары по фашистам с тыла.

— А ведь дело говоришь, Сергей. Только вот что... — Дородных задумался. Он не знал, где его полк, что с ним. На лбу резко залегла складка. Может быть, впервые я заметил, что он как-то заметно сдал за эти дни, постарел. — Людей кормить надо, где возьмешь продовольствие?

— Свяжемся с местным населением, помогут.

— Местное население разное бывает.

— Подавляющее большинство — это наши, преданные Советской власти люди. Установим связь с советскими и партийными работниками... — Чем больше я говорил, тем больше сам загорался этой идеей. — Мы на своей земле, среди своих. Это у немца будет гореть земля под ногами. Я считаю, надо объявить наше решение отряду.

— Ну что ж, действуй, — одобрил Дородных.

На широкой поляне построили всех людей.

— Товарищи, отныне наша группа объявляется партизанским отрядом, — обратился я ко всем. Кое-кто выразил удивление, а кое-кто и прямое неудовлетворение. — Вот что, друзья, кто согласен, останется, кто хочет, может пробираться к линии фронта. — Про себя я подумал, что

те, которые останутся, будут надежным ядром отряда.

— А что будем делать? — спросили из рядов.

— Будем бить фашиста! — с заметным казахским акцентом крикнул Нурум Садыков.

— Бить!..Чем? Палкой? Тоже — воякa.

— Моя не хуже вояка, чем ты! — огрызнулся Нурум.

— Тише, товарищи, — успокаиваю я спорщиков. — Думаю, что прежде всего свяжемся с местным населением и займемся сбором оружия и боеприпасов, а потом... — Правду сказать, я и сам еще не представлял себе четко, что потом. Ни я и никто другой из нас не знали особенностей партизанской войны. Одно было ясно — будем бороться.

— Согласны!

— Это дело! — раздались голоса.

— Конечно, дело, наш лейтенант — командиром... — услышал я Нурума Садыкова, который что-то доказывал своему соседу, но так и не понял, что он хотел сказать.

Н.Садыкаў.

Так в ночь с 24 на 25 июня 1941 года был создан партизанский отряд.

Расходились споря, бурно обсуждая свое решение. А я подумал, что такие, как Нурум Садыков (я его хорошо знал, это был примерный боец из моей роты), как Леонид Зеленин — чекист, родом из-под Курска — и многие другие, будут надежной опорой. Так оно потом и оказалось...

Друкуецца паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977.

Нарада ў партызанскім атрадзе імя М.М.Чарнака. Выступае Н.Садыкаў.

Узрывы ўначы

З успамінаў Н.Я.Шчарбакова, камандзіра дыверсійнай групы партызанскага атрада імя М.М.Чарнака

... Фронт уходит все дальше. Фашисты ведут себя как хозяева, как завоеватели. «Неужто, — думаю, — так будет? Нет, не может быть!» И действительно, все шире пошли слухи о партизанах. Но как с ними установить связь? Стал искать верных людей. Скоро познакомился с ребятами из числа бывших военнопленных, которым разными путями удалось выскользнуть из фашистских лап. С ними в марте 1942 года и ушел в отряд Чернака. Комиссаром там оказался мой знакомый по Бресту Леонид Зеленин. Стал у него связным. Время шло, и роль связного перестала меня удовлетворять. Молодой, здоровый, я чувствовал, что способен на большее. И случай подтолкнул. Прохожу как-то мост через Мухавец, что на дороге из Пугачева, а он стоит целехонек и... никем не охраняется. Родилась у меня идея: раз так, думаю, то и Суворовский мост не очень-то охраняется. Взорвать тот мост, а потом, пока не оправятся фашисты, этот.

... В напарники взял хлопца Ивана Донового по кличке Молдаван. Отчаянный парень, на него можно было положиться.

Идем с Молдаваном разведывать подходы к мостам, а на том, что не охраняется, посмотреть, где взрывчатку положить.

Ночь спустилась темная, густая. Но идем уверенно, правду говоря, привыкли ходить ночью. Вот уже и река заблестела в темноте тяжелым свинцовым блеском. Вдруг — голоса. Остановились, прислушались. Наши! Подходим ближе — и точно наши: Николай Шаповалов, Владимир Василюк, Фома Вольский.

— Чего вы тут, хлопцы? — спрашиваю, делая вид, что не понимаю.

— Комиссар послал мост взорвать.

— Ну конечно, который не охраняется, взорвать не больно много храбрости нужно, а везде потом охрана усилится.

— Приказ.

— Эх, приказ! — выругались мы с Молдаваном, а делать нечего, ушли. Ребята подожгли и взорвали мост.

Как теперь нам быть? Ломаем голову день-другой. И вдруг осенило!

— Слушай, Молдаван, — обращаюсь к своему другу, — фашист ночью усилил охрану Суворовского моста?

— Факт!

— Комендантский час с девяти?

— С девяти.

— А если после девяти попался — значит, партизан, расстрел на месте, так?

— Так. Да что ты ко мне пристал, — возмутился Молдаван, — будто сам не знаешь.

— Знаю, все знаю, а потому и говорю — мост мы взорвем днем.

Партызаны атрада імя М.М.Чарнака перадаюць лістоўкі са звесткамі Саўінфармбюро жыхарам в. Горы Маларыцкага раёна.

— Тю-ю! Ты что, очумел, Профессор? вытаращил на меня глаза Молдаван.

— А ты не удивляйся. Слушай внимательно, мы сделаем так... — И я рассказал другу свой замысел...

Немцы — народ пунктуальный. После обеда — отдых, самое, если можно так сказать, спокойное время. А если это еще и воскресенье! С полудня на улицах народу мало. Мы с другом на повозке едем и думаем, как бы самим вместо моста не взлететь на воздух: груз в нашей повозке довольно деликатный — взрывчатка.

Улицы проехали, уже и переезд виден, и откуда ни возьмись —немцы.

— Тут обязательно обыскивать станут.

— Это точно, сворачивай в переулок.

Повернули в Пугачево. Железнодорожная линия, и опять немцы! Придется ехать прямо. На расстоянии почтительно снимаю фуражку:

— День добрый!

Немцы посмотрели подозрительно на повозку, но пропустили. Отъехали, облегченно вздохнули — пронесло!

Выезжаем на мост. Напарник — к лошади, стал возиться около нее, будто поправляет упряжь. Я тем временем зажег фитиль. Зажег прямо в мешке, где взрывчатка. Потом мешок — на мост.

— Готово!

Ваня лошадь повернул поперек моста, а сам ко мне. Немцы что-то заподозрили.

— Хальт!

Но мы скорым шагом — вниз по дороге. Впереди Молдаван, я сзади, пячусь лицом к мосту. Пистолет на боевом взводе в кармане. Вижу: немцы метнулись к повозке, к мешку. Увидели дымок фитилей — и быстрей на другую сторону моста, к Бресту! А нам только это и нужно, — главное, чтобы тихо, чтоб стрельбу не открыли.

Проходим метров 150. Навстречу немец — винтовка на плече, на ней, как на палке, узел с бельем. Посмотрел на нас и в ужасе забормотал: «Фэрфлюхт, бандиты». И скорей от нас. Вторым встретился пьяный полицай. Едет на велосипеде, песни орет, а другой велосипед ведет в руках. Проехал. Третий был фашистский офицер с немкой под ручку. Этот тоже не обратил на нас внимания.

Идем дальше. И вот желанный, давно ожидаемый взрыв! Мы бросаемся в сторону, прячемся в картофлянике. Долго лежим, не шевелясь. Наконец стемнело. Благополучно уходим...

Но мне опять не давал покоя Суворовский мост. Он начал действовать. Во что бы то ни стало взорвать его, лишить фашистов важной дороги! Решено — сделано! Начинаю подготовку к операции. Раздобыли мину в 12 кг, снаряд на 22 кг и 20 литров бензина. На этот раз дневная операция не пройдет, надо только ночью.

Но вот все готово. Ждем подходящей погоды. Скоро нам повезло —выдалась темная дождливая ночь. И мы пошли. Мы — это Алексей Егоров по кличке Скопской, Жорка-«полицай» и я. ... Подошли к мосту. Теперь наступает самое глав-

Суворaўскі мост у Брэсце, узарваны дыверсійнай групай Н.Я.Шчарбакова.

М.А.Мартысюк.

В.П.Панасюк.

ное — пробраться незамеченными. Осторожно поднялся на насыпь. Бросился в будку с намерением уничтожить часовых. Но... часовых нет. Дал сигнал своим.

Егоров быстро разлил бензин, Жорка приладил мину, я — снаряд.

— Готово, Профессор, — доложил Егоров.

— Готово! — шепотом сообщил Жорка.

— Теперь вниз, на другую сторону откоса!

Дождавшись, когда все скрылись, стал на колени, чтобы укрыться от ветра и дождя, зажечь спичку. Зажег. Бензин вспыхнул ярким пламенем, загорелись брюки. С железнодорожного моста застучал пулемет. Я упал. Покатился по откосу. Не заметил, когда сбил пламя. Пополз к проволоке. Пулемет фашистский не дает подняться — бьет по шоссе. Хочет, чтобы мы ушли вправо, попали на мины.

Лежу, соображаю, как выбраться, и слышу разговор:

— Профессора нет. Может, ранен.

— Слушай, дай ты этому фашисту, чтоб он там у своего пулемета захлебнулся.

Не успел я что-нибудь сообразить, как наши открыли огонь. И в самом деле, фашист замолчал. Немедленно воспользовался этим, присоединился к своим.

Друкуецца паводле кн.: Буг в огне. Мн., 1977.

АТРАД ІМЯ М.В.ФРУНЗЕ

Створаны ў ліпені 1943 г. з часткі асабовага складу атрада імя М.М.Чарнака. 22 сакавіка 1944 г. атрад злучыўся з Чырвонай Арміяй, перафарміраваны і 25 мая зноў накіраваны ў варожы тыл. Дзейнічаў самастойна ў Жабінкаўскім і Кобрынскім раёнах. У другі раз злучыўся з савецкімі войскамі 21 ліпеня 1944 г. у складзе 407 партызан.

Камандзіры: Спірыдонаў Павел Пятровіч (ліпень 1943 — снежань 1943), Канукоў Альбін Харытонавіч (снежань 1943 — люты 1944), Кадзаеў Міхаіл Барысавіч (люты 1944 — красавік 1944), Мартысюк Мікалай Андрэевіч (красавік 1944 — чэрвень 1944); камісары Канукоў Альбін Харытонавіч (ліпень 1943 — снежань 1943), Гогалеў Аляксандр Паўлавіч (студзень 1944 — сакавік 1944), Саўчук Міхаіл Андрэевіч (красавік 1944 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Мартысюк Мікалай Андрэевіч (ліпень 1943 — красавік 1944), Клябанаў Уладзімір Сямёнавіч (красавік 1944 — май 1944), Казлоў Анатоль Захаравіч (май 1944 — чэрвень 1944, в.а.).

Так яны пачыналі...

Расказ аб партызанскім камандзіры М.А.Мартысюку

МАРТЫСЮК Мікалай Андрэевіч, н. у 1912 г. у в. Шэбрын Косіцкай воласці Брэсцкага павета. З 1928 г. па 1939 г. — удзельнік рэвалюцыйнага руху ў заходніх абласцях Беларусі. У чэрвені 1941 г. з Брэста адыходзіў на ўсход. Пад Вязьмай паранены папаў у палон. З лютага 1942 г. — член антыфашысцкай групы І.П.Салейкі, з 1944 г. — камандзір партызанскага атрада імя М.В.Фрунзе.

Началась война. Николай Мартысюк примкнул к воинской части и стал солдатом, хотя и был в цивильном одеянии. В Барановичах пиджак сменил на гимнастерку. Под Вязьмой был ранен и, мучаясь от боли, не заметил, что остался один в поле. Не успел оглядеться, как попал в немецкий лагерь для военнопленных. Немцы так быстро наступали, что не знали, что делать с пленными. Стремились к Москве. Лагерь, в который угодил 29-летний брестчанин, был наскоро оборудован. Шли дни. С трудом, но успокоилась рана. Не выходит у Николая из головы речь И.В.Сталина

3 июля 1941 г., которую слышал из военной машины, его слова «Наше дело правое, мы победим», его призыв к партизанскому движению...

Выбор был двоякий — бежать или медленно умирать здесь. Большая потеря крови. «Вояка из меня плохой», — думал он. — «Мне показалось, — рассказывал он позже, что лагерь наш почти не охранялся. Просто согнали, как подстреленных овец, и бросили. Решил пройтись — так, почти без всяких трудностей покинул этот голодный загон. Подумал: раз Сталин призывает к борьбе в тылу врага — значит, я нужен там.

В то, что дойду до Бреста, до своего родного Шебрина, — веры не было, слишком ослаб».

Был декабрь сорок первого, когда пришел Николай в родные места. От жены узнал, что где-то здесь Солейко, его надо разыскать. Встретил Николая Андреевича Мирошника, сочувствующего КПЗБ. Разговорились. Может быть, поспешил Николай, но время не ждало, и он спросил напрямик:

— Где Солейко? Помоги его найти.

— Иди в Заболотье к Ивану Старосельцу.

— Как туда добраться и где дом?

— На перекрестке стожок сена и поленница дров, дом по левую сторону. Спросишь: «Продаете дрова?» Ответят: «Продаю, одну повозку».

Это был пароль.

...Беседа была долгой. Чугунка два чаю выпили. Мартысюк расказывал о своих мытарствах. Сказал, что слышал призыв Сталина к развертыванию партизанской борьбы. У Солейко оживились глаза:

— Карты в руки. Если не мы, так кто же тогда, — проговорил он.

Созрел план. Так двое патриотов вступили в борьбу. В некоторых деревнях вокруг Бреста люди начинали объединяться для борьбы, а в самом городе уже действовала группа антифашистов во главе с Жуликовым.

...Николай Мартысюк был запевалой во многих схватках с врагом, часто стоял на краю пропасти, был тяжело ранен под деревней Мощенка, но борьбу не оставил. Подпольная группа переросла в партизанский отряд. В апреле 1943 г. группа абъединилась с отрядом Сергея Шиканова. 28 апреля 1943 г. Николай Мартысюк с группой добровольцев сделали удачную вылазку в имение Воляного, забрали скот, хлеб и увезли в лес. Разгромили спиртзавод в Атегине...

Добрым словом вспоминает Николай Мартысюк о земляке Варфоломее Потаповиче Панасюке, жителе д. Франополь, который спас его от гибели.

В одном из боев Панасюк прикрыл огнем отход боевых друзей.

Этот отважный человек имеет свою историю. Когда территория Западной Белоруссии подпала под господство польских помещиков и капиталистов, Варфоломей Потапович принимал самое активное участие в революционном движении. С первых дней фашистского нашествия на нашу страну стал поддерживать тесную связь с Брестским подпольем, потом с партизанами. Дважды арестовывался фашистами. Лишь чудом ему удалось избежать расправы. Когда оставаться на месте стало невозможно, ушел в партизанский отряд имени Чернака.

Под прикрытием его огня мой истребительный отряд оторвался от фашистов. Мы долго еще слышали его пулемет. А когда он смолк, до нашего слуха донесся большой силы взрыв. Было это 26 мая 1944 г. Варфоломей Потапович взорвал гранатой себя и подбежавших к нему немецких солдат. Погиб наш земляк как истинный герой.

В заключение Николай Андреевич рассказал: «Помню, как-то Шиканов распорядился:

— Гитлеровцы, возможно, решат, что Первое мая мы будем отмечать с чаркой, и предпримут облаву. Надо достойно их встретить.

Когда немцы Первое мая начали облаву, партизаны заняли круговую оборону.

— Подпустить как можно ближе, чтобы бить наверняка. Без команды не стрелять, — потребовал Шиканов.

Фашисты, ободренные нашим молчанием, шли во весь рост, почти не остерегаясь. Слышим их говор. Вот они подошли так близко, что, казалось, можно различить цвет их глаз. Нервы напряглись до предела. И тут раздался чуть глуховатый, но твердый голос Шиканова: «Огонь!»

Загремели выстрелы, затрещали пулеметные и автоматные очереди. Ошелом-

В.М.Грэбеняў.

ленные внезапным ударом, потеряв 15 человек убитыми, гитлеровцы бежали. В этом бою погиб начальник разведки отряда М.Н.Чернак. Летели рельсы, эшелоны, рвалась связь врага...»

За смелые и дерзкие действия, организаторскую хватку Николай Андреевич Мартысюк был избран начальником штаба отряда имени Фрунзе, потом и его командиром.

Г.В.Бессонов.

АТРАД М.І.КАЛІЕВА

Створаны ў красавіку 1944 г. з часткі асабовага складу атрада імя М.М.Чарнака, якая засталася ў тыле ворага, пасля злучэння атрада з Чырвонай Арміяй у сакавіку 1944 г. 31 мая 1944 г. атрад (99 чал.) уліўся ў атрад імя М.М.Чарнака.

Камандзір Каліеў Мазарбек Іосіфавіч, камісар Салейка Іван Пятровіч, начальнік штаба Шапавалаў Мікалай Андрэевіч.

БРЫГАДА ІМЯ У.І.ЛЕНІНА

Створана ў сакавіку 1944 г. згодна з загадам па партызанскім злучэнні Брэсцкай вобласці з партызанскіх атрадаў імя К.Я.Варашылава і імя Г.К.Жукава, вылучаных з партызанскай брыгады імя І.В.Сталіна.

У чэрвені 1944 г. арганізаваны атрад імя Л.П.Зяленіна.

Брыгада дзейнічала на тэрыторыі Дамачаўскага і Маларыцкага раёнаў.

Камандзір Каткоў Віктар Уладзіміравіч (красавік 1944 — ліпень 1944), камісар Грэбеняў Васіль Мікалаевіч (красавік 1944 — ліпень 1944), начальнік штаба Гуляеў Леанід Сцяпанавіч (красавік 1944 — ліпень 1944).

Партызаны правялі шматлікія баі па ліквідацыі варожых апорных пунктаў і ваенных упраў у вёсках Гвозніца, Радзеж, Велікарыта, Прыбарава, Арэхава, Олтуш, зрабілі налёт на гарнізон у райцэнтры Дамачава, знішчылі склады са збожжам, сыравінай, захапілі шмат зброі. У жніўні — кастрычніку 1943 г. падарвалі 3 эшалоны праціўніка, 19 мастоў, у тым ліку 1 чыгуначны мост. Разам з мясцовым насельніцтвам вывелі са строю ўчастак шашэйнай дарогі Брэст — Уладава, выкапалі 25 процітанкавых равоў і зрабілі 18 іншых перашкод. Грамілі варожыя пагранічныя і апорныя пункты на левым беразе Буга. У ліпені 1944 г. разам з часцямі Чырвонай Арміі вялі баі з гітлераўцамі каля в. Гвозніца, удзельнічала ў знішчэнні брэсцкай групоўкі праціўніка.

АТРАД ІМЯ К.Я.ВАРАШЫЛАВА

Створаны ў лютым 1943 г. з партызанскіх груп В.М.Грэбенева, І.С.Супрунюка, Н.Аліпы, якія дзейнічалі ў Дамачаўскім і Маларыцкім раёнах. Атрад дзейнічаў самастойна, з ліпеня 1943 г. — у складзе брыгады імя І.В.Сталіна.

Камандзіры: Грэбеняў Васіль Мікалаевіч (люты 1943 — чэрвень 1943), Вараб'ёў Іван Аляксеевіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944); камісары: Вараб'ёў Іван Аляксеевіч (май 1943 — чэрвень 1944), Жукаў Міхаіл Пятровіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944); начальнікі штаба: Гуляеў Леанід Сцяпанавіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944), Шупікаў Раман Піліпавіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944).

20 ліпеня 1944 г. атрад колькасцю 102 партызаны злучыўся з Чырвонай Арміяй.

АТРАД ІМЯ Л.П.ЗЯЛЕНІНА

Створаны 7 чэрвеня 1944 г. з груп, выдзеленых партызанскімі атрадамі імя К.Я.Варашылава і імя Г.К.Жукава. Атраду прысвоена імя камандзіра брыгады імя І.В.Сталіна Зяленіна Леаніда Пятровіча, які загінуў 23 верасня 1943 г.

Камандзір Калугін Іван Данілавіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944); камісар Жгут Віктар Афанасьевіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944); начальнік штаба Гурашвілі Міхаіл Вісарыёнавіч (чэрвень 1944 — ліпень 1944).

20 лістапада 1944 г. атрад колькасцю 261 партызан злучыўся з Чырвонай Арміяй.

АТРАД ІМЯ Г.К.ЖУКАВА

Створаны ў ліпені 1943 г. з ініцыятыўнай групы І.С.Супрунюка — Я.М.Лапекі атрада імя К.Я.Варашылава і

жыхароў вёсак Радзеж, Навaселле, Галеўка, Кобрынка Даманавіцкага і Маларыцкага раёнаў.

Камандзіры: Супрунюк Іпаліт Сідаравіч (ліпень 1943), Каткоў Віктар Уладзіміравіч (ліпень 1943—чэрвень 1944), Холадаў Мікалай Лукіч (чэрвень 1944—ліпень 1944); камісары: Лапека Яўстафій Малахавіч (ліпень 1943—чэрвень 1944), Жураўлёў Фёдар Піліпавіч (чэрвень 1944—ліпень 1944); начальнік штаба: Лапцеў Васіль Сямёнавіч (ліпень 1943—снежань 1943), Талызенкаў Сямён Мікітавіч (студзень 1944—чэрвень 1944), Сарабаеў Суран Алі (чэрвень 1944—ліпень 1944).

20 ліпеня 1944 г. атрад колькасцю 462 партызаны злучыўся з Чырвонай Арміяй.

150-Я БРЫГАДА ІМЯ Ф.М.ЯЗЫКОВІЧА

Створана ў снежні 1943 г. у Капаткевіцкім раёне згодна з загадам па партызанскім злучэнні Палескай вобласці. Названа іменем сакратара Палескага падпольнага абкома партыі Языковіча Фёдара Міхайлавіча, які загінуў у баі 7 красавіка 1943 г. Па распараджэнні БШПР у снежні 1943 г. — студзені 1944 г. здзейсніла баявы рэйд з Капаткевіцкага раёна Палескай вобласці ў Дамачаўскі раён Брэсцкай вобласці. Дзейнічала на тэрыторыі Целяханскага раёна Пінскай, Дамачаўскага, Дзівінскага, Драгічынскага раёнаў Брэсцкай, Любешаўскага раёна Валынскай (Украіна) абласцей.

Ф.Е.Тронкіна.

Камандзір Вялігін Васіль Афанасьевіч (снежань 1943—красавік 1944); камісар Падута Сяргей Міхайлавіч (снежань 1943—красавік 1944); начальнік штаба Гардзіенка Мікалай Іосіфавіч (снежань 1943—красавік 1944).

30 сакавіка 1944 г. брыгада ў складзе атрадаў 17-га, 27-га імя Ленінскага камсамола, 39-га імя В.Н.Бажэнкі агульнай колькасцю 541 партызан злучылася з Чырвонай Арміяй.

Брестский подпольный райком ЛКСМБ

Действовал с 1.8.1943 по 21.7.1943 под руководством Брестского подпольного обкома ЛКСМБ. Секретари: Ф.Е.Тронкина (весь период), С.С.Шиканов (с 1.1.1944); члены: Н.А.Шаповалов, А.Л.Мельник и Н.В.Мартыненко (весь период).

Основная база находилась в партизанской бригаде имени И.В.Сталина в Брестском и Жабинковском районах.

Проводил политико-воспитательную работу по вовлечению комсомольцев и молодежи района в подпольную и партизанскую борьбу против немецко-фашистских оккупантов, руководил деятельностью комсомольско-молодежного подполья в населенных пунктах, комсомольской работой в партизанских формированиях.

До создания райкома комсомольским подпольем на территории Брестского района руководил член бюро Брестского подпольного обкома ЛКСМБ М.А.Леонтенко (с апреля 1943), которому помогали комсомольцы-партизаны.

Друкуецца паводле кн.: Брест. Энциклопедический справочник. Мн., 1987. С. 143.

Дакументы сведчаць

АБ БАЯВОЙ АПЕРАЦЫІ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ К.Я.ВАРАШЫЛАВА БРЫГАДЫ ІМЯ І.В.СТАЛІНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ НА ШАШЫ БРЭСТ—ДАМАЧАВА КАЛЯ ВЁСКІ ДУБІЦА

20 лістапада 1943 г.

19 ноября 1943 г. дубицкая разведка в 20.00 донесла в штаб отряда (район Дубица), что 2 грузовых и 1 легковая машины из гор. Бреста прошли в направлении Домачево и завтра возвращаются обратно. В 3.00 командир отряда тов. Гребнев вызвал командира 1-й роты

лейтенанта Шупикова Романа Филимоновича и поставил ему задачу: «Вчера в 20.00 из Бреста в гор. поселок Домачево прошли 3 машины с немцами. По всей вероятности, эти машины сегодня будут возвращаться в Брест. Ваша задача на обратном пути их уничтожить».

Командир роты поднял роту, дал 15 мин. сроку для подготовки к боевой операции. В назначенное время группа в количестве 65 человек вышла в район дер. Збунин. Движение было ночью через болота. Соблюдалась полная тишина. На рассвете группа была у своей цели. Место было открытое — по обе стороны шоссе чистое поле. Всем казалось, что операция будет неудачной — партизаны будут обнаружены.

Но командир Шупиков и политрук Жуков были настойчивы и уверены в победе. Группа расположилась, приготовилась к встрече с фрицами. Сигнал для открытия боя — огонь двух лобовых пулеметов. В центре была расположена основная сила. Для охраны флангов были выделены патрули на расстоянии до 1 км. Тыл патрулировался тремя чел.

С наступлением рассвета по шоссе началось движение крестьян в ту и другую стороны. Командир роты приказал патрулям: «Движущихся крестьян в направлении Бреста пропускать, стараясь маскироваться. Движущихся в направлении Домачево задерживать и направлять к тыловым патрулям».

Было уже 11 часов дня, а фрицы не ехали. Командир роты отправил 25 чел. на хозяйственную операцию в дер. Збунин, а с остальными остался ждать. «Машины, — передал левофланговый патруль в 12.15 дня, — по местам. Приготовиться к бою». Две грузовые машины вынырнули из-за поворота. «Внимание, лобовые пулеметы. Не подкачать», — предупредил командир и сам расположился в центре засады. Машины выровнялись с засадой. Очереди лобовых пулеметов, а затем открылся партизанский внезапный огонь со всего оружия. «Левый фланг, вперед», — раздалась команда. Огонь левого фланга на 10 мин. заставил замолчать противника... В результате боя убито 28 гитлеровцев, 4 взято в плен. Разбито и сожжено 2 автомашины. Взяты трофеи: 1 пулемет, 31 винтовка, 4 пистолета, много документов, боеприпасов и имущества. Со своей стороны потерь партизаны не имели. В бою отличились: Шупиков Р.Ф., Жуков Михаил Петрович, Мелешко Л., Филоненко Авдей, Лях Николай, Братчук Федор, Линзаев Кузьма, Губа Дмитрий, Ворончук Ян. Засада была организованная и удачная. Быстрое уничтожение противника и без своих потерь — тактика, свойственная партизанам.

Командир отряда им. Ворошилова Воробьев
Комиссар отряда им. Ворошилова Жуков
Начальник штаба отряда Шупиков

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 321. Л. 104—105.

АБ РАЗГРОМЕ ВАРОЖАГА ГАРНІЗОНА Ў ПАС. ДАМАЧАВА СІЛАМІ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ І.В.СТАЛІНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

23 лістапада 1943 г.

Подготовка к разгрому Домачевского гарнизона велась около 15—20 дней, цель была установить расположение противника в зданиях, его численность и вооружение, план укреплений и охраны гор. поселка в ночное время (расположение постов) и пути подхода к гарнизону.

Было установлено, что противник с постоянной численностью до 300 чел. и переменной 400—500 чел. занимает ряд зданий, укрепленных земляными валами и проволочным заграждением, с бетонированными огневыми точками, как-то: занимал школу, где находилось до 200 вооруженных солдат, 2 здания, в которых находилась жандармерия, здание полицейского участка и здание добровольной команды по борьбе с партизанами.

Оборона гор. поселка была построена в виде треугольника, по углам которого были расположены основные силы противника, охранявшие главные пути подхода. Вблизи полицейского участка находилась баня, служившая оборонным пунктом противника (каменное здание, вокруг которого были устроены бетонные блиндажи). В случае нападения партизан полицейские должны были быстро занять баню и блиндажи. Наибольшая сила противника (до 200 чел.) находилась в сильно укрепленной школе, взятие которой атакой требовало больших жертв со стороны партизан.

Исходя из вышеизложенных данных командование приняло следующий план нападения: первая рота под командованием Шупикова должна была незаметно подойти к зданию

стар па зброі быў, канешне, патрэбен. І мы рашыліся. Нашаму знаёмаму далі пашпарт Сяргея Смаля, а пашпарт яго жонкі — каханцы, якую той браў з сабой. З горада да вёскі Бярнады дабраліся добра. Там і чакалі партызан. Але, на бяду, яны чамусьці не прыйшлі, а раніцай вёску акружылі фашысты. Каханка незнаёмага пабегла і сказала, што ведае чалавека, які збіраецца ў партызаны. Немцы накіраваліся да хаты, дзе быў наш знаёмы. Гаспадар прапанаваў яму ўцякаць, але незнаёмец не згадзіўся. Тады ён закрыў хату і павесіў на дзверы замок, быццам там нікога няма.

Немцы збілі прыкладамі замок і адшукалі незнаёмца. Той не разгубіўся. Схапіў сякеру, забіў аднаго салдата і выскачыў на вуліцу. Яго ўбачылі і застрэлілі. Па пашпарце, знойдзеным у забітага, выйшлі на Сяргея Смаля і на Майсея Фамука.

Я на працу ў фірму не пайшоў, баяўся, што схопяць і мяне. Але ніхто нікога не выдаў.

ФАМУК Іван Сямёнавіч, н. у 1927, падарваўся на міне ў 1944.

ЦАП Аніся, загінула 22 чэрвеня 1941 у час варожага абстрэлу.

ВЁСКА ПРЫЛУКІ

БАДУН Піліп Ігнатавіч, сын **Уладзімір,** дачка **Надзея** з дзіцем, падарваліся на міне ў 1944.

БАСАЦКІ Аляксандр Лук'янавіч, н. у 1923, расстраляны за сувязь з партызанамі ў 1943.

БАСАЦКІ Мірон, забіты немцамі.

БОГДАН Сямён Іванавіч.

ВЕРАМЧУК Аляксандр Ануфрыевіч.

ДАРКОВІЧ Піліп Іванавіч, н. у 1898, расстраляны фашыстамі.

ЗЫШЧУК Мікалай Іванавіч.

ПАНАСЮК Карп Дарафеевіч.

ПАСТУШЫК Надзея.

СІВЕНЬКА Вольга Тарасаўна.

СІВЕНЬКА Мікалай Тарасавіч.

СІВЕНЬКА Надзея Лявонаўна.

СІВЕНЬКА Тарас Іванавіч, н. у 1903.

ТРАЦЮК Ігнат Мікітавіч.

ВЁСКА СТРАДЗЕЧ

АНДРАШУК Павел Мікітавіч, н. у 1905.

БАБРЫКІНА Манефа Мітрафанаўна, н. у 1918.

ГАМАНЮК Іван Максімавіч, н. у 1910.

ГУРЭЦ Пётр Лукіч, н. у 1895, яго дочкі **Вера**, н. у 1925, **Любоў**, н. у 1929.

ГУЧКО Павел Майсеевіч, н. у 1896, яго жонка **Алена Мікітаўна,** н. у 1900, сын **Уладзімір,** н. у 1931.

ЗАЯЦ Васіль Іосіфавіч, н. у 1903, дэпутат сельскага Савета, яго жонка **Вера Якаўлеўна**, н. у 1903, дзеці **Іван,** н. у 1936, **Марыя**, н. у 1931, **Мікалай,** н. у 1929, **Таццяна**, н. у 1936, **Рыгор**, н. у 1941, **Уладзімір**, н. у 1940.

ЗІНОВІЙ Іван, н. у 1908.

ІВАНЕЦ Якаў Максімавіч, н. у 1896, дэпутат Страдзецкага сельсавета, яго жонка **Кацярына Піліпаўна**, н. у 1899, іх дзеці **Уладзімір,** н. у 1922, **Вера**, н. у 1929, **Анатоль**, н. у 1931, **Іван,** н. у 1930.

ІОВІК Міхаіл Сцяпанавіч, н. у 1904, яго жонка **Вера Міхайлаўна,** н. у 1913, іх дзеці **Мікалай,** н. у 1929, **Пётр**, н. у 1931, **Марыя,** н. у 1934, **Сцяпан,** н. у 1934, **Уладзімір,** н. у 1941.

ІСАЕНКА Фядосся Мітрафанаўна, н. у 1911, дзеці **Ніна**, н. у 1934, **Валянціна,** н. у 1940.

КАЗМІРУК Антон Аляксеевіч, н. у 1908, яго жонка **Еўдакія Міхайлаўна**, н. у 1910, іх дзеці **Уладзімір,** н. у 1934, **Марыя,** н. у 1941.

КАНЮШЫК Міхаіл Раманавіч, н. у 1918.

КАРАЛЮК Аляксей Данілавіч, н. у 1895, яго жонка **Дамініка Іванаўна**, н. у 1895, іх дзеці **Аляксей,** н. у 1918, **Сцяпан,** н. у 1932, **Марыя,** н. у 1936.

З успамінаў Настассі Аляксееўны Шайко (Каралюк), жыхаркі в. Страдзеч

Гэта здарылася позняй восенню 1943 г. Ужо лёг першы снег. Вёску акружылі карнікі, пачалі збіраць па спісе жыхароў. Прыйшлі і да нас. Перад гэтым забралі

Помнік ахвярам фашызму ў в. Прылукі.

П.А.Грахольская.

ў Дамачаве майго бацьку Аляксея Данілавіча. Ён працаваў да вайны ў сельпо. Тады сям'ю не чапалі. У гэты раз усіх сабралі ў пакоі. Брат Мікалай памкнуўся схавацца на гарышчы. Яго вярнулі.

У зручны момант мае браты Мікалай, Павел, Пётр выскачылі ў акно. Пазней яны пайшлі ў партызаны. За імі выскачыў і малодшы Сцяпан. Ён схаваўся ў хляве суседа. Але па слядах на снезе яго знайшлі.

Усіх, хто быў у спісах, сабралі ў адно месца, загадалі капаць яму. А пасля пастралялі. У той дзень не стала маёй маці, сястры і брата.

Пастраляўшы людзей, карнікі паехалі, пакінуўшы магілу адкрытай. Жыхары самі ўжо закапалі целы нябожчыкаў. Кажуць, кроў цюрчэла раўчукамі.

Я толькі выйшла замуж, баялася, што прыедуць і за мной, таму памяняла прозвішча.

КАРАЛЮК Павел Мікітавіч, н. у 1890, дэпутат сельскага Савета.

КАРАЛЮК Уладзімір Данілавіч, н. у 1905, старшыня калгаса.

СЕМЯНЮК Аляксей Мікітавіч, н. у 1896, яго жонка **Марыя Лаўрэнцьеўна**, н. у 1897, іх дзеці **Мікалай**, н. у 1926, **Міхаіл**, н. у 1929, **Васіль**, н. у 1932.

СЕМЯНЮК Емяльян Васільевіч, н. у 1894, яго жонка **Акуліна Раманаўна**, іх дзеці **Сцяпан**, н. у 1929, **Васіль**, н. у 1932, **Іван**, н. у 1934.

СЯМЁНАВА Хрысціна, н. у 1872.

ХВІСЮЧЫК Мікіта Акімавіч, н. у 1902, яго жонка **Акуліна**, н. у 1903, іх дзеці **Мікалай**, н. у 1927, **Канстанцін**, н. у 1929, **Марыя**, н. у 1931, **Сцяпан**, н. у 1936.

ЧАМАЙЛА Піліп Іванавіч, н. у 1904, яго жонка **Ганна Максімаўна**, н. у 1904, дзеці **Пётр**, н. у 1927, **Іван**, н. у 1934, **Канстанцін**, н. у 1942.

ЧАМАЙЛА Майсей Мікітавіч, н. у 1896.

ШМОЦ Лявонцій Емяльянавіч, н. у 1896, яго жонка **Марыя Архіпаўна**, н. у 1898, іх дзеці **Аўдоцця**, н. у 1926, **Ганна**, н. у 1936, **Уладзімір**, н. у 1940.

ШЧОГАЛЕВА Клаўдзія Іванаўна, н. у 1916, дзеці **Ліза**, н. у 1939, **Уладзімір**, н. у 1940.

ЮРАВА Серафіма Андрэеўна, н. у 1918, дачка **Алена**, н. у 1940.

ДАМАЧАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГРАХОЛЬСКАЯ П.А., выхавацельніца Дамачаўскага дзіцячага дома, расстраляна разам з дзецьмі ў верасні 1942.

* * *

БАРЛАС Ісраэл, н. у 1928.
БАРЛАС Майсей, н. у 1916.
БАРЛАС Мірон, н. у 1922.
БАРЛАС Пейша, н. у 1887.
БАРЛАС Сендэр, н. у 1914.
БАРЛАС Хаім, н. у 1936.
БАРЛАС Цына, н. у 1930.
БАРЛАС Янкель, н. у 1882.
БАЦМХОЛЦ Іосіф, н. у 1930.
БАЦМХОЛЦ Люба, н. у 1892.
БАЦМХОЛЦ Райца, н. у 1927.
БАЦМХОЛЦ Хаім, н. у 1897.
БАЦМХОЛЦ Хаім, н. у 1934.
БЕНДЗЕР Герш, н. у 1898.
БЕНДЗЕР Лея, н. у 1926.
БЕНДЗЕР Нухім, н. у 1932.
БЕНДЗЕР Фрэйдла, н. у 1907.
БЕНДЗЕР Шэйма, н. у 1928.
ВАССЕРМАН Лейзер, н. у 1884.
ВАССЕРМАН Эста, н. у 1887.
ВАРТМАН Люба, н. у 1894.
ВАРТМАН Майсей, н. у 1901.
ГАРСЕКМАН Барыс, н. у 1920.
ГАРСЕКМАН Геня, н. у 1934.
ГАРСЕКМАН Іосіф, н. у 1923.
ГАРСЕКМАН Мірон, н. у 1925.
ГАРСЕКМАН Райца, н. у 1920.
ГАРСЕКМАН Фаня, н. у 1922.
ГРУМШПАН Барыс, н. у 1887.
ГРУМШПАН Геня, н. у 1937.
ГРУМШПАН Інда, н. у 1887.
ГРУМШПАН Лейба, н. у 1930.
ГРУМШПАН Мітон, н. у 1927.
ГРУМШПАН Міхаіл, н. у 1937.
ГРУМШПАН Міхаліна, н. у 1927.
ГРУМШПАН Міхля, н. у 1926.
ГРУМШПАН Роза, н. у 1934.
ГРУМШПАН Сара, н. у 1932.
ГРУМШПАН Таля, н. у 1901.
ГРУМШПАН Фаня, н. у 1928.
ГРУМШПАН Эстула, н. у 1925.
ГРУМШПАН Барыс, н. у 1919.
ГРУМШТАЙН Вельвель, н. у 1925.
ГРУМШТАЙН Міхаэл, н. у 1923.
ГРУМШТАЙН Міхля, н. у 1930.
ГРУМШТАЙН Рухля, н. у 1927.
ГРУМШТАЙН Рыгор, н. у 1889.
ГРУМШТАЙН Таўба, н. у 1885.

ГУТЭРМАН Іра, н. у 1897.
ГУТЭРМАН Калман, н. у 1890.
КАВАЛЕРАВА Дзіна.
КАВАЛЕРАВА Эма.
КАМЯНЕЦКАЯ Бэла, н. у 1930.
КАМЯНЕЦКАЯ Ганна, н. у 1921.
КАМЯНЕЦКАЯ Хаіна, н. у 1884.
КАМЯНЕЦКІ Іцка, н. у 1934.
КАМЯНЕЦКІ Янкель, н. у 1892.
ЛІЗГАРТЭН Бэла, н. у 1912.
ЛІЗГАРТЭН Лейба, н. у 1891.
ЛІЗГАРТЭН Сара, н. у 1923.
ЛІЗГАРТЭН Эстума, н. у 1916.
ПАДЛУЖСКАЯ Фейга, н. у 1892.
ПАДЛУЖСКАЯ Ханка, н. у 1917.
ПАДЛУЖСКІ Іосіф, н. у 1887.
ПАДЛУЖСКІ Янкель, н. у 1927.
ПАМЕРАНЕЦ Хэля.
РАГАЛЬСКАЯ Хаца.
РАУЗЕЦ Іра, н. у 1935.
РАУЗЕЦ Ісраэл, н. у 1884.
РАУЗЕЦ Майер, н. у 1925.
РАУЗЕЦ Молій, н. у 1916.
РАУЗЕЦ Цыля, н. у 1914.
РАУЗЕЦ Эста, н. у 1887.
РАУЗЕЦ Эста, н. у 1918.
ТРОІК Фелікс.
ФІШМАН Жэня, н. у 1919.
ФІШМАН Іольку, н. у 1884.
ФІШМАН Іцхак, н. у 1918.
ФІШМАН Мацке, н. у 1921.
ФІШМАН Хапна, н. у 1887.
ФЛЕЙШМАН Арон, н. у 1887.
ФЛЕЙШМАН Бэла, н. у 1904.
ФЛЕЙШМАН Бэла, н. у 1931.
ФЛЕЙШМАН Ганна, н. у 1902.
ФЛЕЙШМАН Пейсах, н. у 1902.
ФЛЕЙШМАН Сара, н. у 1927.
ФЛЕЙШМАН Шэпсель, н. у 1927.
ФРЭНКЛАХ-БАБРОВА Дзіна.
ФРЭНКЛАХ-БАБРОВА Лена.
ФРЭНКЛАХ-БАБРОВА Эма.
ФРЭНКЛАХ-БАБРОЎ Барыс.
ХЮНТЭНШНАЙДЭР Бэла, н. у 1920.
ХЮНТЭНШНАЙДЭР Завель, н. у 1893.
ХЮНТЭНШНАЙДЭР Майсей, н. у 1938,
ХЮНТЭНШНАЙДЭР Рухля, н. у 1926.
ХЮНТЭНШНАЙДЭР Сара, н. у 1897.
ХЮНТЭНШНАЙДЭР Цыма, н. у 1928.
ЧАРНЯЎСКАЯ Марылен.
ЧАРНЯЎСКІ Рома.
ШАХМЕТАВА Яўгенія Ігнацьеўна.
ШНЭЙДЭРМАН Абрам, н. у 1915.
ШНЭЙДЭРМАН Герш, н. у 1887.
ШНЭЙДЭРМАН Герш, н. у 1925.
ШНЭЙДЭРМАН Рухля, н. у 1887.
ШНЭЙДЭРМАН Янкель, н. у 1923.

ВЁСКА БАРЫСЫ

СКАКУН Сцяпан Іванавіч, н. у 1908, страшыня калгаса.

ЯКІМУК Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1903, яго жонка **Матрона Барысаўна**, н. у 1904, іх дзеці **Яўгенія**, н. у 1930, **Ніна**, н. у 1935, **Васіль**, н. у 1938, **Міхаіл**, н. у 1939, закатаваны ў 1943.

ВЁСКА ГУТА

КАЧАЛОЎСКАЯ Агафія Фёдараўна, н. у 1889, расстраляна ў 1942.

ЛАХМІЦКАЯ Ксенія Пярфілаўна, н. у 1878, расстраляна ў 1942.

ЛАХМІЦКІ Андрэй Пярфілавіч, н. у 1906, расстраляны ў 1942.

ЛАХМІЦКІ Фёдар Пярфілавіч, н. у 1916, расстраляны ў 1942.

РАБАЯ Галіна Міхайлаўна, н. у 1901, расстраляна ў 1942.

ВЁСКА ДУБОК

БАЦЮК Іван Аляксеевіч, н. у 1919, расстраляны ў 1942.

ВАСІЛЮК Іван Паўлавіч, н. у 1919, расстраляны ў Дамачаве ў 1942.



Помнік ахвярам фашызму ў в. Тамашоўка.

ВАСІЛЮК Наталля Іванаўна, н. у 1923.

ГАЛАЛЮК Піліп Іванавіч, н. у 1884.

ГАЮК Мікіта Іванавіч, н. у 1893, расстраляны 26 красавіка 1944.

ГАЮК Сяргей Пятровіч, н. у 1906.

ДЗЕНІСЮК Алена Цімафееўна, н. у 1900.

ДЗЕНІСЮК Васіль Іванавіч, н. у 1918.

КАЗЯРУК Фядора Данілаўна, н. у 1900, яе дзеці **Мікалай,** н. у 1926, **Настасся,** н. у 1928, расстраляны за ратаванне партызана.

КАРВАТ Гаўрыла Іванавіч, н. у 1884, яго жонка **Ефімія**, н. у 1884, іх сын **Раман Гаўрылавіч**, н. у 1906, нявестка **КАРВАТ Таццяна Цімафееўна**, н. у 1907.

КАРВАТ Даніла Сцяпанавіч, н. у 1902, яго жонка **Еўдакія Сямёнаўна**, н. у 1900, іх дачка **Кацярына**, н. у 1926.

КАРВАТ Іван Паўлавіч, н. у 1889.

КАРВАТ Ігнат Ігнатавіч, н. у 1902, яго жонка **Марыя Нікіфараўна**, н. у 1903, іх дзеці **Дзмітрый**, н. у 1928, **Марыя,** н. у 1929, **Вера**, н. у 1931, **Ніна**, н. у 1933, **Лідзія**, н. у 1936, бацьку расстралялі ў 1942 у Дамачаве, сям'ю таксама ў 1942.

КАРПУК Антон Аксенцьевіч, н. у 1905.

З успамінаў дачкі Марыі Антонаўны Ганжа (Карпук), жыхаркі вёскі Чэрск

Вясной 1944 года наша сям'я жыла ў зямлянцы ў лесе непадалёку ад лагера партызан. Зямлянку выкапаў мой бацька, склаў печ. Прывезлі ў лес жорны і малолі на муку жыта. У вёсцы ў хляве засталіся карова і 16 авечак. Бацька паехаў забраць авечкі, але сусед залез праз страху, адчыніў хлеў і выпусціў іх, аддаў немцам.

Я даіла карову, і тут мы дазналіся, што немцы робяць аблаву. Бацька стаў уцякаць. Як на грэх у суседкі сарвалася з вяроўкі карова, і ён хацеў дапамагчы загнаць яе ў хлеў. У гэты момант яго і застрэлілі.

Мы доўга не маглі пахаваць бацьку, бо адбылася сутычка немцаў з партызанамі. У той сакавіцкі дзень многа пабілі людзей.

КАРПЮК Сцяпан, н. у 1903.

КАРАНЧУК Аляксандр Васільевіч, н. у 1902, яго жонка **Кацярына Маркаўна**, н. у 1906, іх дзеці **Аляксей**, н. у 1928, **Фёдар**, н. у 1929, **Пётр**, н. у 1931, **Уладзімір**, н. у 1932, **Яўгенія**, н. у 1934, **Ганна**, н. у 1936, **Ніна**, н. у 1938, расстраляны ў 1942.

КАРАНЧУК Мікіта Якаўлевіч, н. у 1910, яго жонка **Варвара,** н. у 1908, іх дзеці **Іван,** н. у 1934, **Васіль**, н. у 1937, гаспадара закатавалі ў Дамачаве, а жонку з дзяцьмі расстралялі ў верасні 1942.

КАРАНЧУК Якаў Дзмітрыевіч, н. у 1903, расстраляны каля хаты ў 1944.

З успамінаў Ганны Іванаўны Пішчук (Уласюк), жыхаркі в. Дубок

У нашу вёску часта наведваліся немцы і партызаны. Па падазрэнні ў сувязі з імі фашысцкія каты некалькі разоў праводзілі аблавы на жыхароў, і хто трапляў пад гарачую руку — расстрэльвалі.

Вось і ў той чорны дзень у вёску наляцелі фашысты. Мяне дома не было. Звычайна мы хаваліся, стараліся адсядзецца ў родзічаў.

Калі я вярнулася ў свой двор, то жахнулася. На агародзе кучай ляжалі расстраляныя сем'і суседзяў, знаёмых. Тады расстралялі сям'ю Мікіты і Варвары Каранчукоў, Рамана Карвата і многіх іншых старых людзей і дзяцей. Каля 26 чалавек загубілі каты. Кроў маленькімі ручаямі цякла па агародзе. Родзічы пахавалі забітых на могілках. Да гэтай пары не магу забыць той дзень. А адбылася трагедыя, відаць, вясной 1943 года.

ПІШЧУК Іван Паўлавіч, расстраляны ў Дамачаве ў 1942, яго жонка **Наталля Іванаўна** была цяжарная, немец выстраліў ёй у жывот.

ПІШЧУК Іван Раманавіч, н. у 1923.

ПІШЧУК Таццяна Якімаўна, н. у 1882.

ПІШЧУК Цімафей Аляксандравіч, н. у 1903.

УЛАСЮК Аляксей Савіч, н. у 1913, яго жонка **Соф'я Трафімаўна,** н. у 1914, іх дачка **Марыя,** расстраляны ў верасні 1942.

УЛАСЮК Кірыла Аляксандравіч, н. у 1895.

УЛАСЮК Савелій Анісімавіч, н. у 1876, яго жонка **Макрына Данілаўна**, н. у 1889, іх дзеці **Іван,** н. у 1914, **Сяргей**, н. у 1923.

ХАМІЧУК Фама Рыгоравіч, н. у 1878, яго жонка **Васіліса Нікіфараўна**, н. у 1881, іх дзеці **Фёдар,** н. у 1909, **Міхаіл**, н. у 1912, расстраляны каля хаты.

ШЫШКО Максім Ільіч, н. у 1881.

ВЁСКА КАБЁЛКА

АЎДЗЯЮК Іван Іосіфавіч, н. у 1906, забіты 22 чэрвеня 1941.

З успамінаў Мікалая Іванавіча Цярэшкі, жыхара в. Кабёлка (было 11 гадоў)

Я добра памятаю першы дзень вайны. Немцы раніцай ужо былі ў вёсцы. Дзенідзе ім аказвалі супраціўленне. Першыя часці прайшлі. За імі ўжо рухаліся немцы больш спакойна. Памятаю, каля хаты Аўдзеюка расло жыта. З яго раздаўся

адзіночны стрэл. Нямецкі афіцэр упаў. А тут з хаты, як на бяду, выйшаў Іван Аўдзяюк. Яго расстралялі ва ўпор.

ШАЎЧУК Уладзімір Іванавіч, н. у 1928, падарвася гранатай у 1944.

ВЁСКА ЛІПІНКІ

ГАЛЯКА Сільвестр Мартынавіч, н. у 1923, расстраляны ў 1942, яго жонка **Усціння Рыгораўна,** н. у 1925, і сын.

Загінулі ў час дыверсіі на чыгунцы каля ст. Дубіца ў 1942 г.:

ДАРАШУК Аляксей Захаравіч, н. у 1925.
ЦЯРЭШКА Іван Дзмітрыевіч, н. у 1920.
ЦЯРЭШКА Сцяпан Паўлавіч, н. у 1925.

ВЁСКА ЛЯПЛЁЎКА

БАГЛАЙ Аляксандр Емяльянавіч, н. у 1894.
БАРЫСЮК Праскоўя Пятроўна, н. у 1895.

З успамінаў Міхаіла Іванавіча Барысюка, удзельніка вайны, жыхара в. Ляплёўка

У той дзень, калі здарылася трагедыя, я працаваў у Брэсце на чыгунцы. Прыехаў вечарам да хаты, і мне расказалі, як загінула мая маці.

У час аблавы многія жыхары імкнуліся ўцячы, бо ўжо ведалі, чым усё канчаецца. Маці з дачкой — маёй сястрой — кінуліся ад хаты ў жыта. Але кулямётная чарга перарэзала яе цела. Параніла і сястру.

ВІРЧЫК Праскоўя Яўстаф'еўна.

ІГНАЦЮК Фёдар Еўдакімавіч, н. у 1900, яго жонка **Ганна Яўстаф'еўна**, н. у 1898, іх дзеці **Іван**, н. у 1923, **Марыя**, н. у 1926, **Вера,** н. у 1930, **Аляксандр,** н. у 1940. Уся сям'я была расстраляна ў верасні 1942, а бацька і сын **Іван** павешаны на бярозе каля клуба ў вёсцы за агітацыю супраць нямецкай арміі. Пахавалі каля чыгункі.

ІГНАЦЮК Якаў Еўдакімавіч, н. у 1902.

ІГНАЦЮК Яфім Еўдакімавіч, н. у 1908, яго жонка **Марыя**, н. у 1906, іх дачка **Надзея**, н. у 1935.

КАЛЮХОЎСКІ Дзям'ян Максімавіч, н. у 1890, яго жонка **Марыя Нікіфараўна**, н. у 1892.

КАСЦЮЧЫК Іван Лявонцьевіч, н. у 1903, яго жонка **Фядосся Рыгораўна**, іх дзеці **Вера**, н. у 1925, **Рыгор**, н. у 1930, **Надзея**, н. у 1938, расстраляны 8 снежня 1942.

КАСЦЮЧЫК Васіль Рыгоравіч, н. у 1905.

ЛЯЎЧУК Васіль Яўстаф'евіч, н. у 1906.

ЛЯЎЧУК Праскоўя Яўстаф'еўна, н. у 1892.

МАРТЫНЮК Антон, н. у 1874, спалены жывым пасля нападу партызан на немцаў каля в. Збунін.

МАРТЫНЮК Фядосся Антонаўна, н. у 1898, яе дачка.

МЕЛЯНЮК Ганна Данілаўна, н. у 1928, кінута карнікамі жывой у агонь вясной 1942.

МЕЛЯНЮК Сцяпан Варфаламеевіч, н. у 1893, яго жонка **Еўдакія**, н. у 1898, іх дзеці **Іван**, н. у 1924, **Наталля**, н. у 1928, **Аляксандр**, н. у 1928, расстраляны 8 снежня 1942.

НІКАЛАЮК Кірыла Аляксандравіч, н. у 1908, прафсаюзны актывіст, яго жонка **Еўдакія,** н. у 1916, іх дзеці **Надзея**, н. у 1941, **Ніна**, н. у 1942, маці Кірылы Аляксандравіча **Аляксандра Фёдараўна**.

НІКАЛАЮК Пётр Георгіевіч, н. у 1913, яго жонка **Дамяніка Дзям'янаўна**, н. у 1912.

НІКАЛАЮК Сцяпан Георгіевіч, н. у 1908, яго жонка **Ганна Фадзееўна,** н. у 1908, іх сын **Іван,** н. у 1934.

ПАНАСЮК Іван Раманавіч, н. у 1908, арыштаваны за сувязь з партызанамі, расстраляны ў брэсцкай турме.

ПОЛЮХ Мікалай Іванавіч, н. у 1908, быў арыштаваны як савецкі актывіст, адпраўлены ў брэсцкую турму, адтуль не вярнуўся, яго жонка **Лізавета**



Помнік на магіле ахвяр фашызму ў в. Вялікія Радванічы.

Васільеўна, н. у 1915, іх дзеці **Марыя,** н. у 1938, **Міхаіл,** н. у 1940, расстраляны ў 1942.

СІМАНЮК Андрэй, н. у 1872, **Марыя**, н. у 1882.

СІМАНЮК Ганна, н. у 1890, **Наталля**, н. у 1863, спалены карнікамі.

ТЫЦЫК Фёдар, н. у 1914, яго жонка **Вольга Фёдараўна**, н. у 1919, іх сын **Іван**, н. у 1937.

ХАМІЧУК Марыя, н. у 1895.

ЦЯРЭШКА Андрэй Маркавіч, н. у 1917, яго маці **Акуліна**, н. у 1874.

МІКАЛАЙ (прозвішча невядома), н. у 1922, рускі, у час баёў трапіў у палон да немцаў, уцёк і хаваўся ў вёсцы. Расстраляны разам з сялянамі.

ВЁСКА НАВАСАДЫ

КАНАШУК Мірон, яго жонка **Паўліна,** іх сын **Іван**, расстраляны за сувязь з партызанамі.

САВІЦКАЯ Зінаіда Мікалаеўна, настаўніца, расстраляна ў брэсцкай турме.

ВЁСКА ПАДЛУЖЖА

ГАЛАЛЮК Рыгор Лукіч, н. у 1896, яго жонка **Хаўроння Лукінічна,** н. у 1899, іх дзеці **Павел,** н. у 1926, **Іван**, н. у 1926, **Мікалай**, н. у 1930, **Уладзімір**, н. у 1934, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ГАНЖА Арцём Міхайлавіч, н. у 1900, яго жонка **Лізавета**, н. у 1895, іх дзеці **Вольга,** н. у 1929, **Ніна**, н. у 1939, за уцёк бацькі з-пад арышту ўся сям'я расстраляна.

ГАРАХ Аляксей Емяльянавіч, расстраляны партызанамі.

МАШЧУК Іосіф Міхайлавіч, яго жонка **Ганна Пятроўна**, іх дачка **Марыя**, расстраляны за сувязь з партызанамі.

МЕЛЯНЮК Таццяна Іванаўна, н. у 1881.

МЕЛЯНЮК Фядосся Аляксандраўна, н. у 1899, яе дачка **Марыя**, н. у 1930.

З успамінаў Ганны Фамінічны Лялькі (Дземідзюк), жыхаркі вёскі Падлужжа

Гэта было вясной на рэлігійнае свята Алексія. Раніцай хату солтыса нашай вёскі Аляксандра Меленюка акружылі фашысты і закідалі гранатамі.

У падполлі сям'я хавала былых пагранічнікаў. Іх было шасцёра. Яны доўга жылі. Нехта выдаў. Пасля мы бачылі іх целы, якія выцягнулі са склепа.

Гаспадару ўдалося ўцячы. Пазней ён загінуў у партызанах. Яго жонку Фядоссю прывязалі вяроўкай да бярозы. І пакуль хата гарэла, яна была прывязана. Пазней жонку з дачкой забралі ў Дамачава і расстралялі, а маці, Таццяну Іванаўну, забралі праз месяц і забілі.

ПАЛЯШЧУК Павел Дзям'янавіч, н. у 1913, яго маці **Кацярына Сцяпанаўна**, н. у 1899, жонка **Таццяна Фамінічна,** н. у 1910, іх дзеці **Аляксей, Уладзімір**, н. у 1939, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ПОЛЮХ Еўдакім Арцёмавіч, н. у 1891, яго жонка **Марыя Аляксандраўна**, н. у 1894, іх дзеці **Васіль**, н. у 1924, **Надзея**, н. у 1927, **Лідзія,** н. у 1929, расстраляны за адказ Лідзіі ехаць у Германію.

СВІСТУН Варвара, н. у 1904, маці мужа **Акуліна,** н. у 1880, дзеці **Іван**, н. у 1925, **Вера,** н. у 1928, **Марыя,** н. у 1932, **Аляксей**, н. у 1936, расстраляны за тое, што гаспадар пайшоў у партызаны.

ВЁСКА РУДНЯ

ГАЛАЛЮК Пракоп Георгіевіч, расстраляны за сувязь з партызанамі, якім рамантаваў і шыў абутак.

ЛЁДВІГ Крыся, палячка, расстраляна з дзіцем каля хаты, перазахавана на могілкі ў в. Чэрск.

ВЁСКА ЧЭРСК

БАГЛАЙ Антон Ерафеевіч, н. у 1896, яго жонка **Пелагея Сямёнаўна**, н. у 1896.Гаспадар арыштаваны і закатаваны ў брэсцкай турме, яго дзеці **Рыгор**, н. у 1922, **Міхаіл**, н. у 1926, расстраляны.

БАГОНСКАЯ Марфа Емяльянаўна, н. у 1914.

ГАЛАЛЮК Адам Лявонцьевіч, н. у 1923, яго сястра **Ева Лявонцьеўна**, н. у 1926, зводны брат **ГАЛАЛЮК Пракоп,** н. у 1917.

ГАЛАЛЮК Макрэнія Рыгораўна, н. у 1886.

ГАЛАЛЮК Іван Антонавіч, н. у 1899, і **МЕЛЯНЮК Васіль Гаўрылавіч,** н.у 1904, запісаліся ехаць у Германію, з Брэста іх вярнулі і расстралялі ў Дамачаве.

ГАНЖА Фама Лукіч, н. у 1905, расстраляны ў 1942 у Брэсце.

ГЕРАСІМЧУК Фама Кандратавіч, н. у 1916, арыштаваны і расстраляны ў Дамачаве, яго жонка **Варвара Васільеўна,** н. у 1922, з дзіцем.

ДЗЕНІСЮК Мірон Пятровіч, н. у 1876.

КАРНЯЛЮК Нікіфар.

КАРПІЦКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1910, старшыня Чэрскага сельсавета, яго жонка **Матрона**, н. у 1909, маці **Ганна Паўлаўна**, дачка **Таццяна**, н. у 1935.

КАЧАЛОЎСКІ Барыс Паўлавіч, н. у 1899, расстраляны ў Дамачаве.

КВЯТКОЎСКІ Іосіф Антонавіч, н. у 1884, яго жонка Наталля, н. у 1889, забіты за слуханне радыёпрыёмніка.

МАЛЕВІЧ Казімір, паляк, жыў з сям'ёй на хутары, меў сувязь з партызанамі, яго жонка **Соф'я Іосіфаўна,** дзеці **Болек, Уладзік, Янка.**

З успамінаў Фёдара Паўлавіча Сцепанюка, жыхара вёскі Чэрск (было 14 гадоў)

Я пасвіў кароў і мяне паслаў Фёдар Харс (ён быў нейкі чын пры немцах) на

хутар да Малевічаў прынесці літар самагонкі. На хутар я прыбег, калі гаспадары яшчэ спалі. Разбудзіў іх, сказаў, што мне загадалі. Жонка Казіміра занепакоілася, хуценька падняла мужа і стала будзіць дзяцей. Відаць, гэта быў умоўны сігнал.

Але нікуды яны не паспелі ўцячы. Пад'ехала аўтамашына. У хату ўвайшлі немцы з солтысам. Надзелі наручнікі на гаспадара і яго жонку. Мяне спыталі: «Чаго прыйшоў?». Я пачаў плакаць, гаворачы, што згубіў карову і шукаю. Малевічаў з дзецьмі павялі за хату, а мне сказалі ісці адсюль.

Не паспеў я адысці далёка, як прагучаў стрэл. Я ўпаў на зямлю, думаючы, што страляюць па мне. Яшчэ некалькі разоў стрэлілі. Там каля хаты ўсю сям'ю і закапалі.

Засталася ў жывых родная сястра Казіміра. Яе не было ў той час. А магілка і цяпер ёсць. Помнік патрэбен. Але ж хто яго паставіць?

САВАСЦЮК Пелагея, н. у 1889.
ХАРС Фёдар Іванавіч, н. у 1898.

ЗНАМЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДУБРОВА

ЛЯЎЧУК Антон Венядзіктавіч, яго жонка **Марыя Васільеўна**, забіты гітлераўцамі.

ВЁСКА ЗБУНІН

ВАЎРАНЮК Георгій Дзмітрыевіч, н. у 1922.
ГАПАНЮК Аграфена, н. у 1865.
ГАПАНЮК Іван Данілавіч, н. у 1885, яго жонка **Ганна Пракопаўна**, н. у 1886.
ГАПАНЮК Марыя Маркаўна, н. у 1922.
ГАПАНЮК Мікалай Якаўлевіч, н. у 1936.
ГАПАНЮК Фёдар Аляксеевіч, н. у 1936.
ГАПАНЮК Фёдар Антонавіч, н. у 1882.
ДЗЕМІДЗЮК Фядосся Карнілаўна, н. у 1902.
ДЗЕМІДЗЮК Мікалай Іосіфавіч, н. у 1940.
КАСЦЮЧЫК Сцяпан Лявонцьевіч, н. у 1900, яго сын **Мікалай**, н. у 1940.
ЛЯВАЙ Малання, н. у 1880.
ЛЯВАЙ Цімафей Міхайлавіч, н. у 1908.
ЛЯВАЙ Цімафей Пятровіч, н. у 1888.
СКАЎРОНСКІ Уладзімір, н. у 1936.
ТАРНОЎСКІ Іван Касьянавіч, н. у 1908, яго жонка **Агаф'я Максімаўна**, н. у 1907.
ЯРМАШУК Пётр Цімафеевіч, н. у 1925, забіты асколкам снарада 22 чэрвеня 1941.



Мемарыяльная пліта на магіле ахвяр фашызму ў в. Медна.

ВЁСКА МЕДНА*

22 чэрвеня 1941 г. загінулі ў час нямецкага абстрэлу вёскі:

ВАСІЛЮК Герасім Пятровіч.
МІХАЛЬЧУК.
МІХАЛЮК Ганна Рыгораўна.
МІХАЛЮК Рыгор Антонавіч.
ПЕКУН Наталля Рыгораўна.
ЦЯЛЕПКА Вольга.

Восенню 1942 г. фашыстамі расстраляны:

ВАСІЛЮК Надзея Кірылаўна, н. у 1907, расстраляна ў брэсцкай турме.
КАРНЯЛЮК Зінаіда Пракопаўна, н. у 1867.
СТАНЧУК Ульяна Іванаўна.
СТАНЧУК Яфімія Антонаўна, н. у 1907, жонка партызана.
УХАЛЮК Зінаіда Пракопаўна.

Расстраляны ў Дамачаве:

ЗАХОЖАЯ Антаніна Мацвееўна, н. у 1924.
КЛІМУК Максім Аляксеевіч, н. у 1900.
ПЕКУН Мікіта Аляксеевіч.
РАДЧУК Уладзімір Сідаравіч, н. у 1900.
ТАБАЛА Сямён Макаравіч, н. у 1925.

Позняй восенню 1942 г. расстраляны:

МАРОЗ Сідар Васільевіч, н. у 1881, яго жонка

* Акрамя матэрыялаў Дзяржархіва Брэсцкай вобласці выкарыстаны напрацоўкі Пятра Карабейкі.

Малання Мікітаўна, н. у 1883, іх дзеці **Настасся,** н. у 1908, **Васіль,** н. у 1910, нявестка **Ганна Данілаўна,** н. у 1905, дзеці **Дзмітрый,** н. у 1938, **Канстанцін**, н. у 1940, **Сцяпан**, н. у 1941. Разам з сям'ёй Марозаў расстралялі каля школы настаўніцу з в. Страдзеч.

ЯРАШУК Аксенцій Майсеевіч, н. у 1908, яго жонка **Ульяна Еўдакімаўна**, н. у 1908, іх дзеці **Іван**, н. у 1932, **Надзея**, н. у 1930, **Мікалай**, н. у 1935, **Дзмітрый,** н. у 1937, **Сцяпан,** н. у 1936, **Сямён**, н. у 1938, **Павел,** н. у 1940. Расстраляны за ст. лейтэнанта Жданава Дзмітрыя Фёдаравіча, які ўцёк з канцлагера каля Маларыты. Сяляне вёскі адмовіліся пазнаць забітага.

На світанні 1 сакавіка 1943 г. карны атрад фашыстаў акружыў і падпаліў вёску. 126 сялян, сагнаных у пуню, па адным расстрэльвалі каля загадзя выкапанай ямы.

ВАСІЛЮК Еўдакім Васільевіч, н. у 1885, яго жонка **Харыціна Міхайлаўна,** дзеці **Вольга**, н. у 1932, **Ганна**, н. у 1930, **Еўдакія**, н. у 1927, **Пётр**, н. у 1922.

ВАСІЛЮК Надзея Майсееўна.

ГАПАНЮК Якаў Цімафеевіч.

ДАРАШУК Дзяніс Арцёмавіч, н. у 1899, яго жонка **Ксенія Мацвееўна**, н. у 1899, іх дзеці **Мікалай**, н. у 1932, **Марыя**, н. у 1934.

ДАРАШУК Емяльян Арцёмавіч, н. у 1907, яго жонка **Ганна Нікіфараўна**, н. у 1905.

ДЫМІНСКІ Пракоп Лук'янавіч, н. у 1909, яго жонка **Аляксандра Аляксандраўна**, н. у 1910.

КАНДРАЦЮК Іван Аляксеевіч, н. у 1913, яго жонка **Наталля Майсееўна**, н. у 1915, іх сын **Мікалай**, забіты снарадам.

КЛІМУК Мікалай Аляксеевіч, н. у 1902.

ЛЯВАЙ Ігнат Ігнатавіч, н. у 1911, яго жонка **Усціння Якаўлеўна,** н. у 1912, маці **Матрона Іванаўна,** н. у 1889.

ЛЯВАЙ Пракоп Мацвеевіч, н. у 1884, яго жонка **Матрона Лук'янаўна**, н. у 1885, іх сын **Іван,** н. у 1925, **Настасся**, н. у 1922.

ЧОРНЫ Іван Мікалаевіч, жыў у сям'і, расстраляны.

ЛЯЎЧУК Агаф'я Аксенцьеўна, н. у 1905.

ЛЯЎЧУК Андрэй Максімавіч, н. у 1906, яго жонка **Агаф'я Раманаўна**, н. у 1902, іх дзеці **Ганна,** н. у 1929, **Вольга, Мікалай**, н. у 1930.

ЛЯЎЧУК Максім Аляксеевіч.

ЛЯЎЧУК Марыя Андрэеўна.

ЛЯЎЧУК Таццяна Майсееўна.

ЛЯЎЧУК Фёдар Максімавіч, н. у 1910, яго жонка **Ульяна Іванаўна,** н. у 1914, дзеці **Дзмітрый**, н. у 1934, **Іван,** н. у 1932, **Кацярына**, н. у 1941, **Марыя,** н. у 1940, **Сцяпан**, н. у 1938.

МАКСІМУК Іван Марцінавіч.

ПАЛЯШЧУК Мікалай Савельевіч, н. у 1914, яго жонка **Марфа Дзянісаўна**, н. у 1916.

ПАНАСЮК Настасся Карпаўна, н. у 1915.

ПАНАСЮК Сямён Андрэевіч, н. у 1872, яго жонка **Малання Мацвееўна**, н. у 1874, дзеці **Сямён,** н. у 1919, **Марыя, Сцяпан.**

ПАРХІМУК Ганна Аляксееўна, н. у 1908.

ПАРХІМУК Еўдакія Аксенцьеўна, н. у 1906.

ПАРХІМУК Еўдакія Макараўна, н. у 1917.

ПАРХІМУК Марцін Гардзеевіч, н. у 1887, яго жонка **Матрона Мацвееўна**, н. у 1886, іх сын **Іван**, н. у 1917, **Пётр,** н. у 1929.

ПАРХІМУК Наталля Емяльянаўна, н. у 1892, дзеці **Дзмітрый**, н. у 1925, **Лідзія**, н. у 1927, **Вольга,** н. у 1930.

ПАЦЯЮК Аксіння Саваўна, н. у 1921.

ПАЦЯЮК Настасся Севасцьянаўна, н. у 1925.

ПАЦЯЮК Сямён Севасцьянавіч, н. у 1919.

ПЕКУН Таццяна Міхайлаўна.

РАДЧУК Анатоль Іванавіч.

РАДЧУК Васіль Еўдакімавіч, н. у 1935.

РАДЧУК Надзея Аляксееўна, н. у 1904, маці **Марыя Мікалаеўна**, н. у 1880, дзеці **Макар**, н. у 1913, **Еўдакія,** н. у 1913, **Уладзімір,** н. у 1900.

САЧУК Карп Іванавіч, н. у 1872, яго жонка **Таццяна Іванаўна**, н. у 1871, дачка **Вольга,** н. у 1930.

СТАНЧУК Павел Фёдаравіч, н. у 1896, яго жонка **Алена Іванаўна**, н. у 1898, сын **Мікалай,** н. у 1927.

СТАНЧУК Лук'ян Сцяпанавіч, н. у 1899, яго жонка **Аксіння Дзмітрыеўна**, н. у 1900, іх сын **Дзмітрый,** н. у 1932.

СТАНЧУК Юрый Аляксандравіч.

ФЯДЧУК Сцяпан Сідаравіч, н. у 1912, яго жонка **Агаф'я Еўдакімаўна**, н. у 1914.

ХАРЗА Надзея Максімаўна, н. у 1908.

ЯРАШУК Васіль Нікіфаравіч.

ЯРАШУК Вера Нікіфараўна.

ЯРАШУК Дар'я Апанасаўна, н. у 1896.

ЯРАШУК Гаўрыла Данілавіч, н. у 1914, яго жонка **Хрысціна Арцёмаўна**, н. у 1904, маці **Праскоўя Іванаўна,** н. у 1874.

ЯРАШУК Іван Майсеевіч, н. у 1920, яго жонка **Надзея Лук'янаўна**, н. у 1926, маці **Ганна Пятроўна**, н. у 1884.

ЯРАШУК Іван Мікалаевіч, н. у 1898, яго жонка **Марыя Данілаўна**, н. у 1902.

ЯРАШУК Марфа Мікалаеўна, н. у 1919.

ЯРАШУК Нікіфар Майсеевіч, н. у 1912, яго жонка **Лізавета Максімаўна**, н. у 1913, дачка **Надзея**, н. у 1932.

ЯРАШУК Сава Тарасавіч, н. у 1910, яго жонка **Агрыпіна Іванаўна**, н. у 1910.

У час аблаў былі застрэлены мірныя жыхары:

НАВУМІК Марцін Піліпавіч, н. у 1897.
НАВУМІК Павел Емяльянавіч, н. у 1929.
НІЧЫПАРУК Надзея Пятроўна, н. у 1928.

Загінулі ў час дзвюх бамбёжак вёскі:

МАРОЗ Вольга Сідараўна.

ПАЦЯЮК Ганна Васільеўна.

Загінулі ў пажарышчы ў лютым 1944 г., калі вёску спалілі партызаны:

ПЕКУН Малання Савельеўна.
РАДЧУК Марына Савельеўна.

1 сакавіка 1942 г. разам з жыхарамі вёскі гітлераўцы расстралялі былых чырвонаармейцаў, якія ўцяклі з палону. Прозвішчы апошніх невядомы:

Дзмітрый, н. у 1920.
Лука, н. у 1920.
Мікалай, н. у 1902.
Мікалай, н. у 1911.
Міхаіл, н. у 1920.

У вёсцы былі расстраляны:

Варвара, н. у 1916.
Манефа, н. у 1920.

Расстраляны фашыстамі:

ПАНАСЮК Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1912.
РАДЧУК Марк Майсеевіч, н. у 1875.
СТАНЧУК Рыгор Аляксеевіч, н. у 1917.
УХАЛЮК Аўдоцця Васільеўна, н. у 1897.

ВЁСКА РАГОЗНА

Жыхары вёскі, расстраляныя і закатаваныя ў час некалькіх карных аперацый гітлераўцаў за сувязь з партызанамі. Толькі 16 жніўня 1942 г. загінулі 42 чалавекі:

АСАВЕЦ Аксіння Маркаўна, н. у 1927, яе брат **Уладзімір**, н. у 1929.
АСАВЕЦ Мікалай, н. у 1900.
АСАВЕЦ Павел Дзям'янавіч, н. у 1911.
АСАВЕЦ Рыгор, н. у 1911.
ВАЛЬЧУК Яўхімія, н. у 1888.
ЗАХОЖАЯ Аўдоцця Фёдараўна, н. у 1879.
ЗАХОЖЫ Іван Мікалаевіч, н. у 1895, яго жонка **Аляксандра**, н. у 1896, дзеці **Марыя,** н. у 1920, **Васіль**, н. у 1925, нявестка **Аксіння**, н. у 1922.
ЗАХОЖЫ Сідар Фёдаравіч, н. у 1877.
ЗАХОЖЫ Фёдар, н. у 1925, яго жонка **Аўдоцця**, н. у 1910, дзеці **Таццяна**, н. у 1931, **Мікалай**, н. у 1933, **Аксіння**, н. у 1937, **Сямён**, н. у 1939, **Пётр**, н. у 1941.
КРАСЬКО Рыгор Антонавіч, н. у 1901, солтыс, яго жонка **Дамініка Паўлаўна**, н. у 1905, дзеці **Вольга**, н. у 1927, **Антон,** н. у 1929.
КУНДА Аляксандр, н. у 1890, яго жонка **Марыя,** н. у 1889, дачка **Валянціна,** н. у 1929.
ЛЕВАНДОЎСКІ Браніслаў, н. у 1908, дачка **Марыя**, н. у 1936.
МАРОЗ Раман Іванавіч, н. у 1888, яго жонка **Варвара,** н. у 1888.
ПЕКУН Аўдоцця, н. у 1909, яе сын **Іван,** н. у 1936.
ПЕКУН Тарас, н. у 1880.
ПЯТРОВІЧ Якаў Пракопавіч, н. у 1886, яго жонка **Дар'я Паўлаўна**, н. у 1888, дзеці **Марфа,** н. у 1924, **Ніна**, н. у 1926, **Аўдоцця,** н. у 1930, **Іван,** н. у 1928, **Васіль,** н. у 1938. Гаспадара павесілі пасля цяжкіх катаванняў, жонку і дзяцей расстралялі. Разам з імі загінуў чырвонаармеец **Дзмітрый**, які ўцёк з палону.
СТАНЧУК Емяльян Раманавіч, н. у 1904, яго жонка **Хаўроння Іванаўна,** н. у 1902, дзеці **Аляксей**, н. у 1928, **Мікалай,** н. у 1930, **Вольга**, н. у 1933, **Ніна,** н. у 1940.
УХАЛЮК Сцяпан, н. у 1909.
УХАЛЮК Тарас Фёдаравіч, н. у 1870, яго жонка **Аўдоцця Тарасаўна**, н. у 1895, нявестка **Сцепаніда Пятроўна**, н. у 1912, яе дачка **Надзея**, н. у 1934.
УХАЛЮК Фёдар, н. у 1884.
ХІВУК Васіль Артамонавіч, н. у 1941.
ХІВУК Навум Емяльянавіч, н. у 1854, яго сын **Барыс,** н. у 1901, яго жонка **Ефрасіння**, н. у 1907.
ХІВУК Наталля Патапаўна, н. у 1910, **Таццяна,** н. у 1916, **Дзмітрый**, н. у 1916.
ХІВУК Павел Іосіфавіч, н. у 1876, яго жонка **Агафія,** н. у 1870, расстраляны.
ХІВУК Хрысціна Лявонцьеўна, н. у 1908, дзеці **Палагея,** н. у 1938, **Ніна**, н. у 1939, **Марыя,** н. у 1936, **Фёдар,** н. у 1941.
ЯМЧУК Магдалена, н. у 1887.
ЯМЧУК Марыя, н. у 1938, брат **Васіль,** н. у 1936.

Загінулі ў час бамбардзіроўкі вёскі:

КІРЫЧУН Марыя Цярэнцьеўна, н. у 1929.
ХІВУК Дзмітрый Артамонавіч, н. у 1942.
ХІВУК Іван Майсеевіч, н. у 1915, яго маці **Акуліна**, н. у 1886, расстраляны.

КЛЕЙНІКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Расстраляны за слуханне звестак з Масквы па радыёпрыемніку ў хаце Раманоўскага Франца Рогавіча:

ВЁСКА КЛЕЙНІКІ

РАМАНОЎСКІ Франц Рогавіч, н. у 1900 у в. Церабунь.

ВЁСКА ЦЕРАБУНЬ

ВОЎК Сцяпан Панцялеевіч, н. у 1906.

ВЁСКА ШУМАКІ

БОБЕР Яўгенія Цярэнцьеўна, н. у 1915, падпольшчыца.
ЛЯЎЧУК Іван Гардзеевіч, н. у 1902.
ПАНАСЮК Емяльян Пятровіч, н. у 1887.
ПЕКАР Аляксандр Антонавіч, н. у 1895.
САРОКА Аляксандр Іларыёнавіч, н. у 1907.

ЯКУБЧЫК Рыгор Варфаламеевіч, н. у 1892.

ВЁСКА КОСЦІЧЫ

ПАРХАЧ Кліменцій, н. у 1900, загінуў у час бамбардзіроўкі ў Германіі, куды быў вывезены на прымусовыя работы.

ВЁСКА НЕПЛІ

БЫСЮК Васіль Давыдавіч, н. у 1902, старшыня Клейнікаўскага сельсавета, расстраляны ў 8-м форце ў 1941 г. як савецкі актывіст.

БЫСЮК Мікалай Давыдавіч, расстраляны. Месца пахавання невядома.

РАМАНЮК Пётр, старшыня Рэчыцкага сельсавета, расстраляны ў 1941. Месца пахавання невядома.

ВЁСКА ПЕСКІ

САЎЧУК Цімафей Сідаравіч, расстраляны ў 1941.

ВЁСКА ЦЕРАБУНЬ

ВІКАРУК Валянціна Сільвестраўна, н. у 1918, расстраляна як савецкая актывістка.

КОЗЕЛ Пётр Карнілавіч, н. у 1899, арыштаваны ў 1942, расстраляны ў в. Чарнаўчыцы.

ЛЯЎЧУК Максім, забралі ў 1943 у нямецкі лагер у Парахонску каля г. Лунінец, дамоў не вярнуўся.

З успамінаў былога вязня Івана Рыгоравіча Саладухі, жыхара в. Церабунь

Мы разам з Максімам былі ў гэтым лагеры. Там было за 5 тысяч вязняў, у тым ліку 750 чалавек з Брэсцкай вобласці. Мы будавалі дарогі. Здзекаваліся над людзьмі вельмі. Працавалі цяжка, а кармілі абы як. На суткі давалі 150 грамаў ячменнага хлеба і адзін раз гарачы суп. Мне пашчасціла, што ведаў польскую мову. А жонка начальніка лагера была полькай. Яна дапамагала не памерці з голаду. Яшчэ і Максіма карміў. Ён быў знясілены, хварэў. А тут аддалі вопратку на пражарку і Максімава згарэла. І ён застаўся распранутым. А справа была зімой.

На маіх вачах памёр. Сканаў у лужыне. А мне ўдалося ўцячы. Ваяваў у Войску Польскім кулямётчыкам. Помсціў фашыстам за здзекі.

РЫБАЧУК Аляксандра Іванаўна, н. у 1868, загінула 22.6.1941 у в. Чылеева, пахавана на могілках в. Вялікая Ракавіца.

ТЫШЧУК Аляксей Трафімавіч, н. у 1903, дэпутат Матыкальскага сельсавета, арыштаваны ў 1942, адпраўлены ў брэсцкую турму; расстраляны каля в. Плоска.

З успамінаў Івана Аляксеевіча Тышчука, жыхара в. Церабунь

Бацька мой быў добры і справядлівы чалавек. Таму і абралі яго дэпутатам і народным засядацелем. Часта па грамадскіх справах яго вызывалі ў горад ці ў сельсавет. Да яго ішлі людзі са сваімі клопатамі.

Прыйшлі немцы і ў першую чаргу ўзяліся за актывістаў. Першы раз бацьку арыштавалі і завезлі ў Матыкалы ў камендатуру. Але пасля адпусцілі. Прыйшлі ў другі раз.

Я хадзіў з маці ў камендатуру, насіў перадачы. Апошні раз бацьку не застаў, сказалі, толькі што павезлі ў горад на фурманцы. Я доўга бег па дарозе, хацеў дагнаць. Але не ўдалося.

У турме яго трымалі да жніва. Вадзілі на допыты. Кажуць, што расстралялі каля в. Плоска. А дзе, так і не ведаем.

ЛЫШЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАЯРЫ

ДАВІДЗЮК Мікалай, н. у 1929, загінуў у 1944 ад узрыву снарада.

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ ЗВОДЫ

ГРЫЦУК Дзмітрый, старшыня сельсавета ў в. Баршчова Камянецкага раёна.

ІВАНЮК Трафім, расстраляны як савецкі актывіст.

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ ШЧЫТНІКІ

Расстраляны ў брэсцкай турме ў 1941:

КАНДРАЦЮК Рыгор Ільіч, н. у 1904.
НОВІК Барыс Іванавіч, н. у 1905.
ПАШКОЎСКІ Іван Нікадзімавіч, н. у 1921.
ФЕДАРУК Дзмітрый Максімавіч, н. у 1922.

ВЁСКА ЛЫШЧЫЦЫ

Расстраляны пасля катаванняў на 3-м форце Брэсцкай крэпасці ў чэрвені 1942 г.:

ГАРДЗЯЮК Іосіф Лукіч, н. у 1893, яго сын **Сямён**, н. у 1923.

КАРАВАЙ Аксенцій Паўлавіч, н. у 1889.
ЛЕГАМІНА Сцяпан Цімафеевіч, н. у 1921.
МІЛІШКЕВІЧ Іван Іосіфавіч, н. у 1912.
НЯРОДА Емяльян Карнілавіч, н. у 1888, яго сын **Якаў Емяльянавіч**, н. у 1921.
ПАЛЯНЮК Аляксандр Андрэевіч, н. у 1908.
ФРАЛОВІЧ Аляксандр, н. у 1920, былы вайсковец, расстраляны.
ЦІМАФЯЮК Міхаіл Іосіфавіч, н. у 1898, яго сын **Уладзімір**, н. у 1923.

З успамінаў Вольгі Міхайлаўны Гук (Цімафяюк), жыхаркі в. Лышчыцы

Жылі мы да вайны, як і ўсе добрыя людзі. Працавалі на сваёй зямлі. Мой муж, Міхаіл Іосіфавіч, быў загадчыкам сталовай на чыгуначнай станцыі Лышчыцы.

У сям'і бацькоў было пяцёра дзяцей. Брат Валодзя рана ўступіў на шлях барацьбы з фашыстамі. У нас быў радыёпрыёмнік, і Валодзя разам з сябрам Сцяпанам Легамінам слухалі радыё на гарышчы нашай хаты.

У пачатку лета 1942 г. пачаліся арышты. Каго ўзялі ў першы дзень, павезлі у камендатуру ў Вялікія Матыкалы. Адтуль адправілі ў турму г. Брэста.

Майго бацьку і брата забралі праз тыдзень. Білі, завезлі на пастарунак на станцыю, трымалі некалькі дзён, дапытвалі, катавалі. Стараліся дазнацца, дзе схаваны гранаты і міны.

Памятаю, як адпраўлялі іх у Брэст. Везлі возам каля хутара нашага дзеда. Мы пабеглі туды. Бацьку і брата нельга было пазнаць, да таго яны былі збітыя. Рукі звязалі калючым дротам. Брат быў ледзь жывы.

Паліцаі спынілі воз і далі магчымасць развітацца арыштаваным з сям'ёй. Бацька трымаўся цвёрда. Папрасіў дзеда прыглядаць за дзецьмі і на развітанне сказаў: «Не трэба плакаць. Я скора вярнуся...» Мая сястра бегла за возам, мабыць, з кіламетр, пакуль яе не прагналі.

А сустрэцца нам ужо не давялося. Усіх арыштаваных у нашай вёсцы з ліку моладзі і старэйшых доўга катавалі, а потым ноччу расстралялі ў горадзе.

НЯРОДА Аляксей Ігнатавіч, н. у 1912, забіты бандытамі ў 1944.
ЦЫБУЛЬСКІ Іван Мікалаевіч, н. у 1905.
ШЫЛАЎ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1910.

Расстраляныя гітлераўцамі камсамольцы ў Камянецкім раёне, дзе яны меркавалі схавацца ад арышту:

КУРЫЛЮК Аляксей.
МАЦВЯЮК Мікалай.
НЯРОДА Іван.
ЦЫБУЛЬСКІ Аляксей.

Растраляны ў 1941—1942 гг.:

ГАНЧАРОЎ Аляксандр, н. у 1920.
СЦЯНТКЕВІЧ Ян Пятровіч, н. у 1916.

За 1 км ад вёскі ва ўрочышчы Курылава ў 1942—1944 гг. гітлераўцы расстралялі 756 мірных жыхароў, у асноўным з іншых раёнаў. Сярод іх былі і нашы землякі:

АНДРАЮК Ганна Паўлаўна, н. у 1907, яе маці **СІДАРУК Ксенія Дзям'янаўна,** н. у 1873, і дачка **Галіна**, расстраляны гітлераўцамі як сям'я партызана. **Ксенію Дзям'янаўну** солтыс прывёў для расстрэлу з царквы, дзе яна малілася.
ЧЫРКО Ефрасіння Кірылаўна, н. у 1904.
ЧЫРКО Мікалай Кірылавіч, н. у 1926.

Жылі ў в. Сычы. Расстраляны ў Курылаве за тое, што сям'я ратавала савецкага ваеннаслужачага Сямёна:

Сям'я **ПАНЬКО**, шасцёра чалавек з в. Ужыкі Камянецкага раёна. Трое дзяцей з гэтага ж раёна.

ВЁСКА МАЛЫЯ ШЧЫТНІКІ

СЕЛІВАНЮК Павел Канстанцінавіч, н. у 1907, міліцыянер, арыштаваны ў 1942 і расстраляны ў Брэсце.

ВЁСКА СЕГЕНЕЎШЧЫНА

МАРОЗАЎ Валерый, расстраляны немцамі, пахаваны на могілках в. Люта.

МАТЫКАЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЕЛЬЯМОВІЧЫ

Загінулі ў час карнай аперацыі ў пачатку лета 1944 г.:

ВАРАНЧУК Вольга Трафімаўна, н. у 1909, яе дзеці **Мікалай**, н. у 1936, **Валянціна**, н. у 1934.
ГАРАЧЫНСКІ Юзаф, н. у 1890, яго сын **Баляслаў,** н. у 1928.
ДУДЗІК Андрэй Дзмітрыевіч, н. у 1889.
ДУДЗІК Павел Яўстаф'евіч, н. у 1904.

З успамінаў Мікалая Іванавіча Хаменкі, жыхара в. Вельямовічы

Вясной каля нашай вёскі ў напрамку да граніцы праходзіла партызанскае злучэнне Каўпака. Немцы ўцякалі як маглі. Дык адзін паляк сказаў, што ўсе вяскоўцы настроены супраць нямецкай улады. І фашысты ў злосці пайшлі па вёсцы, сталі расстрэльваць мірных жыхароў, закідвалі схроны, дзе хаваліся людзі, гранатамі.

Не шкадавалі нікога — ні малое дзіця, ні старых. А маіх суседзяў — Андрэя і Паўла Дудзікаў — загналі ў яму ад бульбы (скопец) і расстралялі іх з аўтамата.

Хто застаўся жывы, гатовы былі разарваць таго паляка, але ён уцёк разам з немцамі.

ІГНАЦЮК Васіль Фёдаравіч, н. у 1882.
ІГНАЦЮК Рыгор Сцяпанавіч, н. у 1909.
КАЛІШУК Піліп, н. у 1894, расстраляны.
МАКСІМЧУК Мікалай Рыгоравіч, н. у 1921, яго брат **Сцяпан**, н. у 1928.
МАКСІМЧУК Міхаіл Майсеевіч, н. у 1908.
МАКСІМЧУК Пётр Артамонавіч, н. у 1926.
МАКСІМЧУК Таццяна Дзямідаўна, н. у 1882.
НОВІК Павел Рыгоравіч, н. у 1926, расстраляны.
НОВІК Пётр Рыгоравіч, н. у 1910.
САЛАНЕНКА Ігнат Юзафавіч, н. у 1884.

Загінулі ў час бамбёжкі савецкімі самалётамі варожых ўмацаванняў у 1944 г.:

КОДАЛЬ Ілья Ільіч, н. у 1919.
ХАЦЕЙ Каліст рат Емяльянавіч, н. у 1916.

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ МАТЫКАЛЫ

КАВАЛЬЧУК Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1895.

Восенню 1942 г. немцы стварылі невялікае гета, дзе ўтрымліваліся яўрэі, якія ўцяклі з г. Брэста і сагнаныя з іншых вёсак. Амаль 500 чалавек было расстраляна каля мясцовых могілак. У лістападзе 1996 г. на месцы расстрэлу пастаўлены памятны знак. Імёны ахвяр загінуўшых невядомы.

Жыхары вёскі сведчаць

ШУБІЧУК Фёдар Іванавіч:

В ста метрах от моего дома имеется кладбище, около которого немцы устроили место расстрела еврейского населения, которое ловила местная полиция, когда те бежали из гетто из Бреста...

До самого снега проводились эти расстрелы, и почти ежедневно можно было наблюдать расстрел полицией мирного населения. И мне в окно было видно место расстрела у кладбища, и по моим подсчетам у кладбища расстреляно не менее 500 человек.

К.І.Валынчук:

... Часов в шесть вечера из подвала шефства вывели человек 11—13 евреев, причем все они были подростками, мальчики и девочки, и полицейские повели их к кладбищу, где уже была вырыта яма — там их раздели донага и расстреляли, — но сам расстрел я не могла смотреть, хотя это со второго этажа было хорошо видно.

Я не могла смотреть, как расстреливают совершенно невинных людей.

Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 514. В1. Спр. 41, Л. 13 адв., 15.

ВЁСКА ЗАПОЛЛЕ

АНТАНЮК Міхаіл Паўлавіч, н. у 1933, падарваўся на міне.

ВЁСКА КАВЯРДЗЯКІ

КЛІМУК Арсеній Якаўлевіч, загінуў у час абароны чыгуначнага вакзала ў г. Брэсце.

Загінулі ад нямецкіх снарадаў 22 чэрвеня 1941 г.:

АНТАНЮК Васіль Іванавіч, н. у 1896.
ВІШНЯВЕЦКІ Лаўрэн Уласавіч, н. у 1892.
ВОЛЧУК Іван Рыгоравіч, н. у 1906.
ДАБРАЛІНСКІ Сямён Трафімавіч, н. у 1865, яго сын **Міхаіл Сямёнавіч**, н. у 1905.
КАНДРАЦЮК Іван Мікітавіч, н. у 1883.

ВЁСКА МАЛЫЯ МАТЫКАЛЫ

МАКСІМУК Міхаіл, н. у 1932, падарваўся на нямецкім снарадзе ў 1946.
ПАНАСЮК Сцяпан Дзмітрыевіч, н. у 1911.

ВЁСКА МАЛАЯ РАКАВІЦА

ГРЫЦУК Мікалай Іванавіч, н. у 1906, старшыня калгаса, расстраляны.

У 1943 г. фашысты павесілі за вёскай двух чырвонаармейцаў, якія ўцяклі з палону.

Успамінае Семянюк Міхаіл Уладзіміравіч

Я ішоў з поля дадому. Гляджу, пад'ехала нямецкая аўтамашына да ўскраіны вёскі. З кузава выскачылі варожыя салдаты і вывелі двух чырвонаармейцаў. Яны ў свой час уцяклі з нямецкага палону і засталіся на акупіраванай тэрыторыі. Жылі ў нашай вёсцы.

Немцы зрабілі вісельню, падвялі сваіх ахвяр да яе. Арыштаваныя не супраціўляліся. Самі накінулі сабе пяцелькі на шыі. Я хутчэй пайшоў у хату, каб не бачыць гэтай жахлівай расправы над людзьмі...

ВЁСКА НЕХАЛСТЫ

БЯЛЬКЕВІЧ Максім Карпавіч, н. у 1895.
КРУГЛЕЙ Дзмітрый Емяльянавіч.

Загінулі 22 чэрвеня 1941 г. ад нямецкага артылерыйскага абстрэлу вёскі:

ГАЛЬЧУК Ксенія Іоўна, н. у 1895.
ГАЛЬЧУК Любоў Дзмітрыеўна, н. у 1927.

З успамінаў Рыгора Дзмітрыевіча Гальчука, жыхара в. Нехалсты

Я добра памятаю, як пачыналася вайна. Мне было тады 15 гадоў.

На світанні нас разбудзіла кананада. Над граніцай, якая знаходзілася ад вёскі непадалёку, неба было багровым. Там так грымела, што дрыжэлі шыбіны ў вокнах хат.

Усе павыбягалі на вуліцу, у роспачы не ведаючы, што рабіць: ці дабро спасаць, ці самім хавацца, каб не трапіць пад асколкі снарадаў, якія рваліся ў вёсцы

У гадзін восем раніцы загінула мая сястра Люба. Варожы снарад разарваўся каля нашай хаты. Ён забраў жыцці маёй сястры, Ксеніі Гальчук і суседкі Праскоўі Місак.

ВЁСКА СКОКІ

БАНДАРУК Францішак Іосіфавіч, н. у 1910, расстраляны.

РАЧКО Тарас Пятровіч, н. у 1911, жыў каля чыгункі. Працаваў начальнікам паўстанка.

Каля вёскі Скокі знаходзілася калонія, у якой жылі пераважна палякі, ці беларусы, якія прынялі каталіцтва. Як расказвалі местачкоўцы, жыхары калоніі стварылі падпольную арганізацыю, мэтай якой была барацьба з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Іх выдаў ксёнз, немцы ўсіх арыштавалі. Далейшы лёс вязняў невядомы. Вось іх імёны:

АРЭПУК Міхаіл Антонавіч, н. у 1903.
ГАРНЕЦКІ Стафан Мікалаевіч, н. у 1919.
ДАНЕЛЬСКІ Міхаіл, н. у 1900.
КАНЯЗЕК Адольф Ксав., н. у 1926.
КУЛАКОЎСКІ Зігмунт, н. у 1914.
КУЛАКОЎСКІ Раман Іванавіч, н. у 1915.
КУЛАКОЎСКІ Тадэвуш Раманавіч, н. у 1927.
НЯХОДА Аляксандр, н. у 1900.
ШЫВОНІК Іосіф Станіслававіч, н. у 1890, яго сын **Станіслаў**, н. у 1921.
ПЕТЛЯК Ульян Уладзіслававіч, н. у 1919.
САСНОЎСКІ Станіслаў Іванавіч, н. у 1896.

ВЁСКА СТАВІШЧА

ДАБРАЛІНСКІ Павел Васільевіч, н. у 1909, падпольшчык, расстраляны ў в. Чарнаўчыцы.

ДРЫНЮК Мікалай, расстраляны ў в. Чарнаўчыцы.

ВЁСКА СТАРОЕ СЯЛО

ЛЯШУК Іван Аляксандравіч, н. у 1924.
ЛЯШУК Ігнат Антонавіч, н. у 1925.

ВЁСКА СЫЧЫ

ДАНЯЛЬЧУК Рыгор Нікіфаравіч, н. у 1903, расстраляны ў 1942 у в. Курылава.

ПАЛЯШЧУК Фама Пятровіч, н. у 1905, дэпутат сельскага Савета, расстраляны.

Загінулі ад бамбёжкі ў час вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:

ВЯЖЫНСКІ Уладзімір Тарасавіч, н. у 1890.
ДОЛБАК Ніна Сямёнаўна, н. у 1927.
НІКІЦЮК Васіль Кузьміч, н. у 1895.
ХАНЬКО Фёкла, н. у 1880.
ШАЛАПЫКА Лук'ян, н. у 1870.

ВЁСКА СЫЧЫ (КАЛОНІЯ)

Загінулі пры бамбардзіроўцы савецкімі самалётамі:

КЛЕФАЁ Станіслаў, н. у 1884, яго жонка **Вікторыя Станіславаўна**, н. у 1888, унук **Мечыслаў**, н. у 1934.

КАЧАРОЎСКАЯ Агнешка Францаўна, н. у 1938.

ЛЕНДЗЕН Хрысціна, н. у 1874.

ЯНЕЧАК Баляслаў, н. у 1936.

ВЁСКА ЧЫЖЭВІЧЫ

АНДРАЮК Сцяпан Якімавіч, н. у 1907.

ВАЛЬШЫНЕЦ Макар Цімафеевіч, н. у 1894, расстраляны ў брэсцкай турме як савецкі актывіст у лістападзе 1942.

ДЗЕМЯНЧУК Іван Данілавіч, н. у 1900, расстраляны.

ДЗЕМЯНЧУК Павел Мікітавіч, н. у 1927, падарваўся на міне ў 1942.

ЛЯЎЧУК Павел Лявонцьевіч, н. у 1936, загінуў ад узрыву бомбы.

ВЁСКА ЧЫЛЕЕВА

СКАВАРОДКА Лук'ян Лукіч, н. у 1886, яго жонка **Таццяна Якімаўна**, н. у 1896.

Успамінае Рыгор Лук'янавіч Скавародка, жыхар Брэста

Мне было 14 гадоў, калі пачалася вайна. Побач з нашай вёскай была пагранічная застава. Немцы пачалі моцна біць па ёй і па вёсцы. Вяскоўцы сталі разбягацца — хто ў лес, хто ў поле.

Мне ўцякаць не давялося: жонка палітрука Сарокіна дала мне на рукі гадавалага сына, каб я аднёс яго на заставу. Сям'я палітрука кватаравала ў нас, пасля яны перайшлі жыць да суседзяў. Дык вось, я з хлопчыкам на руках пабег у бок заставы. Але далёка не змог адбегчы. Разарваўся недалёка варожы снарад, я схаваўся за дрэва. Узрывы ў напрамку заставы былі такія частыя, што я вымушаны быў павярнуць назад. Мне дапамог нейкі дарослы, і дзіця я перадаў маці.

Я застаўся з бацькам. Маці маёй да тых часін ужо не было ў жывых — асколак снарада трапіў ёй у патыліцу. Мы былі каля хаты, калі пад'ехаў нейкі нямецкі чын на матацыкле і загадаў хавацца ў скляпы. А то, маўляў, будзе страляніна. Я з бацькам схаваўся ў наш склеп.

Сядзім, бачым — пад'ехаў другі матацыкліст, паставіў лесвіцу і падпальвае дах нашай хаты. Я хацеў выгнаць з хлява карову, але бацька не дазволіў, сказаў: «Не ідзі, бо заб'юць». Я паслухаўся. Але ж да склепа падбег немец з вінтоўкай і выстраліў у наш бок двойчы. Мне куля прабіла руку, а бацьку забіла. У яго пайшла кроў праз рот.

Калі саламяны дах склепа загарэўся, я выскачыў у агарод. Вакол было многа немцаў. Яны стралялі ў бок заставы. Праз наш агарод прайшоў нямецкі танк. Але скора вярнуўся назад, страляючы ў бок заставы.

Мне ўдалося перабегчы да суседзяў. Іх сын перавязаў мне руку, і я пабег далей у вёску, схаваўся ў чужы склеп. Варожы салдат, відаць, чэх, перавязаў мне руку і сказаў чакаць: прыйдзе машына і адвязе за Буг у шпіталь.

Але я яе не дачакаўся. Пайшоў у вёску Нехалсты, дзе жыла мая цётка.

Вось такім і запомніўся мне першы дзень вайны, які прынёс вялікае гора ў нашу сям'ю.

МУХАВЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВАЎКІ

АМЕЛЯНЕЦКАЯ Варвара Якаўлеўна, н. у 1912, арыштавана за антыфашысцкую дзейнасць у 1943, закатавана ў брэсцкай турме.

АМЕЛЯНЕЦКІ Павел Максімавіч, н. у 1898, расстраляны ў брэсцкай турме за сувязь з партызанамі ў 1942.

НОСІК Мікалай Антонавіч, н. у 1909, трымаў сувязь з партызанскай групай, загінуў восенню, пахаваны ў в. Шэбрын.

НОСІК Сцяпан Андрэевіч, н. у 1926, расстраляны ў 1942.

Расстраляны за сувязь з партызанамі ў 1943 г.:

ДЗЯМЧУК Мікалай Іванавіч, н. у 1910.

ДЗЯМЧУК Павел Сцяпанавіч, н. у 1897, падпольшчык часоў панавання буржуазнай Польшчы.

ДЗЯМЧУК Сафроній Паўлавіч, н. у 1885.

НОСІК Лявон Антонавіч, н. у 1912, член падпольнага антыфашысцкага камітэта, сувязны партызанскага атрада імя Чарнака, расстраляны ў сакавіку 1943 на другім форце (Бярозаўка).

ВЁСКА ГУЛІ

ГУЛЬ Міхаіл Емяльянавіч, н. у 1910, забіты ў 1943.

ВЁСКА ЗАБАЛАЦЦЕ

ВАСІЛЮК Ігнат Рыгоравіч, н. у 1914.

ГРЫЦУК Даніла Піліпавіч, н. у 1900.

ЗДАНЕВІЧ Ганна Харытонаўна, н. у 1930, памерла ад ран, атрыманых у час варожага абстрэлу.

КОВАК Васіль Антонавіч, н. у 1899.

ПЯДА Ігнат Анісімавіч, н. у 1822.

РАБЧУК Андрэй Пятровіч, н. у 1926.

РАБЧУК Ганна Пятроўна, н. у 1822.

СТАЛЬМАШУК Пётр Фёдаравіч, н. у 1926.

Забіты ў час аблавы ў 1944 г.:

АЛЬЧУК Пелагея Рыгораўна, н. у 1884.
БУДНІК Сямён Дзям'янавіч, н. у 1861, яго сын Цімафей, н. у 1898.
ДЗЯМЧУК Іван Міхайлавіч, н. у 1902.
МЕЛЬНІЧУК Павел Майсеевіч, н. у 1880.

ВЁСКА ЗАКІЙ

Расстраляны гітлераўцамі ў 1943—1944 гг. за падтрымку партызан:

ВОЛЬСКАЯ Марыя Якімаўна, н. у 1897.
ГАЦЬКО Ігнат Маркавіч, н. у 1905.
ГРОДА Антон Севасцьянавіч, н. у 1885, яго сын **Раман**, н. у 1905, загінулі ў брэсцкай турме ў 1943.
ГУЛЬ Флорый, н. у 1876.
КОЗЕЛ Аляксей Аляксандравіч, н. у 1923.
КОЗЕЛ Васіль Фёдаравіч, н. у 1900.
КОЗЕЛ Іван Цімафеевіч, н. у 1923.
КОЗЕЛ Фёдар Сямёнавіч, н. у 1861.
МЕЛЬНІК Васіль Фёдаравіч, н. у 1928, расстраляны ў 1943 у в. Вялікія Радванічы.
МЕЛЬНІК Фёдар Васільевіч, н. у 1893.
СТАЛЬМАШУК Аксіння Ануфрыеўна, н. у 1908, расстраляна ў 1944.

ВЁСКА ЗАСЛУЧНА

Расстраляны мірныя жыхары вёскі, сем'і савецкіх ваеннапалонных, грамадзяне яўрэйскай нацыянальнасці ў кастрычніку 1942 г.:

АХРЫМУК Ефрасіння, яе дачка **Вера**.
КУЗАЎКА Фёдар Васільевіч.
МАСЮК Іван Антонавіч, н. у 1905, яго жонка **Марыя Андрэеўна**, н. у 1905, дачка **Лідзія**, н. у 1940.
МАСЮК Трафім Антонавіч, н. у 1916, яго жонка **Марыя Ціханаўна**, н. у 1922, дачка **Яўгенія**, н. у 1941.

З успамінаў Сцепаніды Ціханаўны Каценка (Бай), жыхаркі п. Мухавец

Сям'я наша жыла ў вёсцы Заслучна Камяніца-Жыровецкага сельсавета. Была яна вялікая: бацька Ціхан Лявонцьевіч, маці Алена Харытонаўна, старэйшая сястра Марыя (яна была замужам за лесніком Трафімам Масюком), брат Аляксандр пайшоў у партызаны (пазней прапаў без вестак на фронце), жылі з намі яшчэ сястра Дуся і брат Міша.

Пачалі прыходзіць да нас партызаны з братам. Маці мыла для іх бялізну, пякла хлеб. Выдаў нас немцам мясцовы жыхар. Бацьку і брата Міхаіла забралі ў брэсцкую турму , пасадзілі ў адну камеру, а маці, сястру Дусю і мяне — у другую. Мне тады было дзесяць гадоў.

Немцы моцна здзекаваліся з арыштаваных: білі маці, бацьку, дапытваліся і ў нас, дзяцей, ці прыходзілі партызаны і дзе брат. Але мы не прызнаваліся.

Амаль паўгода пратрымалі нас у турме. І толькі ў жніўні адпусцілі дадому. Вярнуліся мы ў вёску, хата наша спалена, карову немцы забралі перад тым, як арыштаваць нас.

Прыйшлі да свайго спаленага жытла, каб што-небудзь узяць. Маці хацела пліту забраць. Ступіла — і грымнуў выбух. Аказалася, нават пажарышча фашысты замініравалі. Маці адарвала нагу, параніла асколкам у жывот. Не вытрымала, памерла наша мама.

Цяжкая нам дасталася доля. Старэйшую сястру Марыю Масюк і яе мужа Трафіма расстралялі фашысты каля школы. Побач стаяла хата Сцепаніды Смаль, дык яна казала, што глядзела праз шчыліну клуні, як здзекаваліся карнікі над людзьмі. Думала, што сэрца разарвецца, гледзячы на гэта. Дзевачку іхнюю, ей было два гады, кінулі каты жывую ў яму, яна там плакала, доўга не закопвалі, бо падводзілі ўсё новыя і новыя ахвяры.

Яна ж, Сцепаніда, апавядала пра тое, як здзекаваліся з брата, мужа маёй сястры. Ён пры буржуазнай Польшчы быў членам КПЗБ, за сваю падпольную дзейнасць сядзеў у турме. Яго застаўлялі залазіць на дах школы і адтуль каціцца на зямлю. Знясіленага, закатаванага да паўсмерці, яго расстралялі. Не пашкадавалі цяжарную жонку Марыю і малую дачку Лідзію.

Іуду, які выдаў сваіх аднавяскоўцаў, божая сіла, відаць, наказала — яго разарвала мінай у сваім жа агародзе.

ПАРХАЦ Віктар.
ПАРХАЦ ФАМА Іванавіч, н. у 1882.
РАЦЮК Філімон Васільевіч, яго жонка **Ганна**, іх дзеці **Марыя, Сцяпан, Мікалай.**

Расстраляны:

АНТОНЕНКА Канстанцін, расстраляны ў 1943,пахаваны на могілках вёскі Пажэжын.
ГРЫЦУК Максім Сямёнавіч, н. у 1905, расстраляны ў 1941.

ПАНАСЮК Іван Яўціхіевіч, н. у 1915, закатаваны ў брэсцкай турме за сувязь з партызанамі.

ПАНАСЮК Міхаіл Цімафеевіч, закатаваны ў турме.

ВЁСКА КАМЯНІЦА-ЖЫРОВЕЦКАЯ

ВАСІЛЮК Ігнат Рыгоравіч, н. у 1914, забіты ў час аблавы.

ГАЦЬКО Андрэй Пракопавіч, н. у 1888.

ГАЦЬКО Лаўрэнцій Пракопавіч, н. у 1891.

ГАЦЬКО Мікалай Сідаравіч, н. у 1923.

ЖЫШКО Фёдар Максімавіч, н. у 1914.

ПАНАСЮК Марфа Герасімаўна, н. у 1914.

ПАНАСЮК Уладзімір Максімавіч, н. у 1925, расстраляны 27.6.1944, пахаваны на могілках в. Знаменка.

СЛЯЗІНСКІ Пётр Міхайлавіч, н. у 1909.

ВЁСКА ЛІТВІНЫ

НОСІК Іван Іванавіч, н. у 1906, расстраляны ў 1943.

ВЁСКА ЛОЗЫ

ГУЛЬ Сцяпан Аляксандравіч, закатаваны ў брэсцкай турме.

ГУЛЬ Сямён Аляксеевіч, н. у 1903, закатаваны ў брэсцкай турме.

ІВАНЧУК Іван Сафронавіч, н. у 1927, забіты ў 1944 у час аблавы.

СТАЛЬМАШУК Сямён Андрэевіч, н. у 1911, забіты ў 1944 у час аблавы.

ПАСЁЛАК МУХАВЕЦ

ВАЛЫНЕЦ Іван Сямёнавіч, н. у 1905.

ГРЫЦУК Васіль Васільевіч, н. у 1886.

ЖМІНЬКО Несцер Сільвестравіч, н. у 1920, расстраляны за сувязь з партызанамі.

З успамінаў Сільвестра Паўлавіча Жмінько, жыхара в. Раманаўскія Хутары (цяпер п. Мухавец)

Наш сын чытаў палітычную літаратуру, меў сувязь з партызанамі. Аднойчы ён паехаў у лес па дровы. А калі вярнуўся, то ў двары ўжо чакалі немцы з паліцыяй. Не стала сына.

Думаў, не перажывём наша гора. Але Бог паслаў хлопчыка Вову. Ён быў сынам афіцэра Чырвонай Арміі. Яго маці Ганна Кульган (прозвішча пазней устанавілі следапыты Мухавецкай СШ).

Жанчына жыла ў нас з дваімі дзецьмі, працавала ў пана Рудкоўскага. Маці пакінула чатырохгадовага сына ў нас, бо пракарміць дваіх не магла.

Нам з жонкай Вова быў замест сына. Мы яго ахрысцілі, і ён жыў у сям'і да восені, аж пакуль нямецкія каты не сталі збіраць сем'і афіцэраў. Маці прыйшла да нас у суправаджэнні немца і забрала хлопчыка. Іх усіх расстралялі ва ўрочышчы Плянта.

Праз некалькі дзён я пайшоў на месца расстрэлу з сапёрнай лапаткай, каб пахрысціянску пахаваць нашага любімчыка. Ледзь знайшоў роў, замаскіраваны дзярнінай. Месцамі трава была рудой ад выступіўшай крыві. Калі разгарнуў зямлю, то жахнуўся — усе ахвяры былі раздзетыя.

Доўга шукаў Вовачку. Убачыў грудное дзіця Тамары Анішчанковай. Яго кінулі загорнутым у коўдрачку і яно задыхнулася. Страшна было глядзець. Тамару расстралялі з маці і траімі малымі дзецьмі. Яны жылі ў маіх родзічаў, у Яфіма Жмінько.

Хлопчыка нашага я знайшоў, і мы, каб ніхто не бачыў, пахавалі яго на могілках.

ЖМІНЬКО Рыгор Іванавіч, н. у 1907.

ЗАНЬ Канстанцін, н. у 1889.

КАЗЕЙ Андрэй Іванавіч, н. у 1898.

КАРАБЕЙКА Даніла Еўдакімавіч, н. у 1904.

ЛАПЧУК Васіль Лявонцьевіч, н. у 1903.

МАКАВЕЦКІ Мікіта Нікіфаравіч, н. у 1903.

З успамінаў Надзеі Мікітаўны Загарадневай (Макавецкай), жыхаркі в. Раманаўскія Хутары (цяпер п. Мухавец)

Нашага бацьку арыштавалі 6 сакавіка 1942 года, забралі ў турму і там расстралялі. Засталася маці Марыя Сцяпанаўна і мы, дзеці.

Прыехалі партызаны і забралі нас восем чалавек у лес. У атрадзе былі мае браты Коля, Валодзя і Іван. Давезлі нас да вёскі Сямісосны і спыніліся адпачыць. Толькі мы выехалі ў Вялікія Радванічы, як прыехалі немцы і, не застаўшы нас, спалілі хату.

Калі пераязджалі раку Рыту, на возе сядзелі я і брат Федзя. Конь спатыкнуўся і мы аказаліся ў вадзе. Я доўга не магла пераносіць паху рачной вады.

Усё ж у партызанскі лагер мы трапілі. Жылі ў зямлянцы. Праўда, доўга хварэлі. Той, хто выдаў нас немцам, адседзеў дзесяць гадоў у турме, а забітых ужо не вярнуць. Няма ў жывых і маіх братоў — Колі, Валодзі і Івана, — яны памерлі.

СМАЛЬ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1910, расстраляны за сувязь з партызанамі ў 1943, пахаваны на могілках Падлессе-Камянецкае.

СУГАК Фёдар Міхайлавіч, закатаваны ў турме.

ХАРЛАМПОВІЧ Васіль Трафімавіч, н. у 1886, расстраляны ў 1942.

ЮШЧУК Мікіта Нікіфаравіч.

ЮШЧУК Нікан Емяльянавіч, н. у 1886, яго жонка Парасся Фёдараўна, н. у 1887, іх дачка **Вольга,** н. у 1922, расстраляны восенню 1942, пахаваны на вясковых могілках.

З успамінаў Веры Іларыёнаўны Блахіной (Бушчук), у час вайны ёй было 12 гадоў

Жылі мы ў вёсцы Раманаўскія Хутары (п. Мухавец). У сям'і нас было чацвёра: бацька Іларыён Максімавіч, маці Харыціна Мікалаеўна, я і брат Яўген (Жэнік).

Перад вайной пры савецкай уладзе майго бацьку абралі дэпутатам Камянец-Жыровецкага сельсавета. Прыйшлі немцы і пачалі расстрэльваць актывістаў. Мы жылі і баяліся, што аднойчы прыйдуць і за намі.

У 1942 годзе, акурат на рэлігійнае свята Міхайла, каля нашай хаты спынілася аўтамашына з гестапаўцамі. Разам з немцамі быў і солтыс.

Маці чысціла бульбу, збіралася варыць снеданне. Як убачыла немцаў — змярцвела і кінула нож, уся затрэслася і сказала: «Ну, дзеткі мае, усё. Прыехалі па нас».

Мы выбеглі на вуліцу і ўбачылі, што солтыс павёў фашыстаў да хаты майго дзеда па маці Нікана Юшчукі і маёй бабулі Параскі. Разам з імі жыла дачка Вольга. Яна была замужам ў вёсцы Пугачова, але разышлася з мужам і прыехала да бацькоў. Дзеда і бабулю, цётку Вольгу забралі ў машыну, туды закінулі і рэчы. Калі машына праязджала каля нас, бабуля памахала белай хусцінкай, развітвалася з намі. Так і сёння бачу яе перад сабой.

Павезлі на Плянту. Хутка мы пачулі стрэлы. Тады забралі немцы Рыгора Жмінько, Фаму Юшчука і цесця Азарчукоў (прозвішча не памятаю).

ЯКАВУК Уладзімір Іванавіч, н. у 1915.

ВЁСКА ПАДЛЕССЕ-КАМЯНЕЦКАЕ

КУЗАЎКА Усціння Іванаўна, н. у 1885, расстраляна ў кастрычніку 1942.

КУЗАЎКА Фёдар Васільевіч.

СУК Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1926, расстраляны за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА ПАДЛЕССЕ-РАДВАНІЦКАЕ

АНДРАЮК Міхаіл Усцінавіч, н. у 1910, расстраляны вясной 1944 за сувязь з партызанамі.

БЕЙ Іван Антонавіч, н. у 1922, расстраляны ў сакавіку 1944.

БЕЙ Пётр Іванавіч, н. у 1904.

БЕЛАВЕЖА Аляксей Міхайлавіч, н. у 1922.

БЕЛАВЕЖА Дзмітрый, н. у 1907.

БЕЛАВЕЖА Пётр Васільевіч, н. у 1904.

БЕЛАВЕЖА Рыгор Іванавіч, н. у 1910, закатаваны ў 1943 у брэсцкай турме.

ГУЛЬ Аўдоцця, н. у 1863, забіта ў час аблавы ў 1944.

ГУЛЬ Васіль Андрэевіч, н. у 1932, забіты ў час аблавы.

ГУЛЬ Васіль Ігнатавіч, н. у 1920.

ГУЛЬ Марыя Мікалаеўна, н. у 1919, забіта ў час аблавы ў 1944.

Помнік на магіле ахвяр фашызму ў в. Падлессе-Радваніцкае.

ГУЛЬ Марфа Ціханаўна, н. у 1910.

ІВАНЧУК Іван Сафронавіч, н. у 1928, забіты ў час аблавы ў 1944.

ЛІТВІН Пётр Іванавіч, н. у 1876, забіты ў час аблавы ў 1944.

САПЯЖУК Барыс Раманавіч, н. у 1892, памёр ад ран у 1944.

СМАЛЬ Пётр Сцяпанавіч, н. у 1895, расстраляны за сувязь з партызанамі.

СУПРУНОВІЧ Аўдоцця Гаўрылаўна, н. у 1912, падарвалася на міне ў 1944.

ШЭЙДА Хвядос Андрэевіч, н. у 1916, расстраляны ў 1944.

РАДВАНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ РАДВАНІЧЫ

Расстраляны 12 ліпеня 1941 г. паміж вёскамі Франопаль і Радванічы:

АНІСЬКАЎ Кірыла Гаўрылавіч, настаўнік Радваніцкай школы.

ГАЛОДКА Кузьма Пятровіч, н. у 1895, яго сын **Міхаіл**, н. у 1922.

З успамінаў Лідзіі Кузьмінічны Панасік (Галодка), жыхаркі в. Вялікія Радванічы

Прыйшлі немцы і праз два тыдні акружылі нашу вёску і ўсіх людзей сагналі. Жанчын у адзін бок паставілі, мужчын — у другі. Накіравалі на мірных людзей кулямёты. Сталі дапытвацца: у каго ў сям'і ёсць камсамольцы, камуністы. Людзі маўчаць. Тады падышлі да яўрэя Майсея Грынберга. Ён быў шаўцом. Нікога не выдаў. Яго застрэлілі на месцы. Дзеці пачалі крычаць, плакаць. Тады некаторыя з жыхароў ад страху за сваё жыццё сталі гаварыць: «Чаго мы будзем за вас гінуць, прызнавайцеся!»

Мая маці не сказала, што сын — камсамолец. Мужчыны, з якімі стаяў мой брат Міша, супакоілі хлопца: «Мы цябе, Міша, не выдадзім».

З натоўпу жанчын выйшла Вера Буднік. «Я камсамолка», — сказала яна, заплятаючы касу.

Яе павялі да мужчын. «Кажы, хто камсамолец, камуніст, калі жыць хочаш».

І Вера паказала на майго брата, настаўніка Аніська. Іх палажылі на зямлю і пачалі біць. Бацьку нашага не ўзялі, ён быў хворы. Даведаўшыся, што сына вядуць на расстрэл, ён прыйшоў да машыны і стаў прасіць: «Адпусціце сына, лепей вазьміце мяне. Я камуніст, гэта я заставіў сына ўступіць у камсамол».

— Ах, ты камуніст? — са злосцю сказаў старшы з немцаў. — Дык ідзі і ты.

Пасадзілі ў машыну і бацьку. Грышу Ласковіча і брата расстралялі першымі. З бацькі сарвалі кашулю і завязалі вочы. Забілі апошнім.

ГАЛАВАЧ Гардзей Фаміч, н. у 1875, застрэлены ў ліпені 1944 пры адступленні немцаў.

ГАРШЧАРЫК Аляксандр Васільевіч, н. у 1906.

ГАРШЧАРЫК Мікалай Варфаламеевіч, закатаваны ў гестапа ў Брэсце за сувязь з партызанамі.

ГАРШЧАРЫК Фёкла Карлаўна, расстраляна ў брэсцкай турме за сувязь з партызанамі.

ДРАНЕВІЧ Якаў Сямёнавіч, н. у 1905.

ЖЫГАР Кацярына Васільеўна, н. у 1890, немцы спалілі ў хаце ў ліпені 1944.

КАРАБАН Піліп Сямёнавіч, н. у 1902, арыштаваны і адпраўлены ў брэсцкую турму.

КАЛІШОК Фёдар Кірылавіч, расстраляны ў 1944.

КАВАЛЬЧУК Аляксандр Герасімавіч, н. у 1910.

КАВАЛЬЧУК Майсей Іванавіч, н. у 1905, закатаваны ў гестапа ў 1943.

КУЗЬМІЦКІ Міхаіл Пракопавіч, н. у 1926, яго брат **Аляксей,** н. у 1932, расстраляны за сувязь з партызанамі 7.10.1942, пахаваны на могілках вёскі.

ЛАСКОВІЧ Аляксандр, сакратар камсамольскай арганізацыі.

ЛАСКОВІЧ Рыгор Іосіфавіч, н. у 1923, пахаваны на могілках в. Вялікія Радванічы.

ЛАСКОВІЧ Іван Мікалаевіч, н. у 1917, расстраляны ў 1943 у г. Брэсце.

ЛАСКОВІЧ Ірына, н. у 1881, забіта фашыстамі ў ліпені 1944.

ЛАСКОВІЧ Пётр, н. у 1880, забіты фашыстамі ў ліпені 1944.

ПУЧЫК Кірыла Антонавіч, н. у 1902, арыштаваны гестапа ў 1943.

ПУЧЫК Парасся Паўлаўна, н. у 1885, забіта фашыстамі ў ліпені 1944.

РАМАНОВІЧ Давыд Давыдавіч, расстраляны ў 1944.

РАМАНОВІЧ Іван Якаўлевіч, н. у 1910, загінуў у нямецкім канцлагеры.

САМСАНЮК Іван Паўлавіч, н. у 1924, закатаваны ў 1943 у гестапа г. Брэста.

САМСАНЮК Павел Андрэевіч, н. у 1898.

СЕЛІВОНІК Васіль Аляксеевіч, н. у 1923.

ШЭЙДА Барыс Карлавіч, н. у 1908.

ЧАРЭЎКА Васіль Емяльянавіч, н. у 1914.

ЧАРЭЎКА Рыгор Фаміч, н. у 1888, расстраляны немцамі ў 1944.

У вёсцы некаторы час жылі пяць яўрэйскіх сем'яў. Яны пераязджалі з вёскі

ў вёску. Сярод дарослых былі добрыя майстры — сталяры, шаўцы. Вайна застала іх у Радванічах, дзе яны загінулі.

ГРЫНБЕРГ Шэйна, Майсей, Разалія, Фаіна, закатаваны у Брэсцкім гета.

РОЙЗІС Ёсель, Фаіна, Дыня, Ліба, Хана, адпраўлены ў Брэсцкае гета.

РОЗЕНЦВЕЙ Мотэль, Жыфра, Дора, Янкель, закатаваны ў Брэсцкім гета.

ВЁСКА МАЛЫЯ РАДВАНІЧЫ

Расстраляны ўвосень 1942 г. карнікамі за сувязь з партызанамі:

БЕЛАВЕЖА Пётр Фёдаравіч, яго жонка **Еўдакія Рыгораўна**, іх дзеці **Аляксей, Марыя.**

БУДНІК Матрона Фёдараўна, н. у 1900, яе дзеці **Ганна,** н. у 1924, **Васіль,** н. у 1928, **Еўдакія,** н. у 1938, **Іван,** н. у 1941.

ДРАНЕВІЧ Фёдар Ануфрыевіч, н. у 1926.

КУЗЬМІЦКАЯ Агаф'я Пракопаўна, н. у 1922.

КУЗЬМІЦКІ Пракоп Іванавіч, н. у 1882, расстраляны 7 кастрычніка 1942, пахаваны на могілках в. Вялікія Радванічы.

КУЗЬМІЦКАЯ Наталля Іванаўна, н. у 1902, расстраляна 7 кастрычніка 1942, пахавана на могілках в. Вялікія Радванічы.

МЕЛЬНІЧУК Кірыла Паўлавіч, н. у 1893, дзеці **Ефрасіння, Іван,** н. у 1917.

МЕЛЬНІЧУК Малання Макараўна.

ПАЎЛОЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1902, яго жонка **Вольга Яфімаўна,** н. у 1904, іх дзеці **Ганна**, н. у 1924, **Алег**, н. у 1939, расстраляны ў 1942 у в. Муры.

СЕЛІВОНІК Настасся Аляксееўна.

СЕЛІВОНІК Валянціна Пятроўна, расстраляна каля роднай вёскі.

СЕЛІВОНІК Іван Пятровіч.

СЕЛІВОНІК Іна Пятроўна, расстраляна каля роднай вёскі.

СЕЛІВОНІК Пётр Пракопавіч, н. у 1905, расстраляны каля роднай вёскі.

ШАЎЧУК Соф'я, н. у 1900.

Загінулі ў розныя гады:

АНІШЧУК Якаў Савельевіч, н. у 1908, арыштаваны за сувязь з партызанамі ў 1943.

ВАЛАСЮК Макар Астапавіч, н. у 1896.

ГАЛОДКА Піліп Лявонавіч, н. у 1888.

ГАЛАВАЧ Іван Савельевіч, н. у 1908.

ГАРДЗІЦКАЯ Лукер'я Сямёнаўна, н. у 1907.

ГАРДЗІЦКІ Кірыла Рыгоравіч, н. у 1875.

ГАРДЗІЦКІ Лука Пятровіч, н. у 1905.

ГАРШЧАРЫК Аляксандр Андрэевіч, н. у 1897.

ГАРШЧАРЫК Вадзім Фёдаравіч, н. у 1895.

ГАРШЧАРЫК Настасся Тарасаўна, н. у 1936.

ДРАНЕВІЧ Емяльян Іванавіч, н. у 1907.

ДРАНЕВІЧ Марыя Ануфрыеўна, н. у 1928.

ДРАНЕВІЧ Рыгор, н. у 1908.

КАВАЛЕВІЧ Міхаіл Васільевіч, н. у 1897.

КАНДРАСЮК Ганна Лук'янаўна, н. у 1868, расстраляна ў ліпені 1944.

КАНДРАСЮК Мікалай Іосіфавіч, н. у 1923, расстраляны ў 1944.

КУЗЬМІЦКІ Акім Іванавіч, н. у 1893, яго дачка **Ганна,** н. у 1925, загінулі у брэсцкай турме ў 1943.

КУЗЬМІЦКІ Васіль Мацеевіч, н. у 1906.

КУЗЬМІЦКІ Герасім, яго сын **Максім**, н. у 1910, расстраляны ў 1944 у роднай вёсцы.

МАРТЫНЮК Уладзімір Іванавіч, быў забіты немцамі ў 1944.

МІХНО Мікалай Паўлавіч, н. у 1916, расстраляны вясной 1943 г. за сувязь з партызанамі.

З успамінаў Пятра Паўлавіча Міхно, жыхара Брэста

Жылі мы на хутары Сасновы. Там і цяпер яшчэ хата стаіць. Хацелі пасля вайны ў ёй адкрыць музей, але штосьці перашкодзіла. Нашу сям'ю добра ведае ганаровы жыхар Брэста Васіль Пятровіч Ласковіч. Ён родам з суседняй вёскі.

Мой брат у 1939 г. працаваў лесніком. У час акупацыі яго зноў прынялі на гэту пасаду. Трымаў сувязь з партызанамі атрада імя Чарнака. За гэта быў арыштаваны немцамі восенню 1942 г. і адпраўлены у брэсцкую турму. Там недзе вясной наступнага года яго расстралялі. Сям'я, вядома, была пад падазрэннем.

У нашай вёсцы тады ўжо паліцыі не было.

Аднойчы немцы прыехалі забраць моладзь на прымусовыя работы ў Германію. Хлопцы, мае аднагодкі, прыбеглі да нас на хутар. Кажуць, аблава. Каго схапілі — адправілі ў Германію, каго расстралялі, хто ўцёк.

Мы вырашылі ісці ў партызаны. Разам са мной пайшлі з вёскі, прыхапіўшы зброю, Канстанцін Букраба (загінуў у партызанах), Мікалай Буднік (з фронту не вярнуўся), Пётр Мельнічук (лёс яго невядомы), Павел Драневіч (памёр ужо).

Мы пайшлі ў атрад імя Бажэнкі злучэння Фёдарава — двойчы Героя Савецкага Саюза. Партызаны тады стаялі на Белым возеры Драгічынскага раёна. Ехалі разведчыкі і нас узялі з сабой...

ПАРХАЦ Ганна Назараўна, н. у 1914, яе дзеці **Валянціна,** н. у 1937, **Раіса,** н. у 1938, расстраляны летам 1944.

ПУЧЫК Майсей Цімафеевіч, н. у 1900, закатаваны ў гестапа за антыфашысцккую дзейнасць 1943.

РАМАНОВІЧ Апанас Фёдаравіч, н. у 1900.

РАМАНОВІЧ Нікіфар Раманавіч, н. у 1912, закатаваны ў турме ў 1943.

РАМАНОВІЧ Пётр Антонавіч, расстраляны ў 1943 у в. Міхалін.

РАМАНОВІЧ Ульяна Пятроўна, н. у 1884.

СЕЛІВОНІК Аляксей Пятровіч, яго дзеці **Васіль,** н. у 1923, **Настасся, Ганна**, н. у 1925, расстраляны ў 1943 каля в. Міхалін.

СЕЛІВОНІК Ульяна Ігнатаўна, расстраляна каля в. Міхалін.

ФЕДАРУК Цярэнцій Сцяпанавіч, н. у 1912, забіты немцамі ў 1944.

ШАЎЧУК Лук'ян Пятровіч, н. у 1898, арыштаваны ў 1943 і закатаваны ў брэсцкай турме.

ВЁСКА МІХАЛІН

Расстраляны ў 1942 — 1943 гг. за сувязь з партызанамі:

ГАРШЧАРЫК Аляксей Пятровіч, н. у 1880, яго жонка **Ульяна Ігнатаўна**, н. у 1884, дзеці **Васіль**, н. у 1925, **Ганна**, н. у 1929, **Мікалай,** н. у 1913, яго жонка **Агаф'я Міхайлаўна**, н. у 1914, іх дзеці **Мікалай**, н. у 1939, **Ніна,** н. у 1937.

КУЗЬМІЦКІ Сяргей Макеевіч, н. у 1870, яго жонка **Сцепаніда Міхайлаўна**, н. у 1875.

КУЗЬМІЦКІ Павел Сяргеевіч, н. у 1900, жонка **Ульяна Пятроўна**, н. у 1902, іх дзеці **Марыя**, н. у 1926, **Вольга**, н. у 1928, **Іван,** н. у 1930, **Ганна, Аляксандр**.

Расстраляны ў кастрычніку 1942 г.:

МЕЛЬНІЧУК Васіль Раманавіч.
МЕЛЬНІЧУК Герасім Сцяпанавіч.
МЕЛЬНІЧУК Марыя Сцяпанаўна.
МЕЛЬНІЧУК Марыя Пятроўна.
МЕЛЬНІК Раман Кандратавіч.
МЕЛЬНІК Соф'я Варфаламееўна.
МЕЛЬНІЧУК Сямён Сцяпанавіч.
ПУЧЫК Марыя Фёдараўна, яе сястра **Парасся Фёдараўна.**
ПУЧЫК Надзея Лукашаўна.
ПУЧЫК Цімафей Якаўлевіч, расстраляны ў кастрычніку 1942.
ПУЧЫК Якаў Еўдакімавіч, падарваўся на міне ў 1944.

ВЁСКА МУРЫ

ГАЛАВАЧ Іван Савельевіч, н. у 1910.
МАРТЫНЮК Уладзімір Паўлавіч, н. у 1908.
ПАРХАЦ Ганна Карпаўна, н. у 1910, яе дзеці **Валянціна,** н. у 1934, **Раіса,** н. у 1936.
ФЕДАРУК Цярэнцій Паўлавіч, н. у 1911.

ВЁСКА ФРАНОПАЛЬ

БАЙ Іван Сямёнавіч, н. у 1896, расстраляны ў 1944.
БУДНІК Марыя Іванаўна, расстраляна ў 1944.
КАВАЛЕВІЧ Нікіфар Харытонавіч, расстраляны за сувязь з партызанамі ў Шэбрынскім лесе.
КАНДРАЦЮК Іван Барысавіч, расстраляны ў 1943 у в. Раманаўскія Хутары (п. Мухавец).
ЛАСКОВІЧ Рыгор Іванавіч, расстраляны ў 1942 каля роднай вёскі.
ПАНАСІК Дзмітрый Лук'янавіч, н. у 1919, сувязны партызанскага атрада імя Чарнака, арыштаваны 23 кастрычніка 1942 у в. Шэбрын, прапаў без вестак.
СЕЛІВОНІК Павел Еўдакімавіч, расстраляны.

Расстраляны ў брэсцкай турме за сувязь з партызанамі ў 1943 г.:

ЛАСКОВІЧ Фёдар Барысавіч.
ЛОБІК Васіль Захаравіч, яго жонка **Кацярына Сцяпанаўна,** іх сын **Павел Васільевіч.**
ПАНАСІК Сідар Фёдаравіч, яго дачка **Марыя.**
СЕЛІВОНІК Аляксандр Фёдаравіч, н. у 1915, брат **Іван Фёдаравіч,** партызан.

ТАМАШОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВОРХАВА

БУДЫШ Мацвей Мікітавіч.
ГАЛЮК Ануфрый Паўлавіч.
ГАЛЮК Ануфрый Пятровіч.
ДАРАШУК Рыгор Іванавіч.
ЗАБОРСКАЯ Сіцылія, інструктар Дамачаўскага райкома партыі.

З успамінаў Валянціны Сідараўны Мікалайчук, жыхаркі в. Камароўка (ёй было 14 гадоў)

З першых дзён вайны ў нас жыла маладзенькая дзяўчына Сіцылія Заборская. Да вайны яна працавала інструктарам райкома ў Дамачаве, часта бывала ў нашых месцах.

Мы далі ёй прытулак на нейкі час, хавалі ад немцаў. У крытычныя моманты, калі магла з'явіцца праверка, ёй прыходзілася хавацца... у канапе. Ды чалавек — не іголка. Разумела і яна, што праз яе нашай сям'і таксама пагражае расстрэл, і таму ў хуткім часе пайшла ад нас. Потым немцы замардавалі яе недзе каля Ставоў. А мяне з сястрою ці не з-за гэтага пагналі ў Германію. Быў чалавек, які выдаў, не хачу пра яго гаварыць.

Нас спачатку павезлі ў Люблін, дзе размяшчаўся зборны пункт. Усіх сагналі ў адзін

будынак — там чакалі лазні, потым глядзелі дактары. Праз некалькі дзён павезлі ў Германію. Апошнім прыпынкам быў Магдэбург. Там нас размеркавалі на фабрыку па вырабу матрацаў, дзе былі проста нечалавечыя ўмовы і працы, і жыцця. Але былі і сярод немцаў някепскія людзі. Няйначай ні я, ні сястра не змаглі б выжыць.

КОНАН Іван Назаравіч.
ЛІЦВІНАЎ Міхаіл Пятровіч.
ЛЯЎЧУК Андрэй Данілавіч, н. у 1912, яго брат Уладзімір Данілавіч, н. у 1914, дэпутатат сельсавета.
РАФАЛЬСКІ Вацлаў Вацлавіч.
БОЛДЫРАЎ Пётр, чырвонаармеец, які ўцёк з фашысцкага палону.

ВЁСКА КАМАРОЎКА

Расстраляны за сувязь з партызанамі ў кастрычніку 1942 г.:

ГАРАДНІЧУК Сцяпан Кузьміч, н. у 1917.
ГІЧКО Мікіта Яфімавіч, н. у 1913.
ДАРАШУК Еўдакія Сцяпанаўна, н. у 1892.
ЛАХМІЦКІ Сідар Паўлавіч, н. у 1883.
ТАРАСЮК Кандрат Лук'янавіч, н. у 1912.
ТАРАСЮК Любоў Іванаўна, н. у 1911.
ТАРАСЮК Сіла Максімавіч, н. у 1910.
ТАРАСЮК Юлія Сілаўна.
Сцяпан, н. у 1917, пагранічнік і чырвонаармеец (прозвішча невядома).

ВЁСКА ПРЫБАРАВА

ВАСІЛЬЧУК Мікалай Пятровіч.
ВАСІЛЬЧУК Мікалай Рыгоравіч.
ЗГЕРА Іван Сямёнавіч, н. у 1913, яго сын Сямён.
ЗАГАРОЎСКІ Аляксандр Піліпавіч, н. у 1878, палкоўнік царскай арміі, расстраляны ў 1941 як заложнік.
КАЖУХОВА Надзея Васільеўна, н. у 1912, жонка палітрука 18-й пагранзаставы.
КАРПЮК Аляксей Піліпавіч, н. у 1885, яго жонка Варвара Яўстафіеўна, н. у 1887, іх дзеці Тамара, н. у 1919, Васіль, н. у 1925, Антон, н. у 1927. Расстраляны за сувязь з партызанамі ў 1942.
КРЫНІЦА Васіль Сцяпанавіч, н. у 1905, расстраляны ў 1943.
КРЫНІЦА Васіль Паўлавіч, н. у 1905, расстраляны ў 1942 за сувязь з партызанамі.
КУЧУК Міхаіл Мацвеевіч, н. у 1914, партызан, расстраляны ў 1943 каля в. Тамашоўка.

З успамінаў Веры Мацвееўны Кучук, жыхаркі вёскі Прыбарава

Жылі мы дружнай сям'ёй, бацькі працавалі на сваёй гаспадарцы. Калі пачалася вайна, брат Міхаіл выбраў свой лёс — вырашыў стаць на шлях барацьбы з фашыстамі. Наладзіў сувязь з партызанамі, дапамагаў ім зброяй, звесткамі пра сілы немцаў, прадуктамі харчавання. А калі ў вёсцы заставацца стала небяспечна, пайшоў у атрад.

У 1943 г. Міхаіл вяртаўся з задання і трапіў у рукі паліцыі і быў расстраляны каля в. Тамашоўка. Нашу ўсю сям'ю ўзялі, хацелі таксама расстраляць, але за нас заступіўся бацюшка.

ЛАЗАВЫ Герасім Цярэнцьевіч, н. у 1920, дырэктар мясцовай школы, яго жонка Ганна Яфімаўна, н. у 1921, настаўніца, расстраляны ў 1944.
ЛІТВІНАЎ Міхаіл Пятровіч, працаваў у міліцыі.
ПАРХОМЦАЎ Емяльян Сямёнавіч, працаваў на чыгунцы.
ПЕТРАЧУК Еўдакія, яе дачка Настасся, расстраляны за сувязь з партызанамі.
РАСЛЯКОВА Аляксандра, жонка лётчыка.

ВЁСКА СЕЛЯХІ

Загінулі 22 чэрвеня 1941 г. у час артабстрэлу вёскі:

ДАРАШУК Антон Фёдаравіч, н. у 1933.
ДАРАШУК Васіль Фёдаравіч, н. у 1929.
ДАРАШУК Фёдар Фёдаравіч, н. у 1927.

ВЁСКА ТАМАШОЎКА

Расстраляны гітлераўцамі летам 1942 г.:

ВЕРАШЧЫНСКІ Вікенцій, н. у 1923.
ВЕРАШЧЫНСКІ Эдуард, н. у 1924.
ВІННІЧЫК, н. у 1889, начальнік чыгуначнай станцыі Уладава, яго жонка, н. у 1891.
ГАЛЮК Павел Сцяпанавіч, н. у 1926.
ГАЦКЕВІЧ Андрэй Усцінавіч, н. у 1918.
ЖУК Уладзіслаў, н. у 1920.
ЖЫВЯЛЮК Васіль Фёдаравіч, н. у 1921.
ЖЫВЯЛЮК Уладзімір, н. у 1919.
НАВІЦКІ Сцяпан, н. у 1923.
ПАЛЯШЧУК Вольга, н. у 1912.
ПАЛЯШЧУК, н. у 1889.
ПАШКЕВІЧ Эдуард, н. у 1924.
ПЯТРОЎСКІ Баляслаў, н. у 1922.
РАФАЛЬСКІ Уладзіслаў, н. у 1910.
САЎЧУК Сцяпан Васільевіч, н. у 1912, дырэктар вінакурнага завода.
СІДАРУК Мікалай Іванавіч, н. у 1919, сакратар сельсавета.
СТУДНЯНСКІ Андрэй, н. у 1910.
СКШЫМОЎСКІ, н. у 1904.
ЦІМАХОВІЧ Антон, н. у 1899, дырэктар прамкамбіната.
ЯГЛЯК, н. у 1914.

Летам 1942 г. загінулі звыш 2000 вязняў мясцовага гета:

АЛЕРХАНТ Берк, н. у 1899.
АЛЕРХАНТ Мошка, н. у 1896.
АЛЕРХАНТ Фрайда, н. у 1900.
АЛЕРХАНТ Роза, н. у 1899.
АЛЕРХАНТ Мацель, н. у 1896.
АЛЕРХАНТ Рухля, н. у 1896.
АЛЕРХАНТ Поля, н. у 1928.
БЕГАНШЧ Гершк, н. у 1896.
БЕГАНШЧ Мантоль, н. у 1924.
БЕГАНШЧ Хася, н. у 1896.
БЕГАНШЧ Поля, н. у 1928.
БЯЛЫ Жэня, н. у 1891.
БЯЛЫ Лейзар, н. у 1919.
БЯЛЫ Лёва, н. у 1890.
БЯЛЫ Мардка, н. у 1939.
БЯЛЫ Рухля, н. у 1939.
БЯЛЫ Соня, н. у 1921.
БЯЛЫ Хаім, н. у 1920.
БЯЛЫ Хума, н. у 1923.
БЯЛЫ Эста, н. у 1914.
ГОЛЬДБЕРГ Гершк, н. у 1899.
ГОЛЬДБЕРГ Чарна, н. у 1902.
ГОЛЬДБЕРГ Эсма, н. у. 1917.
ГОЛЬДБЕРГ Лейб, н. у 1937.
ГОЛЬДШПАН Лейб, н. у 1914.
ГОЛЬДШПАН Хела, н. у 1916.
ГОЛЬДШПАН Рахель, н. у 1939.
ЗЕЛЬЦЭР Іцка, н. у 1912.
ЗЕЛЬЦЭР Таля, н. у 1914.
ЗЕЛЬЦЭР Поля, н. у 1936.
ЗЕЛЬЦЭР Герш, н. у 1938.
КОГАН Іосіф, н. у 1927.
КОГАН Рухля, н. у 1931.
КІШЫ Ісраэл, н. у 1885.
КІШЫ Ганна, н. у 1891.
КІШЫ Чарна, н. у 1916.
КІШЫ Лейзер, н. у 1924.
КІШЫ Люба, н. у 1931.
КОСЦЕР Іта, н. у 1922.
КОСЦЕР Лея, н. у 1924.
ЛІХТЭНБЕРГ Товія, н. у 1905.
ЛІХТЭНБЕРГ Эста, н. у 1905.
ЛІХТЭНБЕРГ Рухля, н. у 1934.
ЛІХТЭНБЕРГ Люба, н. у 1936.
ЛІХТЭНБЕРГ Абрам, н. у 1929.
ЛІХТЭНБЕРГ Шлёма, н. у 1927.
ЛЯЙДЭРЭР Грэм, н. у 1890.
ЛЯЙДЭРЭР Шэндаль, н. у 1918.
ЛЯЙДЭРЭР Хэля, н. у 1913.
НАЙМАН Герш, н. у 1894.
НАЙМАН Рухля, н. у 1900.
НАЙМАН Шмуль, н. у 1923.
НАЙМАН Пейсах, н. у 1928.
НАЙМАН Борух, н. у 1931.
НАЙМАН Арон, н. у 1899.
НАЙМАН Малка, н. у 1904.
НАЙМАН Цыля, н. у 1936.
НАЙМАН Фаня.
НАЙМАН Зельман, н. у 1914.
НАЙМАН Бруха, н. у 1916.
НАЙМАН Ганна, н. у 1889.
НАЙМАН Фішаль, н. у 1904.
НАЙМАН Рухля, н. у 1909.
НАЙМАН Пейсах, н. у 1921.
НАЙМАН Рыва, н. у 1927.
ПЯТРУШПА Хаім, н. у 1909.
ПЯТРУШПА Цывія, н. у 1909, яе дзеці Рухля, н. у 1938, Поля, н. у 1941.
РОТЭНШТЭЙН Давід, н. у 1914.
РОТЕНШТЭЙН Поля, н. у 1889.
РОТЭНШТЭЙН Лёва, н. у 1925.
РОТЭНШТЭЙН Эля, н. у 1925.
СЯЛЫ Рухля, н. у 1921.
СЯЛЫ Шлёма, н. у 1932.
СЯЛЫ Іцка, н. у 1885.
СЯЛЫ Эста, н. у 1889.
СЯЛЫ Пейсах, н. у 1914.
СЯЛЫ Эхва, н. у 1918.
СЯЛЫ Яхва, н. у 1909.
СЯЛЫ Герш, н. у 1908.
ФЕРДМАН, н. у 1904.
ФЕРДМАН Рахель, н. у 1914.
ФЕРДМАН Люба, н. у 1934.
ФЕРДМАН Мока, н. у 1909.
ФЕРДМАН Поля, н. у 1909.
ФЕРДМАН Сара, н. у 1928.
ФЕРДМАН Велвул, н. у 1931.
ФЕРДМАН Люба, н. у 1936.
ЦУКЕРМАН Ганна, н. у 1879.
ЦУКЕРМАН Хаім, н. у 1908.
ЦУКЕРМАН Жэня, н. у 1914.
ЧЭСЛЕР Іта, н. у 1889.
ЧЭСЛЕР Люба, н. у 1916.
ЧЭСЛЕР Рахель, н. у 1914.
ЧЭСЛЕР Янкель, н. у 1909.
ЧЭСЛЕР Ёша, н. у 1916.
ЧЭСЛЕР Іосіф, н. у 1874.
ЧЭСЛЕР Ісраэл, н. у 1891.
ЧЭСЛЕР Чынаостра, н. у 1883.
ЧЭСЛЕР Рухля, н. у 1916.
ЧЭСЛЕР Элька, н. у 1925.
ЧЭСЛЕР Абрам, н. у 1925.
ЧЭСЛЕР Іосіф, н. у 1930.
ЧЭСЛЕР Лейзер, н. у 1931.
ЧЭСЛЕР Ганна, н. у 1936.
ЭКХАУЗ Іцка, н. у 1912.
ЭКХАУЗ Роза, н. у 1884.
ЭКХАУЗ Хана, н. у 1922.

ВЁСКА ХАРСЫ

Загінулі ў 1942 г.:

ГАРАХ Аляксей Канстанцінавіч, н. у 1916.
ГАРАХ Канстанцін Данілавіч, н. у 1904.
ГАРАХ Лявонцій Піліпавіч, н. у 1908.
ГАРАХ Мікалай Канстанцінавіч, н. у 1905.
ГАРАХ Якаў Антонавіч, н. у 1898, яго жонка Наталля Фёдараўна, н. у 1902, іх дзеці Іван, н. у 1924, Васіль, н. у 1927.

ЖУК Лявонцій Піліпавіч, н. у 1898.
ЛОБАЧ Іван Фёдаравіч, н. у 1906.

ТЭЛЬМІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ОЧКІ

ІВАНЮК Пётр Цімафеевіч, н. у 1909, расстраляны ў 1944 за сувязь з партызанамі.
КАНДРАЦЮК Таццяна, н. у 1925, сувязная партызанскага атрада імя Чарнака, загінула ў 1943.
КАНДРАЦЮК Уладзімір Іванавіч, н. у 1924, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ВЁСКА БУЛЬКОВА

ГРАЧАНІК Іван Макаравіч, н. у 1911.
ГРАЧАНІК Аляксандр Ігнатавіч, н. у 1910.
ГРАЧАНІК Максім Макаравіч, н. у 1908.

ВЁСКА БУЯКІ

СЕЛІВЕСТРАЎ Аляксандр Емяльянавіч, н. у 1912, арыштаваны ў 1941, закатаваны ў брэсцкай турме.

ВЁСКА КОШАЛЕВА

ВОЙЧАК Іван Аляксандравіч, н. у 1912, расстраляны ў вёсцы Малыя Косічы.
ЛЕПСКАЯ Таццяна, н. у 1900.
ЛЕПСКІ Мікалай, н. у 1926.
ПРАКАПЧУК Еўдакія, н. у 1924.
ПРАКАПЧУК Рыгор Андрэевіч, н. у 1899, закатаваны ў гестапа ў 1944.
ПРАКАПЧУК Яфімія, н. у 1898.
РАБЧУК Рыгор Андрэевіч, н. у 1899, загінуў у фашысцкім лагеры.
ХІЛЬКОВІЧ Сцяпан, н. у 1860.
ХІЛЬКОВІЧ Фядосся, н. у 1860.

ВЁСКА МАЛЫЯ КОСІЧЫ

РАБЧУК Адам Якаўлевіч, н. у 1922, закатаваны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

Загінулі ў час бамбёжкі ў 1944 г.:

РАБЧУК Герасім Маркавіч, н. у 1906.
РАБЧУК Васіль Марцінавіч, н. у 1910, яго жонка Таццяна, н. у 1926, бацька Васіля Марцін, н. у 1880.

ВЁСКА НОВЫЯ ЗАДВОРЦЫ

Расстраляны ў 1944 г.:

ІВАНЮК Пётр Мацвеевіч, н. у 1899.
КАТОВІЧ Васіль Аляксеевіч, н. у 1898, яго сын Іосіф, н. у 1935.
МІХАЛЬЧУК Ганна Іванаўна.
МІХАЛЬЧУК Таццяна Міхайлаўна, н. у 1879.
ПАРФЯНЮК Дзям'ян Мікалаевіч, н. у 1887.
ПІНСКІ Васіль Іванавіч, н. у 1925.
САЎЧУК Рыгор Мікалаевіч, н. у 1907.
СОКАЛ Мікіта Сцяпанавіч, н. у 1899.
СОКАЛ Фама Іосіфавіч, н. у 1894.
ФЕДАСЮК Васіль Міхайлавіч.

Загінулі ў час бамбёжкі ў 1944 г.:

КАТОВІЧ Андрэй Маркавіч, н. у 1939.
СОКАЛ Вольга Еўдакімаўна, н. у 1927.

ВЁСКА СТАРЫЯ ЗАДВОРЦЫ

ВАЎРАНЮК Якаў Фёдаравіч.

ВЁСКА ТЭЛЬМЫ 1-я

НОВІК Мікалай Нікіфаравіч, загінуў у 1944 у час бамбёжкі.
ПАЦЯЙЧУК Максім Сцяпанавіч, н. у 1905, яго жонка Кацярына Антонаўна, н. у 1907, закатаваны ў засценках гестапа ў 1944 за сувязь з партызанамі.

З успамінаў Мікалая Іванавіча Дзенісюка, жыхара в. Тэльмы

Максім Пацяйчук пад час нямецка-фашысцкай акупацыі прымаў актыўны ўдзел у барацьбе супраць ворага. Ён працаваў у подпольнай антыфашысцкай арганізацыі. На явачнай кватэры ў г. Брэсце яго арыштавалі і пасадзілі ў турму.

Жонка Кацярына была цяжарная, панесла мужу перадачу. Затрымалі і яе. Пасля допытаў і катаванняў іх расстралялі.

СЕЛІВАНЮК Антон Пятровіч, н. у 1908. Па словах Мікалая Іванавіча Дзенісюка, кіраўнік падпольнай ячэйкі ў в. Тэльмы загінуў у фашысцкім лагеры ў 1944 г.

ВЁСКА ХАБЫ

Загінулі ў фашысцкім лагеры:

МАРТЫСЮК Іосіф Іосіфавіч, н. у 1921.
МАРТЫСЮК Мікалай Іосіфавіч, н. у 1923.
МАРТЫСЮК Сяргей Трафімавіч.
ПЛЕЧКА Сцяпан Андрэевіч, н. у 1910.
ТРАЦЮК Пётр Іванавіч, н. у 1924.

ВЁСКА ШЭБРЫН

Арыштаваны ў час карнай аперацыі 2 мая 1942 г. і расстраляны пасля катаванняў ў раёне 8-га форта:

ГУЛЬ Настасся Рыгораўна, н. у 1896.
ГУЛЬ Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1896.
КУПРЫЯНЮК Сямён Елісеевіч, н. у 1880.
ЛЯЎЧУК Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1921.
МАРТЫСЮК Андрэй Антонавіч, н. у 1889.

З успамінаў Мікалая Андрэевіча Мартысюка, былога камандзіра партызанскага атрада імя Фрунзе, жыхара Брэста

Мой бацька быў адукаваным чалавекам, меў прыгожы почырк, карыстаўся аўтарытэтам сярод людзей. Нездарма ў гады бежанства, калі сям'я вымушана была пакінуць родныя мясціны і жыць ў Расіі, яго прызначылі начальнікам аддзела міліцыі на станцыі Аўдзееўка. Ехаць назад, у Беларусь, не хацеў, але маці настаяла на сваім.

Прыехалі ў вёску — хата спалена. Жылі ў брата Івана — пакуль не пабудавалі сваю. Быў актыўным удзельнікам барацьбы супраць буржуазна-памешчыцкага ладу Польшчы. Не адзін раз бацьку арыштоўвалі.

Калі ў 1942 г. Іванам Салейкам была створана партызанская група, якая пазней улілася ў партызанскі атрад імя Чарнака, бацька дапамагаў партызанам прадуктамі. У вёску прыехаў карны атрад. Вось тады і арыштавалі групу жыхароў, у якую трапіў і мой бацька. Іх адправілі ў турму. Я ў той дзень разам з іншымі партызанамі групы быў каля вёскі Закій. Доўга не ведаў, што бацьку забралі. Толькі пазней, калі з месца расстрэлу ўцёк Цімафей Дабралінскі з вёскі Кавердзякі і прыйшоў да нас — ён сядзеў у турме разам з бацькам, — я даведаўся пра горкі лёс дарагога мне чалавека і маіх аднавяскоўцаў.

МАРТЫСЮК Міхаіл Лукіч, н. у 1890.

З успамінаў Ніны Міхайлаўны Ячнік (Мартысюк), жыхаркі Брэста

Мне было семнаццаць гадоў, калі немцы арыштавалі майго бацьку. Я таксама, як і маці, не раз насіла перадачы. Бацьку трымалі ў турме на трэцім паверсе, у вуглавой камеры. З акна ён нам даваў знак, што перадачу атрымаў.

Аднойчы маці, Аляксандру Аксенцьеўну, збілі за тое, што ўсю ноч хадзіла вакол турмы. А быў каменданцкі час. У ліпені, калі мы прынеслі чарговую перадачу, нам сказалі: «Усё, памаліцеся за яго».

Мы так і не ведаем, дзе расстралялі бацьку, дзе ён знайшоў апошні прытулак. Бо тых, хто знаходзіўся ў турме, расстрэльвалі на месцы, на фартах, у Чырвоным Двары.

НОСІК Марфа Іосіфаўна, н. у 1907.
НОСІК Пётр Васільевіч, н. у 1898.
ПЛЕЧКА Аксенцій Барысавіч, н. у 1911.
ПЛЕЧКА Дзмітрый Паўлавіч, н. у 1897.

Забіты ў розныя гады нямецка-фашысцкай акупацыі:

ГУЛЬ Аляксей Рыгоравіч, н. у 1924, застрэлены паліцэйскім.
ГУЛЬ Пётр Антонавіч, н. у 1929.
КУПРЫЯНЮК Аляксей Сямёнавіч, н. у 1911, партызан групы Салейкі. Загінуў 26 ліпеня 1942 каля в. Бердычы.
КУПРЫЯНЮК Мікалай Елісеевіч, н. у 1898, яго сястра Ксенія Елісееўна, н. у 1891, арыштаваны за знойдзены партрэт Сталіна, далейшы лёс невядомы.
КУПРЫЯНЮК Рыгор Мікалаевіч, н. у 1929.
ЛЯЎЧУК Васіль Мікалаевіч, н. у 1929, арыштаваны ў 1942 за агітацыю супраць фашыстаў.
ЛЯЎЧУК Мікалай Аксенцьевіч, н. у 1890.
ЛЯЎЧУК Дар'я Максімаўна, н. у 1890, расстраляна 5 жніўня 1943 за сувязь з партызанамі. Пахавана ў в. Шэбрын, каля царквы.

З успамінаў Веры Лаўрэнцьеўны Мартысюк (Янчук), жыхаркі Брэста

5 жніўня 1943 г. вёску акружыў карны атрад. Там былі партызаны. У перастрэлцы загінулі Аляксей Арцімук і Барыс Лазорык, а Івана Шастака ранілі, і ён схаваўся ў кустах, увечары яго пераправілі цераз Мухавец.

У час аблавы паліцай Крышталік з Падлесся арыштаваў мяне. Я хавалася на гародзе. Арыштавалі Дар'ю Ляўчук і Сцяпана Саўчука.

Прывялі да царквы. Учынілі допыт. Пытаюць у Дар'і пра сыноў. «Не ведаю, — адказала жанчына. — Цяпер дзеці бацькам не падпарадкоўваюцца». Яе адвялі ўбок. А ў Сцяпана Саўчука знайшлі дома салдацкае адзенне.

У той дзень немцы палілі вёску Ваўкі. Снарады над нашымі галовамі ляцелі да вёскі. Паліцэйскім было не да нас, яны ўглядаліся ў той бок.

Я кажу Сцяпану: «Выкінь у кусты клунак з адзеннем». А ён гаворыць: «Мне нічога не зробяць». А Дар'я мне кажа: «Табе, Вера, і мне — не жыць».

Дайшла чарга і да мяне. «Вашыя людзі

кажуць, што муж у цябе камуніст?» Я сказала, што гэта няпраўда. Маўляў, мяне ўжо адзін раз арыштоўвалі, але адпусцілі. Сказалі: «Жыві!» Мяне адпусцілі і ў гэты раз. А Дар'ю і Сцяпана павялі за царкву. Пасля жанчына, якая жыла побач, расказвала аб тым, як расстрэльвалі іх. Паклалі на зямлю тварам уніз і стралялі ў патыліцу. Дар'я загінула адразу, а ў Сцяпана стралялі некалькі разоў.

Калі карнікі пакінулі вёску, прыехаў узвод партызан Анатоля Казлова. Адзін з партызан папрасіў у мяне вады. А калі піў, шапнуў: «Будзь вечарам на беразе Мухаўца».

У лодцы мяне пераправілі на другі бок і возам завезлі ў в. Франопаль. Так я апынулася ў партызанскім атрадзе, дзе быў і мой муж.

МАРТЫСЮК Варвара Іванаўна, н. у 1912.
НОСІК Пётр Іосіфавіч, н. у 1910, міліцыянер, загінуў 22 чэрвеня 1944.
НОСІК Васіль Сцяпанавіч, н. у 1916.
САЎЧУК Сцяпан Міхайлавіч, н. у 1914, расстраляны 5 жніўня 1943.

ВЁСКА ЯМНА

У 1944 г. у час аблавы былі затрыманы і расстраляны жыхары вёскі:

КАЧАНОЎСКІ Ігнат Васільевіч, н. у 1909.
НОВІК Уладзімір Пятровіч, н. у 1921, сувязны партызанскага атрада імя Чарнака, павешаны каля в. Вістычы.

З успамінаў Мікалая Пятровіча Цімасюка, удзельніка вайны, жыхара в. Ямна

З Уладзімірам мы разам выконвалі заданні партызан: рэзалі тэлефонную сувязь, даставалі зброю.

Калі Уладзімір ішоў на сваё апошняе заданне, я даў яму свой наган. Хлопцам не пашанцавала, яны напароліся на паліцыю. У перастрэлцы Уладзіміра цяжка паранілі. Загінуў конь, і таму параненага ніяк не маглі перанесці цераз дарогу.

Яго схапілі, дапытваліся, адкуль ён. Але Уладзімір нікога не выдаў.

САЛЕЙКА Аляксей Васільевіч, н. у 1925.
СЫЧУК Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1923.

Падарваліся на мінах:

ГУЛЬ Раман Сцяпанавіч, н. у 1929, падарваўся каля в. Ямна.
ПЛЕЧКА Мікалай Антонавіч, н. у 1926, падарваўся ў 1944 г.

Загінулі ў розныя гады:

ЛЫСЮК Цімафей Іванавіч.
САЛЕЙКА Аляксандра Ціханаўна, н. у 1908, загінула ў фашысцкім лагеры.
САЛЕЙКА Георгій Сцяпанавіч, н. у 1925, загінуў у фашысцкім лагеры.
САЛЕЙКА Сцяпан Лукіч, н. у 1897, працаваў на паромнай пераправе цераз раку Мухавец, забіты ў час перастрэлкі.

ЧАРНАЎЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АМЯЛІНА

КУЗАЎКА Андрэй Зіноўевіч, н. у 1905.
КУЗАЎКА Васіль Іосіфавіч, н. у 1905.

ВЁСКА БЛЮВІНІЧЫ

ГАЦКЕВІЧ Фама Антонавіч, н. у 1902, старшыня сельсавета, расстраляны.
КУЧУР Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1900.
РОЙ Аляксандр Якімавіч, н. у 1902.

ВЁСКА ВІСТЫЧЫ

БАСЮК Міхаіл, н. у 1902.

ВЁСКА ВУЛЬКА

СТРОКАЧ Васіль Сільвестравіч, н. у 1904, яго сын Сяргей, н. у 1927.

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ СУХАРЭВІЧЫ

ДУБЕНІК Пётр Іосіфавіч, н. у 1899, дэпутат сельсавета, расстраляны ў 1942.
КУРЫЛЮК Фёдар Ануфрыевіч, н. у 1905, загінуў у 1944 у час бамбёжкі.

ВЁСКА ДРУЖБА

КОЗІК Фёдар, н. у 1904.

ВЁСКА ЗЕЛЯНЕЦ

ШВАЙКОЎСКІ Аляксандр Іванавіч, н. у 1905.
ЭЙСМАНТ Уладзіслаў Паўлавіч, н. у 1900.
ЮЛЬКОЎСКАЯ Антаніна, н. у 1860.

ВЁСКА ІВАХНАВІЧЫ

НОСІК Алена Мікалаеўна, н. у 1921.
НОСІК Мікалай Аляксандравіч, н. у 1930.
ШУМСКІ Аляксей Сцяпанавіч, н. у 1923.

ШУМСКІ Уладзімір Цімафеевіч, н. у 1917.

ВЁСКА КАЗЛОВІЧЫ

КАРАВАЙ Міхаіл Паўлавіч, н. у 1914, расстраляны як савецкі актывіст у брэсцкай турме ў 1941.

КРЫСЮК Міхаіл Іванавіч, н. у 1927.

МАРЦІШКА Аляксей Фёдаравіч, н. у 1926.

МАЦЯЮК Мікалай Дарафеевіч, н. у 1914.

ПЕТРЫК Фёдар Ульянавіч, н. у 1906.

ПІВАВАРЧУК Іван Васільевіч, н. у 1903, першы старшыня калгаса імя Сталіна, расстраляны немцамі ў 1943.

СТАРЫНСКАЯ Наталля Мікалаеўна, н. у 1896.

ТЫШУК Вера Іосіфаўна, н. у 1922.

ХІЛЬ Вольга Карпаўна, н. у 1905.

ЯРКОЎ Іван Дарафеевіч, н. у 1894, старшыня сельсавета ў Казловічах, яго сын Дарафей, н. у 1923, сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса, расстраляны ў 1942 у г. Брэст.

ВЁСКА НЕСВІЛО

Расстраляны ў брэсцкай турме летам 1942 г.:

АЧКАВЕЦ Мікалай Назаравіч, н. у 1903.

АЧКАВЕЦ Пётр Парфёнавіч, н. у 1898.

АЧКАВЕЦ Сцяпан Якаўлевіч, н. у 1900, шавец.

КРАЎЧУК Васіль Іванавіч, н. у 1907.

З успамінаў Яўгена Васільевіча Краўчука, жыхара Брэста

Мой бацька з братам Максімам былі актывістамі, падтрымлівалі савецкую ўладу. За гэта, калі прыйшлі немцы, і паплаціліся.

Аднойчы я прачнуўся ў чатыры гадзіны раніцы. Бацька ўжо быў на нагах, вывеў каня. У гэты час зайшлі немцы з паліцаямі. Загадалі бацьку апрануцца, і ён накінуў курцяк. Забралі і бацькавага брата Максіма. Я бег за бацькам, пакуль мяне не адштурхнулі прыкладам.

У тую раніцу арыштавалі дзесяць чалавек. Адправілі ў турму. Дзе расстралялі, мы так і не ведаем.

КРАЎЧУК Максім Андрэевіч, н. у 1906.

КРАЎЧУК Максім Іванавіч, н. у 1909.

КРАЎЧУК Сцяпан Маркавіч, н. у 1900.

ПРЫГАН Емяльян Сцяпанавіч, н. у 1895.

САЛАДУХА Мікалай Дзянісавіч, н. у 1906.

ХІЛЬ Іван Зотавіч, н. у 1900.

ВЁСКА ПОКРЫ

САРОКА Сцяпан Севасцьянавіч, н. у 1870.

ВЁСКА ЧАРНАКІ

ПІВАВАРЧУК Іван Васільевіч, н. у 1900.

УЛАСЮК Васіль Сцяпанавіч, н. у 1889.

ХОМІЧ Рыгор Пятровіч, н. у 1925.

ВЁСКА ЧАРНАЎЧЫЦЫ

Расстраляныя яўрэі 23 чэрвеня 1941 г.:

ВІНІКОЎСКІ Абрам, н. у 1920.

ВІНІКОЎСКІ Мотэль, н. у 1922.

ВІШЭНГРАД Міхаел, н. у 1900.

ЕРАЗАМСКІ Берк, н. у 1921.

ЗЕЛЬЦЭР Кісель, н. у 1880, яго дзеці Хуна, н. у 1906, Абрам, н. у 1902.

ЗЕЛЬЦЭР Шмуль, н. у 1900.

КАРЖАНЕВІЧ Барыс, н. у 1915, старшыня сельскага спажывецкага таварыства.

ПЛІНДА Аляксей Лукіч, н. у 1902, расстраляны як камуніст.

ТАРНАПОЛЬСКІ Ушэр, н. у 1920.

Загінулі ў розныя гады:

БЫШКО Іосіф Паўлавіч, н. у 1880, паралізаваны застрэлены немцамі.

КАПЦЭВІЧ Мікалай Ігнатавіч, н. у 1896, яго дачка Зінаіда, н. у 1930, загінулі ў 1944 у склепе пры артабстрэле.

КЛЯШЧОНАК Павел Аляксеевіч, н. у 1912, дырэктар Чарнаўчыцкай школы. Загінуў як баец Чырвонай Арміі каля в. Пелішча, перапахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы.

КУРЫЛЮК Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1923.

МАЦУЛЬ Георгій Аляксеевіч, н. у 1941, падарваўся на міне.

САРАЧЫНСКІ Яфім Ігнатавіч, н. у 1895.

СУХОЦКІ Іосіф Феліксавіч, н. у 1938, падарваўся на міне.

ТРАФІМУК Аляксей Рыгоравіч, н. у 1910, расстраляны 22 чэрвеня 1941 г.

ТРАФІМУК Мікалай Іосіфавіч, н. у 1898.

ТРАФІМУК Яфім.

ЧЭРНІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКІЯ КОСІЧЫ

ПРАКАПЧУК Рыгор, расстраляны.

ВЁСКА ВЯЛІКАЯ КУРНІЦА

АРЭХАЎ Іван Іванавіч, н. у 1917.

ЗЫКОВІЧ Акуліна Мікалаеўна, н. у 1899.

ЗЫКОВІЧ Мікалай Антонавіч, н. у 1927.

ІВАНЧУК Андрэй Максімавіч, н. у 1884.

ІВАНЧУК Марыя Ільінічна, н. у 1897, загінула ў ліпені 1944.

МАШЧУК Васіль Апанасавіч, н. у 1903, яго жон-

ка Таццяна Андрэеўна, н. у 1905, загінулі ў ліпені 1944 ад разрыва варожага снарада.

РАЧКОЎСКАЯ Акуліна Севасцьянаўна, загінула ў ліпені 1944 ад снарада.

МЯЖЭНСКАЯ Акуліна Мікалаеўна, н. у 1888, загінула пры артабстрэле.

ЯКУБОЎСКІ Арсеній Афанасьевіч.

ЯКУБОЎСКІ Васіль Васільевіч, н. у 1923, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ЯКУБОЎСКІ Сямён Цімафеевіч, н. у 1885, яго жонка Фядора Сямёнаўна, н. у 1890, дачка Вольга, н. у 1935, суседка МАЛЫХА Надзея Сямёнаўна, загінулі ў 1944 ад трапіўшай у сховішча бомбы з савецкага самалёта.

ВЁСКА ВЯЛЮНЬ

БАБІЧ Пётр Іосіфавіч, н. у 1925, дапамагаў партызанам атрада імя Чарнака, арыштаваны паліцыяй у час развешвання ў вёсцы лістоўкі «Смерць нямецкім акупантам!», якую ён напісаў, расстраляны вясной 1943. Перад смерцю перадаў на волю запісную кніжку, у якой напісаў: «Прашу перадаць гэтую кніжонку Якубуку Фёдару. Нас вязуць на расстрэл...».

ВЁСКА ЗБІРАГІ

ТУЗ Міхаіл, н. у 1918, міліцыянер г. Брэста, расстраляны зімой 1942 г.

ВЁСКА КЛІМАВІЧЫ

ПАЎЛЮЧЫК Аляксей Фадзеевіч, н. у 1924.

ПАЎЛЮЧЫК Рыгор Фёдаравіч, н. у 1921.

ПЕЧКА Іван Антонавіч, н. у 1926.

ПЕЧКА Нікан Дзмітрыевіч, н. у 1900, расстраляны фашыстамі ў 1944 у в. Чарнаўчыцы за сувязь з партызанамі.

СМЫК Сцяпан Аляксеевіч, н. у 1903.

СМЫК Фёдар Аляксеевіч, н. у 1905.

ВЁСКА МАШЧОНКА

ПЕЧКА Васіль Іванавіч, н. у 1927.

ПЕЧКА Іван Рыгоравіч, н. у 1902.

ПЕЧКА Фёкла Феафілаўна, н. у 1911.

ТАКУН Ануфрый, н. у 1898.

ТАКУН Уладзімір Феафілавіч, н. у 1919, трапіў у палон у 1941, расстраляны ў 1943 у г. Брэсце.

ВЁСКА СЕЛЯХІ

КОЗЕЛ Іван Лукіч, н. у 1898.

З успамінаў Мікалая Іванавіча Козела (было 13 гадоў)

Мой бацька быў смелым чалавекам. Ён звязаў свой лёс з партыяй яшчэ ў 30-я гады, калі панавала Польшча, стаў членам КПЗБ. Разам з сябрамі па падпольнай барацьбе вёў масава-палітычную работу сярод мясцовых сялян. Аб гэтым мне не раз апавядаў вядомы партыйны дзеяч на Брэстчыне Ігнат Антанюк, які родам з Чэрнінскіх хутароў.

А як радаваўся бацька, калі ў 1939 г. прыйшла савецкая улада! Ён стаў працаваць фінансавым агентам у сельсавеце. Памятаю першыя выбары дэпутатаў у Чэрнінскі Савет, якія праводзіліся ў 1939 г. Яны засталіся ў маё1 памяці таму, што галасаванне праходзіла ў нашай хаце ў вёсцы Селяхі. Каб ніхто не перашкодзіў, актывісты, і мой бацька ў тым ліку, арганізавалі ўзброеную ахову выбарчага ўчастка.

Добра памятаю, як арыштавалі бацьку. Гэта здарылася ў сакавіку 1943 г., як разам з маці насілі ў брэсцкую турму харчы і бялізну.

Напэўна, у маі мы прыйшлі да бацькі ў апошні раз. Перадачу ад нас не ўзялі. Сказалі: «Бацькі няма». Больш нічога мы тады не даведаліся. Ды да сённяшняга дня не ведаю, дзе знайшоў свой апошні прытулак мой бацька. Мяркую, хутчэй за ўсё пахаваны каля вёскі Плоска, дзе ў тыя часы расстрэльвалі многа вязняў турмы.

ВЁСКА ЧЭРНІ

АБРАМУК Іван Іванавіч, н. у 1923, расстраляны ў 1944 за сувязь з антыфашысцкім падполлем.

ВАЙЦЮК Рыгор Іосіфавіч, міліцыянер, арыштаваны ў 1942, расстраляны ў 1943.

БОТУХ Емяльян Андрэевіч, н. у 1869, загінуў 22 чэрвеня 1941 ад разрыва нямецкага снарада.

БОТУХ Юсцін, н. у 1901, расстраляны як актывіст у 1943.

ГУЦІК Сцяпан Ігнатавіч, н. у 1906, расстраляны ў 1942 у г. Брэсце за сувязь з партызанамі.

КРАЦЮК Іван Уладзіміравіч, н. у 1921, расстраляны ў 1941.

КРАЦЮК Феадосій, н. у 1900, расстраляны ў 1943 за сувязь з партызанамі.

ПЕЧКА Іван Рыгоравіч, н. у 1900, яго сын Васіль, н. у 1923, расстраляны ў 1943.

Партызаны, якія загінулі ў Брэсцкім раёне

АРЦЯМУК Аляксей Іванавіч, н. у 1911 у в. Тэльмы-2, сувязны атрада імя М.В.Фрунзе брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у баі 5.9.1943, перапахаваны на вясковыя могілкі в. Шэбрын.

АСТАШОНАК Віктар Максімавіч, н. у 1914 у в. Дуброўка Смалявіцкага р-на Мінскай вобл., партызан атрада імя П.Л.Валькова брыгады «За Радзіму» імя А.К.Флегантава, загінуў у баі 26.1.1944, перапахаваны каля шашы Брэст — Уладава (паварот на Белае возера).

БЕЛАВЕЖА Рыгор Іванавіч, н. у 1910 у в. Падлессе-Радваніцкае Мухавецкага сельсавета Брэсцкага р-на, сувязны партызанскага атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, расстраляны ў красавіку 1943.

БЛІЗНЮК Трафім Міхайлавіч, н. у 1920 у в. Бярнады Гершонскага сельсавета Брэсцкага р-на, партызан атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у баі 5.12.1943 у Шэбрынскім лесе.

ВАЛЬШЫНЕЦ Макар Цімафеевіч, н. у 1896 у в. Чыжэвічы Матыкальскага сельсавета Брэсцкага р-на, сувязны атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, арыштаваны гітлераўцамі ў лістападзе 1942, прапаў без вестак.

ВАСІЛЮК Пётр Раманавіч, н. у 1921 у в. Камяніца-Жыровецкая Брэсцкага р-на, партызан атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у баі 5.10.1943, пахаваны ў в. Вялікія Радванічы.

ВОЛЬСКІ Андрэй Андрэевіч, н. у 1923 у в. Франопаль Радваніцкага сельсавета Брэсцкага р-на, разведчык атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у баі 10.10.1943, пахаваны ў в. Закій.

ГАРШЧАРЫК Пётр Яфімавіч, н. у 1922 у в. Малыя Радванічы Брэсцкага р-на, партызан атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў 5.5.1944.

ГРЫШЧАНКА, загінуў у 1943, пахаваны ў в. Медна.

ДАВЫДАЎ Іван Іванавіч, з Казахстана, партызан атрада імя Г.К.Жукава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у баі, перапахаваны ў в. Чарнаўчыцы.

ДАМБРОЎСКІ Канстанцін Людвігавіч, н. у 1921 у в. Ляхаўцы Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл., партызан атрада імя М.В.Фрунзе брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у баі 1.7.1944, перапахаваны ў г.п. Дамачава.

ДЗЕМЧАНКА, пахаваны ў в. Чарнаўчыцы.

ДЗЯМЧУК Сцяпан Максімавіч, н. у 1913 у в. Ваўкі Брэсцкага р-на, партызан атрада імя М.В.Фрунзе брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у баі 15.6.1943, пахаваны ў Халстусонскім лесе.

КАВАЛЬЧУК Іван Нікіфаравіч, н. у 1926 у в. Франопаль Брэсцкага р-на, сувязны атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у жніўні 1943, месца пахавання невядома.

КАНАВАЛАЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1910 у в. Ярослаўка Дуванаўскага р-на Свярдлоўскай вобл., маёр, партызан атрада імя К.Я.Варашылава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у баі 30.9.1943, перапахаваны каля шашы Брэст — Уладава (паварот на Белае возера).

КАНДРАЦЮК Уладзімір Мітрафанавіч, н. у 1926 у в. Страдзеч Брэсцкага р-на, партызан атрада імя П.Л.Валькова брыгады «За Радзіму» імя А.К.Флегантава, загінуў у баі 23.7.1944, пахаваны ў в. Страдзеч.

КАРАЛЮК Андрэй Пятровіч, н. у 1922 у в. Знаменка Брэсцкага р-на, партызан атрада імя П.Л.Валькова брыгады «За Радзіму» імя А.К.Флегантава, загінуў у баі 20.7.1944 каля в. Чэрск, пахаваны ў в. Знаменка.

КАРАЛЮК Уладзімір Аляксеевіч, н. у 1905 у в. Страдзеч Брэсцкага р-на, сувязны партызанскага атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, арыштаваны гітлераўцамі 5.5.1944, прапаў без вестак.

КАСЯНЧУК Васіль Максімавіч, н. у 1922 у в. Гершоны Брэсцкага р-на, партызан атрада імя К.Я.Варашылава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у 1943, месца пахавання невядома.

КАШУБА Майсей Афанасьевіч, н. у 1911 у в. Суціша Тыўраўскага р-на Вінніцкай вобл., партызан атрада імя Г.К.Жукава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у баі 30.4.1944, перапахаваны каля шашы Брэст—Уладава (паварот на Белае возера).

КВЕЦЕНЬ Іван, н. у 1909 у Маларыцкім р-не Брэсцкай вобл., партызан атрада імя К.Я.Варашылава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у баі у 1944, перапахаваны каля шашы Брэст — Уладава (паварот на Белае возера).

КВЕЦЕНЬ Станіслаў, н. у Маларыцкім р-не Брэсцкай вобл., партызан атрада імя К.Я.Варашылава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у баі ў лістападзе 1943, пахаваны каля шашы Брэст — Уладава (паварот на Белае возера).

КІСЯЛЁЎ Сцяпан Андронавіч, н. у 1917 у г. Незяпятроўску Чэлябінскай вобл., партызан атрада імя К.Я.Варашылава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у баі ў 1942, перапахаваны каля шашы Брэст — Уладава (паварот на Белае возера).

КУРГАНСКІ Сцяпан Паўлавіч, партызан, загінуў 22.7.1944, пахаваны ў в. Чэрск.

ЛАЗОРЫК Барыс Міхайлавіч, н. у 1923, сувязны-партызан атрада імя М.В.Фрунзе брыгады імя

І.В.Сталіна, загінуў 5.9.1943, пахаваны ў Шэбрынскім лесе.

ЛАСКОВІЧ Рыгор Іванавіч, н. у 1901 у в. Франопаль Брэсцкага р-на, партызан атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, расстраляны ў снежні 1943, пахаваны ў в. Вялікія Радванічы.

ЛАСКОВІЧ Ульяна Іванаўна, н. у 1914 у в. Франопаль Брэсцкага р-на, партызанка атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінула 10.10.1943, пахавана ў в. Вялікія Радванічы.

ЛАХМІЦКІ Андрэй Парфір'евіч, н. у 1912 г. у в. Гута Брэсцкага р-на, сувязны ў атрадзе імя К.Я.Варашылава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў 26.7.1943.

ЛАХМІЦКІ Фёдар Парфір'евіч, н. у 1916 у в. Гута Брэсцкага р-на, сувязны атрада імя К.Я.Варашылава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў 26.7.1943.

ЛУКАШУК Рыгор Дзмітрыевіч (Дзям'янавіч), н. у 1921 у в. Знаменка Брэсцкага р-на, партызан атрада імя П.Л.Валькова брыгады «За Радзіму» імя А.К.Флегантава, загінуў 23.3.1944, пахаваны ў в. Знаменка.

МАКАРЭВІЧ Рыгор Цімафеевіч, н. у 1900 у в. Страдзеч Брэсцкага р-на, сувязны, арыштаваны гітлераўцамі 5.5.1944, прапаў без вестак.

МАЛЫХА Карп Іванавіч, н. у 1906 (1908) у в. Бердычы Брэсцкага р-на, пам. камандзіра ўзв. атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў 25.3.1944, пахаваны ў в. Дзівін Кобрынскага р-на Брэсцкай вобл.

МАМЧУР Яўген Яфімавіч, н. у 1915 у г. Камянец-Падольскі, сувязны атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, расстраляны гітлераўцамі ў верасні 1942.

МАТЫЯШВІЛІ Рэзо, партызан атрада імя К.Я.Варашылава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у 1943, пахаваны каля шашы Брэст — Уладава (паварот на Белае возера).

МЕЛЬНІЧУК Андрэй Іванавіч, н. у 1923 у в. Малыя Радванічы Брэсцкага р-на, партызан атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у баі 29.1.1943, пахаваны ў в. Радванічы.

МЕЛЯНЧУК Кірыла Іванавіч, н. у 1909 у в. Кунахі Брэсцкага р-на, сувязны атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў 14.1.1943.

МІХАЛЬЧУК Адам Савіч (Савельевіч), н. у 1920 у в. Страдзеч Брэсцкага р-на, партызан атрада імя П.Л.Валькова брыгады «За Радзіму» імя А.К-.Флегантава, трапіў у палон 23.3.1944, расстраляны.

МІХНО Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1922 у в. Вялікія Радванічы Брэсцкага р-на, сувязны атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, расстраляны гітлераўцамі 13.4.1944.

ПАНАСІК Варфаламей Патапавіч, н. у 1912 у в. Франопаль Брэсцкага р-на, партызан атрада імя М.М.Чарнака брыгады імя І.В.Сталіна, загінуў у баі 24.5.1944, падарваў сябе гранатай, каб не трапіць у палон.

ПАТАРАЯ Карл (Кірыла) Уладзіміравіч, н. у 1923 у п. Ланчхуці (Грузія), камандзір групы атрада імя Г.К.Жукава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у баі 23.6.1944, перапахаваны каля шашы Брэст — Уладава (паварот на Белае возера).

ПІШЧЫК Іван Ісакавіч, н. у 1926 у в. Алтуш Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл., партызан атрада імя Г.К.Жукава брыгады імя У.І.Леніна, загінуў у баі 14.11.1943, перапахаваны каля шашы Брэст — Уладава (паварот на Белае возера).

ПУЧЫК Якаў Майсеевіч, н. у 1922 у в. Муры Брэсцкага р-на, партызан атрада імя Г.К.Арджанікідзе брыгады імя В.В.Куйбышава Пінскага злучэння, загінуў у баі 10.11.1943.

РАМАНЕНКА Іван Мацвеевіч, н. у 1912, загінуў у баі 6.7.1944, перапахаваны ў г.п. Дамачава.

САМОЙЛЕНКА Мікалай Паўлавіч, н. у 1916, партызан, загінуў у 1943, перапахаваны каля шашы Брэст—Уладава (паварот на Белае возера).

САРОКІН Аляксандр Іванавіч, партызан, загінуў 25.7.1944, пахаваны ў в. Медна.

СЕЗОНАЎ Аляксандр, н. у 1922, загінуў 9.9.1944, перапахаваны ў в. Камяніца-Жыровецкая.

У 1948 г. у раёне было адноўлена ўжо 13 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 379 сялянскіх гаспадарак, што складала 4,7% усіх гаспадарак раёна. Калгасы мелі 3818 га зямельных угоддзяў, у тым ліку пашы — 2086 га, у сярэднім на адзін калгасны двор — 5,5 га. Сярэдняя ўраджайнасць у чатырох калгасах, утвораных яшчэ ў 1947 г., складала: збажыны — 11,6 ц, бульбы — 92 ц з гектара.

На 1 лістапада 1950 г. у раёне быў 71 калгас, у якіх налічвалася 6012 гаспадарак — 80,3% усіх сялянскіх гаспадарак.

Сельскагаспадарчая вытворчасць. У 1950-я гады сельская гаспадарка атрымала далейшае развіццё. Працягвалі ўтварацца калгасы. Калі ў 1947 г. у раёне было калектывізавана толькі 0,7% сялянскіх гаспадарак, у 1949 г. — 20%, у 1950 г. — 81,3%, то ў 1951 г. ужо 97,8%.

Значна павялічыліся плошчы пашы. У 1950 г. пашы ў раёне было 8652 га, у 1951 г. — 17 505 га, а ў 1952 г. — 22 072 га. Пашырыліся плошчы пад харчовыя і тэхнічныя культуры. Пасевы яравой пшаніцы ў 1950 г. складалі 226 га, ў 1951 г. — 508 га, у 1952 г. — 667 га. Пасевы грэчкі ў 1952 г.

Кукурузнае поле ў саўгасе «Пагранічнік».

у параўнанні з 1950 г. павялічыліся ў пяць разоў, ільну — у 4 разы, значна ўзраслі плошчы пад гародніну, закладваліся сады.

Калектывізацыя сялянскіх гаспадарак і ўзбуйненне калгасаў дазволілі шырэй выкарыстоўваць у сельскай гаспадарцы механізацыю. У 1952 г. у раёне дзейнічалі 2 МТС, якія налічвалі 47 трактароў, 12 камбайнаў, 15 малацілак і шмат сельскагаспадарчых машын.

Павольна, але ўзрастала ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. У 1950 г. ураджайнасць па раёне склала: жыта — 13,5 ц, аўса — 12 ц, ячменю — 11,5 ц з гектара. У перадавых гаспадарках яна была яшчэ вышэйшая. У 1952 г. у калгасе «Маладая гвардыя» ў брыгадзе Кубая В.П. з плошчы 50 га было атрымана па 15,5 ц, у калгасе імя Кагановіча ў брыгадзе Занько К.С. з плошчы 65 га — па 16 ц,

а ў калгасе імя Гастэлы ў брыгадзе Данільчука з плошчы 60 га — па 22 ц азімага жыта.

У 1950 г. у раёне было 1784 галавы буйной рагатай жывёлы, 883 свінні, 925 авечак і каля 6 тысяч птушак. У калгасах раёна налічвалася 168 жывёлагадоўчых фермаў, у тым ліку 53 фермы буйной рагатай жывёлы, 39 свінафермаў, 35 авечкафермаў і 41 птушкаферма. У 18 калгасах увогуле не было фермаў.

Паступовы рост сельскагаспадарчай вытворчасці дазволіў не толькі своечасова разлічвацца з дзяржавай па хлебанарыхтоўках, забяспечваць сябе насеннем, але і выдаваць калгаснікам натуральную плату за працадні. Так, у калгасе «Памяць 9 студзеня» ў 1951 г. на працадні было выдадзена калгаснікам па 3 кг хлеба, 6 кг бульбы і па 2 рублі. У калгасе «Чырвоная Зорка» на працадні было атрымана па 4,5 кг зерня, 7 кг бульбы і 2,5 рублі.

Далейшае развіццё атрымала сельская гаспадарка ў 1960-я гады. У выніку разбуйнення ў 1967 г. у раёне засталося 17 калгасаў і 4 саўгасы. Яны мелі звыш 40 тысяч га пашы, якая апрацоўвалася ўжо больш як 550 трактарамі розных марак, каля 100 зернеўборачных камбайнаў і шмат іншай тэхнікі.

На вялізных плошчах у гэты перыяд у раёне вырошчвалася кукуруза, якую актыўна насаджалі зверху. У сярэднім па раёне ўрадлівасць гэтай культуры ў 1960 г. склала 553 ц з гектара. Па 600—700 ц кукурузы з гектара было атрымана ў калгасах «Беларусь», імя Леніна і імя Калініна, саўгасе «Дамачаўскі».

У 1966 г. калгасы і саўгасы раёна вырабілі ў пераліку на 100 га сельгасугоддзяў па 360 ц малака і 35,5 ц мяса. А ў калгасе «Пагранічнік» — 599, імя Жданава — 470, «Краіна Саветаў» —464, саўгасе «Мухавец» — 571 ц. У сярэднім на 1 карову па раёне было надоена 2179 кг малака. Валавы выраб малака ў параўнанні з 1965 г. павялічыўся на 115,3%, мяса — на 106,2%.

Многія гаспадаркі вырасцілі добры ўраджай цукровых буракоў, кармавых карняплодаў, люпіну і іншых культур. План па нарыхтоўцы зерня быў выкананы на 170%, бульбы — на 101%, цукровых буракоў і малака — на 141%, мяса — на 102%, яек — на 128%. Грашовыя прыбыткі калгасаў выраслі ў 1,5 раза.

За 1966—1970 гг. у калгасах і саўгасах раёна валавая вытворчасць зерня вырасла на 53%, бульбы — на 40, цукровых буракоў — на 214, гародніны — на 23, малака — на 86, мяса —на 85%, яек — у 3,1 раза ў параўнанні з 1961—1965 гг. Сярэднегадавы надой на фуражную карову павялічыўся на 571 кг.

Але ўрадлівасць асноўных сельскагаспадарчых культур заставалася нізкай. Сярэднегадавая ўраджайнасць за 1968—1970 гг. склала: збожжавых — 12,6 ц, бульбы — 120, цукровых буракоў — 188, гародніны — 113, насення льну — 2,2, ільновалакна — 3,7 ц з гектара.

У 1968—1970 гг. вытворчасць малака вырасла на 21,2%, а мяса —на 60% у параўнанні з 1965—1967 гг. Сярэднегадавы выраб на 100 га сельгасугоддзяў складаў: малака — 415,2 ц, мяса — 63,2 ц. Удой на 1 карову за гэтыя гады павялічыўся на 246 кг, аднак у 1970 годзе ён заставаўся на ўзроўні 2365 кг. Раён не выканаў план 8-й пяцігодкі (1966—1970 гг.) па вытворчасці малака.

У 1970 г. у калгасах і саўгасах раёна было ўжо 525 трактароў, 184 зернеўборачныя камбайны. Акрамя таго меліся сотні сельскагаспадарчых машын, плугоў, сеялак, культыватараў. На жывёлагадоўчых фермах было ўстаноўлена 88 даільных установак, 87 транспарцёраў для ўборкі гною, дзесяткі транспарцёраў ТВК-80 для

раздачы кармоў, пабудавана 6 механізаваных кармацэхаў і 18 зернятокаў.

Павольна, але расце дабрабыт працаўнікоў сельскай гаспадаркі. У 1968—1970 гг. аплата аднаго чалавека-дня калгасніка павялічылася на 31,1% і склала больш за 3 рублі. Для калгаснікаў, рабочых і служачых у раёне за гэтыя гады пабудавалі 244 кватэры, 1120 індывідуальных дамоў, 149 сем'яў перасяліліся з хутароў на цэнтральныя сядзібы гаспадарак.

У 1973 г. калгасы і саўгасы раёна сабралі з кожнага гектара ў сярэднім па 23,4 ц збажыны, ці на 8,2 ц больш, чым у 1968—1970 гг. Валавы збор збажыны дасягнуў 44 386 тон. Найлепшых вынікаў дасягнулі калгасы «За мір», дзе было атрымана 29,1 ц зерня, саўгас «Прыбужжа» — 28,1 ц, калгас «Краіна Саветаў» і саўгас «Брэсцкі» — па 27 ц з гектара. У гэтым годзе гаспадаркі раёна прадалі дзяржаве больш за 2 планы зерня.

Працягваў расці машынны парк гаспадарак. За тры гады (1971—1973) калгасы і саўгасы атрымалі 266 трактароў, 157 зернеўборачных, бульба- і сіласаўборачных камбайнаў, вялікую колькасць розных сельскагаспадарчых машын і абсталявання. Павысілася канцэнтрацыя пагалоўя жывёлы. У сярэднім на адну гаспадарку ў 1973 г. прыходзілася 1700 галоў буйной рагатай жывёлы і столькі ж свіней.

Вытворчасць малака на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў у 1975 г. склала 564 ц. Рост вытворчасці малака ў 9-й пяцігодцы (1971—1975) склаў 125%, а продаж — 127% у параўнанні з узроўнем 8-й (1966—1970). У 1975 г. на 100 га сельгасугоддзяў прыходзілася 60 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 20 кароў. Было выраблена каля 7 тысяч тон мяса, ці па 107,6 ц на 100 га сельгасугоддзяў.

За гады дзевятай пяцігодкі валавая прадукцыя калгасаў і саўгасаў узрасла на 30,4%. Вытворчасць зерня ў параўнанні з 8-й пяцігодкай павялічылася на 87%, бульбы — 19, цукровых буракоў — 15, гародніны — 65, малака — 24, мяса — 70, яек — 33, воўны — на 27%. Калгасы і саўгасы раёна за 5 гадоў (1971—1975) атрымалі 453 трактары, 98 зернеўборачных, 61 бульбаўборачны і 89 сіласаўборачных камбайнаў.

Самаадданая праца людзей была адзначана дзяржавай. За дзевятую пяцігодку звыш 230 працаўнікоў сельскай гаспадаркі раёна былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, ганаровымі граматамі і граматамі Вярхоўнага Савета БССР, каля 800 чалавек атрымалі знакі «Пераможца сацыялістычных спаборніцтваў» і «Ударнік 9-й пяцігодкі». Аплата аднаго чалавека-дня калгасніка ўзрасла да 4,12 рубля.

Павысіўся прафесійны ўзровень кіраўнікоў гаспадарак. У 1975 г. з 24 старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў усе з'яўляліся спецыялістамі сельскай гаспадаркі, 20 мелі вышэйшую адукацыю.

На 100 га сельгасугоддзяў у 1977 г. было выраблена 587 ц малака і 130 ц мяса, а ў шасці гаспадарках раёна — больш за 700 ц малака, у 5 гаспадарках — больш за 150 ц мяса. Усе саўгасы і калгасы працавалі прыбыткова, а ўзровень рэнтабельнасці склаў 27%. За дасягнутыя вынікі па вытворчасці зерня і малака ў 1977 г. раён быў узнагароджаны Дыпломам II ступені ВДНГ СССР.

На 1 студзеня 1978 г. у раёне было 14 калгасаў, 8 саўгасаў і адна птушкафабрыка. Пад сельскагаспадарчыя ўгоддзі было занята 69,2 тыс. га зямлі (43,2% тэрыторыі раёна), з іх 15,3 тыс. га асушаных зямель. Агульная плошча пасеваў у 1977 г. склала 42,3 тыс. га, у тым ліку пад збожжавымі — 19,9, цукровымі буракамі — 0,8, бульбай — 5,9, кармавымі культурамі — 15 тыс. га. У гаспадарках раёна ў 1978 г. налічвалася 50,7 тыс.

галоў буйной рагатай жывёлы (у тым ліку 20,6 тыс. кароў), 8,1 тыс. свіней, 2,7 тыс. авечак.

На XXI Брэсцкай раённай партыйнай канферэнцыі ў лістападзе 1978 г. адзначалася, што ўраджайнасць збажыны дасягнула 30,8 ц з гектара. Валавы збор зерня склаў 61 тысячу тон. Найвышэйшых вынікаў дасягнулі: калгас імя Леніна — 37 ц, «За мір» — 36,3 ц, «Пагранічнік» — 35,8 ц, саўгас «Брэсцкі» — 35,5 ц з кожнага гектара. Сярэднегадавая ўраджайнасць зерневых культур за 1976—1978 гг. у параўнанні з 1971—1973 гг. узрасла на 7 ц, бульбы — на 75 ц, цукровых буракоў — на 60 ц з кожнага гектара. У выніку спецыялізацыі і канцэнтрацыі ў саўгасах раёна ў 2,5 раза павялічылася вытворчасць гародніны.

Да пачатку 1980-х гадоў у раёне быў у асноўным завершаны працэс спецыялізацыі і канцэнтрацыі ў земляробстве і жывёлагадоўлі. 5 саўгасаў малочна-гародніннага трэста займаліся вырошчваннем гародніны і кожны год пастаўлялі ў гандлёвую сетку Брэста не менш як 10 тысяч тон садавіны і гародніны. Закончылася будаўніцтва цяплічнай гаспадаркі ў саўгасе «Брэсцкі». Саўгас «Рассвет» пачаў спецыялізавацца на садаводстве. Пры дапамозе спецыялістаў з Польшчы тут быў закладзены пальметны сад, плошчу якога планавалася давесці да 800 га.

Асабліва прыкметны быў працэс спецыялізацыі і канцэнтрацыі ў жывёлагадоўлі. У раёне ўтварылася авечкагадоўчая гаспадарка, а таксама птушкафабрыка, былі пабудаваны малочны комплекс на 800 галоў у саўгасе «Маладая гвардыя», комплекс па вырошчванні цялушак на 1200 галоў у калгасе «Іскра», будаваўся малочны комплекс у калгасе «Зара», а таксама комплекс па адкорме буйной рагатай жывёлы ў калгасе імя Дзяржынскага. У 1980—1981 гг. закончылася будаўніцтва буйнога жывёлагадоўчага комплекса «Заходняе» на 54 тыс. галоў адкорму ў год, пачала працаваць першая чарга камбіната па вытворчасці ялавічыны ў калгасе «Памяць Ільіча».

У складаных кліматычных умовах ішла барацьба за ўраджай 1980 г. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых па раёне склала ўсяго 21 ц з гектара. Павольна раслі надоі. Сярэдні ўдой на карову за дзесятую пяцігодку (1976—1980) павялічыўся толькі на 90 кг. У большасці гаспадарак сярэднясутачныя прывесы буйной рагатай жывёлы не перавышалі 400 г, а свіней — 200—250 г. Нягледзячы на сціслыя эканамічныя паказчыкі, працягваўся рост заработнай платы. У 1980 г. аплата аднаго чалавека-дня рабочых саўгасаў і калгасаў дасягнула 6 руб.

1980-я гады былі адметныя пошукамі новых падыходаў да вырашэння харчовай праблемы. Актыўна пачаў выкарыстоўвацца сямейны падрад. Аднымі з першых у раёне перайшлі на сямейны падрад па адкорме маладняка буйной рагатай жывёлы муж Канстанцін Герасімавіч і жонка Наталля Яўгенаўна Стараверавы. У першым паўгоддзі 1987 г. сярэднясутачныя прывесы маладняку склалі тут 807 г, а затраты працы на адзін цэнтнер прывесу — 8 чалавека-гадзін пры сярэднераённым паказчыку 22 чалавека-гадзіны.

У калгасе «Расія» паспяхова працаваў сямейны калектыў жывёлаводаў Веры Купрыянаўны і Івана Фёдаравіча Мельнічукоў. З пераходам на сямейны падрад надоі ад кожнай з 50 кароў іх групы павялічыліся на 1728 кг і дасягнулі 3994 кг. Усяго ж у раёне ў 1987 г. дзейнічалі 23 сямейныя калектывы і 8 калектываў інтэнсіўнай працы.

Шмат увагі ў раёне надавалася стварэнню ўмоў для высокапрадукцыйнай працы. Клопаты пра людзей,

пра іх быт, вольны час давалі добрыя вынікі. Цудоўны прыклад такіх адносін паказвалі ў калгасе-камбінаце «Памяць Ільіча». Невыпадкова ўраджайнасць у калгасе паднялася за адзінаццатую пяцігодку (1981—1985) з 17 да 44,2 ц з гектара. У 1987 г. у гаспадарцы атрымалі з гектара па 266 ц бульбы, 460 ц кармавых карняплодаў, надоі малака на карову павялічыліся на 174 кг і дасягнулі 3800 кг.

У 1987 г. у раёне ўтварыўся клуб даярак-чатырохтысячніц. Ужо праз 2 гады ў яго ўваходзіла 91 даярка. На чале клуба стаяла Герой Сацыялістычнай Працы Л.Д.Брызга, якая ў 1985 г. перайшла на адстаючую ферму і за адзін год дабілася павелічэння надояў на 1871 кг. У 1987 г. надой на карову дасягнуў у яе групе з 85 галоў 6245 кг.

Спрыяльным выдаўся для працаўнікоў сельскай гаспадаркі раёна 1989 год. Ураджайнасць збожжавых у сярэднім па раёне склала 37,2 ц з гектара (у 1988—27,2 ц). А ў калгасе-кааператыве «Знамя» сабралі з кожнага гектара па 44,9 ц, у калгасе-камбінаце «Памяць Ільіча» — 44,2 ц, у калгасах «За мір» і імя Дзяржынскага —больш за 43 ц.

У параўнанні з мінулым годам вытворчасць малака выросла на 2,4%, воўны — на 8,5%, аднак вытворчасць мяса не павялічылася. На 100 га сельгасугоддзяў было выраблена 1048 ц малака. У сярэднім ад кожнай каровы надаілі па 3726 кг, гэта на 107 кг больш, чым у 1988 г. У пяці гаспадарках раёна — калгасе «Памяць Ільіча», «Беларусь», саўгасах «Брэсцкі», «Рассвет», імя Кісялёва —перавысілі чатырохтысячны ўзровень надояў малака. Быў выкананы план нарыхтовак па ўсіх відах прадукцыі сельскай гаспадаркі. Звыш плана сельскія працаўнікі раёна прадалі дзяржаве 8,2 тыс. т бульбы, 7,2 тыс. т садавіны, 2,3 тыс. т малака, 650 т мяса, у два разы быў перавыкананы план па нарыхтоўцы воўны.

Аплата працы калгаснікаў выросла ў 1989 г. да 248 руб.

Цяжкімі выдаліся для сельскіх працаўнікоў раёна 1990-я гады. Разбурэнне эканамічных сувязяў, ігнараванне патрэб сяла прывялі да рэзкага скарачэння вытворчасці асноўных відаў сельскагаспадарчай прадукцыі. У 1992 г. на 100 га сельгасугоддзяў было выраблена толькі 287,8 ц мяса. Вытворчасць малака панізілася ў 1992 г. на 18,4% у параўнанні з 1991 г., а ў параўнанні з сяроднегадавым паказчыкам за мінулыя пяць гадоў (1988—1992) — на 20,6%. Паменшылася пагалоўе буйной рагатай жывёлы, кароў, свіней. Не магло не змяніць становішча ў сельскай гаспадарцы ўзнікненне фермерскага руху. У 1997 г. у раёне было 40 фермерскіх гаспадарак, якія валодалі 348 га зямлі.

У 1991—1995 гг. ураджайнасць збожжавых па раёне была 31,5 ц, бульбы — 104 ц, цукровых буракоў — 249 ц. Удоі на адну карову склалі 3120 кг, а сярэднясутачныя прывесы на адкорме буйной рагатай жывёлы — 498 г. Але ж, нягледзячы на ўсе цяжкасці, працаўнікі сельскай гаспадаркі не дапусцілі абвальнага спаду вытворчасці, паступова нарошчваюць аб'ёмы сельскагаспадарчай прадукцыі.

Прамысловасць і будаўніцтва. Адраджэнне прамысловасці ў раёне пачалося з райпрамкамбіната. Ужо ў 1944 г. было адноўлена і працавала 12 прадпрыемстваў і майстэрняў, якія далі прадукцыі ў даваенных цэнах на 117 346 руб. У 1945 г. пачалі працаваць яшчэ 9 прадпрыемстваў, у тым ліку 3 млыны (Кошалева, Лышчыцы, Шумакі) і мелавапняковы завод у Матыкалах. За 1945 г. райпрамкамбінат выпусціў прадукцыі на 409 413 руб. На 1 ліпеня 1946 г. у яго складзе дзейнічалі 8 млыноў (Цюхінічы,

Чарнаўчыцы, Матыкалы, Кашылава, Лышчыцы, Сычы, Шумакі, Страдзеч), 3 кузні (Гершоны, Бердычы, Кашылава), цагельня № 70 у Грузнях, мылаварня ў Пугачове, мела-вапняковы завод у Матыкалах, швейная і трыкатажная майстэрні ў Чарнаўчыцах, швейная майстэрня ў Казловічах, 5 шавецкіх майстэрняў (Чарнаўчыцы, Цюхінічы, Сычы, Казловічы, Астрамечава), рымарская майстэрня ў Казловічах, колаабадная і бляшаная майстэрні ў Матыкалах, шубапашывачная і аўчынадубільная майстэрні ў Сычах, воўначасальная і сталярная майстэрні ў Чарнаўчыцах. Усяго ў райпрамкамбінаце працавала 147 чалавек.

У 1948 г. на тэрыторыі раёна дзейнічалі цагельня № 22 Міністэрства будматэрыялаў БССР, малочны завод Міністэрства мясамалочнай прамысловасці БССР, райпрамкамбінат, 3 торфазаводы (Лышчыцы, Блювінічы, Тэльмы).

Усе прамысловыя прадпрыемствы, за выключэннем малочнага завода, адчувалі вострыя недахоп працоўнай сілы.

Цагельня № 70 райпрамкамбіната 23 жніўня 1948 г. пачала абпал цэглы і фармоўку новага віду прадукцыі — чарапіцы.

На цагельні № 22 у 1949 г. было выраблена 2,7 штукі цэглы і 1120 тыс. штук чарапіцы. Тут былі ўтвораны 3 брыгады выдатнай якасці: па фармоўцы сырцу на прэсе «Крок» (брыгадзір Уладзімір Зашчук), брыгада ўкладчыц (брыгадзір Вольга Стэльмашук), брыгада садчыкаў цэглы ў гофпечы (брыгадзір Дзмітрый Карпук). Усяго брыгадамі выдатнай якасці было ахоплена 36 чалавек. Усё гэта дазволіла прыкметна палепшыць якасць прадукцыі. Сярод лепшых працаўнікоў былі выгрузчык Міхаіл Воўк, закідчык Сцяпан Зданевіч, глінакоп Сцяпан Сухонь, садчык Міхаіл Смаль. Сярэдняя зарплата рабочага на фармоўцы складала 500—600 руб.

Малочны завод у 1949 г. засвоіў выпуск новага віду прадукцыі: марожанага малочнага, шакаладнага, сметанковага і сметанкова-шакаладнага. Усяго за гэты год было выраблена 747 т масла, 350 марожанага, 1327 кісламалочнай прадукцыі, 47,8 казеіну, 201 тварагу, 75 сырковай масы, 260 т прастаквашы.

З трох торфапрадпрыемстваў у 1949 г. з планам спраўляліся толькі ў Блювінічах. Асноўная прычына — недахоп рабочых рук. На торфазаводзе «Тэльмы» ў 1949 г. працавала 11 звенняў, 3 з якіх — выдатнай якасці. Так, звяно Васіля Казловіча кожны месяц давала торфацэглы на 1 тыс. штук вышэй нормы. Гэта звяно на 11 дзён раней тэрміну закончыла сезоннае заданне па здабычы торфу і звыш плана дало больш за 100 тыс. штук торфацэглы. Калі ў 1948 г. адна тона торфу абыходзілася заводу ў 92 руб., то ў 1949 г. — у 45 руб.

У верасні 1949 г. на торфазаводзе «Тэльмы» працавала 35 чалавек (сярэдняя зарплата 172 руб.), «Лышчыцы» — 31 чалавек (252 руб.), «Блювінічы» — 26 чалавек (221 руб.), на цагельні № 22 — 130 чалавек (448 руб.) і Брэсцкім хімлеспрамгасе — 166 чалавек (437 руб.).

У 1950-я гады прамысловая індустрыя раёна атрымала далейшае развіццё. У 1951—1952 гг. на цагельні № 22 была пабудавана тунэльная сушка магутнасцю 6 млн. штук цэглы ў год. Для рабочых завода быў пабудаваны двухпавярховы клуб на 150 месцаў, лазня і жылы дом плошчай 42 м². На цагельні № 70 райпрамкамбіната пабудаваны 4 сушыльныя сараі для сушкі цэглы і чарапіцы, а таксама чатырохкватэрны дом для рабочых плошчай 150 м², вялося будаўніцтва яшчэ аднаго такога дома. План 1951 г. цагельня выканала на 147%, а 1952 г. — на 116%. Камбінат



Першая ў раёне дызельная электрастанцыя, калгас «Пагранічнік».

будаўнічых матэрыялаў адпаведна на 116% і 103,3%. Была пабудавана і пушчана ў эксплуатацыю Цюхініцкая ГЭС магутнасцю 50 кілават. Яна абслугоўвала калгасы імя Калініна, імя Леніна і імя Сталіна.

Ішлі гады. Усё новыя аб'екты прамысловага, гандлёвага і культурна-бытавога прызначэння будаваліся ў раёне. Выраслі новыя цэнтры ў саўгасах «Мухавец», «Брэсцкі», «Знамя», «Беларусь», «Дамачаўскі». Вуліцы забудоўвалі новымі, выгоднымі дамамі. На вачах пераўтвараліся сёлы і вёскі. За перыяд з 1946 г. па 1964 г. у раёне было пабудавана больш за 7 тыс. дамоў. Толькі за 1960—1965 гг. пабудавана 1839 жылых дамоў, капітальна адрамантавана 3377, перакрыта саламяных дахаў 257, пабудавана 16 магазінаў, 20 прадпрыемстваў грамадскага харчавання, 16 школ, 10 клубаў, 2 дзіцячыя садкі і хлебапякарня ў г.п. Дамачава.

З 212 населеных пунктаў раёна ў 1996 г. было электрыфікавана 186, радыёфікавана 191. Працаўнікі раёна мелі 4162 радыёпрыёмнікі, 582 тэлевізары, 1072 матацыклы, 12 497 веласіпедаў і 28 аўтамабіляў ва ўласным карыстанні. За гады восьмай пяцігодкі (1966—1970) агульны аб'ём капітальных укладанняў у будаўніцтва па раёне склаў больш за 10 млн. руб. За гэты перыяд было ўведзена ў эксплуатацыю 125 буйных аб'ектаў прамысловага і культурна-бытавога прызначэння. Умацавалася будаўнічая база МСО і ПМК-8. Пяцігадовы план будаўніча-мантажных работ быў перавыкананы. Паспяхова справіўся з заданнем пяцігодкі і калектыў ДЭУ-138.

Значна пашыралася сетка гандлю і грамадскага харчавання. У 1965 г. у раёне працавала 140 гандлёвых прадпрыемстваў, ці на 30% больш, чым у 1940 г. Рознічны тавараабарот кааператыўнага гандлю за перыяд з 1940 г. па 1965 г. вырас амаль у 7 разоў. За тры гады дзевятай пяцігодкі (1971—1973) аб'ём капітальных укладанняў склаў звыш 21 млн. руб. За гэты перыяд былі здадзены ў эксплуатацыю 177 аб'ектаў прамысловага, жыллёвага і культурна-бытавога прызначэння. У параўнанні з 1970 г. сярэднямесячная зарплата рабочых і служачых павялічылася на 12% і склала ў 1973 г. 122 руб., а да канца дзесятай пяцігодкі (1976—1980) — ужо 160 руб.

У 1975 г. у раёне ўступілі ў эксплуатацыю 2 новыя АТС на 100 нума-

роў: адна ў калгасе «За мір», другая на Мяднянскай птушкафабрыцы. Пашырылася ёмістасць АТС у Мухаўцы і Тэльмах. Усяго ў раёне дзейнічала 14 АТС агульнай ёмістасцю 1100 нумароў. Працаўнікоў раёна абслугоўвалі 32 аддзяленні сувязі.

Раённыя ўлады ўвесь час клапаціліся пра малазабяспечаныя сем'і і ветэранаў вайны. У 1971—1976 гг. для малазабяспечаных сем'яў было пабудавана 12 і адрамантавана 99 дамоў, аказана грашовая дапамога ў суме 23 тыс. руб., выдадзена 1073 кубаметры лесаматэрыялаў, 132 інваліды Вялікай Айчыннай вайны атрымалі пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку.

За гады дзесятай пяцігодкі (1976—1980) агульны аб'ём прамысловай вытворчасці ў раёне павялічыўся на 68% замест 26% па плане. Па ўсіх крыніцах фінансавання было засвоена больш за 51 млн. руб. капітальных укладанняў, на 36 млн. руб. выканана будаўніча-мантажных работ, гэта на 12 млн. руб. больш, чым у дзевятай пяцігодцы (1971—1975). Уведзена ў эксплуатацыю 185 аб'ектаў вытворчага, жыллёвага і культурна-бытавога прызначэння. Сярод іх 12 прамтаварных і прадуктовых магазінаў агульнай плошчай 1920 м², сетка прадпрыемстваў грамадскага харчавання пашырылася на 504 пасадачныя месцы. У раёне пачалі будавацца цэлыя гандлёвыя комплексы. Яны адкрыліся ў вёсках Тэльмы, Медна, Чэрні, г.п. Дамачава. Пачалі працаваць 22 комплексныя прыёмныя пункты бытавых паслуг.

У дванаццатай пяцігодцы (1986—1990) у раёне было ўведзена ў дзеянне асноўных фондаў на суму больш як 180 млн. руб. У сярэднім за год будавалася больш за 22 тыс. м² жылля, на 6 тыс. болей, чым у адзінаццатай пяцігодцы (1981—1985).

За пяць гадоў пабудаваны 2 сярэднія школы, 5 дзіцячых садкоў, Дом культуры, 12 магазінаў і сталовых, 9 прадпрыемстваў бытавога абслугоўвання, 7 медыцынскіх аб'ектаў.

Сёння ў Брэсцкім раёне дзейнічаюць 8 прамысловых прадпрыемстваў розных формаў уласнасці, якія вырабляюць мноства разнастайнай прадукцыі: зборны жалезабетон, сценавыя і піламатэрыялы, дзелавую драўніну, запасныя часткі, швейныя вырабы і інш. Удзельная вага дзяржаўнага сектара ў агульным аб'ёме вытворчасці складае 76,4%.

Адукацыя. Працаўнікі раёна пачалі актыўна аднаўляць аб'екты народнай адукацыі, і да 1 верасня 1944 г. было адчынена 63 школы (з іх 17 — сямігадовыя) з агульнай колькасцю вучняў 5700 чалавек.

У 1946/47 навучальным годзе ў раёне працавала 59 школ, з якіх 16 няпоўныя сярэднія з колькасцю вучняў 6164. Паспяховасць у гэтым годзе склала 78,1%. Многія вучні не хадзілі ў школу з-за адсутнасці абутку і вопраткі, дрэнных дамашніх умоў. У 1946/47 навучальным годзе адкрыліся школы ў в. Новыя Задворцы, а ў 1947/48 — у вёсках Закій Камянец-Жыровецкага і Пескі Клейнікаўскага сельсаветаў. За перыяд з 1944 г. па 1948 г. былі пабудаваны і прыстасаваны пад школы і кватэры для настаўнікаў 23 будынкі.

У 1946/47 навучальным годзе дзяржаўныя выдаткі на адукацыю склалі 1 998 300 руб., а ў наступным — 2 241 339 рублёў.

У 1948 г. у школах раёна працавалі 226 настаўнікаў. З іх вышэйшую адукацыю мелі толькі 10 чалавек, незакончаную вышэйшую — 49, сярэднюю педагагічную — 130, няпоўную сярэднюю — 37.

Больш як палова настаўнікаў раёна мела педагагічны стаж, меншы за 5 гадоў, і толькі 33 чалавекі — ад 10 да 20 гадоў.

Вайна пакінула цяжкую спадчыну. У раёне ў 1948 г. былі 972 непісьменныя і 1271 малапісьменны. Для іх

адчынілася 12 школ і 83 групы граматы, дзе навучаліся 1759 чалавек. 470 чалавек вучыліся ў 11 школах сельскай моладзі. Да 1950 г. непісьменнасць сярод дарослага насельніцтва амаль знікла.

У 1949 г., у адпаведнасці з урадавай пастановай, у сельскай мясцовасці была ўведзена абавязковая сямігадовая адукацыя. Прыйшлося павялічыць сетку сямігадовых і сярэдніх школ.

У 1950/1951 навучальным годзе ў раёне дзейнічалі ўжо 3 сярэднія школы, 18 сямігадовых, 40 пачатковых, дзе навучаліся 6400 дзяцей. Да 1948 г. школы раёна не давалі сярэдняй адукацыі, а ў 1950 г. атэстаты атрымалі 19 чалавек. 17 дзяцей калгаснікаў навучаліся ў ВНУ.

У 1950 г. на народную адукацыю было затрачана 3,9 млн. руб., ці 60% раённага бюджэту.

У 1950/51 навучальным годзе вышэйшую адукацыю мелі ўжо 17 настаўнікаў раёна, незакончаную вышэйшую — 140, сярэднюю — 137.

Значныя сродкі выдзяляліся на развіццё матэрыяльнай базы адукацыі ў 1960-я гады. У 1966 г. у раёне працавала ўжо 96 агульнаадукацыйных школ, з іх 16 — сярэднія, 27 — васьмігадовыя і 53 — пачатковыя, школа-інтэрнат, дзіцячы дом і 6 дзіцячых садкоў. Школы раёна былі добра ўкамплектаваны педагагічнымі кадрамі, усе дырэктары сярэдніх і васьмігадовых школ, акрамя двух (навучэнцаў завочнага аддзялення ВНУ), мелі вышэйшую адукацыю і вялікі педагагічны стаж. З 802 настаўнікаў і выхавальнікаў 488 чалавек мелі вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю, 224 — сярэднюю педагагічную, а 126 вучыліся завочна.

Улетку для школьнікаў раёна ствараліся аздараўленчыя пляцоўкі, працавалі піянерскія лагеры. У 1966 г. у піянерскім лагеры «Селяхі» адпачылі 260 вучняў, у гарадскім лагеры ў г.п. Жабінка — 140.

У межах падрыхтоўкі да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі пабудавалі Страдзецкую школу на 320 вучняў, Гершонскую і Чэрнінскую васьмігадовыя школы на 240 месцаў кожная. Закончылася пашырэнне Холміцкай і Вельямовіцкай васьмігадовых школ на 120 вучняў. У раёне працавала 31 група падоўжанага дня, дзе займаліся 1237 вучняў. Было арганізавана харчаванне ў 10 сталовых і буфетах, дзе абслугоўваліся 4,7 тыс. школьнікаў.

У 1978 г. у раёне працавала ўжо 11 сярэдніх, 15 васьмігадовых, 11 пачатковых школ, дзіцяча-юнацкая спартыўная і музычная школы, Дом піянераў і школьнікаў, 13 дашкольных устаноў. Значна пашырылася сетка клубаў інтэрнацыянальнай дружбы, у многіх школах утварыліся пакоі і музеі рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы. Музей Мухавецкай СШ у 1980 г. заняў першае месца ў рэспубліцы.

У 1990 г. Брэсцкаму раёну споўнілася 50 гадоў. Да гэтага часу ў раёне працавала 15 сярэдніх, 13 васьмігадовых і 8 пачатковых школ, 2 вучэбна-вытворчыя камбінаты, школа-інтэрнат і 22 дзіцячыя дашкольныя ўстановы.

Ахова здароўя. Адразу пасля вызвалення раёна пачалося адраджэнне сістэмы аховы здароўя. Летам 1946 г. пачалі працаваць бальніцы ў Чэрнях (на 20 ложкаў) і Лышчыцах (на 15). У раёне праводзілася вялікая прафілактычная работа, рабіліся прышчэпкі супраць воспы і брушнога тыфу. Гэта дазволіла пазбегнуць эпідэмій. Калі ў 1946 г. у раёне было 28 выпадкаў захворвання на сыпны тыф, то ў 1947 г. іх было толькі 8.

У 1948 г. у раёне працавалі 3 урачэбна-бальнічныя ўчасткі на 40 ложкаў: Лышчыцкі, Чэрнінскі, Чарнаўчыцкі; 5 фельчарска-акушэрскіх

пунктаў: Жыравецкі, Збіражскі, Матыкальскі, Страдзецкі і Сычоўскі.

У выніку цяжкасцей і нястачы пасляваеннага жыцця нараджальнасць была зусім нізкая. За 8 месяцаў 1948 г. у раёне нарадзілася толькі 479 дзяцей. Вельмі высокая была смяротнасць. На ўвесь раён было толькі 52 медработнікі, з якіх усяго 9 урачоў (у тым ліку 3 зубныя), 12 фельчараў, 8 акушэрак, 20 медсясцёр і 3 дэзінфектары.

Тым не менш, нават у гэтых складаных умовах у 1947 г. 10 працаўнікоў раёна змаглі паправіць сваё здароўе на курортах краіны, а ў 1948 г. планавалася паслаць ужо 22 чалавекі.

Не хапала самага неабходнага. Калі нават у 1944 г. у раёне дзейнічала 21 лазня, то ў 1947 г. іх засталося толькі 7, за што кіраўніцтва раённага аддзела аховы здароўя падверглася сур'ёзнай крытыцы.

Паступова матэрыяльная база аховы здароўя ўмацоўвалася. У сярэдзіне 1960-х гадоў на тэрыторыі раёна дзейнічала ўжо 37 медыцынскіх устаноў, дзе працавала 27 урачоў і 203 сярэднія медыцынскія работнікі.

У 1964 г. пачала працаваць Чарнаўчыцкая бальніца. Забеспячэнне насельніцтва медыцынскай дапамогай склала 4,6 ложка на тысячу чалавек. Значна зменшылася дзіцячая смяротнасць, у 1964 г. яна складала 18 чалавек на тысячу, а ў 1963 г. — 33. Памяншалася і колькасць інфекцыйных захворванняў.

У 1967 г. у раёне працавала 6 бальніц, 21 фельчарска-акушэрскі пункт і 3 амбулаторыі.

На беразе Рагазнянскага возера ў 1976 г. быў пабудаваны міжкалгасны санаторый «Бярэсце» на 250 ложкаў. Тут былі фізіятэрапеўтычнае і бальнеагразелячэбнае аддзяленні, хваёвыя, марскія, кіслародныя, жамчужныя, вуглякіслыя і іншыя лячэбныя ванны. Пуцёўкі для працаўнікоў раёна аплачвалі прафсаюзныя арганізацыі калгасаў і саўгасаў.

У дзесятай пяцігодцы (1976—1980) працягвала ўмацоўвацца матэрыяльная база аховы здароўя, засвойваліся новыя метады дыягностыкі і лячэння працаўнікоў сяла, медыцынскія ўстановы папаўняліся кваліфікаванымі кадрамі.

У 1980 г. сетка лячэбна-прафілактычных устаноў раёна ўключала раённую бальніцу на 100 ложкаў, паліклініку на 18 наведванняў у змену, размешчаныя ў старых прыстасаваных будынках. Была таксама гарадская бальніца на 75 ложкаў з паліклінікай у г.п. Дамачава, чатыры ўчастковыя бальніцы на 125 ложкаў, 3 амбулаторыі і 21 фельчарска-акушэрскі пункт. У раёне працавалі 46 урачоў і 154 сярэднія медработнікі. Забяспечанасць насельніцтва медыцынскімі кадрамі была значна ніжэйшая, чым у сярэднім па вобласці.

На пачатку 11-й пяцігодкі (1981—1985) у раёне распрацавалі спецыяльную праграму будаўніцтва аб'ектаў аховы здароўя. У 1986 г. пачала працаваць раённая паліклініка на 375 наведванняў у змену, Лышчыцкая ўчастковая бальніца пашырылася да 50 ложкаў, адкрылася амбулаторыя ў в. Вялікія Радванічы і фельчарска-акушэрскія пункты ў вёсках Клейнікі і Івахнавічы.

У 1988 г. уведзены ў эксплуатацыю тэрапеўтычны корпус на 120 ложкаў у раённай бальніцы, а ў 1990 г. — фельчарска-акушэрскія пункты ў вёсках Чэрск і Забалацце. У 1933—1996 гг. пабудаваны амбулаторыі ў вёсках Камароўка, Кавердзякі, Астрамечава, Тэльмы, Камяніца-Жыравецкая.

У 1996 г. сетка медыцынскіх устаноў раёна складалася з раённай бальніцы на 140 ложкаў і паліклінікі на 375 наведванняў у змену, бальніц у г.п. Дамачава, вёсках Чарнаўчыцы, Лышчыцы, Чэрні і Медна на 210

ложкаў, 9 амбулаторый і 20 фельчарска-акушэрскіх пунктаў.

З 1986 г. у новай раённай паліклініцы прымаюць хворых такія спецыялісты, як фтызіятр, дэрматавенеролаг, анколаг, псіхіятр, нарколаг. Працуюць кабінеты функцыянальнай і ультрагукавой дыягностыкі, зубапратэзны, фізіятэрапеўтычны, эндаскапічны. Жыхары раёна маюць магчымасць амбулаторна-паліклінічнай дапамогі па 26 урачэбных спецыяльнасцях.

У 1996 г. у раёне працавалі ўжо 123 урачы і 336 сярэдніх медработнікаў, забяспечанасць насельніцтва ўрачамі на 10 тыс. чалавек склала — 29,7 (па вобласці — 34,6), сярэднім медперсаналам — 81,2 (103,3). Дзіцячая смяротнасць на тысячу народжаных паменшылася з 12,6 у 1985 г. да 9,2 у 1995 г.

Культура. Адначасова з аднаўленнем разбуранай вайной эканомікі ў раёне пачалося адраджэнне культурнага жыцця. 15 кастрычніка 1944 г. у Дамачаўскім раёне (пазней ён увайшоў у склад Брэсцкага) з'явіўся першы нумар раённай газеты «Сталінец». У 1951 г. ужо дзейнічалі раённы Дом сацыялістычнай культуры, 3 сельскія дамы культуры і 19 хатчытальняў, раённая і 4 сельскія бібліятэкі з кніжным фондам 30 тыс. кніг. У раёне было 26 калгасных бібліятэк, аднак 20 калгасаў іх яшчэ не мелі.

З кожным годам расла колькасць удзельнікаў мастацкай самадзейнасці. У 1951 г. у раёне працавала 102 гурткі, з іх 20 драматычныя, 15 харавыя, 11 музычныя, 5 танцавальныя, 4 ваенна-абаронныя і інш. У іх займаліся 1200 чалавек. І калі ў 1948 г. толькі ў трох клубах (Гершонскім, Камяніца-Жыравецкім, Страдзецкім) дэманстраваліся кінафільмы, то ўжо ў 1951 г. да паслуг аматараў кіно меўся і паўстацыянар, і 9 кінаперасовак.

На ніве культуры ў 1951 г. працавалі 32 культасветработнікі, аднак сярод іх не было ніводнага чалавека з вышэйшай адукацыяй.

Пашыралася раённая сетка радыёфікацыі: у 1952 г. у 13 калгасах мелася 1213 радыёкропак. У хатах калгаснікаў было ўстаноўлена 405 радыёпрыёмнікаў.

У 1960-я гады матэрыяльная база культуры значна змянілася. У сярэдзіне 1960-х працаўнікоў раёна абслугоўвалі ўжо 73 клубныя ўстановы, гэта ўтрая больш, чым у 1940 г.; 23 масавыя бібліятэкі з кніжным фондам больш за 333 тыс. экзэмпляраў.

Насельніцтва раёна выпісвала каля 40 тыс. газет і часопісаў. У карыстанні вяскоўцаў знаходзілася 5 тыс. радыёпрыёмнікаў, больш за тысячу тэлевізараў. Усе населеныя пункты раёна былі радыёфікаваны.

У 1970 г. у раёне было 40 клубаў, 30 бібліятэк і 50 кінаперасовак.

У 1978 г. у раёне дзейнічалі 48 клубных і 58 бібліятэчных устаноў, 51 кінаўстаноўка (у тым ліку 45 стацыянарных).

У 1980 г. у жыхароў раёна было 10 326 тэлевізараў і радыёпрыёмнікаў, больш за 11 тыс. радыёкропак.

Далейшае развіццё атрымала самадзейная мастацкая творчасць. Пры дамах культуры і клубах працавалі 125 калектываў мастацкай самадзейнасці, у тым ліку 22 харавыя, 13 танцавальных, 21 драматычны, 17 агітацыйна-мастацкіх брыгад, якія аб'ядналі 1780 аматараў мастацтва. Штогод для жыхароў раёна яны давалі каля 600 канцэртаў.

Спорт. Ужо ў чэрвені 1947 г. зборная каманда па футболе г.п. Дамачава прымала ў сябе адну з наймацнейшых каманд Брэста «Лакаматыў» і перамагла. Футбольная каманда г.п. Дамачава ў 1950 г. зрабілася чэмпіёнам Брэсцкай вобласці, а ў наступным годзе аказалася другой.

У 1951 г. у раёне ўтварылася

ДССТ «Калгаснік», у якое ўвайшлі ўсе 49 калгасаў. У раёне налічвалася 78 калектываў фізкультуры, якія аб'ядналі больш за 6,5 тыс. чалавек. У спартыўных секцыях па 24 відах спорту займалася больш за 8 тыс. чалавек. У 1951 г. адбыліся 82 спартыўныя спаборніцтвы.

У 1966 г. у раёне адкрылася дзіцяча-юнацкая спартыўная школа. На двух аддзяленнях — веласіпеднага спорту і бокса — тут займалася 250 вучняў. У 1991 г. ДзЮСШ пераўтварылася ў дзіцяча-юнацкі клуб фізічнай падрыхтоўкі. Сёння ў ім займаецца больш як тысяча вучняў. Тут працуюць гурткі па лёгкай атлетыцы, настольным тэнісе, акрабатыцы, гіравым спорце. За апошнія гады ў клубе падрыхтавалі 5 майстроў, 12 кандыдатаў у майстры спорту.

У раёне выхаваны цэлы шэраг спартсменаў экстра-класа, якія абаранялі спартыўны гонар не толькі рэспублікі, але і Савецкага Саюза. Былая вучаніца Тэльмінскай СШ Л.Гаражанская заняла 6-е месца па веласіпедным спорце на Алімпійскіх гульнях у Атланце. Высокія спартыўныя дасягненні дэманстраваў член зборнай каманды СССР па лёгкай атлетыцы, кандыдат на Алімпійскія гульні ў Сеуле Ф.Гагалюк. Членамі зборнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы з'яўляліся В.Шындушкоў, А.Савельеў, А.Коржык. Члены зборнай каманды РБ па акрабатыцы М.Бараноўскі, А.Рабцэвіч былі ўдзельнікамі чэмпіянату свету 1994 г. у Маскве.

Л.П.Нікіценкава, У.І.Нікіценкаў.

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ Ў ПРАЦЫ

Героі, ардэнаносцы

АГАРКАЎ Пётр Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1924 г. у с. Савецкае Лівенскага раёна Арлоўскай вобласці.

Пачаў працоўную дзейнасць у 1939 г. трактарыстам, а затым брыгадзірам трактарнай брыгады Лівенскай МТС Арлоўскай вобласці.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў у Брэсцкім абласным упраўленні сельскай гаспадаркі, быў кіраўніком аддзялення саўгаса «Брэсцкі», а з 1965 г. — старшыня калгаса «Пагранічнік» Брэсцкага раёна. Паказаў сябе выдатным арганізатарам сельскагаспадарчай вытворчасці. Калгас у 1976 г. узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

П.М.Агаркаў за высокія дасягненні калгаса ў вытворчасці сельгаспрадуктаў і арганізатарскія здольнасці ўзнагароджаны ордэнамі Леніна (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973), «Знак Пашаны» (1966), шасцю медалямі. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

АНІСКЕВІЧ Мацвей Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1943 г. у в. Чарнаўчыцы Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

З 1959 г. пачаў працоўную дзейнасць у калгасе «Савецкая Армія» паляводам, а затым, пасля заканчэння вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі, трактарыстам. У 1968 г. перайшоў працаваць у калгас імя Калініна Брэсцкага раёна.

Мае кваліфікацыю трактарыста-машыніста вышэйшага класа. Умела выкарыстоўвае замацаваную за ім тэхніку, утрымлівае яе ва ўзорным стане. Уважлівы да маладых механізатараў, дапамагае ім, ахвотна дзеліцца вопытам па эфектыўным выкарыстанні сельгасмашын, перадавой тэхналогіі вырошчвання і ўборкі сельскагаспадарчых культур.

Радзіма высока ацаніла яго працу. Ён узнагароджаны ў 1973 г. ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а ў 1976 г. — ордэнам Леніна.

АСІЮК Лідзія Іванаўна, нарадзілася ў 1920 г. у сям'і селяніна-беднякa в. Барысы Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

У 1940 г. уступіла ў калгас «Свабодная праца». За добрыя паказчыкі ў працы ў 1941 г. яе накіравалі на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку ў Маскву.

Пасля вызвалення раёна ад нямецка-

фашысцкіх захопнікаў працавала ў агародніцкай брыгадзе калгаса, а з 1951 г. даяркай.

Л.І.Асіюк, выкарыстоўваючы вопыт перадавікоў калгаснай вытворчасці, значна павышала надоі малака ад кожнай замацаванай за ёй каровы. Па яе ініцыятыве было арганізавана лагернае ўтрыманне жывёлы і падкормка зялёнымі кармамі. У 1973 г. яна надаіла 800 цэнтнераў малака, надой на карову склаў 8001 кілаграм.

За выдатныя поспехі ў працы Л.І.Асіюк у 1957 г. Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. У 1958, 1966, 1971 гадах узнагароджвалася ордэнамі Леніна.

Л.І.Асіюк прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці калгаса, абіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 4-га, 5-га і 6-га скліканняў, дэлегатам III Усесаюзнага з'езда калгаснікаў.

БОЙКА Марыя Якаўлеўна, нарадзілася ў 1914 г. у в. Дубок Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і селяніна. У час Вялікай Айчыннай вайны актыўна змагалася супраць фашысцкіх акупантаў. З красавіка 1943 г. да прыходу Чырвонай Арміі знаходзілася ў партызанскім атрадзе імя Варашылава. Узнагароджана медалём «За баявыя заслугі».

У жніўні 1946 г. у в. Дубок утвараецца калгас. Марыя Якаўлеўна прымае актыўны ўдзел у яго арганізацыі.

З 1951 г. па 1957 г. загадвае свінагадоўчай фермай калгаса. З 1957 г. звеннявая па вырошчванні кукурузы. У 1959 г. за дасягненне высокіх ураджаяў кукурузы ўзнагароджана ордэнам Леніна.

БРЫЗГА Лідзія Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1943 г. у в. Барысы Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

З 1959 г. пасля заканчэння васьмігадовай школы працуе ў калгасе імя Жданава напачатку ў паляводстве, а з 1960 г. даяркай. Падтрымаўшы пачын перадавой даяркі Лейды Пейпс, у 1975 г. у ліку першых у вобласці перайшла на абслугоўванне ўзбуйненай групы кароў. У 1977 г. удзельнічала ў сустрэчы перадавых жывёлаводаў краіны на ВДНГ СССР.

За выдатныя поспехі ў працы Л.Дз.Брызга ў 1981 г. Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка», яна ўзнагароджана таксама ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны». Была членам Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС, депутатам Вярхоўнага Савета БССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР.

П.М.Агаркаў.

М.М.Аніскевіч.

Л.І.Асіюк.

М.Я.Бойка.

Л.Дз.Брызга.

У.М.Бурцік.

БУРЦІК Уладзімір Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1938 г. у в. Калодна Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

С.Л.Воўк.

Дз.С.Дацэнка.

Н.П.Дудчык.

Г.К.Кардзімук.

Р.Р.Карпук.

З 1958 г. працуе трактарыстам у калгасе «Пагранічнік» Брэсцкага раёна. За час работы паказаў сябе дасведчаным спецыялістам.

У час уборкі хлеба Уладзімір Мацвеевіч садзіцца за штурвал камбайна. І гэту машыну механізатар вывучыў дасканала, дзякуючы чаму ўбірае збажыну хутка і акуратна, без страт.

За поспехі ў працы У.М.Бурцік узнагароджаны ў 1970 г. медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна», у 1972 г. ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, у 1978 г. ордэнам Леніна.

ВОЎК Сцяпан Лукіч, нарадзіўся ў 1934 г. у в. Маціевічы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці.

З 1951 г. працаваў у ПМК-8 упраўлення «Брэстсельбуд». З першых дзён праяўляе добрасумленныя адносіны да працы, зацікаўленасць у ёй, імкненне глыбей пазнаць сваю прафесію. Ён стаў спецыялістам вышэйшага разраду, авалодаў некалькімі сумежнымі будаўнічымі спецыяльнасцямі.

У 1963 г. стаў на чале комплекснай брыгады. Дзякуючы бесперапыннаму ўдасканаленню працы і арганізацыі вытворчасці, ужыванню перадавой тэхналогіі брыгада кожны год дасягае добрых вынікаў.

За высокія паказчыкі ў працы С.Л.Воўк у 1970 г. узнагароджаны ордэнам Леніна, у 1971 г. сярэбраным медалём ВДНГ СССР, у 1975 г. ордэнам Працоўнай Славы III ступені, у 1979 г. залатым медалём ВДНГ СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, заслужаны будаўнік рэспублікі.

ДАЦЭНКА Дзмітрый Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1913 г. у в. Анаўка Мелітопальскага раёна Днепрапятроўскай вобласці.

У 1935 г. прызываецца ў Савецкую Армію. Прайшоў шлях ад курсанта палкавой школы да падпалкоўніка, памочніка камандзіра палка. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Цэнтральным і Украінскім франтах.

Пасля фарсіравання Одэра ў раёне г. Брыг батарэя знішчальнага супрацьтанкавага палка пад камандаваннем Дз.С.Дацэнкі прыняла няроўны бой з нямецкімі танкамі. У крытычную хвіліну бою Дзмітрый Сцяпанавіч сам стаў за гармату і падбіў два варожыя танкі. Немцы не вытрымалі і адышлі. Батарэя выканала задачу: плацдарм быў утрыманы.

За мужнасць і гераізм Дз.С.Дацэнку было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». Ён таксама ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, «Знак Паша-

ны», двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і васьмю медалямі.

Шмат гадоў Дз.С.Дацэнка працаваў старшым інспектарам па кадрах ВМК-8 Брэсцкага раёна. Памёр у 1996 г. Пахаваны на гарнізонных могілках г. Брэст.

ДУДЧЫК Ніна Пятроўна, нарадзілася ў 1923 г. у в. Кошалева Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

На жывёлагадоўчую ферму саўгаса «Маладая гвардыя» прыйшла яшчэ ў тыя часы, калі памяшканне кароўніка было старым, патрабавала капітальнага рамонту. Умовы працы былі цяжкія, але маладая даярка засталася працаваць на ферме. Працавітасць, любоў да жывёлы паступова выпрацавалі майстэрства і досвед.

Хуткая, руплівая, яна самыя складаныя аперацыі выконвала на здзіўленне лёгка. У той жа час для яе характэрны добрасумленныя, гаспадарчыя адносіны да сваіх абавязкаў. Жывёлаводы гаварылі, што яна аддае працы ўсе свае веды, увесь вопыт.

У 1966 г. за дасягненне высокай прадукцыйнасці кароў Н.П.Дудчык было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка».

КАРДЗІМУК Ганна Кузьмінічна, нарадзілася ў в. Вялікія Шчытнікі Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ў 1930 г.

З 1958 г. працавала ў калгасе «Памяць Ільіча», напачатку ў паляводстве, а затым у жывёлагадоўлі. Да 1962 г. працавала даяркай, а пасля свінаркай. З 1980 г. на пенсіі. Ганна Кузьмінічна заўсёды дабівалася высокіх вытворчых паказчыкаў, выхоўвала моладзь, абіралася дэпутатам раённага Савета народных дэпутатаў. У 1972 г. узнагароджана вышэйшай узнагародай — ордэнам Леніна. У 1970 г. юбілейным медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна».

КАРПУК Рыгор Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1942 г. у в. Неплі Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

З 1966 г. працуе трактарыстам у калгасе «Пагранічнік».

Не адну сотню гектараў зямлі ўзараў і засеяў Рыгор Рыгоравіч, не адну сотню тон ураджаю перавёз у калгасныя сховішчы. Ахвотна браўся за любую справу і даводзіў яе да канца. Вядомы ў калгасе як працавіты чалавек, высакакласны спецыяліст. Праўленне калгаса ў 1976 г. прызначыла яго брыгадзірам трактарнай брыгады. За поспехі ў працы Р.Р.Карпук узнагароджаны ордэнамі Леніна і Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1973).

П.І.Клімук.

КЛІМУК Пётр Ільіч, нарадзіўся ў 1942 г. у в. Камароўка Брэсцкага раёна. Лётчык-касманаўт СССР (1973), генерал-маёр (1978), двойчы Герой Савецкага Саюза (1973, 1975).

Ганаровы грамадзянін Брэста (1974). Скончыў Чарнігаўскае вышэйшае ваеннае вучылішча (1963), Ваенна-паветраную акадэмію імя Ю.А.Гагарына (1977). У атрад касманаўтаў залічаны ў 1965 г. У якасці камандзіра карабля разам з бортінжынерам В.В.Лебедзевым 18—26 снежня 1973 г. здзейсніў арбітальны палёт на касмічным караблі «Саюз-13». Другі палёт (63 суткі) ажыццявіў 24 мая — 26 ліпеня 1975 г. у якасці камандзіра карабля «Саюз-18» і на арбітальнай станцыі «Салют-4» разам з бортінжынерам В.І.Севасцьянавым. У трэцім палёце 27 чэрве-

Т.Я.Лапко.

М.М.Ляўчук.

І.Ц.Маісееў.

Г.Ф.Скакун.

ня — 5 ліпеня 1978 г. стаяў на чале міжнароднага экіпажа касмічнага карабля «Саюз-30». Разам з касманаўтам-даследчыкам ПНР М.Гермашэўскім правёў стыкоўку карабля з арбітальным навуковым комплексам «Салют-6» — «Саюз-29». На працягу 7 сутак касманаўты У.В.Кавалёнак, А.С.Іванчэнкаў, Клімук і Гермашэўскі праводзілі навуковыя, у тым ліку медыка-біялагічныя даследаванні па праграме, распрацаванай спецыялістамі СССР і ПНР.

Дзяржаўная прэмія СССР (1978). У Брэсце ўстаноўлены бюст П.І.Клімука.

ЛАПКО Таццяна Якаўлеўна, нарадзілася ў 1932 г. у в. Косічы Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

З 1958 г. працавала даяркай у саўгасе «Маладая гвардыя».

У 1975 г. узнагароджана ордэнам Леніна за высокія паказчыкі ў вытворчасці малака. Узнагароджана таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна».

ЛЯЎЧУК Максім Максімавіч, нарадзіўся ў 1919 г. у в. Калодна Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1951 г. працуе ў калгасе «Пагранічнік» напачатку ў паляводстве, а з 1960 г. — брыгадзірам паляводчай брыгады.

Брыгада яго кожны год займала адно з вядучых месцаў у раённых сацыялістычных спаборніцтвах, дабівалася рэкордных ураджаяў сельскагаспадарчых культур.

За поспехі ў працы М.М.Ляўчук узнагароджаны ордэнамі Леніна (1973), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966) і пяццю медалямі.

МАІСЕЕЎ Іван Цімафеевіч, нарадзіўся 16 жніўня 1910 г. у в. Велюнь Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў 5 класаў і курсы рахункаводаў у Томску. У Чырвонай Арміі з 1932 г. У 1933 г. скончыў палкавую школу, у 1938 г. — курсы малодшых лейтэнантаў, у 1942 г. — курсы «Стрэл».

У дзеючай арміі з 1944 г. Камандзір батальёна 619-га стралковага палка (203-я стралковая дывізія, 53-я армія, 2-і Украінскі фронт) капітан Маісееў адным з першых 7 лістапада 1944 г. фарсіраваў р. Ціса ў раёне пасёлка Шаруд (9 км на паўночны захад ад г. Цісадзерж, Венгрыя). Нягледзячы на ўпартае супраціўленне ворага, з групай байцоў абышоў артпазіцыі і захапіў варожую батарэю. Сваімі дзеяннямі садзейнічаў пашырэнню плацдарма на правым беразе р. Ціса і забяспечыў пераправу асноўных сіл палка і дывізіі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945.

Пасля вайны працягваў службу ў арміі. З 1947 г. капітан Маісееў у адстаўцы. Жыў у г. Марыінск Кемераўскай вобласці. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Памёр 12.2.1976.

СКАКУН Галіна Фёдараўна, нарадзілася ў 1943 г. у в. Барысы Брэсцкага раёна. З 1965 г. даярка калгаса імя Жданава (зараз «Беларусь»). Герой Сацыялістычнай Працы (1988). Узнагароджана ордэнамі Леніна (1983, 1988), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973), «Знак Пашаны» (1971), медалём «За працоўную доблесць» (1966).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР

(1980). Мае 3 залатыя, 3 сярэбраныя і 5 бронзавых медалёў ВДНГ СССР. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь (1996).

СУШАНАЎ Мікалай Цімафеевіч, нарадзіўся 15 снежня 1920 г. у в. Тростань на Браншчыне. У 18-гадовым узросце стаў сакратаром сельскага Савета. Праз год прызваны ў Чырвоную Армію, дзе прайшоў шлях ад радавога да афіцэра-палітработніка. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у суровых абарончых баях. З лютага 1943 г. — на Цэнтральным, Беларускім, 1-м Беларускім франтах, удзельнік Курска-Арлоўскай бітвы. У якасці намесніка камандзіра стралковага батальёна па палітчасці малодшы лейтэнант М.Ц.Сушанаў вылучыўся ў баях за Беларусь. 15 кастрычніка 1943 г. на чале групы воінаў ён пераправіўся на правы бераг Дняпра, падавіў некалькі агнявых кропак ворага, знішчыў нямецкі дзот і кулямёт разам з разлікам. Трое сутак, адрэзаны ад сваіх, абараняў ён з таварышамі ўчастак каля Лоева. За гэты подзвіг малады камуніст атрымаў званне Героя Савецкага Саюза.

Так здарылася, што Мікалай Цімафеевіч спазнаў на вайне не толькі ўдачу і славу. Ён трапіў у палон, збег з лагера, ваяваў у партызанскім атрадзе. У ліпені 1944 г. яго накіроўваюць на працу адказным сакратаром Шэрашаўскага райвыканкома Брэсцкай вобласці.

У 1948 г. М.Ц.Сушанаў закончыў Рэспубліканскую партшколу пры ЦК КП(б)Б, а ў 1967 г. — Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. У Брэсцкім раёне Мікалай Цімафеевіч працаваў з 1960 г. Быў кіраўніком аддзялення саўгаса «Брэсцкі», сакратаром парткома, у 1965—1980 гг. — начальнікам раённага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі. Памёр у 1997 г.

СЦЕПАНЮК Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1924 г. у в. Дабранеж Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалём «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

З 1951 г. працаваў у саўгасе імя Гастэлы брыгадзірам паляводчай брыгады, а затым — механізатарам.

М.Ц.Сушанаў.

І.Ф.Сцепанюк.

А.Н.Чабаткоў.

Выдатна ведаў сельскагаспадарчую тэхніку і заўсёды трымаў яе ў бездакорным парадку. Свой багаты вытворчы досвед перадаваў моладзі.

За добрасумленную працу ўзнагароджаны ў 1971 г. ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а ў 1976 г. — ордэнам Леніна.

ЧАБАТКОЎ Андрэй Нікандравіч. Дэмабілізаваўся ў 1947 г. і неўзабаве ўжо працаваў галоўным аграномам райсельгасаддзела Брэсцкага раёна, а праз два гады загадваў сельскагаспадарчым аддзелам райкома партыі.

Пасля партыйнай вучобы Андрэя Чабаткова прызначаюць першым намеснікам начальніка абласнога ўпраўлення сельскай гаспадаркі Брэсцкага аблвыканкома. З гэтай пасады праз тры гады ён накіраваны дырэктарам на Малецкую МТС Бярозаўскага раёна.

— Гэта была самая занядбалая машынна-трактарная станцыя, — распавядае Андрэй Нікандравіч. — Дысцыпліна

В.С.Шаўчук.

П.Дз.Шыш.

дрэнная, у калектыве п'янства, добрай рамонтнай базы няма. Вось дзе спатрэбіўся вопыт працы ў юнацтве на Чабатоўскай МТС. За тры гады я здолеў згуртаваць калектыў механізатараў і вывесці яго ў перадавыя. І тут здарылася бяда. Пад час уборкі ад дзіцячага сваволства згарэла вёска Рэпехі. Сем нашых трактарыстаў, што працавалі ў полі, засталіся, ў чым былі. Сабраў увесь калектыў і сказаў: «Хлопцы, з торбамі вас не пусцім».

Два тыдні ездзілі ў лес. Выдзеліў тэхніку для перавозкі драўніны і на піларраму. Дамовіліся, што план у брыгадзе застаецца такі самы. І людзі не падвялі. Да зімы пабудавалі хаты.

Аўтарытэт дырэктара ўзрос яшчэ больш. У 1955 г. МТС наведаў першы сакратар абкома партыі П.М.Машэраў, які станоўча адазваўся аб справах калектыву.

Па патрабаванні першага сакратара А.Н.Чабаткова пераводзяць на пасаду дырэктара Брэсцкай МТС, якая пазней аб'ядналася з Чарнаўчыцкай. І там справы пайшлі лепш.

У жніўні 1961 г. Андрэй Нікандравіч быў прызначаны дырэктарам саўгаса «Брэсцкі», утворанага з пяці калгасаў. Што ўяўляла сабой гэта гаспадарка? Вось некалькі лічбаў. Сельгасугоддзяў налічвалася 12 тысяч гектараў, а пашы — 8 тысяч. На фермах было 5 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы і столькі ж свіней. Кармавая база была слабая, надоі нізкія. Вытворчасць малака на 100 гектараў сельгасугоддзяў складала 125 цэнтнераў. Праз пяць гадоў яна павялічылася ўтрая. Саўгас зрабіўся прыбытковым.

За дасягнутыя поспехі 10 працаўнікоў жывёлагадоўлі былі ўзнагароджаны ў 1966 г. ордэнамі і медалямі, а загадчыцы фермы «Косічы» Ніне Пятроўне Дудчык было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Не абышлі пашанай і дырэктара. На яго грудзях заззяў ордэн Леніна. Гэта не адзіная яго ўзнагарода за баявыя і мірныя справы.

На доўгія гады звязаў Андрэй Нікандравіч свой лёс з Брэсцкім раёнам. І зараз, ужо на пенсіі, ён удзельнічае ў грамадскім жыцці, уваходзіць у савет раённай арганізацыі ветэранаў, стаіць на чале савета ветэранаў абласнога аб'яднання хлебапрадуктаў.

А нядаўна Андрэй Нікандравіч і яго жонка Вольга Паўлаўна адгулялі залатое вяселле. Траіх дзяцей узгадавалі яны, багатыя на ўнукаў і праўнукаў.

Н.Горба.

ШАЎЧУК Васіль Севасцьянавіч, нарадзіўся ў 1930 г. у в. Дружба Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці.

З 1959 г. працаваў трактарыстам у саўгасе «Рассвет» Брэсцкага раёна. Паказаў сябе добрасумленным працаўніком, высокакваліфікаваным спецыялістам. Спагадлівы да сваіх таварышаў па працы, дзяліўся сваім досведам па авалоданні тэхнікай і тэхналогіяй вырошчвання сельскагаспадарчых культур. Трактарыст 1-га класа.

У 1978 г. В.С.Шаўчук выступіў у раёне ініцыятарам камбайнераў-тысячнікаў: абавязаўся намалаціць на камбайне СК-6 тысячу тон збожжа і паспяхова выканаў свае абавязацельствы.

Радзіма высока ацаніла яго працу. Ён узнагароджаны ў 1970 г. медалём «За працоўную адзнаку. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна», ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1971), ордэнам Леніна (1973).

ШЫШ Праскоўя Дзмітрыеўна, нарадзілася ў в. Астрамечава Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ў 1910 г. Усё сваё працоўнае жыццё прысвяціла жывёлагадоўлі. Працавала даяркай калгаса «Памяць Ільіча» з 1955 г. па 1978 г. Праскоўя Дзмітрыеўна дабівалася высокіх вытворчых паказчыкаў, выступала ініцыятарам сацыялістычных спаборніцтваў, вылуча-

лася высокай дысцыплінаванасцю, была настаўнікам моладзі.

У 1971 г. узнагароджана ордэнам Леніна. У 1976 г. — ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі. У 1970 г. — медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна».

В.П.Россіхін.

Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь

Заслужаны аграном Рэспублікі Беларусь

ВІШНЮК Яўгенія Міхайлаўна, нарадзілася ў 1928 г. у сяле Кумены Кіраўскай вобласці (Расія). У 1953 г. скончыла Ленінградскі сельгасінстытут і пачала працаваць у Брэсцкім аблвыканкоме аграномам па ўкараненні перадавога вопыту, а затым аграномам па абароне раслін. У верасні накіравана на працу аграномам на Чарнаўчыцкую МТС Брэсцкага раёна. З 1955 г. дваццаць гадоў працавала галоўным аграномам калгаса «Краіна Саветаў» Брэсцкага раёна.

У 1966 г. узнагароджана медалём «За працоўную доблесць», у гэтым годзе ёй прысвоена званне «Заслужаны аграном БССР». У 1970 г. узнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна», у 1971 г. — ордэнам «Знак Пашаны», у 1973 г. — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Пенсіянерка. Жыве ў Брэсце.

Заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь

БАСАЦКІ Міхаіл Лук'янавіч, нарадзіўся ў 1934 г. у вёсцы Прылукі Брэсцкага раёна, працаваў настаўнікам фізікі Тэльмаўскай СШ. Званне прысвоена ў 1971 г. Памёр у 1996 г.

ВАЛЮКЕВІЧ Алена Феліксаўна, нарадзілася ў 1924 г. у вёсцы Ванлярава Смаленскага раёна. Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры, а таксама геаграфіі ў Чарнаўчыцкай СШ. Званне прысвоена ў 1965 г. Пенсіянерка. Жыве ў вёсцы Чарнаўчыцы.

ВАСІЛЮК Уладзімір Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1927 г. у вёсцы Камяніца-Жыровецкая Брэсцкага раёна. Працаваў настаўнікам біялогіі ў Дамачаўскай СШ. Званне прысвоена ў 1968 г. З 1987 г. на пенсіі. Жыве ў г.п. Дамачава.

ДЗЕНЧЫК Ганна Канстанцінаўна, нарадзілася ў 1935 г. у вёсцы Рагозна Жабінкаўскага раёна. Працавала настаўніцай матэматыкі, намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай працы Чарнаўчыцкай СШ. Званне прысвоена ў 1968 г. У 1976 г. узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Чарнаўчыцы.

КРАВЕЦ Надзея Кузьмінічна, нарадзілася ў 1932 г. у вёсцы Луцэвічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Вістыцкай васьмігадовай школе. У 1966 г. узнагароджана медалём «За працоўную доблесць». Званне прысвоена ў 1972 г. Жыве ў в. Вістычы, пенсіянерка.

НАВУМЕНКА Нінель Антонаўна, нарадзілася ў 1925 г. у горадзе Жлобін. Працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры ў Вістыцкай васьмігадовай школе. Званне прысвоена ў 1972 г. Жыве ў в. Вістычы. Пенсіянерка.

ПАНАСЮК Надзея Фёдараўна, нарадзілася ў 1935 г. у вёсцы Казловічы Брэсцкага раёна. Працавала настаўніцай пачатковых класаў і дырэктарам Знаменскай СШ. У 1970 г. узнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна». Званне прысвоена ў 1975 г. Жыве ў в. Знаменка. Пенсіянерка.

ШЫРАЯ Ганна Пятроўна, нарадзілася ў 1920 г. у вёсцы Багацькаўка Магілёўскай вобласці. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Дамачаўскай СШ з 1946 г. па 1975 г. Званне прысвоена ў 1965 г. Жыве ў г.п. Дамачава.

А.А.Кандыба.

Заслужаны работнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь

ФЕДАРУК Ніна Фёдараўна, нарадзілася ў 1951 г. у в. Воля Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці.

У 1969 г. закончыла Столінскае медыцынскае вучылішча, працавала медсястрой Пелішчанскага ўчастка Камянецкай райбальніцы. З 1972 г. па 1979 г. — студэнтка Гродзенскага медінстытута. Закончыла інстытут з адзнакай і была накіравана ў Мікашэвіцкую бальніцу Лунінецкага раёна, дзе працавала ўчастковым тэрапеўтам, а затым загадчыцай тэрапеўтычнага аддзялення. З 1984 г. працуе ў Брэсцкім раёне галоўным урачом Дамачаўскай бальніцы, а са снежня 1985 г. — галоўным урачом раёна.

Пад кіраўніцтвам Н.Ф.Федарук былі пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю раённая паліклініка на 375 наведванняў у змену, Лышчыцкая ўчастковая бальніца на 50 ложкаў, амбулаторыя ў в. Вялікія Радванічы, фельчарска-акушэрскія пункты ў вёсках Клейнікі, Івахнавічы, тэрапеўтычны корпус на 120 ложкаў з харчовым блокам раённай бальніцы, харчовы блок Лышчыцкай участковай бальніцы, фельчарска-акушэрскія пункты ў вёсках Чэрск, Забалацце, амбулаторыя на 40 наведванняў у змену з аптэкай і кватэрамі для медперсаналу ў в. Камароўка, амбулаторыя ў в. Кавердзякі, амбулаторыя на 100 наведванняў у змену ў в. Астрамечава і амбулаторыя ў в. Тэльмы, фельчарска-акушэрскі пункт у в. Камяніца-Жыровецкая.

Амбулаторна-паліклінічная дапамога насельніцтву была пашырана да 26 урачэбных спецыяльнасцяў. У раёне ўзнік шэраг новых медыцынскіх службаў: псіханеўралагічная, фтызіятрычная, анкалагічная. Значна вырас аб'ём дыягнастычных даследаванняў. Карэнным чынам змяніліся ўмовы ўтрымання хворых у стацыянары.

За вялікі ўклад у развіццё і ўмацаванне аховы здароўя ў раёне Н.Ф.Федарук 19 чэрвеня 1992 г. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь».

А.П.Гаршчарук.

Заслужаны работнік культуры

КУРЭПІН Віктар Гаўрылавіч, нарадзіўся 8 мая 1915 г. у сяле Чыбізаўка (зараз г. Жэрдзеўка) Тамбоўскай вобласці.

У 1931 г. скончыў сямігадовую школу. Працаваў у калгасе, уступіў у камсамол. З 1932 г. — на камсамольскай рабоце ў райкоме. З 1936 г. па 1939 г. вучыўся ў Варонежскай вышэйшай камуністычнай сельгасшколе, пасля яе працаваў сакратаром Таліцкага райкома камсамола. Са снежня 1939 г. — курсант Сталінградскага ваенна-палітычнага вучылішча. Удзельнік вайны. З 1946 г. — загадчык ваеннага аддзела Высокаўскага райкома партыі (Брэсцкая вобласць). Затым рэдактар раённай газеты. У 1948—1950 гг. навучаўся ў партшколе пры ЦК КПБ. Затым працаваў рэдактарам газеты Сігневіцкай МТС Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1953—1954 гг. — інструктар Брэсцкага абкома партыі. З ліпеня 1954 г. па ліпень 1975 г. — рэдактар брэсцкай раённай газеты «Заря над Бугом».

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і ордэнам Айчыннай вайны I ступені за абарону Радзімы, а таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга за доблесную працу.

9 мая 1975 г. В.Г.Курэпіну прысвоена званне «Заслужаны работнік культуры Беларусі». Ён узнагароджаны таксама Ганаровай Граматай Вярхоўнага Савета БССР, неаднойчы абіраўся дэпутатам раённага Савета народных дэпутатаў.

Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь

БУХАВЕЦКІ Якаў Адамавіч, нарадзіўся ў 1951 г. у г. Столін Брэсцкай вобласці. Скончыў Гродзенскі сельгасінстытут і ў 1977—1980 гг. працаваў галоўным аграномам саўгаса «Мухавец». З 1982 г. — дырэктар гэтага саўгаса. У 1984 г. узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку». У 1996 г. атрымаў пачэс-

нае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».

СЕКАЦКІ Франц Антонавіч, нарадзіўся ў 1936 г. у вёсцы Дуброўка Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1960 г. скончыў Беларускую сельгасакадэмію. З 1961 г. — галоўны аграном саўгаса «Брэсцкі», дзе працуе і зараз. Узнагароджаны медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна» (1970), «За працоўную доблесць» (1971), ордэнамі «Знак Пашаны» (1973), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1982). У 1986 г. атрымаў пачэснае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».

СКАКУН Аляксей Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1946 г. у вёсцы Дастоева Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1969 г. скончыў Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут. Пачаў працаваць галоўным заатэхнікам калгаса «Маладая гвардыя» Іванаўскага раёна. З 1973 г. па 1975 г. — намеснік старшыні калгаса «Маладая гвардыя». З 1975 г. па 1979 г. — старшыня калгаса «Дружба» Іванаўскага раёна. З 1979 г. па 1982 г. — начальнік управлення сельскай гаспадаркі Івацэвіцкага раёна, а з сакавіка 1982 г. — старшыня СКП «Астрамечава». Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку» (1973), ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1981), Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1986), двума залатымі медалямі ВДНГ (1981, 1987). Ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь» прысвоена ў 1993 г. А.С.Скакун — кандыдат эканамічных навук, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь.

К.М.Папко.

Навукоўцы

ІВАНОЎ Юрый Аляксандравіч, нарадзіўся ў студзені 1943 г. у в. Дубкі Іздзешкаўскага раёна Смаленскай вобласці (Расія). У 1969 г. закончыў з адзнакай Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С.Пушкіна па спецыяльнасці «Настаўнік геаграфіі і біялогіі», пасля чаго працаваў старшынёй студэнцкага прафкома Брэсцкага педінстытута. З 1976 г. працуе ў Брэсцкім раёне дырэктарам шэрагу школ, а з 1983 г. — загадчыкам аддзела адукацыі Брэсцкага райвыканкома. Абіраўся дэпутатам Знаменскага сельскага Савета, раённага Савета народных дэпутатаў, членам раённага выканаўчага камітэта. Член калегіі Міністэрства адукацыі (1993—1995), з 1996 г. — член калегіі ўпраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкома.

У 1993 г. абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па тэме «Арганізацыйна-педагагічнае забеспячэнне дыферэнцыраванага навучання ў вясковай школе».

Аўтар рэгіянальнай адукацыйнай праграмы школ Брэсцкага раёна.

Удзельнік рэспубліканскіх і міжнародных навукова-практычных канферэнцый, аўтар больш як 30 палемічных і навуковых артыкулаў і іншых публікацый.

МЕЛІШКЕВІЧ Уладзімір Ульянавіч, нарадзіўся 1 ліпеня 1942 г. у в. Лышчыцы Брэсцкага раёна. У 1958 г. закончыў СШ № 1 г. Брэста. Працаваў фрэзероўшчыкам, грузчыкам на прадпрыемствах горада. З 1960 г. па 1965 г. вучыўся на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У.І.Леніна. Пасля гэтага працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ № 20 г. Брэста, затым кансультантам Дома палітычнай асветы, лектарам Брэсцкага абкома КПБ. З 1975 г. па 1978 г. вучыўся ў аспірантуры Інстытута гісторыі АН БССР. У 1979 г. абараніў дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па тэме «Руска-беларускія культурныя сувязі другой паловы XIX стагоддзя».

З 1978 г. па 1982 г. працаваў у апараце Брэсцкага абкома КПБ. У 1982—1984 гг. — загадчык кафедры навуковага камунізму Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута. З 1984 г. працаваў у Брэсцкім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя А.С.Пушкіна загадчыкам кафедры гісторыі КПСС, затым прарэктарам па навуковай працы. У 1991 г. атрымаў вучонае званне прафесара і стаў загадчыкам кафедры ўсеагульнай гісторыі і гісторыі сусветнай культуры.

У.У.Мелішкевіч многа зрабіў для

развіцця гістарычнай навукі на Брэстчыне. Ён апублікаваў больш за 70 навуковых, навукова-метадычных і публіцыстычных прац. Сярод іх: «Брест — XVI век. Социально-экономический очерк» (Брэст, 1974); «Белоруссия в изданиях вольной русской печати (1857—1865)» (Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1978. № 2); «Н.Г. Чернышевский и революционно-демократическая мысль в Белоруссии» (Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. 1978. № 4); «Белоруссия в произведениях русских художников» (Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1978. № 40); «Русско-белорусские культурные связи второй половины XIX века» (Мн.: Вышэйшая школа, 1984); шэраг артыкулаў у энцыклапедычных выданнях «Брест. Энциклопедический справочник» (Мн.: БелЭн, 1987), «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» у 6 тамах. Том 1 (Мн.: БелЭн, 1993) і іншыя.

У.У.Мелішкевіч стаяў каля вытокаў утварэння гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.С.Пушкіна. У 1992 г. зрабіўся яго першым дэканам. Яго любілі студэнты, і ён не шкадаваў часу на іх. Актыўна ўдзельнічаў у складанні першага выпуску «Моладзі Берасцейшчыны» — зборніка лепшых студэнцкіх прац.

У.У.Мелішкевіч быў старшынёй праўлення Брэсцкага абласнога аддзялення савецкага фонду культуры. Ён многа зрабіў для духоўнага адраджэння роднай зямлі, умацавання сувязяў з беларускімі абшчынамі ў Польшчы, Расіі, Літве, Украіне.

Памёр 7 ліпеня 1994 г.

У.І.Нікіценкаў.

Пісьменнікі

КАЛІНА (ЛУКАШЭВІЧ) Клаўдзія Канстанцінаўна, нарадзілася 1 лістапада 1925 г. у в. Блювінічы Брэсцкага раёна. У 1953 г. закончыла Брэсцкае музычнае вучылішча. Працавала настаўніцай спеваў у школах Брэста і Мінска. З першымі творамі выступіла ў 1962 г. Першая кніга К.Каліны «Хлопчык-пакідайчык» (1969) засведчыла, што пісьменніца добра ведае дзіцячы свет, умее стварыць займальныя сюжэты. Аповесці «Забароненая песня» (1972) і «Світанак» (1979) прысвечаны тэме Заходняй Беларусі. У першым з названых твораў праўдзіва паказана жыццё дзяцей ва ўмовах белапольскай акупацыі. У цэнтры твора дзяўчынка Кася і яе сябры, праз вобразы якіх пісьменніца паказала рэальную атмасферу часу свайго дзяцінства.

У кнізе «Маці і сын» (1977) вырашаюцца складаныя маральныя праблемы. У гады Вялікай Айчыннай вайны вясковая жанчына Хрысця Жытнік узяла сабе хлопчыка, якога пакінула, уцякаючы з фашыстамі на Захад, яго маці. Нялёгка было выхоўваць Хведара (так звaўся хлопчык), асабліва калі памёр родны сын Паўлік. Кульмінацыяй сюжэту аповесці з'яўляецца той момант, калі аб'явілася жанчына, што ў вайну адмовілася ад сына. Каго называць сваёй маці? Такое пытанне павінен вырашыць Хведар. Выбар трэба рабіць абавязкова.

Фарміраванне характару дзіцяці ў вясковых умовах, дзе яно расце ў натуральнай залежнасці ад прыроды, ад ладу народнага жыцця з яго ўстойлівымі маральнымі прынцыпамі, паказана ў аповесці «Бабуля Насця, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля». Аповесць напісана займальна, з глыбокім пранікненнем ва ўнутраны свет дзяцей.

Тэме вайны прысвечаны аповесці Каліны «Крылаты конь» і «Бурштынавыя пацеркі». У вобразах герояў гэтых твораў увасоблены высокі маральны дух народа, што з асаблівай сілай выявіўся ў ваеннае ліхалецце.

К.Каліна — пісьменніца чуйная да праўды, да стыхіі народнага жыцця, да гучання роднай мовы.

Памерла К.Каліна 25.6.1994 г.

СТАЛЬМАШУК Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся 9 кастрычніка 1922 г. у в. Забалацце Брэсцкага раёна. Пісьменнік, аўтар кніжкі дакументальнай прозы «Шумят ели». Пятае дзіця ў сялянскай сям'і, пачаў помніць сябе з пастушковай торбачкай за плячыма і рабенькім кійком у руках. Але ў шматгаліновым родзе Стальмашукоў цанілі навуку, і за маршалка

Пілсудскага агораў Валодзя чатыры класы Камяніца-Жыравецкай «паўшэхнай» школы, потым вучыўся ў вячэрняй школе, скончыў у Мінску афіцэрскія курсы Міністэрства унутраных спраў СССР.

Асноўныя «універсітэты» праходзіў падлеткам, дапамагаючы члену КПЗБ, падпольшчыку, роднаму дзядзьку Мікіту. На пачатку вайны ўступіў у партызанскі атрад, які ўзначальвалі вядомыя на Брэстчыне рэвалюцыянеры Дзмітрук, Салейка, Купрыянюк. У атрадзе блізка сышоўся з паэтам Міколам Засімам. Больш як два гады партызаніў, у чэрвені 1944 г. дабравольцам пайшоў на фронт. Да 1946 г. быў разведчыкам 270-й стралковай дывізіі 1-га Прыбалтыйскага фронту. З 1946 г. працаваў у міліцыі на аператыўна-следчай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені, «За адвагу».

Як запісана ў асабовай справе капітана міліцыі У.І.Стальмашука: «Исключен из списков личного состава по причине смерти 10.10.1966 г.». Не дажыў, цяжка хворы, трох дзён да выхаду асноўнага свайго жыццёвага набытку — кніжкі, аб якой шчыра выказаўся У.А.Калеснік: «...Гэта сумленна зроблены помнік ягоным сябрам па зброі, ... доўг сумлення, адданы ў першую чаргу тым з сяброў-таварышаў, хто пайшоў ад нас незваротна, а таксама тым, хто жывым сціпла маўчыць аб сваім гераічным мінулым. А яно дастойна ўсеагульнай увагі».

Л.Г.Філатаў.

ФІЛАТАЎ Леанід Георгіевіч (Аляксей Філатаў), нарадзіўся 13 мая 1939 г. у в. Бабінічы пад Віцебскам. Але на гэтай зямлі будучаму пісьменніку не давялося пакінуць свой след — пасля прыходу на Берасцейшчыну Чырвонай Арміі сюды на працу ў Брэсцкае педагагічнае вучылішча пераязджае яго маці. Вайна, якая раптоўна пачалася ў чэрвені 1941 г., застала яе ў Маларыце. Варожы снарад трапіў акурат у будынак школы, маці загінула. Двухгадовага хлапчука забрала са шпіталя сям'я настаўніка Ляхавіцкай школы Афанасьева. З вялікай цеплынёй і ўдзячнасцю гаворыць сёння пісьменнік пра гэтых людзей. Бацька, Аляксей Нічыпаравіч, — настаўнік з пяцідзесяцігадовым стажам, надзелены ад прыроды талентам, дарам расказчыка, дабрынёй. Маці, Ларыса Мяфодзьеўна, чалавек высокай культуры, ёй уласцівы такія якасці, як спагадлівасць, бескарыснасць, уменне разбірацца ў людзях.

Пасля Ляхавіцкай сямігодкі Л.Філатаў вучыўся ў Маларыцкай сярэдняй школе, пазней — у Брэсцкім чыгуначным тэхнікуме. Затым працяглы час працаваў на чыгунцы. Завочна скончыў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут.

Аляксей Філатаў пачаў друкавацца ў канцы 1950-х гадоў. Свае нарысы і замалёўкі змяшчаў у Маларыцкай і Брэсцкай раённых газетах і ў «Заре». Апавяданні Філатава друкаваліся ў часопісах «Полымя», «Бярозка». Піша для дзяцей (аповесць «Шчаслівая зорка»). Выдаў зборнік гумарэсак «Ляхавіцкая торба» (1992). Творы Філатава вызначаюцца трапнай народнай мовай, дасціпным гумарам.

А.Філатаў жыве ў пасёлку Мухавец Брэсцкага раёна і працуе настаўнікам у мясцовай сярэдняй школе.

А.А.Майсейчык.

Раёнка паведамляла

У раёне з 15 кастрычніка 1944 г. пачала выходзіць газета «Сталинец», якая ў 1954 г. у сувязі з рэарганізацыяй раёнаў (Брэсцкага і Дамачаўскага) была перайменавана ў «Социалистический путь», а ў красавіку 1962 г. атрымала новую назву — «Заря над Бугом».

Важнае месца на старонках раёнкі займалі пытанні жыцця сяла, яго працаўнікоў у першыя пасляваенныя гады. На пярэдні план выступалі задачы аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі.

Год за годам газета вяла актыўную выхаваўчую работу, перадавала вопыт перадавікоў сельскагаспадарчай вытворчасці, дасягненні ў галіне прамысловасці і будаўніцтва, адукацыі, культуры, медыцыны, гандлю, спорту.

Паводле матэрыялаў газеты «Сталинец» за 1944—1953 гг.

Крестьяне и крестьянки деревни Вычулки Брестского района выступили с обращением к труженикам области досрочно выполнить поставки хлеба государству: «Мы сдали в фонд поставок 384 пуда зерна и 1560 пудов картофеля. На строительство танковой колонны собрано 32 пуда зерна и 5300 рублей деньгами, обязуемся дополнительно собрать в фонд обороны по 2—3 пуда хлеба с каждого крестьянского двора. К дню 27-ой годовщины Октября проводим сбор подарков для воинов Красной Армии».

Обращение крестьян одобрено исполкомом облсовета депутатов трудящихся и обкомом КП(б)Б и предложено всем райкомам партии, райисполкомам и сельсоветам обсудить его на общих собраниях крестьян в каждой деревне и сельсовете.

* * *

В Домачевском районе организован конно-прокатный пункт, который с первых дней весеннего сева выехал на поля безлошадных семей фронтовиков и бывших партизан Леплевского и Комаровского сельсоветов. За период весеннего сева по району вспахано и засеяно более 47 гектаров. За оказанную помощь крестьяне обязуются ответить ударной работой и достойной помощью Родине и фронту.

* * *

Высоких показателей на вывозке леса добились крестьяне д. Черск Галолюк Иван, Булава Никифор и Осиюк Федор. Только в последнюю пятидневку каждый из них вывез по 37 кубометров лесоматериалов. Сезонное задание возчики выполнили на 100 процентов.

* * *

ОБЪЕДИНИЛИСЬ В КОЛХОЗ. Крестьяне дер. Дуричи Меднянского сельсовета, поняв преимущество колхозного строя над единоличным, объединились в сельхозартель, которую назвали именем создателя социалистического государства Владимира Ильича Ленина.

В колхоз вступило 47 хозяйств. Сейчас идет обобществление сельхозинвентаря и тягловой силы. Колхозу отведена земельная площадь, колхозники получили приусадебные участки.

Председателем колхоза избран тов. Ничипорук Трофим Леонтьевич.

* * *

В деревне Леплёвка с 10 июня открылась детская оздоровительная площадка. Здесь отдыхают дети-сироты, отцы которых погибли в борьбе с немецкими захватчиками. Под руководством пионервожатой Нины Николайчук и воспитательницы Татьяны Поддубной дети ходят на экскурсии, проводят спортивные игры.

* * *

В недалеком прошлом в Дубице насчитывалось много неграмотного и малограмотного населения. Настоящая работа по обучению грамоте крестьян развернулась только при Советской власти. Только за один 1948 год силами культармейцев, работой которых руководит заведующий школой А.Семонюк, было обучено грамоте 28 человек. В начале этого года по деревне оставалось еще 7 неграмотных. Идя навстречу выборам народного суда, культармейцы поставили себе задачу: обучить грамоте и этих крестьян. Взятое обязательство выполнено. Осиюк Анастасия обучила грамоте 5 человек. Неплохо работали культармейцы Каштанюк Ольга, Лялько Пелагея, Прокопюк Еврония, Мартынюк Пелагея и Петрочук Ольга. Следующая задача —всех малограмотных охватить школой.

* * *

ЗА НАШЕ СЧАСТЬЕ. Сегодня 12 марта. Я много думала об этом дне, который для меня является особенно праздничным: я буду впервые в своей жизни выбирать в Верховный Совет, я буду голосовать за кандидатов блока коммунистов и беспартийных тов. Силяева Федора Пахомовича и тов. Гаврилюк Ефросинью Михайловну. В этот день я особенно чувствую огромную заботу большевистской партии и советского правительства о молодежи. Ни в одной капиталистической стране молодежь не имеет таких прав, которые даны нам Сталинской Конституцией. Одним из этих прав является право на образование.

* * *

Я учусь в 9 классе. Впереди у меня ясное будущее. Я не боюсь за свой завт-

рашний день. И мои подруги не боятся. Мы знаем, что о нашем будущем заботится великий Сталин.

Р.Галалюк.

* * *

23 сентября открывается районная сельскохозяйственная выставка. В колхозах заканчиваются последние приготовления, составлены необходимые схемы, программы и другие материалы, отражающие успехи социалистического сельского хозяйства района за 1951 год.

* * *

Хороший уход за посевами кок-сагыза организован в науковедческих звеньях колхоза «Ленинский путь» Черского сельсовета. На всех плантациях проведена первая прополка и шаровка междурядий, а в звеньях Марии Бекеша и Марии Дугельной заканчивается вторичная прополка кок-сагыза.

* * *

Достойно встретили 36-ю годовщину Великого Октября колхозники сельхозартели «Ленинский путь» — здесь завершено строительство электростанции. Энергия будет использоваться не только для освещения домов колхозников и общественных помещений, животноводческих ферм, но и для других нужд колхоза. Возле электростанции в скором времени будет установлена пилорама и гонторезный станок.

Па старонках газеты «Социалистический путь» за 1954—1962 гг.

В Москву на Всесоюзную сельскохозяйственную выставку выехала вторая группа экскурсантов — лучших людей колхозного производства нашего района. В числе экскурсантов — передовой конюх колхоза им. Н.К.Крупской Ф.Т.Ковальчук, старшая свинарка колхоза им. А.С.Пушкина Н.С.Жиранюк, бригадир сельхозартели «Память Ильича» В.И.Старов, садовод кохоза им. М.И.Калинина А.А.Лесняк и еще 12 колхозников.

* * *

При панской Польше на месте нынешних Лисович был полупустырь. В этом «местечке» стоял панский дом, да поодаль пять приземистых хат. И только теперь Лисовичи стали благоустроенным населенным пунктом. Здесь широко раскинулся городок Чернавчицкой МТС. Сверкают белизной зимнего солнца новые типовые мастерские, гараж и навесы для сложной сельхозтехники, здание электростанции, жилые дома и другие сооружения. Еще больше их будет воздвигнуто в текущем году. Появятся здание конторы МТС, хозяйственные и жилые дома. На свои личные сбережения сооружают собственные дома агроном Герасимов, механик Гончаров и другие работники МТС. Те, кто раньше жили вблизи Лисович, могли только мечтать о какой-либо специальности, кроме найма в батраки. Сегодня в поселке трудятся трактористы, комбайнеры, механики, слесари, кузнецы...

* * *

Во многих населенных пунктах Брестского района хорошо знают имя киномеханика — комсомолки Веры Вашкевич. Только за прошедший год она дала 313 киносеансов, которые просмотрело 14 735 зрителей. По заявкам колхозников были показаны кинофильмы «Карнавальная ночь», «Без вести пропавший», «Сердце бьется вновь», «Малахов курган». Киномеханик держит тесную связь и с молодыми зрителями. Ребята с большим интересом приходят на детские фильмы «Кортик», «Ревизор», «В степи», «В людях». Богатый опыт своей работы Вера передает молодым киномеханикам района.

* * *

На колхозном дворе, недалеко от нашей кузницы, установлен репродуктор. Когда из него послышались волнующие слова сообщения ТАСС о запуске корабля-спутника «Восток» с человеком на борту, мы с помощником забыли, что нужно срочно ремонтировать льносеялку и, как зачарованные, неотрывно слушали каждое слово диктора.

Мы были потрясены этим известием о величайшем в наше время научном свершении, с нетерпением ждали дальнейших сообщений. Когда же передали, что тяжеловесный корабль-спутник удачно приземлился, радости нашей не было конца. Это поистине всенародный праздник. Ведь каждому советскому человеку

приятно, что такое «чудо» совершила наша страна, что первым космонавтом был советский человек.

Мы, труженики, от души поздравляем нашего соотечественника Юрия Алексеевича Гагарина с благополучным возвращением на Землю и с присвоением звания Героя Советского Союза.

А.Васильев,
кузнец колхоза «Пограничник».

Паводле матэрыялаў газеты «Заря над Бугом» за 1964—1982 гг.

Одни из первых начали сбор средств на строительство памятника героям Брестской крепости колхозники колхоза «Беларусь». Здесь в четвертой бригаде, прямо на поле, где работали более 120 человек по уходу за посевами сахарной свеклы, состоялся митинг...

На митинге выступили звеньевая тов. Николаюк Любовь, секретарь парторганизации колхоза агроном тов. Никищенко Екатерина Федоровна, директор местной школы тов. Дубенецкий Николай Алексеевич и другие, которые единодушно одобрили решение оргкомитета и внесли на счет № 70008 по 5—10 рублей каждый.

За первые два часа после митинга на сооружение памятников было собрано 102 рубля.

* * *

В минувшем году труженики белорусского села работали с высоким подъемом, идя навстречу полувековому юбилею родной республики и ее Коммунистической партии. С таким же трудовым подъемом работала и я. И для меня этот юбилейный год явился особенно радостным: за все время работы дояркой я не выходила на такой рубеж, как теперь.

Более 7800 килограммов молока в среднем от каждой коровы — о таких надоях раньше я могла только мечтать. И вот моя мечта стала явью...

Достигнутый успех постараюсь закрепить в текущем году.

Л.Осиюк,
доярка колхоза имени Жданова,
Герой Социалистического Труда, депутат Верховного Совета СССР.

* * *

Когда заходишь в наш военный городок, то глаз радует большой сад. Тут есть яблони, сливы, груши. За садом любовно ухаживают все воины.

А история этого сада такова. Лет десять тому назад воины-комсомольцы во главе с комсоргом старшим сержантом Игорем Валиевым оказали помощь труженикам колхоза «Искра» в уборке урожая, и вот в благодарность за это правление колхоза подарило воинам несколько десятков саженцев фруктовых деревьев. В посадке сада принимали участие и комсомольцы колхоза, и в честь этого сад был назван «Садом дружбы».

Каждый год сад дарит богатый урожай плодов к солдатскому столу, и воины с большой теплотой вспоминают своих старших товарищей, которые оставили о себе такую память.

Е.Добычин,
старшина Брестского гарнизона.

* * *

За достигнутые успехи в социалистическом соревновании по производству продуктов полеводства, бережное и высокопроизводительное использование техники, высокую культуру земледелия бюро РК КПБ, исполком райсовета и райком профсоюза рабочих и служащих сельского хозяйства и заготовок присвоили звание «Лучший механизатор района» и занесли в Книгу трудовой славы трактористов колхоза имени Ленина Г.Д.Гульчука, колхоза «Пограничник» Г.Г.Карпука и Н.И.Руду, колхоза «Страна Советов» П.Д.Петрочука, совхоза «Прибужье» С.С.Литвинчука, совхоза имени Н.Ф.Гастелло И.А.Иващенко, совхоза «Мухавец» В.А.Михайловского, совхоза «Брестский» В.А.Мартысюка, колхоза «Советская Армия» В.Т.Рака, совхоза «Рассвет» В.С.Шевчука.

* * *

Ранее о колхозном прибужском селе Комаровка мало кто знал за пределами Брестского района. Ныне оно известно городам и селам всей нашей страны. Здесь родился, вырос, учился и мужал славный сокол нашей Отчизны космонавт Петр Ильич Климук, который вместе со своим товарищем Валентином Витальевичем

Лебедевым на космическом корабле «Союз-13» 18 декабря 1973 г. начал свой путь к звездам, в просторы Вселенной.

Радостно взволнованы жители деревни Комаровка. Чувством гордости переполнены сердца. Их земляк, их односельчанин Петр Климук, которого многие знали еще школьником, пареньком, — командир космического корабля «Союз-13».

Одним из первых горячо поздравил мать космонавта Марфу Павловну с радостной вестью председатель колхоза имени Дзержинского Виктор Иванович Панасюк. Ныне многолюдно в доме Марфы Павловны. Односельчане поздравляют мать с подвигом сына, желают счастливого полета экипажу космического корабля.

* * *

Решением коллегии «Союзсельхозтехника» и Президиума ЦК профсоюза за достигнутые высокие показатели во Всесоюзном социалистическом соревновании по итогам работы за второй квартал 1975 года коллективу Прибужского районного объединения «Сельхозтехника» присуждено переходящее Красное Знамя Всесоюзного объединения «Союзсельхозтехника» Совета Министров СССР и ЦК профсоюза рабочих и служащих сельского хозяйства и заготовок.

* * *

САД «ДРУЖБА». Пожалуй, трудно найти среди подарков более красивый и более памятный, чем этот дар братской страны и братского народа. Он особенно дорог нам еще и потому, что польские друзья помогли посадить нам этот сад в канун 60-й годовщины Великого Октября.

«Если думаешь на год вперед — засей поле. Если на десять лет — посади дерево». Об этой мудрой поговорке вспомнили на митинге, посвященном передаче плодового сада — дара польского народа советскому народу — труженикам совхоза «Рассвет».

Под бурные аплодисменты кандидат в члены Политбюро ЦК ПОРП, министр сельского хозяйства ПНР Казимеж Барчиковский зачитал и передал директору совхоза «Рассвет» дарственное письмо, в котором говорится:

«С разрешения Председателя Совета Министров Польской Народной Республики товарища Петра Ярошевича передаю совхозу «Рассвет» Брестской области Белорусской ССР 100 гектаров яблоневого сада, который является даром польского народа белорусскому народу... Нам бы хотелось, чтобы переданный вам сад «Дружба» стал прочным символом братства и сотрудничества польского народа с народами Страны Советов.

Мы передаем сад в опытные руки рабочих вашего совхоза и желаем, чтобы он не только давал высокие урожаи, но и служил дальнейшему углублению знаний в области садоводства и укреплению сотрудничества между земледельцами наших стран».

* * *

Снова ликует Прибужье, снова радость и гордость за своего земляка вошла в каждый наш дом. 27 июня 1978 г. стартовал второй космический международный экипаж в составе командира корабля летчика-космонавта СССР, дважды Героя Советского Союза, полковника Петра Ильича Климука и космонавта-исследователя, гражданина Польской Народной Республики, майора Войска Польского Мирослава Гермашевского.

Несколько дней назад в Томашевской средней школе, в которой учился Петр Ильич Климук, состоялся выпускной бал. Аттестаты зрелости получили 47 юношей и девушек, 47 молодых односельчан прославленного космонавта, который в эти дни держит очередной, очень трудный и ответственный экзамен в космосе.

Сейчас их в космосе четверо — Владимир Коваленок, Алексей Иванченков, Петр Климук и Мирослав Гермашевский. Экипаж орбитального комплекса «Салют-6» — «Союз-29» — «Союз-30» приступил к выполнению научных исследований.

* * *

ДОРОГИЕ ДРУЗЬЯ! ЗЕМЛЯКИ!

Вот уже 25 лет у каждого из вас настольной газетой является «Заря над Бугом». Само название очень символично. Новый, счастливый день начинается с восхода солнца, с зари. Эта заря и заалела в Западной Белоруссии, в прибужских, с очень красивой природой, местах, пос-

ле 1939 года. Она принесла всем нам счастье и радость обновления, прекрасную перспективу.

Газета нога в ногу шла вместе с трудящимися района. Она рассказывала о подвигах будней, о тех проблемах, которые необходимо было решать, являлась трибуной передового опыта. На ее страницах мы встречались с героями пятилеток, с передовиками производства. Мы стремились быть на них похожими, брали с них пример.

Замечательно и то, что газета нацеливала каждого труженика на решение задач, стоящих перед районом. Она рассказывала о передовом опыте в сельском хозяйстве, лучших людях Прибужья. «Заря над Бугом» жила жизнью района, трудовыми делами людей, их радостями и заботами.

И вот незаметно, в каждодневном труде, подошел серебряный юбилей. Уважаемые читатели! Позвольте и от вашего имени пожелать коллективу редакции газеты и многочисленному внештатному активу творческих удач в их благородном журналистском труде.

П.И.Климук,
дважды Герой Советского Союза, летчик-космонавт СССР, Звездный городок.

* * *

Еще несколько месяцев тому назад на этом погорке росли травы. А когда с поля ушли тракторные косилки, широким фронтом здесь развернулись земляные работы. Мощные бульдозеры неустанно снимали плодородный слой почвы, освобождая на холме место под будущую строительную площадку.

Сегодня между деревнями Остромечево и Рудавец уже угадываются контуры будущего объекта. Здесь, недалеко от дороги силами МПМ-3 и другими субподрядными организациями возводится комплекс для крупного рогатого скота на 10 тысяч голов откорма в год.

С руководителем стройки — старшим прорабом И.Ф.Наумовым — мы встретились на монтаже корпуса телятника. «Первые колышки на площадке геодезисты вбили в июле, — рассказывает Иосиф Федорович. — А теперь уже бригада Василия Владимировича Василюка занята на кладке стен корпуса приема телят. Эта бригада завершила недавно монтаж каркаса хранилища сена».

«На объекте занято пока 46 человек, — говорит прораб Евгений Петрович Щука. — Но люди прибывают ежедневно. И наша главная пока задача — разместить людей. Правление колхоза «Память Ильича» понимает наши трудности и делает все возможное, чтобы помочь стройке. Часть людей мы разместили в доме механизатора, часть будет расквартирована в Остромечево и Рудавце, часть рабочих мы привозим из Бреста».

* * *

Санаторий «Берестье» — крупнейшая здравница для работников сельского хозяйства республики. Здесь одновременно могут отдохнуть и поправить здоровье около 500 человек. Расположено «Берестье» в красивом сосновом бору на берегу лесного озера. В санатории удобные комнаты для отдыхающих, красивые холлы и залы, медицинские кабинеты, сауна, летняя эстрада. На территории здравницы действуют две скважины с местной минеральной водой, планируется использовать в лечебном процессе и торфяные грязи.

* * *

Недавно в д. Люта состоялась встреча бывших воспитанников Высоковского детского дома № 1, который находился на территории Лыщицкого сельсовета. На нее собрались воспитанники детдома, те, чье детство было опалено грозными днями военного лихолетья. Но в трудные послевоенные годы они не чувствовали себя обделенными лаской: педагоги и воспитатели отдавали детям тепло своих сердец, делили с ними все невзгоды и радости, учили трудиться, растили настоящими людьми. Об этом говорили на митинге, посвященном открытию памятной мемориальной доски на здании бывшего детского дома, его директор, ветеран Великой Отечественной войны М.А.Леонтенко, воспитанники В.Ткачева, Б.Артышук, М.Васильев. На митинге выступили также почетные гости — председатель колхоза-комбината «Память Ильича» А.С.Скакун и председатель Лыщицкого сельсовета В.И.Жукевич.

* * *

Ольга Павловна Брынза 25 лет проработала на ферме Малые Зводы. За свой труд имеет немало наград, среди которых два ордена: Октябрьской революции и «Знак Почета». Сейчас Л.П.Брынза — персональная пенсионерка. Недавно

Ольге Павловне исполнилось 60 лет. В честь юбилейной даты коллектив фермы совместно с руководством колхоза-комбината «Память Ильича» организовал вечер-портрет «Живет на селе коммунист». Ведущие вечера рассказали о партийной и трудовой деятельности О.П.Брынзы.

С.Р.Іваненка.

Толькі 100 гадоў

Сціпла і, можна сказаць, непрыкметна працуе сёння чыгуначная ветка Брэст—Уладава. А пабудавана яна была роўна 100 гадоў таму. У 1897 г. рушылі першыя цягнікі з Хэлмы на Брэст праз Уладаву—Дамачава—Дубіцу, злучыўшы паўднёва-ўсходнія ваяводствы Польшчы з заходнімі рэгіёнамі Расійскай імперыі.

Ветка Брэст—Уладава мела два пуці, цягнікі без перашкод рухаліся насустрач адзін аднаму. Пасля Вялікай Айчыннай вайны дарогу зрабілі аднабаковай: рэльсы і шпалы спатрэбіліся для іншых, больш важных накірункаў.

Заря над Бугом. 1997. 20 жн.

Брэсцкі РАУС

Адгрымелі апошнія залпы вайны на Брэстчыне. Прыйшоў доўгачаканы Дзень Перамогі. Пачалося мірнае, вельмі цяжкае жыццё, якое патрабавала такой самай мужнасці, як і ў гады вайны.

На былой акупіраванай тэрыторыі вораг пакінуў сваю агентуру, акапаліся ў глыбокім падполлі былыя нямецкія памагатыя, нацыяналісты; буйныя палітычныя і крымінальныя фарміраванні тэрарызавалі насельніцтва. Усё гэта перашкаджала станаўленню савецкай улады на вызваленай зямлі. У гэтых выпрабаваннях працаўнікі міліцыі праявілі масавы гераізм і з гонарам вытрымалі іх.

У ліпені 1944 г. Аляксандр Васільевіч Смірноў атрымаў прызначэнне начальнікам Брэсцкага РАМ. У аддзеле кадраў УНКУС ён атрымаў паперу са штатным раскладам новага аддзела міліцыі. Падбіраць і камплектаваць штат яму рэкамендавалася асабіста. Напачатку з невялікім штатам 15 чалавек даводзілася выконваць аб'ём працы, які зараз патрабаваў бы некалькі дзесяткаў працаўнікоў.

Не было ніякага транспарту, акрамя коней. Да месца здарэння дабіраліся з вялікім спазненнем. Сувязь была наладжана дрэнна. Гэта ўскладняла працу, асабліва пошук і затрыманне злачынцаў. Умовы ў раёне былі, да таго ж, вельмі складаныя: тут дзейнічала цэлая сетка нацыяналістычных бандаў. Бандыты вельмі ўскладнялі становішча: штодзённыя начныя налёты на сельсаветы, пагромы, падпалы, забойствы партыйнага і савецкага актыву адбываліся яшчэ і ў 1945—1946 гг., а асабліва — у 1944 г.

Большасць працаўнікоў з адчуваннем высокага абавязку перад народам не толькі вытрымалі націск бандытаў, але і выйшлі пераможцамі ў барацьбе з імі. У баявых аперацыях па ліквідацыі бандытаў і рабаўнікоў вылучыліся многія працаўнікі раённага аддзела: Адам Шурынюк, Іван Касцевіч, Яўген Раковіч, Пётр Сярко і іншыя.

Былы начальнік Брэсцкага раённага аддзела міліцыі падпалкоўнік Ісак Віктаравіч Егуткін успамінае: «Ішоў 1928 год, жыў у сваім родным Гомелі. Мяне, 24-гадовага хлопца, дэмабілізаванага з Чырвонай Арміі, запрасілі ў гаркам партыі і сказалі: маўляў, з кадрамі міліцыі цяжкавата, ты адслужыў, прайшоў вайсковую загартоўку, і цябе, маладога камуніста, мы рэкамендуем туды. Праца там, маўляў, цяжкая, а ты для яе падыходзіш».

У міліцыю дык у міліцыю — вырашыў Егуткін. Хацелася адразу на аператыўную працу, вабіла рамантыка незвычайных прыгод. Але ў міліцыі сказалі: «Каб зрабіцца сапраўдным аператыўнікам, трэба спачатку папрацаваць радавым міліцыянерам». Год працаваў паставым, а затым чатыры гады малодшым агентам Гомельскага акруговага крымінальнага вышуку. Так пачалося яго фарміраванне як аператыўніка.

У 1937 г. у ліку першых працаўнікоў міліцыі краіны быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Разам з часцямі Чырвонай Арміі

адыходзілі на ўсход і працаўнікі міліцыі, частка з іх загінула пад бомбамі, некаторых расстралялі фашысты, многія ішлі ў партызаны і са зброяй у руках змагаліся супраць акупантаў. Нямала было і такіх, хто стаў у рады байцоў Чырвонай Арміі. Такі ж лёс напаткаў і Егуткіна: ён быў прызначаны старшым упаўнаважаным армейскага аддзела контрразведкі «Смерш» 10-й гвардзейскай арміі і прайшоў з гэтай арміяй шлях да Перамогі.

У снежні 1945 г. дэмабілізаваўся і зноў пайшоў працаваць у міліцыю, напачатку начальнікам Кобрынскага, а з чэрвеня 1950 г. — Брэсцкага раённага аддзела міліцыі.

У 1944—1946 гг. аб'яднанымі намаганнямі працаўнікоў органаў унутраных спраў і дзяржаўнай бяспекі пры падтрымцы насельніцтва ўдалося амаль цалкам знішчыць падполле і банды.

У 1950-я гады ў сувязі з адменай картак, а разам з тым і дзяржаўнага кантролю над спажываннем, стала шырока развівацца спекуляцыя. Каб спыніць яе, спатрэбілася нямала намаганняў аператыўнікаў аддзела Шурынюка, Касцевіча, Раковіча і іншых.

Складаныя і заблытаныя справы давялося разблытваць М.А.Сахараву, Я.Раковічу і іншым.

Золатам гараць словы, высечаныя на мармуровай дошцы ў будынку аддзела унутраных спраў Брэсцкага райвыканкома: «Малодшы лейтэнант міліцыі Курыленка Васіль Міхайлавіч загінуў пры выкананні службовых абавязкаў 12 лютага 1953 года».

Што ж здарылася ў той позні зімовы вечар, што стаў апошнім у жыцці малодшага лейтэнанта, начальніка аддзялення міліцэйскай службы?

У дзяжурным пакоі рэзка зазвінеў тэлефон:

— Прыязджайце ў вёску Бярозаўка, — сказаў усхваляваны голас. — Бяда!..

Малодшы лейтэнант Курыленка хутка пайшоў на аўтобусны прыпынак. Парыпваў пад нагамі снег. Ад ліхтароў, што гарэлі нябяркім, цьмяным святлом, лажыліся касыя, размытыя цені.

Падышоў аўтобус. Рэзка скрыпнулі тармазы. У салоне сядзелі пасажыр і кандуктар, што зябка хуталася ў каўнер паліто. Час позні. За акном праплывалі вуліцы з рэдкімі прахожымі. Але што гэта? Аўтобус рабіў складаныя віражы, заязджаючы на левы бок дарогі, на тратуар. Наперадзе паказаўся чыгуначны пераезд. Ён быў закрыты. Удар — і драўляны шлагбаум разляцеўся на кавалкі. «Што з шафёрам? — падумаў Васіль Міхайлавіч. — Можа, хворы?» Ён зазірнуў у кабіну. На міліцыянера глянулі асалавелыя вочы, крэпка несла спіртным. За рулём п'яны? У любы момант магла здарыцца бяда.

Адабраўшы, як належыць у такіх выпадках, пасведчанне на права кіравання аўтобусам, Васіль Міхайлавіч прапанаваў шафёру сесці ў салоне, а сам павёў аўтобус.

— Эй, начальнік! — ледзьве варочаючы языком, захрыпеў шафёр. — А можа дамовімся?

— Ніякіх дамоў! — Васіль Міхайлавіч нахмурыў шырокія бровы. — Пагаворым у аддзяленні міліцыі.

Вось што адказаў пасля злачынца, шафёр аўтобуса, на пытанне следчага: «Калі і як вы ажыццявілі пакушэнне на міліцыянера?»

— Пасля таго, як «дамова» не атрымалася, я нахіліўся, дастаў са скрынкі манціроўку і ў прысутнасці пасажыра і кандуктара нанёс Курыленку некалькі ўдараў па галаве. Ён упаў на падлогу. Я спыніў аўтобус, адчыніў дзверы і спіхнуў яго ў снег. Кандуктар з пасажырам з крыкам выскачылі на вуліцу і некуды пабеглі. Я сеў у аўтобус і рушыў з месца, але ўспомніў, што мае правы засталіся ў работніка міліцыі. Зноў спыніў машыну, вярнуўся да яго, абшукаў кішэні, узяў правы і паехаў далей.

Карціна забойства дапаўняецца расказамі сведкаў (пасажыра і кандуктара): калі злачынца выкінуў цела з аўтобуса, ён нанёс яшчэ 8 удараў.

І.М.Паршанкоў.

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ

Этнічныя асаблівасці раёна

Раён прылягае да р. Буг у яе сярэднім цячэнні. Рака здаўна не толькі падзяляла, але і злучала людзей — яна была зручным шляхам зносін, у яе ўпадаюць на тэрыторыі раёна рэкі Мухавец, Лясная і некалькі дробных рэк, не лічачы шматлікіх ручаёў і рачулак. Гэта спрыяла развіццю рыбалоўства і птушкагадоўлі, тым больш, што са старажытных часоў горад Бярэсце (па-мясцоваму Бэрэсць) адыгрываў значную ролю як гандлёвы і культурны цэнтр, а пад час сярэднявечча вылучаўся сярод іншых палескіх гарадоў сваім зручным становішчам. Гэта адбівалася на лёсе яго жыхароў і жыхароў значнага наваколля, бо горад вабіў да сябе не толькі гандляроў, рамеснікаў, але і прагных да нажывы заваёўнікаў. Горад і яго патрэбы вельмі паўплывалі на культуру і быт вясковага насельніцтва, а з будаўніцтвам крэпасці, а потым і чыгуначных ліній на Баранавічы, Ковель, Пінск, Беласток і Уладаву адцягнуў на сябе значную частку насельніцтва і пераарыентаваў гаспадарку.

У пасляваенны час (з 1944) па Бугу прайшла граніца, і рака была адгароджана ад сяльчан, што прывяло да заняпаду промыслаў жыхароў Тамашоўкі, Дамачава і іншых вёсак і мястэчак (зараз статус гарадскога пасёлка мае толькі Дамачава) па рачной перавозцы грузаў, лоўлі рыбы і гандлю з зарэчнымі населенымі пунктамі. Размяшчэнне ў Брэсце і ваколіцах вялікай колькасці вайскоўцаў, стварэнне буйной прамысловасці прывялі да таго, што практычна палова працаздольнага сельскага насельніцтва, асабліва маладога ўзросту, сталі рабочымі і служачымі. Гэта садзейнічала, з аднаго боку, пранікненню ў вёску стэрэатыпаў гарадскога быту і адыходу часткі насельніцтва ад традыцыйнай культуры (што добра бачна на прыкладах вёсак, якія непасрэдна прылягаюць да горада, а таксама размешчаных на чыгуначных і шашэйных дарогах, якія перасякаюць раён па ўсіх напрамках). З другога боку — праявілася і рэакцыя этнічнай культуры на нівеліруючае, разбуральнае ўздзеянне горада. Асабліва ў вёсках, якія размешчаны ў баку ад шляхоў зносін, у большай частцы на поўдзень ад Брэста. Увогуле ў гаспадарчых адносінах поўдзень апынуўся ў большай залежнасці ад горада. Тут менш урадлівых зямель, менш магчымасцей выпасу жывёлы. Але культурная традыцыя тут захавалася лепш. Нават у такіх вёсках, як Прылукі, Страдзеч, Падлужжа, Прыбарава, Камароўка, не кажучы ўжо пра Медна, Рагозна, Чэрск, Дубок. Мабыць, тут больш праявіла сябе рэакцыя этнічнай культуры, чым на поўначы раёна, які ў гаспадарчых адносінах менш залежыць ад горада. Таму ўмоўна раён можна падзяліць на паўночную і паўднёвую часткі.

У гэтых дзвюх вялікіх частках выдзяляюцца значныя рэгіёны, якія групуюцца вакол вёсак: на поўначы — Астра-

мечава, Чарнаўчыцы, Клейнікі, Івахновічы, Чэрні, Шэбрын, Радванічы. На поўдні вылучаецца прырэчная зона і лясная, дзе таксама ёсць свае культурныя цэнтры: Тамашоўка (раней такую ролю адыгрывала Камароўка), Дамачава, Прыбарава, Чэрск, Рагозна, Медна, Страдзеч.

У адрозненне ад іншых раёнаў Брэсцкі раён характарызуецца інтэнсіўнымі міжэтнічнымі кантактамі. Урбанізацыя прыцягнула ў Брэст шмат мігрантаў. У прыгарадных вёсках даволі шматлікая група рускіх. Нягледзячы на пашырэнне ўжывання рускай мовы, выхадцы з Расіі, асабліва ўжо ў 2—3-м пакаленнях, амаль не адрозніваюцца па сваёй культуры ад мясцовага насельніцтва. Хвалі рускай міграцыі: першая — пасля далучэння тэрыторыі да Расійскай імперыі ў 1795 г.; другая — у сувязі з пачаткам будаўніцтва крэпасці; трэцяя — ад канца XIX ст. да пярэдадня першай сусветнай вайны; чацвёртая — 1940—1941 гг. Усе гэтыя хвалі ў асноўным былі ваенна-чыноўніцкія. І толькі міграцыя канца XIX ст. звязана з пераўтварэннем Брэста ў чыгуначны вузел і з'яўленнем прамысловасці. Менавіта ў гэты час з'яўляецца і рускае насельніцтва ў навакольных вёсках.

Міграцыю 1940—1941 гг. таксама трэба аднесці да ваенна-адміністрацыйнай. На пасады кіраўнікоў савецкай улады на месцах вельмі часта назначаліся рускія, альбо выхадцы з Усходняй Беларусі, дзе савецкая ўлада існавала з часоў рэвалюцыі. У мясцовай традыцыі і тых і другіх называюць «восточныкы». Найбольшая міграцыйная плынь «восточныкэй» прыпадае на пасляваенныя гады. Гэта не толькі вайскоўцы і адміністрацыйныя работнікі, а і настаўнікі, фельчары, урачы, інжынеры, тэхнікі і г.д. З цягам часу яны асіміляваліся, хаця і не ўспрынялі ў большасці мясцовай мовы і карысталіся расійскай. Працэс асіміляцыі добра абрысаваў стары селянін з вёскі Чэрск. Вось пераказ яго разважанняў: «Мы заўсёды паважалі начальнікаў, бо шмат іх было і ўсякіх. І палякі, і немцы, і «бандэры», а яшчэ раней рускія. Але тыя начальнікі больш кіравалі наездамі. А калі прыйшлі Саветы, то пасялілі начальнікаў па вёсках. Некаторыя адразу станавіліся «сваімі», а другіх трэба было прыручаць. Васточнікі ж былі бяднота, а тут пабачылі, што ў людзей сёе-тое ёсць, то некаторых куплялі ці падарункамі, ці працай на яго сотках. Хтосьці быў падкі да жанчын, а іншаму трэба было наліць шклянку гарэлкі. Праз год-два-тры яны ўжо залежалі ад нашай ласкі, хаця на людзях і карысталіся знешнімі праявамі павагі. А рабіць гэта нашы людзі, ой, як умеюць. Шмат хто прыязджаў халасцяком, то тут іх жанілі. Наогул шляхоў «прыручэння» было шмат. І не трэба было спрачацца, ці ісці ў лес са стрэльбай. А дзеці іх ужо мала адрозніваліся ад нашых».

Нарэшце, вялікая хваля мігрантаў, выкліканая ростам горада, а таксама будаўніцтвам вялікіх сельскагаспадарчых комплексаў, напрыклад, у раёне абласной бальніцы (Вычулкі) і іншых, павялічыла колькасць прышлага насельніцтва розных нацыянальнасцей, але за апошні час пачынаюць пераважаць мігранты з зоны Чарнобыля. І ў вёсках не толькі Брэсцкага, але таксама Маларыцкага, Жабінкаўскага, Камянецкага і іншых «чыстых» раёнаў шмат сустракаецца перасяленцаў не толькі са Столінскага і Лунінецкага раёнаў, але і з Гомельскай і Магілёўскай абласцей.

На поўдні раёна адзначаецца вялікі ўплыў суседняй Украіны; кантакты з вёскамі на Украіне — звычайная справа, кантакты на ўзроўні не толькі знаёмства, але і сваяцкіх адносін. Трэба адзначыць, што насельніцтва паўночных раёнаў Валынскай і Ровенскай абласцей па сваёй культуры не адрозніваецца ад астатняга насельніцтва басейна верхняга цячэння ракі Прыпяць, да якога і належаць поўдзень Брэсцкага, Маларыцкі, поўдзень Кобрынскага (Дывін), Драгічынскі, Пінскі раёны.

Традыцыйна вялікай этнічнай групай, акрамя ўсходніх славян, у Брэсцкім раёне з'яўляюцца палякі. Найбольш палякаў пражывае ў прыгарадах Брэста і на поўначы раёна (Чарнаўчыцы, Лышчыцы, Астрамечава і інш.). Яны таксама ў значнай ступені захавалі сваю этнічную культуру. Але ў вёсках палякі адрозніваюцца ад мясцовага насельніцтва большай прыналежнасцю да каталіцкага веравызнання. Створанае культурна-грамадскае таварыства палякаў у цесным супрацоўніцтве з касцёлам шмат робіць для захавання і

адраджэння этнічнай культуры палякаў на тэрыторыі раёна.

Татары, якіх, паводле звестак, рассяляў у ваколіцах Брэста Вітаўт, былі, хутчэй за ўсё, асіміляваны і пакінулі аб сабе памяць у выглядзе чорных вачэй, шырокіх скул, смуглявай скуры зноў жа на поўначы раёна, а таксама высокага майстэрства агародніцтва і садаводства, што прывезлі ў свой час крымскія татары, якія пазнаёміліся з гэтымі заняткамі на Чарнаморскім узбярэжжы, дзе садаводства і агародніцтва былі вядомы з антычных часоў. Саміх татар у Брэсцкім раёне фактычна не засталося. Татарская абшчына ў Брэсце толькі складваецца, але яе складаюць у большасці мігранты ўжо савецкага часу.

У раёне Дамачава, на беразе Буга да 1942 г. (ці па другіх звестках да 1943) існавалі два пасёлкі галандцаў. Па ўспамінах старажылаў Ірыны Раманаўны (1920 г.н.) і Пятра Якаўлевіча (1912 г.н.) Макарэвічаў з Чэрска, гэта былі заможныя людзі, якія займаліся агародніцтвам (вырошчвалі цыбулю, агуркі, памідоры), займаліся рамяством (кавальскім і шавецкім), рыбнай лоўляй. Мясцовыя жыхары называлі іх «голэндрамы». Царквы ў іх не было, але быў прапаведнік, якога ўсе слухаліся. Слухаць яго і маліцца яны збіраліся ў каго-небудзь у хаце. У якасці прыслугі і на сезонныя работы наймалі служанак і рабочых з мясцовага насельніцтва. Паходжанне іх па розных звестках рознае. Але хутчэй за ўсё гэта якая-небудзь сектанцкая абшчына, якіх шмат размясціла Кацярына II па заходніх абшарах сваёй імперыі за іх працавітасць і чэснасць — каб былі прыкладам для іншых.

Калонія была выселена немцамі пад час Вялікай Айчыннай вайны, як кажуць старажылы, «за те, шчо вільно сыбэ почувалы». Куды — невядома.

Карацей кажучы, асноўнай асаблівасцю раёна з'яўляецца тое, што тут адбываюцца і адбываліся з вельмі далёкіх часоў міжэтнічныя кантакты, і таму яшчэ больш цікава разгледзець, як захавалася мясцовая этнічная культура, як змагла пранесці традыцыю праз усе разбуральныя ўздзеянні, якія ахоўныя механізмы былі выпрацаваны.

А на заканчэнне гэтай своеасаблівай прадмовы — успаміны Мельнік Еўдакіі Іванаўны, 1910 г.н., жыхаркі в. Аркадзія (запіс зроблены Пікулёвай Жаннай у 1990 г.): «Наша деревня была треугольником: одна улица — наша, вторая — украинская и третья — сибиряков. А в средине, как на площади, — клуб. Родители мои сами с Тулы, жили потом в Сибири, а мужа родители — с Киева, они брали там (в Сибири) надел земли. Мой папа, родители — как казаки, и мужа папа тоже. Они посмотрели, что есть много земли, узнавали, что и как нужно, оформляли все и в 1907—1908 году приезжали туда.

А украинцев, которых туда как на каторгу отсылали, называли челдонами (плыли на челнах с Дона, потому и звали их так: челдоны). Отсылали их в Сибирь еще до революции. Мы (приезжие) больше по-украински говорили...»

З 1940-х гадоў жывуць у вёсцы Аркадзія разам «мясцовыя», украінцы і выхадцы з Сібіры. І тыя міжэтнічныя зносіны, перапляценні, што ішлі стагоддзямі на велізарных абшарах (ад Кіева і Дона да Сібіры), замыкаюцца ў «трохкутніку» вёскі Аркадзія, дзе і суіснуюць без усялякіх этнічных канфліктаў да апошняга часу.

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ЗАНЯТКІ НАСЕЛЬНІЦТВА

Земляробства было асновай жыцця. Апісанне земляробчых прылад цікаўныя могуць знайсці ў адпаведных этнаграфічных выданнях. Для ворыва прымяняліся лёгкая саха і плуг. Большая частка раёна занята пясчанымі глебамі. Гэта землі на поўдзень ад Мухаўца. Паўночней Мухаўца — супесак і суглінак. Яны не вельмі прыдатны да вядзення земляробства, і ўраджаі тут не вылучаюцца багаццем. Земляробчыя прылады — саха, плуг, барана. Бароны прымяняліся як прасцейшыя — сукаваткі, так і фабрычнай вытворчасці. Блізкасць горада спрыяла распаўсюджванню ўдасканаленых прылад працы і новых тэхналогій. У вёсках Медна і Астрамечава яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы выкарыстоўвалі конныя металічныя каткі, культыватары. У вёсцы Медна створаны адзін з лепшых этнаграфічных музеяў вобласці.

Дзякуючы блізкасці горада тут раней, чым у іншых рэгіёнах, з'явіліся і ўдасканаленыя прылады і прасцейшыя меха-



Саха, в. Рагозна.

нізмы. Да такіх належыць конны прывад. Бытавалі, асабліва сярод заможных сялян, і іншыя прасцейшыя машыны: малатарні, веялкі і іншыя. Але для абмалоту збажыны карысталіся ў большасці цэпам. Абмалочвалі зерне на таку — добра ўтрамбаванай глінянай падлозе ў гаспадарчым памяшканні. Жалі сярпамі, якія рабілі часцей за ўсё мясцовыя кавалі, а потым і фабрычным спосабам. Зжатую збажыну вязалі ў снапы і ставілі сушыцца ў «дэсяткы», «бабкы», «на плот» (азярод) — на поўначы раёна.

Сеялі жыта, авёс, ячмень, шмат саджалі бульбы і гародніны, боб, гарох, цыбулю, проса і іншыя культуры. З тэхнічных культур высявалі лён і каноплі. Але канапель сеялі не шмат — толькі для гаспадарчых патрэб. З канаплянага валакна плялі вяроўкі. Праўда дзе-нідзе вяроўкі плялі і на продаж, таму канапель высявалі больш. З канаплянага і льнянога семя «білі» алей. «Білі» таму, што для выцiскання льнянога і канаплянага алею выкарыстоўваліся клінковыя вертыкальныя і гарызантальныя прэсы. Па клінках, калі іх заганялі, білі, адсюль і выраз.

З земляробчымі работамі ў сялян звязана велізарная колькасць усялякіх прымет, якія ўяўлялі даволі стройную і лагічную сістэму ведаў пра земляробства: тэрміны сяўбы, апрацоўкі глебы і пасеваў, выбар тых ці іншых тэхналогій. Шмат такіх прымет і тэхналагічных прыёмаў звязаны са звычаямі і абрадамі. Сустракаюцца сярод іх і магічныя дзеянні. Напрыклад: па даўжыні сяннінкі, якую гаспадар выцягвае з-пад абруса на Каляды ці Шчадрэц, рабілі выснову, ці доўгі вырасце лён; іней на дрэвах у калядную ноч паказваў на добры ўраджай садавіны, а таксама лясных ягад і каліны. (З каліны рыхтавалі смачныя стравы). Зіхаценне зорак альбо мітусня сняжынак (тут прыметы мяняюцца ад вёскі да вёскі) нібыта гаварылі пра тое, што вуллі і борці будуць пускаць раі; калі куцця ўдавалася густая і «вылазіла» з гаршка, то гэта абяцала багаты ўраджай; былі таксама прыметы на пагоду вясной, на прыплод жывёлы, на пашу і г.д.

Пад час зімы было некалькі дзён, у якія па стане надвор'я меркавалі пра кліматычныя ўмовы на зіму, вясну і лета. Напрыклад, гавораць: «Як на Благавешчэння певень напьецця водыці, то на Юрья будэ травыця». Да магічных дзеянняў адносяцца таксама наступныя: не прадуць на калядныя святы, бо будуць крывыя ногі ў цялят і ягнят. З гэтай жа нагоды нельга віць вяроўкі, што б то ні было скручваць, плесці, звязваць, гнуць, калоць. На поўдні раёна нельга гэтага рабіць, каб не было сваркі ў хаце (в. Чэрск), каб «не завезаті діўцы косу навік» — не выйдзе замуж (в. Медна) і інш. Дарэчы, гэтыя забароны існуюць з вельмі даўніх часоў (Шэйн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. СПб., 1887. Т. 1, ч. 1).

Са старажытных часоў захаваліся таксама метады прадказання надвор'я на паўгода па выглядзе некаторых унутраных органаў хатніх жывёл.

Дарэчы, біць кабана напярэдадні Каляд было абавязковым. Мабыць, гэта памяць пра тыя часы, калі кабана прыносілі ў ахвяру богу Сонца — Дажбогу, які быў, хутчэй за ўсё, адным з галоўных на Палессі.

У некаторых месцах захаваліся сляды старажытных рытуалаў. Паўсюдна пры заколванні кабана, яго асмольванні, разборцы непажадана прысутнасць жанчын. У іншых месцах гэта прамая забарона, у другіх — жанчыны не прысутнічаюць пры пэўных аперацыях.

Заколатага кабана смалілі саломай і пучкамі саломкі льну, пасля аблівалі вадой, папярэдне палажыўшы на жывот галавой на паўднёвы ўсход. Аблітую ва-

дой тушу пакрывалі тоўстым слоем саломы, і ўсе мужчыны і хлопчыкі сям'і садзіліся на кабана «вярхамі» — ля галавы бацька, а за ім па старшынству. Тыя, хто праходзіў міма, віталі: «Спасібі станок» — спасі бог статак, на што бацька адказваў падзякай. Пасля «сядзення» кабана мылі і скрэблі нажамі. Жоўтая, добра асмаленая і памытая туша затым разбіралася. Часам хворым даюць пакаштаваць цёплай крыві. Элементы рытуалу і прымушаюць меркаваць, што ў даўнія часы заколванне кабана было ахвярай Сонцу (кабан прысвечаны богу Сонца), адсюль і гаданні на вантробах свяшчэннай жывёлы.

Шмат дзе ёсць гаданні па тым, як скача певень пасля адсячэння яму галавы і які малюнак пакідае кроў на снезе. Варожаць таксама па палёце птушак, па паводзінах звяроў, насякомых. Напрыклад, з'яўленне камара ў пакоі пад час маразоў прадказвае хуткую адлігу.

Усе гэтыя прыметы і варожбы дазвалялі селяніну скласці доўгатэрміновы прагноз надвор'я і прыняць рашэнне, што і ў якія тэрміны сеяць. Гэта звязана з блізкасцю горада — відавочна. Яшчэ з канца XIX ст. шмат мужчын занятыя былі на будаўніцтве крэпасных збудаванняў, чыгунак, станцыйных пабудоў, а потым і іх абслугай, з пачаткам вайны шмат мужчын пайшлі на вайну, шмат іх загінула. Таму адбываецца прыкметнае «ажаночванне» сельскай гаспадаркі, і асабліва гэта бачна на прыкладзе Брэсцкага раёна. Тут часцей, чым у іншых месцах, старэйшая ў хаце (ці ў родзе) жанчына мела ўладу не толькі над жаночымі, але і над мужчынскімі справамі. Але ўсё ж пры выкананні абрадаў і на людзях прытрымліваліся традыцыйнай іерархіі ў сям'і ці родзе, з яго трохі большым значэннем старэйшай жанчыны, чым гэта было нават у Цэнтральным ці Усходнім Палессі.

Таму патрыярхальнасць адносін тут была яшчэ менш выражана, чым на поўдні Палесся. Праўда, у шляхецкіх сем'ях патрыярхальнасць праяўлялася больш. Шляхта, асабліва пры Польшчы, імкнулася падкрэсліць сваю асаблівасць, свае перавагі над сялянамі, хаця па фактычным становішчы яны часцей за ўсё былі такімі ж сялянамі ці напоўрабочымі, як і большасць мясцовага насельніцтва. Толькі, бадай, трымаліся больш замкнёна (па ўспамінах старажылаў). Гэта праяўлялася, напрыклад, у тым, што хлопцы-шляхціцы вельмі рэдка жаніліся на «мужычках» — гэта з'ява асуджалася ў асяроддзі шляхціцаў. Дзяўчыны-шляхцянкі часцей выходзілі замуж за «мужыкоў», пераважна за заможных. Сярод шляхты больш была пашырана школьная адукацыя, яны імкнуліся больш пераймаць «панскія», ці «гарадскія», традыцыі і вобраз жыцця. Вызначаліся і веравызнаннем. Большасць шляхты была каталікамі ці уніятамі. У пасляваенны час граніца паміж «шляхтай» і «мужыкамі» фактычна знікла, хаця памяць пра колішні падзел на саслоўі яшчэ засталася.

Жывёлагадоўля. Земляробства не магло абысціся без яе, бо жывёла — гэта не толькі малако, мяса, скура, воўна, а яшчэ і цяглавая сіла, і крыніца ўгнаення, і грошы на падатак, і сродкі на прыдбанне сельскагаспадарчага інвентару, які немагчыма вырабіць сваімі рукамі, а трэба набыць у краме, на рынку ці заказаць спецыялісту-рамесніку. Жывёлы трымалі памногу, хаця і менш, чым нават ужо на Іванаўшчыне ці Піншчыне. Гэта тлумачыцца некалькімі прычынамі. Па-першае — прыгарадны раён вылучаўся яшчэ задоўга да рэвалюцыі 1917 г. большай шчыльнасцю насельніцтва (А.Смоліч. Геаграфія Беларусі. Мн., 1983. С. 119). І калі сярэдні сялянскі надзел па Гродзенскай губерні складаў каля 5 дзесяцін (каля 5,2 гектара), то ў прыгарадным раёне ён складаў хутчэй за ўсё менш (у сярэднім). Таму і ўгнаення для яго патрэбна было менш. Па-другое — частка насельніцтва (асабліва мужчыны) была занята на работах, звязаных з горадам, гарнізонам, чыгункай, ракой, лесам і г.д. Таму яны мелі другія крыніцы грашовых даходаў, акрамя продажу сваёй сельскагаспадарчай прадукцыі. Тым не менш існавалі гаспадаркі, у якіх было і па 80—85 гектараў зямлі (Астрамечава, Лышчыцы, Радванічы, некаторыя іншыя), а былі гаспадаркі, якія мелі гектар і менш зямлі. Асабліва ў бліжніх прыгарадных вёсках такой колькасці зямлі дастаткова было для ўтрымання вялікага агарода, які даваў значны даход. Таму ў прыгарадных вёсках трымалі няшмат буйной рагатай жывёлы. 1—2—3 каровы — гэта максімум.



Лодка-пласкадонка.

Больш трымалі коз і авечак. Распаўсюджана было ўтрыманне птушкі — асабліва курэй. (Зноў жа адбівалася тое, што селянін тут арыентаваўся на патрэбы горада). Па ўспамінах старажылаў, хтоніхто трымаў да 50, а то і да 100 курэй у гаспадарцы. Распаўсюджана таксама было ўтрыманне гусей і качак.

У сярэднім жа па вёсках трымалі ад 4 да 10—15 кароў (зрэдку здаралася і больш) — сюды трэба прылічыць яшчэ і пару валоў. Пры магчымасці імкнуліся трымаць каня. Конная цяга ў сельгаспрацах тут практычна выціснула валовую, якая на Палессі была шырока распаўсюджана. Трымалі шмат авечак (да 8—10), у большай ступені дзеля воўны і аўчыны, якія ішлі на выраб адзення, і часткова як тавар — на продаж. Трымалі таксама некалькі свіней.

Для ўтрымання жывёлы патрабавалася вялікая колькасць кармоў — сена, адходаў, зерня, саломы, жалудоў (якія ў вялікай колькасці выкарыстоўваліся пры адкорме свіней). Тут раней, чым у другіх рэгіёнах, на корм жывёле пачалі саджаць бульбу і буракі.

Нарыхтоўка сена і кармоў для жывёлы аднімала таксама вельмі шмат часу. Добрыя сенакосы былі пераважна толькі на поўначы ад Мухаўца і ў яго даліне, у даліне Буга на поўдні. Таму выкошвалі шматлікія палянкі ў лясах, прыбалотныя ўчасткі і г.д. Сена складвалі ў стагі на месцы, дзе яно было скошана, і звозілі зімой да хлявоў. На дварышчы яго складвалі часцей за ўсё на гарышчы («вушкі», «вышкі») гаспадарчай пабудовы ці ў стажках на падвор'і.

К канцу XIX ст. каля паловы прыгараднага насельніцтва сучаснага Брэсцкага раёна так ці інакш было ўцягнута ў рынкавыя адносіны. Па-першае, трэба адзначыць возніцкі промысел, які быў вельмі пашыраны да канца 80-х гадоў XIX ст. Ён пачаў прыходзіць у заняпад з будаўніцтвам чыгунак. Па сведчанням старажылаў прыгарадных вёсак, часам больш за палавіну дарослых мужчын займаліся возніцтвам па найме.

Па Бугу, Мухаўцу перавозілася вялікая колькасць разнастайных тавараў. Жыхары Камароўкі, Дамачава, Знаменкі, Страдзечаў, Клейнікаў, Костычаў і іншых вёсак займаліся рачным возніцтвам. Шмат хто з прырэчных вяскоўцаў меў вялікія пласкадонныя лодкі, якія наймалі для перавозкі розных грузаў. Амаль у кожнай вёсцы было некалькі чалавек, якія ўмелі рабіць лодкі-пласкадонкі. З развіццём чыгуначнага транспарту і воднае возніцтва таксама прыходзіць да заняпаду.

Збіральніцтва. Лясы Брэсцкага раёна багатыя грыбамі, ягадамі, рознымі карыснымі раслінамі. Збіраць грыбы было ў асноўным мужчынскім заняткам. З ранняга ўзросту да гэтай справы прывучаліся і хлопчыкі. Па сведчанні жыхароў в. Медна, грыбы хаваюцца ад жанчын, саромеюцца іх, і калі жанчыны ўпарта іх шукаюць, то яны наогул могуць перастаць расці. Магчыма, гэта звязана з нейкімі старажытнымі вераваннямі і звычаямі, адгалоскі якіх захавала гэта павер'е. Найбольш каштоўнымі відамі грыбоў лічыліся розныя формы белага (Boletus edalis). Грыбы варылі, смажылі, салілі, але, напэўна, часцей за ўсё сушылі.

З ягад раён багаты на чарніцы, брусніцы, дзе-нідзе на балотах сустракаюцца журавіны. Найбольшым попытам карыстаюцца чарніцы, якія нарыхтоўваюць у вялікай колькасці, вырабляючы з іх варэнне. А яшчэ шмат чарніц сушаць. У такім выглядзе «палескі ізюм» можа захоўвацца некалькі гадоў і выкарыстоўвацца для прыгатавання кампотаў, кісялёў і іншых страў і напояў, а таксама ў якасці лекавых сродкаў. Вялікі попыт на ягады прывёў да з'яўлення прыстасаванняў для збору ягад (у асноўным чарніц, брусніц і журавін). Можна меркаваць, што адпаведная прылада была зроблена на падставе веялкі, якая ўжывалася ў сялянскай гаспадарцы для правейвання зерня пасля абмалоту.

Збіралі таксама маліну, ажыну, парэчкі, каліну, рабіну і іншыя ягады. Нарыхтоўвалі таксама кветкі ліпы (з якіх рыхтавалі лекі, а таксама пахучы чай), багун, іншыя травы, кветкі і лісце.

Збіральніцтва наогул было адным з важных заняткаў — яно давала прадукты харчавання, лекі і ў наяўнасці буйнога цэнтра гандлю — грошы.

Пчалярства і бортніцтва. Бортніцтва з'яўлялася адным з старажытнейшых заняткаў на Берасцейшчыне. Бары, гаі і пушчы садзейнічалі гэтаму занятку. Для вырабу борці выбіралася высокая старая сасна, вершаліна якой за некалькі гадоў перад тым спільвалася, каб сасна расла «ўтоўшч». Дрэва павінна быць «усіталатым» — мець рыхлую смалістую структуру сарцавіны. Выяўлялі такое дрэва прастукваннем абушком у зімовы час. Потым з дапамогаю спецыяльнага інструмента на вышыні 7—12 метраў у ствале дрэва выдзёўбвалі борць «слепэтэнь». Тэхналогія ўладкавання борці апісана ў спецыяльнай літаратуры.[2] Такая тэхналогія была амаль аднолькавая ва ўсіх усходніх славян з невялікімі мясцовымі асаблівасцямі, з якіх вылучаецца палеская тэхналогія, дзе выкарыстоўваецца арыгінальнае прыстасаванне для лазання па дрэвах — лезіва. Вельмі цікава, што тэхналогія бортніцтва, аналагічная палескай, захавалася да нашага часу ў Чувашыі.[3] Борці памячаліся знакамі, і такую борць ніхто не меў права чапаць, акрамя гаспадара. Нягледзячы на памяркоўны характар беларусаў і палешукоў, разбурэнне борці каралася вельмі жорстка. Па сведчанні старажылаў, такога злодзея маглі нават забіць самасудам. Існуе легенда, што чалавек, які разбурыў божую борць, быў пакараны тым, што пераўтварыўся ў мядзведзя і загінуў пад час разбурэння борці сялян. Адносіны да пчол былі, як адносіны да святога. З пчалінага воску рабілі грамнічныя свечкі, а потым і свечкі, якія ўжываліся ў хрысціянскіх абрадах. Мядовая сыта — абавязковая страва шматлікіх абрадаў. Мёдам частавалі маладых пры сустрэчы іх ад вянца і г.д.

Вялікі попыт на мёд і воск і блізкасць буйнога гандлёвага цэнтра — Бярэсця, садзейнічалі ранняму ператварэнню бортнага промысла ў таварную галіну гаспадаркі. З гэтай нагоды тут рана з'явіліся



Вулей з саламянымі сценкамі.

вуллі. Найбольшае распаўсюджанне атрымалі вуллі-калоды, якія распаўсюджаны ва ўсіх усходніх славян.[4] У раёне бытавала цікавая тэхналогія вырабу вулляў-калод. Падрыхтаваную з сухога дубу ашкураную калоду ставілі вертыкальна і зверху па памерах будучай адтуліны распальвалі вогнішча. Абгарэўшую частку выскрэбвалі і на дне зноў палілі вогнішча. Так паступова паглыблялі адтуліну калоды, затым начыста апрацоўвалі стругам, спецыяльнай сякерай і іншым інструментам. Такім жа метадам выпальвалі і ступы.

Па ўспамінах старажылаў, у 20—30-я гады былі пчаляры, якія трымалі па 40—60 вулляў і здабывалі мёду да 200 кг. Вуллі рабілі рамавыя, з саламянымі сценкамі.

Рыбалоўства і паляванне. На поўначы раёна рыбалоўства развівалася на Бугу, Мухаўцы, Лясной. Тут яно яшчэ дастаткова даўно набыло арцельны характар, а адсутнасць колькі-небудзь значных азёр і балацін не дазвалялі пераўтварыцца гэтаму промыслу ў значны занятак.

Поўдзень раёна ўваходзіць у зону азёр Паўночна-Заходняй Валыні, адкуль бярэ пачатак рака Прыпяць. Тут знаходзіцца шэраг невялікіх азёр і верхавых балот, прарэзаных ручаямі і рачулкамі. У XIX — пачатку XX ст. рыбалоўства тут было добра развіта.

Былі вядомы рыбалоўныя прылады, плеценыя з прутоў лазы, сеткавыя снасці — браднік, волак. У апошні час распаўсюдзіліся розных памераў «тэлевізары» «павукі». Прыходзілася бачыць «павук» на лябёдцы, памеры сеткі 10х10

м. На азёрах і затоках прымяняліся стаўныя сеткавыя прылады — жакі (венцеры), сеткі-трыгубіцы. На большых азёрах распаўсюджаны невады з мяшком («мотнэю») і латы. Дарэчы, тут, як і наогул на Палессі, лавілі вялікую колькасць рыбы, што не адбівалася на яе запасах. Знаёмства з гэтым промыслам у Лунінецкім[5], Брэсцкім, Столінскім і іншых раёнах вобласці сведчыць, што большасць традыцыйных прылад і рыбалоўных снасцей у наш час адносіцца да браканьерскіх. У той жа час, паводле сведчання жыхароў в. Медна (Брэсцкі раён) і Арэхава (Маларыцкі раён), забарона выкарыстоўваць невады і латы для рыбнай лоўлі на азёрах прывяла да інтэнсіўнага забалочвання берагоў, бо невадамі і латамі не толькі лавілі рыбу, але і чысцілі дно, выцягваючы іл і бруд, а разам з ім і калоніі і насенне водарасцяў. Шмат якія віды проста не могуць існаваць у заіленым вадаёме, які ўтрымлівае, акрамя ўсяго іншага, шмат шкодных рэчываў. У чыстым жа возеры пагалоўе рыбы хутка ўзнаўлялася. Магчыма, у парушаных экасістэмах традыцыйнае рыбалоўства і не будзе эфектыўным сродкам узнаўлення рыбных запасаў, але гэтае пытанне патрабуе дадатковага вывучэння. Традыцыйна некаторыя віды водарасцяў выкарыстоўваліся для адкорму свіней.

Наогул жыццё каля вады — гэта не толькі рыбная лоўля і водны транспарт. Вада ў жыцці палешука іграе больш значную ролю. Там жывуць вадзянікі, якія часам уяўляюцца ў выглядзе старога велізарнага сома, які любіць ласавацца свойскай жывёлаю. Магчыма, гэта водгук даўніх часоў, калі вадзяніку прыносілі ахвяру. Дарэчы, паданні аб самах-людаедах (якіх таксама шмат) ніколі не звязваюцца з вадзяніком. Тут гэта хутчэй антыпод вадзяніка, які часам нават дапамагае злавіць сома-людаеда. З вадой звязаны і паданні-казкі пра чалавека-вужа, які ажаніўся на дзяўчыне.[6]

З рыбалоўствам і паляваннем звязана шмат павер'яў і звычаяў. Да паляванння не дапускаліся жанчыны. Звычайна паляўнічы, выходзячы на промысел, пазбягаў нават сустрэчы з імі. Калі нечакана сустракалася жанчына, то можна смела вяртацца дахаты і вешаць на гваздок стрэльбу ці лоўчыя снасці — усё роўна не пашанцуе. У адрозненне ад агульнапрынятага погляду на тое, што паляўнічы ці рыбак заўсёды перабольшвае памеры і колькасць здабычы, паляшук наогул імкнецца не гаварыць на гэтую тэму, — каб не сурочылі. А калі заходзіць гаворка пра здабычу, то заўсёды імкнецца прыменшыць свае дасягненні, стараючыся не ўпамінаць назву (імя) рыбы ці звера. Шчупака ён назаве «сеголеток», «галас», сома — «полено», «колода», «пэнёк», мядзведзя — «хазяін», кабана — «секач» і г.д. Лічыцца, што пахвальба ці пералічэнне здабычы можа выклікаць незадавальненне вадзяніка ці лесавіка. Гэта традыцыя, безумоўна, узыходзіць да дахрысціянскіх вераванняў. Асаблівай павагай карысталіся некаторыя птушкі, на якіх распаўсюджвалася забарона паляванння. Сярод іх бусел («боцян», «бусько»). Паводле павер'яў, раней гэта быў чалавек, якому Бог (па другіх варыянтах св. Мікола ці іншы святы) далі аднесці і ўкінуць у балота мех з «нячыстымі» тварынамі — жабамі, гадзюкамі і г.д. Яму строга-настрага забаронена было развязваць мех і глядзець, што там. Але цікаўны паляшук усё ж такі на ўскрайку балота не вытрымаў і развязаў мех. І ўся жыўнасць з яго імгненна распаўзлася па ваколіцах. Тады Бог (святы), раззлаваўшыся, сказаў, што да сканчэння свайго роду чалавек гэты павінен лавіць і знішчаць жывёлін, якія знаходзіліся ў мяху. Гэткая ж доля была наканавана і яго нашчадкам. А для таго, каб яму лягчэй было займацца паляваннем, Бог аснасціў яго крыламі, каб з вышыні выглядаць, дзе поўзае здабыча, доўгімі нагамі і моцнай дзюбай. Так з'явіўся на свет бусел. Магчыма, гэта адгалосак старажытнейшага татэмістычнага міфа.

ЖЫЛЛЁ І ГАСПАДАРЧЫЯ ПАБУДОВЫ

Тэрыторыя раёна населена з глыбокай старажытнасці. Яшчэ ў сярэднявечча шляхі зносін аказалі вялікі ўплыў на фарміраванне і структуру населеных пунктаў. На поўдні раёна яны выцягнуты ўздоўж Буга, чыгуначнай лініі і шашы на Уладаву. З канца XIX ст. населеныя пункты ўсё больш набываюць рысы мястэчкаў. Асабліва гэта характэрна для Дамачава, Прыбарава, Тамашоўкі. У Падлужжы, Багданах і некаторых іншых захава-

ліся рэшткі характэрнай для Палесся лінейнай па беразе ракі ці рачной даліны планіроўкі з фасадамі і франтонамі да берага і гаспадарчымі пабудовамі, не звязанымі паміж сабой. У вёсках Чэрск, Рагозна, Медна захаваліся рэшткі радыяльна-лугавой планіроўкі.

Традыцыйная планіроўка жылля ўзыходзіць да аднакамернай курнай хаты, характэрнай для ўсходніх славян. Больш характэрныя хаты з двухкамернай планіроўкай (хата — сенцы), а таксама трохкамернай: хата — сенцы — сцепка (комора), якая мае тэндэнцыю ператварацца ў другое жылое памяшканне. Сустракаюцца пабудовы, у якіх сенцы маюць двое дзвярэй. У прыгарадных вёсках нярэдка сустракаюцца пабудовы, якія маюць высокі ганак і «парадны» ўваход. Хутчэй за ўсё гэта ўплыў гандлёва-рамесніцкіх пабудоў, якія часта сустракаюцца ў мястэчках. Шмат такіх пабудоў у Дамачаве, Тамашоўцы, Вычулках, Чарнаўчыцах.

Будаўніцтва было справай усяго роду. Звычайна гаспадар доўга рыхтаваўся да гэтага адказнага кроку. У той ці іншай ступені кожны селянін быў будаўніком. Ён мог без дапамогі спецыяліста збудаваць драўляны хлеўчык. Ён жа і яго родзічы былі галоўнай рабочай сілай пры ўзвядзенні жылля. Для самых складаных работ наймалі спецыяліста-цесляра. Той выбіраў у лесе дрэвы, прыгодныя для будаўніцтва, кіраваў лесапавалам, тралёўкай і складваннем бярвенняў. Выбіралі дрэвы спелыя, узростам 70—100 гадоў, якія растуць на ўзгорках і з якіх не сцягвалі смалу. Выбар можна было рабіць пасля таго, як лес «засне», звычайна ў маладзіку пасля маразоў. Найлепшы час для выбару лесу — другая палова студзеня — першая палова лютага. Тады дрэва «пустое». У сувязі з попытам на жыллёвае будаўніцтва ў раёне раней, чым у іншых рэгіёнах, вылучаюцца цяслярскія арцелі, і сяляне ўжо з канца мінулага стагоддзя аддаюць перавагу такім арцелям, якія робяць хату «пад страху».

Адной з самых адказных аперацый была распілоўка лесу на брусы. Дарэчы, брус на хату ў заходнім Палессі танчэйшы, чым у цэнтральным, з гэтым звязаны і асаблівасці рубкі вуглоў. Гэтая акалічнасць дыктуе і неабходнасць больш сталай распілоўкі. Таму «верхні пільшчык» абавязкова высокакваліфікаваны спецыяліст. Распілоўвалі бярвенні па шнуры — адбітку намазанага галавешкай шнура. На адным бервяне «адбівалі» 1—2 брусы, па баках — дошкі.

Тэхніка і тэхналогія будаўніцтва такая ж, што характэрна для ўсяго заходняга Палесся. Але на поўначы раёна распаўсюджаны асаблівасці, характэрныя для Беласточчыны і вёсак Камянецкага раёна, якія прылягаюць да р. Буг. Спачатку робіцца вялікі, на ўсю хату, лёх глыбінёй 2 метры і болей, сцены якога выкладваюцца з валуноў. Лёх перакрываецца бетонным перакрыццем, раней склепаваннем, альбо дубовымі плахамі. Сцены лёха ўзвышаюцца над зямлёй іншы раз да метра і зрэдку нават болей і служаць таксама падмуркам хаты. З боку вуліцы ёсць люк у лёх, праз які падаюцца бульба, буракі і іншыя, прызначаныя для захавання на зіму, прыпасы. Лёх усталяваны перагародкамі, полкамі і паліцамі. Там захоўваюцца таксама квашаная капуста, салёныя агуркі, марынаваныя і салёныя грыбы. У наш час полкі застаўлены шклянымі банкамі з разнастайнымі салённямі, варэннямі, кампотамі. Уваход у лёх робіцца з сяней. Пабудова на такім лёху-падмурку мае дастаткова манументальны выгляд і, як правіла, цэнтральнай кампазіцыі. На большай тэрыторыі раёна раней хата звычайна ўзводзілася без падмурку — на штандарах і падвалінах. У адрозненне ад раёнаў, усходней Кобрына, штандары не рабіліся высокімі, і 1—2 вянцы падрубы, якія апіраліся на штандары па вуглах, клаліся на зямлю. У в. Чэрск зафіксавана хата, вакол якой зроблена «прызба» — цеплаізаляцыя з зямлі, якая засыпалася за дошку, умацаваную паралельна сцяне на адлегласці 30—40 см ад яе. Сцены рабіліся з больш тонкага бруса.

Раней, да паўсюднага існавання лесапілавання, у будаўніцтве выкарыстоўвалі расколатыя папалам бярвенні, абчэсаныя з закругленага боку. Шырокая плоскасць такой «дэлі» клалася ўсярэдзіну хаты. Гэта патрабавала больш дакладнага і трывалага вугла, бо тонкія брусы і колатыя бярвенні маюць вялікую здольнасць дэфармавацца. Такі вугал з астаткам з двума патайнымі шыпамі можа быць таксама



Узор аднараднай забудовы, в. Страдзеч.

з адным зарэзам, а не толькі з двума. Выступаючыя рэшткі вугла часта бываюць апрацаваныя. Сцены ўсярэдзіне абавязкова муравaліся белай глінай, змешанай з кастрыцай. Шпары звонку сцен таксама замазваліся глінай. Сцены і знутры і звонку бялiліся. Такая хата мае вельмі прыгожы святочны выгляд. Бэлькі вядомы толькі папярочныя. Падоўжанай бэлькі (трама, альбо маціцы) тут не ведаюць. Столь часцей насцілаецца тоўстымі дошкамі ўпрытык, а не ў разбежку, па бэльках. Насціл столі выходзіць за сцяну і дасягае даху. Таму з-пад даху відаць канцы бэлек. На насціле столі робяць тоўстую, 20—25 см, цеплаізаляцыю з гліны, перамешанай з кастрыцаю. У такой цеплаізаляцыі не заводзяцца мышы — кастрыца для іх не па зубах. Кроквы ставяцца выключна на бэльках. Страха рабілася саламяная, хаця бывае страха з колатых плах на самцах. Такая страха вядома яшчэ з раскопак Бярэсця.

Што датычыць аздаблення жылля дэкаратыўнымі элементамі, то яны на Палессі ў большасці сціплыя, стрыманыя. Гэта часцей фігурна апрацаваныя канцы бярвенняў вугла з рэшткаю і бэлек, сціплы лінейны ўзор ліштваў акон і дзвярэй, часам трапляецца разьба, у якой можна адшукаць міфалагічныя матывы, звязаныя з пакланеннем Сонцу. Мастацка-архітэктурная традыцыя Палесся заснавана не на знешніх, дэкаратыўных элементах упрыгожвання, а на старанна вытрыманых прапорцыях пабудовы і надзіва мэтазгоднай арганізацыі аб'ёмаў. Для ўсяго Палесся характэрна ўражанне манументальнасці пабудоў, нягледзячы на даволі сціплыя памеры. Таму і дэкаратыўныя элементы (напрыклад, ліштвы) павінны толькі дзяліць аб'ёмы і плоскасці, не выпадаючы з агульнага строгага малюнку архітэктурнага цэлага.

З будаўніцтвам звязана шмат звычаяў і абрадаў. Цікавыя метады выбару месца для хаты. Добрым месцам лічыцца тое, дзе любіць лажыцца на адпачынак хатняя жывёла. На добрае месца паказваюць і мурашкі. Дзе яны жывуць, там можна будаваць. Спрыяльнае месца можна знайсці, калі выйсці цёплым вечарам напрыканцы вясны ці на пачатку лета пасля захаду сонца, калі паветра паспела астыць, і пашукаць, дзе паветра найбольш цёплае. Той жа вынік дасць, калі пахадзіць босымі нагамі па расе да ўсходу сонца. Дзе раса цяплейшая, тут і патрэбна распачынаць будоўлю. На поўдні раёна выбіралі месца пад хату пры дапамозе хлеба. (Гэты метад вядомы ад Пасожжа да Падляшша). Гаспадар браў круглы бохан хлеба, які выпечаны ў хатняй печы, і хадзіў з ім па ўчастку, час ад часу як бы знянацку хлеб падаў на зямлю. Кожны раз, падымаючы хлеб, патрэбна было прасіць прабачэння і цалаваць тое месца, якім хлеб ляжаў на зямлі. Калі хлеб падаў верхняй скарынкай да зямлі, то будаваць хату на гэтым месцы было нельга. Пад час абходу ўчастка з хлебам гаспадар тварыў спецыяльную малітву, змест якой, на жаль, ужо

ніхто з рэспандэнтаў не памятае, але там упамінаюцца Мікола, Ілья і Іосіф, муж Багародзіцы.

Ні ў якім разе нельга было будаваць на старой дарозе, на скрыжаванні дарог, на старых могілках, на месцы, дзе звер задраў жывёліну. Лічыцца, што на гэтых месцах водзіцца нячыстая сіла. Такое месца вельмі добрае для будаўніцтва царквы. На скрыжаваннях дарог на ўсім Палессі раней ставілі крыжы; нават, калі ад такога скрыжавання да бліжэйшай вёскі 10 і больш кіламетраў, чыясьці клапатлівая рука падпярэжа гэты крыж аздобленым фартушком ці павяжа яго даматканым ручніком, а калі гэтая рэч састарэе ці сатлее, то абавязкова з'явіцца новая. І ніхто не ведае, хто і калі гэта зрабіў. Складваецца ўражанне, што фартушкі і ручнікі абнаўляюцца самі сабой, у чым упэўнены кожны паляшук.

Акрамя жылля на падвор'і знаходзіліся гаспадарчыя пабудовы — хлявы, клуня, куратнікі, вазоўня, рухомая на чатырох слупах чатырохсхільная страха, пад якую складвалі сена.

Жыллё, гаспадарчыя пабудовы, «малыя архітэктурныя формы» —калодзеж, дзверцы ў плоце і г.д., адыгрываюць вялікую ролю ў каляндарных і сямейных абрадах. Згадаем толькі абрады, звязаныя з будаўніцтвам. Гэтыя абрады суправаджаюцца частаваннем. Гэта акладзіны (пасля закладкі першага вянца зруба), «шлаповэ» (пасля перакрыцця дзвярных і аконных праёмаў), «бальковэ» (пасля ўстаноўкі бэлек), «шчытовэ» (пасля ўстаноўкі франтонаў і прымацавання кветкі ці галінкі дрэва на адным з іх). На поўдні раёна гэта было апошняе частаванне цесляроў і называлася «квітка».

У мястэчках і прыгарадных вёсках развіты былі дрэваапрацоўчыя промыслы (сталярства, стальмашнае рамяство, выраб саней, бандарны промысел). Шырока распаўсюджана пляценне. У некаторых вёсках майстры рабілі прыгожую плеценую мэблю. Для патрэб гандлю і нарыхтоўкі рыбы, ягад, грыбоў, капусты, агуркоў і г.д. патрабавалася шмат бочак. Паколькі перавозіць гатовыя бочкі, скажам, з Піншчыны, Лунінеччыны ці Століншчыны было нязручна — яны займалі шмат месца, то там звычайна нарыхтоўвалі клёпку для бочак. У Брэсце, мястэчках каля яго, прыгарадных вёсках бондары з гэтай клёпкі збіралі бочкі. Так ужо даволі рана стыхійна складалася спецыялізацыя рамесніцкай вытворчасці.

Вельмі важным быў калёсны промысел. Ён, дзякуючы сваёй складанасці, працаёмкасці і вялікаму попыту на колы, рана вылучыўся ў асобны промысел і стаў спецыялізаваным. Тэхналогія аднолькавая на ўсім Палессі.

АДЗЕННЕ

З XVIII стагоддзя распаўсюдзілася традыцыя шыць адзенне з крамнай тканіны (гэта ўплыў вялікага гандлёвага цэнтра — Брэста), з гэтай жа нагоды распаўсюджаны і «гарадскі» пакрой адзення, асабліва ў мяшчанскім і гандлёва-рамесным асяроддзі. Аднак у вёсках, асабліва аддаленых ад горада, захаваліся традыцыі вырабу даматканага палатна і пашыву з яго адзення. У якасці сыравіны для вырабу нітак служылі льновалакно і воўна. Падрыхтоўка льну да прадзення мела шмат тэхналагічных аперацый. Абкалочаная, звязаная ў снапы саломка льну расцілалася на лугах на жнівеньска-верасняўскія росы, якія і вымочвалі лён. Канаплю часцей за ўсё вымочвалі ў рацэ ці азеры, прыціснуўшы яе жэрдкамі, на якія накідвалі дзёран ці камяні.

Лён, які адляжаў на лузе ад 2 да 4 тыдняў, зноў звязвалі. Ён ужо падрыхтаваны да далейшай апрацоўкі. Церлі лён звычайна ў кастрычніку — першай палове лістапада. Перад тым лён прасушвалі. Рабілася гэта на спецыяльных прыстасаваннях. Жанчыны звычайна збіраліся церці лён талакою. Церлі па чарзе лён кожнай гаспадыні. Для сушкі саломкі льну капаецца яма, даўжынёй 2—4 м, шырынёй 1,2—1,5 м і глыбінёй 60—80 см. Над ямай робіцца збудаванне з жэрдак у выглядзе каркаса двухсхільнай страхі. У ямцы напальваюць тоўсты слой жару і, калі агонь патухне, на жэрдкі збудавання над ямкай рассцілаюць саломку льну, які вельмі хутка высыхае і добра апрацоўваецца на церніцы. Далейшая апрацоўка льну і падрыхтоўка яго да прадзення ажыццяўляецца на часалках.

Для прадзення вельмі распаўсюджаны калаўроты («ковроткі»). Часцей за ўсё гэта вядомыя самапрадкі-лежакі. На

Узоры ткацтва.

іх жа пралі і шарсцяную пражу, прычым падрыхтоўка шэрсці да прадзення таксама ўключае шмат тэхналагічных працэсаў — ад стрыжкі воўны да падрыхтоўкі кудзелі на спецыяльных машынах-чахмарнях.

Прадзенне было адным з асноўных заняткаў жанчын у доўгія восеньскія і зімовыя вечары. Дарослыя жанчыны часта збіраліся ў каго-небудзь на «попредухі», моладзь — на «вэчерніцэ». Звычайна прасці забаранялася з вечара ў пятніцу да ранку ў панядзелак. Наогул у суботу прасці не забаранялася, але гэты дзень быў на Палессі традыцыйна днём прыборкі. Не пралі, нават прыбіралі з хаты ўсё, што звязана з прадзеннем, на зімовыя святы — з Раства да Хрышчэння. Забаранялася трымаць у хаце што б ні было, звязанае з пражай, пад час вяселля. Існавала яшчэ шмат іншых павер'яў і забарон, звязаных з прадзеннем.

Шарсцяныя ніткі часцей за ўсё потым фарбавалі. У якасці фарбавальнікаў ужываліся адвары кары крушыны, дуба, дубовых арэшкаў, якія растуць на лісцях гэтага дрэва, а таксама некаторыя іншыя расліны ці іх часткі.

Падрыхтаваныя да ткацтва ніткі снавалі — рыхтавалі аснову для тканіны. Распаўсюджаны розныя метады снавання — на сцяне, на раме і на «сніўніцы» — раме, якую круцілі і на якой рабілі аснову. Канструкцыя яе розная.

Узоры ткацтва разнастайныя як па перапляценні, так і па колеравай гаме. На шыццё адзення ішлі льняныя, шарсцяныя і паўшарсцяныя тканіны. Іх афарбоўка, узоры і пакрой залежаць ад строю адзення. На поўдні раёна бытуе так званы дамачаўскі строй, жаночы камплект якога складаецца з тунікападобнай сарочкі з плечавымі ўстаўкамі і шырокім адкладным каўняром, рогі якога ляжалі на пля-

чах. Па краях каўняра і на плечавых устаўках — арнамент з малінавых з чорным палос, які складаў лінейны ўзор. Па нізе рукава такі ж узор, які часта акаймляў геаметрычны ромбавідны. Шырокая спадніца з паўшарсцяной тканіны ў каляровыя палоскі па ўтку ці па аснове (з гэтай нагоды палоскі падоўжныя ці папярочныя). З такой жа тканіны шылі і аднапалковы фартух. Спадніца запрасавана ў буйную складку. Гарсэт (альбо шніроўка) часцей за ўсё з крамнай шарсцяной тканіны светла-сіняга альбо блакітнага колеру, які багата аздоблены аплікацыяй з тасьмы, стужак, упрыгожаны гузікамі, бляшкамі, іншы раз манетамі. Гарсэт зашпільваўся спераду на гузікі, прыталены з адразной баскай у 8 фальбонаў, аздобленых па беразе.

Галаўныя ўборы жанчын — хустка, а раней бытаваў каптур, пераважна чырвонага колеру, прашыты стужкай ці тасьмой. Спераду над ілбом «зуб», каптур меў «вушы». Паверх яго павязвалі накрухмаленую хустку, і ўвесь галаўны ўбор набываў вельмі маляўнічы выгляд. У халодную пару года камплект дапаўняўся світкай з валенага сукна шэрага ці карычневага колеру, прыталенай, з адкладным каўняром. Бытавалі таксама кажушкі. Святочны абутак — чаравічкі, якія звычайна заказвалі дзяўчыне на выданне ў гарадскога краўца. Такія чаравічкі на высокім абцасе называліся румынкамі.

Мужчынскі камплект больш сціплы, але таксама ўключаў у сябе гарсэт, часта ўпрыгожаны. На галаву надзявалі ўлетку капялюш, плецены з саломы, упрыгожаны чорнай стужкай.

Бытаваў гэты строй па р. Буг, на тэрыторыі Брэсцкага, Маларыцкага раёнаў, у Польшчы (у ваколіцах Уладавы), а таксама на паўночным захадзе Валыні (таксама пераважна па р. Буг). Цікава, што гэты строй больш характэрны для вёсак, якія імкнуцца да местачковага быту, чым і вылучаецца апісваемы рэгіён. Магчыма, ён склаўся на падставе больш архаічнага маларыцкага строю, шляхам яго спрашчэння і прывядзення да адной каляровай гамы.

Поўнач раёна больш ахоплена уніфікацыяй касцюма на падставе гарадскога пакрою. На паўночным усходзе адзначаецца своеасаблівае змяшэнне пінскаівацэвіцкага і ваўкавыска-камянецкага строяў з яўнай перавагай апошняга.

Да раздзелу аб адзенні трэба аднесці таксама валяльны промысел (выраб валёнкаў), а таксама пашыў бурак — мяккага абутку накшталт валёнкаў з сукна на ватнай пракладцы. Такія буркі, а таксама валёнкі з лямцу часта насілі ў бахілах — гумавых, клеяных з аўтамабільных камер, высокіх «боцікаў». Выраб бахілаў быў выключна рамесны. Гэтай справай займаліся як местачкоўцы, так і жыхары прыгарадных вёсак. У наш час як пашыў бурак, так і выраб бахілаў мае тэндэнцыю да адраджэння.

ЕЖА

Спосабы прыгатавання страў і рацыён мала адрозніваюцца ад усяго заходняга Палесся. Хаця і тут назіраюцца яўныя ўплывы горада і традыцый іншых этнічных груп — рускіх, палякаў, украінцаў. Развіццё гандлю дазваляла менш увагі надаваць кансерваванню і доўгатэрміновым нарыхтоўкам, хаця ў больш аддаленых ад горада вёсках і захаваліся спосабы нарыхтоўкі і кансервавання як мясных, так і малочных прадуктаў.

Такі спосаб быў вядомы на ўсім Палессі[7]. Тут больш, чым у іншых рэгіёнах, распаўсюджана была нарыхтоўка вяндліны (магчыма, пад уздзеяннем «гарадскіх» тэхналогій ці традыцый іншых этнічных груп). Вэндзілі сала, шынку, трохі вытрыманыя ў жывасоле сцягно ці лапатку, каўбасы.

Шырока выкарыстоўваліся ў рацыёне мучныя вырабы. Сярод іх першае месца трэба аддаць хлебу, які выпякаўся ў хатніх умовах. Хлеб быў пераважна «квасны» — на рошчыне з жытняй мукі. Яго замешвалі ў дзежцы, затым сфармаваныя боханы спецыяльнай лапатай саджалі ў добра напаленую і старанна падмеценую печ на капусныя ці кляновыя лісты. Затым печ закрывалі засланкай, і хлеб выпякаўся некалькі гадзін. Пасля яго даставалі, клалі на стол на абрус, змочвалі верхнюю скарынку вадой, пагладзіўшы яе мокрай далонню, і накрывалі другім абрусам, каб хлеб раўнамерна астываў. Верхняя скарынка пасля такой аперацыі рабілася глянцавай. Звычайна выпякалі хлеб на тыдзень, а то і болей.

Існавала шмат іншых мучных страў. З густога цеста з заваранай аўсянай мукі гатавалі талакно. У пост рабілі саладуху. Дзеля гэтага аўсяную ці жытнюю муку ашпарвалі кіпнем, размешвалі і ставілі на печ. З гэтага атрымліваўся солад, які потым разводзілі вадой і варылі. Страву ўжывалі з хлебам ці бульбай. Такім жа чынам, але замешаную гусцей, муку варылі да тых часоў, пакуль страва не пачырванее, — жур. Больш, чым у іншых рэгіёнах, распаўсюджаны былі стравы з грэчкі, якой шмат сеялі на поўдні раёна. Як і паўсюдна, на Палессі грэчка была абавязковым элементам севазвароту, бо знішчала шмат якія віды пустазелля. Распаўсюджаны былі бабовыя стравы. Традыцыйна сеялі шмат маку, бо мак быў абавязковым у шматлікіх абрадавых стравах, у прыватнасці ў велікодных і калядных пірагах. Дабаўлялі ў пірагі таксама малачко з расцёртых макавых зярнятак. Як наркатычны сродак мак ніколі не ўжывалі, хаця пра гэтыя якасці маку добра ведалі.

З самых пашыраных былі малочныя прадукты. Акрамя сырога малака ўжывалі перапрацаваныя малочныя прадукты. Па-першае, гэта смятана і сметанковае масла. Сметанковае масла білі ў бойках. Вядомы два тыпы — вертыкальная, якая распаўсюджана на ўсім Палессі, а таксама ў розных варыянтах ва ўсіх славянскіх народаў. У ваколіцах Брэста зафіксавана гарызантальная маслабойка, у якой рабочая частка замацавана на рухомай восі. Такая маслабойка больш прадукцыйная, чым вертыкальная. Магчыма, яе канструкцыя была запазычана ў кагосьці з этнічных груп (не выключана, што ў тых жа галандцаў, «голэндроў», якія жылі ў раёне Дамачава). На гэтую думку наводзіць тое, што гарызантальная маслабойка найбольш распаўсюджана на поўдні раёна, а ў Медна, Ляплёўцы і Чэрску яна назусім звязана з этнічнай культурай, у той час як на поўначы, дзе яна добра вядома, пра яе гавораць як пра новую з'яву. Дамачава таксама размешчана на поўдні раёна.

З маслёнкі рыхтавалі смачны боршч — халаднік. Кіслае малако, з якога знялі смятану, адтоплівалі ў цёплай печы і з тварожнай масы рыхтавалі клінковыя сыры, якія маглі захоўвацца вельмі доўгі час. [8]

Трэба нагадаць яшчэ пра вельмі карысныя і смачныя танізуючыя напоі. Рыхтаваўся цудоўны танізуючы напой з сыроваткі, якая заставалася пасля адціскання тварожыстай масы з адтопленага кіслага малака. Ёй давалі крыху забрадзіць, дабаўляючы проса, і захоўвалі ў лесе ці лядоўні. Можна было ўжываць яе на працягу 2 тыдняў. Бярозавы і кляновы сок таксама нарыхтоўвалі ў вялікай колькасці, зліваліў вялікія ёмкасці (звычайна — бочкі), сыпалі туды пэўную колькасць проса, дабаўлялі сёе-тое з траў і некаторыя іншыя дабаўкі. Такі напой мог не псавацца без герметычнага закупорвання цэлае лета і быў цудоўным танізуючым напоем.

Асобнай галіной этнічнай культуры з'яўляюцца і абрадавыя стравы. Шмат якія з іх рыхтаваліся на мяду. Гэта, па-першае, мядовая сыта, якая з'яўлялася абавязковай на памінальных абрадах і абрадах, у якіх памінанне з'яўляецца абавязковым элементам. Мёд разводзілі цёплай вадой і крышылі туды невялікімі кавалкамі хлеб. Звычайна сыта ўжывалася на пачатку памінальнага стала. Да рытуальных страў адносіцца куцця — посная ці на сале каша з пшаніцы, ячменю, радзей з іншых злакавых культур. Для Палесся характэрны рытуальныя стравы, прыгатаваныя з сушанай рыбы. Без ужывання сала яны лічыліся поснымі. Посная рыбная юшка абавязкова падавалася на Каляды, на памінках. Шмат абрадавых страў рыхтавалася з мукі ці крупы. Для вяселля характэрна выпечка спецыяльных хлябоў-караваяў. Гэты працэс сам з'яўляецца даволі складаным абрадам.

У якасці галоўнай каравайніцы выступае часцей за ўсё хросная нявесты, яе цётка па бацьку (радзей па маці), ці якая іншая жанчына, якая на гэты час бярэ на сябе адпаведны статут у сістэме радства. Абавязковае патрабаванне — яна (як і ўсе каравайніцы) мусіць быць замужняю, не быць удавой, мець дзяцей, прычым усе дзеці ў яе павінны быць жывымі, а за апошні год не павінна здарыцца смерці з кімсьці з яе бліжэйшых родзічаў. Каравайніцы неслі з сабою прыпасы, неабходныя для выпечкі, — муку, яйкі, масла, а галоўная каравайніца прыносіла са сваёй печы гарачае вуголле, з якога і распальвалі печ у доме нявесты. Абавязкова накладвалі ў печ дровы тры разы. Галоўная каравайніца пачынала замешваць

цеста, а потым кіравала ўсімі работамі. Яна саджала каравай у печ, папярэдне абнёсшы яго «па сонцы» па ўсёй хаце (часцей тройчы) на лапаце. Пасля таго як каравай быў пасаджаны ў печ, каравайніц частаўвалі. Галоўная каравайніца даставала каравай з печы, калі ён быў гатовы, і зноў абыходзіла з ім усю хату ў тым жа парадку, як і перад пасадкаю ў печ. Пасля гэтага каравай на ручніку ставіўся на покуці, а каравайніц зноў саджалі за стол частаваць. Выпечка каравая суправаджалася песнямі. Пад час замесу цеста каравайніцы спявалі:

Свэты місяць із раю
До нашого короваю,
Шчоб було віднюсэнько
Мэсыты хорошэнько.
Пэрша квітонько — молода (імя дзяўчыны).
Друга квітонько — молоды (імя жаніха).

Калі ставілі на покуці, спявалі:

Пшанычэнько яра,
Стояла — буяла,
Як у лозі стояла.
Тэпэр ты шумыш,
Тэпэр ты буяеш
У новых купанёчках,
На тэсовых столычках.

Выпечка каравая адносіцца да вясельнага цыкла абрадаў і, як і ўсё вяселле, наогул багата песенным аздабленнем.

У абавязковыя абрадавыя стравы ўваходзіць і кісель. Часта ён з'яўляецца знакам для заканчэння «афіцыйнай» часткі (іншы раз гэта каша з пшана), а на памінальных абрадах, звычайна пасля яго, дзякавалі Богу і ўставалі з-за стала.

НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА

Мабыць, ні адзін раздзел этнаграфіі не выклікае ў наш час такой цікавасці, як гэты. Яно і зразумела, але тут трэба папярэдзіць, што выкарыстанне лекавых сродкаў народнай медыцыны патрабуе не менш ведаў, чым дае сучасная медыцынская адукацыя, толькі яны трошкі іншага плану, чым інстытуцкія. У старыя часы таксама не кожны мог параіць ці прапісаць лекі хвораму, а рабілі гэта добра падрыхтаваныя спецыялісты, якія з малых гадоў вучыліся сваёй справе ад сваіх бацькоў ці дзядоў і станавіліся аўтарытэтнымі лекарамі ў вельмі сталым узросце, а то і пад старасць. Усё жыццё ў іх ішло на вучобу, авалоданне і ўдасканаленне майстэрства. Нездарма практыка народных лекараў абстаўлена шэрагам забарон і звычаяў, абавязковых да выканання. Састарэлы лекар перадаваў сваю справу толькі каму-небудзь аднаму, але апошні не меў права самастойна практыкаваць да смерці свайго настаўніка. Часам, калі выбар вучня быў няўдалы альбо ён заўчасна памераў, лінія гэтага лекара-настаўніка перарывалася. Таму асабліва адказны быў выбар вучня, а таксама яго навучанне і выхаванне. Гэта наогул мала вывучаная тэма ў айчыннай этнаграфіі, а яна цікавая яшчэ і з пункту гледжання этнапедагогікі.

Агульнавядомыя лекавыя напоі з маліны, парэчак (асабліва чорнай), чарніц. Сярод лекавых раслін шырока ўжываецца ліпавы цвет, які нарыхтоўваецца і высушваецца. Выкарыстоўваецца ў выглядзе заваркі і ўваходзіць кампанентам у шмат якія народныя лекі. Багун высушаны таксама запарваўся і выкарыстоўваўся пры прастудных захворваннях, ангінах. Як гігіенічныя і касметычныя сродкі ўжываліся чыстацел, рамонак, хвойны адвар (з сасны) і некаторыя іншыя.

З вонкавых лекавых раслін шырока распаўсюджана ўжыванне трыпутніку, лісты якога прыкладваюць да раны. Яны ўтаймоўваюць крывацёк, садзейнічаюць зажыўленню. У меншай ступені такім жа двеяннем валодае лісце чорнай вольхі.

Вядома вялікая колькасць лекавых раслін і шмат метадаў іх ужывання. Знаўца траў з вёскі Чэрск пералічыў больш за 60 відаў. Для кожнага з іх існавалі свае тэрміны збірання, тэхналогіі нарыхтоўкі і захавання. Многія расліны трэба нарыхтоўваць з выкананнем даволі складаных абрадаў. Гэта датычыць некаторых грыбоў і водарасцяў.

Да раслінных лекавых сродкаў трэба аднесці і палатно. Дым паленага льняного нефарбаванага палатна добра дапамагае супраць насмарку.

Шырока ўжываліся лекавыя прэпараты жывёльнага паходжання. Пры нарывах выкарыстоўвалі воск: тонкія пласцінкі разагравалі і накладвалі на нарыў, а потым прыбінтоўвалі.

Пры паражэннях агнём і абмаражэннях шырока ўжываўся таплёны несалёны гусіны тлушч, які заўсёды меўся ў

запасе. Ён наносіўся тонкім слоем на пашкоджанае месца, добра зажыўляў апёкі і абмаражэнні.

Пры захворванні туберкулёзам выкарыстоўваўся сабачы ці барсуковы тлушч. З гэтай жа мэтай выкарыстоўвалася і мяса вожыка. Некаторыя гінекалагічныя захворванні, а таксама малакроўе і дыстрафію лячылі, ужываючы свежую кроў забітага парсюка, а таксама малодзіва кароў (серу), пакуль малако не набудзе пасля ацёлу звычайны смак і пах.

Цікавай галіной медыцыны з'яўляюцца шаптанне і загаворы. Па сутнасці гэта псіхалагічныя і псіхафізічныя метады лячэння, якія атрымалі навуковае абгрунтаванне толькі ў апошнія паўтара стагоддзі.

Аўтару даводзілася размаўляць з сапраўдным знахарам, імя якога і месцажыхарства па яго просьбе не называюцца. Ён адзначаў таксама, што сучасныя «шкірлатаны» (так ён іх называе) часта выкарыстоўваюць знешнія эфекты, якія ўздзейнічаюць на псіхіку чалавека, падаўляючы яго волю. Часта выкарыстоўваецца гіпноз ці яго элементы, што ў практыцы народнай медыцыны катэгарычна забараняецца. Дарэчы, З. Фрэйд таксама катэгарычна адмоўна ставіўся да выкарыстання гіпнозу ў медыцынскай практыцы пры лячэнні неўрозаў і псіхозаў. З размовы высветлілася, што традыцыйная знахарская практыка вельмі нагадвае псіхааналіз, калі прычыну хваробы адшукваюць у падсвядомасці. І ў спаленай паперы альбо ва ўзорах воску на вадзе чалавек часта бачыць забытую падзею і за некалькі сеансаў можа ўгледзець і тую, што паслужыла прычынай пачатку неўрозу.

КАЛЯНДАРНЫЯ АБРАДЫ

Адносіны да абрадаў мяняюцца ў залежнасці ад веравызнання. Для католікаў больш характэрна прывязка абрадаў да касцёла. У праваслаўных больш захавалася язычніцкіх элементаў. Трэба таксама адзначыць, што абрад існуе ў шматлікіх варыянтах і мяняецца ад вёскі да вёскі, хаця на ўсіх абшарах Палесся — ад Падляшша да Пасожжа і ўсходней, ад Слуцка і Пружан да Валыні — існуе пэўнае адзінства міфалагічнай падставы абрадаў. «Каляндарныя» абрады для жыхароў горада, у значнай ступені іншаэтнічнага паходжання, былі своеасаблівай экзотыкай. Таму больш увагі надавалася знешняму, фармальна мастацкаму боку абраду. Ва ўмовах горада ён меў усе шансы пераўтварыцца ў своеасаблівы карнавал. Але засілле ідэалогіі — спачатку праваслаўнай і каталіцкай, а потым так званай камуністычнай, выключала абрады з афіцыйнага кола культуры. Замалёўкі, якія вам прапануюцца, уяўляюць сабой спробу рэканструкцыі міфалогіі на падставе абрадаў.

Каляды. Яны заўсёды былі звязаны з нараджэннем Бога. Таму так лёгка ўпісаліся ў хрысціянскую традыцыю. У глыбокай старажытнасці хутчэй за ўсё свята нараджэння бога Сонца — Дажбога. Да гэтага свята рыхтавалася ўся сям'я. Раней гэта быў цэлы цыкл — ад Раздва да Вадохрышча. Дажбога павінна была нарадзіць Грамавіца (магчыма, жонка Перуна). Ён мусіў з'явіцца на свет у самым бяспечным месцы, дзе нячыстая сіла не мае аніякай магчымасці нашкодзіць маці і немаўлятку, — у глухім лазняку ці вербніку на ўскрайку балота. Вось туды яе і суправаджаюць дзяўчаты. Праходзіць яна па вёсках, заходзіць у хаты — адпачыць, падсілкавацца, спытаць дарогу. І яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя першаю хваляю каляднікаў, якія ішлі пасля дзяцей (ім дазвалялася калядаваць да захаду сонца), былі дзяўчыны, якімі кіравала сталая жанчына, што добра ведала калядныя песні. Звычайна яны заходзілі ў двор, віталіся пад акном і прасілі дазволу заспяваць песню. У некаторых вёсках іх запрашалі ў хату, у большасці выносілі пачастунак на двор і праводзілі да плота. Так гэтая кампанія абыходзіла ўсе двары. За імі ішлі хлопцы пад кіраўніцтвам сталага мужчыны, таксама добрага знаўцы калядных песень. Яны ўвасаблялі сабой «нячыстых», якімі кіраваў Сціўрат — бог падземнага царства, вечных маразоў. Іх мэта — перашкодзіць нараджэнню Дажбога, бо тады Сонца растопіць ільды і прыйдзе канец панаванню Сціўрата.

Гэтую кампанію таксама прымалі, ведаючы, хто яны. Іх ужо абавязкова запрашалі ў хату, прасілі паспяваць для кожнага члена сям'і, іншы раз саджалі за стол і частавалі. Усяляк затрымлівалі як мага даўжэй, каб даць Грамавіцы адысці далей.

Дарэчы, строга забаранялася гаварыць, ці былі ўжо тут каляднікі, хто яны і куды пайшлі. У рэшце рэшт мужчыны ўсё ж даганялі Грамавіцу, і тады апошняя пераўтваралася ў казу. Адсюль распаўсюджаныя на Палессі калядныя песні пра казу:

Ого-гой, козынька, ого-гой, серая.
Дэ коза ходыць, там жыто родыць.
Дэ коза рогом, там сэно стогом...

Адсюль жа і маска казы ў калядніка ў. Сціўрат жа пераўтвараецца ў мядзведзя, а яго каманда ў ваўкоў. Адсюль традыцыя вадзіць на калядкі вучонага мядзведзя (зафіксавана яшчэ напрыканцы мінулага стагоддзя), маска мядзведзя, вывернутыя кажушкі, размаляваныя сопухаю твары.

Нарэшце Грамавіца дабіраецца да запаветнага месца, і Дажбог з'яўляецца на свет. І апоўначы ішла трэцяя хваля калядніка ў — «з зіркою» — гэта часта вельмі прыгожа зроблены, іншы раз з свечкаю ўнутры, аранжавы круг з промнямі — адлюстраванне сонца. Яны віншавалі з божым нараджэннем.

З цягам часу першапачатковая легенда знікла, забылася, засталася ў глухіх намёках, а раней строга падзеленыя калядныя кампаніі зліліся, і ў адным гурце можна было пабачыць і казу, і мядзведзя, і зорку. Характэрна, што ў шмат якіх мясцінах каза пад час калядавання памірае і ўваскрасае.

Сціўрат, раз'юшаны няўдачай, вяртаецца і, праходзячы па вёсках, зрывае зло і помсціць сялянам, якія, затрымліваючы, так яго падманулі. Таму ў аднаго дзверы з плота зніме, у другога дровы на двор выкаціць, у трэцяга воз на страху зацягне і г.д. Але гэта не ўсё. На наступны дзень, па ўспамінах старажылаў, зранку збіралася ўся моладзь сяла і ішла па дварах глядзець, якія разбурэнні пакінуў пасля сябе раз'юшаны Сціўрат. З той хаты, дзе разбурэнняў было больш за ўсё, пачыналіся аднаўленчыя работы. Бо на гэтую хату больш за ўсё абураўся Сціўрат. Значыць, тут больш за ўсё дапамаглі Грамавіцы. Не толькі прыбіралі ўсё раскіданае за ноч, а яшчэ рабілі бягучы рамонт — там плот паправяць, там дошку прыб'юць і г.д. Не абміналі і хаты ўдоў, старых, калек. Моладзь, у асаблівасці падлеткі, прыводзілі вёску ў святочны выгляд.

На Калядкі — абавязковая вячэра, на якой павінна прысутнічаць уся сям'я. Варыцца куцця, рыхтуюцца мядовая сыта, абавязковая страва з рыбы, часцей за ўсё юшка, абавязковы кісель і прасяная каша. Пад абрус кладуць сена, якое павінна ляжаць да Шчадраца (стары Новы год), а пасля аддаецца свойскай жывёле. З Калядкамі звязана шмат варожбаў і прыкмет, па якіх прадказваюць надвор'е на наступны год, віды на ўраджай і г.д.

Дарэчы, паходжанне слова «калядкі» да гэтага часу тлумачаць па-рознаму. Цікавае тлумачэнне дала старая паляшучка з-пад Пінска:

— Чого зовуть Коляда? То тож зрозуміло — діло до вэсны йдэ. І на самай справе — у старажытных славян багіня Вясны — Лада. Часта замест назвы пары года ўжывалі імя багіні. І тады на старажытнаславянскай мове «да Вясны» гучала як «ко Ладе» — адсюль зусім блізка да гучання «Каляда».

Вяснова-летнія абрады. Успомніўшы пра Ладу, мы фактычна перайшлі да вясновых абрадаў. Раней шырока было распаўсюджана свята гукання Вясны. Звычайна гэта падзея адзначалася напрыканцы лютага — на пачатку сакавіка (з 23.2 па 25.3). Гэта быў тыдзень у маладзіку за месяц да таго маладзіка, пасля якога ідзе дзень веснавога раўнадзенства. Звычайна выбіралася месца, дзе з'явілася на пагорку значная праталіна і відаць была зямля. Добра, калі на ёй заставалася незамерзлая вада альбо цёк ручаёк. Там збіралася моладзь, вадзілі карагоды, спявалі вяснянкі:

— Ой ты, Высна-красна, у-у,
Шчо ты нам прынысла? у-у.
— Ой, дывочкам по чоўночку, у-у,
А хлопчыкам по кіёчку, у-у.
Ой, дывочкам красёнкі ткаты, у-у,
А хлопчыкам статочок гнаты, у-у.
Ой, дывочкам красёнкі ткаты, у-у,
А хлопчыкам статочок гнаты, у-у.

На поўдні раёна бытавала ў даўніну такое — на гуканне Вясны выбіралі самую прыгожую дзяўчыну, упрыгожвалі яе і саджалі на пачэсным месцы, на якое насцілалі сосновыя галінкі. Вакол яе вадзілі карагоды, спявалі песні, а потым з песнямі ўрачыста вялі ў вёску і абыходзілі з ёю ўсе хаты. Гаспадары частавалі моладзь, давалі грошы, харчы з сабою. На

жаль, гэты абрад у раёне амаль знік. Але яшчэ ў мінулым стагоддзі ён быў адным з цэнтральных. Яго функцыі часткова перайшлі на іншыя святы, у тым ліку на Вялікдзень.

Шмат абрадаў звязана з жывёлагадоўляй і земляробствам. Найбольш вядома ў раёне святкаванне Юр'я — у гэты дзень першы раз выганяюць жывёлу на пашу (6 мая). Варыянтаў абрадаў шмат. Але абавязковымі былі дзеянні са свечкай (звычайна гаспадар абыходзіў усе хлявы з запаленай грамнічнай свечкай і крэйдай меціў шулы і дзверы крыжамі). Гэта павінна было зберагчы жывёлу ад хвароб, «урокаў», буйных паводзін, а таксама засцерагчы ад чараўніц, якія могуць адабраць у кароў малако.

Асаблівую ролю адыгрываў у гэтых абрадах пастух, якога з кожнай хаты збіралі ў дарогу, а вечарам частавалі. Абавязкова на досвітку будзілі ўсіх хлапчукоў, якія павінны былі прысутнічаць пры першым выгане жывёлы. Маці сыну спявала такую песню:

Ужэ літо наступае,
Маты сынка пробуждае:
— Вставай, сынку, годэ спаты,
Пора волы выгоняты.
Чужы волы напаслыся,
А нашы ў хлыві настоялыся.

Святкаваўся і першы выезд у поле. Звычайна селянін апранаў святочную вопратку, клаў на воз саху ці плуг, запрагаў каня ці валоў, і на досвітку краналіся ў дарогу. Гаспадар браў з сабой малодшага сына, які таксама апранаўся ў святочнае адзенне. Яго гаспадар саджаў спераду і аддаваў яму лейцы. Сам садзіўся ззаду, тварам да хаты. На поле трэба было заехаць да ўзыходу сонца і праараць першую баразну. Потым мужчыны снедалі на полі і вярталіся дадому. Больш ім у гэты дзень рабіць нічога не дазвалялася. Яны адпачывалі. На полі ўдавы першую баразну павінен быў праараць яе сын, якога, да паўналецця, суправаджалі свёкар ці брат нябожчыка-мужа. Праводзячы да варот воз, удава спявала:

Ой, з-за горы тыхыі вітёр віе,
Ой, там удова пшынычыньку сіе.
Ой, посіяла да й стала волочыты,
Поволочывшы, стала Бога просыты:
— Роды, Божэ, да й густу пшынычыньку.
Дай на мэнэ бідную вдовычыньку.

Але, бадай, самым яскравым было Купалле.

Купалле. У старыя часы яно ўваходзіла ў цыкл купальскіх святаў. Кульмінацыяй была ноч перад Купалай. У розных вёсках захаваліся розныя фрагменты абрадаў, таму аднаўленне ўсяго цыкла ўяўляе надзвычай цяжкую справу:

Тыпэр Купайло, а заўтра Ен.
Пойшлы дывочкы в зылёный гай,
Пойшлы дывочкы гаю рваты,
А хлопчыка Пытра ждаты.
Дывочкы гаю нарвалы,
А хлопчыка Пытра дождалы.

Мабыць, гэтыя словы якраз і перадаюць сэнс Купалля. Аналіз абраду высвятляе яго безумоўнае падабенства да вясельнага абраду. Пра сувязь з вяселлем сведчаць і наступныя дзве песні купальскага цыкла:

На річыньцы, на дошчыццы,
Там ластовынько полошчыцця,
Ой, полошчыцця, умываіцця,
На Купайлычко збыраіцця.
Ой, купаіцця, умываіцця,
Свойго батынька пытаіцця,
Свойго рідного пытаіцця:
— Ой, дай мні, батю, свою волю.
Ой, дай мні волю волюваты.
Гэтэ літычко літуваты,
Жовтую косу годуваты.
Ой, росты, коса, до пояса,
А я молода, як ягода.
А мое літычко ек яблычко,
А я сама ек вышынька,
Ек у садочку чэрэшынька.

* * *

Пошлы дывочкы жыто жаты,
Знайшлы Купайло у сіножаты.
— Дэ ты, Купайло, купалося?
А дэ ты будэш сушытыся?
— Ой, купалося я у бродычку,
А сушытымся на сонычку.
А дэ ты, дывонько, годувалась?
А дэ ты будыш дорастаты?
— Ой, годувалася у батынька,
А дорастатым у свікорка.
Я выростала у рідного,
А дорастатым у сужоного.

У старыя часы да Купалля рыхтаваліся, як да вяселля. Гэта быў цыкл абрадаў, звязаны адзінствам тэмы. Да нашага часу захаваліся толькі часткі, якія ўспры-

маюцца як разрозненыя абрады. Да іх трэба аднесці, па-першае, Тройцу (Духаўскія, альбо Зялёныя святкі). Напярэдадні, у суботу, чыста прыбіраецца хата, а пад вечар на падлогу і дарожкі двара раскідваюцца нарыхтаваныя загадзя сцяблы аеру (пляшнік, лэпэшнык), і пасля гэтага ўжо нельга было нічога рабіць. У некаторых вёсках на вушаках дзвярэй і на покуці пад абразамі прымацоўвалі галіны клёна ці ясеня. Вечарам перад святадухавым днём дзяўчаты плялі вянкі. Для гэтай мэты вельмі часта ўжываліся валошкі (васількі), якія збіралі на жытнім полі. Валошка наогул вельмі шаноўная расліна. З жытняга поля, на якім іх не было, зерне лепей прадаць, бо яно не зусім чыстае. Таму палешука вельмі засмучала тая акалічнасць, што на полі не расце гэтая прыгожая кветка. Ёсць звесткі, што гэта кветка вясны і ў старажытнасці была прысвечана Ладзе, багіні вясны і сямейнага дабрабыту. Жыта ж здаўна лічылася раслінай сонца, мабыць, было прысвечана Дажбогу, пра нараджэнне якога расказана ў папярэднім раздзеле. Пабачыўшы Ладу, якая адпачывала ў чоўне сярод мораакіяна (была яна дачкой Стрыбога, бога зямных і нябесных водаў), Дажбог закахаўся ў яе і ў гонар сваёй каханай — марской царэўны — на жытніх палях насадзіў дзіўныя сінія кветкі. Таму валошка і карысталася такой павагай і была асноўным матэрыялам для пляцення вянкоў.

Менавіта гэтыя вянкі і выкарыстоўваліся пад час шматлікіх варожбаў.

Наогул Тройца, альбо Сёмуха, больш свята дзявочае, свята ў гонар багіні Вясны, якая была апякункаю шлюбаў і кахання.

Раніцай перад купальскай ноччу ў сяле заставаліся дзяўчаты і хлопцы. Дзяўчаты прыбіралі хаты, выкідаючы на вуліцу ўсё, што ўжо адслужыла свой тэрмін — атопкі (стаптаныя лапці), спрацаваныя венікі, паламаныя прылады працы і г.д. Хлопцы цягалі па сяле воз, грузілі на яго ўсю гэтую старызну і звозілі на месца, дзе традыцыйна палілі ў купальскі вечар вогнішча. На змярканні, калі падоены каровы, уся моладзь сяла збіралася каля месца вогнішча. У старыя часы, дзе дарослыя хлопцы, дзе жанатыя мужчыны, а іншы раз бацькі дзяўчат, якія збіраліся замуж, здабывалі «жывы агонь» з сухога ясеневага дрэва. Ад яго і запальвалі агонь. Тэхналогія здабычы «жывога вагню» была розная ў розных месцах, але часцей гэта варыянты тэхналогіі, апісанай Д.К. Зяленіным.[11] Вакол вогнішча вадзілі карагоды, спявалі песні, часам праводзілі рытуальныя гульні. Запалены купальскі агонь павінны былі пабачыць усе. Лічылася вялікай заганай і грахом не паглядзець на яго. Дзеля гэтага нават старых і нядужых выносілі на двор.

Калі насаджанае на канцы шаста кола ў рэшце рэшт падала, яго стараліся адразу падхапіць палкамі і пакаціць з пагорка ў раку ці возера. Па тым, як падала кола, як яно кацілася, як гарэла, як увайшло ў ваду, варажылі пра надвор'е на будучы год, пачынаючы з другой паловы бягучага лета.

Пасля таго як вогнішча згарыць больш чым напалову, хлопцы і дзяўчаты (іншы раз узяўшыся за рукі) скачуць цераз агонь. Пры гэтым скакаць дазвалялася толькі хлопцам, якія яшчэ не пазналі жанчыну, і дзяўчатам, якія не страцілі дзявочай годнасці. Пры парушэнні гэтай забароны ў сяле мог здарыцца пажар альбо наступіць засуха. Старыя людзі кажуць, што ў такіх выпадках шукалі вінаватых сярод удзельнікаў абраду і, як правіла, знаходзілі.

Тыя хлопцы і дзяўчаты, якія скакалі цераз агонь і змаглі гэта зрабіць, удзельнічалі ў далейшых дзеяннях абраду. Падлеткі ж «білі ведзьму» — насаджвалі на палкі спрацаваныя венікі, падпальвалі іх, бегалі па лузе, падкідаючы ўгару гэтыя своеасаблівыя факелы. Мятла ва ўсіх славян — «транспартны сродак» нячыстай сілы. Падпальваючы мятлу ад жывога агню купальскага вогнішча, падлеткі наносілі значныя страты нячыстай сіле, якая ў гэтую ноч атрымлівала яшчэ адзін шанц перашкодзіць маючай адбыцца падзеі, — шлюбнай сустрэчы Лады і Дажбога, у выніку якой павінен нарадзіцца Ярыла, сонечнае бажаство, а таксама бог пладавітасці жанчын і мужчынскай сілы.

Скаканне праз агонь вельмі нагадвае ачышчэнне агнём, якое з'яўляецца абавязковым элементам вясельнага абраду.

Далейшыя дзеянні вельмі адрозніваюцца ў розных вёсках. Мабыць, проста захаваліся розныя элементы больш ці менш цэласнага абраду, які складваецца

ў такі малюнак. Усе дзеянні, уключаючы варажбу, накіраваныя на забеспячэнне сустрэчы Дажбога і Лады. Часам нават выбіраюцца хлопец і дзяўчына, часцей адна дзяўчына, якія кіруюць далейшымі дзеяннямі. Іншы раз іх сустрэчай завяршаецца купальская ноч. Важную ролю адыгрывае пошук папараць-кветкі, якая, згодна з прыгожай і паэтычнай легендай, зацвітае менавіта ў купальскую ноч. Вядома, што на ўсходзе сонца ў гэты дзень «грае». У розных вёсках «гульню» сонца апісваюць па-рознаму. Яно можа ўзысці, потым схавацца, потым зноў узысці. І так некалькі разоў. Можа перамяшчацца па гарызонце даволі доўгі час, можа распадацца на кавалкі, якія разбягаюцца па гарызонце, а потым зноў збягаюцца, можа раскочвацца двума ці больш дыскамі, якія то сыходзяцца ў адзін, то зноў раскочваюцца. У раёне зафіксаваны ўсе адзначаныя варыянты «гульні» сонца на Купалле. Іншы раз кажуць «сонца купаіцця». Па павер'ям, яно «выглядае нэвісточку», хоча ёй нагадаць пра сябе. А марская царэўна Лада хаваецца дзесьці ў цяньку дрэў, сярод сваіх любімых раслін. Пад гэтую ноч ёй бліжэй за ўсё папараць. Сярод папаратніку ёсць адна расліна, якую яна возьме з сабою на сустрэчу з суджаным. Але той павінен знайсці яе і адзначыць сваім промнем, які застыне над папарацю клубочкам свету. Сонечнага свету. Мабыць, Сонцу-Дажбогу не заўсёды надаецца з першага разу знайсці папараць Лады. Таму робіцца некалькі спробаў. І ў гэтым сэнс «Гульні Сонца».

Нячыстая сіла імкнецца завалодаць гэтай кветкай. Але сама яна не можа не толькі сарваць яе, але нават пабачыць. Таму спрабуе падкупіць каго-небудзь з хлопцаў, удзельнікаў абраду, паабяцаўшы скарб, багацце, удачу ў жыцці. У гэтым, мабыць, сэнс гульні ў хованкі, якая бытавала яшчэ напрыканцы мінулага стагоддзя.

У рэшце рэшт усё завяршалася цудоўна, і сімвалічная ці разыграная ў дзеючых асобах сустрэча Дажбога і Лады адбывалася. Пры гэтым у некаторых месцах кідалі ў ваду запаленае саламянае чучала, апранутае ў лахманы, і адпіхвалі кіямі ад берага да таго часу, пакуль яно не знікала з вачэй альбо танула.

Пасля гэтага ўсе ўдзельнікі абраду павінны былі купацца ў рацэ ці возеры. Лічыцца, што гэта ачышчэнне вадою. І зноў жа гэты элемент абраду пераклікаецца з вяселлем. Там таксама ёсць ачышчэнне вадою.

Зажынкі і дажынкі. Зажыналі часцей за ўсё ў суботу, можна было рабіць гэта ў аўторак і чацвер, але ні ў якім разе не ў нядзелю і пятніцу. Звычайна пад вечар некалькі жанчын збіраліся і ішлі на поле той гаспадыні, дзе жыта было лепшае альбо спялейшае. Усё адбывалася перад захадам сонца. Старыя людзі кажуць, што пад вечар «сонцэ бачыць» і на час жніва будзе з'яўляцца на небе.

Жанчына, на ўчастку якой робяць зажынкі, бярэ з сабою хлеб, сыр, часам яйкі. Усё звязана ў чысты абрус, якім потым, увечары, засцелюць стол у хаце. Зажынае не абавязкова гаспадыня, але часцей за ўсё яна. Першую зрэзаную жменю яна кладзе разам з сярпом, а на яе прынесеныя хлеб, сыр і яйкі.

Пакуль жняя нажне сноп ці хаця б крышачку жыта, астатнія жанчыны спяваюць:

Жнітэ, жэнчыны, жнітэ,
Самы сыбэ ны познітэ.
Бо шчэ ныва вылыка,
Да й дорожка й далёка.
Ны дожаўшы ны підытэ,
Ночуваты будытэ[10].

Вядомы і іншыя жніўныя песні:

За гай, сонцэ, за дольну,
Постій, сонцэ, хоч годыну,
Шчоб мы діло доробылы,
Нас у дома похвалылы.
Бо у нас чужа маты —
Нас ны будэ жалуваты.
У воротычках сутоніе,
З ручок сэрпычка бырэ,
Выдэрцэ ў ручку дае:
— Іды ж, нывіста, по водыцю
У зылітый бір, у крыныцю[10].

Разам з дарослымі жанчынамі ідуць і дзяўчаты. Усе апрануты ў святочнае адзенне. У некаторых вёсках бяруць таксама аднаго хлопца альбо падлетка (часцей за ўсё гэта сын гаспадыні) — «крутыты пэрэвісла» — скручаныя з жыта жгуты, якімі звязваюць снапы. Першы сноп перавязваецца чырвонай ніткай, і яго забіраюць з сабою. Першая жменя ў ад-

ных месцах уключаецца ў першы сноп, у другіх застаецца на месцы — «на пташкы», «шчоб сонцэ бачыло» і г.д.

Потым гаспадыня забірала хлеб і сыр, што пабывалі на полі, і ўся талака з песнямі ішла ў хату гаспадыні. Там абрусам з поля засцілалі стол, за які садзіліся жанчыны, ухваляючы сноп, пастаўлены часцей за ўсё на покуці. Пачыналася частаванне, якое цягнулася часта дапазна. Спяваліся жніўныя песні, іншы раз запрашалі музыку. Мужчыны пры гэтай гулянцы не прысутнічалі.

На дажынкі, як і зажынкі, зноў жа ідуць талакою. Варыянтаў дажынак вельмі шмат. Але абавязкова, пасля таго як дажнуць апошні сноп, пакідалі «козу», «бороду» — некалькі нязжатых каласкоў (часта па ліку сямейнікаў у хаце гаспадыні). Прысутныя тры разы абыходзілі нязжатыя каласкі кругам «па сонцы». Гаспадыня старанна вырывала ў сярэдзіне круга пустазелле, але не голай рукой, а праз спадніцу ці фартух. Зжаўшы па крузе маленькімі жменькамі, пакінутыя некалькі каласкоў збіралі ў пучок і перавязвалі чырвонай ніткай. «Козу» часцей за ўсё пакідалі на полі. У некаторых месцах «козу» рабілі на чатырох вуглах поля, пачынаючы з паўднёва-ўсходняга. Пад «козой» пакідалі скібкі хлеба.

Пад час дажынак таксама спявалі песні:

Ой, ты, мій загінчыку,
Шчо ў тыбэ на кінчыку?
Тыпэр у нас дожыночкы,
Нап'емося горілочкы.
— Ой, коза біла,
Дэ ты рога поділа?
— Положыла на польцы,
Да й укралы молодыцы[10].

* * *

Тыпэр у нас дожынкы,
Вып'емо горілкы.
А я жала, ны лыжала.
Два снопочкы нажала.
А трэцёго лыновалася,
На загоны потягалася[10].

* * *

Тыпэр наша господэня домуе,
Того на вэчорынку готуе.
Ой, ны міла вэчорынка, ны міла,
Бо ныва шырока нас втомыла.
Ны так шырока, як узка,
Бо прыставонька пустая[12].

Апошні сноп з песнямі неслі ці везлі на возе ўрачыста і з вялікай павагай да хаты гаспадара, які сам сустракаў жанчын з хлебам-соллю. Сноп зноў жа ставіўся на пачэснае месца, дзе раней стаяў зажыначны сноп. Яго найчасцей да гэтага выпадку абмалочвалі, зерне малолі і на дажынкі з атрыманай мукі пяклі хлеб.

Зерне з дажыначнага снапа потым дасыпалі да насення на наступны год.

Зноў пачыналася частаванне жней, якое часта цягнулася дапазна.

Вядомы і іншыя абрады, звязаныя з каляндарным цыклам.

СЯМЕЙНЫЯ АБРАДЫ

Гэта надзвычай цікавы і невычэрпны пласт этнічнай культуры. Шмат вельмі істотных асаблівасцяў нясуць у сабе сямейныя абрады, якія бытуюць на Палессі, як беларускім, так і ўкраінскім.

Абрады і звычаі, звязаныя з нараджэннем дзіцяці. Яны пачынаюцца задоўга да з'яўлення чалавека на свет. Напрыклад, існуе шмат прыкмет, па якіх у сям'і, часта беспамылкова, даведваюцца, што жанчына ці дзяўчына зацяжарыла. Па снах — калі сніцца голенькае дзіця, жывая рыба і г.д. Беспамылкова на цяжарнасць паказвае сава, якая лётае і гукае над хатай.

Традыцыйна лічыцца, што больш пажаданымі ў сям'і першымі дзецьмі з'яўляюцца хлопчыкі. Гэта не зусім справядліва для Палесся. Тут існуе даволі трапная прымаўка, якая характарызуе адносіны палешука да нараджэння дзіцяці таго ці іншага полу: «Спэрша нянька, а послі лялька».

З цяжарнасцю жанчыны звязана шмат павер'яў і забарон. Цяжарную жанчыну ўсюды трэба прапускаць без чаргі, ёй заўсёды трэба даць сесці і г.д. Цяжарным забараняецца выходзіць з хаты ў цёмны час сутак, стаяць на ганку, трэба было пазбягаць сустрэч з сабакамі, катамі, пеўнямі. Забаронена было падымацца на гарышча хаты, ісці ў гару (бо дзіця будзе «крутое»), нельга апускацца ў падвал ці яму (дзіця будзе нелюдзімае, замкнёнае), нельга таўчы проса, малоць муку, мяшаць хлеб. Прыбіраючы хату, цяжарная не павінна была выносіць смецце за парог — гэта павінен быў зрабіць хтосьці іншы. Забаронена было глядзець у калодзеж

(дзіця будзе «цёмнае»), з гэтай нагоды ёй нельга хадзіць па ваду. Нельга глядзець на агонь, асабліва на пажар. А калі такое здаралася, то ні ў якім разе нельга хапацца за жывот, бо на тых месцах, дзе рука маці дакранулася да дзіцяці, будуць плямы. Трэба было пазбягаць пахавальных працэсій, наведваць нябожчыкаў (дзіця народзіцца хваравітае, з нездаровым колерам твару). Калі ўсё ж гэта неабходна, то жывот патрэбна падвязаць чырвонай шарсцяной хусткай.

Абавязковым было наведванне цяжарнай на апошніх перыядах гэтага стану сяброўкамі і сваячкамі. Існуе павер'е, што цяжарная жанчына валодае вялікай магічнай сілай. (З гэтай нагоды, дарэчы, цяжарных не толькі паважаюць, але і баяцца). Наведвальніцы як бы запазычвалі частку гэтай сілы, што давала ім магчымасць лягчэй пераносіць такі ж стан у будучым. Да цяжарнай прыходзілі з падарункамі, дапамагалі па гаспадарцы, таксама дапамагалі рыхтаваць прыданае чакаемаму дзіцяці.

Звычайна роды прымала бабка — дасведчаная ў акушэрстве жанчына, якая ўспрыняла гэтую прафесію ад сваёй маці альбо часцей ад бабулі. Прыёмы народнай акушэрскай практыкі пакуль яшчэ вывучаны недастаткова. Бабка ніколі не прымала дзіця голымі рукамі, а абавязкова на добра вымытую ношаную сарочку — каб чалавек не быў «голым», а абгортваўся багаццем, як старой сарочкай. Можа, адсюль паходзіць выраз «радзіцца ў сарочцы»?

Пупавіна хлопчыку перараза лася на рэчы, якая звязана з мужчынскай працай (напрыклад, на сякеры), а дзяўчынкам — на рэчы, звязанай з жаночай працай (напрыклад, на верацяне).

Надзвычай важным быў выбар імя дзіцяці. У звычаі было называць дзіця па дзеду, бабулі, дзядзьку ці цёткі. Пазбягалі называць дзіця імёнамі людзей, вядомых у акрузе дрэннай рэпутацыяй. Гэта мела вялікае выхаваўчае значэнне. Паводле павер'яў, імя, не перададзенае дзецям, лажыцца закляццем на душу чалавека, які яго насіў, і душа павінна блукаць па гэтым свеце, і не будзе ёй спакою да тых часоў, пакуль імя не будзе перададзена нованароджанаму. Здаралася, што якое-небудзь імя дзесяцігоддзямі не давалі дзеткам менавіта з гэтай нагоды... А імя — адно з першых паняццяў, якія засвойваў малы.

Цікавая традыцыя выбару хросных бацькоў. У значнай ступені яны былі важнейшыя за родных бацьку і маці. Бацькі далі дзіцяці жыццё, а прымаў яго род. Вось прадстаўнікамі роду і былі хросныя. Хросным бацькам часцей за ўсё станавіўся нежанаты дваюрадны пляменнік бацькі ці маці, прычым на поўначы раёна пераважае першая тэндэнцыя, на поўдні — другая. Выбар хроснай больш вольны, але калі хроснага бралі, напрыклад, з роду маці, то хросную пераважна з роду бацькі. Пры некаторых абставінах бралі і проста сустрэчных кумоў.

Першае наведванне хаты, дзе нарадзілася дзіця, таксама суправаджалася шэрагам звычаяў. Наведвальніку забаранялася садзіцца, ён павінен быў пакласці ў калыску малому грошы ці які-небудзь падарунак. Тое ж патрэбна было рабіць і ўсім запрошаным на хрэсьбіны.

Хрэсьбіны звычайна праводзіліся праз месяц-два, а то і больш, пасля нараджэння. Хросныя везлі малога ў царкву, прысутнасць там бацькоў раней не была абавязковая.

Вярнуўшыся з царквы, клалі дзіця на новую пасцель, якую часцей за ўсё даравала хросная. Затым пачыналася частаванне.

У некаторых вёсках хросныя ўручалі падарункі малому. У іншых — падарункі давалі напрыканцы застолля. Бацькі абыходзілі ўсіх гасцей, і кожны што-небудзь дараваў малому. Так ужо з першых дзён свайго жыцця чалавек атрымліваў істотную дапамогу ад родзічаў. Напрыканцы застолля хросных абдорвалі бацькі нованароджанага. Абавязковым падарункам для хроснага была кашуля, раней вышытая, для хроснай — святочная вышытая сарочка ці сукенка (у больш познія часы). Багаты падарунак атрымоўвала таксама бабка. У падарунак абавязкова ўваходзілі хустка і адрэз на сукенку, а ў больш даўнія часы — намітка і кавалак палатна.

Пасля таго як падавалі кашу, усе дзякавалі Богу і выходзілі з-за стала. Гасцей праводзілі да плота. Хто не заходзіў за плот, той мог яшчэ вярнуцца і ў нефармальных абставінах дабраць тое, чаго не дабраў.

Пасля хрысцін да наступнага дня ў хаце нельга прыбіраць. Звычайна наступным ранкам гаспадар запрашае суседзяў і родзічаў «на снеданне». І толькі пасля гэтага пачынаюць наводзіць парадак.

Вяселле. Увогуле вяселле ўяўляе сабою цыкл абрадаў і абрадавых дзеянняў, якія часам расцягнуты на паўгода і болей. Пачыналіся яны са зговару — калі бацькі жаніха і нявесты дамаўляліся пажаніць сваіх дзяцей. Яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. пры гэтым часам не пыталіся згоды маладых. Але ўжо ў другой палове XIX ст. такая згода, калі не была абавязковай, то ўлічвалася. Хлопец лічыўся жаніхом, пачынаючы з 18 год, дзяўчына магла выйсці замуж раней. Часцей за ўсё хлопец быў старэйшы на некалькі год. Не лічылася заганай, калі нават жаніх старэйшы на 10 і болей гадоў, і такія шлюбы не былі рэдкасцю.

Важным этапам было сватанне. У сваты ішлі звычайна 2—3 чалавекі. Гэта маглі быць хросны бацька і чалавек хроснай маці (в. Вілюнь), бацька, маці, жанаты брат жаніха, хросныя (в. Тэльмы).

Сваты неслі з сабой хлеб і гарэлку. Заходзілі ў хату, віталіся, і пачыналася размова, але ніколі не наўпрамкі. Па ўсім Палессі бытуе павер'е, што нячыстыя з коміна могуць падслухаць і нашкодзіць справе, а то і разладзіць вяселле. Таму размова ішла іншасказальна:

— Мы тэ чулы, шо у Вас продаёцца тэлка (е товар), то мы хочэмо еі купыты.

Першы адказ звычайна нерашуча-адмоўны:

— Так, тэлка е, алэ вона шэ молодая, то можэ мы будэмо еі шэ годуваты самы.

Сваты настойваюць на сваёй прапанове, тады маці ідзе «будзіць» свайго мужа, які выходзіць «заспаны», робіць выгляд, што нічога не разумее, і размова працягваецца ў тым жа плане. У рэшце рэшт «успамінаюць» пра дзяўчыну, і зноў жа іншасказальна робіцца прапанова ёй, і калі яна згодна, то калупае пазногцем гліняную абмазку печы альбо выбягае ў сенцы, моцна ляпнуўшы дзвярыма. Чым мацней ляпне, тым больш ёй даспадобы прапанова.

Пасля гэтага галоўны сват кладзе на стол свой хлеб, загорнуты ў ручнік. У адных месцах разам кладуць свой хлеб гаспадары; іншы раз гэта палавінкі хлеба, якія злучаюцца. У другіх хлеб сватоў кладзецца на печ, а на яго месца кладзецца хлеб гаспадароў. Яго забяруць з сабой сваты. Пасля выстаўляецца пляшка гарэлкі сватоў, а каля яе — пляшка гаспадароў. З гэтага моманту можна гаварыць пра ўсё адкрыта. Абмен хлебам ці іх злучэнне не даюць магчымасці нячыстай сіле нашкодзіць...

Накрываецца стол, і канкрэтная размова працягваецца ўжо за трапезай. Звычайна размова зацягваецца дапазна, але сваты павінны пакінуць хату да ўсходу сонца. На развітанне жаніх даруе нявесце каштоўны падарунак, і яна праводзіць усіх да плота.

Другім абрадам цыкла з'яўляецца «пэрша», «запоіны», «заручыны». Яны таксама наладжваюцца ў хаце нявесты праз 2—3 тыдні пасля сватоў. З боку жаніха і нявесты прысутнічаюць бліжэйшыя родзічы, часам сябры і блізкія суседзі. Гэта па сутнасці абвяшчэнне намераў маладых пажаніцца і ўхваленне гэтага намеру з боку родзічаў.

Тут жа канчаткова вырашаюцца пытанні месцажыхарства маладой сям'і, памер пасагу і інш. Пад гэты час пяецца шмат песень, кожны этап гэтага абраду суправаджаецца спецыяльнымі да выпадку песнямі:

Як прыіхалы за запывалнокы
Молодую запываты.
Прывызлы оны бочку мыдочку
Матэньку частоваты.
А горылонькі тры барылонькі
Для еі родыноньк[13].

У гэты час (в.Вілюнь) маладыя абменьваюцца пярсцёнкамі, а род жаніха і род нявесты абменьваюцца падарункамі. У некаторых вёсках адбываецца першае дарэнне маладых, часцей за ўсё родам нявесты.

Пасля «першоі» ў адзін з дзён (аўторак, чацвер ці суботу) жанчыны з роду нявесты прыходзілі ў дом жаніха, прычым без папярэджвання. Гэта агледзіны, альбо зняцце меркі. Раней яны глядзелі, як жыве сям'я жаніха, дзе будуць жыць маладыя, знімалі меркі з аконных і дзвярных праёмаў, з вусця печы (на іх з прыходам у хату нявесты на другі дзень вяселля маладая і яе дружкі развешваюць новыя фіранкі). Лічылі, колькі патрэбна ручнікоў, дзе і якія можна размясціць

вышыўкі і г.д. У старыя часы, калі ў хаце жаніха жанчынам прыйшлося не даспадобы, то нявеста магла яму яшчэ адмовіць. Пад час абмераў гаспадары накрывалі на стол. Цікаўна, што жанчыны паводзілі сябе пад час зняцця меркі даволі нахабна, маглі абазваць гаспадароў, абразіць іх, зганьбіць хатні парадак і г.д. Гаспадары павінны былі цярпліва зносіць пагарду і абразы, паказаць сваю дабрату, шчодрасць і сціпласць. Потым пачыналася частаванне. На ім не лічылася заганай добра падпіць. Вярталіся жанчыны ў хату нявесты з песнямі і калі дэманстравалі, што яны п'яныя, то гэта было вялікім гонарам для бацькоў жаніха — жанчынам там спадабалася.

Напярэдадні вяселля вызначаліся «вясельныя чыны» з боку жаніха і нявесты. Мужчына, які кіраваў сватаннем з роду жаніха, атрымліваў чын галоўнага свата. Бацькі маладых і іх хросныя станавіліся старшымі сватамі. Старэйшыя ў родах жанчыны альбо бабкі-павітухі атрымлівалі чын «бабы». Незамужняя сястра жаніха альбо яго незамужняя бліжэйшая родзічка станавілася «свечавой свахай». З нежанатых стрыечных братоў альбо пляменнікаў і сяброў жаніха набіраліся маршалкі, альбо дружкі. З незамужніх стрыечных сясцёр ці пляменніц нявесты набіраліся дружкі. Часцей за ўсё родзічы гэтай катэгорыі атрымлівалі азначаны чын. Сярод іх вылучаліся галоўны маршалак і галоўная дружка. Яны адыгрывалі важную ролю ў вясельных абрадах. Жаніх з маршалкам і нявеста з дружкай хадзілі запрашаць на вяселле.

У гэты вечар дружкі і сяброўкі нявесты рабілі «квіты» і вілі вяночкі. «Квіты» потым прышпільваліся на грудзі нежанатым і незамужнім вясельным чынам. Нявесце расплятралі касу. Звязвалі прыданае і складвалі яго ў куфар. Ладзілася агульная вячэра. Часам прыязджалі на фурманцы маршалкі за пасцеллю нявесты і яе куфрам. Наладжвалася гульня — калі маршалкам не ўдавалася выкрасці ці якім іншым спосабам завалодаць пасцеллю маладой, то яны павінны былі плаціць за яе даволі значны выкуп. Лічылася добрай прыкметаю, калі пасцель нявесты будзе змята дружкамі і маршалкамі, таму ў звычаі былі абдымкі і пацалункі маршалкаў і дружак. У некаторых вёсках пасцель і куфар перавозяць на другі дзень вяселля, калі маладая едзе ў хату маладога. Існуе таксама звычай перавозіць пасцель на пераводзіны (пра гэта ніжэй). У той жа вечар звычайна каравайніцы пякуць каравай.

На наступны дзень жаніх у суправаджэнні сваіх вясельных чыноў адпраўляўся да маладой, каб ехаць з ёю да вянца. Зноў жа маршалкі павінны былі выкупіць нявесту. Часта яе перад гэтым трэба было яшчэ адшукаць. У некаторых вёсках пошукі нявесты і яе выкуп адбываюцца напярэдадні пераезду вяселля ў дом жаніха.

Раніцай дружкі, маці і хросная ў прысутнасці «бабы» апранаюць нявесту ў вясельны строй. Рытуал апранання суправаджаецца песнямі:

В ныділю рано
На мшы звоняло.
Час тобі, Таццяно,
Час до цэрквонькі[13].

Нявеста адказвала:

Ой, шчэ мні ны час, шчэ й ны пора,
Бо я молодая шчэ й ны выбыралася,
Своёй матэньцы ны кланялася.
Як я молодэнька хорошэ вбэруся,
Своёй матоньцы до ножок склонюся[13].

Маці надзявае дачцэ вэлюм, дружкі папраўляюць і ўлаштоўваюць яго. Перад ад'ездам да вянца нявесту садзяць на лаўку каля стала. Жанчыны спяваюць:

Сыдыць Тэцця о концы стола,
Дрібны слюзонькы роныть.
На юй выночэк ны не раю слова
До еі ны промовыть.
Ой, промуў, промуў
Мэні, выночку,
Яка мэні доля будэ.
Ой, ек добра долэнько моя,
Йідь до шюбу зо мною.
А як кепская долэнько моя,
Плынь на морэ з водою.
Хочь я поплыну, хочь і поплыну
Такі я ны втоплюся.
Ой, ек ты прыдыш водычкы браты,
За тэбэ учыплюся[13].

Нявесту бралі пад рукі маршалкі, вялі да павозкі. Жаніх і нявеста ехалі на асобных вазках. Жаніха суправаджалі дружкі,

нявесту — маршалкі. У вазку жаніха ехала таксама «свечавая сваха». Бацька і маці благаслаўлялі дачку. Бацька са святой вадою і хлебам, маці з жытам тры разы абыходзяць вакол вазоў «па сонцы», бацька кропіць вазы, а маці пасыпае жытам. Хлеб кладуць на дарозе (у другіх месцах паляць салому), і праз хлеб (ці попел вогнішча) праязджаюць вазы.

Кропы, тато,
Просы Бога даты,
Шчоб кінь зносыв
І Біг простыў.
Дытятко да шлюбоньку
І назад до думоньку.
Пэрша квітонька (імя хлапца)
Друга квітонька (імя дзяўчыны)[13].

Пад час абраду вянчання, які добра вядомы, у доме нявесты рыхтуюцца да сустрэчы маладых.

Котыўся горошок
Край дорожэнькі,
Всэ трома градынкамы.
Йідэ до шлюбу молода Тэттянонька
Всэ трома возыкамы.
На першым возі сам
Господь йідэ
З йеснымы свычонькамы.
На другім возі — Божая Матер
З своімы анёлкамы.
На трэтім возі молода Тэттяна
З своімы дружынтікамы.

На зваротным шляху дарогу поезду часта перагароджваюць сталамі. Іншы раз гэта робяць пры пераездзе вяселля да хаты маладога. На стале абрус альбо ручнік, на якім хлеб-соль, кветкі. Галоўны сват, у некаторых месцах сам жаніх, які ад вянца едзе ўжо разам з нявестай, забірае хлеб-соль і кветкі, выстаўляе адну ці некалькі (па вуглах і цэнтры) пляшак гарэлкі, і поезд кранаецца далей. Чым больш сталоў вынесуць перад поездам, тым лепш — значыць, маладыя і іх радня карыстаюцца вялікай пашанай і павагай. Калі такога не здараецца, хто-небудзь з вясельных бяжыць наперад і арганізуе такі стол.

Фурманка з маладымі звычайна спыняецца каля форткі. На парозе хаты стаіць стол, на ім чысты абрус, хлеб-соль, мёд, чатыры чаркі і віно. Маладыя і вясельныя чыны ідуць ад форткі да парога. Баба ці хросная пасыпае іх жытам. Моладзь, якая ўтварае жывы калідор, кідае маладым пад ногі кветкі. Жанчыны спяваюць:

Моя матёнко-утко
Йізывайся хутко.
Пэрымай ногі чэрэз порогі,
Йдэ дытя з дорогі.

Бацькі благаслаўляюць маладых, даюць пакаштаваць хлеб-соль. Цешча частуе зяця мёдам: у адных месцах з лыжачкі, у другіх з пальца. Бацькі наліваюць у чаркі віна, стукаюцца з маладымі. Маладыя віно толькі прыгубліваюць і выліваюць уверх цераз сябе. Прысутныя імкнуцца, каб на іх папала хаця б кропля віна — гэта вельмі добры знак. Затым маладыя разбіваюць свае чаркі аб ганак.

Стол прыбіраецца, маладыя, свечавая сваха і астатнія чыны заходзяць у хату. Хросны маладой усталёўвае абраз, які пабываў разам з маладымі ў царкве, на покуці, справа ад галоўнага сямейнага абраза і нявеста накрывае яго ручніком. Гэты абраз будзе галоўным у новай сям'і.

Свечкі ставяцца на стол у гаршчок з жытам. Маладых саджаюць на покуці, па правую і левую руку ад іх хросныя і вясельныя чыны па старшынству (жаніха і нявесты адпаведна).

Раней адразу садзілі ўсіх гасцей (род жаніха) за сталы. І пачыналася першае застолле ў хаце нявесты. Зараз застолле ў апісаным парадку цягнецца хвілін 20—30. Маці надзявае нявесце на плечы белую стужку — «скрывальнік», у знак таго, што гэта ўжо замужняя жанчына. Пасля пажаданняў і сімвалічнай выпіўкі ўсе ўстаюць з-за стала. Жанчыны рыхтуюць стол, а малады са сваімі чынамі ідзе дахаты. Там чакаюць усіх родзічаў, за гасцямі прысылаюць пасланцоў (часцей за ўсё гэта дзядзька маладой, яе хросны ў суправаджэнні дружак) і запрашаюць сватоў у хату да маладой.

Для раёна характэрна, што адразу дзеляць каравай і раздаюць яго з перапоем роду нявесты. Але ўсё часцей каравай і перапой раздзяляюцца. Тут адчуваецца ўплыў традыцыі больш усходніх раёнаў Палесся, адкуль вельмі шмат перасяленцаў у Брэсцкім раёне. Але традыцыя дзяліць каравай нявесты ў яе хаце, а жаніха ў яго — пераважае. Таму караваі не «сустракаюцца», як, напрыклад, на Піншчыне, і не адбываецца іх спабор-

ніцтва — «вышэнне» — як на Століншчыне. Калі гэта адбываецца, то, як правіла, вяселле ладзяць выхадцы з тых мясцін альбо хто-небудзь з маладых паходзіць адтуль.

Часта перад «короваем» браты нявесты «крадуць» яе, хаваюць і патрабуюць у жаніха выкуп.

У памяшканне, дзе ідзе вяселле, каравай звычайна ўносіць брат нявесты. Старшы сват з боку нявесты (часцей за ўсё яе хросны, а таксама яго памочнік — староста) мые рукі, прычым сваты з боку жаніха стараюцца перашкодзіць, насыпаць у рукі пясок, каб сват іх некалькі разоў перамываў. Маці нявесты ці яна сама падаюць ручнік, якім і выціраюць рукі. Першым да каравая, які яшчэ не пакроены, прыходзяць дзеці. Яны каравай «полюць», кідаючы ў маладых галінкі барвінку, а жаніх і нявеста адкідваюць іх назад. Нарэшце старшы сват падыходзіць да каравая. Усе дзеянні суправаджаюцца песнямі, напрыклад, такой — варыянты яе зафіксаваны па ўсім раёне:

Свэты, місяцю, з раю
До нашого короваю,
Шчоб було віднэсенько
Краяты дрыбнэсенько.
Бо в нас роду нэмало,
Шчоб короваю стало.
Нашэе Танечкі родына,
Ек чырвоная калына.
Ек скінецца по чэрвінцёві,
То будэ повна скрыня.

Ой роду (роды) богаты,
Нэ стыйтэ в сінёх, ідытэ до хаты.
Ідытэ до хаты
Танечку пэрэпіваты[14].

Звычайна вершалінка каравая перадаецца маладым. Усё астатняе — роду маладой, які падыходзіць да старшага свата па чарзе, прадыктаванай блізкасцю сваяцтва. Спачатку бацькі, потым хросныя, потым родныя браты і сёстры, за імі дзядзькі і цёткі і г.д. Скупляючы каравай, адначасова робіцца і перапой, даруюцца падарункі, часам са шматлікімі прымаўкамі даволі вольнага зместу. Падэшва каравая звычайна дастаецца музыкам.

Пасля раздачы каравая і перапою галоўны сват з боку нявесты разам з яе маці складваюць грошы і перадаюць іх нявесце, якая садзіцца на іх, каб яны не перавадзіліся. Звычайна пасля застолля ідуць на гулянку, а потым спаць. Назаўтра — апошняе застолле ў доме нявесты. Часам перад ім адбываюцца апісаныя вышэй скрадванне нявесты братамі і яе падмена. Пасля застолля жаніх павінен забраць нявесту ў сваю хату. Звычайна пры гэтым за сталом застаюцца бліжэйшыя родзічы, якія пасля сімвалічнага «сядзення» тройчы абыходзяць «па сонцы» вакол стала. Водзіць працэсію звычайна хросны нявесты. На апошнім крузе нявеста цалуе галоўны абраз сваёй былой сям'і і забірае свой, які панясе альбо сама, альбо яе хросны ў яе новую сям'ю. Перад выхадам маладых з хаты звычайна хто-небудзь з дзядзькоў нявесты хрысціць дзверы тры разы чапляёй, прычым так, каб пры апошнім удары чапляя паламалася. Іншы раз аб вушак разбіваецца гаршчок з кашай. Нявеста развітваецца з хатай і роднымі. Звычайна гучаць песні:

Просьба маці нявесты да зяця:

Сорока рака носыть,
А тэшча зятя просыть:
Ой, зятю муй мылы,
Ны бі моёй дытыны[13].

* * *

Развітальная песня нявесты:

Я тобі матёнко отслужыла,
На стіл сэрпыка положыла.
Хто тым сэрпыком будэ жаты,
Той будэ мэнэ вспомынаты[13].

Ёсць яшчэ шмат іншых элементаў провадаў нявесты з дому, прычым яны часта розняцца ад вёскі да вёскі.

Урэшце вясельны поезд кранецца і вязе маладых і вясельных чыноў да хаты маладога.

І на ўсім шляху зноў гучалі песні, асобныя для ад'езду, на кожны паварот, на пад'езд да хаты маладога. Мы прыводзім толькі некаторыя з іх:

Ой, полытілы, полытілы
Яры пчолонькі до бору.
Йідэ (імя жаніха) з свэю жыною до дому.
— Ой, ны гнівайся, моя матінко, на мэнэ,
Шчо я прыхав з свэю жэною до тэбэ.
— Ой, чого я ж маю на тэбэ гніватыся,
Ой, прошу, прошу з свэю жыною до хаты[13].

* * *

Кыньтэ Танечцы цыбулі більша,
Хай вона заплачэ до матулі йдучы.[14]

* * *

Нэ вспіла нэвіста на двір зыхаты,
Выйшлі зовонькі пэрэглядаты.
Пэрэгледэвшы, пішлы до хаты,
Пішлы до хаты матэры казаты:
— Ой, мамо, мамо, дывна нэвіста,
З йі косонькі вітёр віе,
З йі очэнькув дрібны дошчык ідэ,
В йі запільцы скачуць сокільцы.[14]

Сустрэча маладых адбываецца амаль гэтак жа, як і ў доме нявесты.

У хаце нявеста клала на печ свой вузялок з харчамі, якія перад ад'ездам ёй дала маці, адорвае ўсіх сямейнікаў, у некаторых вёсках цалуе печ. У адных вёсках свякроў, у другіх сама нявеста здымае з плячэй белую стужку ці палатно (нашыйнік) і аддае свёкру. Гэтую стужку вешаюць на сцяну, у адных выпадках над маладымі каля покуці, у другіх — над ложкам, у трэціх — на жэрдку над печчу.

Вясельныя чыны садзяцца за стол. Свахі спяваюць:

А дэ ж тая маты,
Шо сына гудувала,
700 свічок спалыла,
700 ніч нэ доспала,
Покуль сына вжэныла?
То хай йдэ із сінь до хаты
Скрывальныка зныматы.[13]

(Іншы раз менавіта зараз знімаецца з нявесты белае палатно.)

Маці жаніха абводзіць усіх тройчы вакол стала. У некаторых вёсках маладых маці стукае лбамі. Пасля гэтага пачынаецца застолле, якое цягнецца нядоўга.

Іншы раз (зараз часцей за ўсё) адбываецца перапой. Пасля яго нявеста танцуе з сяброўкамі, па чарзе надзяваючы на іх вэлюм, які перад гэтым з яе здымае свякруха, у іншых месцах пры дапамозе чапляі. Пасля гэтага свякроў вядзе нявестку ў асобны пакой. Там маладую жанчыну апранаюць у «рабочую сукенку». З гэтага часу яна ў адзенні, падараваным свякрухаю, і ў хустцы, якую свякруха павязвае ёй замест фаты, разам з родам свайго мужа прыслужвае за сталамі свайму роду. Застолле пакрысе заканчваецца. Маладая праводзіць сваіх родзічаў да форткі, але за плот ёй выходзіць забараняецца. Пасля провадаў гасцей нельга нічога прыбіраць. Нявестцы забараняецца выходзіць з хаты да заўтрашняй раніцы. Звычайна ўсе кладуцца спаць...

У наступную нядзелю маладыя і бліжэйшыя родзічы маладога запрашаюцца ў дом бацькоў маладой, дзе адбываюцца «перэводыны», «пырогі» і г.д. Дачка прымаецца ў хаце сваіх бацькоў ужо ў якасці госця.

Пахаванне і памінкі. Лічылася, што смерць чалавек павінен сустрэць у роднай хаце, у акружэнні блізкіх. Стары чалавек, звычайна адчуваючы набліжэнне смерці, збіраў блізкіх, прасіў у іх прабачэння, аддаваў апошнія распараджэнні і выказваў свае пажаданні. Пра смерць чалавека спецыяльна не абвяшчалася. Пра гэта паведамляў царкоўны звон. Старыя жанчыны абмываюць і апранаюць нябожчыка. У яго хаце запальваюць свечку, клічуць граматнага чалавека, які ўмее чытаць Псалтыр і ведае, у якім парадку і якія месцы гэтай кнігі патрэбна чытаць. Каля памерлага пастаянна дзяжураць родзічы. Усе вяскоўцы звычайна наведваюць хату і хаця б некалькі хвілін моўчкі пастаяць у пакоі, дзе ляжыць нябожчык (выключэнне складаюць цяжарныя жанчыны — не родзічы, а таксама малыя дзеці, якія не маюць роднаснага дачынення да памерлага). Абавязкова закрываюць цёмнай драпіроўкай люстры, выносяць з пакоя тэлевізар, радыё.

Прыходзячы ў хату, дзе ёсць нябожчык, нельга вітацца. Не вітаюцца таксама з яго роднымі. Абавязкова наведванне прадстаўнікоў той сям'і, дзе напярэдадні быў выпадак смерці.

Пераступаючы парог, жанчыны, асабліва блізкія сваячкі, звычайна «галасілі». Галашэнні заўсёды выражалі смутак з нагоды смерці, у іх пералічваліся добрыя справы памерлага, яго выдатныя рысы характару, а таксама выказвалася, што на тым свеце нябожчык будзе пачуваць сябе лепш, чым тут.

Перад палажэннем у труну каля памерлага садзілася ўся радня. Клалі ў труну абавязкова не сваякі. Яны ж выносілі і труну з хаты. Пасля вынасу труны сямейнікі па чарзе садзіліся на лаўку, дзе ляжаў нябожчык. У некаторых вёсках на тым месцы павінен быў пераначаваць хтонебудзь з хатніх — каб паказаць, што месца ўжо занята і нябожчыку не варта

сюды вяртацца, што ім не грэбуюць і яго не баяцца.

Ад царквы нябожчыка неслі да могілак, прыпыняючыся на кожным скрыжаванні дарог — каб той мог развітацца з усімі сваімі зямнымі шляхамі.

Пасля развітання на могілках труну забівалі цвікамі і апускалі ў яму. Звычайна гэта рабілі тыя, хто капаў магілу. Яны таксама не павінны быць сваякамі. Апускалася труна на кавалку палатна, канцы якога кідаліся на века труны. Затым усе па чарзе павінны былі кінуць на труну па тры жмені жвіру.

Усе ўдзельнікі пахавання, якія прысутнічалі на могілках, абавязкова мусілі прыйсці ў хату, адкуль вынеслі нябожчыка ў апошні шлях. Але з могілак стараліся ісці не той дарогай, па якой неслі нябожчыка на могілкі.

Каля хаты абавязкова трэба было памыць рукі і твар (альбо хоць вочы). Толькі пасля гэтага можна было заходзіць у хату, дзе жанчыны (таксама не родзічы) ужо накрылі стол для жалобнай вячэры. Стравы ў большасці былі посныя. Пасля малітвы, знак да якой падаваў звычайна кум памерлага ці іншы раз псаломшчык, усе выпівалі за ўпакой душы. Выпіваць за тое, каб зямля была пухам, нельга, бо яна ніколі пухам быць не можа. Перад першай чаркай усе частаваліся мядовай сытой, каштуючы моўчкі па тры лыжкі, пасля кожнага разу кладучы яе на стол. Гэтакую ж ролю адыгрывала і ўжыванне сыру. Абавязковымі стравамі былі рыбная юшка, рыба адвараная альбо смажаная на алеі. Напрыканцы жалобнай вячэры абавязкова падаваліся посная каша і кісель альбо жур. Калі выстаўляліся гэтыя стравы, звычайна тушылася свечка.

Усе стравы, уключаючы мядовую сыту і сыр, здымаліся па тры лыжкі ў асобную міску, пажадана гліняную, для нябожчыка. У некаторых месцах яе неслі на наступны дзень на могілкі.

Пасля таго як пакаштуюць кашы і кісялю, распарадчык абраду падымаўся, а за ім і ўсе астатнія. Дзякавалі за жалобную вячэру і разыходзіліся.

На наступны дзень бліжэйшыя родзічы, не снедаючы, ішлі ў царкву на спецыяльнае набажэнства, а затым на могілкі, дзе і снедалі на свежай магіле, пакідаючы частку ежы і выпіўкі нябожчыку.

Наступныя памінкі робяцца праз дзевяць дзён. На жалобны стол абавязкова гатуецца куцця. Нябожчыку таксама ставяць прыбор.

Каля саракавога дня, абавязкова ў нядзелю і абавязкова калі сорак дзён яшчэ не мінула, рабіліся другія памінкі. Лічыцца, што душа чалавека сорак дзён знаходзіцца на гэтым свеце. Калі зрабіць памінкі занадта рана, то яна можа пакрыўдзіцца, што ёй не далі дабыць адведзены ёй тэрмін сярод родных, на такой цудоўнай і мілай зямлі. Калі пазней за 40 дзён, то душа павінна будзе блукаць па зямлі яшчэ цэлы год, не даючы пакою хатнім.

Перад «саракавой» зноў ішлі на могілкі — «будзіць» нябожчыка. Там частаваліся, пакідалі пачастунак нябожчыку і спраўлялі жалобны абед у хаце, дзе ён жыў. Набор абрадавых страў і парадак іх падачы такі ж, як і ў папярэдніх.

Паміналі нябожчыка таксама на паўгода і ў гадавіну смерці. У далейшым ён памінаўся ў агульным сонме дзядоў, і спецыяльных памінак па ім не спраўлялі.

Наогул памінанне дзядоў адбываецца некалькі разоў у год. Элементы памінання ёсць на Каляды, Шчадрэц, Тройцу і іншыя святы. Існавалі таксама спецыяльныя памінальныя дні і святы. Гэта Фаміна нядзеля, Наўскі вялікдзень і інш. Найбольш вядомыя з іх Радуніца і Дзяды.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Вядома, сціслыя памеры прапанаваных замалёвак не дазволілі падрабязна пазнаёміць чытача з усім багаццем і асаблівасцямі культуры Палесся ў тым варыянце, які бытуе ў Брэсцкім раёне. Вельмі мала закранута культура местачковага насельніцтва. Не змаглі мы звярнуць увагу і на асаблівасці праяў этнічнай культуры рускіх, украінцаў, палякаў, яўрэяў, і тым больш тых іншых этнічных груп, якія толькі ў наш час складваюцца. Тым не менш замалёўкі могуць даць першапачатковае ўяўленне пра народную культуру і побыт насельнікаў Брэсцкага наваколля. Гэты раздзел кнігі «Памяць» можна разглядаць як першую спробу комплекснага вывучэння этнаграфіі раёна.

У рабоце, акрамя палявых матэрыялаў аўтара, выкарыстаны матэрыялы экспе-

дыцыі 1992 г. па Брэсцкім раёне пад кіраўніцтвам аўтара. Я вельмі ўдзячны таксама студэнтам і выпускнікам нашага універсітэта: Скабук Н., Катовіч Н., Астапук Н., Папко В., Бабей Н., Кабанавай А. і іншым, матэрыялы якіх, з іх згоды, выкарыстаны ў прапанаваных замалёўках. Вядома, гэта работа не магла б з'явіцца без дзейснай падтрымкі і дапамогі выканкома Брэсцкага раёна, працаўнікам якога я таксама вельмі ўдзячны.

С.П.Жлоба.

Крыніцы:

1. Зеленин Д.К. Восточнославянская этнография. М., 1991. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1991. Народная сельскагаспадарчая тэхніка беларусаў. Мн., 1974. Українська етнографія. Київ, 1978.
2. Помнікі этнаграфіі. Мн., 1974. Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя.
3. Родина. № 4. 1983.
4. Зеленин Д.К. Восточнославянская этнография. С. 108–113.
5. Памяць. Лунінецкі раён. Мн., 1995.
6. Славянский и балканский фольклор. М., 1986. С. 248–250.
7. Памяць. Лунінецкі раён. Мн., 1995. С. 175.
8. Там жа. С. 176.
9. Каравайныя песні запісаны студэнткай Н.П.Скабук.
10. Песні запісаны студэнткай універсітэта Н.С.Катовіч у 1993 г.
11. Зеленин Д.К. Восточнославянская этнография. С. 129–130.
12. Песня запісана студэнткай Н.В.Астапук у в. Прыбарава Брэсцкага раёна.
13. Песні запісаны студэнткай Н.П.Скабук.
14. Песня запісана студэнткай Вольгай Папко у в. Тэльмы ў 1994 г.

Помнікі архітэктуры

Гістарычная памяць беларусаў найбольш фундаментальна і вобразна адбілася ў помніках манументальнага дойлідства. Асваенне архітэктурнай культуры мінулага з'яўляецца адным з магістральных шляхоў вывучэння гісторыі, а праз яе і ўдасканалення і ўзбагачэння суцэльнага гісторыка-культурнага працэсу Беларусі. І ў гэтым рэчышчы Брэстчына з'яўляецца багатай гісторыка-архітэктурнай крыніцай.

ЦЭРКВЫ І КАСЦЁЛЫ

Найбольш старажытным помнікам манументальнага дойлідства на Брэстчыне з'яўляецца **Троіцкі касцёл у Чарнаўчыцах**, які размешчаны ў цэнтры вёскі каля шашы Брэст–Камянец. Першапачатковы парафіяльны храм быў фундаваны Ільінічамі яшчэ ў XV ст. Паводле «Каталога Брестской епархии» 1925 г. існуючы храм пабудаваны ў 1583 г. (па іншых звестках у 1585(95) г.) па фундацыі Мікалая Крыштафа Радзівіла Сіроткі як парафіяльны. У 1867 г. забраны пад праваслаўную царкву, у 1918 г. вернуты каталікам. На 1935 г. налічваў каля 1900 парафіян. На паўночным захадзе ад касцёла на высокім цокалі стаіць 3-ярусная 4-гранная званіца з шатровым дахам.

Чарнаўчыцкі касцёл — унікальны помнік беларускай архітэктуры стыляў позняй готыкі і рэнесансу, мае выразныя рысы абарончага дойлідства сярэднявечча. Яскравы шэдэўр беларускай архітэктурнай спадчыны, вялізарнае нават паводле сучасных уяўленняў збудаванне вырашана аднанефавым «караблём» з невялікім трансептам, які пераходзіць у больш вузкую, але буйнамаштабную паўкруглую апсіду з бакавымі нізкімі сакрысціямі. Аб'ём храма аб'яднаны высокім дахам, які ўступам пераходзіць у паўшатровае завяршэнне апсіды. З паўднёвага боку да апсіды далучана цыліндрычная вежа з шатровым пакрыццём і вітой лесвіцай унутры. Яе вузкія байніцы надаюць храму абаронча-крапасны характар. Да галоўнага фасада прыбудаваны нізкі аб'ём нартэкса. У дэкаратыўным вырашэнні высокага 3-вугольнага франтона галоўнага (заходняга) фасада — выразныя элементы рэнесансу: плоскія прамавугольныя і круглыя нішы, прафіляваны карніз, лапаткі, круглыя люкарны. Атынкаваныя масіўныя сцены бакавых фасадаў (таўшчыня 1,3 м) выкладзены ў тэхніцы гатычнай муроўкі, умацаваны пілонамі-контрфорсамі, прарэзаны паўцыркульнымі вокнамі з глыбокімі адхіламі, завершаны прафі-

Троіцкі касцёл у в. Чарнаўчыцы.

ляваным карнізам. Зала храма перакрыта цыліндрычным скляпеннем на распалубках, аздобленым ляпнымі нервюрамі геаметрычнага малюнка — матыў архітэктуры рэнесансу. Сцены апрацаваны пілястрамі. Эпоха барока не закранула архітэктуры храма, але ўнесла ў яго інтэр'ер характэрную па дынаміцы і руху каталіцкую драўляную паліхромную скульптуру XVIII ст. у алтары і нішах галоўнага фасада. У інтэр'еры 3 скульптуры: «Святы Дамінік» у алтары (прывезены з зачыненага касцёла ў г. Высокае Камянецкага раёна), «Святы Антоній» і «Святы Марцін» у нішах галоўнага фасада. На паверхні скульптур захаваліся сляды афарбоўкі залаціста-карычневых і чырвоных таноў. У сакрысціі храма захаваўся арнат, аблямаваны слуцкім поясам. Гатычна-рэнесансны характар атрымала і архітэктура адасоблена пастаўленай каля касцёла 4-яруснай званіцы моцнага канструкцыйнага вырашэння з вуглавымі контрфорсамі. Увесь касцёльны ансамбль набывае асобую значнасць і як сведак старажытнасці, і як надзвычай рэдкі захаваны рарытэт Адраджэння, надзелены нацыянальнымі архітэктурна-стылёвымі рысамі.



Узор скляпення ў Троіцкім касцёле ў в. Чарнаўчыцы.

Аналагічнае спалучэнне форм готыкі і рэнесансу прасочваецца ў архітэктуры **Спаса-Праабражэнскай царквы** ў **в. Шумакі**, пабудаванай у 1609 г. на захадзе ад вёскі, на левым беразе р. Лясная. Паводле падання, пабудавана як прысядзібная царква князя Шуйскага з цэглы

раскіданага палаца Радзівіла, які прайграў яго таму ў карты. Невялікі (10х12 м) кампактны мураваны храм складаецца з прамавугольнага аб'ёма, спалучанага з масіўнай паўкруглай апсідай, над якой агульны 2-схільны дах пераходзіць у канічнае пакрыццё. Па цэнтры вільчыка даху ўзвышаецца купалок на драўляным 8-гранным барабане. Вытанчаную пластыку белакаменных фасадаў ствараюць шырокія лапаткі ў прасценках стральчатых акон, прафіляваны паддахавы карніз. Лучковае акно апсіды запоўнена каляровым вітражом у выглядзе крыжа. Уваход арганізаваны праз прыбудаваны пазней нізкі прытвор. Царква з часу яе ўзвядзення не атрымала змен, але званіца перабудоўвалася неаднаразова. Першапачаткова яна ўзвышалася над прытворам і па форме нагадвала гранёны барабан. У наступным была разабрана і замест яе ў царкоўным двары была пабудавана простая і зграбная драўляная званіца, вырашаная ў традыцыях народнага драўлянага дойлідства (перабудавана ў 1930-х г.). Прастора залы перакрыта цыліндрычным з распалубкамі скляпеннем, сцены крапаваны лапаткамі, адпаведнымі вонкавым. Інтэр'ер упрыгожаны іканастасам разной царскай брамай у стылі барока. Мастацкую каштоўнасць уяўляюць абразы «Пакроў Багародзіцы» (палатно на дошцы, тэмпера, XVIII ст.) і «Віленскія пакутнікі» (палатно, алей, XIX ст.).

Крыжаўзвіжанская царква ў в. Вістычы размешчана на невялікім пагорку ў цэнтры вёскі, у 100 м ад шашы Брэст—Высокае, дамінуе ў навакольнай забудове і ландшафце. Пабудавана з каменю ў 1678 г. па фундацыі князёў Чартарыйскіх як Троіцкі касцёл манахаў ордэна цыстэрыянцаў. У 1864 г. забраны пад праваслаўную царкву. У 1857 г. зроблены капітальны рамонт. Царкоўны двор акаймаваны цаглянай агароджай. Перад храмам стаіць драўляная званіца, а крыху ў баку — паўразбураная каплічка.

Царква — помнік архітэктуры барока. Уяўляе сабой трохнефавую базіліку з павялічаным сярэднім нефам, завершаным паўцыркульнай апсідай. Пануючая роля сярэдняга нефа, нерасчлянёная прастора якога з'яўляецца кампазіцыйнай асновай будынка, дакладна выяўлена ў плане, складаючы з апсідай нераз'яднанае

Крыжаўзвіжанская царква ў в. Вістычы.

цэлае, ён займае ўсю даўжыню будынка. Бакавыя нефы значна вузейшыя і карацейшыя за сярэдні. Па абодва бакі ад сярэдняга нефа размешчаны чатыры прыдзелы: два з іх, далучаныя да апсіды, знаходзяцца ў габарытах бакавых нефаў, а два іншых, што выходзяць на галоўны фасад, выступаюць з асноўнага аб'ёма амаль на тры метры. Унутраная структура царквы выяўлена ў яе знешняй кампазіцыі. Сцены галоўнага карабля храма, расчлянёныя рэдка расстаўленымі вокнамі, плаўна пераходзяць у глухую сцяну магутнай апсіды суровага і манументальнага выгляду. Не меншай суровасцю вылучаюцца сцены бакавых нефаў, расчлянёныя парнымі пілястрамі, паміж якімі размешчаны высока ўзнятыя вялізныя паўкруглыя люкарны. Увядзенне пілястраў узбагачае пластыку бакавых фасадаў, надае ім больш дробны маштаб, падкрэсліваючы іх падпарадкаваную ролю. Кампазіцыя галоўнага фасада, расчлянёнага атаблементам на два ярусы, адносіцца да распаўсюджанай у эпоху барока схеме рымскай царквы Ілы Джэзу. Рытмічны, нарастаючы да цэнтра строй пілястраў і паўкалон падкрэслівае асноўную кампазіцыйную вось, якая акцэнтавана арачным парталам, аконнай нішай другога яруса з лучковым сандрыкам і авальнай люкарнай на завяршаючым фасад трохвугольным франтоне. Магутныя паўкалоны тасканскага ор-



Царква Параскевы Пятніцы і званіца ў в. Збірагі.

дэра, якія пастаўлены папарна на абодва бакі партала, падаўжаюцца больш стройнымі паўкалонамі верхняга яруса. Дынамічнасць пірамідальнай кампазіцыі, ступеньчатасць яе пабудовы, пластычная апрацоўка сцяны, цякучыя формы крывалінейных завяршэнняў, што згладжвае пераходы ярусаў, сведчаць пра барочны характар архітэктуры фасада. Пры наяўнасці знешніх прыкмет італьянскага барока помнік захоўвае манументальнасць і прастату, што ўласцівы беларускаму дойлідству. Сцены і масіўныя пілоны, якія падтрымліваюць і ўспрымаюць распор крыжовых скляпенняў, выкананы з цэглы і атынкаваны. Манументальная аркада, што ўспрымае нагрузку сцен сярэдняга нефа і вылучае яго ад бакавых, завершана антаблементам, які акаймоўвае па перыметры ўвесь неф і дакладна падзяляе яго на два ярусы. Вертыкальныя чляненні вылучаны падвойнымі пілястрамі, што крапуюць сцены і пілоны і служаць апорай магутным падпружным аркам скляпення. Размешчаныя ў яго люнетах лучковыя вокны заліваюць залу святлом, дзякуючы чаму высока ўзнятыя скляпенні здаюцца лёгкімі і паветранымі. Дэкаратыўнае ўбранне інтэр'ера дапаўняецца архівольтамі арак і простымі філёнгамі на пілонах і арках. Спакойны рытм вертыкальных чляненняў, ясныя прапорцыі, лаканізм дэкора — усё сведчыць пра рэнесансны характар строгага і ўрачыстага інтэр'ера. Ва ўсходняй частцы інтэр'ера над галоўным уваходам на магутнай арцы размешчаны хары, на якія вядзе размешчаная ў тоўшчы сцяны вінтавая лесвіца.

Барочную архітэктуру Брэстчыны прадстаўляе **Пакроўская царква ў в. Малыя Шчытнікі**, пабудаваная з цэглы ў 1742 г. Была пабудавана як невялікі (7,6 х 8,8 м) прысядзібны храм. Забраны ў праваслаўе ў 1864 г., але ў 1918 г. быў вернуты каталікам як прыхадскі касцёл Сэрца Ісуса. У 1888 г. побач з царквой устаноўлены камень, на якім высечаны словы беларускага мысліцеля, атэіста і матэрыяліста К.Ляшчынскага: «О падарожны! Не міні гэтых камянёў. Ты на іх не спатыкнешся, калі не спатыкнешся на ісціне. Усвядоміш ісціну каля камянёў, бо нават тыя людзі, якія ведаюць, што гэта праўда, вучаць, што гэта мана. Вучэнне мудрацоў — свядомы падман». Меркавалася стварыць у царкве музей гісторыі і культуры імя К.Ляшчынскага. Даволі кампактны прамавугольны ў плане будынак святыні накрыты вальмавым дахам. Але фасады насычаны архітэктурнай крапоўкай — лапаткамі паміж высока ўзнятымі лучковымі вокнамі бакавых фасадаў. Голоўны фасад завершаны трохвугольным з «заломам» франтонам з лучковым акном і круглай люкарнай па восі. Галоўны ўваход вырашаны нізкім прытворам, кампазіцыя якога паўтарае галоўны фасад. Зала царквы перакрыта драўляным корабавым скляпеннем. Над уваходам размешчаны хары на двух драўляных слупах.

У перыяд панавання ў манументальнай архітэктуры стылю барока царкоўнае драўлянае дойлідства несла на сабе нацыянальна-народныя рысы. Майстэрства народных дойлідаў гэтага перыяду ілюструе **царква Святой Параскевы Пятніцы,** што размешчана на ўзгорку цэнтра вёскі **Збірагі**. Збудавана па фундацыі княгіні Агаты Сапегі Пацэвай як уніяцкая ў 1610 г., з 1865 г. — праваслаўная. Царква вырашана простым чатырохсценным зрубам пад вальмавым дахам, над якім узвышаецца цыбульчатая галоўка. Да ўсходняй сцяны далучаецца больш вузкі 3-гранны зруб апсіды, па баках якой далучаны нізкія рызніцы. Уваход у храм вырашаны невялікім прытворам пад 2-схільным дахам. Калі б не большы маштаб, будынак цяжка было б адрозніць ад звычайнай сялянскай хаты. Але вертыкальная шалёўка, высока ўзнятыя прамавугольныя вокны надаюць аб'ёму храма вядомую вертыкальную накіраванасць. Зала перакрыта простай столлю па бэльках, сцены складзены з брусоў, неашаляваныя, афарбаваныя алеем. Апсіда вылучана драўляным разным іканастасам. У залу храма над уваходам на двух драўляных слупах выступаюць хары з дугападобным парапетам. Мастацкую цікавасць уяўляюць абразы XVIII ст. «Параскева Пятніца» і «Маці Боская Адзігітрыя». Сціплы храм у ансамблі з адасобленай званіцай складае прасторава развітую кампазіцыю. Чацверыковая вертыкальна ашаляваная званіца мае верхні адкрыты ярус-звон у выглядзе слупавай лучковай аркады, якая ўтрымлівае 4-схільны гонтавы шацёр з крыжам.

Стыль барока ў народным драўляным культавым дойлідстве яскрава праявіўся ў архітэктуры **Міхайлаўскай царквы ў в. Чэрск**. Стаіць у цэнтры вёскі, на яе галоўнай вуліцы. Драўляная царква са званіцай збудавана ў канцы XVII — пачатку XVIII ст. (да 1701 г.). Як і большасць храмаў той эпохі, мае непаўторную аб'ёмна-прасторавую пабудову. Асноўны кубападобны зруб пераходзіць у працяглую 5-гранную апсіду з бакавой рызніцай, накрыты агульным гонтавым дахам з вальмамі па гранях апсіды. Асноўны аб'ём і апсіда былі завершаны фігурнымі барочнымі купаламі. У XIX ст. да галоўнага фасада дабудаваны непрапарцыянальна вялізны квадратны ў плане прытвор. Малітоўная зала перакрыта карабавым скляпеннем старажытнай канструкцыі. Інтэ'ер упрыгожвае драўляны разны іканастас з творамі іканапісу XVII—XVIII ст. Адасоблена ад царквы пастаўлена 3-ярусная званіца — таксама арыгінальнай архітэктурна-кампазіцыйнай трактоўкі. Над ніжнім кубічным зрубам узведзены шырэйшы пірамідальны каркасны ярус-звон, раскрыты 4-пралётнай аркадай: над ім узвышаецца трэці чацве-



Абраз Параскевы Пятніцы ў царкве в. Збірагі.



Званіца Міхайлаўскай царквы ў в. Чэрск.

рыковы ярус з шатровым пакрыццём і макаўкай у завяршэнні.

Найбольш выразным помнікам драўлянага дойлідства стылю барока на Брэстчыне з'яўляецца **Пакроўская царква ў в. Покры**. Размешчана адасоблена ад вёскі ў паўночным баку на пагорку ў акружэнні бутавай агароджы і старых ліп. Збудавана ў 1739 г., з'яўляецца выразным помнікам народнага драўлянага дойлідства стылю барока. Уяўляе сабой храм цэнтрычнага тыпу. Крыжападобны ў плане, ён накрыты двухсхільнымі дахамі, сяродкрыжжа якіх завершана пластычным шмат'ярусным купалам у стылі барока. Крыло апсіды мае 5-гранную форму з бакавымі нізкімі рызніцамі, што не толькі парушае цэнтрычнасць кампазіцыі, колькі надае ёй асіметрычна-дынамічнае гучанне. Да царквы прыбудавана 2-ярусная (васьмярык на чацверыку) шатровая званіца, якая таксама з-за сваёй маламаштабнасці не парушае агульнай цэнтрычнай кампазіцыі храма. Яго вертыкальную накіраванасць падкрэслівае вертыкальная шалёўка сцен і трохвугольных франтонаў, дэкарыроўка вуглоў разным «бягучым» арнаментам. Помнік мае насычанае каляровае вырашэнне — блакітныя сцены спалучаюцца з серабрыстымі дахамі і пазалотай крыжоў, каляровымі вітражамі акон апсіды. Над уваходам на двух слупах устроены хары.

Аналагічны па агульнай кампазіцыі і барочнай архітэктуры храм захаваўся ў **в. Чарнаўчыцы. Царква Параскевы Пятніцы** — помнік народнага драўлянага дойлідства, размешчаны на галоўнай вуліцы вёскі (адрэзак шашы Брэст—Камянец), абнесена бутавай агароджай. Пабудавана ў цэнтры вёскі ў 1733 г., перабудоўвалася ў канцы XIX ст. Крыжовы ў плане зруб некалькі выцягнуты ўздоўж падоўжнай асі за кошт пяцігранай апсіды з бакавымі нізкімі рызніцамі і невялікага прытвора пад двухсхільным дахам. Сяродкрыжжа двухсхільных дахаў увенчана фігурным шмат'ярусным купалам. Акрамя яго вертыкалізм кампазіцыі будынка падкрэслівала і вертыкальная шалёўка, брусы-сцяжкі, вуглавыя руставаныя лапаткі, спараныя прамавугольныя вокны. Над прытворам размешчаны хоры. Апсіда вылучана драўляным разным іканастасам XIX ст. У апсідзе знаходзіцца каштоўны твор беларускага жывапісу — абраз «Цуд Георгія аб змею» 1729 г.

Да канца XVIII ст. адносіцца будаўніцтва **Праабражэнскай царквы ў в. Медна**. Размешчана на царкоўным пагосце на паўднёвай ускраіне вёскі. Помнік народнага драўлянага дойлідства канца XVIII ст. Архітэктурная выразнасць храма дасягаецца не насычаным дэкорам, а сродкамі яскрава вылучанай, прасторава развітай аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі. Да прамавугольнага ў плане асноўнага зруба праз невялічкі бабінец далучаецца стройная аднаярусная званіца аднолькавай вышыні з асноўным аб'ёмам і накрытая двухсхільным гонтавам дашкам з макаўкай. Рытмічна спалучаюцца двухсхільныя гонтавыя дахі і трохвугольныя абшытыя «у ёлку» франтоны. Вертыкальна ашаляваныя сцены прарэзаны невялікімі прамавугольнымі вокнамі, па вуглах абшытыя дошкамі. Апсіда ўнутры храма вылучана простым дашчатым іканастасам, сцены брусчатыя неашаляваныя, афарбаваныя алеем.

На заходняй ускраіне **вёскі Дубок** стаіць **Ільінская царква** — помнік народ-

нага драўлянага дойлідства на мяжы XVIII—XIX ст. Храм адназрубны з 3-яруснай шатровай званіцай і трохграннай апсідай. Зрубы накрыты агульным двухсхільным дахам з вальмамі над апсідай, над шатром званіцы макаўка. Архітэктурная выразнасць гарызантальна ашаляванага і пазбаўленага дэкору будынка дасягаецца выключна кампазіцыйнымі сродкамі, што спрадвеку было характэрна для народнага драўлянага дойлідства. Фасады гарызантальна ашаляваны, вуглы апрацаваны накладкамі, расчлянёны прамавугольнымі вокнамі ў фігурных ліштвах, у апсідзе паўцыркульная люкарна. Сцены малітоўнай залы, якая непасрэдна расчыняецца ў апсіду і бабінец, зрубленыя з брусоў і не ашаляваныя, афарбаваныя алеем.

Мастацкае мысленне на мяжы XVIII—XIX ст. засноўваецца на натуральным імкненні да спрошчанасці, яснасці, рацыянальнасці, лагічнасці архітэктурнага вобразу, заснаванага на арыентацыі на формы антычнага дойлідства. Архітэктура класіцыстычных храмаў валодала акрэсленым наборам фармальных прызнакаў: гарызанталь пераважае над вертыкаллю, кампазіцыйна вылучаецца вось сіметрыі, архітэктурныя формы цягнуцца да квадрата, акружнасці, паўцыркульнай аркі. Галоўная задача архітэктурнай кампазіцыі храма — даць візуальна яснае вызначэнне яе велічыні, мернасці, прапарцыянальнасці, маштабнасці. Храмы гэтага стылёвага кірунку вызначаюцца тэктанічнасцю, бачаннем канструкцыйнай структуры будынка. На фасадах выяўлены ордэрны дэкор — пілястры, капітэлі, калоны, карнізы, што адыгрываюць не канструкцыйную, а мастацка-вобразную ролю. Ад успрыняцця класіцыстычнага храма, нягледзячы на тое, што ён прайграе ў дэкаратыўнасці перад другімі стылямі, узнікае адчуваенне душэўнага спакою, яснасці, прасветленасці.

Лаканічны, строгі і рытмічны стыль класіцызму, які прыйшоў на Беларусь на змену барока ў другой палове XVIII ст., увасобіўся ў архітэктуры **Прачысценскай царквы**, што стаіць на галоўнай вуліцы **вёскі Шэбрын**, за 2 км ад шашы Брэст—Мінск. Пабудавана з цэглы ў 1793(8) г. Просты і кампактны прамавугольны ў плане аб'ём накрыты 2-схільным дахам,

Царква Параскевы Пятніцы ў в. Чарнаўчыцы.



Абраз з чарнаўчыцкай царквы Параскевы Пятніцы.

3-вугольны франтон якога завяршае плоскасны галоўны фасад. Ён, як і бакавыя фасады, рытмічна расчлянёны шырокімі лапаткамі, лучковымі вокнамі і нішамі. Вуглы будынка акруглены. Зала храма 4 драўлянымі слупамі падзелена на 3 нефы. Бакавыя рызніцы і апсіда паміж імі ўчынены ўнутры асноўнага аб'ёма і злучаны паміж сабой шырокімі бакавымі арачнымі прасветамі; над уваходам хоры. Апсіда асветлена васьміграннай люкарнай. Званіца пастаўлена адасоблена збоку перад храмам і таксама выратана ў адной з царквою архітэктуры: цэнтрычнае, квадратнае ў плане вежападобнае збудаванне пад шатровым дахам з макаўкай. Плоскасныя грані крапаваны вуглавымі пілястрамі і прарэзаны лучковымі вокнамі.

У стылі позняга класіцызму выканана архітэктура **Свята-Міхайлаўскай царквы**, размешчанай у цэнтры **вёскі Астрамечава** і акаймаванай цаглянай агароджай. Пабудавана ў 1846 г. з цэглы і бутавага каменю. Тры простыя чатырохсценныя аб'ёмы аб'яднаны ў падоўжна-восевую кампазіцыю. Іх выкладзеныя з бутавага каменю сцены акантаваны і расчлянёны атынкаванымі і пабеленымі плоскімі і руставанымі лапаткамі, прамавугольнымі вокнамі ў простых ліштвах. Новая стылёвая арыентацыя на формы старажытнарускага дойлідства праявілася ў надбудове над прытворам васьміграннага яруса шатровай званіцы і цыбульчатая галоўка над дахам. Гэты стылёвы сімбіёз надае архітэктуры храма пераходны эклектычны характар. Да прамавугольнага ў плане асноўнага аб'ёму з усходу далучаецца трохсценная апсіда, з захаду — чатырохгранная 2-ярусная званіца, шацёр якой увенчаны макаўкай. Царква мае кантрастнае каляровае вырашэнне — атынкаваныя і пабеленыя элементы архітэктурнага дэкору вылучаюцца на фоне паліхромнай бутавай муроўкі сцен.

Рысы позняга класіцызму несла архітэктура **касцёла Непарочнага Зачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў в. Дамачава**. Пабудаваны як парафіяльны ў 1854 г. з цэглы. У 1905 г. пашыраны. Храм, як і вясковая капліца, не захаваўся. Не захаваліся касцёлы ў вёсках Лышчыцы, Астрамечава, капліца ў Дубіцах.

Надзвычай шырокі маштаб праваслаўнае царкоўнае будаўніцтва набыло ў другой палове XIX — пачатку XX ст. Праз яго рускі царызм імкнуўся сцвердзіць «спрадвечнасць» правоў рускага самадзяржаўя на тутэйшыя тэрыторыі як «исконно русские земли». У гэтай сувязі ўзнікла шмат манументальных царкоўных будынкаў, пастаўленых на грошы і рукамі мясцовага праваслаўнага сялянства. Узведзеныя храмы можна лічыць сапраўды народнымі помнікамі, таму што будаваліся яны на народныя сродкі і па «прыгаворах» сельскіх сходаў: з кожнага гаспадара бралі 3 рублі, з батракоў і салдат — 1 рубель. Будаўніцтва храмаў аддавалася ў падрад купцам. Вялікую суму грошай выдзеліў у фонд царкоўнага будаўніцтва і расійскі ўрад.

Адначасова разгарнулася кампанія па закрыцці каталіцкіх храмаў, большасць якіх была перабудавана пад праваслаўныя цэрквы. Так, каталіцкія капліцы ў вёсках Прыгодзічы і Рудавіцы пасля 1863 г. пераасвечаны ў праваслаўныя.

Пераход архітэктуры аднаго стылёвага напрамку да другога не адбываўся раптоўна і радыкальна — у гэты перыяд з'яўляюцца творы, у якіх спалучаюцца формы мінулага і надыходзячага стыляў. Пануючы на працягу апошняй чвэрці XVIII і 40-х гадоў XIX ст. стыль класіцызму паступова знікае, пакідаючы месца эклектыцы і гістарызму. У царкоўным дойлідстве з 1840-х гадоў усталёўваецца афіцыйна і «высачайша зацверджаны» рэтраспектыўна-рускі стыль.

У архітэктуры другой паловы XIX — пачатку XX ст. шырока рэалізуецца нацыянальна-рамантычны мастацкі кірунак, арыентаваны на аднаўленне традыцый і форм старажытнарускага дойлідства. Прыхільнасць да так званага «рускавізантыйскага» стылю ў праваслаўным царкоўным будаўніцтве з яго цыбулепадобнымі купаламі і макаўкамі-свечкамі, спічастымі шатрамі званіц, закамарамі, дэкаратыўнай узорыстасцю была прадвызначана і афіцыйным на той час агульнарасійскім будаўнічым статутам. Стваральнікі шматлікіх «сінадальных» цэркваў былі абмежаваны ў сваіх творчых пошуках зацверджанымі «найвысачайша» канонамі. Але гэта датычылася толькі планіровачнай арганізацыі. Затое ў вырашэнні знешняй архітэктуры жорст-

кіх цыркуляраў не існавала, акрамя адпаведнасці «старажытнаму візантыйскаму дойлідству». Таму аднолькавых храмаў, за рэдкім выключэннам, не сустракалася, у кожным з іх была свая асаблівасць, хоць якая-небудзь адметная форма ці дэталь.

Узнясенская царква ў в. Вельямовічы пабудавана ў 1868 г. з цэглы ў цэнтры вёскі на месцы старога струхнелага драўлянага Сямёнаўскага храма па хадайніцтву брэсцкага епіскапа Ігнація. Міравы пасрэднік 2-га ўчастка Брэсцкага ўезда дакладае гродзенскаму губернатару аб тым, што царква ў вёсцы знаходзіцца ў такім стане, што працягваць у ёй богаслужэнне немагчыма. Генерал-губернатар дае загад распрацаваць праект мураванай царквы адпаведна колькасці прыхаджан, якіх на той час налічвалася 860 чалавек. Праект храма быў складзены архітэктарам Каленкевічам у 1864 г. Кампазіцыя мае кананічную 4-часткавую пабудову — да асноўнага кубападобнага аб'ёма далучаецца паўкруглая апсіда, трапезная і званіца. Асноўны аб'ём быў завершаны пяцігалоўем, але дамінуе ў сілуэце будынка 3-ярусная (2 васьмерыка на чацверыку) шатровая званіца з макаўкай у завяршэнні. Атынкаваныя фасады насычаны архітэктурнай пластыкай, пазычанай са старажытнарускага дойлідства — аркатурныя паясы, візантыйскія спараныя арачныя вокны, аб'яднаныя агульнай кілепадобнай аркай, філёнгавы цокаль, вуглавыя лапаткі, какошнікі, зубчастыя фрызы. Ніжні чацверыковы ярус званіцы завершаны какошнікамі, сярэдні ярус дэкарыраваны прамавугольнымі нішамі і аконнымі праёмамі. Званіца завершана васьмігранным шатром з макаўкай. Зала храма перакрыта самкнутым скляпеннем.

У цэнтры **вёскі Гершоны** стаіць **Раства-Багародзічная царква**. Будаўніцтва мураванага храма замест струхнелага драўлянага ажыццёўлена па хадайніцтву брэсцкага епіскапа Ігнація. Падрадчыкам будаўніцтва сціплага мураванага храма быў мешчанін Чарнігаўскай губерні Гардзей Навараў, які па кантракту здзейсніў будаўніцтва за тры гады з 1866 па 1869 гг. Помнік культавага дойлідства рэтраспектыўна-рускага стылю. Мае падоўжна-восевую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, якая складаецца паслядоўнасцю званіцы,



Царква ў в. Гершоны.

трапезнай залы, пяціграннай апсіды з бакавой рызніцы. Апошняя ўносіць слаба выяўлены элемент асіметрыі ў агульна ўраўнаважаную пабудову храма. Яе дамінантамі з'яўляюцца 2-ярусная шатровая званіца (васьмярык на чацверыку), завершаная цыбульчатай галоўкай, і такі ж купалок на васьмігранным барабане. Шматпланаваць агульнай прасторавай кампазіцыі будынка дасягаецца чаргаваннем высокіх аб'ёмаў (званіцы і залы) і нізкіх (трапезнай, апсіды і рызніцы). З арсенала старажытнага царкоўнага дойлідства пазычаны акантоўка аб'ёмаў аркатурнымі паясамі і вуглавымі лапаткамі, кілепадобныя ліштвы вокнаў званіцы, слаёныя нішы. Асноўны прамавугольны ў плане аб'ём накрыты чатырохсхільным дахам з галоўкай.

Царква пабудавана ў 1881 г. з цэглы на паўднёвай ускраіне **вёскі Сычы**. Архітэктура вылучалася спрошчанасцю — кампактны прамавугольны ў плане асноўны аб'ём накрыты двухсхільным дахам з вальмай над алтарнай часткай. Па цэнтры даху ўзвышаецца цыбульчатая галоўка на васьмігранным барабане. Над галоўным уваходам узвышаецца 3-ярусная шатровая званіца з цыбульчатай галоўкай. Плоскасныя фасады расчлянёны арачнымі вокнамі і пілястрамі ў прасценках, аперазаны прафіляваным карнізам.

Свята-Афанасьеўская царква размешчана ў цэнтры **вёскі Аркадзія**. Драўляны храм пабудаваны на мяжы XIX—XX ст. на месцы гібелі беларускага гра-

мадскага, палітычнага і царкоўнага дзеяча Афанасія Філіповіча ў 1648 г. Рашэннем Брэсцкага аблвыканкома царква перададзена Рускай праваслаўнай царкве. Падноўлена намаганнямі прыхаджан у 1988 г. У сярэдзіне верасня 1995 г. наведана Патрыярхам маскоўскім і ўсяе Русі Алексіем II. Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства з рысамі рэтраспектыўна-рускага стылю. Пабудавана з сасновага бруса на мураваным падмурку. Выразнасць будынка дасягаецца падоўжана-восевым спалучэннем розных па памерах зрубаў прытвора і залы, плаўным спалучэннем двухсхільных дахаў. Канёк даху галоўнага аб'ёма завершаны цыбульчатай галоўкай на гранёным барабане. Вырашана крыжовым зрубам, завершаным двухсхільнымі дахамі. Над сярод-крыжжам уздымаецца высокі гранёны шацёр з макаўкай. Макаўкамі завершаны і трохвугольныя франтоны крылаў крыжа. Па тыпу сялянскай хаты галоўны фасад завершаны трохвугольным франтонам, ашаляваным «у вугал» і ахоплены разным падзорам; фасады ашаляваны гарызантальна з вылучэннем цокальнай часткі вертыкальнай абшыўкай. У інтэр'еры апсіда вылучана шырокай кілепадобнай аркай. 1-ярусны драўляны іканастас у неарускім стылі; царскія вароты, арачныя рамы ікон размежаваны карынфскімі калонкамі, завершаны кілепадобнымі франтончыкамі. Галерэя хораў падтрымана бакавымі ўвагнутымі кранштэйнамі.

Пачатак XX ст. у архітэктуры адзначаны стылем мадэрн, які меў некалькі напрамкаў. Адным з іх з'яўляўся неарускі стыль, заснаваны не на запазычанні форм і прыёмаў старажытнарускага дойлідства, а на іх авангарднай інтэрпрэтацыі, стылізацыі, асацыятыўнасці. Гэтымі стылёвымі рысамі адзначана **Свята-Лукаўская царква** ў **в. Дамачава**. Пабудавана ў 1905 г. ў цэнтры вёскі. Архітэктура храма вырашана ў неарускім стылі. Пабудавана па кананічнай чатырохчасткавай планіровачнай схеме, якая атрымала надзвычай дынамічную, буйнамаштабную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. Цыклапічная па вышыні 3-ярусная шатровая званіца ўзносіцца над простым, але высокім і шырокім прамавугольным у плане зрубам бабінца і ўражвае сваёй амаль гатычнай накіраванасцю ў вышыню. Яе верхнія грані дэкарыраваны балюстрадай і паўкалонамі. Кубападобны аб'ём залы завершаны аграмадным васьмігранным светлавым барабанам, шацёр, як і на званіцы, вянчае цыбульчатая галоўка. Дынаміку архітэктурнай кампазіцыі ўзмацняюць больш нізкая пацігранная апсіда і высокі шасціслуповы ганак, завершаны трохвугольным франтонам «мадэрновай» трактоўкі. Суровая плоскаснасць ашаляваных фасадаў змягчаецца высока ўзнятымі прамавугольнымі вокнамі ў разных ліштвах, ажурнай балюстрадкай званіцы. Галоўны ўваход вылучаны высокім шчыпцом на шасці тонкіх слупах. Для мадэрна і яго неарускага напрамку характэрна выкарыстанне манументальнага выяўленчага мастацтва. У інтэр'еры царквы грані раскрытага ў залу барабана і сцены дэкарыраваны палі-хромным роспісам. Ветразі барабана падтрымліваюць чатыры спараныя калоны. Апсіда абмежавана разным 3-ярусным іканастасам.

У традыцыях народнага драўлянага дойлідства пабудавана ў 1838 г. **Пакроўская царква** ў **в. Камяніца-Жыровіцкая**. Храм вырашаны прамавугольным зрубам, накрытым двухсхільным гонтавым дахам з вальмамі над трохсценнай апсідай. Уваход арганізаваны праз нізкі прыруб прытвора. Яго трохвугольны франтон разам з франтонам асноўнага зруба ствараюць рытміку франтальнага фасада. Архітэктурная выразнасць сціплай пабудовы дасягаецца гарманічным спалучэннем аб'ёмаў і дахаў, гарызантальнай шалёўкай фасадаў, прарэзаных прамавугольнымі вокнамі, шырокімі гонтавымі адлівамі, выкананымі «ў ёлку» ўваходнымі дзвярамі.

У драўляным царкоўным будаўніцтве пачатку XX ст., як і ў мураваным, была з'ява вяртання да драўлянага культавага дойлідства Рускай Поўначы. Калі б ажыццявіўся праект драўлянай **царквы**, распрацаваны для вернікаў **в. Збунін** архітэктарам Цярноўскім у 1914 г., архітэктурная спадчына Брэстчыны мела б яшчэ адзін шэдэўр культавага драўлянага дойлідства. Неабходнасць будаўніцтва новага храма была абумоўлена тым, што старая драўляная Мікалаеўская царква знаходзілася ў струхнелым стане (у 1858

і 1879 гг. вытрымала капітальны рамонт), але гэтаму пашкодзіла 1-я сусветная вайна. Калі б будаваць у вёсцы храм — нельга стварыць лепшага праекта. Замыслены па 4-часткаваму канону, ён вылучаецца выключна зграбнымі прапорцыямі — ад фронту ўздымаецца высокая шатровая званіца з адкрытым верхнім ярусам-звонам і цыбульчатай галоўкай у завяршэнні. Праз нізкі бабінец яна злучаецца з кубападобным зрубам храма, двухсхільны дах якога завершаны таксама шатром з макаўкай. Такая ж макаўка вянчае дах прамавугольнай апсіды. Рознавялікасць зрубаў і іх дахаў, тры зграбныя шатровыя вертыкалі, франтоны-бочкі, вокны з дыяганальнымі пераплётамі — усё складзена ў адзіную ўражлівую кампазіцыю, якая выклікае непасрэдныя асацыяцыі з славутым мінулым праваслаўнага дойлідства Рускай Поўначы.

Тое ж самае адбылося з **Праабражэнскай царквой** у **в. Радванічы**, якая знаходзілася ў струхнелым стане. У 1909 г. паўстае пытанне пра будаўніцтва ў вёсцы мураванага храма. Але архітэктарам У.А.Срокам праектуецца драўляны храм. Дойлід прытрымліваецца кананічнай чатырохчасткавай кампазіцыйнай схемы: шатровая званіца, бабінец, кубападобны храм з бакавымі прыдзеламі, квадратная апсіда з рызніцамі. Асноўны кубападобны аб'ём меў вялізны шатровы васьмерыковы ярус.

Драўляная **Іаанаўская царква** была пабудавана ў **в. Чэрні** ў 1884 г. па праекце архітэктара барона Г.Розэна. Храм быў вырашаны прамавугольным зрубам пад высокім дахам з вальмай над апсідай. Да франтальнага фасада далучалася высокая чацверыковая званіца з шатровым васьмерыком у завяршэнні.

Народнае культавае драўлянае дойлідства прадстаўлена Свята-Афанасьеўскай капліцай у в. Гершоны са званіцай на галоўным фасадзе, Свята-Іаанаўскай царквой у в. Прыбарава (пабудавана ў 1812 г.), касцёлам Прасвятой Троіцы ў в. Збірогі. (Фундаваны Сапегамі і Пацамі як парафіяльны ў 1620 г., у 1866 г. зачынены расійскай уладай, у 1920 г. вернуты каталікам, у 1925 г. адрэстаўрыраваны).

СЯДЗІБНА-ПАРКАВЫ КОМПЛЕКС

Палацава-сядзібная архітэктура стылю барока на Брэстчыне прадстаўлена **сядзібай Нямцэвічаў у в. Скокі**, якая фарміравалася з сярэдзіны XVIII ст. Размешчана ў цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1770-я гады. Тут 16.2.1757 г. нарадзіўся польскі пісьменнік і публіцыст Юліян Урсын Нямцэвіч. Сядзібна-паркавы комплекс — помнік архітэктуры барока і садова-паркавага мастацтва «французскага» стылю. Планіроўка сядзібна-паркавага ансамбля рэгулярная сіметрычна-восевая, у цэнтры знаходзіцца 2-павярховы панскі дом. Аднапавярховыя бакавыя флігелі (жылы і стайня не захаваліся) стваралі перад домам курданёр з круглым газонам, акаймаваны акруглым драўляным плотам з чатырохслуповай брамай. За жылым флігелем знаходзіліся гаспадарчыя пабудовы, за домам — парк рэгулярнага тыпу з цэнтральнай і дзвюма бакавымі паралельнымі алеямі, якія выходзяць да р. Лясная. Драўляны касцёл-пахавальня, які стаяў супраць дома цераз дарогу (не захаваўся) завяршаў парадную частку комплексу. Сядзібны дом мае характэрную для архітэктуры барока пластычную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю: прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак пад мансардай, раней быў пакрыты чарапічным дахам з бакавымі алькежамі, якія першапачаткова завяршаліся фігурнымі купаламі. Уваходы ў дом з галоўнага і паркавага фасадаў акцэнтаваны тэрасамі на пілонах. Франтальныя фасады маюць рэгулярны рытм прамавугольных вокнаў, па цэнтры вылучаны слаістымі пілястрамі, аперазаны тонкапрафіляваным карнізам. Стрыманы барочны дэкор уключае пластычныя сандрыкі і ліштвы вокнаў, міжпавярховую і фрызавую цягі, вуглавыя лапаткі, лучковыя люкарны даху. Цэнтральнае месца ў анфіладнай планіроўцы дома займае вестыбюль з трохмаршавай лесвіцай. Па цэнтры другога паверха знаходзілася вялізная бальная зала з антрэсолямі для музыкаў. Бакавыя алькежы выкарыстоўваліся ў якасці сховішчаў хатніх каштоўнасцяў і архіва. Прысядзібны касцёл фундаваны як парафіяльны ў 1776 г. У 1850 г. уладальніку маёнтка памешчыку Баляславу Карлавічу Мазеўскаму даецца дазвол на будаўніцтва новага касцёла. У 1864 г. адышоў праваслаўнаму духавенству. У 1921 г. вернуты каталікам. Не захаваўся.

Барочны больш буйны па маштабе **палацава-паркавы ансамбль** меўся ў **в. Чарнаўчыцы**, сфарміраваны ў першай палове XVIII ст. Аднапавярховы драўляны палац меў традыцыйную на той час П-падобную планіровачную арганізацыю. Цэнтр галоўнага фасада вылучаўся ганкам з балюстрадай, дваровага — галерэяй. Інтэр'еры мелі насычанае дэкаратыўнае аздабленне — разьба па дрэве, кафляныя грубкі і каміны, стукавая ляпніна і габелены. Мураваная сцяна, якая агароджвала палац, надавала магнацкай рэзідэнцыі замкава-абарончы характар. Гэтаму ўражанню садзейнічала 2-ярусная ўязная брама з дазорным памяшканнем над праездам. Другая брама выходзіла на мост праз канал, за якім быў высаджаны «італьянскі» тэрасны сад з гротам і альтанкамі, сістэмай прамавугольных алей і баскетаў.

Апошняя стадыя развіцця стылю барока носіць назву ракако. Шэдэўр гэтага мастацка-стылёвага напрамку існаваў у **в. Чарнаўчыцы** і быў прадстаўлены драўляным **палацам Радзівілаў**, збудаваным у 1761 г. на тэрыторыі старажытнага фамільнага замка. Будынак меў распаўсюджаную ў сярэдзіне XVIII ст. цэнтрычную кампазіцыю, якую стваралі 8-гранны 3-павярховы аб'ём з шлёмападобным з заломам фігурным купалам з флюгерам у завяршэнні і 4 2-павярховыя, квадратныя ў плане крылы пад 2-схільнымі дахамі. Паміж крыламі на ўзроўні другога паверха былі створаны вялізныя тэрасы з балюстраднай агароджай, на якія выходзіла галоўная бальная зала. Будынак насычана ўпрыгожаны ракайльнымі вазамі і алегарычнай скульптурай, картушамі, пуці, вуглавым рустам, надваконнымі сандрыкамі, філёнгамі, шматлікімі прафіліроўкамі. Пры палацы меўся парк са звярынцам.

Старажытнае мястэчка Чарнаўчыцы вядома сваімі манументальнымі помнікамі архітэктуры XVI—XVIII ст. — дзеючымі царквой Параскевы Пятніцы і Троіцкім касцёлам. Але тут яшчэ існавалі замак і палац Радзівілаў. Замак складаўся з драўлянага аднапавярховага П-падобнага ў плане палаца з вялікай залай у цэнтры, быў абнесены мураванай сцяной з брамамі. Галоўны ўваход у палац вылучаўся ганкам з балюстрадай, а з тыльнага боку мелася тэраса-галерэя. Палац акружаў італьянскі сад з альтанкамі і гротамі.

У 1761 г. на тэрыторыі былога замка з'явіўся новы палац. Надзвычай арыгінальную кампазіцыю драўлянага будынка складалі асноўны васьмігранны трохпавярховы аб'ём са шлемападобным фігурным купалам і чатыры двухпавярховыя квадратныя ў плане вуглавыя крылы, аб'яднаныя аднапавярховымі перамычкамі з балюстраднымі тэрасамі на плоскім даху. Архітэктура палаца мела барочна-ракайльны характар: скульптурныя і арнаментальна-ляпныя ўпрыгожванні, сярод якіх пуці, картушы, вазы і інш. Асабліва характэрна для стылю ракако размяшчэнне фігурнага картуша ў разрыве граняў франтона на другім паверсе галоўнага фасада і гуллівых пуці над верхнім акном. Прамавугольныя вокны дэкарыраваны прафіляванымі сандрыкамі, ляпнінай сцены —руставанымі лапаткамі, філёнгамі, карнізамі і міжпавярховымі цягамі. З грамадзянскай архітэктуры класіцізму ў раёне мелася **сядзіба** ў **в. Вістычы**, збудаваная на мяжы XVIII—XIX ст. (разбурана ў 1920-я гады). Галоўны 11-восевы фасад аднапавярховага, прамавугольнага ў плане дома па цэнтры традыцыйна быў вылучаны ампірным 4-калонным мансардным порцікам з атыкам замест 3-вугольнага франтона. Маёнтак Вістычы ў XVII ст. належаў князям Чартарыйскім, якія фундавалі тут мураваны касцёл. У XIX ст. у гэтым месцы ўзнікла панская сядзіба, знішчаная ў 1920-я гады. Сядзібны дом з'яўляўся творам архітэктуры ў стылі класіцызму ампірнага напрамку. Уяўляў сабой кампактнае, прамавугольнае ў плане аднапавярховае збудаванне, узнятае на высокі падмурак і падведзенае пад вальмавы дах. У цэнтры галоўнага фасада меўся мансардавы паверх і прыстаўлены чатырохкалонны порцік са ступеньчатым атыкам і балконам. Фасады адметныя строгай сіметрыяй, выразным рытмам прамавугольных вокнаў. У інтэр'еры звярталі на сябе ўвагу кафляныя печы (вывезеныя пасля разбурэння дома ў Варшаву).

На мяжы XIX—XX ст. стала модным будаваць драўляныя загарадныя вілы-дачы. Падобная **віла** будуецца ў акружэнні пейзажнага парку на ўскраіне **в. Сычы**. Драўляны панскі дом, пабудаваны на



Сядзібны дом у в. Сычы.

мяжы XIX—XX ст. Вялізны 1-павярховы будынак накрыты паўвальмавым дахам і традыцыйна вылучаны ў цэнтры мансардай са слуповай тэрасай перад ёю. Мае асіметрычную кампазіцыю. Цэнтральная частка галоўнага фасада вылучана двухпавярховым рызалітам, завершаным трохвугольным франтонам. На дваровым фасадзе на другім паверсе рызаліта — балкон. Унутраная планіроўка анфіладнага тыпу. У цэнтральнай частцы на першым паверсе — дзве парадныя залы.

У перыяд эклектыкі ў архітэктуры і мастацтве другой паловы XIX ст. дойліды звяртаюцца да розных гістарычных стыляў мінулага, чым глыбей — тым лепш. Асабліва яскрава гэтая мастацкая з'ява праявілася ў сядзібна-паркавай архітэктуры Беларусі. На Брэстчыне яе можна назіраць у **сядзібе** ў **в. Малыя Зводы**. Сядзібна-паркавы комплекс размешчаны, як звычайна, на ускраіне вёскі. Мураваны сядзібны дом быў узведзены ў 1875 г. (рэканструяваны ў 1971 г.). Пейзажны парк з сажалкай спланаваны і высаджаны па праекце вядомага на Беларусі паркабудаўніка У.Краненберга ў 1890 г. Панскі дом збудаваны з выкарыстанннем стылізаваных форм готыкі і рэнесансу, па асіметрычнай аб'емна-прасторавай кампазіцыі. Т-падобны ў плане двухпавярховы будынак на галоўным фасадзе фланкіраваны разнавялікімі рызалітамі з зубчатым 2-гранным шчыпцом (матыў гатычнай архітэктуры) і вынасным 2-схільным дахам на фігурных кранштэйнах — рэнесансны матыў. Да стылізаваных формаў рэнесансу належыць аднесці тэрасы галоўнага ўвахода на 4 канеліраваных пілонах і бакавога — на 2, плоскія сандрыкі прамавугольных і арачных вокнаў. Ва ўнутранай планіроўцы галоўны корпус прызначаўся пад парадныя і жылыя апартаменты, бакавы — пад службовыя. У цэнтры галоўнага корпуса вестыбюль з параднай лесвіцай на другі паверх, дзе размяшчаліся парадныя апартаменты. «Пад готыку» выкананы будынкі свірна і стайні. Стайня — аднапавярховы прамавугольны ў плане аб'ём пад двухсхільным дахам з рытмічным чаргаваннем аконных праёмаў. Свіран двухпавярховы, фасады расчлянёны буйнымі лапаткамі, вузкімі арачнымі вокнамі ў руставаных ліштвах і ўмацаваны вуглавымі контрфорсамі.

Яшчэ адзін кірунак мадэрна — стыль неакласіцызму, заснаваны на стылізацыі форм антычнай архітэктуры. Гэта мастацка-стылёвая з'ява адлюстравалася на архітэктуры **сядзібы** ў **в. Малыя Шчытнікі**, на жаль, зараз існуючая ў рэштках. Мураваны дом быў двухпавярховым. Асабліваць трактоўкі галоўнага фасада з бакавымі рызалітамі — пры агульнай сіметрычнай пабудове ўваходны партал панесены з цэнтральнай восі, што было недапушчальна для класічнай панскай сядзібы, а дынамічная асіметрыя была характэрна для мадэрнісцкіх архітэктурных



Сядзіба ў в. Малыя Зводы.

пошукаў. Паходжанне будынка з пачатку XX ст. (1905 г.) пацвярджае выкарыстоўванне бачковых скляпенняў у падвалах, металічнага пракату (балкі перакрыцця, кансоль бакавога рызаліта). Планіроўка дома тым не менш застаецца класічнай — у бакі ад цэнтральнага вестыбюля і параднай залы «разбягаюцца» анфілады апартаментаў.

Акрамя барочнага касцёла ў в. Малыя Шчытнікі, што ў 17 км на поўнач ад Брэста, насупраць яго захаваліся падмурак і частка сцен шырокага мураванага сядзібнага дома, а таксама фрагменты парку і алей. Галоўная ўязная алея пераходзіла ў партэр перад домам. Стайня і іншыя гаспадарчыя будынкі з бутавай муроўкі стаялі адасоблена на адкрытай мясцовасці на захад ад панскага дома. З гэтага ж боку знаходзіўся вялізны пладовы сад. Асноўны паркавы масіў пейзажнай планіровачнай арганізацыі цягнуўся паўкругам за домам з цэнтральным адкрытым газонам і спускаўся да размешчанай ніжэй сажалкі. Рэшткі сядзібнага дома, разбуранага, як сцвярджаюць мясцовыя жыхары, у 1961 г., дазваляюць уявіць яго архітэктуру і планіроўку. Будаўніцтва, верагодна, адносіцца да пачатку XX ст. (1905 г.?), пра што сведчыць неакласіцыстычны характар яго архітэктуры. Гэты двухпавярховы, прамавугольны ў плане будынак з балконамі на бакавых рызалітах меў працяглы франтальны фасад. Асіметрычны ўваходны партал фланкіравалі паўкалоны. Па баках галоўнага фасада вылучаліся аднолькавыя рызаліты, а з тылу дома — шэраг прамавугольных у сячэнні слупоў.



Вадзяны млын на р. Лясная каля в. Цюхінічы.

Цокаль будынка выкладзены з блокаў вапняку, сцены — з атынкаванай цэглы. Анфіладна размешчаныя пакоі дома «разбягаліся» па баках цэнтральнага вестыбюля і параднай залы. Пад будынкам захаваліся скляпеністыя падвалы гаспадарчага прызначэння з самастойным знешнім уваходам.

Падобны эклектычны характар мае і **сядзіба** ў **в. Кустын**. Садова-паркавае мастацтва мяжы XIX—XX ст. дапаўняецца **паркам** ў **в. Вельямовічы**, сажалкі якога з'яўляюцца мяжой парку.

ФАРТЫФІКАЦЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Характар буйнога фартыфікацыйнага будаўніцтва XIX ст. прадстаўлены ў **в. Аркадзія**. У 2 км на паўднёвы захад ад вёскі ў 1878—1888 гг. збудаваны **форт № 5**, што было выклікана неабходнасцю ўдасканаліць умацаванні Брэсцкай крэпасці на дальніх рубяжах. Сама ідэя ўмацавання Брэсцкай крэпасці шляхам стварэння асабістых крапасных фортаў належала рускаму фартыфікатару генерал-ад'ютанту З.І.Татлебену яшчэ ў 1862 г. У 1876 г. былі вызначаны месцы стварэння 9 фортаў, што было ажыццёўлена ў 1878 г. Прамавугольнае ў плане мураванае збудаванне абнесена валам, пад якім размешчаны анфілады скляпеністых памяшканняў казармы. Фарпост узмацняў роў з вадою. У 1903 г. абарончыя якасці «фартэцыі» ўдасканальваюцца — умацоўваюцца перакрыцці казематаў да 1,8—2 м таўшчыні, сцены сховішчаў — 5—6 м, уздоўж адхілу створаны нішы-байніцы для стралкоў.

А.М.Кулагін.

Народныя калектывы

Народны хор калгаса імя Ф.Э.Дзяржынскага

Арганізаваны ў 1952 г. З дня заснавання да 1995 г. ім кіраваў Георгій Аляксандравіч Хлябцэвіч — вялікі энтузіяст самадзейнай харавой творчасці. Чулы да песеннага фальклору, да жадання людзей раскрыць душу праз песню, Г.А.Хлябцэвіч дапамог хору набыць самабытнасць і прызнанне слухачоў.

У рэпертуары хору больш за 50 твораў савецкіх кампазітараў, рускіх, беларускіх, украінскіх народных песень.

У 1953 г. хор выступаў на святкаванні 40-годдзя ўз'яднання Украіны з Расіяй у Шацку (Украіна). У 1954 — удзельнічаў у рэспубліканскім аглядзе мастацкай самадзейнасці ў Мінску. У 1957 — у першым Усебеларускім фестывалі моладзі і студэнтаў у Мінску.

Хор выступаў у розных гарадах і вёсках вобласці, неаднойчы выязджаў у Польшчу і на Украіну.

Больш за 500 канцэртаў далі ўдзельнікі хору за гады яго існавання.

Дасягненні калектыву адзначаны Дыпломам 1-га Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР, дыпломамі і граматамі абласных і раённых аглядаў-конкурсаў.

У 1977 г. за актыўную працу па выхаванні працоўных, высокі ідэйна-мастацкі ўзровень рэпертуару і выканаўчае майстэрства хор атрымаў ганаровае званне «Народны самадзейны калектыў».

У маі 1997 г. хор святкаваў сваё 45-годдзе і 20-годдзе з дня прысвоення звання «народны». У гонар юбілею Г.А.Хлябцэвіч быў узнагароджаны Ганаровай граматай Брэсцкага раённага выканаўчага камітэта.

Народны хор «Спадчына»

Утвораны на базе Тэльмаўскага сельскага Дома культуры ў 1968 г. Заснавальнік хору — Павел Мікалаевіч Арлянін. З 1972 г. хорам кіруе Уладзімір Іванавіч Літвінчук — вялікі аматар і прапагандыст народнай песні. 1982 г. для калектыву быў асабліва ўдалым: яму прысвоена званне «Народны».

Народны хор «Спадчына» — дыпламант 1-га і лаўрэат 2-га Усесаюзнага аг-

ляду народнай творчасці. Калектыў узнагароджаны медалямі ВДНГ СССР.

Хор актыўна прапагандуе беларускую народную песню ў Польшчы, Чэхіі, Славакіі, Венгрыі, Малдавіі, Расіі, на Украіне, у рэспубліках Прыбалтыкі. У рэпертуары хору — беларускія, у тым ліку палескія, а таксама рускія і ўкраінскія песні.

Хор спрыяе адраджэнню народных традыцый, святаў, абрадавых песень, вясёлых жартаў і найгрышаў.

Са «Спадчынай» працуе група музыкантаў на чале з Віктарам Феафанавічам Шыманоўскім.

Пры хоры ўтворана фальклорная група, якая ў 1995 г. стала лаўрэатам фестывалю «Галасы Палесся».

Народны хор «Чарнічанка»

Утвораны ў 1987 г. у саўгасе «Маладая гвардыя». Заснаваў гэты калектыў заслужаны работнік культуры БССР Ігар Паўлавіч Чэрнік.

Рэпертуар хору складаецца з беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх песень і твораў савецкіх кампазітараў.

Калектыў вядзе разнастайную канцэртную дзейнасць: яго гасцінна сустракаюць у сваім раёне і ў суседніх Маларыцкім, Кобрынскім, Камянецкім. Творчыя сувязі злучаюць калектыў з харыстамі Расіі, Польшчы.

Удзельнікі хору далі больш за 70 канцэртаў. «Чарнічанка» — жаданы госць усіх раённых аглядаў і святаў.

У 1990 г. хору прысвоена ганаровае званне «Народны самадзейны калектыў».

Мужчынскі хор Астрамечаўскага СДК Лышчыцкага сельсавета

Утвораны ў 1980 г. Кіраўнік — Фёдар Аляксеевіч Мазоль. Хор складаюць 40 чалавек — механізатары, вадзіцелі, аператары жывёлагадоўчага комплексу, настаўнікі, спецыялісты.

Аснова рэпертуара — трох-, чатырохгалосыя творы рускіх, савецкіх кампазітараў, беларускія, украінскія, рускія народныя песні.

Калектыў вядзе вялікую канцэртную дзейнасць. Ён актыўны ўдзельнік масавых мерапрыемстваў: «Свята ўраджаю», свята вёскі «Мастацтва майго дому», канцэртных праграм, творчых сустрэч са шматлікімі дэлегацыямі, што наведваюць перадавую гаспадарку СКП «Астрамечава».

За высокае выканаўчае майстэрства ў 1987 г. мужчынскі хор атрымаў званне «Народны самадзейны калектыў».

Аркестр народных інструментаў выкладчыкаў музычных школ Брэсцкага раёна

Утвораны ў 1989 г. Заснавальнік аркестра — Сяргей Фёдаравіч Любчук, заслужаны работнік культуры БССР.

У аркестры ўдзельнічаюць 34 выкладчыкі. Аснова рэпертуару — творы класікаў рускай і замежнай музыкі, беларускія народныя песні ў апрацоўцы і аркестроўцы кіраўніка аркестра.

За высокае выканаўчае майстэрства, разнастайную канцэртную дзейнасць аркестр атрымаў званне «Народны самадзейны калектыў» (у 1990 г.).

Ансамбль танца «Местачковыя казыры»

Утвораны ў 1991 г. Нягледзячы на сваю маладосць, паспеў набыць папулярнасць у гледачоў. Калектыў часта выступае перад працаўнікамі гарадоў і вёсак Брэсцкай вобласці, удзельнічае ў раённых і абласных аглядах-конкурсах.

Заснавальнікі і кіраўнікі ансамбля — Міхаіл Арцёмавіч і Ала Уладзіміраўна Сегер, выпускнікі харэаграфічнага аддзялення Мінскага інстытута культуры.

У 1994 г. ансамбль атрымаў званне «Узорны самадзейны калектыў». У 1997 г. стаў дыпламантам Міжнароднага фестывалю рэгіянальнага танца «Палескі карагод».

Музычныя школы

У раёне працуюць 3 дзіцячыя музычныя школы (п. Дамачава, вёскі Чэрні, Чарнаўчыцы) і 3 школы мастацтваў (вёскі Тэльмы, Матыкалы, Астрамечава). Старэйшая з іх, Дамачаўская, існуе 25 гадоў. Самая маладая, Тэльмінская, адкрылася ў 1992 г.

510 дзяцей навучаюцца іграць на розных інструментах: на фартэпіяна, скрыпцы, баяне, акардэоне, гітары, ударных, духавых.

Р.А.Свістун.

Грамадскія музеі раёна

Музей касманаўтыкі ў в. Тамашоўка, пры мясцовай сярэдняй школе. Плошча 246 м². Адкрыты ў лістападзе 1978 г. Колькасць экспанатаў — 2623. Музей шырока асвятляе жыццё і дзейнасць лётчыка-касманаўта П.І.Клімука.

Літаратурны музей у г.п. Дамачава, на базе сярэдняй школы. Плошча 54 м². 610 экспанатаў. Адкрыты ў 1989 г.

Музей баявой славы ў г.п. Дамачава, у памяшканні сярэдняй школы, плошча 54 м². Адкрыты ў маі 1985 г. 470 экспанатаў. Адлюстроўвае мужнасць і гераізм савецкіх людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, паказвае ўдзел у ёй сваіх землякоў.

Музей народнай славы і этнаграфіі ў в. Медна. У асобным будынку плошчай 52 м². Адкрыты ў 1988 г. 890 экспанатаў. Кіраўнік музея — вялікі энтузіяст, краязнаўца, настаўнік школы Пётр Данілавіч Карабейка.

Музей баявой і працоўнай славы ў п. Мухавец, у памяшканні сярэдняй школы. Плошча 56 м². Адкрыты 8 мая 1975 г. 2700 экспанатаў. Кіраўнік музея — настаўніца мясцовай школы, старшыня клуба «Подзвіг» Таццяна Васільеўна Басацкая.

Музей народнай славы ў в. Вялікія Радванічы, у памяшканні сярэдняй школы, плошча 55 м². Адкрыты ў маі 1988 г. 580 экспанатаў. Шырока адлюстроўвае рэвалюцыйны рух сярод мясцовых жыхароў у гады польскай акупацыі.

Музей баявой і працоўнай славы ў в. Чарнаўчыцы, у будынку сярэдняй школы. Адкрыты 8 мая 1985 г. 470 экспанатаў. Галоўным чынам адлюстроўвае гераізм мясцовых жыхароў у барацьбе з нямецкімі захопнікамі.

Н.Д.Рыбалка.

З гісторыі населеных пунктаў

АГАРОДНІКІ, вёска ў Лышчыцкім сельсавеце, у складзе СГП «Астрамечава».

Назва вёскі паходзіць ад імя сацыяльнай групы збяднелых сялян, якая склалася ў XVI ст. Агароднікі ў тыя часы атрымлівалі вельмі дробныя надзелы зямлі і былі прыпісаны да работ у маёнтку пана. У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Ставы, прыватная ўласнасць графіні Красінай; 114 мужчын, 120 жанчын. У 1886 г. уладанне на р. Буг у Воўчынскай воласці; 81 двор, 526 жыхароў, піцейны дом. У 1890 г. сяляне ўваходзілі ў склад Астрамечаўскага сельскагаспадарчага таварыства, якому належалі 363 дзесяціны зямлі. У вёсцы была праваслаўная царква на могілках; працавала школа граматы. У 1905 г. вёска (180 жыхароў) у Лышчыцкай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні. У 1941 г. — 28 двароў, 117 жыхароў. У вайну вывезены ў Германію 3 чалавекі, вярнуліся 2, загінулі на фронце 4.

У 1997 г. — 14 двароў, 20 жыхароў.

АДАМКОВА, былая вёска. З 1958 г. у межах Брэста (у Ленінскім р-не горада з 1978 г).

На пачатку XX ст. маёнтак у Косіцкай воласці Брэсцкага павета (58 жыхароў), у 1930-я гады, 1940—1958 гг. вёска ў складзе Рэчыцкага сельсавета Брэсцкага раёна.

АЛЬХА, вёска ў Знаменскім сельсавеце. У 1997 г. — 15 двароў, 25 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

Ва ўрочышчы Альха ўстаноўлены абеліск з надпісам: «Тут, 22 чэрвеня 1941 г. пры абароне Дзяржаўнай граніцы СССР, па-геройску змагаліся і загінулі: сяржант



Помнікі гісторыі і культуры Брэсцкага раёна.

Калмазан Г.І. (трэба — Каламазан), яфрэйтар Мурзугаліеў Ш.М. (трэ-ба — Мурзагаліеў), радавы Сярдзітаў Ф.І., Кочнеў К.К., Губар Ф.І., Шостак І.П., Малькоў А.П., Ягораў М.Е., Аляксееў П.В. (трэба — В.В.), Нікалаеў П.Н., Сомаў А.Ф., Рашаеў А.Е. (трэба — Ражэў), Емяльянаў С.І., Пахомаў Г.Ф., Гусеў М.І., Падгайнаў Ф.А.» (14-я пагранзастава).

АРКАДЗІЯ, вёска ў Гершонскім сельсавеце, у складзе калгаса «Прыбужжа».

У 1868 г. вёска ў складзе казённага маёнтка Пажэжыл; 29 мужчын, 32 жанчыны. У 1890 г. сялянам Аркадзійскага таварыства, у якое ўваходзілі вёскі Дубінікі, Аркадзія, належала 283,3 дзесяціны зямлі. У 1905 г. вёска (270 жыхароў) у Камянец-Жыровіцкай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 69 двароў, 356 жыхароў. У час вайны спалена 8 двароў, забіта 10 мірных жыхароў, 8 загінулі на фронце.

У 1950 г. арганізаваны калгас імя Малянкова. Аб'яднаў 40 гаспадарак, затым увайшоў у склад саўгаса «Прыбужжа», а ў 1992 г. ператвораны ў калгас «Прыбужжа».

У 1997 г. — 228 двароў, 681 жыхар.

Помнікі гісторыі і культуры

КРАПАСНЫ ФОРТ № 5. За 2 км на паўднёвы захад ад вёскі. Пабудаваны ў 1878—1888 гг. Узор буйной фартыфікацыйнай пабудовы, які адлюстроўвае характар і маштабы крапаснога будаўніцтва XIX ст.

АФАНАСЬЕЎСКАЯ КАПЛІЦА. У цэнтры вёскі, на месцы гібелі Афанасія Філіповіча. Узведзена на мяжы XIX—XX ст. з хваёвага бруса на мураваным цокалі. Рашэннем Брэсцкага аблвыканкома перададзена Рускай Праваслаўнай Царкве, адноўлена ў 1988 г. прыхаджанамі. У 1997 г. тут заснаваны праваслаўны мужчынскі манастыр.

Капліца — помнік народнага драўлянага дойлідства.

АСТРАМЕЧАВА, вёска ў прыгараднай зоне, за 24 км на паўночны захад ад Брэста, за 7 км ад чыгуначнай станцыі Лышчыцы.

Паводле легенды, тутэйшая мясцовасць была глухая, нешматлюдная. Толькі каля рэчкі ўзвышаўся велічны касцёл, які наведваў польскі кароль. Насупраць знаходзіліся тры курганы. Людзі гаварылі, што ў гэтых курганах закапаны каштоўнасці, але колькі іх не шукалі, так нічога істотнага не знайшлі. Назва вёскі пайшла ад прозвішча Астрамеч, якое меў каралеўскі кухар, ён вельмі смачна гатаваў ежу. Кароль яго шанаваў і ганарыўся ім. З часам кухар састарэў і кароль адпусціў яго на адпачынак, а замест яго пакінуў кухарыць яго сына. Застаўся Астрамеч з дачкой. Аднойчы яму не спалася, і ён вырашыў прагуляцца па начным парку. Зайшоў Астрамеч у самы далёкі куток, толькі сеў на пень, як пачуў цікавую размову, размаўлялі 4 чалавекі. Ён толькі пачуў, што калі яны стануць уладальнікамі гэтых каштоўнасцей, то будуць вельмі багатыя. Праз тыдзень яны дамовіліся ісці да кургану, схавалі паперу (гэта быў план) у дупле і зніклі. Астрамеч украў гэтую паперу і ўцёк. Назаўтра ён прыйшоў да караля і стаў прасіць, каб яго пасялілі ў мясцовасці, што была на плане. Кароль згадзіўся пасяліць свайго любімага слугу на гэтым месцы. Пасяліўся Астрамеч са сваёй дачкой у закінутай старой хаце. Днём дачка заставалася дома, а Астрамеч кудысьці знікаў. Хутка ён стаў прыносіць многа золата. Адбудаваўся, жывёлы многа з'явілася ў яго. Адным словам, разбагацеў, не стаў спраўляцца з гаспадаркай і наняў 4 парабкаў (гэта былі тыя бандыты, што былі ў парку). Аднойчы ноччу парабкі ўварваліся да старога і сталі пытаць у яго, дзе скарб. Але Астрамеч спалохаўся і нічога не сказаў. Тады бандыты забілі яго, а дачку згвалцілі і павесілі. Спалілі і знішчылі ўсё, толькі чуткі аб гэтай гісторыі і засталіся. Адсюль пайшло Астрамечава.

У 1570 г. маёнтак Астрамеч у Берасцейскім старостве належаў двум зямянам Харытам. У 1860 г. сяло — цэнтр маёнтка, які належаў памешчыку Пузыну; 86 мужчын, 90 жанчын. У 1886 г. у Дамачаўскай воласці; 29 двароў, 348 жыхароў. Працавала царкоўнапрыходская школа, меўся піцейны дом.

У 1941 г. — 155 двароў, 776 жыхароў. За час вайны знішчана 12 двароў, вывезена ў Германію 14 чалавек, 13 вярнуліся. 10 чалавек загінулі на фронце, 4 — у партызанах.

Калгас «Памяць Ільіча», арганізаваны 10 лютага 1949 г., аб'яднаў 75 гаспадарак і 109 чалавек, 58 коней і 780 га зямлі. У 1992 г. на яго базе ўтворана кааператыўнае прадпрыемства «Астрамечава».

Сярэдняя школа, Дом культуры, Астрамечаўская народная бібліятэка, камбінат бытавога абслугоўвання, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, сталовая, прамтаварны і прадуктовы магазіны, кансервавы завод, звераферма.

У 1997 г. — 570 двароў, 1904 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На

заходняй ускраіне вёскі. Брацкая магіла воінаў, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вёсак Кашылава, Малыя Сухарэвічы, Астрамечава, Рудавец Лышчыцкага сельсавета. На магіле ўстаноўлена пліта з імёнамі загінуўшых. За магілай насыпаны курган вышынёй 1,8 м. У 1986 г. на кургане пастаўлена стэла, аздобленая белым гранітам, якая ўвекавечвае памяць землякоў (61 чалавек) з вёсак Уладычыцы, Кашылава, Астрамечава, Рудавец, Цюпрыкі, што загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Іх імёны высечаны на мармуровай дошцы ў падножжы стэлы.

МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1846 г. з цэглы і бутавага каменю. Абнесена мураванай агароджай.

Царква — помнік архітэктуры з мясцовай трактоўкай элементаў класіцызму.

КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК, х. Гуркі. Датуецца XI—XIII ст. Належаў дрыгавічам. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН РБ і ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

БЕРДЫЧЫ, вёска ў Чэрнінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1566 г. сяло ў Збіражскім войтаўстве Берасцейскага староства. Жыхары мелі 13 валок зямлі, 5 валок часткова пуставала. Сяляне плацілі чынш — з адной валокі 31 грош. Яны павінны былі апрацоўваць панскую ворную зямлю: з кожнай валокі 2 дні ў тыдзень і 4 дні летам. Апрача гэтага, сяляне плацілі натуральную даніну. У 1818 г. уласнасць казённага маёнтка Цюхінічы; 68 мужчын, 82 жанчыны. У 1890 г. вёскай валодаў Піліп Чыжоўскі, які меў 19,5 дзесяціны зямлі, сяляне Бердыцкага таварыства мелі 413,3 дзесяціны зямлі. У 1905 г. вёска (298 жыхароў) і маёнтак (12 жыхароў) у Косіцкай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 318 жыхароў, 58 двароў. 17 двароў знішчылі гітлераўцы. 32 мірныя жыхары загінулі ад рук акупантаў. З чалавекі загінулі на фронце, 1 — у партызанах.

У 1997 г. — 34 двары, 59 жыхароў.

БЛЮВІНІЧЫ, вёска ў Чарнаўчыцкім сельсавеце.

Назва вёскі паходзіць ад прозвішча Блювініг. У XV ст. кароль Казімір падараваў Блювінічы Лявону Шаломічу. У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Дзем'янічыцы, якім валодаў Баяроўскі; 79 мужчын, 93 жанчыны. У 1890 г. сяляне ўваходзілі ў Блювініцкае сельскагаспадарчае таварыства, якое мела 242 дзесяціны зямлі. У 1905 г. вёска (391 жыхар) у Турнянскай воласці.

У 1941 г. — 66 двароў, 280 жыхароў. Двух чалавек вывезлі ў Германію, яны не вярнуліся, 4 загінулі ў партызанах і 4 — на фронце.

У сакавіку 1949 г. арганізаваны калгас імя Лысенкі. Аб'яднаў 27 з 50 гаспадарак. Меў 210 га раллі і 110 га сенакосу, 25 коней. У 1960-я гады ўвайшоў як падраздзяленне ў калгас «Іскра». Месца былых распрацовак торфу, дзейнічаў торфазавод да 1970-х гадоў.

У 1997 г. — 56 двароў, 109 жыхароў.

БУЛЬКОВА, вёска ў Тэльмінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Брэсцкі». Прыгарадная зона адпачынку за 20 км на ўсход ад Брэста, на берагах рэк Мухавец і Асіпоўка. Плошча больш за 1,2 тыс. га. Адначасова могуць адпачываць да 5 тыс. чалавек. На тэрыторыі зоны аздараўленчыя лагеры, база адпачынку, участкі садовага таварыства.

У вёсцы пасля вайны — 28 двароў, 85 жыхароў. Загінулі на фронце і ў партызанах 13 чалавек.

У 1997 г. — 23 двары, 30 жыхароў.

БЯРОЗАЎКА, былая вёска. З 1968 г. у межах Брэста (у Ленінскім р-не горада з 1978 г.).

На пачатку XX ст. вёска ў Косіцкай воласці Брэсцкага павета; 46 двароў, 306 жыхароў. З 1940 г. цэнтр Бярозаўскага сельсавета і калгаса імя М.Горкага, у 1954—1968 гг. у Трышынскім сельсавеце Брэсцкага раёна.

БЯРОЗАЎКА 1-я, былая вёска, з 1958 г. у межах Брэста (у Маскоўскім р-не горада з 1978 г.). Уваходзіла ў склад Бярозаўскага, у 1954—1958 гг. Трышынскага сельсаветаў Брэсцкага раёна.

БЯРОЗАЎКА 2-я, былая вёска. З 1958 г. у межах Брэста (у Ленінскім р-не горада з 1978 г.). На пачатку XX ст. маёнтак у Косіцкай воласці Брэсцкага павета (50 жыхароў), пазней вёска, з 1940 г. у Бярозаўскім, у 1954—1958 гг. у Трышынскім сельсаветах Брэсцкага раёна.

ВАЛЫНКА, былы прыгарад Брэста, з

XIX ст. у межах Брэста. Узнікла да XIII ст. за 2,5 км на паўднёвы ўсход ад Брэста (Бярэсця) на гандлёвым шляху на Валынь (адсюль і назва) як рамесна-гандлёвае паселішча, якое пазней прыйшло ў заняпад, затым сельскае паселішча, жыхары якога займаліся земляробствам.

ВАЎКІ, вёска ў Мухавецкім сельсавеце, у складзе саўгаса «Мухавец».

У 1868 г. вёска ў Радваніцкай воласці ў складзе Ведамскай дзяржаўнай маёмасці; 62 мужчыны, 75 жанчын. У 1890 г. сяляне вёскі ў Падлесным сельскагаспадарчым таварыстве, мелі 1323 дзесяціны ворнай зямлі. У 1905 г. вёска (65 жыхароў) у Радваніцкай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 35 двароў, 152 жыхары. 27 двароў знішчылі немцы ў час вайны, 8 мірных жыхароў забіты, 2 чалавекі загінулі на фронце.

У 1997 г. — 18 двароў, 22 жыхары.

ВЕЛЬЯМОВІЧЫ, вёска ў Матыкальскім сельсавеце, у складзе калгаса імя У.І.Леніна.

У 1868 г. сяло, дзяржаўная ўласнасць; 85 мужчын, 92 жанчыны. У 1869 г. на сродкі дзяржавы, прадастаўленыя галоўным начальнікам краю графам М.М.Мураў'ёвым, была пабудавана каменная царква са званіцай. Ён жа падараваў царкве Ушэсця напрастольны сярэбрана-пазалочаны крыж з надпісам 1863—1864 гг. Прыхаджан налічвалася 1183 чалавекі з 6 вёсак. Працавала царкоўнапрыходская школа. У 1886 г. былое ўладанне на р. Буг, у Воўчынскай воласці; 29 двароў, 287 жыхароў, 2 праваслаўныя царквы, піцейны дом. У 1890 г. уладальнікам быў памешчык Вікенцій Добрынскі, які меў 93 дзесяціны зямлі, 40 дзесяцін зямлі належала царкве. У 1905 г. сяло (546 жыхароў) і маёнтак (6 жыхароў) у Воўчынскай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 86 двароў, 433 жыхары. Знішчана немцамі 18 двароў. Забіта 8 мірных жыхароў, 7 вывезены ў Германію, 4 вярнуліся дадому, 19 загінулі на фронце.

У жніўні 1949 г. арганізаваны калгас імя Гастэлы, у які ўступілі 48 гаспадарак са 107.

Сярэдняя школа (1863), бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт (1946), клуб.

У 1997 г. — 185 двароў, 550 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛЫ ВОІНАЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. На сельскіх могілках. Магілы воінаў, што загінулі ў 1944 г. у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На адной з іх надпіс: «Сяржант Ушакоў А.М. 1922 г.н. Загінуў 30.7.1944».

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На ўсходняй ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці яе жыхароў (51 чалавек), што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1968 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

ЦАРКВА УШЭСЦЯ. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1899 г. з цэглы. Прамавугольная, з напаўцыркульнай апсідай з усходу і трапезнай і трох'яруснай званіцай з захаду. Званіца мае васьмігранны шацёр з макаўкай. Царква — помнік архітэктуры руска-візантыйскага стылю.

ВІСТЫЧЫ, вёска ў Чарнаўчыцкім сельсавеце.

Сяльцо Вістычы ў XVI ст. у Берасцейскім старостве належала магнату беларускага паходжання маршалку літоўскаму і старосту брэсцкаму Юрыю Іванавічу Ілінічу. У 1678 г. быў пабудаваны з цэглы касцёл, вядомы як касцёл цыстэрцыянцаў. У пачатку XIX ст. вёска належала памешчыку Шаміёту. У час Айчыннай вайны 1812 г., у верасні пры пераправе цераз р. Лясная каля вёсак Вістычы, Клейнікі, Церабунь, адбылася буйная бітва французаў з рускімі, у выніку якой загінулі 2000 французаў і 1000 рускіх салдат. Вёска ў час бітвы згарэла з усёй маёмасцю. Французы, пазбягаючы праследавання, знялі мост, тады рускія войскі выкарысталі пантонныя масты, перайшлі р. Лясная і пагналі ворага на Беласточчыну.

У 1834 г. касцёл быў перабудаваны ў каменную Крыжаўзвіжанскую праваслаўную царкву, з драўлянай званіцай. Медны звон важыў больш за 5 пудоў і быў датаваны 1692 г. Царкву наведвалі 3888 жыхароў з 14 навакольных вёсак, ёй належала 126 дзесяцін зямлі. У 1849 г. Вістычы — уладанне графа Грабоўскага, у маёнтку была плаціна і 8 мастоў. У 1863 г. ветраны, вадзяны млыны, карчма. Маёнткам Вістычы валодаў Павел Ягмін. За ўдзел у паўстанні 1863 г. паводле царскага загаду Павел Ягмін абавязаны быў прадаць сёмую частку свайго маёнтка і

быць высланы з Заходняга краю. У 1889—1890 гг. у вёсцы працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 61 хлопчык і 3 дзяўчынкі. У 1890 г. маёнткам валодаў Станіслаў Ягмін, які меў 383 дзесяціны зямлі. Дзейнічала народнае вучылішча. У 1905 г. маёнтак Вістычы ў Матыкальскай воласці; 74 жыхары.

У 1941 г. — 5 двароў, 37 жыхароў. У гады вайны загінулі на фронце 5 чалавек. Цэнтр саўгаса «Рассвет» (1969), базавая школа, сельская бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

У 1997 г. — 170 двароў, 605 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

КРЫЖАЎЗВІЖАНСКАЯ ЦАРКВА, У цэнтры вёскі, каля дарогі Чарнаўчыцы—Вялікія Матыкалы. Помнік архітэктуры барока.

ВІТОШКІ, вёска ў Чэрнінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Вітошкі, які належаў памешчыку Гадлеўскаму; 34 мужчыны, 42 жанчыны. У 1890 г. сяляне ўваходзілі ў Залескае сельскагаспадарчае таварыства, якое мела 81 дзесяціну зямлі. Уладальнік маёнтка — Уладзіслаў Анцуга, 105 дзесяцін зямлі. У 1905 г. вёска (191 жыхар) у Збіражскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 8 двароў, 41 жыхар.

У 1997 г. — 2 двары, 4 жыхары.

ВУЛЬКА-ПАДГАРОДСКАЯ, былая вёска. З 1968 г. у межах Брэста (у Маскоўскім р-не горада з 1978 г.).

На пачатку XX ст. вёска ў складзе Камянец-Жыровіцкай воласці Брэсцкага павета, 327 жыхароў. З 1940 г. у Пугачоўскім, у 1954—1969 гг. у Гершонскім сельсаветах Брэсцкага раёна. У студзені 1950 г. утвораны калгас імя Н.К.Крупскай. Са 100 гаспадарак вёскі ў яго ўвайшлі 42, а ў чэрвені 1951 г. калектывізацыя дасягнула 100%.

ВЫЧУЛКІ, вёска ў прыгараднай зоне Брэста, на правым беразе р. Мухавец, за 8 км ад Брэста, 1,5 км ад шашы Брэст—Мінск, 5 км ад чыгуначнай станцыі Кошалева, у Тэльмінскім сельсавеце.

У 1510 г. земянное сяло на р. Мухавец у Берасцейскім старостве. Кароль Жыгімонт замацаваў яго за панам Л.Храбтовічам, магнатам беларускага паходжання. У 1868 г. сяло ў Косіцкай воласці, у маёнтку Трышын, якім валодаў Гутоўскі; 38 мужчын, 50 жанчын. У 1890 г. Вычулкаўскае таварыства, якое аб'ядноўвала сялян вёсак Косічы, Вычулкі, Задворцы, мела 4514 дзесяцін зямлі. У 1905 г. вёска (220 жыхароў) у Косіцкай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 52 двары, 182 жыхары.

У 1997 г. — 334 двары, 996 жыхароў.

Пачатковая школа, сельская бібліятэка; будуецца Свята-Георгіеўская каменная царква. Участак Брэсцкага рачнога порта, дырэкцыя будоўлі аўтадарог, абласное аб'яднанне «Зааветзабесп», дарожна-будаўнічае ўпраўленне № 138, саўгас цяплічны камбінат «Бярэсце», аблсельгасэнерга.

У 1967 г. каля школы пастаўлены абеліск з надпісам, які ўшаноўвае памяць землякоў, загінуўшых у вайну.

ВЯЛІКІЯ КОСІЧЫ, вёска ў Чэрнінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Трышын, уладальнікам якога быў Гутоўскі; 47 мужчын, 58 жанчын. У 1882 г. жыхары Вялікіх Косіч і навакольных вёсак сумесна са свяшчэннікамі Качалоўскім і Савіцкім пабудавалі праваслаўную драўляную царкву са званіцай. Званіца мела 2 званы «Року Божія 1683». Прыхаджан было 1487 чалавек з 9 вёсак. У 1886 г. сяло, 13 двароў, 147 жыхароў, валасная ўправа (з 1890 г. знаходзілася ў в. Чэрні), праваслаўная царква, піцейны дом.

Працавала царкоўнапрыходская школа, у якой вучыліся 69 хлопчыкаў і 8 дзяўчынак. У 1905 г. сяло (214 жыхароў) — цэнтр Косіцкай воласці. У сяле быў валасны сельскі фельчар, размяшчаліся ўчасткі: судовых следчых, міравых пасрэднікаў, судова-міравой акругі. Адзін раз у год працаваў прызыўны ўчастак па воінскай павіннасці. У воласці было 16 сельскагаспадарчых таварыстваў і сельскагаспадарчых абшчын, яна аб'ядноўвала 27 вёсак, у якіх было 395 двароў, 2161 мужчына, 2159 жанчын.

У 1941 г. — 29 двароў, 168 жыхароў. У студзені 1950 г. арганізаваны калгас імя Фрунзе. З 42 гаспадарак у яго ўступілі 32. З 1969 г. увайшоў у склад саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1997 г.— 46 двароў, 96 жыхароў.

ВЯЛІКІЯ МАТЫКАЛЫ, вёска ў пры-

гараднай зоне Брэста, за 18 км ад яго, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Матыкалы, на шашы Брэст—Высокае. Цэнтр сельсавета і калгаса імя Леніна.

У 1566 г. Матыкалы — уласнасць зямян Афанаса і Мацвея Бекцішаў у Камянецкім павеце Берасцейскага староства. У 1672 г. гміна —уласнасць Марціна Матусевіча. У 1788 г. дзейнічала паштовая станцыя паміж Высокім і Брэстам. У 1861 г. у вёсцы адбыліся сялянскія хваляванні. Сяляне адмовіліся выконваць інвентарныя павіннасці, для ўстанаўлення парадку былі выкарыстаны салдаты. У 1866 г. у вёсцы 84 мужчыны, 97 жанчын, маёнткам Матыкалы валодаў Уладкаў. У 1869 г. на сродкі ўрада і жыхароў навакольных вёсак пабудавана каменная царква са званіцай. У 1886 г. сяло, 22 двары, 214 жыхароў, валасная ўправа, царкоўнапрыходская школа, карчма; у маёнтку Матыкалы — цагельны завод, ветраны млын, піцейны дом. У 1889 г. працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 53 хлопчыкі. У 1905 г. сяло, у якім жыло 368 жыхароў, у маёнтку 42 жыхары, цэнтр Матыкальскай воласці, знаходзілася за 14 вёрст ад Брэста. У Вялікіх Матыкалах размяшчаліся ўчасткі: судовых следчых, міравых пасрэднікаў, судова-міравой акругі, валаснога сельскага фельчара. У сяле працавалі паштовае аддзяленне, прызыўны ўчастак на вайсковую службу.

У склад Матыкальскай воласці ўваходзілі вёскі: Вялікія і Малыя Матыкалы, Малыя Косічы, маёнтак Вульня, Костычы, Курміца Вялікая, Неплі, Нехалсты, Смуга, Ставішча, Старое Сяло, Сухарэвічы Вялікія, Шулякі.

У 1941 г. — 52 двары, 154 жыхары.

У вёсцы сярэдняя школа, Дом культуры, цэнтральная раённая бібліятэка, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання, дзіцячы садок-яслі, аддзяленне сувязі, клуб, музычная школа, амбулаторыя, спажывецкае таварыства, прамтаварныя і прадуктовыя магазіны. Помнік У.І.Леніну. Каля вёскі буйны саўгас-камбінат «Заходні».

У 1997 г. — 714 двароў, 2190 жыхароў.

ВЯЛІКІЯ РАДВАНІЧЫ, вёска на правым беразе р. Рыта. Цэнтр Радваніцкага сельсавета і калгаса «Расія». За 33 км на паўднёвы ўсход ад Брэста, 15 км ад чыгуначнай станцыі Пажэжын.

Назва вёскі паходзіць, напэўна, ад слова рыдван, што азначае: вялікая дарожная карэта.

У 1510 г. кароль Жыгімонт зацвердзіў Радванічы Царкоўныя на р. Рыць за Берасцейскім дваранінам Андрэем Лозкам. У 1600 г. была пабудавана праваслаўная царква, прыхаджанамі якой былі жыхары вёсак Зарэчча, Міхалін, Франопаль, Антонаў, усяго 2835 чалавек. У 1868 г. у Радванічах Царкоўных было 193 мужчыны, 293 жанчыны. У 1886 г. сяло, 54 двары, 634 жыхары, валасная ўправа, праваслаўная царква, піцейны дом, за 3 вярсты лясная кантора Каблунь. У 1890 г. уладальнікамі маёнтка Радванічы Царкоўныя былі Іван Песціч, Катарскі, Уладзімір Тур. У 1889 г. працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 67 хлопчыкаў, 3 дзяўчынкі. У 1905 г. 324 жыхары. Сяло Радванічы Царкоўныя — цэнтр Радваніцкай воласці за 25 вёрстаў ад Брэста. У сяле знаходзіўся валасны сельскі фельчар, былі размешчаны ўчасткі паліцэйскіх ураднікаў, міравых пасрэднікаў, судова-міравой акругі, судовых следчых, адзін раз у год працаваў прызыўны ўчастак па воінскай павіннасці. У воласць уваходзілі вёскі Літвіны, маёнтак Франопаль, Кашылава, Міхалін, Ваўкі, Радванічы Зарэчныя.

У 1941 г. — 220 двароў, 937 жыхароў. У час вайны знішчана 97 двароў, забіты 34 мірныя жыхары. Загінулі на фронце 38 чалавек.

Сярэдняя школа (1963), дзіцячы садок, амбулаторыя, бібліятэка, аддзяленне сувязі (1953), магазіны прамысловых і харчовых тавараў.

У 1997 г. — 205 двароў, 537 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. У цэнтры вёскі. Пахаваны 16 воінаў і 5 партызан-разведчыкаў атрада імя М.М.Чарнака партызанскай брыгады імя І.В.Сталіна, што загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На могілках. Пахаваны 35 савецкіх грамадзян, закатаваных нямецка-фашысцкімі акупантамі ў кастрычніку 1943 г. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На

могілках. Пахавана сям'я Кузміцкіх (6 чалавек), расстраляная нямецка-фашысцкімі захопнікамі 7.10.1942 г. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ВЯЛЮНЬ, вёска ў Чэрнінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1868 г. вёска, цэнтр маёнтка Вялюнь, якім валодаў Ягмін; 90 мужчын, 74 жанчыны. У 1890 г. сяляне Вялюнскага таварыства мелі 246 дзесяцін зямлі. Уладальніца маёнтка — Юзэфа Ягмін, 358 дзесяцін зямлі. У 1905 г. вёска (309 жыхароў) у Збіражскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 61 двор, 360 жыхароў. 6 жыхароў загінулі на фронце.

У сакавіку 1949 г. арганізаваны калгас імя Суворава. Уступілі 52 з 70 гаспадарак, аб'ядналі 300 га раллі і 65 га сенакосу, а таксама 33 кані.

У 1997 г. — 54 двары, 104 жыхары.

Радзіма Героя Савецкага Саюза Маісеева Івана Цімафеевіча (16.8.1910 — 12.2.1976).

ГЕРШОНЫ, вёска ў прыгараднай зоне Брэста, за 6 км ад горада, 2 км ад чыгуначнай станцыі Бернады, за 0,5 км ад шашы Брэст—Тамашоўка. Цэнтр Гершонскага сельсавета і калгаса «Прыбужжа».

Назва вёскі паходзіць ад прозвішча нямецкага паходжання, што азначае: глава, пан, уладар. У 1672 г., паводле прывілея польскага караля Яна Казіміра, была пабудавана праваслаўная царква. Ёй былі выдзелены 2 валокі зямлі з Брэсцкай эканоміі і фальварак у канцы сяла. У 1839 г. быў пабудаваны лесапільны завод, на якім працавала 49 рабочых. У 1868 г. вёска маёнтка Плянта ў Камянец-Жыровіцкай воласці, уладальніцай якога была памешчыца Паніхвіцкая; 63 мужчыны, 60 жанчын. У гэтым жа годзе на сродкі прыхаджан і дапамогу з асігнавання генерал-губернатара М.М.Мураўёва была пабудавана каменная праваслаўная царква са званіцай. Царкву наведвала 1811 прыхаджан з 9 вёсак. У 1878—1888 гг. каля вёсак быў пабудаваны крапасны форт № 5, каб удасканаліць умацаванне Брэсцкай крэпасці, адпаведна зменам, якія адбыліся ў ваеннай тэхніцы. У 1889 г. у вёсцы працавала школа граматы, народнае вучылішча, у якім вучыліся 71 хлопчык і 5 дзяўчынак. Размяшчалася кватэра паліцэйскіх ураднікаў. У 1905 г. вёска (253 жыхары) у Камянец-Жыровіцкай воласці.

У вёсцы сярэдняя школа, у якой у 1970—1980-я гады працаваў вучэбна-вопытны ўчастак. 21 вучань быў удзельнікам ВДНГ, 7 з іх атрымалі значок «Удзельнік ВДНГ». На базе ўчастка абаранілі кандыдацкія дысертацыі М.Б.Разумовіч, С.М.Навумаў, В.І.Палянскаў, М.С.Кавалевіч. Клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, амбулаторыя, прамтаварны і прадуктовы магазіны.

Калгас «Прыбужжа» аб'ядноўвае вёскі Аркадзія, Кацельня-Баярская, Бярнады, Міцькі, Прылукі і ўтвораны на базе аднайменнага саўгаса ў сакавіку 1992 г.

У 1969 г. — 112 двароў, 376 жыхароў.

Тут працуюць Брэсцкая перасовачная механізаваная калона.

У 1997 г. — 525 двароў, 1700 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА САВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ. За 0,5 км на поўдзень ад вёскі, каля чыгункі Брэст—Уладава. Тут пахаваны экіпаж самалёта (3 чалавекі), які загінуў у баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў маі 1944 г.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АДАМЧУКУ Аляксею Данілавічу. Вуліца Цэнтральная, 21. Устаноўлена ў 1967 г. на доме, дзе жыў савецкі патрыёт А.Д.Адамчук, якога закатавалі нямецка-фашысцкія акупанты ў лютым 1943 г.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АНДРАЮКУ Івану Мікалаевічу. Вуліца Цэнтральная, 46. Устаноўлена ў 1967 г. на доме, дзе жыў савецкі патрыёт І.М.Андраюк, закатаваны нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1943 г.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ГЛАВАЦКАМУ Кірылу Фёдаравічу. Вуліца Цэнтральная, 64. Устаноўлена ў 1968 г. на доме, дзе жыў працаўнік цагельні К.Ф.Главацкі, закатаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі восенню 1943 г.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА КЛАЧКО Кірылу Харытонавічу. Вуліца Цэнтральная, 50. Устаноўлена ў 1967 г. на доме, дзе жыў савецкі патрыёт, удзельнік антыфашысцкай барацьбы К.Х.Клачко, які працаваў у час вайны на лесапільні ў Брэсце. У сакавіку 1944 г. яго арыштавалі і закатавалі нямецка-фашысцкія захопнікі.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА СТРАЧУКАМ. Вуліца Цэнтральная, 52. Устаноўлена ў 1967 г. на доме, дзе жылі савецкія патрыёты Аляксей Васільевіч Страчук, яго жонка Хрысціна Паўлаўна і сын Уладзімір, што загінулі ў 1943 г. у фашысцкіх засценках.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. У 1985 г., каб увекавечыць памяць загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны землякоў з вёсак Аркадзія, Бярнады, Гершоны, Міцькі, быў насыпаны курган вышынёй 1,2 м, на ім пастаўлены абеліск, ніжэй — мемарыяльныя дошкі з імёнамі загінуўшых.

ЦАРКВА. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў другой палове XIX ст. з цэглы. Асноўны прамавугольны ў плане аб'ём накрыты чатырохскатным дахам з невялікім купалам. Да яго далучаюцца пяцігранная апсіда, а з другога боку — вузкая трапезная і двух'ярусная шатровая званіца з макаўкай.

Царква — помнік архітэктуры рускавізантыйскага стылю.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ПАГРАНІЧНІКАМ. На будынку школы. Устаноўлена ў 1968 г. на ўшанаванне памяці пагранічнікаў 11-й пагранзаставы, што размяшчалася тут да Вялікай Айчыннай вайны. 22 чэрвеня 1941 г. воіны-пагранічнікі праявілі мужнасць і гераізм у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

ГУЗНІ, былая вёска. З 1968 г. у межах Брэста (у Маскоўскім р-не горада з 1978 г.).

У XIX ст. у в. Гузні (Гузня) дзейнічалі лесапільня і цагельня. Заснаваная ў 1879 г. і абсталяваная ў 1884 г. паравой машынай лесапільня (22 рабочыя) вырабіла ў 1886 г. прадукцыі на 10 тыс. руб. Уваходзіла ў склад Косіцкай воласці Брэсцкага павета, налічвала 159 жыхароў (1905). У 1940—1968 гг. у складзе Трышынскага сельсавета Брэсцкага раёна.

ГУТА, вёска ў Дамачаўскім пасялковым Савеце, у складзе саўгаса «Дамачаўскі».

Гута — металургічная або шкловытворчасць (магчыма, ад германскага Hutte), узнік тэрмін у XIV—XVI ст. У 1860 г. вёска ў Прыбараўскай воласці, у складзе маёнтка Прыбарава, якім валодаў граф Замойскі. У ліпені 1862 г. адбыліся сялянскія хваляванні. Сяляне адмовіліся адбываць згонную павіннасць і плаціць чынш грашыма або хлебам. У 1866 г. было заснавана народнае вучылішча, у якім вучыліся 31 хлопчык і 4 дзяўчынкі. У 1868 г. 41 мужчына, 44 жанчыны. У 1890 г. сяляне Гуцкага сельскагаспадарчага таварыства мелі 183 дзесяціны зямлі. У 1905 г. вёска (282 жыхары) у Прыбараўскай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 58 двароў, 245 жыхароў. Фашысты спалілі 51 двор, забілі 9 мірных жыхароў, 4 вывезлі ў Германію, 2 вярнуліся. 12 чалавек загінулі на фронце, 2 — у партызанах.

У вёсцы клуб-бібліятэка. У 1997 г. — 56 двароў, 128 жыхароў.

ГУТОВІЧЫ, вёска ў Чэрнінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1868 г. вёска — дзяржаўная ўласнасць у Збіражскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні; 36 мужчын, 39 жанчын. У 1890 г. сяляне ўваходзілі ў Харытонаўскае сельскагаспадарчае таварыства, якое мела 92 дзесяціны зямлі. Працавала школа граматы. У 1905 г. — 180 жыхароў.

У 1941 г. — 33 двары, 165 жыхароў. Загінулі на фронце 4 чалавекі.

У 1997 г. — 13 двароў, 17 жыхароў.

ДАМАЧАВА, гарадскі пасёлак, цэнтр пасялковага Савета, саўгаса «Дамачаўскі».

У 1788 г. намаганнямі жыхароў мястэчка і навакольных вёсак пабудавана праваслаўная драўляная царква з капліцай. Царква мела 1815 прыхаджан з 4 вёсак.

У 1860 г. мястэчка Дамачава (1104 жыхары) — цэнтр Дамачаўскай воласці і маёнтка Дамачава, якім валодаў князь Вітгенштэйн. У чэрвені 1861 г. сяляне адмовіліся выконваць павіннасці. Міравы пасрэднік 1-га ўчастка сумесна са свяшчэннікам не змаглі пераканаць сялян. Для падаўлення сялянскага хвалявання была паслана ваенная каманда са 100 чалавек ніжніх воінскіх чыноў з афіцэрам і барабаншчыкам.

У 1886 г. — 683 жыхары, валасная ўправа, праваслаўная царква, яўрэйскі малітоўны дом. На працягу года адбываліся 2 кірмашы. Працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 63 хлопчыкі, дзейнічалі мяшчанская ўправа, паштовае аддзяленне. У 1890 г. уладальнікам маёнтка быў князь Пётр Вітгенштэйн. У склад маёнт-

ка ўваходзілі хутары Аляксандрава, Маслянкі, фальварак Чэрск. У 1905 г. у мястэчку — 1163 жыхары, чыгуначная станцыя «Дамачава» на лініі Брэст—Холм.

Дамачаўская воласць знаходзілася за 38 вёрстаў ад Брэста. У ёй працавалі ўчастак сельскага ўрача, лячэбніца, валасны фельчар, раз у год дзейнічаў прызыўны ўчастак па воінскай павіннасці. Тут размяшчаліся ўчасткі: судовых следчых, міравых пасрэднікаў, судова-міравой акругі, паліцэйскіх ураднікаў. У Дамачаўскую воласць уваходзілі вёскі: Багданы, Барысы, Дубіца, Кабёлка, Харсы, Ляплёўка, Чэрск, Рудня, Падлужжа, Шыкілі, Навасёлкі, Ліпінкі, Руда.

Са студзеня 1940 г. — цэнтр Дамачаўскага раёна, падзеленага на сельсаветы: Дубіцкі, Камароўскі, Ляплёўскі, Мяднянскі, Падлужскі, Прыбараўскі, Чэрскі. У складзе раёна быў г.п. Тамашоўка, ператвораны ў кастрычніку 1940 г. у рабочы пасёлак, а ў сакавіку 1954 г. ліквідаваны. У 1956 г. раён увайшоў у склад Брэсцкага раёна.

У 1941 г. — 530 двароў, 3950 жыхароў. 500 двароў і 3800 жыхароў знішчаны ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі (1941—1944).

Дамачава вызвалена ад фашыстаў 22.7.1944 г. воінамі 38-й гв. сд 96-га ск 70-й арміі*.

Сярэдняя школа (1979), вучэбна-вытворчы камбінат, гарпасялковая бальніца (1940), аддзяленне сувязі (1957), гарпасялковая бібліятэка, кааператыўнае вытворчае прадпрыемства «Хлебазавод», аптова-рознічнае гандлёвае прадпрыемства, дом для састарэлых і інвалідаў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. Вул. Камуністычная. Пахаваны пагранічнікі, воіны і партызаны, што загінулі ў чэрвені 1941 г. і ліпені 1944 г. у баях з фашыстамі. У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск і скульптура воіна з аўтаматам у руках.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На паўднёвай ускраіне пасёлка. Пахаваны 3800 жыхароў г.п. Дамачава і былога Дамачаўскага раёна, забітых фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

На былой заставе пастаўлен абеліск з надпісам: «Тут 22 чэрвеня 1941 г. па-геройску змагаліся воіны 16-й пагранічнай заставы. Палі смерцю храбрых сяржант Артамонаў і 16 невядомых пагранічнікаў».

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА НОВІКАВУ Аляксею Аляксандравічу. На будынку універмага. Устаноўлена ў 1983 г. Малодшы сяржант А.А.Новікаў загінуў 23 чэрвеня 1941 г. у баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

ПОМНІК ЛЕНІНУ Уладзіміру Ільічу. У скверы. Скульптура У.І.Леніна пастаўлена ў 1953 г.

ЦАРКВА СВЯТОГА ЛУКІ. У цэнтры пасёлка. Пабудавана ў 1905 г. з дрэва. Помнік неарускага стылю.

ДРУЖБА (СКОРБІЧЫ), вёска ў Чарнаўчыцкім сельсавеце, у складзе калгаса «Іскра».

Да 60-х гадоў XX ст. вёска называлася Скорбічы.

Легенда сведчыць, што ў вёсцы жыла вельмі лютая свякроў, якая не любіла сваю нявестку. Як ні старалася маладзіца дагадзіць сваёй свякрові, але дарэмна, той усё было не так. Яна зневажала і кляла нявестку. Маладзіца пакутавала, плакала, скардзілася свайму мужу, але той шкадаваў сваю маці і не мог абараніць жонку. А тут надышоў час ісці ў рэкруты. У пана быў дрэнны работнік, які быў злодзеем і гультаём. Пан вырашыў збавіцца ад лайдака і аддаць яго ў салдаты. З гэтай весткай прыйшлі вяскоўцы да лайдака, але той быў хітры. Ён ласкава сустрэў вяскоўцаў, прапанаваў ім пачастунак і гарэлку. Калі вяскоўцы добра ап'янелі, лайдак папрасіў замест яго паслаць каго-небудзь. Насыпаў ім поўную шапку залатых, а сам, не губляючы часу, пайшоў да сына той жанчыны і перадаў яму загад пана. Развітваючыся, жонка сказала, што цяпер свякроў яе загубіць, але муж яе супакоіў, як мог, і пайшоў служыць. Свякроў стала яшчэ больш лютаваць і зводзіць маладзіцу. Аднойчы не вытрымала маладзіца і сказала, што лепш бьщь бярозкай у чыстым полі, чым жыць у пакуце. Так і здарылася. Прайшоў нейкі час, сын вярнуўся з войска і спытаў маці, дзе яго жонка. Маці сказала, што ў чыстым полі стаіць самотная бярозка. «Ты ссячы яе і спытай, дзе твая жонка». Ён так і зрабіў. Раптам пачуў знаёмы голас: «Я ж твая жонка. Мне тут было добра, ніхто мяне не мучыў». Стаў бедалага гэтак гараваць-убівацца, што ператварыўся ў шэры камень, а з кораня бярозкі пачала біцца крынічка.

У 1860 г. вёска ў Мяднянскай воласці;

*У шэрагу выданняў памылкова ўказана, што Дамачава вызвалена 12-й гв. сд 61-й арміі.

119 мужчын, 127 жанчын. У 1890 г. сялане ў сельскагаспадарчым таварыстве, якое мела 449 дзесяцін зямлі. У 1905 г. — 484 жыхары.

У 1941 г. — 89 двароў, 278 жыхароў. Гітлераўцы знішчылі 5 двароў, забілі 16 мірных жыхароў. 21 чалавек загінуў на фронце.

У 1997 г. — 68 двароў, 147 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

АРХЕАЛАГІЧНЫ ПОМНІК IX—X ст. Селішча-1. За 0,2 км на поўнач ад вёскі, справа ад дарогі на в. Несвіло, уздоўж левага берага р. Лясная, перад мостам цераз безыменны ручай, на яго левым беразе. Селішча ўзворваецца. Даўжыня 150 м, шырыня 80 м. Раскопкі не праводзіліся.

Селішча-2. На поўнач ад Селішча-1, за мостам цераз ручай, справа ад дарогі на в. Несвіло. Даўжыня 140 м, шырыня 35—40 м. Адкрыла і даследавала ў 1966 г. І.П.Русанава. Выяўлены драўляныя, наземныя, злёгку паглыбленыя ў зямлю хаты, якія былі размешчаны групай на адлегласці 5—10 м адна ад адной. Знойдзены рэшткі ганчарных гаршкоў з моцна адагнутымі венчыкамі, упрыгожаныя лінейным і хвалістым арнаментам, жалезныя нажы і цвікі, крэсіва, шкляныя пацеркі.

Матэрыялы даследавання і знаходкі захоўваюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі і ў Інстытуце гісторыі НАН РБ.

ДУБІЦА, вёска ў Дамачаўскім пасялковым Савеце, у складзе саўгаса «Дамачаўскі», чыгуначная станцыя на лініі Брэст—Уладава.

У 1870 г. вёска ў Дамачаўскай воласці; 101 мужчына, 88 жанчын. У 1883 г. заснаваны лесапільны завод, у 1895 г. тут працаваў 21 рабочы, у 1884 г. уведзены паравы рухавік. У 1890 г. сялянам Дубіцкага сельскагаспадарчага таварыства належала 308 дзесяцін ворнай зямлі. У 1905 г. вёска (374 жыхары), паўстанак Дубіца (10 жыхароў) Брэсцкага павета Гродзенскай губерні.

У 1940 г. — цэнтр Дубіцкага, затым Ляплёўскага сельсаветаў (1954) Дамачаўскага раёна, які ў 1956 г. аднесены да Брэсцкага раёна.

У 1941 г. — 106 двароў, 420 жыхароў. 14 жыхароў забіты і 8 двароў спалены немцамі. 15 чалавек вывезены ў Германію, 10 вярнуліся дадому. 5 жыхароў загінулі на фронце.

У 1997 г. — 92 двары, 166 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

АБЕЛІСК з надпісам: «Тут 22 чэрвеня 1941 г. пры абароне граніцы СССР пагеройску змагаліся пагранічнікі 15-й пагранічнай заставы і гарнізон 4-й пагранкамендатуры».

ПОМНІК НОВІКАВУ Аляксею Аляксандравічу. Непадалёк ад чыгуначнай станцыі. А.А.Новікаў быў у нарадзе каля станцыі Дубіца. Ён разам з напарнікам устанавіў у дупле дуба кулямёт і пад агнём праціўніка трымаў пераправу на працягу дня і ночы; пры гэтым патапіў 3 варожыя лодкі, забіў каля 70 гітлераўцаў. У 1969 г. на месцы бою пастаўлена стэла.

ДУБОК, вёска ў Дамачаўскім пасялковым Савеце, у складзе саўгаса «Дамачаўскі».

Назва вёскі паходзіць ад назвы дрэва — дуб. У 1868 г. сяло ў Прыбараўскай воласці; 160 мужчын, 179 жанчын. У 1886 г. 25 двароў, 410 жыхароў, праваслаўная царква, царкоўнапрыходская школа, карчма. У 1890 г. сялянам Дубоцкага сельскагаспадарчага таварыства належала 632,3 дзесяціны ворнай зямлі. У народным вучылішчы вучылася 39 хлопчыкаў. У 1905 г. вёска (934 жыхары) і маёнтак (20 жыхароў) у Прыбараўскай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 149 двароў, 654 жыхары. Пад час вайны фашысты спалілі 23 хаты, забілі 57 жыхароў, 12 вывезлі ў Германію, 8 чалавек вярнуліся, 24 загінулі на фронце, 4 — у партызанах.

Пачатковая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, клуб-бібліятэка.

У 1997 г. — 128 двароў, 211 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

ІЛЬІНСКАЯ ЦАРКВА. На заходняй ускраіне вёскі. Пабудавана ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. з дрэва. Царква — помнік народнага дойлідства Беларускага Палесся.

ДУБРОЎКА, былая вёска. З 1979 г. у межах Брэста (у Ленінскім р-не горада).

На пачатку XX ст. уваходзіла ў склад Косіцкай воласці Брэсцкага павета, налічвала 67 жыхароў (1905). З 1940 г. у складзе Цюхініцкага, у 1959—1979 гг. Матыкальскага сельсаветаў Брэсцкага раёна.

На месцы вёскі вядзецца інтэнсіўнае будаўніцтва жылых дамоў і аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння, узведзены завод бытавой хіміі.

ЖЫРОВЕЦКАЯ КАМЯНІЦА (Камяніца-Жыровецкая, Камяніца-Жыравецкая), вёска ў прыгараднай зоне, за 12 км на паўднёвы ўсход ад Брэста, 7 км ад чыгуначнай станцыі Каменная, на шашы Брэст—Вялікія Радванічы, у Мухавецкім сельсавеце.

У 1510 г. польскі кароль Жыгімонт земянное сяло Жыровічы з Камяніцай зацвердзіў за магнатам Л.Храбтовічам. У 1838 г. чырванадворскім памешчыкам Выганаўскім пабудавана драўляная царква са званіцай. У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Камяніца; 60 мужчын, 62 жанчыны. У 1881 г. сяло, 16 двароў, 171 жыхар; валасная ўправа, царкоўнапрыходская школа, піцейны дом. Працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 57 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак. У 1890 г. маёнтак Камянец-Жыровіцкі (ён жа Чырвоны Двор) належаў Мікалаю Татарскаму. У 1898 г. у маёнтку працаваў цагельны завод (16 рабочых). У 1905 г. у сяле (325 жыхароў) быў валасны сельскі фельчар, размяшчаліся ўчасткі: паліцэйскіх ураднікаў, кватэра якіх знаходзілася ў Гершонах, судовых следчых, міравых пасрэднікаў, судова-міравой акругі, адзін раз у год працаваў прызыўны ўчастак. У Камянец-Жыровіцкую воласць уваходзілі вёскі: Аркадзія, Бярнады, Вулька-Застаўская, Дубрава, Забалацце, Захі, Кунахі, Падлессе, Плянта, Міткі, Плянта-Тамашоўская, Сямісосны. У воласці было 12 сельскагаспадарчых таварыстваў.

У 1941 г. — 52 двары, 333 жыхары. У гады вайны загінулі 7 жыхароў на фронце і 3 — у партызанах. У Вялікую Айчынную вайну ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі за вызваленне вёскі і навакольля загінулі 123 савецкія воіны і 2 партызаны.

У 1997 г. — 93 двары, 186 жыхароў.

Аддзяленне і цяпліца саўгаса «Мухавец». Базавая школа, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны 49 воінаў. У 1973 г. на магіле пастаўлены абеліск.

БРАЦКІЯ МАГІЛЫ САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны 74 воіны, сярод якіх — воіны 415-й стралковай дывізіі 61-й арміі, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1984 г. на магіле пастаўлены абеліск.

На гэтых жа могілках знаходзіцца брацкая магіла партызан, дзе пахаваны партызаны атрада імя М.М.Чарнака партызанскай брыгады імя І.В.Сталіна В.М.Шыбуня і Т.Е.Шчарбакова, расстраляныя ў сакавіку 1944 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На магіле пастаўлены ў 1966 г. абеліск.

ЗАКАЗАНКА, вёска ў Гершонскім сельсавеце, у складзе калгаса «Прыбужжа».

У 1941 г. — 22 двары, 100 жыхароў. 5 чалавек загінулі на фронце.

У 1997 г. — 13 двароў, 24 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

СТАЯНКА. За 2 км на поўнач ад вёскі, у даліне ракі Заходні Буг, на пясчаных пагорках, ва ўрочышчах Гарадзішча і Міжазер'е. Адкрыў і даследаваў у 1898 г. М.Ф.Беляшэўскі. Стаянка адносіцца да мезаліту, ранняга і позняга неаліту, ранняга і позняга бронзавага веку.

ЗАКІЙ, вёска ў Мухавецкім сельсавеце, у складзе саўгаса «Мухавец».

У 1870 г. вёска, уласнасць памешчыка Выганоўскага; 60 мужчын, 57 жанчын. У 1890 г. Закійскаму сельскагаспадарчаму таварыству належала 115 дзесяцін зямлі. У 1905 г. 263 жыхары, вёска ў Камянец-Жыровіцкай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 72 двары, 285 жыхароў. Фашысты спалілі 72 двары, забілі 6 мірных жыхароў. На фронце загінулі 7 чалавек, у партызанах — 5.

У жніўні 1949 г. арганізаваны калгас імя Варашылава. Уступіла 48 гаспадарак.

У 1997 г. — 21 двор, 43 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ. Помнік мірным жыхарам і сем'ям ваеннаслужачых, расстраляных немцамі ў 1942 г.

ЗАЛЕССЕ, вёска ў Чэрнінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Маладая гвардыя».

Вёска называецца адпаведна назве арыенціру, які характарызуе знаходжанне вёскі за лесам. У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Збірагі, прыватная ўласнасць

графа Грабоўскага; 33 мужчыны, 39 жанчын. У 1886 г. вёска — былое ўладанне, 129 жыхароў, у ёй размяшчалася валасная ўправа. У 1890 г. — сяляне Залескага сельскагаспадарчага таварыства мелі 118 дзесяцін зямлі. Працавала школа граматы. У 1905 г. вёска ў Збіражскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 45 гаспадарак, 223 жыхары. На фронце загінулі 5 чалавек, 1 — у партызанах.

У 1997 г. — 33 двары, 71 жыхар.

ЗБІРАГІ, вёска ў Чэрнінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1941 г. — 26 двароў, 213 жыхароў.

Першы калгас «Шлях Леніна» арганізаваны ў студзені 1949 г.

З 27 двароў у яго ўступілі 25; 16 мужчын, 32 жанчыны. Аб'ядналі 110 га раллі і 30 га сенакосу, 17 коней.

Базавая школа (1938), фельчарска-акушэрскі пункт (1955), аддзяленне сувязі (1953), клуб-бібліятэка.

У 1997 г. — 67 двароў, 154 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Каля школы. На ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1956 г. пастаўлены абеліск.

ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ І ЗВАНІЦА. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1610 г. з дрэва. Неаднойчы аднаўлялася.

Ансамбль вылучаецца цэльнасцю кампазіцыі, суразмернасцю маштабаў, мастацкай выразнасцю архітэктурнага рашэння.

ЗБУНІН, вёска ў Знаменскім сельсавеце, у складзе калгаса «Знамя».

За 2 км на поўнач ад вёскі, на пясочным узгорку, каля р. Заходні Буг размешчана стаянка, якая адносіцца да позняга неаліту і бронзавага веку (3—2-е тысячагоддзі да н. э.). Гэты археалагічны помнік сведчыць, што мясцовасць была заселена ў далёкай старажытнасці. У 1628 г. князем Мікалаем Сапегам была пабудавана праваслаўная драўляная царква. Яе наведвалі 2053 прыхаджаніны з 4 вёсак: Збунін, Медна, Атол, Рагозна. У 1868 г. было 135 мужчын, 154 жанчыны. У 1886 г. 33 двары, 238 жыхароў, карчма, царкоўнапрыходская школа. У 1890 г. сялянам Збунінскага сельскагаспадарчага таварыства належала 677 дзесяцін зямлі, царкве 104 дзесяціны зямлі. Працавала народнае вучылішча. У 1905 г. сяло (649 жыхароў) і фальварак (6 жыхароў), у Мяднянскай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 120 двароў, 480 жыхароў. Фашысты спалілі 20 двароў, загубілі 15 мірных жыхароў. У баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў Вялікую Айчынную вайну загінулі 15 савецкіх воінаў.

У 1997 г. — 262 двары, 676 жыхароў. Сельская бібліятэка.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. Каля дарогі Брэст—Тамашоўка, паварот на Белае возера. Пахаваны савецкія воіны і партызаны, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1970 г. на магіле быў пастаўлены абеліск. У 1996 г. на абеліску ўстаноўлена пліта з імёнамі загінуўшых.

СТАЯНКА. За 2 км на поўнач ад вёскі, на пясчаным узгорку, каля р. Заходні Буг.

Даўжыня ўздоўж берага ракі каля 300 м. Культурны пласт часткова выходзіць на паверхню. Знойдзены рэшткі вогнішчаў, абкладзеных камянямі, ракавіны, вуглі, шмат апрацаваных крамянёў, абломкі глінянага ляпнога посуду, крамянёвыя наканечнікі стрэл, нажы, вастрыі, скрабкі, скоблі, адбойнікі з пясчаніку і кварцыту, гліняныя прасліцы, рэчы з бронзы. Знайшоў і даследаваў у 1898 г. М.Ф.Беляшэўскі. Адносіцца да позняга неаліту і бронзавага веку.

ЗНАМЕНКА (ДУРЫЧЫ), цэнтр Знаменскага сельсавета і калгаса «Знамя».

Да шасцідзесятых гадоў XX ст. вёска называлася Дурычы. Паводле легенды, людзі ў гэтай вёсцы доўгія дзесяцігоддзі вельмі любілі пасмяяцца адзін з аднаго. Людзі з другіх мясцін не заўсёды разумелі іх жарты. Вось аднойчы ехаў адзін мужык з суседняй вёскі па вуліцы на высока накладзеным возе сена і ўважліва сачыў, каб воз не перакуліўся. Раптам ён убачыў двух хлопцаў, якія ішлі яму насустрач і смяяліся, паказваючы на яго воз, а потым як закрычаць:

«Дзядзька! Воз гарыць! Ратуйся, бо згарыш!» Селянін скокнуў на каня, выхапіў сякеру, рассек вупраж і панёсся па вуліцы. Людзі дзівяцца, што мужык на кані вярхом, а дугу нават не зняў. Толькі ў канцы вёскі апамятаўся селянін. І зразумеў, што падманулі яго, вярнуўся назад. Падышоў да свайго воза і чуе, як людзі смяюцца і кажуць: «Хлопцы! Трэба сапраўды воз запаліць, а то чалавек будзе пераживаць за свой промах». Тут мужык не вытрымаў, ды як закрычыць:

«Вось вазьму дубец, то зараз супакоіцеся. Пасмяяліся і хопіць». Зявакі разышліся, а селянін запрог свайго каня як мог і паехаў у роспачы. Аднак вяскоўцы дабіліся таго, што іх вёску пачалі называць Дурычы. Аднаго разу сядзелі на прызьбе, а каля іх круціліся сабакі. Злавілі сучку, апранулі яе ў спадніцу. Смешна ім. Смяюцца, ажно надрываюцца, абмазалі хвост смалой і падпалілі, думаючы, што яна пабяжыць па вуліцы і будзе вельмі смешна. Але сучка завыла і кінулася бегчы не па вуліцы, а ў гумно да таго, хто яе падпаліў. У гэты дзень палову хат знішчыў агонь. З гэтага часу і пайшло, што дурычы жывуць тут.

У 1860 г. вёска ў Мяднянскай воласці, у складзе маёнтка Медна; 188 мужчын, 202 жанчыны. У вёсцы была царкоўнапрыходская школа. У 1890 г. сяляне Дурыцкага сельскагаспадарчага таварыства, у якое ўваходзілі вёскі Белагоры, Мельнікі, Дурычы, мелі 713,3 дзесяціны зямлі. У 1905 г. вёска (327 жыхароў) і фальварак (14 жыхароў) у Мяднянскай воласці.

У 1941 г. — 184 двары, 436 жыхароў. За гады вайны знішчана 9 двароў, забіты 30 мірных жыхароў. У баях за вызваленне вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінулі 36 савецкіх воінаў і 1 партызан.

Сярэдняя школа, аддзяленне сувязі (1944), амбулаторыя (1946), сельская бібліятэка, турысцка-аздараўленчы комплекс «Белае возера», санаторый «Бярэсце».

У 1997 г. — 513 двароў, 1237 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. У паўночнай частцы вёскі, каля шашы Брэст—Тамашоўка. Пахаваны воіны і партызаны, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ІВАХНАВІЧЫ, вёска ў Чарнаўчыцкім сельсавеце, у складзе калгаса «Іскра».

У 1941 г. — 81 двор, 280 жыхароў. З двары знішчылі фашысты. Загінулі на фронце 6 чалавек, 3 — у партызанах.

Першы калгас імя А.А.Андрэева арганізаваны ў кастрычніку 1949 г. У яго ўвайшлі 48 са 109 гаспадарак. Пасля шэрагу ўзбуйненняў вёска зрабілася падраздзяленнем калгаса «Іскра».

Дзейнічае фельчарска-акушэрскі пункт, клуб-бібліятэка.

У 1997 г. — 136 двароў, 370 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК САВЕЦКІМ ВОІНАМ. Пры ўездзе ў вёску. На ўшанаванне памяці савецкіх воінаў, што загінулі пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1958 г. пастаўлены абеліск.

КАВАЛЁВА, былая вёска, з 1958 г. у межах Брэста (у Маскоўскім р-не з 1978). Вёска стала працягам вул. Суворава ў горадзе. Ідзе будаўніцтва шматпавярховых жылых дамоў, пабудаваны завод «Цветатрон».

Вёска — былы фальварак у Камянец-Жыровіцкай воласці Брэсцкага павета. З 1940 г. — пасёлак, дзе жылі ваеннаслужачыя. Уваходзіў у склад Пугачоўскага, з 1954 г. Гершонскага сельсаветаў Брэсцкага раёна.

КАЗЛОВІЧЫ, вёска ў Чарнаўчыцкім сельсавеце, у прыгараднай зоне, за 18 км на поўнач ад Брэста, на правым беразе р. Лясная, за 4 км ад чыгуначнай станцыі Матыкалы, на шашы Жабінка—Вялікія Матыкалы.

У 1820 г. вёска ў Косіцкай воласці; 28 мужчын, 31 жанчына. Вёска ў складзе маёнтка Казловічы, які быў уласнасцю горада Брэста. У 1820 г. Казловіцкаму сельскагаспадарчаму таварыству належала 142,5 дзесяціны зямлі ў вёсках Казловічы і Дубраўна. У 1905 г. вёска (152 жыхары) у Косіцкай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні.

У 1940—1941, 1944—1954 гг. — цэнтр сельсавета, які ў ліпені 1954 г. быў ператвораны ў Цюхініцкі, а ў верасні 1959 г. — у Матыкальскі сельсаветы.

У 1941 г. — 135 двароў, 430 жыхароў. Загінулі на франтах 23 чалавекі.

27 кастрычніка 1949 г. быў арганізаваны калгас імя І.В.Сталіна. Са 130 гаспадарак у яго ўступілі 44. Пастановай ЦК КПБ і СМ БССР ад 9 снежня 1969 г. за № 406 ператвораны ў саўгас «Рассвет».

Клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі. Сад савецка-польскай дружбы. Архітэктурны помнік — Крыжаўзвіжанская царква.

У 1997 г. — 103 двары, 211 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 93 землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1968 г. пастаўлены помнік. Па баках ад скульптуры воіна на чатырохгранным пастаменце размяшчаюцца дзве пліты з мармуровымі дошкамі і надпісамі:

«Людзі! Памятайце, якой цаною заваявана шчасце!» і «Аднавяскоўцам, што загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, ад жыхароў вёсак Вялікія Сухарэвічы, Смуга, Вулька, Малая Курніца, Несвіло, Чарнакі, Дружба, Казловічы».

КАЛОДНА (да 1972 г.). Назва вёскі паходзіць ад асновы слова «калода», якое мае розныя значэнні: пчаліны вулей, а таксама выдзеўбаная калодка, кадлуба ў крыніцы для вадапою жывёлы. У XIX ст. вёска ў складзе маёнтка Церабунь у Матыкальскай воласці, прыватная ўласнасць Ксаверыя Грабава. У 1868 г. 131 мужчына, 100 жанчын. У 1890 г. сяляне Калоднянскага сельскагаспадарчага таварыства мелі 448,5 дзесяціны зямлі. Працавала школа граматы. У 1894 г. у вёсцы лютавала эпідэмія халеры, якая знішчыла шмат людзей.

У 1950 г. арганізаваны калгас «Краіна Саветаў». З 93 гаспадарак у яго ўступілі 62. Пазней ён злучыўся з калгасам «Пагранічнік».

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у 1968 г. пастаўлена стэла.

КАМАРОЎКА, вёска ў Тамашоўскім сельсавеце.

У 1862 г. вёска ў Прыбараўскай воласці, 50 двароў, у складзе маёнтка Прыбарава, уладальнікам якога быў граф Замойскі. У ліпені 1862 г. у вёсцы адбылося сялянскае хваляванне. Сяляне адмовіліся выконваць згонную павіннасць і плаціць чынш грашыма або хлебам. У 1890 г. у вёсцы зямля належала сельскагаспадарчай абшчыне, якая мела 149 дзесяцін зямлі.

Працавала царкоўнапрыходская школа, у якой вучыўся 31 хлопчык. У 1905 г. 690 жыхароў.

У маі 1940 г. — цэнтр сельсавета ў Дамачаўскім раёне, у 1954 г. перайменаваны ў Тамашоўскі. У 1956 г. аднесены да Брэсцкага раёна.

У 1941 г. — 130 двароў, 540 жыхароў. У гады вайны загінула 25 чалавек.

Сельская бібліятэка, клуб.

Радзіма касманаўта двойчы Героя Савецкага Саюза П.І.Клімука.

У 1997 г. — 213 двароў, 463 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

МЕСЦА РАССТРЭЛУ СЯМ'І ДАРАШУКОЎ І ДВУХ ВАЕННАПАЛОННЫХ. Каля дарогі на Брэст. Расстрэл адбыўся 5 верасня 1942 г. У 1958 г. на гэтым месцы ўстаноўлены памятны знак. Астанкі ахвяр фашызму перапахаваны на сельскіх могілках.

ПОМНІК ДЗЯРЖЫНСКАМУ Феліксу Эдмундавічу. Каля клуба. Бюст Ф.Э.Дзяржынскага ўстаноўлены ў 1970 г.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. У памяць аб 40 аднавяскоўцах, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1967 г. пастаўлена стэла.

КАЦЕЛЬНЯ-ПАДГАРОДСКАЯ, былая вёска. З 1968 г. у межах Брэста (у Маскоўскім р-не горада з 1978 г.). На пачатку XX ст. вёска ў Камянец-Жыровіцкай воласці Брэсцкага павета, 189 жыхароў (1905). У 1940—1968 гг. у складзе Гершонскага сельсавета Брэсцкага раёна.

КАЦІНБОР, былая вёска, з 1979 г. у межах Брэста (у Ленінскім р-не горада). У 1819—1850 гг. у маёнтку Кацінбор дзейнічала суконная мануфактура, на якой працаваў 31 чалавек (1828). Маёнтак і хутар уваходзілі ў склад Матыкальскай воласці Брэсцкага павета, налічвалі 58 жыхароў (1905), пазней злучыліся ў вёску. З 1940 г. у Цюхініцкім, у 1959—1979 гг. у Матыкальскім сельсаветах Брэсцкага раёна.

КАШЫЛАВА, вёска ў Лышчыцкім сельсавеце, у складзе СГП «Астрамечава».

У 1941 г. — 42 двары, 215 жыхароў.

У 1949 г. арганізаваны калгас «Чырвоная зорка». 41 гаспадарка ўвайшла ў калгас, у т.л. 27 мужчын і 41 жанчына. Аб'яднана 390 га зямлі, 35 коней.

Пад час узбуйненняў з 6 калгасаў Астрамечаўскага сельсавета (зараз Лышчыцкага) было ўтворана СГП «Астрамечава».

У 1997 г. — 65 двароў, 134 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК. За 1,5 км на захад ад вёскі, ва ўрочышчы Задняя Рыска. Мясцовая назва — Шведскія магілы.

Сярод узаранага поля — 7 абкладзеных камянямі насыпаў вышынёй 0,2—0,3 м, дыяметрам 4—5 м. Частка насыпаў, маг-

чыма, знішчана. Адкрыла і даследавала ў 1980 г. Т.М.Каробушкіна. Раскопкі не праводзіліся.

КЛЕЙНІКІ, вёска ў прыгараднай зоне, за 8 км на паўночны захад ад Брэста, на левым беразе р. Лясная, 2 км ад чыгуначнай станцыі Скокі, 0,5 км ад паўночнага паўкальца. Цэнтр сельсавета і калгаса «Пагранічнік».

У пачатку XIX ст. вёска ў Матыкальскай воласці, належала памешчыку Красоўскаму.

У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Скокі, якім валодаў І.У.Нямцэвіч; 76 мужчын, 82 жанчыны. У 1905 г. у вёсцы было 364 жыхары, у маёнтку 13 жыхароў.

У 1951 г. быў арганізаваны калгас «Пагранічнік», які аб'яднаў 97 гаспадарак у складзе 2 вытворчых брыгад.

У 1941 г. — 335 чалавек, 85 гаспадарак.

У 1997 г. — 1183 жыхары, 426 двароў.

Сярэдняя школа, Палац культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, магазін, міжгаспадарчы пункт пажарнай аховы. У вёсцы працуе вучэбны камбінат.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. У памяць аб 77 земляках — жыхарах вёсак Клейнікі, Казловічы, Костычы, Неплі, Пескі, Рэчыца, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1967 г. пастаўлена стэла.

КРУШЫНА, былая вёска, з 1968 г. у межах Брэста (у Маскоўскім р-не горада з 1978 г., вул. Крушынская).

У 1940—1968 гг. — у складзе Трышынскага сельсавета Брэсцкага раёна.

КУСТЫНЬ, вёска ў Лышчыцкім сельсавеце.

Назва вёскі паходзіць ад асновы слова «куст». Хмызняковая мясцовасць. На пачатку XVII ст. вёску набыў пан Геранім Лышчынскі — бацька Казіміра Лышчынскага, беларускага мысліцеля, філосафа, атэіста. У 1739 г. у вёсцы была пабудавана драўляная праваслаўная царква з каменнай званіцай, на сродкі памешчыка Хржаноўскага. Дзейнічала царкоўнапрыходскае папячыцельства, царкоўнапрыходская школа, у якой вучыліся 2 хлопчыкі і 9 дзяўчынак. У 1886 г. сяло ў Лышчыцкай воласці, ва ўрочышчы Барсукоўшчызна; 22 двары, 197 жыхароў, праваслаўная царква, ветраны млын, піцейны дом. У Кустыні размяшчалася Лышчыцкая валасная ўправа. У 1890 г. маёнтак належаў Зянону Узбіцкаму, які меў 151 дзесяціну зямлі, сяляне Кустынскага сельскагаспадарчага таварыства мелі 200 дзесяцін зямлі. У 1905 г. сяло (270 жыхароў), маёнтак (25 жыхароў), маёнтак (38 жыхароў) у Лышчыцкай воласці; размяшчаўся ўчастак паліцэйскіх ураднікаў. Летам 1906 г. адбылося антыкулацкае выступленне. Сяляне вёскі Кустынь сумесна з сялянамі вёсак Ратайчыцы, Рудаўцы Брэсцкага павета выгналі з маёнтка Трасцянец групу кулакоў, якія купілі гэты маёнтак за 115 тыс. руб.

У 1941 г. — 65 двароў, 280 жыхароў. У гады вайны загінулі на фронце 9 чалавек.

У сакавіку 1947 г. утвораны калгас імя Молатава. З 62 гаспадарак у яго ўступілі 37. Аб'ядналі 240 га раллі і 60 га сенакосу, 20 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 8 дойных кароў, 30 коней, 21 свінню, 14 авечак, 40 птушак і 3 пчоласям'і. Калгас злучыўся з калгасам імя Мічурына, а затым увайшоў у СГП «Астрамечава».

У 1997 г. — 93 двары, 158 жыхароў.

ЛІППІНКІ, вёска ў Дамачаўскім пасялковым Савеце, у складзе калгаса «Беларусь» (1989), раней калгас імя Жданава (1948).

У 1941 г. — 70 двароў, 212 жыхароў.

26 мірных жыхароў знішчаны немцамі, 8 чалавек загінулі на фронце.

У 1997 г. — 83 двары, 180 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

АБЕЛІСК з надпісам: «Тут, 22 чэрвеня 1941 г. па-геройску змагаліся пагранічнікі 17-й пагранічнай заставы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі» (на руінах будынка пагранзаставы).

МАГІЛА ЗАВІДАВА Аляксандра Абрамавіча. Непадалёк ад вёскі, на месцы былой пагранзаставы.

А.А.Завідаў нарадзіўся 17.3.1923 г. у в. Забалацце Таржкоўскага раёна Калінінскай вобл. Член ВЛКСМ. Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў мулярам у г. Петразаводск. З 20.12.1941 г. служыў у пагранвойсках, з чэрвеня 1944 г. — на пагранзаставе.

23.1.1945 г. узброеная банда з 15 чалавек перайшла мяжу і пранікла на савецкую тэрыторыю. Яфрэйтар А.А.Завідаў першым дагнаў ворагаў і, уступіўшы ў барацьбу, затрымаў іх да падыходу асноўнай групы. Пагранічнік забіў некалькі

бандытаў, але і сам быў цяжка паранены і памёр. У 1968 г. пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны I ступені.

У 1951 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ЛІТВІНЫ, вёска ў Мухавецкім сельсавеце, у складзе саўгаса «Мухавец».

У 1941 г. — 12 двароў, 48 жыхароў.

У 1997 г. — 9 двароў, 16 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА НЕВЯДОМАГА ЛЁТЧЫКА. На ўскрайку лесу, за 0,5 км на поўдзень ад вёскі. Пахаваны невядомы лётчык, што загінуў 22 чэрвеня 1941 г. у баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1981 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ЛЫШЧЫЦЫ, вёска ў прыгараднай зоне, за 25 км на паўночны захад ад Брэста, за 1 км ад чыгуначнай станцыі Лышчыцы, на шашы Камянец — Волчын.

Назва вёскі паходзіць ад прозвішча Лышчынскі. У пачатку XVI ст. вёску паводле прывілея атрымаў Леў Лышчынскі, які паходзіў з Вільні. Ён меў трох сыноў: Канстанціна, Станіслава і Івана. У Канстанціна нарадзіўся сын — Геранім, які быў бацькам Казіміра Лышчынскага, беларускага мысліцеля, філосафа і атэіста, радзіма якога — Лышчыцы.

У 1817 г. у вёсцы была пабудавана памешчыкам Кліментам Віслоцкім праваслаўная драўляная царква са званіцай. У 1868 г. Лышчыцы —цэнтр маёнтка, у якім былі ветраны млын, карчма; 142 мужчыны, 160 жанчын. У 1905 г. 574 жыхары, чыгуначная станцыя на паўднёва-заходнім напрамку. Вёска — цэнтр Лышчыцкай воласці, якая аб'ядноўвала 17 вёсак, 20 сельскагаспадарчых таварыстваў, 380 двароў, 4135 жыхароў. Былі размешчаны тэлеграфная станцыя, участкі: па воінскай павіннасці, валаснога сельскага фельчара, судовых следчых, міравых пасрэднікаў, судова-міравой акругі.

У 1941 г. — 100 двароў, 603 жыхары. У час вайны загінулі на франтах 6 чалавек і 3 у партызанах. 15 чалавек вывезены ў Германію, вярнуліся 14.

У студзені 1949 г. 70 з 89 гаспадарак уступілі ў калгас імя Мічурына, усяго 530 чалавек. Былі аб'яднаны 400 га раллі, 1 карова і 48 коней. У 1992 г. калгас ператварыўся ў сельскагаспадарчае калектыўнае прадпрыемства «Астрамечава».

Сярэдняя школа ў 1975 г. перайшла ў новы будынак, тут вучацца дзеці з 17 вёсак, у школе 5 груп падоўжанага дня, 25 настаўнікаў. Працуе дапаможная школа-інтэрнат у в. Люта. Клуб, дзіцячы садок, аддзяленне сувязі, участковая бальніца (1932), аптэка, сельская бібліятэка, прамтаварныя і прадуктовыя магазіны.

У 1997 г. — 65 двароў, 160 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА ВОІНАЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ. На сельскіх могілках. У 1989 г. пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 1 км ад вёскі, каля лесу. У 1942 —1944 гг. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі 756 мірных жыхароў. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ЛЯПЛЁЎКА, вёска ў Дамачаўскім пасялковым Савеце.

Назва вёскі паходзіць ад прозвішча Ляплёў. У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Дамачава, якім валодаў князь Вітгенштэйн; 196 мужчын, 108 жанчын. У 1875 г. у вёсцы быў пабудаваны з цэглы сядзібны дом, акружаны пейзажным паркам плошчай 7 га. У 1886 г. — 51 двор, 614 жыхароў, піцейны двор.

У 1890 г. сяляне вёскі ў Клейнікаўскім сельскагаспадарчым таварыстве, якое мела 368,7 дзесяціны зямлі. У 1905 г. вёска (840 жыхароў) у Дамачаўскай воласці Брэсцкага павета.

У 1940 г. — у Дамачаўскім раёне, цэнтр сельсавета да 1956 г., калі быў аднесены да Брэсцкага раёна ў сувязі з ліквідацыяй Дамачаўскага раёна, у 1967 г. скасаваны.

У 1941 г. — 220 двароў, 460 жыхароў. Фашысты спалілі 54 хаты, забілі 15 мірных жыхароў, 25 вывезлі ў Германію, 10 з іх вярнуліся. 25 чалавек загінулі на фронце і 3 — у партызанах.

З 1959 г. у складзе саўгаса «Дамачаўскі». Базавая школа.

У 1997 г. — 229 двароў, 564 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 400 м на захад ад вёскі. Каля дарогі Брэст—Тамашоўка.

23 верасня 1942 г. гітлераўцы вывезлі з Дамачаўскага дзіцячага дома за пасёлак 55 дзяцей, выхавальніцу П.Грахольскую і расстралялі іх. У 1952 г. на магіле пастаўлены абеліск. У 1987 г. пастаўлены новы помнік «Пратэст» (скульптар

А.Салятыцкі, архітэктары М.Ткачук, Г.Пешкаў). Уяўляе сабой стэлу з белага мармуру, да якой прымацаваны бронзавыя выявы дзяцей, якія просяць ратунку.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. Каля чыгункі. Пахавана сям'я Ігнацюкоў (6 чалавек), расстраляная нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1968 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАКСІМЫ, былая вёска, цяпер вуліца Максімаўская ў в. Збірагі.

У 1868 г. сяло маёнтка Збірагі, якім валодаў граф Грабоўскі; 42 мужчыны, 41 жанчына. У 1890 г. сяляне Максімавіцкага сельскагаспадарчага таварыства мелі 93,5 дзесяціны зямлі. Было народнае вучылішча. У 1905 г. вёска (43 жыхары) у Збіражскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні.

МАЛЫЯ ЗВОДЫ, вёска ў Лышчыцкім сельсавеце.

У 1868 г. — цэнтр маёнтка Малыя Зводы, якім валодаў памешчык Гутоўскі; 49 мужчын, 59 жанчын. Была пабудавана прыхаджанамі праваслаўная драўляная царква, якую наведвала 1478 чалавек з 6 вёсак. У 1886 г. сяло ў Лышчыцкай воласці ва ўрочышчы Гашчэй; 15 двароў, 160 жыхароў, царкоўнапрыходская школа, карчма. У 1889 г. працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 54 хлопчыкі і 5 дзяўчынак. У 1890 г. уладальнікам сяла быў Браніслаў Гутоўскі, які меў 491 дзесяціну зямлі, сяляне сельскагаспадарчага таварыства Малых Зводаў мелі 133 дзесяціны зямлі. У 1905 г. сяло (243 жыхары) і фальварак Малыя Зводы (18 жыхароў) у Лышчыцкай воласці.

У 1941 г. — 35 двароў, 175 жыхароў. 10 чалавек загінулі на фронце, 3 — у партызанах. Базавая школа, аддзяленне сувязі, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт. Будуецца Свята-Мікалаеўскі храм.

У 1997 г. — 200 двароў, 523 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. На паўднёвай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці 43 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1970 г. пастаўлены помнік — скульптурная выява жанчыны ў жалобе.

СЯДЗІБА. На паўднёва-заходняй ускраіне вёскі. Сядзібны дом пабудаваны ў 1875 г. з цэглы. Рэканструяваны ў 1971 г.

КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК. За 2,5 км на паўночны ўсход ад вёскі, у лесе, ва ўрочышчы Ворахава. Мясцовая назва — Шведскія магілы. 19 насыпаў, 18 з якіх абкладзены ўнізе камянямі-валунамі. 10 курганоў насыпаны парамі, побач. Астатнія аддалены адзін ад аднаго на 2—10 м. Усе курганы добра захаваліся. На некаторых растуць дрэвы. Даследаваў у 1978 г. Ю.У.Кухарэнка. У 1980 г., 1985—1986 гг. абследавала могільнік, а ў 1981—1983 гг. даследавала 10 курганоў Т.М.Каробушкіна. Могільнік належаў усходнім славянам, датуецца XI—XIII ст.

Матэрыялы даследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН РБ.

МАЛЫЯ РАДВАНІЧЫ (РАДВАНІЧЫ ЗАРЭЧНЫЯ), вёска ў Радваніцкім сельсавеце, у складзе калгаса «Расія».

У 1868 г. вёска ў Радваніцкай воласці; 130 мужчын, 134 жанчыны. У 1890 г. уладальнікам вёскі быў Мікалай Гутоўскі, які меў 196 дзесяцін зямлі, сяляне Радваніцка-Зарэчнага сельскагаспадарчага таварыства мелі 341 дзесяціну зямлі. Дзейнічала школа граматы. У 1905 г. вёска Радванічы Зарэчныя (12 жыхароў) у Радваніцкай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 116 двароў, 494 жыхары. 6 двароў спалілі немцы пад час акупацыі, забілі 35 мірных жыхароў. 15 чалавек загінулі на фронце, 5 — у партызанах.

У 1997 г. — 230 двароў, 670 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На ўскраіне вёскі. Тут 27.10.1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 35 членаў сямей ваеннаслужачых Чырвонай Арміі. У 1969 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК АХВЯРАМ ФАШЫЗМУ. За 3 км на паўночны захад ад вёскі. Тут у лістападзе 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі партызанскага разведчыка І.А.Гаўрылюка і членаў яго сям'і, а таксама сям'ю савецкага патрыёта П.Белавежа (усяго 7 чалавек).

У 1965 г. на месцы расстрэлу пастаўлены абеліск.

МАЛЫЯ СУХАРЭВІЧЫ, вёска ў Лышчыцкім сельсавеце, у складзе СГП «Астрамечава».

У 1941 г. — 35 двароў, 175 жыхароў. 10 чалавек загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Першы калгас «Чырвоны партызан»

быў утвораны ў лютым 1949 г. 19 гаспадарак уступілі ў яго, у тым ліку 9 працаздольных мужчын і 16 жанчын. Было абагульнена 192 га зямлі і 16 коней.

У 1997 г. — 17 двароў, 28 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. У памяць аб земляках, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1955 г. пастаўлены абеліск.

МАЛЫЯ ШЧЫТНІКІ, вёска ў Лышчыцкім сельсавеце, у складзе СГП «Астрамечава».

У 1566 г. вёска ў Берасцейскім старостве, належала зямянам Гарнастаевым.

У 1821 г. памешчыкам Ф.Паніхвіцкім і мясцовым свяшчэннікам Антоніем Будзіловічам пабудавана каменная царква з драўлянай званіцай. Прыхаджан налічвалася 984 чалавекі з навакольных вёсак.

У 1868 г. сяло, цэнтр маёнтка Шчытнікі; 96 мужчын, 102 жанчыны.

У 1890 г. вёска ў Лышчыцкай воласці, належала памешчыцы Вандзе Дхумоўскай, якая мела 437 дзесяцін зямлі.

У 1905 г. — 78 жыхароў.

У 1941 г. — 47 двароў, 235 жыхароў. 10 чалавек загінулі на фронце.

У 1997 г. — 63 двары, 116 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК. Знаходзіцца ў бары, за 1 км на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Кірганы. Мясцовая назва — Шведскія магілы. Захаваліся 4 насыпы вышынёй 0,5 — 0,6 м, дыяметрам 5—7 м. У 1980 г. і 1985 г. могільнік даследавала Т.М.Каробушкіна. Захаванасць насыпаў здавальняючая. Раскопкі не праводзіліся.

ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА. У парку на тэрыторыі былой сядзібы. Пабудавана ў 1742 г. з цэглы. Царква — помнік архітэктуры з рысамі барока.

У 1988 г. побач з Пакроўскай царквой (за 1,7 км ад в. Лышчыцы, у в. Шчытнікі Малыя) устаноўлены камень, на якім высечаны словы К.Лышчынскага: «О, падарожны! Не міні гэтых камянёў. Ты на іх не спатыкнешся, калі не спатыкнешся на ісціне. Усвядоміш ісціну ля камянёў, бо нават тыя людзі, якія ведаюць, што гэта праўда, вучаць, што гэта мана. Вучэнне мудрацоў — свядомы падман».

МЕДНА, вёска ў Знаменскім сельсавеце.

Назва вёскі адлюстроўвае працоўны навык першапасяленцаў — медны промысел. У 1849 г. вёска—цэнтр маёнтка Медна, якім валодаў граф Браніцкі. У гэтым жа годзе была пабудавана праваслаўная драўляная царква на сродкі мясцовых жыхароў і аканома маёнтка Кавалеўскага.

У 1868 г. сяло — цэнтр Мяднянскай воласці; 199 мужчын, 210 жанчын, маёнткам валодала графіня Красінская.

У 1886 г. — 42 двары, 452 жыхары. Праваслаўная царква, часоўня, піцейны дом, лясная кантора, школа граматы.

У 1905 г. вёска (678 жыхароў) і фальварак (39 жыхароў) — цэнтр Мяднянскай воласці за 25 вёрстаў ад Брэста. У вёсцы быў валасны сельскі фельчар размяшчаліся ўчасткі: міравых пасрэднікаў, судова-міравой акругі, судовых следчых. Раз у год працаваў прызыўны ўчастак па воінскай павіннасці. Участак паліцэйскіх ураднікаў Мяднянскай воласці размяшчаўся ў вёсцы Чэрні. У воласці было 8 сельскагаспадарчых таварыстваў, у 1886 г. — 406 дамоў, 2036 мужчын, 1999 жанчын. У склад Мяднянскай воласці ў 1905 г. уваходзілі вёскі: Знаменка (Дурычы), Рагозна, Страдзеч, Прылукі, Збунін.

У 1941 г. — 220 двароў, 1100 жыхароў. У вайну знішчана 212 двароў, забіта 169 мірных жыхароў. Усяго за гады акупацыі ў в. Медна знішчана 316 чалавек.

Птушкаферма, базавая школа (1955), участковая бальніца (1946), аддзяленне сувязі (1944), сельская бібліятэка.

У 1997 г. — 332 двары, 908 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. У цэнтры вёскі. Пахаваны воіны і партызаны, што загінулі ў ліпені 1944 г. У 1957 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. У цэнтры вёскі. Пахаваны мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору. 25 лютага 1943 г. карны атрад эсэсаўцаў уварваўся ў вёску. Гітлераўцы сагналі ў сарай 126 чалавек рознага ўзросту і расстралялі, вёску (212 двароў) спалілі. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА ВОІНАЎ І КАМАНДЗІРАЎ 160-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ. На сельскіх могілках. Пахаваны воіны і

камандзіры 160-й стралковай дывізіі, што загінулі ў баі з нямецкімі захопнікамі пры вызваленні вёскі 20 ліпеня 1944 г. У 1992 г. мясцовыя жыхары і Мяднянская птушкафабрыка ўстанавілі на магіле мемарыяльныя пліты з імёнамі герояў.

ПОМНІК ВОІНАМ-ЗЕМЛЯКАМ. На ўскраіне вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Пастаўлены жыхарамі вёскі ў 1993 г.

ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА. На паўднёвай ускраіне вёскі, на могілках. Пабудавана ў канцы XVIII ст. з дрэва.

Царква адназрубная. Прамавугольная, пакрытая трохсхільным дахам з купалам над алтарнай часткай. З паўночнага боку — прыдзел пад аднасхільным дахам.

Царква — помнік народнага драўлянага дойлідства Беларускага Палесся.

МІХАЛІН, вёска ў Радваніцкім сельсавеце, у складзе калгаса «Расія».

У 1941 г. — 70 двароў, 355 жыхароў. Акупанты спалілі 5 двароў, забілі 24 мірных жыхароў. 21 чалавек загінуў на фронце, 3 — у партызанах.

У 1997 г. — 24 двары, 47 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. Ва ўрочышчы Дубрава. Пахаваны 13 мірных жыхароў, расстраляных 2.10.1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА СЯМ'І ПАРТЫЗАНА ГРУДНІКА (5 чалавек), расстралянай 2.10.1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1962 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МІЦЬКІ, вёска ў Гершонскім сельсавеце, у складзе калгаса «Прыбужжа».

У 1941 г. — 37 двароў, 198 жыхароў. Немцы ў час акупацыі спалілі 27 двароў, забілі 6 мірных жыхароў. 7 чалавек загінулі на фронце.

У 1997 г. — 105 двароў, 270 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА на сельскіх могілках памерлых у 1944—1945 гг. у шпіталях Брэста 43 воінаў і камандзіраў Чырвонай Арміі, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

МУХАВЕЦ, пасёлак, да 1970 г. — Раманаўскія Хутары. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Мухавец». Прыгарадная зона, за 15 км ад Брэста і за 3 км ад чыгуначнай станцыі Каменная, на шашы Брэст—Велікарыта.

У 1941 г. — 42 двары, 215 жыхароў.

Першы калгас імя В.П.Чкалава ўтвораны ў кастрычніку 1948 г. З 32 двароў у яго ўступілі 26, у тым ліку 20 працаздольных мужчын і 40 жанчын; было аб'яднана 180 га раллі, 14 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 8 дойных кароў, 18 коней, 7 авечак і 18 пчоласем'яў.

Амбулаторыя (1964), аблнасентраўаб'яднанне, лясніцтва, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, яслі-садок, аддзяленне сувязі (1965), кемпінг, гасцініца, сталовая, прамтаварны і прадуктовы магазіны.

У 1997 г. — 542 двары, 1632 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 3 км ад пасёлка, ва ўрочышчы Плянта. Пахаваны члены сем'яў ваеннаслужачых і мясцовыя жыхары, расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК БАГДАНЧУКУ Сяргею Яфімавічу. У скверы каля школы. Актыўны дзеяч рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Помнік пастаўлены ў 1970 г. па ініцыятыве і на сродкі камсамольцаў раёна.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры пасёлка. Пастаўлены ў 1976 г. на ўшанаванне памяці 164 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (скульптар Ю.Рычкоў, архітэктар Ю.Ціханаў; бетон з мармуровай крошкай; вышыня пастамента 1 м, скульптуры 8,6 м).

Помнік — архітэктурна-скульптурная кампазіцыя. Пластычным цэнтрам з'яўляюцца гарэльефы двух воінаў. Замыкае кампазіцыю масіўны блок з лічбамі: 1941—1945. Кампазіцыю аб'ядноўвае трохступеньчаты стылабат і пляцоўка, выкладзеная квадратнымі плітамі.

НАВАСАДЫ, вёска ў Дамачаўскім пасялковым Савеце, у складзе саўгаса «Дамачаўскі».

У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Мутвіцы Олтушскай воласці; 21 мужчына, 21 жанчына. У 1892 г. уладальнікам маёнтка быў Дз.Лабачоў, які вельмі прыгнятаў сваіх сялян. Паміж сялянскіх надзелаў, сенажацей знаходзіўся яго лес, праз які не дазвалялася праходзіць сялянам да сваіх надзелаў ці ганяць скаціну на выпас. Праз праезную дарогу пракапаў

роў, праход цераз які быў забаронены. Запалоханыя сяляне чакалі надыходу ночы, калі Лабачоў і яго вартаўнікі пойдуць дадому, каб пайсці да сваіх надзелаў. У іх склалася прымаўка: «Ідзём красці самі ў сябе». Памешчык здзекаваўся з сялян. Калі селянін з вёскі Навасады праходзіў каля маёнтка, то памешчык раздзяваў яго дагала і адпускаў у вёску. Памешчык адбіраў у сялян жывёлу, сена, дровы, літаральна даводзіў іх да галечы. Супраць сялян свайго маёнтка Лабачоў узбудзіў за 1896 г. 237 спраў. У 1893 г. сяляне напісалі скаргу губернатару, у якой скардзіліся на жорсткасць свайго памешчыка, але, як бачна з дакументаў, гэта не дапамагло ім. У 1905 г. у вёсцы было 163 жыхары.

У 1941 г. — 38 двароў, 206 жыхароў. За гады акупацыі знішчана 37 двароў і забіты 7 мірных жыхароў. Загінулі на фронце 7 чалавек і адзін у партызанах.

У 1997 г. — 42 двары, 97 жыхароў.

НЕПЛІ, вёска ў Клейнікаўскім сельсавеце, у складзе калгаса «Пагранічнік».

Назва вёскі паходзіць, напэўна, ад польскага прозвішча Нелеп. У 1510 г. кароль Жыгімонт зацвердзіў сяло Непле (ад фр. — Зелява, якая ўпадае ў Буг) за магнатам беларускага паходжання Львом Багавіцінавічам. У 1868 г. вёска ў Матыкальскай воласці, у складзе маёнтка Неплі, якім валодаў памешчык Пуслоўскі; 85 мужчын, 88 жанчын. У 1890 г. сяляне Неплінскага сельскагаспадарчага таварыства мелі 171,5 дзесяціны зямлі. Уладальнікам фальварка Неплі быў барон Уладзімір Таўбе. Працавала школа граматы. У 1905 г. — 503 жыхары.

У 1941 г. — 117 двароў, 461 жыхар. У вайну загінулі на франтах 20 чалавек.

У 1997 г. — 27 двароў, 31 жыхар.

Помнікі гісторыі і культуры

АБЕЛІСК з надпісам: «Тут, 22 чэрвеня 1941 г. пры абароне граніцы па-геройску загінулі начальнік заставы лейтэнант Авілаў і група пагранічнікаў (13 чалавек). Вечная памяць героям». (Па даных ЦАПВ, лейтэнант Авілаў прапаў без вестак 23.6.1941 г.)

НЕХАЛСТЫ, вёска ў Матыкальскім сельсавеце, у складзе калгаса імя Леніна.

У 1566 г. сяло ў Сычоўскім войтаўстве Берасцейскага староства. Жыхары мелі 28 валок зямлі і плацілі чынш: з адной валокі 94 грошы. У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Нехалсты, які належаў Мікалаю Швыкоўскаму; 101 мужчына, 111 жанчын. У 1890 г. вёскай валодаў Іван Швыкоўскі, які меў 181 дзесяціну зямлі, сяляне Нехалсцкага сельскагаспадарчага таварыства мелі 302 дзесяціны зямлі. У 1905 г. вёска (445 жыхароў) і маёнтак (42 жыхары) у Матыкальскай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 104 двары, 297 жыхароў. Першы калгас арганізаваны ў жніўні 1948 г., у яго ўвайшлі 66 гаспадарак, 62 мужчыны і 92 жанчыны. Аб'ядналі 504 га зямлі, 8 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 4 каровы, 43 коні і 10 пчоласем'яў.

У 1997 г. — 63 двары, 142 жыхары.

ПАДЛЕССЕ-КАМЯНЕЦКАЕ, вёска ў Мухавецкім сельсавеце, у складзе саўгаса «Мухавец».

У 1941 г. — 150 двароў, 730 жыхароў. За гады акупацыі амаль уся вёска была знішчана.

Першы калгас быў утвораны ў студзені 1949 г. Ён аб'яднаў 37 гаспадарак.

У 1997 г. — 56 двароў, 117 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. На паўночным ускрайку вёскі. Пахаваны мясцовыя жыхары, расстраляныя ў кастрычніку 1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі, сем'і ваеннаслужачых. У 1984 г. на магіле ўстаноўлена мемарыяльная пліта. У 1992 г. — абеліск.

ПАДЛЕССЕ-РАДВАНІЦКАЕ, вёска ў Мухавецкім сельсавеце, у складзе саўгаса «Мухавец».

У 1941 г. — 72 двары, 320 жыхароў. Больш за 70 двароў і 21 мірны жыхар былі знішчаны немцамі. 10 чалавек загінулі на фронце.

Фельчарска-акушэрскі пункт (1975), сельская бібліятэка, магазін.

У 1997 г. — 68 двароў, 134 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. Пахаваны мясцовыя жыхары і сем'і ваеннаслужачых Брэсцкага гарнізона, расстраляныя немцамі ў канцы 1942 г.

У 1961 г. на брацкай магіле пастаўлены абеліск.

ПЛОСКА, вёска ў прыгараднай зоне, за 6 км на паўночны ўсход ад Брэста, 2,5 км ад чыгуначнай станцыі Брэст-Усходні, у Тэльмінскім сельсавеце Брэсцкага раёна.

Базы брэсцкіх прадпрыемстваў, пачатковая школа. Гасцініца аўтатранспартнага прадпрыемства «Саўаўта—Брэст».

Помнікі гісторыі і культуры

На гарадскіх могілках помнік савецкім грамадзянам, закатаваным нямецка-фашысцкімі акупантамі ў 1943 г.

ПОКРЫ, вёска ў Чарнаўчыцкім сельсавеце, у складзе калгаса «Іскра».

Назва вёскі, верагодна, паходзіць ад прозвішча Покра.

У 1739 г. пабудавана драўляная царква, якая ў 1840 г. жыхарамі вёскі і памешчыкам Адамам Баяроўскім была перабудавана.

У 1868 г. Покры — сяло маёнтка Дзем'янічыцы ўладальніцы Баяроўскай; 73 мужчыны, 72 жанчыны. Дзейнічала народнае вучылішча. У 1886 г. сяло ў Турнянскай воласці; 17 двароў, 180 жыхароў, царкоўнапрыходская школа. У 1890 г. сялянам Пакроўскага сельскагаспадарчага таварыства належала 333,5 дзесяціны зямлі, 48 дзесяцін мела царква.

У 1941 г. — 60 двароў, 290 жыхароў. 35 двароў спалілі немцы ў гады вайны. 6 чалавек загінулі на фронце.

Першы калгас «Савецкая Армія» быў арганізаваны ў лютым 1949 г. З 54 гаспадарак у яго ўступілі 43: 20 мужчын і 36 жанчын. Аб'ядналі 215 га раллі, 75 га сенакосу і 40 коней.

Фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі (1953), клуб-бібліятэка.

У 1997 г. — 92 двары, 253 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА ТРОМЗЫ Дзмітрыя Мікалаевіча. На могілках. Сакратар Чарнаўчыцкага райкома КПЗБ Дз.М.Тромза загінуў у верасні 1939 г. пры вызваленні Заходняй Беларусі. У 1973 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ГАРАДЗІШЧА, МОГІЛЬНІКІ

За 2 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе р. Лясная, на астраўку паміж яе рэчышчам і старыцай.

ГАРАДЗІШЧА. Даўжыня з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход 250 м. Шырыня ў паўднёва-заходняй частцы 65 м, у паўднёва-ўсходняй — 35 м. Вышыня над узроўнем поймы ракі на паўднёвым усходзе 3,5 м. Глыбокая лагчына дзеліць яго на 2 часткі: паўднёва-заходнюю, амаль авальную ў плане, і паўднёва-ўсходнюю — доўгую, вузкую. Некалі гарадзішча было абнесена ровам, сляды якога захаваліся. Даследавалі ў 1955 г. І.А.Іофе, у 1959 г. — І.В.Біруля, у 1966 г. — Ю.У.Кухарэнка. У культурным слоі таўшчынёй 0,4—1,2 м знойдзена многа фрагментаў ганчарнага посуду. Датуецца X—XIV ст.

КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК. У паўночна-заходняй частцы астраўка. 2 насыпы з каменным пакрыццём, вышынёй 0,5 м, дыяметрам 3—4 м. Адзін з курганоў раскапаў І.В.Біруля ў 1959 г. Знойдзена пахаванне па абрадзе трупаспалення. Датуецца XI—XIII ст.

БЕСКУРГАННЫ МОГІЛЬНІК. У паўднёва-ўсходняй частцы гарадзішча, каля курганнага могільніка. Даследавалі ў 1955 г. І.А.Іофе, у 1966 г. — Ю.У.Кухарэнка, у 1981 г. — Т.М.Каробушкіна. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Брэсцкім абласным краязнаўчым музеі.

ПАКРОЎСКАЯ ЦАРКВА. На поўнач ад вёскі. Пабудавана ў 1739 г. з дрэва, часткова перабудавана ў XIX ст. Царква — помнік драўлянага дойлідства цэнтрычнай кампазіцыі з асобнымі рысамі барока.

ПРЫБАРАВА, вёска ў Тамашоўскім сельсавеце.

Назва вёскі паходзіць ад назвы-арыенціра, што азначае «каля бора».

У пачатку XIX ст. вёска належала князю Адаму Чартарыйскаму, у 1809 г. ён сумесна з жыхарамі гэтай і навакольных вёсак пабудаваў драўляную царкву. У ліпені 1862 г. у сяле адбыліся сялянскія хваляванні, часова абавязаныя сяляне адмовіліся плаціць чынш грашыма або хлебам, а таксама адбываць згонныя павіннасці. Былі вызваны спраўнік з міравым пасрэднікам і станавы прыстаў, якія змаглі пераканаць сялян, каб тыя сталі выконваць згонную павіннасць. У 1868 г. 388 мужчын, 433 жанчыны. У 1886 г. 810 жыхароў, 80 двароў; валасная ўправа, царкоўнапрыходская школа, праваслаўная царква, карчма. У 1890 г. маёнтак Прыбарава належаў графу Фаме Замойскаму. У вёсцы працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 68 хлопчыкаў і 3 дзяўчынкі. У 1905 г. сяло (1488 жыхароў) — цэнтр Прыбараўскай воласці, якая размяшчалася за 51 вярсту ад Брэста. У сяле працаваў валасны сельскі фельчар, былі размешчаны ўчасткі: паліцэйскіх ураднікаў, судовых

следчых, міравых пасрэднікаў, судовай міравой акругі. Раз у год працаваў прызыўны ўчастак па воінскай павіннасці. У воласць уваходзілі вёскі: Гута, фальварак Дубок, Камароўка, Селяхова, Орхава, 6 сельскагаспадарчых таварыстваў.

У 1940 г. вёска ў Дамачаўскім раёне, цэнтр сельсавета (12.10.1940), які быў аб'яднаны з Падлужскім сельсаветам у адзін Ліпінскі ў ліпені 1954 г., апошні ў верасні 1959 г. увайшоў у Тамашоўскі сельсавет Брэсцкага раёна, калгас імя Дзяржынскага.

У 1941 г. — 299 двароў, 897 жыхароў. Фашысты спалілі 100 двароў, забілі 250 мірных жыхароў, 155 вывезлі ў Германію, вярнуўся 151 чалавек, 120 загінулі на фронце і 12 — у партызанах.

Базавая школа (1958), фельчарска-акушэрскі пункт (1940), аддзяленне сувязі (1950), сельская бібліятэка, Свята-Іаана-Багаслоўская царква.

У 1997 г. — 360 двароў, 640 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. У цэнтры вёскі. Пахавана сям'я Карпюкоў (5 чалавек), расстраляная нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1942 г. У 1979 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА НЕВЯДОМАГА ПАРТЫЗАНА. На могілках. Пахаваны невядомы партызан, які загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны.

АБЕЛІСК з надпісам: «Тут, 22 чэрвеня 1941 г. па-геройску змагаліся пагранічнікі 18-й пагранзаставы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі» (руіны будынка заставы).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на агнявой пазіцыі ручнога кулямёта з надпісам: «Тут, 22 чэрвеня 1941 г. пры абароне граніцы СССР загінуў разлік ручнога кулямёта, які знішчыў 14 фашыстаў. Імёны герояў невядомыя» (каля кіламетра на паўднёвы ўсход ад в. Прыбарава).

СТАЯНКІ.

Стаянка-1. За 3 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Гарынец, на невялікім пясчаным пагорку сярод даліны Заходняга Буга. Адкрыў у 1898 г. М.Ф.Беляшэўскі. Знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, нажы, у большасці мікралітычныя, а таксама фрагменты глінянага посуду. Стаянка адносіцца да неаліту і, магчыма, больш ранняга часу (5—3-е тыс. да н.э.).

Стаянка-2. За 3 км на поўнач ад вёскі, на пясчаных пагорках сярод пойменных балот, ва ўрочышчах Крынічка, Падзаміжны, Плошча. Адкрыў і даследаваў у 1898 г. М.Ф.Беляшэўскі. Знойдзены нешматлікія крамянёвыя прылады працы і рэшткі посуду эпохі неаліту і бронзавага веку (3—2-е тыс. да н.э.).

ПРЫЛУКІ, вёска ў прыгараднай зоне, за 17 км на поўдзень ад Брэста, 1 км ад шашы Брэст—Тамашоўка, за 12 км ад чыгуначнай станцыі Брэст-Паўднёвы, у Гершонскім сельсавеце.

Назва вёскі Прылукі паходзіць ад месца знаходжання паселішча —каля ракі, каля лукі.

У 1566 г. сяло Прылукі — цэнтр войтаўства ў Берасцейскім старостве, каралеўскае ўладанне. Жыхары мелі 43 валокі, сяляне плацілі чынш — з адной валокі 31 грош, павінны былі апрацоўваць гаспадарскую ворную зямлю. З кожнай валокі трэба было адпрацаваць на ёй 2 дні ў тыдзень і 4 дні летам. У 1868 г. у Прылуках было 329 мужчын, 376 жанчын. У 1870 г. мясцовымі жыхарамі пабудавана праваслаўная драўляная царква са званіцай, прыхаджан было 2702 чалавекі з 6 вёсак. Працавала царкоўнапрыходская школа, у якой вучыліся 24 вучні. У 1886 г. 76 дамоў, 836 жыхароў, карчма. У 1889 г. працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 37 хлопчыкаў. У 1890 г. сялянам Прылуцкага сельскагаспадарчага таварыства належалі 1393,5 дзесяціны зямлі. У 1905 г. сяло ў Мяднянскай воласці, 1459 жыхароў.

У 1941 г. — 178 двароў, 664 жыхары. За гады вайны знішчана 20 двароў, забіты 21 жыхар, 8 чалавек вывезены ў Германію, вярнуліся ўсе, 14 жыхароў загінулі на фронце.

Першы калгас імя Л.М.Кагановіча быў арганізаваны ў вёсцы ў лютым 1950 г., ён аб'яднаў 105 гаспадарак. Затым быў утвораны саўгас «Прыбужжа», які рашэннем сходу працоўнага калектыву ад 20 лютага 1992 г. быў ператвораны ў калгас.

Базавая школа, клуб, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

У 1997 г. — 200 двароў, 486 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І АХВЯР ФАШЫЗМУ. За 0,5 км на поўнач ад вёскі. Пахаваны пагранічнікі, што загінулі 22 чэрвеня 1941 г., а таксама

7 мірных жыхароў вёскі, закатаваных і кінутых у калодзеж нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў лютым 1942 г. У 1975 г. на магіле злева пастаўлена стэла з каскай уверсе, справа — сімвалічны бетонны калодзеж.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА з надпісам: «У гэтым будынку дыслацыравалася 12-я пагранічная застава. 22 чэрвеня 1941 г. асабовы састаў праявіў мужнасць і гераізм у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі».

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на абеліску: «Радавы Козыраў Д.С., 1919 — 22.6.1941 г., загінуў пры абароне граніцы СССР» (12-я пагранзастава).

СТАЯНКА. За 2 км на поўдзень ад вёскі, на пясчаным пагорку на правым беразе р. Заходні Буг. Даўжыня каля 300 м. Адкрыў і даследаваў у 1898 г. М.Ф.Беляшэўскі. Стаянка адносіцца да эпохі мезаліту, неаліту і сярэдняга перыяду бронзавага веку.

ПУГАЧОВА, былая вёска, з 1979 г. ў межах Брэста. Тут пабудаваны заводы «Тэкстыльмаш», «Мясамалмаш» (з 1986 г. — машынабудаўнічае вытворчае аб'яднанне) і інш.

У 1905 г. складалася з вёскі, трох маёнткаў, хутара і сядзібы, якія ўваходзілі ў склад Камянец-Жыровіцкай воласці Брэсцкага павета; 811 жыхароў. З 1940 г. — цэнтр сельсавета і калгаса імя Н.К.Крупскай, у 1954—1979 гг. у Гершонскім сельсавеце.

РАГОЗНА, вёска ў Знаменскім сельсавеце, у складзе калгаса «Знамя».

У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Медна ў Мяднянскай воласці; 158 мужчын, 198 жанчын. У 1873 г. уладальнікам вёскі быў князь Баратынскі. У студзені 1873 г. брэсцкі павятовы спраўнік паведамляў гродзенскаму губернатару, што сяляне в. Рагозна аказалі яму ўпартае супраціўленне, таму ў вёску была пастаўлена «ваенная экзекуцыя ў размеры адной роты». У 1890 г. сяляне Рагазнянскага сельскагаспадарчага таварыства мелі 349 дзесяцін зямлі. Працавала школа граматы. У 1905 г. — 718 жыхароў.

У 1941 г. — 150 двароў, 600 жыхароў. 124 хаты спалілі акупанты ў гады вайны, забілі 147 мірных жыхароў. У навакольных лясах дыслацыраваўся партызанскі атрад імя К.Я.Варашылава.

Базавая школа, фельчарска-акушэрскі пункт, сельская бібліятэка.

У 1997 г. — 156 двароў, 347 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ, ПАРТЫЗАН І АХВЯР ФАШЫЗМУ. На могілках. Пахаваны 5 загінуўшых у баі лётчыкаў, 44 партызаны і жыхары в. Рагозна, расстраляныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1977 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МАГІЛА РАДАВОГА КРАЎЧУКА С.П. На могілках. Памёр ад ран у шпіталі № 1057 г. Брэста.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА савецкім воінам. На галоўным корпусе санаторыя «Бярэсце». Устаноўлена 10.12.1987 г.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны тут, каля возера Рагазнянскае, у летніх лагерах размяшчаліся 34-ы стралковы і 68-ы лёгкаартылерыйскі палкі 75-й стралковай дывізіі. На досвітку 22 чэрвеня яны прынялі на сябе першыя ўдары нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У поўным акружэнні дывізія 5 дзён вяла цяжкія баі. 27 чэрвеня каля в. Макраны Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці савецкія воіны прарвалі кальцо акружэння, выйшлі ў раён Пінска і працягвалі абараняць Радзіму.

РУДАВЕЦ, вёска ў Лышчыцкім сельсавеце, у складзе СГП «Астрамечава».

У 1941 г. — 65 двароў, 320 жыхароў. 13 двароў знішчана, 2 мірныя жыхары забіты немцамі ў гады акупацыі. 16 чалавек загінулі на фронце.

У 1997 г. — 33 двары, 75 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

АБЕЛІСК З НАДПІСАМ: «Тут 22 чэрвеня 1941 г. пры абароне граніцы СССР загінуў герой-пагранічнік намеснік палітрука Бяляеў І.П.» (4-я пагранзастава, в. Рудавец, Лазавіца).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА з надпісам: «У апорным пункце заставы па-геройску змагаліся і загінулі пры абароне граніцы СССР палітрук Зуйкоў М.П., радавыя Мішусцін С.І., Іваноў В.Ф., Бахмецьеў Н.П., Іўлеў В.Ф. і іншыя. Вечная памяць героям». (За чвэрць века, пасля прыняцця гэтага дакумента, з'явіліся новыя, тады, можа, невядомыя сведчанні: Зуйкоў у маі 1945 г. праходзіў службу ў в/ч № 59898, пацвярджае архіў пагран-

войскаў. Аб Іванове — калі Іваноў В.Ф. з 3-й камендатуры, то ён жывы, а калі з 4-й пагранзаставы — тады тут было два Івановых, стралок і кулямётчык, але ў іх іншыя імёны і імёны па бацьку і лёс іх невядомы. Па ўспамінах аб радавым Мішусціне, ён трапіў у палон, і лёс яго невядомы. Радавы Бахмецьеў не Н.П., а Ц.П. — Цімафей Піліпавіч, сяржант, камандзір стралковага аддзялення з 3-й пагранзаставы. Іўлеў В.Ф. з 7-й пагранзаставы, стралок, 1920 г.н., у арміі з 1940 г., мае ініцыялы С.М. і лёс яго невядомы).

РЭЧЫЦА, былая вёска, з 1968 г. у межах Брэста (у Ленінскім р-не горада з 1978 г.). На месцы вёскі ідзе інтэнсіўнае будаўніцтва жылых дамоў і прадпрыемстваў культурна-бытавога абслугоўвання; пабудаваны піваварна-вінакурны завод і хлебазавод.

У XIX ст. вёска і маёнтак уваходзілі ў Косіцкую воласць Брэсцкага павета. У 1879 г. у вёсцы працаваў піваварны завод Шырмы (20 рабочых), які ў 1900 г. вырабіў 84 тысячы вёдраў піва (на 58 тыс. руб.). Такі самы завод быў у маёнтку (19 рабочых; уладальнік Таўбе), які выпусціў у 1881 г. прадукцыі на 18 тыс. руб. У 1905 г. тут было 440 жыхароў. У 1930-я гады на месцы маёнтка вырас пасёлак. З 1940 г. вёска і пасёлак у складзе Брэсцкага раёна. У Вялікую Айчынную вайну ў наваколлі вёскі нямецка-фашысцкія акупанты ў ліпені—снежні 1942 г. знішчылі 7,2 тысячы чалавек. Да 1959 г. вёска была цэнтрам сельсавета і калгаса «Пагранічнік». У 1959—1968 гг. пасёлак злучыўся з вёскай, уваходзілі ў Клейнікаўскі сельсавет.

СЕГЕНЕЎШЧЫНА, вёска ў Льшчыцкім сельсавеце, у складзе СГП «Астрамечава».

У 1863 г. уладальнікам маёнтка Сегенеўшчына быў Георгій Гажыц. За ўдзел у паўстанні 1863 г. паводле царскага загаду ён абавязаны быў прадаць свой маёнтак у 2-гадовы тэрмін і быць высланы з Заходняга краю. У 1890 г. маёнткам валодала Марыя Гажыч. У 1905 г. маёнтак у Лышчыцкай воласці, 75 жыхароў.

У 1941 г. — 24 двары, 106 жыхароў. За гады вайны загінулі на фронце 3 чалавекі.

У 1997 г. — 26 двароў, 64 жыхары.

СЕЛЯХІ, вёска ў Тамашоўскім сельсавеце, у складзе калгаса імя Ф.Э.Дзяржынскага.

У 1860 г. вёска ў складзе маёнтка Прыбарава, якім валодаў граф Замойскі. У ліпені 1862 г. адбылося сялянскае хваляванне, сяляне адмовіліся адбываць згонную павіннасць і плаціць чынш грашыма або хлебам. У 1870 г. 66 мужчын, 70 жанчын. У 1890 г. сяляне Селяхоўскага сельскагаспадарчага таварыства мелі 149 дзесяцін ворнай зямлі. У 1905 г. вёска (453 жыхары) у Прыбараўскай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 90 двароў, 290 жыхароў.

У гады нямецкай акупацыі знішчана 12 двароў, забіта 10 мірных жыхароў, 16 чалавек загінулі на фронце, 4—у партызанах.

Першы калгас імя А.С.Пушкіна арганізаваны ў чэрвені 1949 г., у яго ўступіла 30 гаспадарак з 36, затым пры ўзбуйненні ўвайшоў у склад калгаса імя Гагарына і пасля ў калгас імя Дзяржынскага.

У 1997 г. — 47 двароў, 90 жыхароў.

СКОКІ, вёска ў прыгараднай зоне, за 13 км на поўнач ад Брэста, на правым беразе р. Лясная, за 2 км ад чыгуначнай станцыі Скокі, у Матыкальскім сельсавеце.

У 1583 г. вёска належала земяніну пану Г.Гыжэўскаму. У 1796 г. памешчыкам Маркелам Нямцэвічам была пабудавана каменная царква са званіцай. У 1868 г. сяло ў Матыкальскай воласці; 98 мужчын, 87 жанчын. У 1886 г. былое ўладанне на р. Лясная, 23 двары, 143 жыхары, праваслаўная царква. У 1890 г. цэнтр маёнтка, якім валодаў Іван Урсын Нямцэвіч. У вёсцы быў конскі завод, працавала школа граматы. У 1905 г. вёска (356 жыхароў) і маёнтак (102 жыхары) у Матыкальскай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 82 двары, 297 жыхароў.

У лютым 1949 г. утвораны калгас «XIX з'езд КП(б)Б».

Аб'ядналіся 56 гаспадарак і 80 працаздольных чалавек. У калгасе было 310 га раллі і 120 га сенакосу, 36 коней. Сяло ўваходзіла тады ў Цюхініцкі сельсавет — да верасня 1959 г. Рашэннем агульнага сходу калгаснікаў 22 лютага 1992 г. на базе калгаса ўтварылася сельскагаспадарчае таварыства «Лясное».

У 1983 г. закончана будаўніцтва новага будынка сярэдняй школы. Клуб, магазін, сельская бібліятэка, дзіцячы садок.

У 1997 г. — 138 двароў, 653 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны воіны, што загінулі ў 1944 г., вызваляючы вёску ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1966 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

СЯДЗІБА НЯМЦЭВІЧАЎ. У цэнтры вёскі. Пабудавана ў 1770-я гады. Тут 16.2.1757 г. (паводле некаторых крыніц 1758 г.) нарадзіўся польскі пісьменнік і публіцыст Юльян Урсын Нямцэвіч.

Сядзібна-паркавы ансамбль — помнік архітэктуры барока і сядзібна-паркавага мастацтва «французскага» стылю.

Патрабуе поўнай рэстаўрацыі і капрэмонту з аднаўленнем першапачатковага выгляду.

СТАРОЕ СЯЛО, вёска ў Матыкальскім сельсавеце, у складзе СГТ «Лясное» (1992).

У інвентары 1566 г. сяло — цэнтр войтаўства (войт Карл Гавяновіч) у Берасцейскім старостве. Жыхары мелі 40 валок зямлі. Сяляне плацілі чынш — з адной валокі 73 грошы. У 1868 г. сяло — цэнтр маёнтка, якім валодаў Мілючэўскі; 249 мужчын, 298 жанчын. Сяло ў Азяцкай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. Працавала школа граматы.

У 1886 г. — 71 двор, 630 жыхароў. У 1905 г. вёска (274 жыхары) у Матыкальскай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 35 двароў, 234 жыхары.

Першы калгас «Улада Саветаў» арганізаваны сумесна з вёскай Баброўцы ў 1949 г. У калгас уступіла 61 гаспадарка з 69; працаздольных 76 чалавек, з іх 51 жанчына. Аб'ядналі 300 га раллі і 60 га сенакосу, 40 коней.

Аддзяленне сувязі (1966).

У 1997 г. — 104 двары, 300 жыхароў.

СТРАДЗЕЧ, вёска ў Гершонскім сельсавеце, у складзе калгаса «За мір».

Існуе некалькі версій наконт паходжання назвы вёскі. Адна з іх тэрміналагічнага паходжання. Страда — гарачая пара працы ў полі. А паводле легенды, жыхарам гэтай вёскі было вельмі цяжка жыць. Яны вымушаны былі пакутаваць і мужна пераносіць цяжар свайго жыцця, які на іхні лёс выпаў на працягу многіх гадоў, не страчваючы надзеі на лепшае. Шмат людзей сустрэла смерць у беднаце і галечы. Адсюль і назва такая ў вёскі Страдзеч.

У 1866 г. вёска ў складзе маёнтка Колпін, уладальніцай якога была памешчыца Сапежына; 277 жанчын.

У 1884 г. на сродкі ўрада і прыхаджан была пабудавана драўляная царква са званіцай. Прыхаджан налічвалася 1648 чалавек з трох вёсак: Страдзеч, Дурычы, Белагоры.

У 1889 г. дзейнічала народнае вучылішча, у якім вучыліся 68 хлопчыкаў, 6 дзяўчынак.

У 1905 г. сяло (1090 жыхароў), фальварак Івана Хадароўскага (17 жыхароў), чыгуначная станцыя «Страдзеч» (20 жыхароў).

У вёсцы размяшчаўся ўчастак паліцэйскіх ураднікаў Мяднянскай воласці, прыёмны пакой сельскага ўрача.

У 1940 г. — цэнтр Страдзецкага сельсавета. У 1954 г. ён аднесены да Дамачаўскага раёна і перайменаваны ў Дубіцкі (зараз Знаменскі) сельсавет. У 1956 г. адышоў да Брэсцкага раёна.

У 1941 г. — 280 двароў, 1500 жыхароў. За гады фашысцкай акупацыі знішчана 212 двароў, забіты 92 мірныя жыхары, загінулі на фронце 22 чалавекі і 1 у партызанах.

Сярэдняя школа, яслі-садок, фельчарска-акушэрскі пункт (1976), аддзяленне сувязі (1944), Храм Святых пакутніц Веры, Надзеі, Любові і Сафіі. Бібліятэка.

У 1997 г. — 450 двароў, 1422 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны воіны 160-й стралковай Чырванасцяжнай дывізіі (пазней прысвоена найменне «Брэсцкая») і іншых воінскіх часцей, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. У цэнтры вёскі. Пахаваны 86 савецкіх грамадзян, закатаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі восенню 1943 г. Вёску (280 двароў) спалілі. У 1957 г. на магіле быў пастаўлены абеліск.

МАГІЛА МАРКІНА Мікалая Пятровіча. На могілках. Малодшы сяржант М.П.Маркін загінуў у баі 22.7.1944 г.

пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1955 г. на магіле быў пастаўлены абеліск.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА АЛЯКСАНДРАВУ Міхаілу Яфімавічу. На адным з будынкаў цэнтральнай вуліцы вёскі. Герой Савецкага Саюза М.Я.Аляксандраў прапаў без вестак 15.8.1944 г.

МЕСЦА ПОДЗВІГУ АЛЯКСАНДРАВА Міхаіла Яфімавіча. За 3,5 км на захад ад вёскі, на тэрыторыі былой 13-й пагранзаставы. Тут 22—23 ліпеня 1944 г. здзейсніў подзвіг яфрэйтар М.Я.Аляксандраў. У 1974 г. на месцы подзвігу пастаўлены абеліск.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці аднавяскоўцаў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1960 г. устаноўлены скульптура воіна і 2 стэлы.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА: «У гэтым будынку дыслацыравалася 13-я пагранічная застава. 22 чэрвеня 1941 г. асабовы састаў праявіў мужнасць і гераізм у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі».

АБЕЛІСК З НАДПІСАМ:. «Тут 22 чэрвеня 1941 г. пры абароне граніцы загінула група пагранічнікаў (16 чалавек) на чале з начальнікам заставы лейтэнантам Шчагалёвым П.Н.» (13-я пагранзастава). (Аб лейтэнанце Шчагалёве маецца паведамленне ЦАПВ, што ён прапаў без вестак. Імя яго значыцца ў пахаванні на гарнізонных могілках г. Брэста.)

У 1974 г. на месцы гібелі пагранічнікаў пастаўлена стэла.

СТАЯНКА. За 1 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Субоцін, на пясчаным пагорку. Адкрыў і даследаваў у 1898 г. археолаг М.Ф.Беляшэўскі. Знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, скрабкі, нажы, фрагменты глінянага посуду. Адносіцца да позняга неаліту і сярэдняга перыяду бронзавага веку.

СЫЧЫ, вёска ў Матыкальскім сельсавеце, у складзе калгаса імя У.І.Леніна.

У інвентары 1566 г. Сычы — цэнтр войтаўства (войт Панас Ясковіч).

У прывілеі гаворыцца аб падараванні сяла пажыццёва двараніну пану Станіславу Траяноўскаму «з валокамі, з засценкамі, з плацяжамі, з ласкі гаспадарскай». Сяло мела 48 валок зямлі. Даход з адной валокі ішоў на войтаўства, з 2 валок — на царкву. Сяляне плацілі з адной валокі 97 грошаў. У 1822 г. памешчык Іосіф Высоцкі пабудаваў на свае сродкі праваслаўную каменную царкву са званіцай, якую наведвала 1486 прыхаджан з 33 вёсак.

У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Сычы, якім валодаў памешчык Малахоўскі; 149 мужчын, 162 жанчыны.

У 1886 г. сяло ў Лышчыцкай воласці, 47 двароў, царкоўнапрыходская школа, піцейны дом. У 1889 г. у вёсцы дзейнічала народнае вучылішча, у якім вучыліся 50 хлопчыкаў і 8 дзяўчынак. У 1890 г. уладальніцай маёнтка была Соф'я Малахоўская, якая мела 231 дзесяціну зямлі.

У 1905 г. сяло (245 жыхароў) і маёнтак (74 жыхары) у Лышчыцкай воласці.

У 1906 г. адбылося антыкулацкае выступленне: сяляне спалілі гумно са збожжам і хлеў у папа, які актыўна падтрымліваў царскую ўладу і быў заадно з памешчыкамі.

У 1941 г. — 100 двароў, 498 жыхароў. 5 чалавек забілі фашысты ў гады акупацыі, 22 загінулі на фронце.

У 1950 г. арганізаваны калгас імя Куйбышава, які быў ператвораны ў калгас імя Гастэлы, а пры ўзбуйненні гаспадарак увайшоў у калгас імя Леніна.

Сельская бібліятэка, аддзяленне сувязі (1953), фельчарска-акушэрскі пункт (1946), Свята-Параскеўскі храм.

У 1997 г. — 45 двароў, 74 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

СЯДЗІБНЫ ДОМ. На ўскраіне вёскі, у пейзажным парку (захаваўся часткова). Пабудаваны на мяжы XIX—XX ст. з дрэва.

Дом — помнік сядзібнай драўлянай архітэктуры.

ЦАРКВА. На паўднёвай ускраіне вёскі. Пабудавана ў 2-й палове XIX ст. з цэглы. Царква — помнік архітэктуры з традыцыйнымі рысамі мясцовага дойлідства.

ТАМАШОЎКА, цэнтр Тамашоўскага сельсавета, калгаса імя Ф.Э.Дзяржынскага. За 69 км на паўднёвы ўсход ад Брэста, канцавая станцыя чыгункі Брэст—Тамашоўка, злучана з Брэстам шашой.

У 1941 г. — 411 двароў, 4150 жыхароў. У час нямецка-фашысцкай акупацыі знішчана 129 двароў, забіта больш як 2000 чалавек; вывезены ў Германію 30, вярнуліся 25.

Калгас імя Дзяржынскага быў арганізаваны ў в. Прыбарава ў чэрвені 1949 г.

Сярэдняя школа, дзе вучыліся двойчы Герой Савецкага Саюза лётчык-касманаўт П.І.Клімук, дзяржаўны дзеяч Беларусі П.П.Пракаповіч, доктар сельскагаспадарчых навук Н.С.Васільчук. У школе створаны музей касманаўтыкі.

Амбулаторыя, аддзяленне сувязі, магазіны харчовых і прамысловых тавараў, сталовая, дзіцячы санаторый «Ёлачка».

У 1997 г. — 376 двароў, 1287 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. Каля шашы Брэст—Уладава (за 2 км ад павароту на в. Тамашоўка). Пахавана 2200 мірных жыхароў.

Летам 1942 г. нямецка-фашысцкія захопнікі стварылі ў Тамашоўцы гета. На тэрыторыі каля 1,5 км² знаходзілася больш за 2 тысячы чалавек. У канцы ліпеня 1942 г. фашысты пачалі масавае знішчэнне вязняў гета. Іх вывозілі за вёску. Адных атручвалі ў газавых камерах, іншых расстрэльвалі каля прыгатаваных ям. У 1954 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МОГІЛКІ САЛДАТ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. У цэнтры вёскі. У 1262 магілах (у тым ліку 12 брацкіх) пахаваны 1346 салдат рускай арміі і арміі кайзераўскай Германіі, што загінулі ў баях у 1915—1916 гг. Могілкі ўпарадкаваны ў 1919 г. на сродкі Міжнароднага Чырвонага Крыжа.

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ПАГРАНІЧНІКАЎ. У цэнтры вёскі. Пахаваны 22 пагранічнікі (лейтэнант В.В.Кірухін, палітрук А.Н.Белакапытаў, малодшы сяржант А.В.Філатаў і 19 радавых), што загінулі 22 чэрвеня 1941 г., абараняючы дзяржаўную мяжу СССР.

На досвітку першага дня вайны батальён гітлераўцаў пад прыкрыццём артылерыйскага агню распачаў пераправу цераз Заходні Буг каля в. Уладава. У пачатку бою загінуў начальнік 4-й рэзервовай заставы лейтэнант В.В.Кірухін.

У 1969 г. на брацкай магіле пастаўлена стэла (скульптары І.Хоміч і В.Андрушчанка).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА: «Тут дыслацыравалася 20-я пагранічная застава, пагранічнікі якой 22 чэрвеня 1941 г. пры абароне граніцы СССР праявілі гераізм, мужнасць і адвагу» (п. Александроўская Калонія).

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА: «Тут дыслацыравалася рэзервовая застава 5-й пагранкамендатуры. Асабовы састаў праявіў гераізм у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі 22 чэрвеня 1941 г.» (п. Александроўская Калонія).

ТРЫШЫН, былая вёска. З 1968 г. у межах Брэста (з 1978 г. у Маскоўскім р-не горада). Вядома з XVI ст. На пачатку XX ст. вёска, 2 маёнткі і ўрочышча з такой жа назвай уваходзілі ў склад Косіцкай воласці Брэсцкага павета; 350 чалавек.

У 1940—1968 гг. цэнтр сельсавета і калгаса «Маладая гвардыя».

ТЭЛЬМЫ, вёска, цэнтр Тэльмінскага сельсавета і саўгаса «Брэсцкі» (1993).

У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Ямна, якім валодаў памешчык Жылей, у Косіцкай воласці; 30 мужчын, 41 жанчына.

У 1890 г. сяляне Ямнінскага сельскагаспадарчага таварыства, у якое ўваходзілі сяляне вёсак Тэльмы, Чэрні, Ямна, мелі 581 дзесяціну зямлі. Уладальніцай маёнтка Ямна была памешчыца Лізавета Коласава, якая мела 235 дзесяцін зямлі.

У 1905 г. 148 жыхароў, вёска ў Косіцкай воласці Гродзенскай губерні.

У 1941 г. — 41 двор, 164 жыхары. У гады нямецкай акупацыі спалена 40 двароў.

Газаразмеркавальная станцыя, звераферма, Дом культуры, сярэдняя школа, яслі-садок, амбулаторыя (1951), аддзяленне сувязі (1953), сельская бібліятэка, сталовая, прадуктовы і прамтаварны магазіны, дзяржаўнае прадпрыемства «Аэрапорт Брэст», Брэсцкае раённае вытворча-эксплуатацыйнае прадпрыемства па энергетыцы «Райсельэнерга».

У 1997 г. — 632 двары, 1963 жыхары.

ФРАНОПАЛЬ, вёска ў Радваніцкім сельсавеце, у складзе калгаса «Расія».

У 1941 г. — 124 двары, 484 жыхары.

39 двароў і 13 мірных жыхароў знішчылі фашысты пад час акупацыі. 19 чалавек загінулі на фронце, 5 — у партызанах.

У 1997 г. — 65 двароў, 117 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

ГАРАДЗІШЧА. За 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, за 100 м ад каналізаванай старыцы р. Рыта, ва ўрочышчы Акоп, на мысападобным выступе першай

надпойменнай тэрасы. Пляцоўка акруглай формы замацавана кальцавым валам дыяметрам 30 м. У паўднёвай частцы вал пашкоджаны разворваннем. Яго вышыня з боку поймы дасягае 2—2,5 м. Пляцоўка паступова паніжаецца ад краёў к цэнтру, дзе мае глыбіню 1,4 м адносна вала. Выявілі ў 1970 г. П.Ф.Лысенка і Т.М.Каробушкіна, у розныя гады даследавалі Ю.У.Кухарэнка, Т.М.Каробушкіна, В.С.Вяргей, Н.Н.Крывальцэвіч. У 1988 г. А.В.Іоў правёў раскопкі. Гарадзішча датуецца X ст.

СЕЛІШЧА. Прымыкае да паўднёва-заходняга боку гарадзішча. Плошча каля 1 га. Знайшлі ў 1970 г. П.Ф.Лысенка і Т.М.Каробушкіна. У 1988 г. В.С.Вяргей і Н.Н.Крывальцэвіч заклалі шурф памерам 0,5х0,5 м. Культурны слой цёмна-шэрага колеру з уключэннем попелу і вугалю дасягае 0,5 м. Знойдзена больш за 10 фрагментаў гаршкоў, аналагічных посуду з гарадзішча. Селішча датуецца X ст. Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН РБ.

ХАРСЫ, вёска ў Тамашоўскім сельсавеце, у складзе калгаса імя Ф.Э.Дзяржынскага.

У 1941 г. — 88 двароў, 264 жыхары.

13 двароў і 8 мірных жыхароў знішчаны немцамі за гады акупацыі. 8 вывезены ў Германію, вярнуліся 6. 19 чалавек загінулі на фронце.

Клуб-бібліятэка, магазін.

У 1997 г. — 75 двароў, 150 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці 19 землякоў, што загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1957 г. пастаўлена стэла.

ХАРЫТОНЫ, вёска ў Чэрнінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1868 г. вёска — дзяржаўная ўласнасць у Збіражскай воласці Кобрынскага павета Гродзенскай губерні; 29 мужчын, 18 жанчын. У 1890 г. сяляне Харытонаўскага сельскагаспадарчага таварыства, якое аб'ядноўвала вёскі Гутовічы, Валоскі, Харытоны, мелі 92 дзесяціны зямлі. Працавала школа граматы. У 1905 г. — 96 жыхароў.

У 1941 г. — 21 двор, 120 жыхароў. 6 двароў знішчылі акупанты.

У 1997 г. — 13 двароў, 27 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК. За 0,25 км на паўночны ўсход ад вёскі, на могілках, злева ад дарогі Збірагі—Кашалёва. Мясцовая назва — Шведскія магілы. 7 круглых насыпаў вышынёй 0,6—0,8 м, дыяметрам 5—7 м. Усе курганы задзірванелыя, добра захаваліся, на некаторых растуць хвоі. У адным з курганоў знаходзяцца 3 сучасныя пахаванні. Адкрыла і даследавала ў 1980 г. і 1986 г. Т.М.Каробушкіна. Раскопкі не праводзіліся.

ЦЕРАБУНЬ, вёска ў Клейнікаўскім сельсавеце, у складзе калгаса «Пагранічнік».

У 1566 г. Церабунь — каралеўскае сяло ў Берасцейскім старостве. У 1609 г. князем Іванам Шуйскім была пабудавана каменная праваслаўная царква са званіцай. Прыхаджан было 1779 чалавек з 7 вёсак.

У 1868 г. маёнтак Церабунь у Матыкальскай воласці, уладанне графа Ксаверыя Гробава. У вёсцы былі курны завод, 2 піцейныя дамы, адна ярмарка ў год. Працавала царкоўнапрыходская школа. У 1905 г. сяло (47 жыхароў) і маёнтак (45 жыхароў) у Матыкальскай воласці.

У 1941 г. — 32 двары, 117 жыхароў. 6 чалавек загінулі ў час вайны.

Калгас «Новы шлях» утвораны ў вёсцы ў сакавіку 1950 г. У яго ўступілі ўсе 34 гаспадаркі, а ў 60-я гады калгас быў аб'яднаны з калгасам «Краіна Саветаў» (в. Калодна), а затым пад час узбуйнення ўвайшоў у склад калгаса «Пагранічнік» (в. Клейнікі).

Базавая школа (1963), аддзяленне сувязі (1964), Свята-Спаса-Праабражэнская царква.

У 1997 г. — 99 двароў, 180 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. У цэнтры вёскі, каля будынка былога праўлення калгаса «Краіна Саветаў». На ўшанаванне памяці землякоў (51 чалавек), што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1968 г. пастаўлена стэла.

ЧАРНАКІ, вёска ў Чарнаўчыцкім сельсавеце, у складзе калгаса «Іскра».

Назва мае тэрміналагічнае паходжанне: чэрнь, чарнакі, зараснікі лісцевых дрэў.

У 1861 г. вёска маёнтка Ямна ў Косіцкай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні.

Уласнасць памешчыка Кавалеўскага пасля абнародаванага маніфеста аб вызваленні сялян ад прыгонніцтва.

У сакавіку 1861 г. сяляне вёскі адмовіліся выконваць інвентарныя павіннасці. Для ўстанаўлення парадку быў высланы адзін батальён Велікалуцкага пяхотнага палка. Складзеныя памешчыкамі ўстаўныя граматы, якія «ўзаконьвалі» абрабаванне сялян, сустрэлі з іх боку актыўны пратэст. У кастрычніку 1862 г. сяляне зноў адмовіліся адбываць павіннасці. У 1868 г. 117 мужчын, 156 жанчын. Працавала школа граматы.

У 1905 г. вёска (700 жыхароў) у Дзмітравіцкай воласці.

У 1941 г. — 15 двароў, 68 жыхароў.

У 1997 г. — 13 двароў, 20 жыхароў.

ЧАРНАЎЧЫЦЫ, вёска за 18 км на поўнач ад Брэста, 7 км ад чыгуначнай станцыі Матыкалы, на шашы Брэст—Камянец. Цэнтр Чарнаўчыцкага сельсавета і калгаса «Іскра».

Назва вёскі паходзіць ад прозвішча Чарнаўчыц.

У пачатку XVI ст. уладальнікамі Чарнаўчыц былі магнаты літоўскага паходжання Радзівілы. У канцы XV ст. імі быў закладзены касцёл, які быў пабудаваны ў 1585 г., на паўночным захадзе ад касцёла трох'ярусная званіца з шатровым дахам. У 1671 г. Радзівіламі быў пабудаваны аднапавярховы палац з вялізнымі сенямі, у якія магла заехаць шасціконная карэта. Пры двары знаходзіліся сад і звярынец. У 1777 г. тут дзенічаў вадзяны млын, які меў 11 вадзяных колаў. У XVIII ст. мястэчка належала вядомаму натуралісту Марціну Радзівілу (1705—1781). У Чарнаўчыцах ён праводзіў фізічныя і хімічныя доследы, спрабаваў адкрыць філасофскі камень, з дапамогай якога збіраўся ператварыць у золата іншыя металы. Яго родзіч Геранім Радзівіл, вядомы сваім крывавым падаўленнем Крычаўскага паўстання, абвясціў вальнадумца вар'ятам і забраў у апеку яго маёнтак. У 1863 г. гэта было беднае мястэчка, размешчанае за 14 вёрстаў ад Брэста на гандлёвым шляху ў Пружаны.

У 1868 г. — 194 мужчыны, 205 жанчын. Маёнткам Чарнаўчыцы валодаў граф Грабоўскі.

У 1886 г. у мястэчку 71 двор, 509 жыхароў, 65 мяшчан, 2 праваслаўныя царквы, яўрэйскі малітоўны дом, сінагога, тарговыя лаўкі, шавецкая майстэрня, 2 піцейныя дамы, на працягу года праводзіліся 3 кірмашы.

У 1889 г. у народным вучылішчы вучыліся 95 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак. У 1892 г. быў заснаваны хрусталёва-шкляны завод, на якім працавалі 250 рабочых і выраблялі хрустальны посуд.

У 1905 г. у Чарнаўчыцах працаваў пакой сельскага ўрача, дзейнічала мяшчанская ўправа, размяшчаліся прыгыўны ўчастак па воінскай павіннасці і ўчастак судова-міравой акругі. Мястэчка (1316 жыхароў) у Турнянскай воласці.

У 1941 г. — 200 двароў, 1050 жыхароў. У гады вайны спалена 60 двароў, забіта 370 мірных жыхароў, 10 загінулі на фронце і 7 —у партызанах.

Калгас «Іскра» арганізаваны рашэннем агульнага сходу жыхароў вёскі Амяліна ў верасні 1949 г. У яго ўвайшлі 50 гаспадарак з 98. З 10 сакавіка 1951 г. в. Чарнаўчыцы — цэнтр калгаса «Іскра», у якім ужо было 320 гаспадарак.

Сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, клуб, 2 сталовыя, 4 магазіны, сельская бібліятэка, вучэбны цэнтр камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкома, АТ «Чарнаўчыцкі завод жалезабетонных вырабаў».

У 1997 г. — 865 двароў, 2372 жыхары.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН. У цэнтры вёскі. Пахавана каля 500 воінаў і партызан, што загінулі ў ліпені 1944 г. у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сярод пахаваных Герой Савецкага Саюза Васіль Іванавіч Загароднеў.

Побач пахаваны старшыня калгаса «Іскра» І.А.Крупскі (1885—1949), забіты ворагамі савецкай улады.

Тут пастаўлены і стэлы з імёнамі воінаў-землякоў, што загінулі на фронце ў 1941—1945 гг.

МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ. У цэнтры вёскі. 23.6.1941 г. нямецка-фашысцкія захопнікі расстралялі групу мірных жыхароў. У 1950 г. на магіле пастаўлены абеліск, у 1979 г. — новы помнік.

ТРОІЦКІ КАСЦЁЛ. У цэнтры вёскі. Пабудаваны ў 1583 (1585?) г. з цэглы. Касцёл — унікальны помнік беларускай архітэктуры з элементамі готыкі і рэне-

сансу, а таксама рысамі абароннага дойлідства.

ЦАРКВА ПАРАСКЕВЫ ПЯТНІЦЫ. У цэнтры вёскі, каля шашы Брэст—Камянец. Пабудавана да 1733 г. з дрэва, перабудавана ў XIX ст.

ЧЭРНІ, вёска ў прыгараднай зоне, за 9 км на паўночны ўсход ад Брэста, 6 км ад чыгуначнай станцыі Брэст-Усходні. Цэнтр сельсавета і саўгаса «Маладая гвардыя».

У 1868 г. вёска ў складзе маёнтка Чэрні, якім валодаў Фелікс Ягмін; 30 мужчын, 31 жанчына. У 1877 г. пры дапамозе ўрада жыхары вёскі сумесна з жыхарамі навакольных вёсак пабудавалі драўляную царкву.

У 1886 г. сяло ў Косіцкай воласці, 8 двароў, 114 жыхароў, царкоўнапрыходская школа.

У 1889 г. працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 51 хлопчык і 2 дзяўчынкі. У 1890 г. сялом валодаў Калікст Ягмін.

У 1905 г. сяло (151 жыхар) у Косіцкай воласці Брэсцкага павета Гродзенскай губерні. У сяле размяшчаўся ўчастак паліцэйскіх ураднікаў Мяднянскай воласці.

У 1941 г. — 61 двор, 362 жыхары. У час вайны знішчана 8 двароў, 4 чалавекі вывезены ў Германію, 1 вярнуўся, 9 загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

У жніўні 1950 г. утвораны калгас «Маладая гвардыя». З 80 гаспадарак увайшлі 66. У 1969 г. Пастановай ЦК КПБ і Саўміна БССР калгас быў ператвораны ў саўгас «Маладая гвардыя».

Сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, аптэка, магазіны.

У 1997 г. — 618 двароў, 1806 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. Каля царквы. Пахавана каля 300 воінаў, што загінулі ў ліпені 1944 г. пры вызваленні вёсак Бярозаўка, Збірагі, Малыя Косічы, Чэрні ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1966 г. на магіле пастаўлены абеліск, а таксама пліты з імёнамі загінуўшых.

МАГІЛА САВАНЕЎСКАГА Аляксандра Паўлавіча (на могілках), дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У 1976 г. на магіле пастаўлены абеліск.

ЧЭРСК, вёска ў Дамачаўскім пасялковым савеце, у складзе саўгаса «Дамачаўскі».

У 1941 г. — 135 двароў, 520 жыхароў. Зона дыслакацыі партызанскага атрада імя К.Я.Варашылава. 35 двароў, 25 мірных жыхароў знішчылі фашысты за гады акупацыі. 20 чалавек загінулі на фронце, адзін — у партызанах.

Пачатковая школа, фельчарска-акушэрскі пункт (1946), аддзяленне сувязі (1944), сельская бібліятэка.

У 1997 г. — 139 двароў, 250 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ. На могілках. Пахаваны воіны і камандзіры, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

МІХАЙЛАЎСКАЯ ЦАРКВА І ЗВАНІЦА. На галоўнай вуліцы. Пабудавана да 1701 г. з дрэва. Помнік архітэктуры з характэрнымі рысамі драўлянага дойлідства Беларускага Палесся.

ШУМАКІ, вёска ў Клейнікаўскім сельсавеце, у складзе калгаса «Пагранічнік».

У 1609 г. пабудавана каменная царква. У 1878 г. сяло ў складзе маёнтка Церабунь, у якім жылі 142 жыхары.

У 1881 г. — 20 двароў, 185 жыхароў, праваслаўная царква, карчма. У 1905 г. вёска ў Матыкальскай воласці, 335 жыхароў.

У 1941 г. — 61 двор, 230 жыхароў. 12 двароў былі знішчаны немцамі ў гады акупацыі, 4 мірныя жыхары забіты. 9 чалавек вывезены ў Германію, 14 загінулі на фронце, 4 — у партызанах.

У студзені 1950 г. утвораны першы калгас «Ленінец», у які ўвайшла 51 гаспадарка з 60, затым гэты калгас стаў называцца «Краіна Саветаў», а пасля ўзбуйнення — «Пагранічнік».

Фельчарска-акушэрскі пункт (1955).

У 1997 г. — 60 двароў, 100 жыхароў.

Помнікі гісторыі і культуры

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА ШУКУРАВУ Дыльмурату. Каля моста цераз р. Лясная. Устаноўлена ў 1985 г. у памяць аб радавым Д.Шукураве, што загінуў 23 сакавіка 1985 г. пры ліквідацыі ледзяных затораў на рацэ.

СТАЯНКА. За 2,5—3 км на паўночны захад ад вёскі, ва ўрочышчы Калоднае. На паверхні марэннага пагорка — карэннага берага Заходняга Буга. Адкрыў і даследаваў у 1920 г. З.Шміт. Даўжыня ўздоўж берага ракі больш за 300 м. Сярод знаходак многа прылад працы, выраб-

леных з крамянёвых пласцінак. Помнік адносіцца да мезаліту.

Знаходкі захоўваюцца ў археалагічным музеі ў Варшаве.

ПРААБРАЖЭНСКАЯ ЦАРКВА. На захад ад вёскі, на левым беразе р. Лясная. Пабудавана ў 1609 г. з цэглы. Царква — помнік архітэктуры з элементамі готыкі і рэнесансу.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА З НАДПІСАМ: «У гэтым будынку дыслацыравалася 6-я пагранічная застава. 22 чэрвеня асабовы састаў праявіў мужнасць і гераізм у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі».

ШЭБРЫН, вёска ў прыгараднай зоне, за 13 км на ўсход ад Брэста, на правым беразе р. Мухавец, 1,5 км ад шашы Брэст—Кобрын, у Тэльмінскім сельсавеце.

У 1794 г. епіскапам Канстанцінам Сасноўскім была пабудавана каменная царква са званіцай. Яе наведвалі 1494 прыхаджаніны з 5 вёсак. У 1849 г. дзейнічаў паром на пераправе цераз р. Мухавец. У 1878 г. 79 мужчын, 98 жанчын. У 1886 г. сяло на р. Мухавец у Косіцкай воласці; 17 двароў, 285 жыхароў, праваслаўная царква, царкоўнапрыходская школа, піцейны дом.

У 1889 г. працавала народнае вучылішча, у якім вучыліся 57 хлопчыкаў і 11 дзяўчынак. У 1890 г. Шэбрынскае сельскагаспадарчае таварыства мела 484 дзесяціны зямлі, уладальнікам маёнтка Шэбрын быў Уладзімір Дзмітроўскі, які меў 150,5 дзесяціны зямлі.

У 1900 г. быў заснаваны торфараспрацоўчы завод, на якім працавалі 20 рабочых, у гэтым жа годзе на заводзе ўведзены паравы рухавік. У 1905 г. сяло (541 жыхар) і маёнтак (62 жыхары) у Косіцкай воласці Брэсцкага павета.

У 1941 г. — 90 двароў, 290 жыхароў. У час вайны немцы спалілі 12 гаспадарак, забілі 10 мірных жыхароў. Загінулі на фронце 16, у партызанах 4 чалавекі.

У верасні 1948 г. у вёсцы арганізаваны калгас «Перамога». Уступіла 87 з 91 гаспадаркі. Было аб'яднана 350 га раллі і 60 га сенакосу, 1 карова і 57 коней.

Аддзяленне і малочнатаварная ферма саўгаса «Брэсцкі»; клуб, магазін, аздараўленчы лагер «Церамок». Побач з вёскай — Брэсцкі аэрапорт, зона адпачынку «Шэбрынскі лес».

У 1997 г. — 54 двары, 88 жыхароў.

БУДЫНАК АЭРАПОРТА «БРЭСТ». За 12 км на ўсход ад Брэста, за 2 км ад шашы Брэст—Масква, у свабоднай эканамічнай зоне. Аэрапорт — паветраная брама ў заходняй частцы краіны. Пабудаваны ў 1986 г. (архітэктары Р.Шылай, В.Арсеньеў, А.Ляшчук, В.Кяскевіч, В.Гапіенка, інжынеры А.Грыцыенка, Г.Кароль, М.Цынман).

Помнікі гісторыі і культуры

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на сцяне магазіна на ўшанаванне памяці жыхароў вёскі, расстраляных у 1943 г. фашыстамі.

КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК. За 0,4 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Мухавец, на ўзлеску. 13 насыпаў вышынёй 0,6—1,2 м, дыяметрам 4—6 м размяшчаюцца ланцужком перпендыкулярна рацэ, уздоўж палявой дарогі. За 8 м на паўночны ўсход ад асноўнага ланцужка каля ракі кампактнай групай размяшчаюцца яшчэ 4 насыпы, аддаленыя адзін ад аднаго на 2—3 м. Курганы добра захаваліся, здзірванелыя, на некаторых растуць высокія хвоі. Вядомы з канца XIX ст. Даследавала ў 1980 г., 1981—1983 гг., 1985—1986 гг. Т.М.Каробушкіна. Могільнік датуецца VIII—X ст. Знаходкі захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі НАН РБ.

ПРАЧЫСЦЕНСКАЯ ЦАРКВА. На галоўнай вуліцы, за 2 км ад шашы Брэст—Мінск. Пабудавана ў 1793 г. з цэглы. Помнік архітэктуры з мясцовай трактоўкай формаў барока.

ЮЖНЫ, былы пасёлак, з 1958 г. — у межах Брэста (з 1978 г. у Маскоўскім раёне горада).

У XIX ст. на месцы пасёлка быў маёнтак у Камянец-Жыровіцкай воласці Брэсцкага павета. На пачатку XX ст. зямлю маёнтка выкупіла ваеннае ведамства Расіі для будаўніцтва летніх казармаў. У перыяд знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе буржуазнай Польшчы на месцы казармаў у 1936—1938 гг. пабудаваны ваенны гарадок. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР пасёлак быў у складзе Пугачоўскага, з 1954 г. — Гершонскага сельсаветаў Брэсцкага раёна.

ЯМНА, вёска ў Тэльмінскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Брэсцкі».

Назва вёскі паходзіць ад слова

«яма» ў значэнні кар'ер, акоп, упадзіна і г.д.

У пачатку XIX ст. вёска, цэнтр маёнтка ў Косіцкай воласці. У 1849 г. тут на пераправе цераз р. Мухавец дзейнічаў паром, які мог падняць да 40 чалавек. У 1861 г. уладальнікам маёнтка быў памешчык Кавальскі. У красавіку гэтага ж года тут адбыліся сялянскія хваляванні. Сяляне адмовіліся выконваць інвентарныя павіннасці. Для падаўлення хваляванняў была выкарыстана ваенная сіла, быў прысланы адзін батальён Велікалуцкага пяхотнага палка, сяляне былі пакараны розгамі. Двое сялян Антон Грыб і Антон Бялевіч, якіх абвінавацілі ў падбухторванні, былі арыштаваны і зняволены пад варту ў брэсцкай турме. У 1888 г. у вёсцы 58 мужчын, 67 жанчын, уладальнікам маёнтка быў памешчык Жылей. У 1890 г. сяляне Ямніцкага сельскагаспадарчага таварыства, у якое ўваходзілі сяляне вёсак Ямна, Тэльмы, Чэрні, мелі 320 дзесяцін зямлі. Працавала школа граматы.

У 1941 г. — 70 двароў, 220 жыхароў. Фашысты ў гады акупацыі знішчылі 51 двор, забілі 11 мірных жыхароў. 11 чалавек загінулі на фронце, 3 — у партызанах.

У 1950 г. утвораны калгас імя П.К.Панамарэнкі з 34 гаспадарак, пазней увайшоў у склад саўгаса «Брэсцкі».

У 1997 г. — 85 двароў, 187 жыхароў.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА на сцяне мясцовага магазіна на ўшанаванне памяці жыхароў вёскі, якія загінулі ў 1944 г. у час аблавы.

ЯЦКАВІЧЫ, вёска ў Лышчыцкім сельсавеце.

ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ. Пры ўездзе ў вёску, за 0,2 км злева ад дарогі. На ўшанаванне памяці землякоў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У 1980 г. установлена скульптура маці ў жалобе.

В.В.Віталева, В.П.Россіхін.

СКАРАЧЭННІ, ПРЫНЯТЫЯ Ў КНІЗЕ «ПАМЯЦЬ»

абр	—	артылерыйская брыгада
ава	—	асобая ваенная акруга
авд	—	авіяцыйная дывізія
авддд	—	авіяцыйная дывізія далёкага дзеяння
авп	—	авіяполк
ад	—	артылерыйская дывізія
азптадн (оиптадн)	—	асобны знішчальны процітанкавы артылерыйскі дывізіён
азсп (озсп)	—	асобны запасны стралковы полк
аінжбр	—	асобная інжынерная брыгада
ак	—	армейскі корпус
амп	—	артылерыйска-мінамётны полк
ап	—	артылерыйскі полк
арз	—	абозна-рэчавае забеспячэнне
атп	—	асобны танкавы полк
ашр	—	армейская штрафная рота
аэ	—	авіяэскадрылля
в. (д.)	—	вёска
ваяв.	—	ваяводства
ВМП	—	вышэйшая мера пакарання
вобл.	—	вобласць
Воп.	—	вопіс
г.	—	год, горад
гап	—	гаўбічны артылерыйскі полк
г.п.	—	гарадскі пасёлак
гв.	—	гвардзейскі
дэс.	—	дэсантны
зенап	—	зенітны артылерыйскі полк
зптап	—	знішчальны процітанкавы артылерыйскі полк
зсп	—	запасны стралковы полк
зстабр	—	знішчальная супрацьтанкавая артылерыйская брыгада
зстап	—	знішчальны супрацьтанкавы артылерыйскі полк
зстдн	—	знішчальны супрацьтанкавы дывізіён
иап	—	истребительный авиационный полк
інш.	—	іншыя
иптд	—	истребительно-противотанковая дивизия
ист.	—	истребительный (знішчальны)
каз. п.	—	казачы полк
кд	—	кавалерыйская дывізія
кк	—	кавалерыйскі корпус
кп	—	кавалерыйскі полк
Л.	—	ліст
м.	—	мястэчка
мб	—	мотабатальён
мба	—	матарызаваны батальён аўтаматчыкаў
мсб	—	мотастралковы батальён
мсбр	—	мотастралковая брыгада
мсп	—	мотастралковы полк
мср	—	мотастралковая рота
МТС	—	машынна-трактарная станцыя
н. (р.)	—	нарадзіўся
н.п.	—	населены пункт

отд.	—	отдельный (асобны)
оап	—	отдельный артиллерийский полк
оатб	—	отдельный автотранспортный батальон
одсб	—	отдельный дорожно-строительный батальон
оипдн	—	отдельный истребительно-противотанковый дивизион
омспб	—	отдельный мотострелковый пулеметный батальон
отп	—	отдельный танковый полк
отпп	—	отдельный танковый полк прорыва
пабр	—	пушачна-артылерыйская брыгада
пап	—	пушачна-артылерыйскі полк
пас.(пос.)	—	пасёлак
пп	—	пяхотны полк
ПП АДПУ	—	паўнамоцнае прадстаўніцтва пры Аб'яднаным дзяржаўным палітычным упраўленні
ППЛ	—	папраўча-працоўны лагер
прп	—	проціпяхотны
прт	—	процітанкавы
р.	—	рака
рвб	—	ремонтно-восстановительный батальон
РГК	—	Рэзерв Галоўнага Камандавання
р-н	—	раён
с.	—	сяло
сап	—	самаходны артылерыйскі полк
сб	—	стралковы батальён
сбр	—	стралковая брыгада
сд	—	стралковая дывізія
ск	—	стралковы корпус
сп	—	стралковы полк
С.	—	старонка
Спр.	—	справа
ст.	—	старшы, станцыя, станіца
Т.	—	том
тб	—	танкавы батальён
тбр	—	танкавая брыгада
тд	—	танкавая дывізія
тк	—	танкавы корпус
тп	—	танкавы полк
тсап	—	тяжелый самоходный артиллерийский полк
ттсп	—	тяжелый танковый самоходный полк
УР	—	умацаваны раён
Ф.	—	фонд
х.	—	хутар
шак	—	штурмавы авіяцыйны корпус
шап	—	штурмавы авіяцыйны полк
шісбр	—	штурмавая інжынерна-сапёрная брыгада

ЗМЕСТ

Да чытача 17
Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна 19

Ад часоў першабытных — 1917
ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ 21
Каменны і бронзавы вякі 21
Жалезны век 23
Эпоха феадалізму 26
Узнікненне гарадоў на тэрыторыі Сярэдняга Пабужжа 32
Берасцейскія землі ў старажытнасці 34
БЕРАСЦЕЙШЧЫНА Ў СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ 38
Дакументы сведчаць 47
Асобныя шляхецкія, царкоўныя і магнацкія ўладанні на тэрыторыі Брэсцкага раёна ў XVI—XVIII ст. 47
Акт фундушу Астрамечаўскай царквы 50
Акт фундушу вяльможных паноў Храноўскіх кустынскаму плябану 51
Вытрымка прызнання ўгодлівага запісу паміж яго міласцю князем Чартарыйскім, канцлерам ВКЛ і яго міласцю панам Вільчэўскім 51
Казімір Лышчынскі 52
У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ 53
Адміністрацыйнае дзяленне, колькасць насельніцтва, яго нацыянальная і рэлігійная прыналежнасць 53
Сацыяльна-эканамічнае развіццё Брэсцкага павета 55
Войны і паўстанні XIX стагоддзя на тэрыторыі Брэсцкага павета 61
Дакументы сведчаць 66
Справаздача павятовага прадвадзіцеля дваранства за 1831 год у выглядзе пытанняў і адказаў 66
Са справаздачы ў гродзенскі губернскі статыстычны камітэт 66
Рапарт Брэсцкага земскага суда аб становішчы ў Брэсцкім павеце ў 1837 годзе 67
Са справаздачы губернатара Гродзенскай губерні за 1837 год 68

Ліст генерал-губернатара гродзенскаму цывільнаму губернатару аб устанаўленні паліцэйскага нагляду за князем Сапегам і іншымі памешчыкамі Брэсцкага павета... 69
Пра становішча сельскай гаспадаркі Брэсцкага павета... 69
Спіс населеных пунктаў Брэсцкага павета, двароў і сядзіб у іх з пералікам вуліц і ўладальнікаў на 1876 год 70
Юльян Урсын Нямцэвіч 71
На мяжы стагоддзяў 72
Дакументы сведчаць 82
Аб прыгнёце сялян вёсак Навалессе, Навасады і іншых Брэсцкага павета памешчыкам Лабачовым 82
Паведамленні газет пра цяжкае становішча сялян 86
Светач культуры 87

1917—1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ 89
Дакументы сведчаць 90
Справаздача па Брэсцкім павеце за 1919 год 90
З пратакола бежанцаў-беларусаў Гродзенскай губерні 91
У СКЛАДЗЕ ПОЛЬШЧЫ (1921—1939) 92
Дакументы сведчаць 100
Спіс вёсак, сядзіб і хутароў Брэсцкага павета 100
Спіс існуючых на тэрыторыі Брэсцкага павета розных прадпрыемстваў 104
Спіс прамысловых прадпрыемстваў у Брэсцкім павеце 105
Спіс млыноў, якія знаходзіліся на тэрыторыі Брэсцкага павета 107
Агляд геаграфічнага, дэмаграфічнага, сацыяльна-культурнага становішча Брэсцкага павета 107
Тлумачэнне ваяводы палескага аб продажы зямлі мясцоваму насельніцтву 110
Меркаванні ваяводы палескага аб стане адукацыі і польскай прапагандзе 111
Звесткі аб выніках прызыву ў польскую армію па Брэсцкім павеце ў 1932 г. 111
Нацыянальна-вызваленчы рух 111
Змагаліся за лепшую долю 117
Дакументы сведчаць 125
Данясенне Брэсцкага павятовага каменданта паліцыі ў павятовае староства аб святкаванні насельніцтвам 1 Мая 125
Справаздача чэрненскага паліцэйскага пастарунка Брэсцкага павета аб разглядзе абставін антыфашысцкай дэманстрацыі моладзі ў вёсцы Скорбічы Косіцкай гміны 125
Данясенне брэсцкага павятовага старасты палескаму ваяводскаму ўпраўленню... 126
Данясенне брэсцкага павятовага старасты палескаму ваяводскаму ўпраўленню 127
БРЭСТЧЫНА Ў 1939—1941 ГАДАХ 127
Пачатак 2-й сусветнай вайны 127
Уз'яднанне 128

Сустрэча Чырвонай Арміі ... 129
Фарміраванне новых органаў улады.
Тэрытарыяльна-адміністрацыйная рэформа ... 129
Ідэалагічная кампанія ... 132
Новая школа ... 134
Рэарганізацыя сістэмы аховы здароўя і сацыяльнага забеспячэння ... 136
Гандаль. Бытавыя праблемы ... 136
Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ... 138
Падатковая палітыка ... 140
Працоўныя будні ... 141
Мясцовая прамысловасць ... 143
Абарончая работа ... 144
Дакументы сведчаць ... 144
З загаду камандуючага войскамі Беларускага фронту ... 144
З пастановы камітэта па арганізацыі выбараў у Народны сход Заходняй Беларусі... ... 144
З дэкларацыі Народнага сходу Заходняй Беларусі аб дзяржаўнай уладзе ... 145
З дэкларацыі Беларускага Народнага сходу аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР ... 145
З дэкларацыі Беларускага Народнага сходу аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель ... 145
Пастанова бюро Брэсцкага абкома КП(б)Б аб утварэнні Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ... 145
Пастанова бюро Брэсцкага абкома КП(б)Б аб утварэнні Дамачаўскага раёна Брэсцкай вобласці ... 146
Матэрыялы па народнай адукацыі і культпрасветрабоце ў Брэсцкім раёне ў перыяд з 17 верасня 1939 г. па 17 верасня 1940 г. ... 146
Прысуд адменены ... 147
Вернутыя імёны ... 147

1941 — 1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ ... 159
Першыя дні ... 159
Гарачыя дні абароны ... 165
Дакументы сведчаць ... 167
З аператыўнага данясення ў штаб нямецкай групы армій «Цэнтр» ... 167
З аператыўнай зводкі 28-га стралковага корпуса ... 167
Зводка Саўінфармбюро паведамляла ... 167
Вёска ратавала савецкіх воінаў ... 168
Лазарэт Сарачынскага ... 169
Першымі ўступілі ў бой пагранічнікі ... 169
Заўсёды ў баі ... 173
У першыя гадзіны і дні вайны ... 174
Вытрымалі ... 176
Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Брэсцкага раёна ... 178
Трагедыя вёскі Медна ... 185
Як забівалі жыхароў вёскі Рагозна ... 186

Невядомыя... 187
Буйнейшае злачынства 187
Дакументы сведчаць 188
З аператыўнай зводкі за перыяд з 26 лістапада па 2 снежня 1941 г. 188
Са справаздачы акружнога камісара Брэст-Літоўска 188
Справаздача камандзіра 11-й роты аб карнай аперацыі з 5 па 11 кастрычніка 1942 г. 188
З журнала баявых дзеянняў 3-га батальёна 15-га нямецкага палка з 11 верасня па 24 лістапада 1942 г. 189
Са справаздачы акружнога камісара Брэст-Літоўска аб становішчы з рабочай сілай 189
Тэлеграма рэйхсфюрэра Украіны Э.Коха рэйхсфюрэру СС Г.Гімлеру аб знішчэнні вёсак у мэтах барацьбы з партызанамі 190
Справаздача акружнога сельскагаспадарчага кіраўніка за чэрвень 1943 г. 190
Са сведчання К.А.Трафімука аб расстрэлах яўрэяў у кастрычніку 1943 г. 190
Акт № 2 аб злачынствах нямецка-фашысцкіх захопнікаў у вёсцы Рэчыца Брэсцкага раёна 191
З даклада Брэсцкай абласной камісіі аб злачынствах гітлераўцаў на тэрыторыі вобласці 192
З выступлення памочніка галоўнага абвінаваўцы ад СССР Л.Н.Смірнова на Нюрнбергскім працэсе 192
Акт аб месцы масавага пахавання савецкіх ваеннапалонных на тэрыторыі Паўночнага гарадка ў Брэсце 193
Страты Брэсцкага раёна за гады вайны 193
Антыфашысцкае падполле ў раёне 194
На чале народнага супраціўлення 194
Аб'яднанне намаганняў патрыётаў горада і раёна 199
Стварэнне і дзейнасць раённага антыфашысцкага камітэта 201
Аб'яднанне антыфашыстаў раёна з Брэсцкім партызанскім злучэннем 204
На завяршальным этапе 207
Моладзь у барацьбе з акупантамі 208
Удзельнікі антыфашысцкага падполля Брэсцкага раёна 211
Партызанскі рух на тэрыторыі Брэсцкага раёна 217
Партызанскія фарміраванні на тэрыторыі Брэсцкага раёна 222
Партызанская брыгада імя І.В.Сталіна 222
Атрад імя М.М.Чарнака 223
Як мы стваралі партызанскі атрад 223
Узрывы ўначы 226
Атрад імя М.В.Фрунзе 228
Так яны пачыналі... 228
Атрад М.І.Каліева 230
Брыгада імя У.І.Леніна 230
Атрад імя К.Я.Варашылава 230
Атрад імя Л.П.Зяленіна 230
Атрад імя Г.К.Жукава 230
150-я брыгада імя Ф.М.Языковіча 231

Брестский подпольный райком ЛКСМБ ... 231
Дакументы сведчаць ... 231
Аб баявой аперацыі партызанскага атрада імя К.Я.Варашылава... ... 231
Аб разгроме варожага гарнізона ў пас. Дамачава... ... 232
У партызанскім атрадзе ... 233
Расказ пра сябра ... 234
Разам з сынамі ... 236
Сям'я патрыётаў ... 236
Васіліса Селівонік ... 237
Вызваленне ... 237
Удзельнікі былых баёў расказваюць пра вызваленне Брэстчыны ... 240
Дакументы сведчаць ... 243
Аб наступальных баях 38-й гвардзейскай стралковай дывізіі ... 243
Аб баявым шляху 130-й стралковай дывізіі ... 243
З гістарычнага фармуляра 76-й гвардзейскай стралковай дывізіі ... 244
З аператыўных зводак 1-й стралковай дывізіі ... 244
З журнала баявых дзеянняў 160-й стралковай дывізіі ... 244
Загад № 0104 штаба дывізіі 55-й гвардзейскай стралковай дывізіі ... 244
З аператыўных зводак 20-й стралковай дывізіі ... 245
З аператыўных зводак 152-й стралковай дывізіі ... 245
З журнала баявых дзеянняў 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі ... 245
З аператыўных зводак 212-й стралковай дывізіі ... 246
Зводкі Саўінфармбюро паведамлялі ... 246
Аб баявых дзеяннях партызан у час вызвалення раёна ... 247
Дывізіённая газета «На боевом посту» расказвала ... 248
Вайна працягвалася... ... 248
У баях за Віслай ... 248
Першы прызыў ... 249
Ваенны высакосны год ... 249
На магнушаўскім плацдарме ... 249
Вызначыліся пры вызваленні ... 250
Аляксандраў М.Я. ... 250
Валошын М.Ф. ... 251
Гураў І.П. ... 251
Загароднеў В.І. ... 252
Лакціёнаў П.Б. ... 253
Яны вярнуліся пераможцамі ... 254
АХВЯРЫ ВАЙНЫ ... 271
Пагранічнікі 17-га Брэсцкага Чырванасцяжнага пагранатрада,
якія загінулі, памерлі ад ран ці прапалі без вестак у гады вайны ... 271
Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі ці прапалі без вестак
на тэрыторыі раёна ў 1941 г. ... 290
Сем'і ваеннаслужачых Брэсцкага гарнізона,
расстраляныя фашыстамі ў 1941 г. ... 295
Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі ў баях, прапалі без вестак,
памерлі ад ран на тэрыторыі раёна ў 1942—1943 гг. ... 297
Мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору ... 297
Партызаны, якія загінулі ў Брэсцкім раёне ... 326

Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі ці прапалі без вестак
у час вызвалення раёна 328
Савецкія воіны, якія пахаваны ў Польшчы 399
Воіны-землякі, якія загінулі і прапалі без вестак
на франтах Вялікай Айчыннай вайны ў 1941—1945 гг. 409

1945 — да нашых дзён

У МІРНАЙ ПРАЦЫ 455
Вызначыліся ў працы 468
Героі, ардэнаносцы 468
Заслужаныя работнікі Рэспублікі Беларусь 475
Навукоўцы 477
Пісьменнікі 478
Раёнка паведамляла 479
Толькі 100 гадоў 485
Брэсцкі РАУС 485
З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ 487
Этнічныя асаблівасці раёна 487
Традыцыйныя заняткі насельніцтва 489
Жыллё і гаспадарчыя пабудовы 494
Адзенне 497
Ежа 499
Народная медыцына 501
Каляндарныя абрады 502
Сямейныя абрады 507
Заключэнне 514
Помнікі архітэктуры 515
Народныя калектывы 529
Музычныя школы 531
Грамадскія музеі раёна 531
З гісторыі населеных пунктаў 531

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў і дакументаў для кнігі «Памяць. Брэсцкі раён» прымалі ўдзел:

Т.В.Басацкая, Л.Р.Бібік, А.П.Гаршчарук, А.А.Грабёнкіна, В.В.Віталева, С.П.Жлоба, Г.М.Зварыч, У.В.Здановіч, С.Р.Іваненка, Т.М.Каробушкіна, П.Д.Карабейка, А.А.Кандыба, М.Я.Кудрашова, А.М.Кулагін, А.М.Курэц, У.П.Ласковіч, Т.П.Лішко, А.А.Майсейчык, Л.П.Нікіценкава, У.І.Нікіценкаў, К.М.Папко, І.М.Паршанкоў, А.В.Пятроўская, Я.С.Разянблат, В.П.Россіхін, Ю.С.Рубашэўскі, Н.Дз.Рыбалка, Э.М.Савіцкі, Р.А.Свістун, А.М.Суораў, Л.В.Сяргеева, Л.Г.Філатаў, В.І.Фядосік, І.Э.Яленская.

Над спісамі працавалі:

У.І.Адамушка, В.П.Анціпава, В.І.Бай, В.У.Бірукова, Я.П.Буяк, Г.У.Бяссонаў, М.М.Горба, Т.А.Гарчанюк, Г.М.Зварыч, Ю.А.Кладухін, Т.П.Лішко, А.К.Міхайлоўскі, В.П.Россіхін, А.Ф.Сабалеўская.

Пераклад матэрыялаў ажыццявілі:

А.В.Башчук, С.Р.Іваненка, В.Г.Ліневіч, У.У.Тураў, В.А.Фелькіна, А.А.Чабанюк.

Вялікую дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі аказалі:

Брэсцкі дзяржаўны абласны архіў, Брэсцкі абласны краязнаўчы музей, Музей мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Гродзенскі абласны дзяржаўны архіў, Дзяржаўны камітэт па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь, Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (г. Падольск), Цэнтральны архіў пагранвойскаў Расіі (г. Пушкін), Брэсцкі дзяржаўны універсітэт, Архіў Ваенна-медыцынскага музея (г. Санкт-Пецярбург), Брэсцкі гарадскі і раённы ваенныя камісарыяты.

Супрацоўнікі выдавецкага цэнтра БЕЛТА, якія працавалі над кнігай:

Г.К.Кісялёў — галоўны рэдактар, З.І.Малейка — намеснік галоўнага рэдактара, В.І.Багдановіч, Л.І.Рудніцкая — рэдактары-стылісты.

Фота: Р.І.Грыцука, І.І.Долькінай, А.Р.Камолава, А.М.Кулагіна, Ю.С.Рубашэўскага, Г.П.Страхава (каляровыя здымкі), з фондаў музеяў, дзяржаўных і асабістых архіваў.

Картограф Г.Р.Шыкунова.

Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Брэсцкага раёна. – Мн.:
П15 БЕЛТА, 1998. – 574 с.

ISBN 985-6302-13-7.

У кнізе асвятляецца гісторыя раёна ад старажытнасці да нашых дзён. У хроніку ўключаны гістарычныя і біяграфічныя нарысы, артыкулы пра цікавыя падзеі і факты, што адбываліся ў жыцці гэтага краю на працягу яго шматвяковай гісторыі, пра гістарычных асоб і іншых знакамітых людзей, якія былі звязаны лёсам з Брэстчынай. Выкарыстаны шматлікія дакументы і матэрыялы з архіўных і друкаваных крыніц, газетныя публікацыі розных гадоў, успаміны.

Асаблівая ўвага нададзена ўвекавечанню памяці загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну: савецкіх воінаў і пагранічнікаў, што загінулі ў першыя дні вайны на тэрыторыі раёна, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў – ахвяр фашысцкага тэрору, савецкіх воінаў, што загінулі пры вызваленні раёна і пахаваны на яго тэрыторыі, і воінаў-землякоў.

Прыводзяцца таксама звесткі пра жыхароў і ўраджэнцаў раёна, што сталі ахвярамі беспадстаўных палітычных рэпрэсій.

Асобныя старонкі хронікі прысвечаны захаванню матэрыяльнай і духоўнай спадчыны: даецца апісанне этнаграфічных асаблівасцей раёна і архітэктурных помнікаў, расказваецца пра грамадскія музеі, народныя мастацкія калектывы і інш.

Кніга будзе карыснай усім, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

ББК 63.3 (4 Беи)

15040388

БРЭСЦКАЯ ◦ЯСНАЯ
БІБЛІЯТЭКА ◦НУ М. ◦ОРКАГА

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Брэсцкага раёна

Рэдактары:
У.А.Васілевіч, Н.А.Дзянісава,
М.І.Рамяніца, Н.А.Рудніцкая,
Р.А.Чарнаглазава
Мастацкі рэдактар
А.В.Лапін
Тэхнічны рэдактар
А.В.Кажухар
Карэктары:
Г.Т.Глушчанка, Н.В.Гусельцава,
Л.С.Зіза, Л.І.Кароткіх
Падрыхтоўка арыгінал-макета:
А.В.Маісеенка, П.В.Маісеенка,
М.Э.Малярэвіч
Камп'ютэрны набор:
Т.В.Бурачэўская, А.В.Дарчук,
С.А.Долгая, З.У.Марцінчык

Выданне падрыхтавана выдавецкім цэнтрам БЕЛТА.
Падпісана да друку з арыгінал-макета 29.09.98.
Фармат 70х100 1/16. Папера афсетная.
Гарнітура Кудрашоўская энцыклапедычная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 46,6. Ум. фарб.-адб. 53,1.
Ул.-выд. арк. 56. Тыраж 4000 экз. Заказ 1847.
Беларускае тэлеграфнае агенцтва.
Ліцэнзія ЛВ № 60 ад 29.11.1997.
Рэспубліка Беларусь. 220600, Мінск, вул. Кірава, 26.
Ордэна працоўнага Чырвонага Сцяга
паліграфкамбінат імя Я.Коласа.
220005, Мінск, вул. Чырвоная, 23.